Якуб Колас

НА РОСТАНЯХ

1

Якуб Колас

НА РОСТАНЯХ

ТРЫЛОГІЯ

Том 1

Кнігі першая і другая

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
Рэдакцыя мастацкай літаратуры
Мінск 1955

ЗМЕСТ

Кніга першая

У ПАЛЕСКАЙ ГЛУШЫ

I

— А, гэта ты, бабка! Ну, прысядзь, пагаворым трохі!

— Я пастаю, панічок... У вас так ціха, я думала, што вы ўжо спіцё, а вы ўсё з гэтай кніжкай, — сказала, прысаджваючыся, бабка. — Прабачайце, панічок: я прышла запытацца — ці баліць яшчэ ў вас галава, ці перастала?

— Перастала, бабка, перастала! — сказаў малады настаўнік, звярнуўшы ўвагу на сваю галаву і як-бы прыслухаўшыся да яе. — Забыўся нават, што яна і балела!

— Ну, панічок мой родны, як сабе хочаце: хочаце верце, хочаце не верце, а я вам, далі-бог, шаптала!

— Ты і мне шаптала? — здзівіўся настаўнік. — Калі-ж гэта ты ўмудрылася пашаптаць? Я нават і не прымеціў.

— Вот вы тут сядзелі, чыталі, а я з кухні праз дзверы шаптала... Не гневайцеся: далі-бог, шаптала!

Высокая, сухарлявая кабеціна чарнявага воласу — яна была тут старожкаю — прышла ў незвычайны рух, вочы яе ажывіліся, а на твары адзначылася ўнутраное перакананне ў сіле свае здольнасці.

— Напэўна гэта ты мне памагла, бабка, — сказаў настаўнік, усміхнуўшыся.

— Ой, панічыку, вы ўсё смеяцеся, не даеце веры. Не верыце ніяк мне, старой!

— О, не, бабка: веру, веру! Аб тваім знахарстве ўсюды кажуць: у Хатовічах, у Малкавічах, у Ганцавічах, — усюды!

— Г-э-э-э, панічок: з-пад самага Пінска прыходзяць і прыязджаюць да старое Мар'і, — з гордасцю прамовіла бабка.

— І як гэта ты, бабка, шаптаць навучылася?

— Навучылася, панічыку, навучылася!

— А хто цябе навучыў?

— Ой, панічок, вы ўсё хочаце ведаць!

— А што-ж, бабка: навучыўся-б, і да мяне хадзілі-б людзі, і я памагаў-бы ім.

— Няможна гэта, панічыку!

— Чаму няможна? Хіба грэх?

— Няможна!

— Мусіць, бабка, ты з нячыстай сілай знаешся?

— Бог з вамі, панічок! Што вы сказалі процiў ночы?! Няхай бог крые! І не ўспамінайце вы яе!.. Ва імя айца і сына і святога духа!

Старая паляшучка, знахарка Мар'я, набожна перахрысцілася, падняўшы вочы на абраз.

— А што-ж яна мне зробіць, гэтая нячыстая сіла? Я не баюся яе, бо яе, бабка, наогул няма.

— Гэ, панічыку, вы яшчэ маладзенькі, мала на свеце жылі.

— Ну, а вось ты, бабка, дзякаваць богу, трошкі пажыла-такі, а скажы-ж мне, ці бачыла ты хоць раз нячыстую сілу?

— Не кожнага, панічок, яна налучае, — ухілілася старая ад простага адказу.

— А я табе, бабка, скажу, каго яна налучае. Наколькі я ведаю, яна найбольш прывязваецца да п'яных цёмных людзей і то ўночы.

Старожка з гэтым не згадзілася і паківала галавой. А настаўнік, яшчэ зусім малады хлопец, які нядаўна прыехаў у першую сваю школку ў глухой палескай вёсцы, ледзь-ледзь усміхнуўся сам сабе, пэўны ў тым, што старая няіменна раскажа пра здарэнне з нячыстай сілай. Яму вельмі падабаліся такія гутаркі з гэтымі простымі людзьмі, якія яшчэ так мала адышліся ад часоў першапачатковай людской культуры.

— Я вам, панічок, не буду многа казаць, бо вы ўсё роўна не верыце, хоць, мажа, і верыце часам, але кажаце, што не верыце. Ды калі не верыце мне, то паслухайце, няхай вам раскажа мой Міхалка. Вы-ж ведаеце майго Міхалку? А калі яму не паверыце, спытайце людзей. Міхалка тады дзецюком яшчэ быў. Ішоў ён з Сяльца. І ноч была не цёмная. Чулі, мажа, Сяльцо, недалёка ад нашай вёскі, вярста — не болей? Гэта — выселкі з нашае-ж вёскі, двароў дзесяць. Ён і жонку ўзяў адтуль. Дык вось, панічыку, быў ён там — на вячоркі туды хадзіў, покі не жаніўся. На поўдарозе між Сяльцом і вёскай старая карчма стаіць, якраз напроціў могілак. Там невялічкае балотца ёсць, і рэчачка адтуль зачынаецца, малюсенечкая, і злучаецца з другой рэчкай, што ў нас Целяшовым Дубам завецца. І вось, як толькі мінуў ён карчму, дык на яго штось і накінулася — і не звер, і не чалавек. Так проста і налятае на яго. Хоча злавіць яго — не зловіць: нешта голае і слізкае, ні шэрсці, ні адзежы. Міхалка адкіне яго рукою, а яно зноў, а яно зноў. І вось, не паверыце, панічыку, парвала на ім новую світку да самага каўняра. Змогся бедны хлопец і ў непрытомнасці ў хату ўвайшоў. Скажаце, п'яны быў, дык зроду-ж не п'е Міхалка, у рот гарэлкі не бярэ. І праляжаў ён пасля гэтага ў гарачцы тры месяцы, насілу на ногі падняўся.

Лабановіч — так звалі маладога настаўніка — слухаў апавяданне з вялікай цікавасцю. Спярша яму было крыху смешна, але па меры таго, як сама апавядальніца ўсё больш і больш захоплівалася таемнасцю здарэння, Лабановіча зацікавіла іншае, а іменна — непасрэдная і цвёрдая вера людзей у існаванне ўсяго гэтага цёмнага спляцення нядобрай сілы. Мільёны і болей гадоў жыве гэта вера, пачаткі яе загублены ў цёмным віры прошласці, і да гэтага часу людскі розум не патрапіў вызваліцца з аблады гэтага чмучэння...

«Цікава!.. Трэба будзе калі падумаць над гэтым», — зазначыў сам сабе настаўнік. Але, як відаць, была ў яго яшчэ і іншая думка, і ён, нечакана для сябе самога, спытаўся:

— Бабка! А твой Міхалка мог-бы і памерці праз гэта?

— Гэ, панічыку мілы! Чуць-чуць не памёр! Насілу, насілу адхаялі!

— І падумаць толькі: праз якое глупства можа памерці чалавек! — прамовіў малады настаўнік, хутчэй да сябе самога, і задумаўся. Галава яго крыху схілілася набок, цёмныя вочы, у якіх часта адбівалася нейкая затоеная думка, пазіралі, не міргаючы, у кут пакоіка, але нічога не бачылі: яны як-бы пазіралі на тую думку, якая цяпер заварушылася ў яго галаве.

Старая бабка звярнула на гэта ўвагу і з нейкім страхам і цікавасцю пазірала на свайго «паніча».

— А што вы, панічыку, так задумаліся?

Лабановіч ускінуў на яе вочы і засмяяўся.

— А ведаеш, бабка, хочаш, я скажу табе, што ты цяпер думаеш?

Бабка здзівілася яшчэ болей, а настаўнік, не чакаючы яе адказу, прамовіў:

— Ты, бабка, пазірала на мяне і думала: «Калі гэты паніч яшчэ не з'ехаў з глузду, то з'едзе».

Старожка пазірала яму ў вочы, моцна здзіўленая, а Лабановіч, прыдаўшы важны выраз твару, сказаў:

— Ты, бабка, не думай таго: не адна ты знахарка. Я, можа, яшчэ выдатнейшы знахар за цябе.

— А што-ж, панічыку, усё можа быць, — як-бы з нейкай пакрыўджанасцю адказала бабка.

— Ты плюнь, бабка, на гэта, бо ўсё гэта — глупства, а лепш вось што: скажы ты мне, бабка, чаго мы на свеце жывем?

Бабка не ведала, які тон ёй узяць, каб не памыліцца, і сказала:

— Гэ, панічок: што вы так усё пытаецеся?.. Гляджу я на вас і дзіўлюся: сядзіць сабе, як той манашак, і ўсё ў гэтыя кніжкі пазірае. Паглядзелі-б трохі і годзе. А то калі ні прыдзеш, вы ўсё ў кнігі глядзіце. Хіба можна так пільна і доўга пазіраць у іх? — І, памаўчаўшы, дадала: — Сушаць яны і болей нічога.

— Дык ты, бабка, не ведаеш, чаго мы на свеце жывем?

— Не, панічок: не ведаю! Каб вы запыталіся ў дрэва, чаму яно расце, дык хіба-ж-бы яно вам адказала? Так і я не магу адказаць вам. Жывем, покі жывецца, бо жывы

ў зямлю не палезеш, а прыдзе смерць, тады пахаваюць.

— Так, бабка: ты кажаш праўду. Не ведаем мы, чаго на свеце жывем.

— А навошта, панічыку, і ведаць? Жыве чалавек і жыве, пакуль бог яму прызначае. А прыдзе час яму памерці — памрэ.

— А дрэнна, бабка, што трэба ўміраць!

— Што вы, панічыку, усё пра смерць гаворыце! Дзіўны вы, панічок, далі-бог! Вось той паніч, што быў перад вамі, бывала пойдзе куды: ці да пана падлоўчага, або да Курульчука на будку. Там паненка была, ой, прыгожая паненка! Яе цяпер дома няма, а вось прыедзе, дык пабачыце самі!

— А хіба-ж тут паненкі ёсць? — зацікавіўся Лабановіч.

— О, панічыку, чаму-ж няма!

Бабка пачала пералічаць і расхвальваць паненак. Перш-на-перш у валаснога пісара іх цэлых чатыры. Праўда, валасць адгэтуль за пятнаццаць вёрст. Але ёсць паненкі і бліжэй: за сем вёрст дачка каморніка. Усе панічы ў гэтай акрузе закаханыя ў яе. Ёсць яшчэ паненка на хутары за тры вярсты.

— Навошта вам лепей, панічок: у пана падлоўчага дочкі ёсць. Адна яшчэ зусім маладзенькая, а другая старэйшая. Яна пыталася ўжо: «Ну, як твой, бабка, паніч?»

— А ты што ёй сказала?

— Ой, кажу, паніч! Харошы паніч!

— А хіба-ж я харошы?

— А чаму-ж не харошы!

— Ну, а хто з паненак самая лепшая?

— Усе харошыя. Як для мяне, дык усе харошыя.

— Ці не думаеш, бабка, ты жаніць мяне?

— Самі, панічок, жэніцеся... А да пана падлоўчага вам трэба зайсці. Бывала, той паніч — як вечар, дык там. А вы ўсё сядзіце над гэтымі кнігамі. А яны сушаць чалавека.

— А ты, бабка, пашапчы, каб я ад іх адвярнуўся.

Старая колькі хвілін пазірала на настаўніка, а потым засмяялася доўгім-доўгім смехам.

— От, паніч, вы ўсё шуткуеце!

Бабка ўстала, пазяхнула і зірнула ў акно. А там ляжала цёмная-цёмная лістападаўская ноч.

— Толькі ў пана падлоўчага яшчэ вокны свецяцца,— зазначыла бабка.

— Пасядзі яшчэ трохі.

— Не, панічок, позна.

І бабка паволі павярнулася ў сваю кухню на печ.

II

Старожка ўжо злёгку пахрапвала ў кухні на печы, а Лабановіч усё яшчэ не лажыўся. На стале гарэла лямпа пад светлым абажурам і ляжала разгорнутая кніга, якую чытаў настаўнік. На гэты раз чытанне штось не ладзілася, і Лабановіч часта адрываўся ад кнігі, пахаджаў па пакоі і думаў. Новае месца, новыя людзі і тая работа ў школе, якую трэба было распачынаць на гэтых днях і да якой ён так доўга гатаваўся, — усё гэта займала яго думкі, і яму было лёгка і добра, бо так многа новага і цікавага спадзяваўся ён спаткаць на першай сваёй дарозе незалежнай грамадскай працы.

Яму па душы быў і гэты глухі куток Палесся, аб якім яшчэ дома так многа цікавага наслухаўся ад аднаго старога аб'ездчыка, і гэты народ з яго асаблівай мовай і звычаямі, так не падобнымі да мовы і звычаяў тых беларусаў, з гушчы якіх вышаў Лабановіч; гэты некрануты край старажытнасці, якая на кожным кроку кідалася яму ў вочы і затрымлівала на сабе ўвагу, і гэты выгляд самой мясцовасці, агульнага тону якой не мог яшчэ ўлавіць Лабановіч, але ў якой таксама было многа цікавага і, на яго погляд, павабнага.

Што ні кажы, а жыццё, ужо само па сабе, ёсць радасць, вялікае шчасце, бясцэнны дар. Ёсць важныя дзве часціны, з якіх складаецца жыццё і яго глыбокі сэнс і хараство — чалавек і прырода. Бо ніколі не страціць для нас цікавасці чалавек, бо праяўленне яго розуму бязмежна, бо дарогі яго не вызначаны, бо формы яго жыцця і яго адносін да другіх людзей бясконца разнастайныя, канчаткова не выяўлены і ніколі не могуць стаць канчатковымі. А прырода! Колькі вялікага зда-

вальнення дае нам яна! Бо прырода — найцікавейшая кніга, якая разгорнута прад вачамі кожнага з нас. Чытаць гэту кнігу, умець адгадаць яе многалучныя надпісы — хіба-ж гэта не ёсць шчасце? Адно толькі шкада, што наша жыццё несузмерна малое для таго, каб начытацца гэтай кнігай.

З такімі думкамі Лабановіч прыпыніўся каля акна. З двара пазірала цёмная, чорная ноч. Неба, абложанае нізкімі хмарамі, здавалася, усё цяжэй навісала над аголенай зямлёй. Непраглядны змрок і сыры туман спляліся густа-густа і як-бы глынулі гэтую закінутую між балот і лесу невялічкую вёску.

— Якая цемра! — жахнуўся малады настаўнік. Яму было прыемна пачуваць, што ён цяпер у гэтым цёплым і прытульным пакоіку, дзе прыветна і так многазначна гарыць лямпа пад белым абажурам, дзе ўсё так ціха і спакойна і нішто не перабівае думак. І тут-жа паспагадаў ён і тым падарожным, якім так ці іначай прыходзіцца ехаць або ісці ў гэты глухі час ночы па цёмных і гразкіх дарогах, праз брады і грэблі сярод лясоў і балот.

Лабановіч зноў падышоў да стала і ўзяўся за кнігу. Але думкі яго так разышліся, што ён мусіў загарнуць кнігу ды зноў стаў хадзіць па пакоіку і думаць.

Заўтра трэба будзе заказаць старасту фурманку і паехаць да воласці забраць школьныя прыналежнасці; трэба пазнаёміцца там з настаўнікам і параіцца з ім наконт розных пытанняў, звязаных са школай; трэба таксама зайсці і да бацюшкі і запрасіць яго прыехаць сюды адслужыць малебен перад адчыненнем заняткаў у школцы. Так, гэта трэба зрабіць, бо ўжо даўно час брацца за навучанне дзяцей. Праўда, яго назначылі сюды позна. Але адкладаць няма сэнсу, бо не здолее выпаўніць праграму.

Гадзіннік на сцяне рабіў сваю работу. Аднатонна і размерна гойдаўся маятнік у шкляной каморцы, як-бы вельмі здаволены сваёй працай, што і пацвярджаў кароткім «так-так!», «так-так!». Перад тым, як адбіць гадзіны, гадзіннік колькі хвілін трашчаў, рыпеў, як калодзежны журавель на марозе, і пасля такой прадмовы званіў прыемным металічным звонам.

— А ўжо і позна, — зазначыў сабе Лабановіч. Гадзіннік прабіў поўнач. Настаўнік перанёс лямпу ў другі, яшчэ меншы, пакоік, дзе стаяў яго просценькі дзерваны ложак, лёг у пасцелю і чытаў: «Зорныя светы і іх насельнікі».

Шырокі малюнак недасяжных светаў раскрываўся перад вачамі маладога настаўніка ва ўсёй сваёй таемнасці і бязмежнасці. І чым больш мысль захаплівалася гэтым чароўным малюнкам і гэтымі незлічонымі светамі, раскіданымі сярод бяздонных багнаў, такіх страшных, такіх павабных, — зямля і чалавек, пагардлівы гаспадар яе, рабіліся ўсё меней і меней значнымі, нікчэмнымі. Гэта бязмежнасць зацірала зямлю, і яна гублялася ў ёй, як малюсенечкая пылінка. А якім малазначным, непрыметным з'яўляўся чалавек, яго клопат, яго штодзённыя драбніцы жыцця! Новыя думкі і настроі ахінулі маладога настаўніка. Але гэтыя думкі ўмомант разляцеліся, як вераб'і, калі ў іх вясёлы гурток паляціць каменьчык, кінуты рукою якога-небудзь падшывальца-жэўжыка; страшны і непрыемны вобраз смерці бліснуў сярод гэтых думак маладога настаўніка і разагнаў іх. На адзін момант жыццё ў ім як-бы спынілася. Па яго целе прабегла дрыготка, бо гэты вобраз смерці вынік зусім неспадзявана.

— Я памру! — падумаў малады настаўнік: — Будзе такі час, калі я стану нежывым, трупам!

На кароткі міг ён як-бы адлучыўся ад сябе самога і зірнуў на сябе збоку, як староннi, другі чалавек, і жыва ўявіў сабе той момант, калі ён будзе нерухомым трупам.

— Фу! Як гэта прыкра і непрыемна! — падумаў Лабановіч. — А горай за ўсё гэта тое, што перад смерцю мы бездапаможныя і слабыя і не маем спосабу адхіліць яе ад сябе або хоць аддаліць час яе прыходу. Ад яе не адмолішся, ад яе не адкупішся нічым. Я памру. Маладым, пажылым ці старым, але факт той, што памру, бо я, як і ўсё, што мае ў сабе пачаткі жыцця, падлягаю смерці, бо ўсё на свеце, толькі што зарадзіўшыся для жыцця, ужо мае ў сабе адзнакі і пячаць смерці. І людзі звыкліся з гэтым, і нікому нават і ў галаву не прыходзіць выказаць свой пратэст проціў смерці і весці з ёю змаганне, як-бы ўжо даўно-даўно ўмовіліся прызнаць над сабою яе ўладу, лічыць гэту

уладу справядліваю і законнаю. А яна, гэта смерць, кожны дзень ходзіць вакол, кожную хвіліну нішчыць і маладзенькія і старыя формы жыцця. І мы не звáрачаем на гэта ўвагі, і толькі тады яна робіць моцнае ўражанне, калі ўмірае хто блізкі або калі наваліцца мор і людзі пачынаюць уміраць агулам. Тады чалавека ахоплівае жах, і ён губляе галаву. І вось што цікава. Калі парушаюцца драбязговыя правы, то чалавек гатоў грызціся за гэта і кусацца зубамі; там-жа, дзе разбіваецца сама аснова, прынцып, ён пакорна згінае сваю галаву і моўчкі падстаўляе яе пад абух.

— Цьфу! Якая гэта агіднасць! — думаў далей малады настаўнік: — Жывеш, складаеш планы, чагось шукаеш, чагось дабіваешся, спадзяешся, а прыдзе час — і ты будзеш труп, гніль, спажытак чарвей.

Гэтыя думкі парушылі спакой Лабановіча і пакінулі пачуванне нейкага нездаволення і непрыемнасці.

Ён звярцеў папяросу, стараючыся не думаць зусім аб смерці, закурыў, каб перабіць прыкрыя думкі. Гэта яму крыху і ўдалося, бо Лабановіч быў хлопец крэпкі, моцна зросся з зямлёю і жыццём, любіў гэтае жыццё, на парозе якога ён стаяў і росквіт якога для яго толькі што зачынаўся.

— Чаму я пачаў думаць пра смерць? Скуль узялася гэта думка? — запытаў сябе Лабановіч і пачаў дашуквацца сувязі, якая павінна быць паміж думкаю аб смерці і тымі думкамі, што так ці іначай былі прычынаю яе ўзнікнення. Прыпомніўшы ўвесь ход сваіх разваг, настаўнік ніяк не мог знайсці гэтай сувязі, і гэта акалічнасць яго крыху здзівіла і зацікавіла.

— Я чагось не ўзяў пад увагу, нейкі вобраз ці думка проста зніклі з памяці і ад таго факт гэты мне здаецца крыху незразумелым і дзіўным, хоць, наогул сказаўшы, на свеце нічога дзіўнага няма.

А гадзіннік на сцяне несупынна вёў сваю справу: размерна ківаўся хадун-маятнік і кожны свой крок адзначаў кароткім «так-так!», усё так-жа рыпеў перад тым, як прабіць, і ў свой час меладычна званіў.

Лабановіч патушыў лямпу.

Цемра і ціш напоўнілі маленькі пакойчык. З двара ў акно пазірала чорная ноч і завешанае густымі хмара-

мі-валокнамі цёмнае неба. Было ціха і глуха. Праз некалькі хвілін каля дзвярэй у кухню скрабнула мышка. Як відаць, яна знайшла дзесь скарыначку хлеба і барабаніла ёю аб падлогу.

Лабановіч стараўся заснуць, але яму штосьці не спалася. Як толькі заплюшчыў вочы, перад ім, як жывы, усплыў малюнак дарогі, якою ён ехаў ад станцыі: нескапчоныя балоты і цэлыя статкі стажкоў на іх, грэблі, брады, старыя хвоі, што горда ўзвышалі свае макушы над лесам, і наогул увесь гэты краявід, поўны свайго асаблівага хараства і невыразнай цікавасці... «Калі хворы чалавек пачынае думаць аб вялікай дарозе, то гэта ёсць прымета таго, што гэты чалавек не ачуняе», — прыпомнілася невядома калі і дзе і кім выказаная думка.

— Усё гэта — глупства, — падумаў настаўнік і павярнуўся на другі бок.

III

У нядзельку раненька, ледзь толькі зайграла чырвань на ўсходзе, Лабановіч сядзеў ужо на сене ў драбінах і выязджаў з вёскі. Невялічкая вёска ў адну вуліцу выглядала непрыветна і непрытульна. На ўсім ляжала пячаць нядбаласці і нейкай недаробленасці, як-бы тутэйшыя гаспадары будаваліся на скорую руку і ўсё рабілі да часу і яшчэ не ўправіліся даць той лад і парадак, якім, наогул, адзначаецца беларуская вёска. Вуліца была роўная і шырокая. Амаль што не каля кожнай хаты ляжалі кучы бярвенняў і гнілі, але нікому не прыходзіла ў галаву палажыць кладачку хоць супраць свае хаты, каб льга было прайсці праз балота, у якім тапілася гэта вуліца. А гразь была густая, чорная, як дзёгаць, размешаная паляшуцкімі лапцямі, быдлячымі і конскімі нагамі. Але палешукі звыкліся і зжыліся з гэтай граззю і не зварачалі на яе ўвагі. Хаты былі пераважна новыя, пабудаваныя з тоўстага і гладкага лесу. У размяшчэнні гаспадарскіх будынін на дварэ таксама не было пэўнага парадку і сістэмы, а ўсё было навалена, як папала.

Адным словам, жыхарства гэтай вёскі выяўляла сабою праўдзівых дзяцей лесу, якія як-бы зусім яшчэ ня-

даўна асталяваліся тут і толькі што пераходзілі ад аднае формы жыцця да другой. Усе яны былі заўзятыя паляўнічыя, захопліваліся адным толькі выглядам стрэльбы і былі выдатнымі стральцамі. Сялян іншых вёсак, якія жылі больш пры палях, яны называлі палянамі і гэтым самым як-бы адрознівалі іх ад сябе, жыхароў лесу. А лесу і балот тут быў непачаты край. Сама вёска стаяла на невялічкай палянцы сярод лесу і хмызнякоў, і Лабановіч усе гэтыя дні чуў сябе як-бы чымся звязаным, як-бы на ім была надзета цесная адзежына, бо густыя сцены пушчы адусюль націскалі на гэту вёску, насядалі з пагрозай, нібы яна намервалася на парушэнне яго законных правоў. Край палянкі прарэзваўся чыгункай. Дарога ішла каля самай вёскі, захопліваючы нават адзін канец вуліцы. Зараз-жа за пераездам пачынаўся лес.

Нізкае сонца ледзь прабілася скрозь макушы лесу. Неба праяснялася, падыхаў усходні вецер; лёгкі марозік зацягаў лужынкі тонкай плёнкай лёду. Вісеўшы ўсе гэтыя дні туман развеяўся, усюды пасвятлела і павесялела. Нават гэты пануры лес крыху праясніўся і меў больш прыветны выгляд.

— Го, падмарожваць пачало! — весела прамовіў паляшук Сцяпан Рылка і саскочыў з драбінак, выламаў лазіну і хвасянуў ёй свайго худога, але даволі шпаркага коніка.

— Эх, і лесу-ж у вас многа! — сказаў настаўнік, каб разгаварыцца з палешуком і пазнаёміцца з ім бліжэй.

— О, лесу ў нас многа! — пацвердзіў паляшук і павярнуў твар да настаўніка. — Гэта вось цяпер, як правялі тут чыгунку, яго пачалі зводзіць, а даўней лес зусім не такі быў. І звяр'я было многа. Каля нашай вёскі мядзведзі вадзіліся. Яшчэ бацька нашага старасты, ведаеш можа? — стары Грыгор, даўнейшага закалу чалавек! — жывога медзвядзёнка з лесу прынёс, ад мядзведзіцы адабраў!

— Як-жа гэта ён?

— А бог яго ведае. Смелы. Дый здаровы, як дуб. Дарма што яму цяпер семдзесят год, а як забушуе часам у хаце Раман, яго сын, стараста наш, то стары, бывае, не вытрымае, возьме яго на рукі, як хлапчанё, і зараз-жа ўціхамірыць, хоць Раман і не ўломак. Вось як! І за-

везлі таго медзвядзёнка графу Патоцкаму. Дазвол далі Грыгору паляваць у графскіх лясах, яшчэ і пораху і шроту выдалі.

— А цяпер мядзведзяў тут няма?

— Не, няма: перавяліся. Туды далей, пад Татарку, сышлі, дзе месца глушэй і лесу болей, і дзе меней заглядае вока людское... Забараняць пачалі па лесе са стрэльбаю хадзіць, леснікоў паставілі, законы строгія пайшлі. Але і лес нішчыцца, і звер зводзіцца.

— А я чуў, што тут яшчэ многа зверыны?

— Ёсць, праўда, але хіба столькі, як даўней? Бабры тут калісь вадзіліся. Яшчэ і цяпер дзе-ні-дзе можна бачыць сляды іх будынін... На ўсё пайшоў звод, — з нейкай маркотай заключыў паляшук і змоўк, аб чымсі задумаўшыся.

— Так, дзядзька Сцяпан: жыццё не стаіць на месцы, і ўсё на свеце змяняецца. Вось у вас чыгунку правялі, заработкаў прыбавілася, гандаль шпарчэй пайшоў, новыя людзі з'явіліся. Яшчэ тры гады таму назад у вас і школкі не было, цяпер пабудавалі школу, вашы дзеці вучыцца будуць, граматнымі стануць, будуць кнігі, часопісы чытаць, навучацца, як лепей каля зямлі хадзіць, каб карысці з яе болей было, бо ўсё-ж паляпшэнне ў жыцці ад навукі ідзе. Пэўна, і вы, дзядзька Сцяпан, маеце дзетак, якіх трэба ў школцы вучыць?

— Ёсць Іван і Пятрук, самыя шкаляры, — уздыхнуў паляшук.

У яго адказе настаўнік пачуў нотку нездавальнення, што яго хлопцам прыходзіцца ў школу ісці.

Настаўнік з цікавасцю назіраў за палешуком. Яму падабалася паляшуцкая вопратка дзядзькі: чорная выцвіўшая суконная світка, пашытая да стану, шырокі ў чырвоныя палоскі даматканы пояс і шапка-кучомка свайго вырабу. Доўгія, як у папа, цёмнарусыя валасы, светлашэрыя вочы, сярэдні рост, шырокія плечы, павольнасць руху і нейкая сур'ёзнасць выразу твару як не трэба лепей стасаваліся з агульным малюнкам палескай прыроды.

Дарога ўвесь час ішла лесам. Лес зрэдку разрываўся невялічкімі палянкамі, на некаторых рунела жыта, а па краях там-сям пападаліся старадрэвіны-хвоі, што пыш-

на разрасліся на прасторы, абъ развіслыя таўшчэразныя дубы, як заможныя старасвецкія гаспадары; на гэтых дубах палешукі-бортнікі рабілі цэлыя пчольнікі, зацягваючы туды па дзесятку вуллёў. Палянкі зноў змяняліся лесам, то стройным баравым, то нізкім балотным. Высокія тонкія бярозы мяшаліся з шэрымі стваламі хвоі і прыдавалі характар маркоты і засмучэння ўсяму малюнку. Лес зноў расступаўся, даючы месца бясконца вялікім балотам. Балоты цягнуліся далёка-далёка між лесу і замыкаліся лесам, ледзь чарнеючы роўнай палоскай на далёкім небасхіле. Цэлае мора высокай парыжэлай травы засталося зімаваць тут, бо сюды не зойдзе ні гавяда, ні чалавек з касой. Незлічоныя купіны, нізкарослыя хвойкі на іх, пачарнелыя карчагі даўно адмёршых дзеравяк раслі і гнілі тут спрадвеку. Сярод гэтых купін бліскучымі стужкамі павіваліся часамі палоскі вады, чыстыя, гладкія, як шліфаванае шкло. Невядома, з якіх часоў стаялі над імі засохшыя адломкі старых спарахнелых алешын, як свечкі, і маркотна глядзелі ў неба. Ад балот патыхала нейкім невыразным смуткам, ціхім жалем веяла ад аднатонных малюнкаў палескіх куткоў, дзе ўсё-ж-такі жыццё стварала своеасаблівыя формы і, нягледзячы на ўбоства, мела сваю павабнасць і хараство, свой твар, поўны тужлівага задумення. Але гэтыя малюнкі тамілі вочы і засмучалі сэрца, і чалавек мімаволі стараўся знайсці нешта такое, на чым можна было-б адпачыць і заспакоіцца.

Пазіраючы на гэтыя балоты-пустэлі, Лабановіч часамі пачуваў у сэрцы нейкую адарванасць ад жыцця і свету, як-бы гэты свет сышоўся тут клінам, і туга па тым, з чым ён разлучыўся, пачынала забіраць яго душу.

«Што пачувае, аб чым думае гэты дзядзька Сцяпан? Як адбіваюцца на ім вобразы глухога Палесся і які след пакідаюць яны ў ім?» — думаў настаўнік, і яму хацелася хоць на момант стаць тым самым палешуком, што сядзеў поруч з ім, каб зірнуць яго вачамі і зразумець увесь унутраны свет яго, яго надзеі, яго жаданні.

Балоты скончыліся; дарога пашыбавала на горку, калёсы мякка пакаціліся па жоўценькім пясочку, і лес прыняў звычайны свой выгляд. Вярсты праз дзве лес з аднаго боку дарогі зноў разарваўся вясёлаю палянкаю, агінаючы яе прыгожымі завароткамі. На гэтай палянцы, за

поўвярсты ад дарогі, раскінулася чыясь пасада, як сярэдняй рукі фальварак, з усімі прыбудоўкамі, садам і прасторным дваром.

— Чыя гэта пасада? Хто жыве тут? — запытаў настаўнік.

— Гэта? А тут пан каморнік жыве. Завітанкамі пасада называецца. Адгэтуль якраз палавіна дарогі да воласці, — адказаў Рылка.

«А, гэта і ёсць той каморнік, у чыю дачку ўсе тутэйшыя кавалеры закахаліся. Дык вось дзе жыве яна, гэта красуня!»

Лабановіч прыпомніў размову са сваёй старожкай і, зацікаўлены, глянуў яшчэ раз на пасаду. Паслушнае і ўслужлівае ўяўленне ўжо рысавала яму вобраз дзяўчыны, гэту чыстую і прыгожую краску, узгадаваную ў глухіх палескіх барах. Лабановіч ніколі, нават у думках, не дазваляў сабе зняважыць дзяўчыну. Адно слова «дзяўчына» выклікала ў душы яго чысты і прыгожы вобраз, на які можна пазіраць і любавацца толькі здалёк. І цяпер ён прыпомніў два ці тры здарэнні ў сваім жыцці, калі гэтыя вобразы глыбока западалі ў яго сэрца, але ён і намёкамі не сказаў нікому пра гэта. А раз у дачку каморніка ўсе закаханы, то яна, без спрэчкі, ёсць верх хараства. Яшчэ не бачачы яе, настаўнік пачуваў, што яна ўжо мае над ім нейкую ўладу. Яму хацелася хоць паглядзець на яе, і праз усю астатнюю дарогу ён думаў аб дачцы каморніка, ён ужо сустракаўся з ёю, зацікавіў яе і бадай што не ўсіх кавалераў яе засланіў сабою.

IV

Апошні раз расступіўся лес, і перад вачамі настаўніка раскрылася шырокая круглая палянка, вясёлая і прыветная. Лабановіч уздыхнуў лягчэй, як-бы з яго плячэй зваліўся нейкі цяжар, бо дарога, траская і каранiстая, і лес усё-ж-такі дакучылі яму. Тым прыемней зірнулі стрэхі людскіх будынін і коміны хат, з якіх яшчэ дзе-ні-дзе курыўся сіняваты дымок.

Вёска была досыць вялікая, цягнулася ў адну лінію, і толькі каля цэркаўкі на ўзгорку хаты гуртаваліся гу-

сцей і шырэй. Злева, пры канцы вёскі, стаяў дом валаснога праўлення з двума высокімі чырвонымі комінамі над пачарнелым дахам. Насупраць, на другі бок вуліцы, выглядала школа з белымі аканіцамі і двума ці трыма развіслымі вязамі каля яе. Пры дарозе ў вёску, крыху на водшыбе, маркотна тулілася старэнькая драўляная цэркаўка. Цяпер яна стаяла адзінокая, закінутая, забытая, і толькі богабаязны падарожны, праходзячы каля яе, прыпыняўся і хрысціўся, набожна схіліўшы галаву. Па адзін і па другі бок вёскі стаялі ветракі, як страшыдлы, шырока раскінуўшы свае крыллі. Адны з іх былі ў жывым руху, весела падымалі і апускалі крыллі, а другія — стаялі моўчкі, нерухліва і мелі такі выгляд, як-бы яны былі крэпка чымся здзіўлены і пыталіся: «А чаму-ж мы стаім без работы?»

Праехаўшы невялічкую грэбельку, калёсы пакаціліся па шырокай вуліцы. Народ расходзіўся з царквы. Старыя палешукі, сустракаючыся, пачціва кланяліся, а чародкі маладых дзяўчат-паляшучак і праворных маладзіц, убраных, як макавыя кветкі ў агародзе, падштурхвалі адна другую, пераміргваліся і кідалі смяшлівыя погляды ў бок маладога настаўніка, які першы раз з'явіўся тут.

Пад'ехаўшы да школы, Лабановіч выскачыў з драбінак і ўзышоў на ганак. Дзверы былі замкнуты. Лабановіч пастукаў. У глыбі кватэры зараз-жа грукнула крэсла, і пачуліся крокі. Дзверы адчыніліся.

— Выбачайце. Дома настаўнік?

— Вот я. Заходзьце, калі ласка.

Лабановіч пайшоў за гаспадаром, нязграбна ступаючы занямеўшымі нагамі.

— Дазвольце пазнаёміцца: ваш калега і сусед — Лабановіч, — назваў сябе госць.

— Саханюк, тутэйшы педагог. Будзьце ласкавы, знімайце паліто, сядайце.

Госць і гаспадар селі каля стала.

— Вы — новы, і ў нашых краях першы раз?

— Навaспечаны, і ў вашых трушчобах маю гонар быць першы раз, — сказаў з усмехам Лабановіч.

— Ну, як падабаецца вам ваша месца?

— Лепшага месца я і не чакаў: ціхае, глухое. Нішто не пашкодзіць весці працу, — прамовіў Лабановіч.

Саханюк звонка засмяяўся.

— Ах вы, ідэалісты, ідэалісты. Ці надоўга хопіць вам гэтага ідэалізма?.. І тым не меней першы раз бачу чалавека, што так высока ставіць глуш ды яшчэ такую, як ваша.

— У вас тут, выбачайце, большая глуш.

— Як так? — здзівіўся Саханюк. — У нас — валасць, грамада: бацюшка, пісар, фельчар, ураднік, псаломшчык і так збоку людзі часцей даведваюцца.

— І пэўне з Завітанак сюды хтось завітвае, — жартліва ў тон гаспадару прамовіў Лабановіч і кінуў на яго бачлівы погляд.

Гаспадар крыху замяшаўся, бо і ён таксама меў ласае вока на дачку пана каморніка, адразу сцяміўшы, куды цаляе яго сусед.

— А вы хіба былі ў Завітанках? — спытаў Саханюк.

— О, не, — прамовіў Лабановіч, — я лічу, што ў завітанскай чараўніцы і так вялікі штат кавалераў, і мая там прысутнасць ніколечкі не павялічыць яе вагі.

— Калі ў вас, калега, такі погляд на рэчы, — сказаў павесялеўшы Саханюк, — скажу вам: не будзеце і вы мець вагі ў тутэйшых паненак.

— А мне ўсё роўна... Урэшце-ж, ці не памыляецеся вы тут, калега? Але гэта — між іншым. Я хацеў-бы прасіць вас, калега, пазнаёміць мяне з вашай грамадою, бо трэба-ж, як кажуць, аддаць кесарава кесараві. Калі-б вы былі ласкавы пайсці са мною да пісара, таксама і да бацюшкі, а можа, і яшчэ да каго, калі ўжо гэтага вымагае звычай вашай грамады, то я быў-бы вам вельмі падзячан. Гэта было-б і скарэй і прасцей, бо мне яшчэ ніколі не даводзілася выступаць у ролі візітанта.

— А вы чаго-ж так спяшаецеся? Разумеецца, я з вамі пайду, тым болей, што і мне трэба зайсці да таго-другога, але адаслалі-б вы сваю падводу дамоў, а самі тут паначавалі-б.

— Не, калега. Я яшчэ да работы не прыступаў у школе. Вы, пэўна, ужо многа паспелі, і я не даганю вас за ўсю зіму. Мне хацелася-б і павучыцца ў вас сяму-таму, бо вы ўжо набілі, як кажуць, руку і маеце практыку.

Дзверы з другога пакоіка адчыніліся, і на парозе паказалася ўжо немаладая кабеціна. Гэта была старожка.

Яна перш уважліва паглядзела на незнаёмага настаўніка, а потым сказала свайму настаўніку паляшуцкай гаворкай.

— Да вас, панычу, там маладыцы прышлы — лыст напысаць хочуць.

— А сала прынеслі?

— Ны відаю, панычыку.

— Выбачайце, — сказаў Саханюк да госця: — Я пайду адпраўлю гэтых маладзіц.

І Саханюк накіраваўся ў кухню. Старожка Матрона, яшчэ раз агледзеўшы госця, таксама пайшла туды. Ясна, хтось даў ёй наказ, як можна лепей разглядзець Лабановіча, каб навесці аб ім сталыя даведкі. І, як відаць, наказ гэты быў дадзены не так здалёку, бо, счакаўшы хвіліны дзве, Матрона матнулася праз вуліцу, маючы кірунак да кватэры пісара.

Застаўшыся адзін, Лабановіч акінуў вокам пакоік свайго калегі. Кватэра гэта была многа лепшая ад яго кватэры. Было відаць, што Саханюк жыў някепска, прасядзеўшы ў гэтай школе гадоў пяць. І наогул, Саханюк быў чалавек практычнага складу. Нейкім чынам умудрыўся ён за гэтыя пяць год, атрымліваючы дваццаць рублёў пенсіі на месяц, сабраць капітал у пяць-шэсць соцень і меў сваю гаспадарку. «Жылаваты чалавек ты, браце! — падумаў Лабановіч: — Нават за напісанне ліста не саромеешся браць сала». На століку ляжалі школьныя журналы. Разгледзеўшы іх, Лабановіч прышоў да заключэння, што яго калега не так далёка адышоўся з вучнямі, і пераканаўся, што ў асобе Саханюка ён не будзе мець для сябе настаўніка, і тут-жа зазначыў, што супольнага між імі вельмі мала і што блізкімі сябрамі яны ніколі не будуць.

— Ну, цяпер я вольны, можам ісці, — сказаў увайшоўшы Саханюк і падышоў да люстэрка, паглядзеўся, падправіў рыжаватыя вусы, правёў рукой па шчоках, ці добра пабрыты, і прычапіў больш франтаваты гальштук. Саханюк быў хлопец сухарлявы, досыць высокага росту, меў даволі прыгожы твар, але малавыразныя, жаўтавата-карыя вочы яго крыху псавалі. Таксама была ў яго яшчэ адна загана, загана вымаўлення: ён не мог сказаць чыста «р», а нейк скрадваў яго і казаў «й».

— Ты, Мат'ёна, калі я не п'іду, астаў абед на вячэю. Настаўнікі вышлі.

— Куды-ж наўперад пойдзем?

— А давайце пачнем па парадку, каб нікому не было крыўдна, — адказаў Лабановіч.

Зрабіўшы колькі крокаў, Лабановіч і Саханюк узышлі на ганак валаснога праўлення.

— Зойдзем да канцылярыі, — сказаў Лабановіч: — Заадно трэба ўзяць паперы і ўсе вучэбныя прылады.

Настаўнікі пераступілі парог і апынуліся на зборнай. Зборная была прасторная, як абора. На процілежным яе канцы, на ўзвышшы, адгароджаным балясамі, стаяў вялізны стол, абіты зялёным сукном, а за сталом, на шырокім крэсле засядаў сам пісар. Гэта быў ужо стары чалавек, з шырокай барадой, напалавіну сівою. Міна яго была незвычайна важная. Пазіраў ён крыху прыжмурыўшыся, як-бы ён толькі што занюхаў табакі і збіраўся чхнуць. Нягледзячы на тое, што ў канцылярыі было цёпла, пісар сядзеў у валёнках, бо меў у нагах раматус, і на твары яго адбіваліся адзнакі хваравітасці і сляды калісь вясёлага жыцця і п'янства, у якім пісар не меў сабе роўных у воласці. З гарэлкай ён ніколі не разлучаўся. У канцылярыі, у шафе сярод «гражданских и уголовных дел», стаяла бутэлька з «царскімі слязьмі», як называлі тады гарэлку, да якой часта прыкладаўся Пятро Восіпавіч і ў часы сваіх заняткаў у воласці. Праўда, такіх часоў у яго было не так-та многа, і ён прыходзіў сюды ў выпадках рэдкіх і важных; усю-ж работу па воласці вёў яго памочнік, Дубейка, які ўжо лічыўся кандыдатам на пісарскую пасаду. З гэтай прычыны Дубейка нёс сябе высока, насіў манішку і манкеты і лічыў сябе найпершым кавалерам; старанна прычэсаныя валасы і частае заззіранне ў люстэрка сведчылі аб тым, што і ў яго сэрцы засела завітанская паненка.

V

— Дазвольце пазнаёміць, — сказаў Саханюк, падводзячы калегу да пісара, — цельшынскі настаўнік.

— А! — прамовіў пісар, акінуўшы Лабановіча прыжмуранымі вачамі і падаў яму руку. — Прасвяшчаць,

значыць, прыехалі? — спытаў пісар, каб хоць што-небудзь сказаць, і яшчэ раз азірнуў Лабановіча. — Ну, ну, справа патрэбная, — важна заўважыў ён, пасля чаго перастаў цікавіцца Лабановічам, як чалавек практычны, які з першага погляду адгадаў, што для пісарскага дому карысць ад новага настаўніка невялікая.

Затое-ж Дубейка выказаў многа ўвагі і адзнак шляхетнага тону, знаёмячыся з Лабановічам.

— О! — казаў ён: — Нашага палку прыбывае. Вельмі прыемна, калі круг інтэлігенцыі павялічваецца. — Але разам з гэтым Дубейка запытаўся: — А гэта ўжываеце? — Адначасна з запытаннем ён ускінуў галаву і пстрыкнуў пальцам па сківіцы.

Лабановіч здзіўлена глянуў на Дубейку. Гэта запытанне для яго было зусім нечаканае, і ён не ведаў, што адказаць.

— Ну, разумеецца, не так, што-б з ног скідацца, — паправіўся памочнік, — а ў кампаніі, пасля таго, як пулечку згуляеш або стукалку, прапусціць чарачку, другую. Гуляеце ў карцішкі?

— Не, не гуляю.

Дубейка ў сваю чаргу здзівіўся, і ўвесь выраз яго твару як-бы казаў: «Які-ж ты пасля гэтага інтэлігент?»

— Ну, нічога, — заспакоіў Дубейка. — Пажывеце, навучыцеся. Толькі часцей да нас даведвайцеся, бо ў вас там глуш, чалавека не ўбачыш і, апрача падлоўчага, і зайсці там няма да каго.

— Э, гэта не бяда, — адказаў Лабановіч, — людзі ўсюды ёсць. Чым не людзі тыя-ж самыя палешукі? Хіба да іх нельга зайсці? Я лічу, што сярод іх можна вельмі прыемна прабавіць вольную часіну, і там напаткаць не толькі цікавае, але і разумнае, чаго ніколі не знойдзеш ні за чаркаю, ні за пулькаю.

— Не разумею вас, — адказаў Дубейка. — Што цікавае можна знайсці сярод палешукоў? Калі можна там напаткаць што-небудзь цікавае, дык хіба толькі маладзіцу-салдатку. — Пры гэтым Дубейка выразна зірнуў на Саханюка і засмяяўся.

— Калега — манах. Ён любіць глуш і адзіноцтва і хоча жыць пустэльнікам.

— Ведаем мы гэтых пустэльнікаў, — зноў падміргнуў Дубейка. — У ціхай вадзе чэрці водзяцца.

Першыя ўражанні знаёмства не спадабаліся маладому настаўніку, і ён, папрасіўшы выдаць пасылкі з кнігамі і сшыткамі для яго школы, развітаўся з новымі знаёмымі.

Вышаўшы са зборнай, Лабановіч накіраваўся да дзвярэй, каб падацца на вуліцу, але Саханюк затрымаў яго.

— Не, калега: трэба пазнаёміцца з пісаранкамі, бо калі не зойдзеце да іх, то гэта будзе такая крыўда, якая вам ніколі не даруецца ні ў гэтым жыцці, ні на тым свеце.

Саханюк узяў пад руку Лабановіча і павёў яго ў кватэру пісара.

Прасторная і светлая зала была ўбрана чысценька і акуратна на мяшчанскі лад. Сталы і столікі былі засланы чыстымі настольнікамі і настольнічкамі. Крэслы стаялі ў парадку. На сценах віселі розныя малюнкі ў прыгожых асадках. Па кутках залы стаялі круглыя столікі пад белым кружавам: на століках ляжалі альбомы для фатаграфій. На вокнах вазоны розных гатункаў. Адным словам, на ўсім быў відзен адбітак дзявочага прызору і акуратнасці.

Маня, старэйшая дачка пісара, ужо не маладая дзяўчына, гадоў за дваццаць пяць, па ўсім відаць было, падгатавалася спаткаць настаўнікаў. Яна надала свайму твару тую міну, той выраз, якія люстэрка падказала ёй, як самыя лепшыя, што найбольш ішлі да яе, нявінна сядзела за сталом, нібы нічога не ведаючы, і разглядала «Ніву». Яна была чорная, як цыганка, даволі прыгожая з твару; але разам з гэтым было на ім і нешта такое, што рабіла яго сярдзітым, злым. Напэўна доўгае чаканне свайго суджанага, якога дзесь затрымалі чэрці, мела свой уплыў. Саханюк галантна падвёў свайго калегу да пісаранкі.

— Лабановіч, цельшынскі педагог.

— Вельмі прыемна, — сказала Марыя Пятроўна: — Сядайце, калі ласка!

Лабановічу здалося, што яна чымся ўгневана. «Ці не Саханюком, які шукае свайго шчасця не тут, блізка, а дзесь за сем вёрст, што яна з ім крыху неласкавая?» — падумаў Лабановіч.

— Ну, як вам падабаецца наша месца? — спытала пісаранка.

— А нічога. Месца вельмі добрае, і мне наогул падабаецца Палессе.

— А вось вашаму калегу яно падабаецца мала.

— Не скажэце, — адказаў Саханюк: — Каб гэта была праўда, то пяць год я не выседзеў-бы тут.

— Калісь падабалася, — сказала Маня і ледзь уздыхнула.

Увайшла сярэдняя дачка, Саша, зусім непадобная да сястры. Яна была шчаслівейшая ад яе, бо мела жаніха ў асобе тутэйшага ўрадніка. Зараз-жа за ёю ўвайшла і трэцяя сястра, Ніна. Самая малодшая, Ольга, вучылася ў горадзе, і яе цяпер не было дома.

Лабановіч чуўся не па сабе ў кампаніі дзяўчат і не трапляў падтрымаць з імі гутаркі. Ён толькі адказваў на іх пытанні, адказваў сур'ёзна, што не падабаецца паненкам такога стану, якія звыклі, каб іх забаўлялі, жартавалі з імі і малолі гарох і кашу, абы было смешна.

— А вы спяваеце? — спытала яго Саша.

— Не. Спяваю няважна, — адказаў Лабановіч, і ў вачах яго бліснуў ледзь прыметны смех, — за практычную лекцыю па спевах у семінарыі наш Костка ледзьве тры з мінусам паставіў.

— Якая костка? — здзівілася старшая пісаранка.

— Выбачайце, не якая костка, а які Костка, — паправіў яе Лабановіч. — Гэта ў нас быў такі настаўнік у семінарыі, які выкладаў спевы і меў прозвішча Костка.

— Не, — сказала Саша: — Я не пра такія спевы пытаюся. Вы маглі даць няўдалую лекцыю, але гэта не можа пашкодзіць вам самім праспяваць, ну, напрыклад, раманс.

— Крый мяне божа! — засмяяўся Лабановіч: — Каб я яшчэ рамансы спяваў. І сам не спяваю, і не люблю, калі хто іх спявае. Іншая справа паслухаць добры хор.

Такім адказам Лабановіч прыпыніў усякія запытанні ў гэтым кірунку: змоўклі паненкі, маўчаў і ён.

Размова павялася між паненкамі і Саханюком аб справах другога зместу, аб іх знаёмых, адным словам, пачалося пераліванне з пустога ў парожняе.

Некаторы час Лабановіч слухаў, а потым падняўся, папрасіў прабачэння і стаў развітвацца.

Яго не затрымлівалі, хоць з далікатнасці папрасілі заходзіць.

«Дудкі, — казаў сам сабе Лабановіч, выходзячы ад паненак, — не скора я тут буду».

Разам з ім вышаў і Саханюк.

— Ну, як вам, калега, спадабаліся паненкі?

— Ну, што-ж? Дзяўчаты, як дзяўчаты. А вось што я не спадабаўся ім, дык гэта ясна.

— Чаму вы так думаеце?

— Тут і думаць няма чаго. Перш-на-перш, не сказаў кампліментаў і не ўмею казаць іх. Можа-б, і прыдумаў, але не асмельваюся вымавіць, далей, не пахваліў нічога з іх работы, не заспяваў раманса і наогул нічога не патрапіў сказаць у тон.

І ён не памыляўся. Як толькі настаўнікі сышлі з ганка, першая Саша сказала:

— Ну і мяшок! Як для Цельшына, дык лепшага і не падбярэш.

— Зусім неачэсаны: так і відаць, семінарыст, гатовы кашлянуць і зацягнуць: «Благаславі, душэ мая, госпада», — аклікнулася Маня.

Настаўнікі тым часам ішлі да бацюшкі. Дарогаю Саханюк паказваў, дзе хто жыве і чым хто выдацен. Вось у гэтым дворыку жыве фельчар Гарошка, удавец, сышоўся з адною паляшучкаю і сам апаляшучыўся. Сын яго, Максім, вучыўся ва ўсіх школах Пінска, але ні аднае не скончыў, а з апошняе, з духоўнага вучылішча, проста ўцёк. Цяпер ён сядзіць на бацькавай шыі. Уцёк-жа ён з тае прычыны, што ў гэтых школах не вучаць нічому такому, што адпавядала-б яго шырокай натуры, якая знайшла здавальненне ў гарэлцы, картах і іншых забаўках вясковага лабатраса. Цяпер ён бярэ курс на дзяка або на памочніка валаснога пісара. Але пакуль што гэта толькі добрыя намеры.

Бацюшка, яшчэ малады, крыху хваравіты, нікуды не ходзіць, але любіць, калі да яго заходзяць. Матушка была раней настаўніцай, кабета вясёлая і добрая, вельмі любіць пагуляць у стукалку.

Вось гэты дом з садам, першы ад царквы, і ёсць пасада бацюшкі.

Так непрыметна настаўнікі дайшлі да веснічак бацюшкавага двара.

VI

— Міласці просім, міласці просім,—прамовіў а. Кірыл і борздымі крокамі патрусіў да дзвярэй насустрач гасцям і стаў памагаць ім раздзявацца; сам першы пaздароўкаўся з Лабановічам, папрасіў настаўнікаў садзіцца, сам падстаўляў ім крэслы і наогул выказаў вельмі многа прыветнасці і ўвагі, нават радасці і дабраты.

Айцец Кірыл быў чалавек яшчэ малады, нізенькі, шчупленькі, худзенькі, з рэдзенькаю цёмнаю бародкаю і жывымі, крыху неспакойнымі цёмнашэрымі вачамі. Адбітак нейкай мукі адзначаўся на яго худым твары. Гаварыў а. Кірыл громка і борзда, часта смяяўся ад душы, але радасці, гэтай галоўнай уласцівасці здаровага смеху, не чулася. І варта было хоць на хвіліну яму сціхнуць, каб зараз-жа цень смутку лёг на яго твар.

— Даўно-ж вы прыехалі ў Цельшына? — запытаў Лабановіча а. Кірыл.

— А ўжо скора тыдзень будзе, а. Кірыл.

— Што, не думалі, пэўна, папасці ў такую глуш? — зноў запытаў а. Кірыл і громка засмяяўся.

— А вы ведаеце, а. Кірыл, — сказаў Саханюк, — калега знаходзіць, што ў нас тут большая глуш, чым Цельшына.

— І праўду кажа, чыстую праўду, — пераконана прамовіў а. Кірыл: — Тут у нас такая яма, такая, выбачайце, памыйніца, што другой такой і на свеце няма.

— Калі я казаў, што ў вас, калега, большая глуш, то меў на ўвазе, што вы жывеце далей ад чыгункі. Якая-б ні была сама па сабе глуш, але калі ты чуеш гудок паравоза, шум вагонных колаў і бачыш гэтыя роўныя або прыгожа закругленыя палоскі жалеза на шпалах, то не так тужліва адчуваеш адарванасць ад людзей і культуры, бо чыгунка з'яўляецца як-бы жывым вобразам непарванай сувязі з людзьмі.

— Калі-ж вы думаеце пачынаць работу ў школе?

— А вось я і хачу прасіць вас, а. Кірыл, прыехаць на гэтых днях у маю школу на малебен. Так-бы з аўторка і пачаў.

— Не спяшайцеся, — махнуў рукою а. Кірыл. — Вы думаеце, яны, гэта быдлё, зразумеюць, што вы для іх будзеце старацца, вучыць іх? Вы не ведаеце мужыка: зрабі яму дабро — ён адплаціць табе самай чорнай непадзячнасцю. Мужык — гультай, злодзей, п'яніца. Толькі і глядзіць, як абадраць цябе, ашукаць. Ніякай веры няма яму. Ён гатоў цябе ўтапіць, прадаць за чарку гарэлкі. Іх трэба ўзяць — во! — Айцец Кірыл згарнуў кулакі і патрос імі, паказваючы, як трэба трымаць мужыка.

Лабановіч ніяк не спадзяваўся, каб а. Кірыл мог да такой меры не любіць мужыка, і наогул, каб у такім маленькім папку магло змяшчацца столькі нянавісці.

— Вы папрабуйце купіць у мужыка кусок хлеба ці шклянку малака. Што, ён прадасць вам? Ніколі. Гандляру прадасць, вам — ні за якія грошы!

Лабановіч нецярпліва чакаў, калі скончыць выліваць сваю злосць а. Кірыл, каб заступіцца за мужыка. Лабановіч быў пакрыўджан, як мужыцкі сын. Ці даўно яму самому, калі вучыўся ён у семінарыі, крычалі мешчанчукі: «Лямец, лямец! На якой бярозе ты лапці павесіў?»

— Розгамі яго трэба сеч! — скончыў а. Кірыл і гнеўна бліснуў вачамі.

— Я не магу згадзіцца з тым, што сказалі вы, а. Кірыл. Нават і тады, калі гэта ўсё было-б праўда, — пачаў Лабановіч, — і тады нельга судзіць так мужыка. Вы кажаце — мужык скарэй прадасць гандляру, чым пану, бо пад паняцце «пан» у мужыка часта падыходзіць кожны, хто носіць цэшку або чорнае паліто. Гандляра ён ведае, з гандляром ён жыве; часам і лае яго і ў морду яму плюе. На мужыка прывыклі пазіраць, як на пчалу або на нейкую машыну, якая павінна ўсё выраблять, усім даваць і яшчэ пры гэтым казаць і кланяцца: «Дзякую, што бераце». І ўсе так ці іначай бяруць ад мужыка: бяруць сілаю, бяруць хітрыкамі, бяруць ашуканствам. А мужыку многа далі? Паважаюць мужыка? Хто вінават, што мужык неачэсаны, што мужык цёмны і жыве па-

свінску? У святым пісанні напісана: «Якою мераю мерыце вы, такою адмерыцца і вам».

Айцец Кірыл слухаў, апусціўшы вочы, і стукаў пальцамі па стале.

— Вы яшчэ мала ведаеце мужыка, — спакойна адказаў а. Кірыл, — што-б вы мне ні казалі, я буду цвярдзіць сваё: мала білі мужыка!

— Вы зусім не тое гаворыце, што думаеце. Проста вы за нешта ўгневаліся на мужыка, — сказаў Лабановіч, смеючыся.

Саханюк маўчаў.

— А вы ведаеце, — прамовіў урэшце ён: — Нашых тутэйшых сялян ніхто нідзе начаваць не пускае.

— Хто не пускае?

— Другія мужыкі.

— Ды што-ж? Не спрачаюся, вашы мужыкі могуць быць і дрэннымі, але з гэтага не следуе, што і ўсе мужыкі нікуды нягодныя. Тая-ж самая паншчына, аб якой шкадуе а. Кірыл, псавала іх, бо, як пацвярджаюць факты, былі такія паны, што гналі сваіх мужыкоў і падбівалі іх на кражу ў сваіх суседзей-паноў.

На гэтым месцы гутаркі ўвайшла матушка. На яе твары была прыветная ўсмешка. Паздароўкалася, села і, звярнуўшыся да Лабановіча, запытала:

— Былі ў пісара?.. Ну, як вы знаходзіце пісаранак?

— Прызнацца, я і не разгледзеў іх, бо мы вельмі мала былі там.

— А праўда, Саша — харошанькая?

Айцец Кірыл паморшчыўся і махнуў рукою. Лабановіч адказаў:

— Нічога сабе дзяўчына.

— Вось бачыце, шкада толькі, што вы ад нас далёка, а то-б зачасцілі за Алеськаю?

— А хіба тут няма каму гэтай справай заняцца? Вось мой калега, напрыклад?

Саханюк і бацюшка засмяяліся.

— Не, я ўжо зусім страціў там ласку, дзякаваць богу.

Айцец Кірыл засмяяўся яшчэ грамчэй.

— Наш настаўнік кажа: «Не на таго прасцяка напалі!» — сказаў ён.

— Апрача таго, я чуў, што ў яе жаніх ёсць ужо.

— Ці мала на свеце дурняў? — зноў дадаў а. Кірыл.

Матушка вяла сваё:

— Ну, то што? Хіба жаніхам свіней не падкладаюць?

— Гэта было-б не па-хрысціянску.

— Затое-ж па-кавалерску.

— З паліцыяй мець справы небяспечна, — зазначыў а. Кірыл.

— Глуш там у вас, вучыцелька!

— Усе вы, панове, у глушы жывеце, а глушы баіцеся. І ў глушы людзі жывуць. Мне, матушка, нават падабаецца такая глуш.

— Праўда, у пана падлоўчага дочкі падрастаюць, — гнула матушка сваю лінію, — і кажуць, старэйшая вельмі прыгожая, ужо зусім паненкаю выглядае.

— Не ведаю: не быў у іх.

—Што гэта вы так мала паненкамі цікавіцеся?.. О, хітруеце вы, вучыцелька!

— Ёсць тут цікавіцца чым, — зноў буркнуў а. Кірыл.

Матушка ўстала, узяла папяросы, сама закурыла і гасцей патрактавала. Айцец Кірыл не курыў, але набіваць папяросы любіў, і цяпер узяўся за гэту работу.

У пакой увайшла служанка — паляшучка, крэпкая чырвонашчокая дзяўчына.

— Да вас, бацюшка, Апанас Каваль прышоў; просіць хворую прычасціць.

— Хто ў яго хворы?

— Жонка.

— Скажы, зараз іду, — сказаў а. Кірыл. — Я скора вярнуся — тут блізка, а вы, калі ласка, пачакайце мяне, — звярнуўся ён да гасцей.

Айцец Кірыл надзеў цёплую расу, узяў крыж і ўсе патрэбныя рэчы і вышаў.

— Эх, папоўская служба! — уздыхнула матушка: — Нават і адпачыць няма калі. А ён слабы, хворы, ногі чуць цягае. Народ у нас, вучыцелька, грубы, дзікі. Вось вашы, вучыцелька (слова «вучыцелька» матушка выводзіла ласкальна ад «вучыцель»), цельшынцы зусім іншыя людзі. А нашых вам ніхто не пахваліць. Вы ведаеце такое здарэнне? Айцец Кірыл — гэта ўжо гады два таму назад — быў на сенакосе. Распусціў сена, сушыць. А едзе

адзін наш — ёсць тут такі грубіян — проста па бацюшкавым сене! Айцец Кірыл і кажа, падышоўшы: «Ці табе, кажа, дарогі няма, ці не можаш аб'ехаць, што ты па сене з канём топчашся?» А той, нічога не гаворачы, схапіў бацьку за валасы і давай церабіць! Прыходзіць мой бацюшка; як глянула-ж на яго — аж у яго каўтунікі павырываны! Так і лезуць, так і лезуць!

Матушка апавядала гэта проста, нават з нейкім гумарам.

— Народ наш, трэба сказаць праўду, грубы, дзікі. Аднаго толькі ўрадніка і баяцца, аднаго яго і паважаюць. А хто ўжо лепш можа дагадзіць ім, як не а. Кірыл? — зноў казала матушка: — І зямлю ім аддаў, і сенакос, і лякарствы дае, і добрым словам памагае. Ніколі ні ў чым ім не адмаўляе.

Праз поўгадзіны вярнуўся а. Кірыл, утомлены і хмурны.

— Ну, як-жа іх, гадаў, не лаяць? — у гневе прамовіў а. Кірыл: — Чорт ведае, чым кормяць хворую, і гаворыш ім, прыказваеш, не — сваё робяць!.. А гразь!.. Свінні, свінні!

Крыху супакоіўшыся, а. Кірыл сказаў да матушкі ціха:

— Зашлі ты ёй цераз Параску чаго.

— А ўсё-такі, а. Кірыл, вы многа лепшы за тых, хто пра народ гаворыць высокія словы.

Айцец Кірыл махнуў рукою.

— Вось што, другі: будзем абедаць.

VII

Дзервяная сцяна аддзяляла кватэру Лабановіча ад школьнае залы, і, каб папасці туды, трэба было толькі адчыніць нізкаватыя дзверы. Як толькі разднела і ўзышло сонца, пачалі збірацца вучні. Кожны іх крок, кожны рух і вымаўленае слова чуліся ў кватэры настаўніка.

Яшчэ ўчора прайшоўся староста Раман Круглы па вёсцы, заказваючы сялянам пасылаць у школу дзяцей. То таму, то другому, спаткаўшыся па вуліцы, гаварыў ён:

— Пасылайце заўтра дзяцей у школу!

Пры гэтым стараста рабіў сур'ёзную міну і, наогул, меў начальніцкі выгляд. Яго чырвоны кажух з шырокім, як засланка, каўняром з'яўляўся ў розных месцах вуліцы. Калі патрэбныя старасту асобы не сустракаліся, ён падыходзіў да акна, стукаў пальцамі ў шыбы:

— Гэй, Кандрат! Падыдзі-тка сюды!

Калі Кандрата не было ў хаце, стараста падзываў Алену або Параску і таксама строга казаў:

— Пасылайце заўтра дзяцей у школу!

Выпаўніўшы свой абавязак, Раман зайшоў у школу.

— Дома паныч? — ціха запытаў Раман старожку.

— Дома, стараста, дома! — крыху нараспеў прамовіла бабка.

Лабановіч чуў гэту размову.

— Заходзьце, стараста, заходзьце!

Стараста разоў два затрубіў носам. Дзверы ад кухні рыпнулі. Адна палавіна іх адчынілася, а другая затрэслася ад націску шырокага пляча старасты.

Ступіўшы крокі два, Раман перайшоў увесь пакоік-спальню і апынуўся на парозе другога. Кожны яго крок адбіваўся на падлозе мокраю плямаю, а на велізарных лапцішчах ён нёс столькі гразі, што добраму гаспадару і на сахор не выбраць.

— Ну, як маецеся, стараста?

— Хвала богу; паныч як здароў?

— Вось што, стараста: не называйце вы мяне панічом, бо я не паніч, і бацька мой такі-ж самы мужык, як і вы.

Лабановіч папрасіў старасту прысесці на канапу, бо кволае крэсла, якіх тут было ўсяго толькі два, наўрад ці вытрымала-б яго связістае і дзябёлае тулава.

Стараста, па звычаю ўсіх палешукоў, меў доўгія валасы. Рыжая бародка, вузкая і выгінастая, і крыху хмурны погляд спадылба рабілі старасту падобным да званковага караля. Звярнуўшы ўвагу на яго здаравецкі склад, на шырокую расхлістаную грудзіну, на якой яшчэ значыліся сляды летняга загару і адбіткі вятроў, Лабановіч мімаволі ўспомніў яго бацьку Рыгора, які, як зазначыў Сцяпан Рылка, браў старасту на рукі, як хлапчанё.

«Крэпкі народ, хоць і жыве ў балотах», — падумаў Лабановіч.

— Дык ужо вучыцімеце?

— Так, стараста, трэба пачынаць.

— Ну, я ўжо заказаў, каб пасылалі хлопцаў у школу.

— Чаму-ж толькі хлопцаў? Трэба, каб і дзяўчаткі хадзілі.

— Дзе яны пойдуць? — махнуў рукою стараста: — Скажы ім пра школу, дык будуць смяяцца; вельмі дзіўным ім гэта пакажацца. Хоць-бы хлапчукі ўсе пайшлі.

Лабановіч, наколькі мог, тлумачыў старасту, што і дзяўчаткам таксама вучыцца трэба, і даводзіў, скуль гэта патрэба вынікае.

Стараста слухаў, прыплюшчыўшы вочы, і толькі згаджаўся:

— Гэта так, панічок...

— Гэта вы справядліва кажаце.

— А вядома так.

— Што праўда, то праўда.

Але настаўнік бачыў па твары старасты, што ўсе аргументы зусім не пераконвалі яго ў тым, што дзяўчатам трэба навука. Што навука трэба мужчынам (а навуку стараста разумеў, як уменне чытаць, пісанне-ж — ліха яго бяры, без яго можна абыйсціся лягчэй!), стараста не спрачаўся. Справа службы вымагала хадзіць у воласць. А там надаюць яму цэлую кучу розных папер і загадаў. То трэба было павесткі на суд даставіць па прыналежнасці, то нядоімку сыскаць з каго, то лісты перадаць.

У гэтых выпадках у старасты быў асобны парадак. Ён клаў павесткі з павесткамі, лісты з лістамі, нядоімкі з нядоімкамі. І тут галаве яго прыходзілася папрацаваць нямала. Ён распытваў у воласці, каму павесткі, і тут-жа складаў іх у такім парадку, у якім іх трэба перадаць, беручы пад увагу адлегласць. Скажам, павестка для Мікіты Цялушкі, які жыў з гэтага боку вуліцы. Яго павестка клалася першаю, а за ёю ішла другая, трэцяя і так далей. Пасля гэтага стараста запамінаў тых асоб, каму павесткі прызначаліся. Таксама і нядоімкі. На лісты быў іншы парадак. Перш за ўсё іх было нямнога, і канверты былі розныя па колеру і па

велічыні. Вось гэты ў сінім канверце трэба аддаць Гаўрыле Жалезнаму, у белым — Язэпу Нырку, а гэты памяты і засалены — удаве Тэклі... Ну, калі і пераблытаеш іх, не такая ўжо бяда: самі разбяруць, калі будуць чытаць паклоны. Гэта ўжо хутчэй бабы патрапяць.

Забраўшы ўсе паперы, стараста колькі хвілін стаяў і разважаў, як-бы сам сабе здаваў экзамен. Можна было сорак разоў аклікаць яго ці страляць за колькі крокаў ад яго — усё роўна нічога не чуў тады стараста. Здаўшы экзамен, Раман весялеў, з твару сходзіла напружанасць, у якой часта адзначалася пакута, і ўжо звычайным чалавекам ішоў, куды яму было трэба. А калі ў яго памяці гублялася якая-небудзь шрубка, стараста раптоўна спыняўся сярод вуліцы, пазіраў на паперы, пазіраў доўга і напружана. Пры гэтым ён пакручваў галавою і часта страчваў надзею адшукаць гэтую згубленую шрубку. Тады ён зноў вандраваў у воласць і нёс на сваім твары выяўны смутак.

Дзіцячыя галасы гучнелі і мацней даносіліся да кватэры настаўніка. Лабановіч пачуваў лёгкае хваляванне: у гэты дзень твар у твар спаткаецца ён з тымі дзецьмі, якія даручаюцца яму і маральны адказ за якіх ён павінен узяць на сябе. Розныя мыслі аб школе займалі Лабановіча і раней. Цяпер яны захапілі яго яшчэ з большай сілай. Выпаўненне аднае школьнае праграмы яго не здавальняла, і сваё галоўнае назначэнне, як настаўніка, Лабановіч вызначаў так: абудзіць у вучнях і выклікаць да дзеяння крытычны розум, каб да кожнай з'явы і факту яны падыходзілі з пытаннямі — як выніклі? у чым іх прычыны? І, наогул, каб да ўсяго падыходзілі свядома. У гэтым абуджэнні крытычнае думкі Лабановіч бачыў пачаткі таго вялікага сацыяльнага зруху, які павінен пралажыць прасторную дарогу да новых форм жыцця. Бо калі чалавек пачне разважаць, дашуквацца прычын таго стану, у якім ён знаходзіцца, ён напэўна не пагодзіцца са сваёю доляй і будзе старацца адваяваць сабе лепшае месца на свеце. І калі ў чалавека раскрыюцца вочы, ён сам сабе выбера дарогу і сам за сябе будзе несці адказ. Навязваць-жа людзям сваю волю, вымагаць ад іх, каб яны рабілі іменна так, а не іначай, мы не маем права, бо хто можа па-

ручыцца за тое, што мы не памыляемся? Гэтым і тлумачыцца той факт, што розныя правадыры, якія захаплівалі жарам свайго пераканання людскі натоўп і вялі яго за сабою, — вялі толькі да тае граніцы, ад якой пачыналіся перашкоды. Натоўп не разумеў гэтых перашкод, адольваць іх у яго не было ахвоты. На гэтым пункце вынікалі непаразуменні. Правадыр з гарчэчаю ў сэрцы казаў: «О, сляпы, нікчэмны натоўп, статак жывёлін!» А натоўп крычаў: «Ты — ашуканец! Пабіць цябе каменнямі!»

Ужо колькі разоў паглядаў настаўнік на гадзіннік, думаючы, ці не пара яму ў школку.

Праўда, сёння толькі пачатак, толькі збор дзятвы; ён пакуль што азнаёміцца і зробіць запіс у журнал. Усё-ж-такі на сэрцы будзе спакайней: будуць зроблены хоць сталыя крокі да работы.

А дзеці, крыху асвойтаўшыся, пачыналі гусці смялей і весялей. Часамі чулася іх беганка па лаўках, смех і крыкі. Некаторыя ціхенечка падыходзілі да дзвярэй кватэры настаўніка і з найвялікшаю цікавасцю заглядалі ў шчылінкі. Таксама забягалі яны і ў кухню, нібыта напіцца вады. Яны баязліва тапталіся, азіраліся, а некаторыя паціху пыталі ў бабкі:

— А што, бабка, ён сярдзіты?

І калі Лабановіч паказаўся ў кухні, яны, як мышы, загледзеўшы ката, кінуліся наўцёкі.

Старожка залілася вясёлым доўгім смехам: яе вельмі насмяшылі дзеці і іх страх перад настаўнікам. Яна пераказала Лабановічу, як распытвалі пра яго вучні, паціраючы свае вушы, як-бы раней пагадзіўшыся з тым, што іх будуць круціць.

У школьнай зале вучняў было дзесяткі два. Як толькі з'явіўся там Лабановіч, яны завілі з усіх канцоў школы і цясней збіліся ў гурт, як спалоханыя авечкі, і ўжо адтуль пазіралі на свайго настаўніка, як на якое дзіва. Значна большая частка іх былі новыя. Усе вучні былі абуты ў лапці, насілі, як і старыя палешукі, суконныя світкі, чорныя або светлыя. Грудзіны, як і ў бацькоў, былі расхлістаны.

Настаўнік павітаўся, адказ на прывітанне далі колькі хлопчыкаў, якія ўжо вучыліся ў школцы.

— Што-ж вас так мала? — спытаў іх Лабановіч.

— Яшчэ прыдуць, — адказаў адзін са старэйшых.

— Заўтра будзе болей, — дадаў другі.

— А вы, дзеткі, яшчэ першы раз прышлі да школкі? — мякка прамовіў настаўнік да малых.

Тыя спусцілі вочы, і толькі адзін, самы храбры, прамовіў кароткае:

— Але.

VIII

Пагаварыўшы з вучнямі і крыху разагнаўшы іх страх, Лабановіч прынёс журнал і пачаў рабіць запіс. Дзеці смялей падыходзілі да свайго настаўніка і давалі адказы на яго пытанні. Пры гэтым часта выяўлялася прастэча і непасрэднасць дзіцячай істоты, якая вельмі развясельвала настаўніка і ўсю школу, выклікаючы цэлыя выбухі смеху.

— Скажы-ж ты, галубок, — звярнуўся Лабановіч да аднаго хлопчыка, які падышоў запісвацца. — Як ты завешся?

Хлопчык маўчаў і пазіраў на настаўніка сваімі яснымі вочкамі. Відавочна, у гэтым запытанні яму пачулася штось падазронае: ці няма тут якое хітрасці, каб не падашукацца часамі? Запытанне, з яго погляду, было зусім нецікавае і непатрэбнае: хто-ж не ведае, як ён завецца?

Але настаўнік не адступаўся і зноў запытаў, як яго зваць.

— Або ты не ведаеш? — у сваю чаргу спытаў хлопчык.

— Не, не ведаю, бо каб ведаў, то не пытаўся-б.

— Ну, як-жа? Іван, ды і ўсё! — прамовіў громка хлопчык з адценнем лёгкай усерджанасці.

— А цябе як зваць? — спытаў настаўнік другога хлопчыка.

— Лар'ён, — весела адказаў той.

— А як завецца твой бацька?

— Кандрат.

— А як тваё прозвішча?

Хлопчык закрыў рукамі твар і пачаў смяяцца.

— Чаго-ж ты, Лар'ён, смяешся?

— Не знаю, што казаты.

А адзін палешучок, які ўвесь час сядзеў моўчкі, запытаў настаўніка:

— Чаму ты ўсё пытаеш, як мы завямося?

Малады настаўнік стараўся, наколькі мог, бліжэй падысці да дзіцячай душы, заслужыць давер'е вучняў. Іх часта грубаватыя выхадкі ці звароты непасрэдна да яго ён прапускаў між вушэй, ведаючы той грубы асяродак, з якога яны вышлі, і маючы на ўвазе, што з часам усё гэта згладзіцца непрыметна, само сабою, пад уплывам школьнага парадку і ладу, які будзе залежаць, галоўным чынам, ад яго самога. Усе іх памылкі ў гэтым сэнсе ён стараўся выправіць і адзначыць так, каб не пакрыўдзіць і не ўразіць чулае дзіцячае сэрца.

Першыя крокі былі зроблены. Дзеці разварушыліся, павесялелі і вышлі з таго стану замкнёнасці, у якім яны яшчэ так нядаўна былі. Лабановіч, крыху пагутарыўшы, пусціў іх на пераменку. А гэтым часам пад'ехаў і а. Кірыл. Зайшлі ў пакоік настаўніка, пагутарылі пра сёе-тое, пакуль пазбіраліся дзеці. Айцец Кірыл зараз-жа сабраўся і разам з настаўнікам пайшоў у школу. Там ён, не затрымліваючыся, адправіў кароткі малебен, сказаў невялічкае казанне дзецям, у якім клікаў іх да навукі, да паслушэнства і, пажадаўшы здароўя і разумення, даў пацалаваць крыж і акрапіў іх святой вадою.

Пасля малебну настаўнік сказаў вучням перадаць сваім таварышам, каб заўтра ўсе прыходзілі ў школу, і пусціў іх дадому.

З вясёлым шумам і крыкам выбеглі дзеці на вуліцу, напаўняючы яе звонкімі галасамі, і рассыпаліся па хатах. На сваім уласным вопыце пачулі яны, што школа і настаўнік далёка не такія страшныя, як гэта складалася ў іх галаве.

Айцец Кірыл адмовіўся застацца выпіць чаю на дарогу, бо дзень кароткі, а дарога паганая. На развітанне папрасіў ён Лабановіча выкладаць закон божы, бо яму далёка ездзіць сюды.

— А наконт... пенсіі мы пагодзімся, падзелім яе без крыўды.

Настаўнік, хоць і з неахвотаю, згадзіўся.

— Прыязджайце да нас, будзем вельмі рады, — сказаў а. Кірыл, ужо седзячы на каламажцы.

Лабановіч застаўся адзін. У пакоіку стала так ціха, што ён мімаволі звярнуў на гэта ўвагу. І была ў гэтай цішы маркота, якую пачуў ён тут першы раз. Яго пацягнула на свежае паветра, на волю. Тут ён прыпомніў, што сын самага блізкага суседа яго, пана падлоўчага, хоць і мае хадзіць вучыцца, не прышоў. І не прышоў напэўна з тае прычыны, што падлоўчы не лічыў шляхетным пасылаць сына, не пабачыўшыся і не перагаварыўшы з настаўнікам, бо ён тут чалавек новы, незнаёмы. Сам-жа падлоўчы не належаў да тутэйшага насельніцтва, патрэбы якога абслугоўвала гэта школа.

Пасля абеду Лабановіч сабраўся прайсціся. Ен вышаў на двор. На вуліцы было столькі гразі, што перайсці яе ў настаўніка не хапіла адвагі, і ён павярнуў на поле, дзе стаялі два ветракі, і зараз-жа вышаў на вузкую сцежку, якая вяла на чыгунку. Гэта было адзінае месца, дзе можна было хадзіць, не баючыся гразі. Узышоўшы на чыгунку, настаўнік прыпыніўся, як-бы разважаючы, у які канец накіравацца. Вакол было ціха. Далёка беглі ўздоўж дарогі высокія тэлеграфныя слупы з белымі гугачкамі і роўна нацягнутым дротам. Ветру не было, а дрот бесперастанку гуў прыемным звонам, ціхім, аднатонным і жаласным, як казка гэтых панурых лясоў і балот Палесся. З боку раз'езду чыгунка, пралёгшы спачатку раўнюсенечкаю сценкаю, праз вярсту рабіла залом і гублялася дзесь у лесе. У процілежным баку дарога ішла роўна на далёкай адлегласці. Было нават відаць, як выступаў з далечы дамок трэцяй будкі. Адтуль ледзь прыметна пасоўвалася чалавечая постаць. І трудна было вызначыць, куды яна ідзе: сюды ці ў другі бок. Гэтая малюсенькая фігурка адна, здавалася, ажыўляла гэты пануры і ціхі краявід, дзе ўсё як-бы знікла або прытаілася.

— Пайду насустрач, — вырашыў Лабановіч.

Фігурка была так далёка, што мела выгляд тоненькага маленькага калочка. Яна ішла сюды, але трудна было адгадаць, хто гэта быў: мужчына ці кабета. Адлегласць між Лабановічам і фігуркаю змяншалася.

Мінуўшы яшчэ колькі слупоў, настаўнік мог пазнаць, што гэта была кабета, і ён перастаў ёю цікавіцца, а пачаў разглядаць лес і балоты побач дарогі, мосцікі, рачулкі і ўсё, што больш-менш кідалася ў вочы. Настаўнік зусім забыўся аб тым, што яго перш так зацікавіла, звярнуў на гэта ўвагу толькі тады, калі між ім і тым, хто ішоў яму на спатканне, была адлегласць толькі ў два слупы. Цяпер ён заўважыў, што гэта была высокая, стройная дзяўчына, вельмі добра, нават з густам адзетая.

Дзяўчына здалёк колькі разоў бачліва акідвала позглядам незнаёмага маладога хлопца, а падышоўшы бліжэй, апусціла вочы. Лабановіч таксама не лічыў далікатным разглядаць яе. Але як толькі яны параўняліся, дык зірнулі адно на аднаго, і погляды іх спаткаліся. Незнаёмая дзяўчына, як-бы спалохаўшыся, зноў борздзенька апусціла свае чорныя, як смоль, вочы. Лабановіч, зблізку ўбачыўшы яе твар з бліскучымі прадаўгаватымі вачамі, злёгку здрыгануўся: дзяўчына была незвычайна прыгожая. Прайшоўшы крокі тры-чатыры, Лабановіч азірнуўся, каб яшчэ раз глянуць на яе. Тое самае зрабіла і зацікавіўшая яго дзяўчына. Яна, мусіць, не спадзявалася выдаць сябе такім чынам, і з губ яе сама сабою збегла прыемная і павабная ўсмешка, пасля чаго дзяўчына пайшла шпарчэй і ўжо не аглядалася.

Лабановіч, як прычараваны, стаяў колькі хвілін і ўсё пазіраў на яе. Яму было прыемна, нейкая радасць разлівалася ў крыві. Ён пайшоў далей, думаючы аб гэтай незнаёмай дзяўчыне. Яе чорныя вочы, белы твар і гэта чароўная ўсмешка так і стаялі перад ім, як намаляваныя. «Хто-ж-бы гэта была такая?» — пытаў ён сябе. Гэта, напэўна, з будкі, тая дзяўчына, аб якой казала яму бабка. Відаць, яна ішла ў вёску да крамніка, каб купіць чаго. «Трэба было, — думаў ён, — пазнаёміцца і правесці яе да вёскі». Ён пачынаў наракаць на сябе за сваю нясмеласць. Іншы на яго месцы знайшоў-бы дваццаць зачэпак, каб звярнуцца да яе далікатна і проста і такім чынам пазнаёміцца, супраць чаго яна, напэўна, нічога не мела-б.

Узважыўшы ўсё за і супраць, Лабановіч прышоў да перакanання, што ён зрабіў добра, не зачапіўшы дзяўчы-

ны. А вось, калі зноў спаткае яе, як сёння, адзін на адзін, тады няіменна павітаецца, бо яны ўжо як-бы крыху знаёмыя. Дайшоўшы да трэцяй будкі, Лабановіч вярнуўся назад у надзеі, што ён зноў сустрэне дзяўчыну на дарозе. Ён прайшоў адну будку і другую, мінуў ужо і пераезд каля свайго сяла, але дзяўчыны нідзе не спаткаў. Ці не пайшла яна на раз'езд, сабраўшыся куды-небудзь паехаць? А можа, яна зусім не тутэйшая і больш ніколі не з'явіцца тут? Але ў яго душы надоўга застанецца гэты прыгожы вобраз дзявочае красы. Лабановічу стала чагось шкада, як-бы ад яго нешта адарвалася і знікла.

У лесе і ў палях пачынала цямнець, шэры асенні вечар борзда апускаўся на зямлю; разам з ім і нейкі смутак лажыўся на гэтыя пацямнелыя далі. Уся мясцовасць змяніла выгляд, як-бы замкнулася ў сабе самой, аддаўшыся выключна сваім думкам і свайму настрою, а ўсё іншае для яе стала чужым і нецікавым.

Лабановіч дайшоў да сцежачкі каля ветракоў і накіраваўся ў школу.

IX

Пан падлоўчы быў родам дзесь з Гродзеншчыны і паходзіў, як ён казаў сам, са старога дваранскага роду. Тутэйшае жыхарства лічыла яго палякам, сам-жа пан падлоўчы з гэтым не згаджаўся.

«Я — ліцвін», — з нейкаю гордасцю зазначаў пан падлоўчы, і сваю належнасць да ліцвіноў даводзіў, паміж іншым, і тым, што яго прозвішча — Баранкевіч — мела канчатак на «іч», тады як чыста польскія прозвішчы канчаюцца на «скі»: Жулаўскі, Дамброўскі, Галонскі. Даведаўшыся, што прозвішча новага настаўніка Лабановіч, падлоўчы пры спатканні з ім прыметна выказаў адзнакі здавальнення, як гэта бывае тады, калі нам на чужыне прыходзіцца спаткацца з земляком.

— То і пан — ліцвін! — весела сказаў ён маладому настаўніку і пастукаў яго па плячы. Сваё ліцвінства ён падкрэсліваў пры кожным зручным выпадку, кажучы: «Мы, ліцвіны, любім піць гладка!»

Лабановічу, калі ў яго чарцы заставалася недапітая гарэлка, ён таксама казаў:

— А яшчэ ліцвін!.. Ну, які-ж ты пасля гэтага ліцвін! — Пан падлоўчы з дакорам пазіраў у вочы настаўніку: — Не псуй ты мне, братка, кампаніі!

Калі-ж гэты аргумент не памагаў, то пан Баранкевіч прыводзіў другі:

— Ты лепш, браток, падашукай маю жонку, але не ашуквай мяне за чаркаю гарэлкі.

Трэці аргумент, самы моцны і ўжо самы апошні, быў такі:

— Пі! Пі, кажу, бо далі-бог вылью за каўнер!

Гаварыў падлоўчы Баранкевіч найбольш добраю беларускаю моваю. І трэба адзначыць, што ён ні ў якім разе не быў п'яніца, ён проста любіў выпіць «з добрымі людзьмі», а сам адзін і чаркі не выпіваў. Але і ў кампаніі «добрых людзей» ніколі не перабіраў меры. У яго была тут пэўная граніца, якой ён ніколі не пераступаў і за якую яго нельга было вывесці ніякімі сіламі. Што-ж тычыцца яго ліцвіналюбства, дык яно яшчэ выяўлялася і ў тым, што ён вельмі любіў літоўскія калдуны. І гэтых калдуноў, як запэўняў пан падлоўчы, ён з'еў аднойчы сто сорак штук.

— Разумеецца, пры гарэлцы, — дадаваў пры гэтым Баранкевіч.

Першы раз Лабановіч зайшоў да падлоўчага вечарам таго-ж самага дня, калі хадзіў гуляць на чыгунку.

Баранкевіч спаткаў суседа-настаўніка прыветна і павёў яго ў чыстую палавіну дома, дзе ён звычайна прымаў гасцей. Пакой быў прасторны, чысты, акуратна выбелены. Каля аднае сцяны стаяла канапа і вялікі просты стол каля яе, засланы белым настольнікам. На невялічкім століку недалёка ад канапы стаяла скрыначка, музычны струмант, якую падлоўчы і пускаў у работу, каб забавіць гасцей. Апроч яшчэ аднае канапкі каля другой сцяны і некалькіх простых крэслаў, у пакоі гэтым больш не было нічога, і ён выглядаў пуставата.

— Сядайце, паночку, — папрасіў Баранкевіч госця і патрактаваў яго моцнаю папяросаю.

Гаспадар і госць разгаварыліся, прычым пан падлоўчы быў першы чалавек тут, ад якога Лабановіч пачуў доб-

рае слова наконт гэтага месца, якое мела той вялікі козыр, што ляжала каля чыгункі. Прайшоўшыся колькі разоў па пакоі, пан падлоўчы гукнуў, павярнуўшыся да другое палавіны дома:

— Габрынька!

— Зараз, татка! — адгукнуўся ў глыбі дома звонкі дзявочы галасок.

Следам за гэтым пачуліся лёгкія і частыя крокі, і ў пакой увайшла малодшая дачка пана падлоўчага. Такімі-ж борздымі крокамі падышла яна і да госця, працягнула яму сваю яшчэ дзіцячую руку, зрабіўшы прысяданне, якое Лабановіч бачыў першы раз. Ён нават спалохаўся: яму здалося, што гэта маленькая паненачка прысела ад таго, што ён наўмысля наступіў ёй на нагу.

— Чэсю! — зноў гукнуў падлоўчы.

Крыху счакаўшы, скробаючы ботамі, у пакой увайшоў меншы сын Баранкевіча, хлопчык гадоў дзевяці, даволі панурага выгляду, з вялікаю кучараваю галавою і прыгожым тварам. Паздароўкаўшыся з настаўнікам, Чэсь моўчкі сеў каля кахлянае печы і адтуль, як ваўчок, прыглядаўся да настаўніка.

Папрасіўшы прабачэння, падлоўчы адлучыўся, пакінуўшы Лабановіча з дачкою і сынам.

Панна Габрыня, смуглая, строгая і сур'ёзная дзяўчынка-падлетак, звярнулася да Лабановіча з прыветнаю ўсмешкаю:

— Пан любіць музыку?

— Вельмі люблю, — прамовіў Лабановіч.

Габрыня падышла да музычнай скрыначкі, выбрала металічны кружок, прыладзіла яго да скрыначкі, завяла яе і пусціла.

Мяккія, ласкавыя гукі стройным сугалоссем паліліся па пакоі, напаўняючы яго прыемным звонам і навяваючы якіясь добрыя, ціхія чары. Няясныя вобразы ўсплывалі самі сабою, аб чымсі казалі і клікалі невядома куды, а на сэрцы аставалася пачуванне ўтраты чагось далёкага, чаго ўжо не вернеш ніколі і аб чым можна толькі ўспамінаць. Усе-ж дробязі жыцця, увесь будзённы клопат, мут душы, — усё гэта знікала, адступала перад чарамі хараства. Скуль-жа гэты смутак? Аб чым ён? Ці не ёсць гэта тое няяснае адчуванне ха-

раства жыцця, якое так бязлітасна, так груба папіхаецца нагамі, таго хараства, што падымае чалавека над балотам людское сумятні?

Хвілін праз колькі вярнуўся пан падлоўчы, а потым прышла пані падлоўчая — другая яго жонка. Гэта была кабета ціхая, забітая, бо пан Баранкевіч, як даведаўся Лабановіч потым, у сям'і быў чалавек жорсткі.

Габрыня зараз-жа вышла і хутка вярнулася з сястрой, стройнаю чарняваю дзяўчынаю, гадоў шаснаццаці, з тонкімі прыгожа абрысаванымі брывамі. Выраз яе цёмных акруглых вачэй часта змяняўся: то ў іх іскрыўся вясёлы смех і нахіл да жартлівасці, то адбівалася нейкае засмучэнне і тая сталасць, што рабіла ўражанне, быццам дзяўчына многа перадумала і перажыла.

Размову вялі галоўным чынам падлоўчы з настаўнікам, а ўсе іншыя слухалі і толькі зрэдку ўстаўлялі свае слова. Было відаць, што прысутнасць падлоўчага стрымлівала іх, прымушала трымацца нейкіх граніц, якія з'яўляліся вынікам практыкі сумеснага жыцця.

Баранкевіч вельмі ўспагадна ўспамінаў настаўніка, якога змяніў Лабановіч.

— Што мне падабаецца ў пана Турсевіча, дык гэта тое, што ён умеў паставіць сябе ў кожным коле грамадства і меў свой асабісты гонар, — сказаў падлоўчы.

— Турсевіч — гэта мой настаўнік і мой зямляк, аднае воласці. Я лічу яго адным з выдатнейшых настаўнікаў і працаўнікоў. Ён не толькі вядзе добра справу ў школе, але і многа працуе над самім сабою; чалавек многа чытаў і многа думаў. Гэта адзін з тых маіх сяброў, якіх я вельмі шаную і паважаю.

— Як-жа, паночку, ён быў панскім настаўнікам? Здаецца, розніца ў вашых гадах не такая вялікая? — запытаўся Баранкевіч.

— Ён старэйшы ад мяне гадоў на чатыры. Калі ён скончыў першую школку, то я яшчэ пачынаў толькі вучыцца. Ён цэлую зіму быў маім дарэктарам, маім і маіх братоў.

— А, хіба што так.

— Дык пан добра знае пана Турсевіча? — спытала пані падлоўчая: — Ах, які гэта быў рэдкі чалавек! — дадала

яна і зірнула на мужа, як-бы хочучы прачытаць на яго твары, ці добра яна сказала.

— Пан Турсевіч у школе быў строгі, — адгукнуўся малы Чэсь з-пад кахлянае печы.

Баранкевіч павярнуў галаву ў бок сына і, смеючыся, прамовіў:

— А што-ж з вамі іначай зробіш? Дай вам волю, дык вы і школу павернеце, і толку з вас ніякага не будзе.

Паненкі засмяяліся.

— Я, вось, буду прасіць пана настаўніка, каб цябе часцей на калені ставіць ды яшчэ грэчкі падсыпаць.

— У пана настаўніка і грэчкі няма, — сказала Ядвіся і ўскінула на настаўніка свае вясёлыя смяшлівыя вочы.

Лабановіч зірнуў на яе. «Слаўная дзяўчынка», — падумаў ён.

— Ну, то я прышлю, цэлую асміну прышлю, — сказаў падлоўчы.

— Чэсь будзе такі добры ў мяне вучань, што да грэчкі ў нас не дойдзе. Праўда, Чэсю?

Сёстры зноў засмяяліся. Чэся яны знаді лепей і, як відаць, схіляліся да погляду таткі наконта грэчкі.

Чэсь-жа ўгнуў галаву, не зусім пэўны ў тым, што для яго справа можа абыйсціся без грэчкі.

— Ну, як там гарбата? — спытаў Баранкевіч жонку.

Пані падлоўчая зараз-жа ўстала, кіўнула Габрыні і вышла разам з ёю.

Стол заслалі, прынеслі талеркі з вяндлінаю, якую так добра ўмеюць прыгатаўляць на Беларусі, і селі піць чай. Лабановіч пачуваўся добра і вольна і ўвесь час вёў размову то з гаспадарамі, то з паненкамі. Пан падлоўчы, выпіўшы шклянку, устаў, папрасіў прабачэння, што не можа больш заставацца, што ён мусіць ехаць па службе, і вышаў.

Пасля гэтага паненкі пачулі сябе вальней. Яны смяяліся, жартавалі, распытвалі настаўніка аб усім: ці быў ён у воласці, з кім там пазнаёміўся і як каго знаходзіць.

— А вы не знаеце панны Марыны? — запытала настаўніка Ядвіся.

— А хто яна такая? — спытаў Лабановіч.

— А тут на будцы ёсць адна панна.

— Я сёння спаткаў адну вельмі прыгожую дзяў-

чыну якраз на чыгунцы. Можа, гэта і ёсць панна Марына?

— Так, гэта яна, — прамовіла Ядвіся, распытаўшыся, як яна выглядае.

Паненкі на развітанне колькі разоў напаміналі Лабановічу, каб ён часцей заходзіў да іх.

X

Якраз за дзень да ўводзін прасвятое багародзіцы, свята, якое прыпадае на 21 лістапада, у вёсцы Цельшына паўстала вельмі важнае пытанне аб тым, калі святкаваць гэта свята: сёння ці заўтра? І паўстала гэта пытанне, як зазвычай усе важныя пытанні, выпадкова.

Старая Лукашыха, Аўгеня, прышла да свае суседкі Югасі пазычыць падсітак прасеяць мукі. Прышла яна якраз у той час, калі трэба ўжо тушыць у хаце агонь. Аўгеня зразу-ж звярнула ўвагу, што ў хаце суседкі былі ўсе адзнакі свята: прасніцы вынесены вон, мужчыны не ўсе яшчэ былі абуты, а сама Югася падбівала цеста на аладкі і печы не падпальвала.

— Што-ж гэта ў вас, дзеўка, як-бы свята?

У Цельшыне быў такі звычай, што адна старая жанчына, зварачаючыся да другой, казала ёй «дзеўка».

— А хіба-ж не свята? — прамовіла Югася і зірнула на суседку.

— Як свята? Што ты, дзеўка, гаворыш?!

— А так што свята! — цвёрда і пэўна адказала Югася.

— Ах, божачка мілы! А я-ж думала, што заўтра! — ускінула рукамі Аўгеня: — Лукаш мой даўно пайшоў у клуню малаціць грэчку!.. І сама я ўсю раніцу прала!.. А-а, як-жа я гэта думала, што свята заўтра? Ах, матачкі мае родныя!

Аўгеня борздзенька павярнулася і вышла з хаты, нават і падсітак забылася пазычыць. Вышаўшы на вуліцу, яна на хвілінку прыпынілася, а потым раптоўна кінулася да Нупрэя Бабка.

— Што я прышла ў вас спытаць: сёння свята ці заўтра? — запытала Аўгеня і акінула вачамі хату.

Нупрэй зусім яшчэ не падымаўся, ляжаў спінаю на

печы і грэўся, як кот, падкурчыўшы доўгія ногі, бо яны, хоць печ была і прасторная, не маглі на ёй як мае быць змясціцца.

— А пэўне, сёння, — адказаў ён з печы.

Праўда, Нупрэеў голас вялікага аўтарытэту нідзе нагогул не меў, а ў пытаннях свята тым болей, бо Нупрэй Бабок нічога не меў проці таго, каб святкаваць і будныя дні. Але і Маланння, жонка яго, таксама пасведчыла, што свята сёння.

— Ах, матухны, — зноў пляснула рукамі Аўгеня: — Усе людзі святкуюць, адна я, як тая дурная калатоўка, соваюся: ні свята, ні спакою не бачу. — І яна ледзь не бягом вымелася з хаты і пабегла дамоў.

Надта знаёмае тухканне ў Міколкі Стукача адразу затрымала Аўгеню на месцы: калі сёння свята, дык чаму-ж у Стукача таўкуць ячмень?

Не думаючы доўга, Аўгеня кінулася да Стукачовых. Першае, што ўбачыла яна там, была ступа і дзве маладзіцы, нявесткі дзеда Стукача: маладзіцы стаялі адна насупраць другой з таўкачамі і заложна таўклі куццю. Міколка Стукач, лысы дзед з сівою бародкаю, падплятаў лапаць. Бабка Стукачыха прала кудзелю. Грук таўкачоў глуха аддаваўся па хаце, і пасля кожнага ўдару штось бразгацела на паліцы, дзе стаялі міскі з лыжкамі.

Здзіўленая Аўгеня спынілася на парозе.

— А хіба-ж сёння не свята? — спытала яна.

— Якое свята? — сярдзіта зірнуў на яе дзед Міколка.

— Вось, скажэце, мае мілыя: як-бы хто туману напусціў, — прамовіла Аўгеня, збітая з тропу: — Адны святкуюць, другія кажуць, што свята няма.

— Хто святкуе? — запытала бабка Тацяна.

— Я і сама думала, што свята павінна быць заўтра, аж прыходжу да Рамковых — святкуюць, Югася аладкі падбівае; зайшла да Бабковых — і там святкуюць. Прыходжу да вас, — у вас тут будны дзень. Каму-ж верыць?

— А можа, і сёння свята, — ужо іншым тонам пачаў разважаць дзед Стукач.

Маладзіцы прыпынілі работу. Адна абаперлася на таўкач, не вымаючы яго са ступы, а другая трымала таўкач у руцэ. Яны таксама задумаліся.

— Уводзіны святкуюць на восьмай нядзелі ад Пак-

роў, — вылічала бабка Тацяна: — Колькі-ж гэта нядзель ад Пакроў?

— Ну, якраз восьмая нядзеля і пайшла, — сказала Аўгеня.

— Мабыць, свята-такі сёння, — пасля развагі прамовіў дзед Стукач, кінуўшы на зямлю лапаць, і пачухаў галаву ніжэй лысіны.

— Матка! А калі гэта да нас Шпак з будкі прыходзіў? — спытала адна маладзіца сваю свякроў, бабку Тацяну. — Тады казалі, што да гэтага свята засталося адзінаццаць дзён.

Дзед Стукач, бабка Тацяна, нявесткі і старэйшы сын Стукача, Апанас, пачалі вылічаць, калі ў іх быў Шпак з будкі. Выходзіла, што адзінаццаць дзён якраз прайшло. Бабка Тацяна вынесла сваю прасніцу, маладзіца Мар'яна сказала, што куцця ўжо даўно стаўклася; крупы выбралі, а ступу выкацілі вон у сені. Раз свята, дык свята. Аўгеня пайшла дадому, пэўная ў тым, што сёння свята. Не заходзячы ў хату, яна заскочыла да Лукаша ў клуню і накрычала на яго, што ён не святкуе і яе збіў і ўвёў у грэх.

— Ты-ж паслухай, стары пень, ці малоціць хто?

Югасю, у сваю чаргу, занепакоіла старая Лукашыха: а можа, і праўда, што заўтра свята? Накінуўшы кажух, яна пайшла да свае кумы Насты. Наста цвёрда вяла падлік святам і строга сачыла за квадрамі месяца.

— Я ўжо чула, што некаторыя збіраюцца святкаваць сёння, але свята, я напэўна ведаю, заўтра. Піліпавы хлопцы ўжо даўно паехалі ў лес з сякерамі.

Не прайшло і чвэрці гадзіны, як па ўсёй вёсцы толькі і было гутаркі, што пра свята, пры гэтым ясна адзначыліся два станы: святочны і будны. Кожны стан меў вельмі паважных прадстаўнікоў свайго кірунку, што ніякім чынам не маглі дайсці да згоды, бо кожная рука мела вельмі моцныя доказы, на якіх засноўваліся іх пазіцыі наконт свята.

Самы рух пачаўся тады, як пачынала ўжо ўсходзіць сонца. На працягу ўсяе вуліцы то там, то сям стаялі кучкі палешукоў і паляшучак, дзе меншыя, дзе большыя, і ў кожнай кучцы ішла спрэчка аб святце. Усе цель-

шынскія законнікі і законніцы сышліся тут і горача судзілі погляды супрацiўнага стану.

Мікіта Тарпак, вылажыўшы ўсе доказы за заўтрашні дзень і ніколечкі не зрушыўшы станоўкасці поглядаў сваіх супярэчнікаў, плюнуў, сярдзіта павярнуўся і пайшоў да свайго двара. Яго рашучая хада і выраз твару ясна казалі, што ён надумаўся зрабіць нешта такое, што павінна стварыць моцнае ўражанне і прынізіць тых, хто быў не згодзен з ім. Ён выцягнуў панарады, палажыў на іх дошкі і стаў навальваць гной, хоць вывозіць яго цяпер ніколі не меў на ўвазе. Наклаўшы воз гною, ён запрог каня і важна паехаў уздоўж вуліцы, высока паставіўшы сахор. Пад'ехаўшы да тае кучкі народу, дзе ён нядаўна вёў дарэмную спрэчку, Мікіта прыпыніўся і стаў папраўляць хамут, не зварачаючы ні на кога ўвагі, усё роўна як-бы гэта была яго звычайная работа. Як толькі Мікіта павярнуў з вуліцы ў поле, зараз-жа, з таго боку, адкуль ён выехаў, каля студні, пачуліся два жаночыя крыклівыя галасы. Галасы ўсё мацнелі і набіралі болей злосці. Гэта лаялася Аўдоля Латачыха з жонкаю Мікіты, Акуляю. Яны даўно ўжо былі не ў ладах, цяпер-жа гэта свята сталася зачэпкаю для таго, каб даць волю языкам. Латачыха сыпала словы, як гарох. Мусіць, не раз практыкавалася яна ў сваіх мыслях у гэтай лаянцы. Здавалася, яна толькі адчыніла рот, а словы самі, як з мяшка, сыпаліся і сыпаліся. Акуля не паддавалася. Жанкі крычалі то па чарзе, то адначасна. Палаяўшыся з поўгадзіны каля студні, яны разышліся: адна пайшла ў адзін канец вуліцы, другая — у другі, бо ім збрыдла лаяцца, і гэта не давала жаданых вынікаў. І, каб дапячы адна другой, яны пайшлі па вёсцы выстаўляць адна другую перад людзьмі. Тут мелася на ўвазе, галоўным чынам, вастрэй падцяць свайго ворага.

— Ах ты, чортава шлюндра! Пайшла па вуліцы зубамі званіць, языком мянціць, каб ён табе высах ды выпетраў, — крычала Акуля. — Ідзі, ідзі, так вось і паверыць табе, брахусе. Думаеш, не ведаюць людзі, як ты да Міхалкі ў клуню бегала, га? Ведаюць людзі, за што цябе Крупеніч з раз'езду гарэлкаю частуе, каб цябе лейцамі частавалі... Ведаюць, не думай таго!.. Ты думаеш, не ведаюць, як ты з дарожным майстрам ночы гуляеш, як

ты ў яго дзесяць рублёў падчапіла!.. Капач ты з-пад цёмнае хмары, хлеба замясіць не ўмееш, хаты ніколі, як людзі, не падмяцеш, каб табе вочы замяло!

Аудоля, у сваю чаргу, ідучы ў другі канец вуліцы, вяла сваё казанне. Жанчыны зрэдку прыслухоўваліся адна да другой і, такім чынам, скарыстоўвалі словы адна другой для далейшай лаянкі.

— На мяне людзі глядзяць, бо я харошая, а на цябе і сабакі пазіраць не хочуць. Зайздросна табе?.. А ты забылася, як цябе бабка Тацяна на сваім дварэ злавіла! Чаго-ж ты хадзіла туды? Чужых курэй сачыць? А гарбузы з гарода ў Рамковых хто цягаў, каб з цябе кішкі павыцягалі? А хто, калі не твой Мікіта, у дзеда Андрэя баранінку краў? Гэтага, можа, не ведаюць людзі, дык няхай-жа ведаюць...

Палешукі стаялі, як строгія і справядлівыя суддзі, але сур'ёзныя твары іх часта рабіліся вясёлымі, і дружныя покаты смеху напаўнялі вуліцу. Пры гэтым палешукі, як па камандзе, адкідалі назад галовы і выпучвалі жываты. Але гэта было толькі ў тых выпадках, калі якаянебудзь з кабет, пераступіўшы ўсякія граніцы жаночага ўшанавання, адпускала штось вельмі жыццёвае і сакавітае. І ўсё-ж-такі вёска не прышла да згоды. Адны святкавалі сёння, другія — заўтра. А некаторыя, каб не ашукацца, святкавалі два дні.

Гэта няяснае пытанне аб сваце адбілася і на школе. Лабановіч, прышоўшы на заняткі, заўважыў, што паловы вучняў няма.

— Чаму-ж вас так мала прышло?

Дзеці перадалі гісторыю спрэчкі аб сваце, а разам з тым і прычыну адсутнасці вучняў.

XI

Работа ў школе наладзілася.

Малады настаўнік укладаў у яе сваю душу і сэрца. Кароткія зімнія дні праходзілі незаметна, іх не хапала на тое, каб як след правесці работу. Як толькі добра развіднялася і была магчымасць весці лекцыі, Лабановіч ішоў у школу, размеркаваўшы сваю работу між чатырох груп.

Многа патрабавалася ўмення на тое, каб кожная група была занята і не сядзела без работы. Многа трэба было энергіі і старання, каб кожная група была зацікаўлена ў сваёй рабоце, каб увесь час трымаць школу на вышыні таго ці іншага настрою. Удзень вучні распускаліся на паўтары гадзіны для абеду. Пасля лекцыі зноў ішлі да самага вечара, пакуль не цямнела. Часта са старэйшымі вучнямі лекцыі вяліся і вечарамі пры лямпе. Потым настаўнік яшчэ доўга сядзеў над сшыткамі і папраўляў іх. Маладых сіл было многа; здавалася, ніколі не вычарпаеш іх, і расходаваліся яны так, як расходуе з восені заможны, але маладасведчаны і непрактычны гаспадар багаты збор ад свае нівы.

Але ў сваёй рабоце чэрпаў малады настаўнік і поўную чару высокага задавальнення, назіраючы, як дзеці набіраліся знання, лёгка асільвалі тое, што яшчэ ўчора здавалася ім незразумелым і трудным. Больш разбітных і здольных любіў ён той любасцю, якая можа быць толькі ў настаўніка да сваіх выхаванцаў. Ім і дазвалялася шмат таго, чаго не павінны былі рабіць звычайныя вучні, бо ў Лабановіча ў школе наогул быў строгі парадак. Хоць патуранне было і шкодна з педагагічнага боку, і Лабановіч гэта ведаў, але падолець гэту сваю слабасць не мог ніякім чынам. З другога боку, трэба сказаць, што ад лепшых вучняў і вымагалася болей. І нейкая ўцеха брала маладога настаўніка, гледзячы на гэтых маленькіх змыслых палешучкоў.

Скончыўшы навучанне і пераглядзеўшы работы вучняў, Лабановіч часта падводзіў падрахункі дню; пры гэтым разважаў ён і аб тым, як абыйсці тыя пахібы і памылкі, якіх так трудна бывае пазбегнуць у школе маладому, малавопытнаму настаўніку. Усе тыя спосабы, якія так гладка і проста апісаны ў метадыках, часта зусім не падыходзілі і не адпавядалі ўмовам школы, трэба было тутжа выдумляць іх самому. А колькі часу прыходзілася траціць на тое, каб дастасаваць мову дзяцей да кніжнае мовы! І колькі смешных і непажаданых выпадкаў вынікала на грунце гэтага непаразумення ў школе, дзе мова мацеры зневажаецца і забіваецца!

Часамі Лабановічу здавалася, што школа адстае, што вынікі дасягнуты нязначныя, і што, наогул, ён ня-

важны настаўнік. Трэба ўжыць тут штось новае, трэба аджывіць школу, бо спосабы яго заняткаў так застарэлі, што напэўна перасталі быць цікавымі для дзяцей. У такія мінуты настрой яго спадаў, яму рабілася не па сабе.

«Трэба будзе даведацца да Турсевіча і пабачыць, як ён вядзе сваю справу», — падумаў Лабановіч і цвёрда вырашыў у першае-ж свята паехаць да свайго старога настаўніка.

Ён абдумаў маршрут. Праўда, маршрут гэты просты: пайсці на раз'езд, як-небудзь сесці на таварны цягнік і паехаць. Ад станцыі яго сябар жыў за вярсты дзве, а язды поўстанцыі. Калі-ж не ўдасца паехаць машынай, дык у яго — маладыя ногі, да хады прывычныя. Развязаўшы пытанне такім чынам, Лабановіч заспакоіўся і хацеў засесці за кнігу.

Якраз увайшла бабка.

— А што, панічыку: чай піць будзеце?

— Чай? — спытаў настаўнік і заспяваў:

Чай, чай,
Прымячай,
Куды чайкі ляцяць!

Бабка падперла рукамі шчокі і пачала смяяцца.

— Смешны вы, панічок, далі-бог!.. Ах, няхай-бы вы здаровенькі былі!

— А ведаеш, бабка, што я надумаўся?

— Бог вас ведае, панічок.

— У гэтую нядзельку, бабка... ці там нікога няма? — ціха і таемна кіўнуў настаўнік у бок кухні.

— Няма, панічыку! — ціха адказала бабка, нарыхтаваўшыся пачуць нешта вельмі цікавае.

— Дык нават, бабка, не ў нядзельку, а ў суботу нанач надумаўся я паехаць у госці да таго паніча!

— А я-ж, панічок, думала, што вы скажаце пра іншае, — сказала, смеючыся, бабка. — Чаму-ж, панічок, не паехаць? Вядома, збярэцеся...

Дзверы ў кухню стукнулі, і туды хтось увайшоў.

— Гэта, мусіць, бабка, да цябе хтось лячыцца прышоў.

Бабка борздзенька павярнулася і ў дзвярах спаткалася з Чэсем.

— Татка прасіў, каб вы зайшлі да нас, — прамовіў Чэсь Лабановічу.

— Добра, Чэсь: я зараз прыду. У вас там, можа, хто ёсць?

— Пан Сухавараў з раз'езду.

— Ах, Чэсь! Як-жа гэта ты такую штуку мне ў школе ўдраў? — прыпомніў Лабановіч, як Чэсь, седзячы на лекцыі славянскай мовы, скруціў паперку ў трубачку і засунуў яе ў вуха Кандрату Кругламу.

Чэсь апусціў галаву ў знак свае віны і стаяў панурыўшыся.

— Не рабі ты, брат, так ніколі.

Чэсь вышаў. Крыху счакаўшы, вышаў і Лабановіч.

За сталом у падлоўчага сядзеў памочнік начальніка раз'езду, пан Сухавараў, нежанаты, яшчэ малады хлопец, адзеты ў парадны мундзір; ён падкручваў свае чорныя вусікі. На канапе насупраць яго сядзела панна Ядвіся. Яна была ў прыгожай чырвонай кофтачцы, якая вельмі ішла да яе твару, а чорныя і пышныя валасы яе былі перахвачаны чырвонай стужкай. Панна Ядвіся выглядала вельмі цікаваю і прыгожаю. Цёмныя вочы яе з доўгімі мігаўкамі як-бы рассыпалі праменні. Яна была вясёлая і ў добрым настроі.

Лабановіч падышоў да яе і паздароўкаўся. Панна Ядвіся пазнаёміла яго з памочнікам і запыталася:

— Што гэта вас не відаць?

— А я, бачыце, крыху закапаўся ў школе...

— Уяўляю сабе, якая непрыемнасць сядзець увесь дзень з гэтай вясковай дзятвой. Нанясуць лапцямі гразі, дух цяжкі, — прамовіў Сухавараў.

— Пан Лабановіч закахаўся ў сваю школу, — сказала Ядвіся.

— А можа, у вас, панна Ядвіга? — запытаў памочнік і ўскінуў на яе свае алавяныя вочы.

Відаць было, што памочнік хацеў завалодаць адзін увагаю панны Ядвісі, а настаўніка адцерці. Ён лічыў сябе вельмі цікавым кавалерам, з якім такому настаўніку змагацца ніякім чынам немагчыма.

— О, не! У пана Лабановіча ёсць больш шчаслівейшая ад мяне.

Адзін момант Ядвіся памаўчала, як-бы вельмі засмуціўшыся, але з яе вачэй так і сыпаліся іскры смеху.

— Пан Лабановіч аддаў сэрца сваёй бабцы!

Сказала і залілася самым вясёлым сардэчным смехам. Таксама смяяліся і малая Габрынька, і Сухавараў. Смяяўся і пан падлоўчы, які ў гэты момант прышоў да гасцей.

А Ядвіся яшчэ дадала:

— Сядуць з бабкаю каля стала і воркуюць да самай поўначы.

«Аднак-жа ты ахвотніца смяяцца», — падумаў настаўнік і таксама адказаў жартліва:

— Ну, што-ж? Палюбіць маладую і прыгожую кожны патрапіць, а вось закахацца ў старую, гэта ўжо рэч іншая.

— Так, так, — сказаў Сухавараў, — на гэта трэба мець асаблівы талент.

— У пана Лабановіча і ёсць гэты асаблівы талент, — прамовіла Ядвіся.

— Што гэта, паночку, яна да вас прычапілася? — спытаў пан падлоўчы.

— Не ведаю, — адказаў Лабановіч. — На свеце, панесуседзе, бывае так, што хто каго любіць, той таго і чубіць.

— Ха-ха-ха! — засмяяўся пан падлоўчы: — Што, Ядвіська, дастала?

А Ядвіся, як і нібыта таго, спакойна, нават сур'ёзна запыталася:

— А хіба-ж ужо бабка чубіла вас, пане настаўніку?

— Брава! Брава! — запляскаў у ладкі памочнік.

Падлоўчы Баранкевіч громка засмяяўся.

— Дык вас, пане настаўніку, бабка чубіць? — спытаў ён, не перастаючы смяяцца.

За гэтым агульным смехам Лабановічу не ўдалося нічога адказаць, і верх застаўся за паннаю Ядвісяю.

Размова пайшла па другім кірунку, і гаварыў болей памочнік. Гаварыў ён гладка і востра і часта выклікаў вясёлы смех сваіх слухачоў і слухачак. Панна Ядвіся часта ўскідала на яго свае цёмныя выразныя вочы з-пад тонкіх дужак броваў. Лабановіч маўчаў. У яго было такое пачуццё, як-бы ён быў тут зняважаны і пакрыўджаны. А пан Сухавараў вельмі зацікавіў Ядвісю Вільняю і тэат-

рам. Сам ён крыху співаў, але толькі пад гітару. Другі раз абяцаўся ён прысці з гітарай, бо панна Ядвіся яго вельмі прасіла. За ўвесь гэты час яна ні разу не глянула на свайго суседа — Лабановіча.

— А ты, Ядвіська, калі ласка, заспявай, — звярнуўся пан падлоўчы да дачкі.

— Пан Сухавараў смяяцца будзе, — прамовіла Ядвіся, апусціўшы вочы, а потым ускінуўшы іх на памочніка.

— Што вы? Што вы? — усхапіўся Сухавараў, просячы яе заспяваць.

Ядвіся адышла далей у куток каля кахлянай печы і заспявала:

Ці я ў полі не калінаю была?

Голас у яе быў малады, свежы, сакавіты. Спявала яна з такім праўдзівым пачуццём, што рабіла вельмі добрае і прыемнае ўражанне.

Лабановіч слухаў гэтыя спевы, і нейкі жаль ахопліваў яго. Яму хацелася падысці да дзяўчыны і запытаць яе: — «Скажыце, якое гора ў вас на сэрцы?»

Сухавараў многа і доўга хваліў панну Ядвісю, а яна стаяла, апусціўшы вочы, і, здаецца, чакала слова ад Лабановіча. Настаўнік сумыслу не сказаў нічога.

Развітваючыся пасля вячэры, панна Ядвіся была сур'ёзная і не папрасіла суседа заходзіць да іх вечарамі.

XII

Лабановіч пачуў, што на душы ў яго неспакойна. У чым выяўляўся гэты неспакой, ён і сам не мог вызначыць. Не было цяпер і той цэласці і яснасці, з якой жыў ён тут у першыя дні свайго прыезду. То тое, то другое пачынала забіваць душу, адцягваць і раскідаць яго ўвагу, і ён як-бы падзяляўся на асобныя часткі, якія не мелі цеснай сувязі між сабою. Нейкае нездаваленне псавала яго добры настрой.

Лабановіч доўга хадзіў па пакоіку, намячаючы больш-менш сталы і пэўны лад свайго жыцця. Трэба глыбей увайсці ў сябе самога і заняцца чым-небудзь болей важным і сур'ёзным, не траціць час на такое глупства, як марнаванне вечароў у кампаніі асоб накшталт Сухаварава, які нават нічога добрага не бачыць у яго школьнай рабоце. Сухавараў яму не спадабаўся. «Хлюст» — назваў

яго ў думках настаўнік, уявіўшы сабе яго воблік, яго ласыя вочы, якімі ён аглядаў панну Ядвісю, яго крыху звіслую губу. «Грош яму цана!»

Настаўнік доўга хадзіў па пакоіку. Калі набліжаўся ён да лямпы або адыходзіўся ад яе, цень яго то падаўжаўся, то карацеў, а ў стыках сцяны і столі борздзенька пераломваўся і забягаў на столь. Колькі разоў мімаволі вочы яго ўзнімаліся на вокны пана падлоўчага. Яшчэ думаў настаўнік і аб панне Ядвісі. Можа, і Сухаварава не ўпадабаў ён за тое, што яна аддавала відочную перавагу яму...

«Э, глупства! — перапыніў настаўнік свае думкі. — Трэба абавязкова паехаць да сябра і крыху праветрыцца і скінуць той фуз, які патрошку пачынае ўжо набірацца».

Але задуманую паездку прыйшлося адлажыць. На другі-ж дзень зайшоў арцельны стараста Бабініч, пазнаёміўся з ім і вельмі прасіў да сябе ў госці на чацвёртую будку. Стараста Бабініч меўся пасланць у школу да Лабановіча сваіх дзяцей — сына і дачку. А вучні з чыгункі былі платныя, складалі, такім чынам, даход настаўніку. Пенсія настаўніка была надта малая, і кожны вучань з боку быў значнай дапамогай у грашовых справах. Ніякія довады Лабановіча за тое, што ён мусіць паехаць да сябра, Бабініч не браў пад увагу.

— Паспееце пабыць і ў сябра. Пабудзеце ў мяне, а вечарам і да сябра паедзеце, тым болей, што свят назбіралася многа.

Бабініч належаў да тых людзей, якія не так-та лёгка адступаюцца ад сваіх планаў. Ён да таго часу не пакінуў Лабановіча, пакуль не ўзяў з яго слова быць у гасцях.

Як толькі Бабініч вышаў, у пакоік увайшла старожка.

— Напэўна, панічку, арцельны ў госці запрашаў? — спытала яна.

— А скуль ты, бабка, гэта ведаеш?

— А як-жа, панічок: ён будзе сваіх дзяцей да вас аддаваць. Мне жонка яго ўжо казала аб гэтым. А стараста такі чалавек, што любіць аддзякаваць. І пачастуе, і заплаціць.

Бабка ведала ўсіх будачнікаў па адзін і па другі бок раз'езду і вельмі раіла пагасцяваць у Бабініча.

— Вельмі добрыя людзі, — казала яна.

— Што-ж? Нічога не зробіш, бабка: трэба папакутаваць — пайду.

— Якая-ж гэта пакута? От, паніч! І вып'еце, і закусіце.

— А ты, бабка, любіш выпіць?

— А хто-ж яго не любіць, панічыку? Калі трапляецца, то чаму-ж не выпіць?

У першы святочны дзянёк вышаў настаўнік на знаёмую яму сцежку, каля двух ветракоў, і пайшоў на чыгунку. Гэта месца вельмі падабалася Лабановічу, і хоць ён даваў кругу, ідучы тут, але часу заставалася яшчэ многа, спяшацца яму не было куды. На чыгунцы ён затрымаўся. Хацелася пайсці ў бок раз'езду, ісці доўга-доўга па гэтых шпалах між развіслых, шырокіх лазовых кустоў, хмызняку і лесу.

Было зусім ціха. Распагодзілася. Нізка стаяла асенняе сонца, і нейкаю маркотаю патыхала ад усяго гэтага цеснага краявіду і ад гэтае вёсачкі, закінутай між балот і лясоў.

Каротка і адрывіста раўнуў паравоз на раз'ездзе, ціхенька здрыгануліся рэйкі, і нейкі лёгкі, ледзь чутны шолах прабег па іх, як-бы яны аб чымсі перамаўляліся між сабою. І зараз-жа на заломе выбухнуў велізарны клуб белаватага дыму, за ім выкідаліся другія клубкі, следам за гэтым паказаўся паравоз кур'ерскага поезда. Клубчасты, кучаравы хвост дыму ўсё падаўжаўся, шырыўся і, здавалася, нерухома застыў у марозным паветры, тады як галава яго ўсё выцягалася як-бы са свайго ўласнага цела. Было штось велічнае, магутнае і захопліваючае ў гэтай імклівасці поезда. Мімаволі хацелася схіліць галаву прад геніем чалавечага розуму, атрымаўшага верх над бясконцымі адлегласцямі. Поезд праімчаўся, як змей, абдаўшы віхрам пылу і дыму настаўніка, адсякаючы за кожную хвіліну цэлую вярсту.

Лабановіч зрушыў з месца і пайшоў у той бок, куды паляцеў і зараз-жа знік магутны поезд. Настаўнік ішоў на чацвёртую будку да Бабініча. За другою будкаю пачынаўся высокі бор, і месца было больш сухое і вясёлае. Настаўнік падышоў да таго месца, дзе спаткаўся з незнаёмаю дзяўчынаю. Ён часта думаў аб ёй, але ні ў кога не пытаўся пра яе, бо людзі ў такіх выпадках заўсёды схільны ахаяць і кінуць хоць маленькі камячок гразі на

тое, што для цябе з'яўляецца святым і недатыкальным. Толькі з паннаю Ядвісяю, і то між іншым, была аб ёй гутарка. Сёння ён напэўна як-небудзь даведаецца аб ёй. А можа, яна будзе таксама ў гасцях? А калі гэта зусім не тая дзяўчына?

Ідучы каля трэцяе будкі, дзе жыў Курульчук, Лабановіч кінуў бачлівы погляд, але там было ціха, нікога не відаць. Другая будка, чацвёртая ад сяла, была не больш, як за поўвярсты ад трэцяе.

— Калі ласка! Калі ласка!— спаткаў стараста настаўніка на ганачку і павёў яго ў будку.

Маленькая знадворку, будка ўсярэдзіне была досыць памястоўная. У ёй была кухня, праходны пакойчык і яшчэ два пакойчыкі, шмат прастарнейшыя, светлыя і чыстыя.

У пакоіку Лабановіча спаткала гаспадыня, нізкая жанчына. Па яе фігуры адразу трудна было вызначыць, што перамагае ў ёй: таўшчыня ці вышыня.

Гасцей было чалавек восем. Тры мужчыны і кабеты. З боку камоды каля аконца сядзела тая самая дзяўчына, з якою спаткаўся Лабановіч, гуляючы па чыгунцы. Вітаючыся з гасцямі, настаўнік, убачыўшы панну Марыну,— бо гэта была яна, — мімаволі спыніўся на адзін момант перад ёю: гэты незвычайна прыгожы твар як-бы прычараваў яго. Разгледзеўшы панну Марыну зблізку, Лабановіч знайшоў, што такой слаўнай дзяўчыны ён яшчэ ні разу не бачыў. Цёмныя чыстыя вочы, крыху як-бы чымся засмучоныя, пазіралі так панадна і з такою дабратою, што ад іх погляду рабілася лёгка на сэрцы! На высокі белы лоб навісалі чорныя-чорныя валасы і дадавалі яе твару яшчэ больш хараства. Тонкія замкнёныя вусны рабілі твар дзяўчыны разам з тым і крыху строгім і сур'ёзным.

— Здаецца, гэта з вамі спаткаўся я аднойчы? — спытаў Лабановіч, павітаўшыся з дзяўчынаю.

Панна Марына ўсміхнулася.

— Так, гэта я ішла ў вашу вёску.

— Ну, і моладзь! — сказаў Бабініч: — Як скора патрапляюць яны сустракацца!

Бабініч, відаць, паспеў ужо хапіць колькі чарак, бо язык яго, наогул распушчаны, не ведаў стрымання і пачынаў плявузгаць такія рэчы, ад якіх было сорамна не толь-

кі паненкам і кабетам, але часта і мужчыны апускалі вочы або заходзіліся ад смеху. Бабініч у гэтым сэнсе быў вядомы дзівак і ніякім чынам не мог абыйсціся без таго, каб не ляпнуць чаго пры кабетах. І гэта здольнасць Бабініча асабліва вызначалася тады, калі ён добра выпіваў.

Праз колькі хвілін Бабініч і яго жонка-кадушка запрасілі гасцей за стол. На стале было многа закускі, а яшчэ больш гарэлкі. Гаспадыня прасіла гасцей вельмі далікатна, а гаспадар проста пхаў іх з пагрозамі даць каленам, калі хто не надта шпарка займаў за сталом месца.

— А ты чаго стаіш і топчашся, як таўкач той у ступе? — накінуўся ён на будачніка Лобука.

— Садзіся, Лобук, садзіся! — смяяўся высокі, відны сабою, шырокаплечы Курульчук, швагра панны Марыны.

Госці жыва паселі за стол.

Акінуўшы вокам кампанію і тую гарэлку, якая стаяла на стале, Лабановіч цвёрда пастанавіў не піць, бо нейкае пачуванне засцярогі падказвала яму ўстрымацца. І вось, калі першая чарка дайшла да яго, ён падзякаваў гаспадару і перадаў чарку суседцы, жонцы вакзальнага жандара.

На твары Бабініча намалявалася незвычайнае здзіўленне.

— Хіба-ж вы не п'еце? — панізіўшы чуць не да шэпту голас, прамовіў стараста.

— Не п'ю, — салгаў настаўнік.

— Ні аднюсенькае чарачкі?

— Ніяк не п'ю.

— Госпадзі божа, твая воля! Як-жа гэта можа быць, каб чалавек не піў? Ну, што-ж мне з вамі рабіць?

— Ой, пане настаўніку, у нас няможна, каб гарэлкі не піць, — засмуцілася і гаспадыня. Вы хоць трошачкі, а выпіце.

— Не, не! — загулі і кабеты: — Як-та не выпіць?

Настаўнік стаяў на сваім і не паддаваўся ні на якія ўгаворы.

— Панна Марына! Папрасіце вы. Можа, на вашу просьбу госць зверне ўвагу, — звярнулася да дзяўчыны жандарыха, чырвонашчокая, добрадушная жанчына.

Панна Марына ўсміхнулася і паказала свае белыя, як калядны снег, зубы.

— А нашто-ж прынявольваць чалавека? — сказала яна і зірнула на настаўніка.

— Вялікі вам дзякуй! — пакланіўся ёй Лабановіч.

— Эх, панна Марына, панна Марына! — з дакорам паківала галавою жандарыха і выпіла чарку гарэлкі.

Пасля гэтай замешкі чарка ўжо не ведала спакою. Курульчук праз поўгадзіны зачаў сваю песню, адну з тых, якія ён ведаў і спяваў, дайшоўшы да пэўнага стопню:

Быў сабе з тапорыкам пан Ян.

Кабеты таксама разрумяніліся, як тыя пірагі пад вялікдзень у добрае гаспадыні. Бабініч зусім асалавеў, вочы яго пажаўцелі і варочаліся, як тачыла ў руках няздольнага каваля. Яго плявузгота ўжо не рабіла вялікага ўражання: да яе прыслухаліся і прыцярпеліся, і яна як-бы атрымала тут правы грамадзянскія. На гэта, відаць, звярнуў увагу і сам Бабініч, бо ў яго плявузгоце пачаўся перапалом: з кожным разам забіраўся ён усё далей і далей. Ужо колькі разоў закрывала яму рот жонка і сама рагатала. Падгуляўшыя кабеты заспявалі якуюсь песню, а Бабініч закрычаў на ўвесь пакоік, вымагаючы ўвагі. Кабеты змоўклі, слухаючы, што скажа ён. Бабініч адпусціў такія словы аб іх спяванні, што і прывычныя жанкі паўскакалі з месца.

Панна Марына кудысь схавалася, а сястра яе, жонка Курульчука, угневалася і сказала:

— Не, кумок: не пайду я больш да вас.

— Ну, не буду, не буду, — давячыся дымам махоркі, смехам і кашлем, прамовіў Бабініч: — Не буду, няхай вас халера падушыць!

Лабановічу ўрэшце абрыдла гэта п'яная гульня і гэта гразь распушчанага языка. Яго толькі вельмі дзівіла, як магла быць у такой кампаніі панна Марына. Яму было брыдка і за сябе, і за яе. Устаць і пайсці, што ён ужо колькі разоў памыкаўся зрабіць, Лабановіч не рашыўся, не хочучы пакрыўдзіць гаспадара і гасцей. Ён мусіў дасядзець да вечара, пакуль Бабініч не ўстаў, хістаючыся, і не знік за дзвярамі надоўга.

Разам з Курульчукамі і паннай Марынай вышаў настаўнік ад Бабініча. Курульчукі і панна Марына прасілі яго быць з імі знаёмымі і заходзіць да іх.

XIII

— А вас, панічыку, пыталася паненка, — далажыла бабка настаўніку, як толькі ён вярнуўся з гасцей: — «Дзе-ж, кажа, бабка, твой паніч?» — «Пайшоў, кажу, паненачка, кудысь на чыгунку». — «А я, кажа, хацела папрасіць кніг у паніча».

— Добра, бабка, кніг я выберу.

Лабановіч пакапаўся ў сваіх кнігах і адабраў дзве: томік дробных апавяданняў Караленкі і невялічкае апавяданне Сельмы Лагерлёф «Легенда аднаго дома».

Лабановічу хацелася перадаць кнігі самому, і панна Ядвіся, як дагадваўся настаўнік, напэўна хацела, каб ён сам прынёс іх. Кнігі тут былі толькі, як зачэпка. Лабановіч крыху зафанабэрыўся. «Не, не пайду!» — сказаў ён сам сабе.

— Вось, бабка, кнігі, занясі іх, калі ласка, паненцы.

— Добра, панічок.

Бабка крыху пастаяла, як-бы разважаючы, але нічога не сказала і вышла.

Лабановіч, сказаць праўду, гневаўся на панну Ядвісю — пасля таго вечара, калі быў у пана падлоўчага Сухавараў, — і рашыў не паказвацца там. Апрача таго, вобраз другой дзяўчыны яго моцна зацікавіў і таксама крыху засланяў сабою Ядвісю.

І само сабою напрашалася параўнанне гэтых дзяўчат. Панна Марына, без спрэчкі, мела перавагу над Ядвісяю ў хараств, але разам з гэтым уступала Ядвісі ў разнастайнасці праяўленняў жыцця. Марына была ціхая, сталая і напэўна вельмі добрая душа, але гэта была простая дзяўчына. Адлучыўшы ад Марыны хараство, гэту дзявочую шыльду, ад яе засталося-б мала, тады як Ядвіся была натура больш многалучная, больш жывая, якая яшчэ не выявілася і не сфармавалася ў пэўны характар.

Лабановіч усміхнуўся сам сабе: яму прыпомнілася казка пра асла. Галодны асёл папаў між двух стагоў. Ён спыніўся і пачаў разважаць, да якога стога яму накіравацца. Разважаў да таго часу, пакуль не выпрастаў ногі.

У канцы Лабановіч вывеў такое заключэнне, што

гэтыя дзве дзяўчыны ахаваюць яго ад таго, каб закахацца ў адну з іх, і яму стала весела.

— Занесла, панічыку, вашы кнігі. Паненка дзякавала вам. А чаму, кажа, паніч не прышоў? — сказала, вярнуўшыся, бабка.

Па праўдзе сказаць, настаўніку хацелася пабачыць Ядвісю, тым болей, што пасля таго, як быў там Сухавараў, яны не сустракаліся. І як ні хітрыў ён сам з сабою, як ні тлумачыў гэты факт, але аднаго не мог пабароць у сабе — не думаць аб панне Ядвісі. І што-б ён ні рабіў, аб чым-бы ён ні думаў, не-не дый устане перад ім Ядвіся. І чым бліжэй быў ён да яе, тым больш адчувалася ўлада гэтай дзяўчыны над ім. Калі ён быў у гасцях і бачыў перад сабою другую дзяўчыну, ён ні разу не ўспомніў аб сваёй суседцы. А цяпер, як-бы ў помсту за гэта, вобраз панны Ядвісі стаяў неадступна ў вачах, дражніў яго, кудысь зваў і смяяўся. А вокны ў пакоі пана падлоўчага святлелі прынадным бляскам. Цяпер там, напэўна, адна панна Ядвіся з сястрою, бо пан падлоўчы цэлымі днямі ездзіў прымаць сена ад палешукоў для графа Патоцкага; паненкі, напэўна, разглядалі, а можа, чыталі яго кнігі. Хата пана падлоўчага выглядала так, як-бы хацела сказаць настаўніку: «Хлусіш! Ты ўсё-ж-такі да мяне прыдзеш».

— Што за насланне! — прамовіў сам сабе Лабановіч: — Або ў мяне няма сілы ўзяць сябе на павадок?.. Яловыя шышкі! Сказаў сёння: гарэлкі піць не буду, і не піў. А сказаў не пайду да Ядвісі, значыцца і быць так!

Настаўнік зняў са сцяны скрыпку, настроіў сяк-так струны і пачаў вадзіць па іх смыкам. Іграў ён зусім слаба, але ўзяўся за скрыпку, каб разагнаць думкі. Ён нават імкнуўся выявіць ігрою свой настрой, але з гэтага нічога не вышла. Скрыпка, як зазначыў сабе сам музыка, раўла, нібы галодная жывёліна, загледзеўшы свайго гаспадара. Ён кінуў скрыпку на стол, звярцеў папяросу і, момант падумаўшы, адзеўся, узяў палку і пайшоў.

У кухні каля грубкі стаяла бабка, а на зэдліку пры стале сядзела яе прыяцелька Наста.

— А куды-ж гэта вы, панічок? — запыталася бабка.

— Пайду, бабка, лавіць таго чорта, што твайго Мі-

халку напалохаў, — сур'ёзна адказаў Лабановіч і вышаў на двор.

Ужо даўно звечарэла, і ў хатах усюды свяціліся агні.

У адным канцы сяла, ад пераезду, спявалі вясковыя дзяўчаты, і водгулле іх аднатоннай песні, адбіваючыся дзесь каля чыгункі, даносілася сюды цэлымі хвалямі мяккіх жалобных гукаў. Простыя матывы, крыху змякчаныя адлегласцю, хвалявалі маладога настаўніка, як нейкі няясны прываб, і разам з гэтым паглыблялі яго смутны настрой. Цёмны лес, што стаяў недалёка за вёскай і глядзеў хмурна, як-бы казаў: «Не слухай ты гэтых песень: у іх твая атрута. Уцякай ты адгэтуль — тут усё пранята атрутаю сэрца». Але настаўнік стаяў і слухаў дзявочыя песні.

«Чаму яны такія жаласныя? Чаму мала рознастайнасці ў іх матывах, так мала, што трудна сказаць, аб чым спяваюць дзяўчаты: аб смутку ці радасці, бо калі толькі не пачуеш іх спевы, яны заўсёды невясёлыя? Ці не аднатоннасць тутэйшага краявіду, гэтыя доўгія, бясконцыя дарогі між лясоў і балот адбіліся на іх?»

За колькі крокаў ад Лабановіча, вынырнуўшы з цемнаты, без шуму, як цень, выступіла жаночая постаць. Параўняўшыся з агарожай школы, яна прытрымала крок, пайшла павальней, прыглядаючыся на вокны кватэры настаўніка. Вокны свяціліся: выходзячы, настаўнік забыўся патушыць лямпу.

Угледзеўшы настаўніка ці толькі дагадваючыся аб тым, што гэта ён, жанчына прыбавіла крок, ледзь падаючыся ў бок Лабановіча. Цёмная постаць, крыху адышоўшыся, павярнула назад і накіравалася да настаўніка.

— Вам, мусіць, нявесела аднаму? — спытала жанчына ціха глыбокім маладым голасам, у якім чуўся нейкі прывабны смех.

Лабановіч пачуў, што галава яго закружылася, як-бы ад хмелю, а ў крыві і па ўсім целе нібы прабеглі іскры. Ён быў ужо крыху папярэджан і ведаў, што па глухіх вёсках Палесся, у звязку з так званаю «культураю», сустракаліся такія маладзіцы, якія набіваліся самі на кампанію. Цэлы віхор розных пачуванняў пранёсся ў маладым хлопцу. Але ён перамог сябе і груба адказаў:

— Ці не думаеш ты, што мне было-б весела з табою?

Маладзіца, відаць, не чакала такога адказу. Яе жаночае самалюбства было моцна абражана гэтым грубым адказам і балюча ўшчымлена. Але яна не паказала гэтага.

— Ха-ха-ха! — засмяялася яна спакусным смехам: — Хіба-ж вы святы або калека? — І ўжо другім тонам, з відочнай знявагай дадала: — Вы, можа, думаеце, што я ішла дзеля таго, каб вас развясельваць?

Лабановіч, раз стаўшы на пэўны грунт і пачуўшы сябе таксама ўколатым, ужо не мог змяніць тон і лінію паводзін і ў нейкай злосці, трасучыся, сказаў:

— Няма чаго тут табе паказваць зубы, бо я іх усё роўна не бачу і бачыць не хачу.

Лабановіч чуў, што ён гатоў падскочыць да гэтай спакусніцы, каб пагнаць яе ў шыю. Таксама не ручаўся ён і за іншы вынік, і, каб быць далей ад спакусы і захаваць чыстым сваё імя, як настаўніка, ён борздымі крокамі пайшоў праз вуліцу, накіроўваючыся ў той бок, дзе была старая карчма, якраз па дарозе ў Сяльцо.

Маладзіца хіхікнула ўслед, і да яго даляцелі словы.

— Гэта мужчына: ад бабы ўцёк... Неданосак! Стоптаны лапаць!

Настаўнік ішоў і тросся, як у хвэбры, бо ўся гэта праява яго дужа ўсхвалявала. Як толькі ўлеглася абурэнне, ён пачынаў каяцца ў сваёй грубасці з гэтай незнаёмай жанчынай. Хіба яна вінавата, што яе зрабілі такою розныя прахвосты, пацяробкі культуры? Хіба нельга было-б ухіліцца ад яе больш далікатным спосабам, растлумачыўшы ёй усю гразь і ўвесь бруд гэтага лёгкага заработку? Цяпер яна смяецца і не сціскаецца ў розных мянушках па яго адрасу. І мае права, бо гэта права дала яго грубасць. Ну, што-ж? На другі раз трэба быць больш уважлівым да чалавека, хто-б ён ні быў.

Так разважаючы, дайшоў ён да карчмы, што была пабудавана яшчэ ў даўнейшыя часы, тады, калі аб манапольках нікому не снілася. Цяпер гэта карчма дажывала разам са сваім гаспадаром, старым Абрамам, апошнія дні. Не было патрэбы адбудоўваць карчму і не было каму заступіць месца старога шынкара: сыноў Абрам не меў, а дочкі павыходзілі замуж.

Лабановіч кожны раз, праходзячы тут, мімаволі зва-

рачаў увагу на гэта месца і на гэту заняпалую карчму з пакрыўленымі сценамі і пагнутым дахам. І тое, і другое, як нельга лепей, стасавалася адно з другім. Месца было глухое і пустое, і кожны раз выклікала ў настаўніка адно і тое пачуванне і пакідала адно і тое ўражанне. З чаго яно складалася, і якая была яго сутнасць, выявіць і вызначыць было вельмі трудна, але вынікала гэтае ўражанне, відаць, таму, што ў самой мясціне было нешта варожае, непрыветнае і смутнае па сваім характары. Цікава і тое, што ніхто з сялян не будаваўся тут, нягледзячы на ўсе выгады гэтага месца. Старая карчма і яе гаспадар як-бы адной нагой ступалі ўжо на край магілы. А гэта, разам усё ўзятае, хіліла думку настаўніка да заключэння, што на свеце ёсць нейкія розныя пачаткі жыцця. Адны з гэтых пачаткаў вызначаюцца ў бясконцых формах жывых арганізмаў, а другія — адбіліся ў так званай нежывой прыродзе. Але пакуль такія пачаткі не асочаны і не даследаваны як мае быць, яны і не паддаюцца нашаму разуменню, яны жывуць у нашых пачуваннях. Пачуванне-ж ёсць папярэднік розуму ў доследах і вызначэннях сутнасці рэчаў.

Мінуўшы старую карчму, Лабановіч прыпомніў фразу, якая зляцела з языка, калі ён выходзіў з кухні: «Іду, бабка, лавіць таго чорта, што твайго Міхалку напалохаў». Якраз гэта і было месца, дзе, па словах бабкі, Міхалку налучыла тое здарэнне, пасля якога ён ледзь не памёр. Паставіўшы ўсё гэта ў звязак з тым фактам, што ён прышоў іменна сюды, не маючы гэтага ў мыслях, Лабановіч здзівіўся і зацікавіўся.

«Куды-ж я іду і чаго іду?» — спытаў ён сябе і спыніўся, азірнуўшыся вакол.

Было ціха, глуха і пуста, і толькі ў карчме быў відзен агонь. Лабановіч мімаволі пачуў нейкі страх. Яму прыпомнілася апавяданне бабкі. Разумеецца, гэта глупства. Міхалку мог напалохаць які-небудзь дзяцюк, помсцячыся за дзяўчыну, да якой хадзіў Міхалка. Але цікава, наогул, скуль бяруцца гэтыя страхі! Вось ён, настаўнік, не мае веры, што ёсць нейкая таемная варожая сіла, існуючая незалежна ад чалавека, але ён чуе ўплыў на сабе нейкага страху. Калі ён прыдзе сюды ўдзень, гэтага ўплыву не

будзе. Уся справа ў тым, што і другая ноч закрывае сваім змрокам яшчэ многа пытанняў, якія стаяць у звязку з псіхічнымі праяўленнямі чалавечага жыцця.

Нягледзячы на ўсе гэтыя разважанні, Лабановіч чуў, што яму страшна, што яму бракуе сілы павесці змаганне з гэтым страхам. «Пакліч да сябе нячыстую сілу»,— казала яму нейкая думка, але настаўнік прыкінуўся, што не чуе голасу гэтай думкі і разам з гэтым пачуваў яшчэ большую жудасць. «Калі ў цябе не хапае на гэта смеласці, прыслухайся: ты штосьць пачуеш», — прывязалася да яго гэта думка. «Ну, што-ж? — прамовіў сабе Лабановіч: — І буду слухаць!» І ён уніклівa стаў прыслухоўвацца. Тая-ж самая ціш, тая-ж глушыня. «Чэрці! чэрці! пакажыцеся!» — ціхенька паклікаў ён і зноў стаў прыслухоўвацца. Усё было ціха, ніхто не аклікаўся, ніхто не паказваўся. Нервы настаўніка былі моцна напружаны, і ён чуў, што калі саступіць з нейкага пункту, на якім ён ледзь-ледзь трымаўся, то пападзе ў поўную абладу страхаў і пусціцца ўцякаць з гэтага месца. Ён павярнуў назад да карчмы і пайшоў, прыбаўляючы кроку. Каля карчмы затрымаўся, падумаў і павярнуў да старога Абрама. Там ён прысеў, папрасіў бутэльку піва і, крыху супакоіўшыся, пайшоў у школу.

XIV

Напярэдадні Міколы сабраўся Лабановіч да свайго сябра Турсевіча і пайшоў на раз'езд. Дзяжурыў якраз Сухавараў. Ён запэўніў настаўніка, што праз поўгадзіны прыдзе таварны поезд, з якім і можна будзе паехаць. Сухавараў распытаўся, як здароўе панны Ядвісі, як жыве сам настаўнік, як часта бачыцца ён з паненкамі. І тут-жа пахваліўся, як гэтымі днямі залучыў ён да сябе адну маладзіцу. Лабановіч прыпомніў сваё не вельмі даўнае спатканне на вуліцы з незнаёмай жанчынай, і яму стала непрыемна слухаць усю гэтую брудную споведзь.

— Выбачайце, — спыніў яго Лабановіч, — нашто вы ўсё выкладаеце?

— А хіба вы не любіце слухаць такія рэчы?

— А што-ж тут можа быць цікавага?

— Чаму? — спытаў Сухавараў і зірнуў на настаўніка сваімі шэрымі памаўзлівымі вачамі з выяўным насмяханнем.

Настаўнік у сваю чаргу паглядзеў яму ў вочы. Не падабаўся яму гэты твар самаздаволенага самца і гэтыя адвіслыя мокрыя губы з паднятымі ўгару чорнымі вусікамі.

— Як вам сказаць?.. Гадасць усё гэта, і пахваляцца гэтым чалавеку інтэлігентнаму ніяк не прыстала.

— Эх, вы: сарамяжлівая дзяўчына! — прамовіў Сухавараў крыху зняважліва.

Тым часам падыходзіў таварны поезд. Сухавараў і настаўнік вышлі на платформу. Прыпыніўшы поезд, Сухавараў пасадзіў настаўніка ў цяплушку і развітаўся з ім. Лабановіч пачуў сябе лёгка, сядзеў і разважаў аб тым, як спаткае свайго сябра.

Як толькі поезд прышоў на станцыю, Лабановіч борздзенька выскачыў з цяплушкі, на ўсякі выпадак забег на станцыю, бо магло стацца так, што яго сябар зайшоў туды. Але сябра там не было, і Лабановіч пайшоў да вёскі па чыгунцы.

Вечар быў цёмны і ціхі. Побач чыгункі стаяў высокі стары лес, таемны, пануры і важны. На станцыі шумеў паравоз, ціха і роўна, нібы баючыся парушыць спакой лесу. Абложанае бялявымі хмарамі неба, здавалася, ніжэй навісла над зямлёй, і пухаўныя сняжынкі спакойна падалі на гэты высокі лес і дарогу. Было штось незвычайна прыемнае ў руху белых і чысцюткіх пушынак, і так далікатна лажыліся яны на зямлю, на шапку настаўніка. Чулае вуха, здавалася, само прыслухоўвалася да іх ціхусенечкага шолаху, як-бы хацела ўцяміць мілую гутарку.

Лабановіч ішоў борзда. Яму было лёгка, проста хацелася бегчы, ганяцца за гэтымі белымі пушынкамі, нібы яны былі жывымі, або ён сам быў яшчэ дзіця.

З правага боку дарогі лес скончыўся. Лабановіч ішоў і ўзіраўся ў цемру, каб не прамінуць гасцінца, бо дзесь тут ён павінен перасекчы чыгунку. А во гэты шлях, вось гэтыя старыя бярозы-прысады! На гасцінцы, у вярсце ад чыгункі, стаяла хата казённага лесніка Лукаша. Там змяшчалася школа, дзе жыў і вучыў дзяцей Турсевіч.

Лабановіч борзда прайшоў гэту вярсту, здалёк убачыўшы сіняваты бляск у акне свайго сябра. Каля самае кватэры ён прыпыніўся. Акно з боку вуліцы было завешана просценькаю занавескаю. Турсевіч хадзіў па пакоіку і меў такі выгляд, як-бы ён сам сабе пераказваў лекцыю. Лабановіч ціхенька падышоў да аконца, пастукаў пальцам па шыбе і схаваўся.

Турсевіч адхіліў занавесачку і, засланіўшыся рукамі ад лямпы, стаў узірацца. Нікога няма. Як толькі ён адышоўся, Лабановіч зноў таемна пастукаў у шкло і борздзенька адскочыў.

Турсевіч рашуча падышоў да акна і громка запытаў:

— Хто там?

Лабановіч не аклікаўся.

— Што за чорт? — пачуў Лабановіч нібы сярдзіты голас сябра.

Счакаўшы яшчэ з хвіліну, Лабановіч зноў пастукаў. Турсевіч сярдзіта сарваўся з месца і накіраваўся да дзвярэй. Лабановіч схаваўся за тоўстую бярозу. Турсевіч прыадчыніў дзверы, ледзь прасунуў галаву і стаў пазіраць. Нідзе нікога няма. Як толькі ён зачыніў дзверы і замкнуў іх на засаўку, Лабановіч — скок на ганак!

— Хто? — запытаў Турсевіч, не адчыняючы дзвярэй.

— Не скажу! — адказаў Лабановіч.

— Ах ты, мядзведзь цельшынскі! — крыкнуў радасна Турсевіч. — Ну, ідзі, ідзі, брат... Ах ты, фрукт гэтакі! — весела прамовіў ён і расчыніў насцеж дзверы ў сваю кватэру, каб было відно госцю.

Турсевіч крыху адышоўся ад дзвярэй і нарыхтаваўся спаткаць сябра, якому ён быў вельмі рад. Бойкія шэрыя вочы яго так і ўпіліся ў Лабановіча; з іх так і сыпаліся іскры смеху; разам з тым у іх адбівалася жывая мысль, нейкая станоўкасць і ўпартасць.

Лабановіч прыпыніўся каля дзвярэй.

Момант сябры азіралі адзін аднаго, а твары іх свяціліся вясёлым смехам.

— Няхай не падзе на цябе цень бярозы, пад якою сядзеў грэк! — важна і ўзвышальна прамовіў Лабановіч.

— Да не апынешся ты ў становішчы сабакі, які сядзіць на плоце! — адказаў гаспадар.

Перакінуўшыся жартлівымі прывітаннямі, сябры абняліся і сардэчна пацалаваліся.

Турсевіч прышоў у рух і ўзбуджэнне, трос сябра за плечы, громка смяяўся.

—Ну, і малайчына! Далі-бог, маладзец... Я, па праўдзе сказаць, і думаў, што ты павінен праведаць мяне... Ну, сядай!

Турсевіч сабраў са стала кнігі, акуратна злажыў іх і палажыў на палічку. У яго пакоі быў самы строгі парадак і чыстата. Уся кватэра яго складалася з аднае клятушкі, сялянскае хаты, але ён умеў надаць ёй нейкую прытульнасць. Прыводзячы ўсё ў парадак, Турсевіч увесь час вёў размову, закідаў сябра пытаннямі, хапаўся, гаварыў і за сябе, і за сябра.

— Ну, вось што, Лабуня! Зараз закамандую гаспадыні самавар. Будзем сядзець, будзем піць чай і гаварыць. Люблю я, ведаеш, гэтак з прыяцелем за чаем пасядзець!.. Эх, што-ж я? Стой, брат! — спыніў Турсевіч самога сябе: — Мы наўперад закусім. У мяне, брат, вельмі слаўнае сала ёсць... Ну, ведаеш, чула душа, што ты прыедзеш: быў на станцыі і сала купіў. Чакай-жа, брат. У нас ёсць зусім іншая музыка!

— Такія разумныя рэчы не кожнае вуха пачуе, — адказаў Лабановіч: — Адным словам, галава твая міністэрская!.. І дазволь мне, вялікі пустэльніча і мой настаўніча, сказаць колькі слоў на гэты выпадак?

— Валяй!

Лабановіч падняўся, састроіў важную міну і пачаў:

Люблю я слухаць шум ад таркі —
Дзяруць картофлю на бліны,
У печы піск люблю ад скваркі —
Прынадна пахнуць мне яны.

Няхай злуе айцец духоўны,
Няхай суліць мне пекла ён, —
Люблю я больш, як звон царкоўны,
Скаварады аб прыпек звон.

— Ха-ха-ха! — зарагатаў Турсевіч: — Ах ты, богахульнік! Толькі ў Цельшыне і можна дадумацца да гэтага:

Люблю я больш, як звон царкоўны,
Скаварады аб прыпек звон!

Лоўка, далі-бог, лоўка!.. Ну, я зараз!

Турсевіч выбег у сенцы, а адтуль да гаспадыні з загадам прыгатаваць вячэру і зараз-жа вярнуўся.

— А ведаеш, Лабанок, — таемна прамовіў Турсевіч, панізіўшы голас, — можа-б ты выпіў чарку?

— Мілы ты мой друг! Мала таго, што галава твая міністэрская, дык ты яшчэ і чараўнік, адным словам — кудзеснік! — натхнёна прамовіў Лабановіч. — Чаму-ж не выпіў-бы, як кажа мая бабка?

— Дык, кажаш, добра было-б выпіць? — спытаў з нейкаю сур'ёзнасцю Турсевіч.

— А які-ж дурань асмеліцца сказаць, што нядобра?

— Дык няма-ж, братка!

Твар Лабановіча крыху выцягнуўся.

— Ха-ха-ха! — аж прысеў Турсевіч ад смеху, потым усхапіўся, не перастаючы смяяцца і паказваючы на сябра пальцам.

— Абязвечыў ты мяне гэтым, — прамовіў Лабановіч, спаўшы з настрою.

— На тое-ж я кудзеснік, — не пераставаў смяяцца Турсевіч.

Ён падышоў да шафіка, пакапаўся ў ім і важна выцягнуў адтуль поўбутэльку.

— Не журыся, брат! — сказаў ён і патрос поўбутэлькай.

Пакуль смажыліся скваркі, Турсевіч падгатаваў стол да вячэры.

— Што, можа, твая бабка патрапіць так зрабіць? — спытаў Турсевіч сябра, як толькі Лукашыха прынесла вячэру.

— Затое-ж мая бабка шаптаць умее.

— Шаптаць-то яна ўмее, але капусты зварыць не патрапіць. Ведаю тваю бабку.

Сябры селі за стол. Выпілі па чарцы.

— Ну, закусвай, брат!

Увесь час ішла самая вясёлая, самая жывая бяседа. Гаварыў, галоўным чынам, Турсевіч. У яго была тонкая назіральнасць, і ніводная рыска, тыповая драбніца не хавалася ад яго вока. Апрача гэтага, ён меў здольнасць намаляваць і жыва паказаць той ці іншы персанаж.

Турсевіча вельмі насмяшыла адно здарэнне на чыгунцы, і аб гэтым апавядаў ён цяпер Лабановічу.

Справа датыкалася аднаго кантроля, вельмі адданага служакі. Захацелася яму злавіць аднаго старасту на чыгунцы. А стараста, трэба сказаць, быў жулік: прыпісваў лішніх рабочых, каб іх плату палажыць сабе ў кішэню. Налятае гэты кантроль. Старасты пры рабочых не было — дзесь у будцы сядзеў. Пералічыў кантроль рабочых і хацеў знячэўку на старасту наляцець, каб праверыць яго кніжку. Але выпадкова была тут дачка старасты. Дзяўчына пусцілася ў будку бацьку папярэдзіць, а каб кантроль не здагадаўся, яна бокам дарогі пабегла. Кантролю тут і цюкнула. Ён за дзяўчынаю! Бяжыць уперадзе дзяўчына, узняўшы падол, а за ёю, як ганчак за зайцам, кантроль чэша. І дабеглі яны да будкі, праве, адначасна.

— Паказвай запісную кніжку! — загрымеў кантроль да старасты і ніяк духу перавесці не можа.— Я аддам цябе пад суд!

— Я на вас падам у суд, — спакойна адказаў стараста: — Бо вы ганяліся за маёю дачкою, хацелі яе згвалціць.

Кантроль вырачыў вочы, як-бы яго даўбешкаю агрэлі.

— І пабачым, каму ад гэтага будзе болей нясмачна,— казаў усё так-жа спакойна стараста:— Я дзесяць сведак пастаўлю, і кожны пацвердзіць, чаго вы за дзяўчынаю ганяліся.

XV

Сябры скарысталі вясёлы свой настрой для розных смешных успамінкаў і далі волю нестрыманаму смеху.

— У нас сёння дзень не прапаў дарма, бо ў гэты дзень мы многа смяяліся, — заўважыў Лабановіч, — Ніцшэ вуснамі свайго Заратустры казаў: «Той дзень, калі вы не смеяцеся, прападае для вас».

— У такім разе ў нас, брат, многа прападае дзён, — ужо сур'ёзна адказаў Турсевіч. — Бывала, увосень сядзіш адзін гэты доўгі вечар. За акно зірнеш — цемра. Дождж. А кроплі ўсё плюскацяць і плюскацяць пад капяжом, нібы там плача хто. І нейкія асаблівыя думкі пачынаюць валодаць табою. Заўваж, дружа: іменна асаблівыя думкі.

Яны выходзяць як-бы не з твайго мозгу, а табе іх насылае нехта, каго няма, але прысутнасць яго нібы адчуваецца. І вось, уб'юцца ў галаву такія думкі, і, бог ведае, аб чым не гамоняць табе! А вось, як гэтыя бярозы каля хаты пачнуць шумець!.. Ведаеш, брат! Чалавек, скажам, прывыкае да жывёлы. Гаспадару часта шкада разлучыцца з канём ці з кароўкаю, або з сабакам не затым, што яны для яго карысны, а проста па прывычцы. Але можна прывыкнуць не толькі да жывёлы, а і да дрэва, як я, напрыклад, прывык да гэтых старых бяроз, што стаяць на шляху каля хаты. І вось кажу, калі зашумяць яны сваім голым веццем, то я чую нейкі жаль. Мне здаецца, што яны чагось смуткуюць і аб чымсі скардзяцца, і што яны таксама нешта пачуваюць, іменна пачуваюць. І ў такія вечары ўжо не засмяешся... І многа ў нас такіх вечароў!— Апошнія словы Турсевіч прамовіў у нейкім засмучэнні.

Лабановіч уважліва слухаў сябра і зацікавіўся ім. З гэтага боку, з боку такой тонкай чуласці і лёгкага містыцызму, ён бачыў яго першы раз, дасюль лічачы яго чалавекам пераважна рэалістычнага складу.

— Тваю думку аб бярозах я хацеў-бы пашырыць і паглыбіць. Я хачу запытаць у цябе — ці думаў ты калінебудзь над тым, або проста — ці кідаўся табе ў вочы той факт, што прырода вакол нас... Я не ведаю, як выказаць маю думку... Ну, што ў яе ёсць нейкае сваё свядомае жыццё? Якое яно, я не ведаю. Можа, гэта, як у мяне, напрыклад, ёсць перажытак дзяцінства. Але і цяпер я ніяк не магу вызваліцца ад гэтага пачуцця, што прырода мае нейкае сваё свядомае жыццё. Ёсць такія мясціны, іх я знаходжу ўсюды, дзе ні бываю, да якіх мяне не горне, я не магу з імі зжыцца, прывыкнуць да іх. Я звярачаў увагу на тое, што ёсць такія мясціны, дзе птушкі не хочуць гняздзіцца і спяваць, а стараюцца абмінаць іх.

— Ёсць, брат, штось такое, — сказаў Турсевіч.

— І вось, брат, як пачнеш на адзіноце думаць, чорт ведае, да чаго дадумаешся. Накруціш свае нервы так, што пачынае цябе жудасць пашыбаць. І ўсе гэтыя таямніцы, можа, не больш і не менш, як вынік туга накручаных струн-нерваў.

— Мы прывыклі, дружа, — мякка сказаў Турсевіч, —

адбаярвацца агульнымі выразамі там, дзе наш розум не можа адолець, пераступіць нейкія парожкі, якія адгароджваюць ад яго тое, чаго мы не ведаем. І ў адных выпадках мы гаворым: «Гэта — нервы». У другіх: «Аб гэтым ужо і закон так кажа, значыцца, тут трэба спыніць свой розум»; або — «Гэта злучэнне акалічнасцей», «Пад такою планетаю радзіўся» і многа іншага глупства. І часта які-небудзь незразумелы факт мы тлумачым яшчэ больш незразумелымі злучэннямі слоў і думаем, што сказалі нешта надта разумнае, а другія згаджаюцца з гэтым і здавальняюцца. А між тым усе гэтыя сляпыя агульныя выразы вельмі шкадлівы, бо яны звязваюць уніклівую думку чалавека, заспакойваюць і закалыхваюць яе, як закалыхваюць крыклівае дзіця, і не даюць ёй ходу там, дзе трэба разгарнуць дзейнасць, каб дашукацца прычыны. І, такім чынам, праз сям'ю, а потым і праз школу, наш розум прывучаецца пасіўна ўспрымаць такія з'явы, якія далёка не даследжаны і не растлумачаны. Дзяцей часта асякаюць старэйшыя ў сям'і, калі яны прыстаюць з запытаннямі, то вельмі наіўнымі, то часамі занадта замыславатымі. А несвядомыя настаўнікі ў школах таксама забіваюць у вучнях усё тое, што не ўкладаецца ў асадкі падручнікаў або выходзіць за межы знаўства саміх педагогаў. А гэта, усё разам узятае, вядзе да таго, што мы падпадаем пад абладу слоў і не маем волі для пратэсту супраць гвалтоўнасці над нашым розумам.

Лабановіч слухаў сябра, згаджаўся з ім, як-бы Турсевіч выказваў яго ўласныя думкі. Разам з гэтым і нейкае засмучэнне закрадалася яму ў душу.

— Ведаеш, брат, — сказаў ён: — Вельмі добра хоць зрэдку сустракацца з жывым чалавекам, пагаманіць, адвесці душу. А то жывеш у глушы, дзе жывога слова не пачуеш, жывеш адзін. І думкі розныя бываюць; мігатнуцца ў тваёй галаве, як цень на зямлі ад лёгкай хмаркі, і забудуцца, як-бы асуджаныя на зніштажэнне. А гэты дробны клопат штодзённага жыцця, нецікавага, часта пустога і нікчэмнага, прыніжае цябе, выціскае з цябе ўсё больш вартоўнае. І вось цяпер, калі я крыху адышоўся ад свайго Цельшына і зірнуў на яго збоку, то гэта глуш, што цікавіла мяне спярша, пачынае здавацца варожаю і наводзіць на мяне нейкае засмучэнне, як-бы я ў

ей або яна ва мне чуем непрыяцеля. Чым болей я жыву там, тым больш пачуваю, што затрымацца там на доўгі час у мяне не хопіць сіл.

Лабановіч замоўк і задумаўся. Вочы яго сталі нерухлівымі і пазіралі ў адзін пункт. Перад ім устаў вобраз панны Ядвісі. «Не, брат: не ведаеш ты, чым мне мілая гэтая глуш, ды я табе пра гэта не скажу», — думаў Лабановіч.

Турсевіч, залажыўшы за спіну рукі, хадзіў ад сцяны да сцяны і таксама аб чымсьці думаў.

— Так, брат, там цяжка. Па сабе ведаю, якая там глуш, — прамовіў Турсевіч. — Вось ты вазьмі: якія-небудзь дваццаць вёрст раздзяляе нашы месцы, а якая розніца! Тут зусім іншае: не той выгляд прыроды. Мы заўтра пройдземся, паглядзім... Ніяк, брат, няможна раўняць Случчыны з Піншчынаю. І дзеці ў школе не тыя. У іх больш сардэчнасці, больш, ведаеш, гэтай чалавечнасці, а твае палешукі — проста звяркі.

Далёка за поўнач сядзелі сябры. Многа ўсякіх пытанняў было паднята і абмяркавана імі. Усё, што думалася на адзіноце, што так ці іначай займала і цікавіла іх, усё гэта выявілася цяпер і давала многа матэрыялу для гаворкі. Але не хапіла і гэтай доўгай ночы, каб пагаварыць пра ўсё.

— Скажы ты мне, братка Максім, — пытаў сябра Лабановіч, ужо лежачы з ім у пасцелі: — Для чаго чалавек на свеце жыве? З некаторага часу мяне цікавіць гэта пытанне. Аб гэтым пытаў я нават і сваю бабку.

— Ну, для чаго-ж жыве?.. А чорт яго ведае, для чаго ён жыве, — прамовіў Турсевіч.

Сябры громка засмяяліся.

— Тут ужо, брат, нейкая філасофія. І я думаю, што немцу, напрыклад, такое запытанне і ў галаву не прыдзе.

— Чаму?

— А таму, што немец — чалавек практычны. Вырашэнне-ж гэтага пытання не дае ніякага практычнага рэзультату.

— Значыцца, немец не ведае, чаго ён на свеце жыве? — запытаў Лабановіч.

— Ну, каб такі кілбаснік ды не ведаў!

Сябры зноў засмяяліся.

— Чалавек жыве дзеля дабра, для служэння праўдзе, каб ствараць нейкія вартасці жыцця і каб быць карысным для іншых, — сказаў Турсевіч.

— Гэта, брат, ён так павінен жыць. Але мы бачым, што жывуць людзі зусім не па гэтаму правілу, і пляваць яны хочуць на дабро, або на нейкую там карыснасць. А справа тут стаіць зусім проста, і ў гэтым сэнсе ёсць толькі адна мерка, якая падыйдзе да кожнага: жыве чалавек для таго, каб у жыцці як можна болей вывудзіць карыснага і прыемнага для сябе.

— Пастой, брат, ты, здаецца, нясеш нейкую «ерась». Што-ж, па-твойму, вывуджвае які-небудзь праўдзівы хрысціянін, што адрокся ад зямлі з усімі яе дарамі і дабротамі, і ідзе ад людзей, каб заставацца на адзіноце з богам? Як прыложыш ты да яго сваю мерку?

— О, хрысціяне — народ вельмі змыслы, і да іх яшчэ дакладней прыстае гэта мерка. Яны, бачыш, маюць вельмі шпаркі разгон і шырока расчыненую губу. Іх не здавальняе зямля і наогул гэты свет (хоць і зямлёю яны таксама не грэбуюць). Ім давай рай, вечнае збавенне, бясконцую радасць і добрабыт. А на сваё жыццё на зямлі яны пазіраюць, як на спосаб латвей дастасавацца да банкету на тым свеце.

— Ты занадта агаліў сэнс жыцця, — сказаў Турсевіч, — і тым самым зневажаеш чалавека. Ёсць людзі, што жывуць ідэямі агульнага дабра. За свае ідэі яны ідуць у астрогі, на высылкі; за гэтыя ідэі іх крыжавалі, давалі атруту, палілі на кастрах. Тут ёсць нешта большае, чым асабістая выгада і вывуджванне карысці для сябе. І няможна выводзіць з аднаго прынцыпу дзейнасць якога-небудзь жуліка і дзейнасць чалавека, што працуе ўсё жыццё для іншых.

— Гэта толькі здаецца так на першы погляд, — стаяў на сваім Лабановіч, — а прынцып адзін для ўсіх. Справа толькі ў тым, якія ўжываць спосабы, якімі дарогамі ісці і як разумець гэты прынцып. Але каго ты ні возьмеш: ці то будзе вучоны, які вышуквае новыя законы жыцця і пракладае новыя дарогі, ці які-небудзь выдумшчык — Эдысон, ці паэт, ці мастак, ці прапаведнік новага вучэння, ці самаахвярны дзеяч, вечны служка выключна для другіх, — усе яны выходзяць з таго-ж самага прынцыпу.

Не трэба толькі змешваць мэту з тымі дарогамі, якімі гэтая мэта дасягаецца.

— А ўсё-ж-такі я з табою не згаджаюся, — адказаў Турсевіч.

— А калі-ж у спрэчках згаджаюцца? Згодзішся, як аб гэтым добра падумаеш. А цяпер давай хіба спаць, бо, здаецца, пачало ўжо развідняцца.

XVI

Шырокі гасцінец з двума радамі старых бяроз збягаў з горкі раўнюсенечкаю сценкаю кудысь на захад, і чым далей, тым, здавалася, гусцей стаялі гэтыя развіслыя тоўстыя дрэвы, усё болей і болей зніжаліся яны, а потым зліваліся ў адзін шнур і замыкаліся сабою самімі, як-бы ўпіраліся ў лес і хаваліся за лінію небасхілу.

Ёсць штосьці незвычайна прыгожае ў гэтых прывольных старасвецкіх шляхах Беларусі. Шырока і размашыста пралягаюць яны ад вёскі да вёскі, ад мястэчак да гарадоў, злучаючы паветы, губерні і цэлыя краіны. Колькі харaства і чароўнага прывабу ў сініх іх далях! Колькі новых малюнкаў, свежых матываў і таемных здарэнняў абяцаюць яны вачам і сэрцу падарожнага! З якой незвычайнай сілай парываюць яны да сябе і як моцна дакранаюцца да струн душы! Якая-ж сіла заложана ў гэтых прасторах неабнімных родных шляхоў і якую ўладу маюць яны над табою, неспакойны, вечна заклапочаны падарожны? Ці не гэта, нікім не выказаная казка іх, якая складалася доўгімі вякамі і запісвалася агнявымі літарамі людское крыўды ў сэрцах мільёнаў падарожных, што ішлі і ехалі па гэтых шляхах і думалі свае думкі? Ці не ён, гэты летапіс часаў, так глыбока западае ў тваю душу, каб адбіцца ў ёй, знайсці свой пэўны вобраз і форму і грознаю маланкаю жахнуць цёмную ноч няволі, што звісла над краем? А можа, гэта таемная і страшная бясконцасць блукання па свеце, дзе трудна вызначыць пачатак і канец, сімваламі якіх з'яўляюцца гэтыя шляхі, авявае душу тваю невыразным хваляваннем і кліча яе зліцца з бяскрайнасцю зямлі? Ці то — няясны адбітак вечнага нездаволення людскога, таемны покліч да

шукання іншых форм жыцця, несвядомае імкненне да лепшае долі? Ці то — парыванне душы разбіць нейкія граніцы і вырвацца на бязмежныя прасторы яшчэ нідзе неіснуючай волі?

Эх, шляхі, родныя шляхі! Хто перакажа нам вашы казкі, разгадае думкі, назбіраныя і напісаныя часамі на камлях вашых прысад?

— Зірні, ты зірні: якое гэта прыгоства! — казаў Турсевіч сябру, паказваючы з ганка свае кватэры на роўны шлях і на ўвесь малюнак, што раскрываўся перад імі. — Які разгон, які простор! Які вясёлы тон малюнку і колькі ў ім рознастайнасці! А вось гэтыя бярозы каля мае хаты: паглядзі, якія яны слаўныя!

— Я аднаго не разумею, — сказаў Лабановіч, любоўна агледзеўшы краявід: — У нас столькі прыгоства, столькі багацця форм і фарбаў, і край наш вялікі і рознастайны, а мы не бачым, не хочам гэтага бачыць. Аб нашым краі злажыўся погляд, як аб краі бедным, заняпалым. І нідзе ты ў падручніках геаграфіі не знойдзеш больш-менш сталага апісання Беларусі. Што такое наша Беларусь? А гэта, бачыш, заходняя акраіна Расіі. Чым яна слаўная? Нічым. Вось балоты ёсць, ды яшчэ на ўвесь свет вядомая хвароба — каўтун. І мы з гэтым лёгкадумна згаджаемся, мы ўсё гэта прымаем на веру, бо, як ты сказаў праўду, над намі пануе шаблон, шаблон пустых слоў, пустыя выразы, чужыя формы думак і чужы змест іх. Выходзячы з гэтага, мы адварочваемся ад свайго роднага, не шануем яго, мы стыдаемся яго! — слова «стыдаемся» Лабановіч прамовіў з націскам, пры гэтым выраз яго твару змяніўся, а ў вачах загарэўся агеньчык нейкай злосці. У ім абудзіўся цяпер, хутчэй інстынктыўна, чым свядома, пратэст супраць зневажання і прыгнечання правоў народа, і ён, як сын гэтага народа, з якім чуў цесную сувязь, стаў на абарону яго правоў.

— Кожны народ мае свой гонар. Англічанін перад усім светам горда зазначае: я — англічанін! Тое самае скажа француз, немец, аўстрыец, рускі і іншыя прадстаўнікі другіх нацый. А мы, беларусы, не адважваемся прызнацца ў тым, што мы — беларусы. Бо на галаву беларускага народа, як вядома, многа выліта памыяў, годнасць яго прыніжана і мова яго асмеяна, у яго няма

імя, няма твару. А з гэтага вынікае тое, што беларус-інтэлігент адмяжоўваецца не толькі ад свайго народа, але і ад бацькоў сваіх. Мы ведаем такое здарэнне з адным нашым знаёмым настаўнікам, да якога прыехала з дому матка. У яго былі госці. Ён пры гасцях не пасмеў пазнаць свае мацеры: «Ідзі ты, кажа, кабетка, на кухню: там цябе накормяць».

— Гэта — свінства! — адклікнуўся Турсевіч і плюнуў з нейкаю агідаю. — Баяўся мужыком здацца і выявіў сваё поўнае хамства.

Сябры некаторы час ішлі між прысад, а потым звярнулі на дарожку, гладка ўезджаную сялянскімі санямі, і пайшлі ў бок чыгункі.

— Я хачу паказаць табе даўнейшыя могілкі, — сказаў Турсевіч і павёў сябра ў невялічкі лясок на ўзгорку недалёка ад дарогі.

Дзе-ні-дзе на гэтых могілках тырчалі рэшткі крыжоў, панура нахіленых над зямлёю, і невялічкія гарбкі, закрытыя снегам. Між высокіх дрэў стаяла дзервяная каплічка з пабітымі вокнамі. Яна была пабудавана ў асобым стылі і мела арыгінальны выгляд. Яшчэ і цяпер па глухіх кутках Случчыны, напэўна, захаваліся такія каплічкі. Каплічка, здавалася, ледзь ліпела і гатова была кожную мінуту разваліцца. Дзервяны дашок яе прагніў і зяўраў чорнымі дзіркамі. Ухапіўшыся за выступ падваконня, Лабановіч зазірнуў у сярэдзіну каплічкі. З палотнішчаў старых абразоў на яго глянулі строгія, хоць і выцвіўшыя, твары святых. У сярэдзіне каплічка мела яшчэ досыць свежы выгляд, але ўсё ў ёй было пахмурным і страшным, і самі сцены, здавалася, сурова пыталі: «Чаго табе трэба тут, пустацікавец? Якое ты маеш права парушаць спакой гэтае святыні?»

— Каб я ўмеў маляваць, — сказаў Лабановіч, — я перанёс-бы яе на паперу.

— Цікавая каплічка, — згадзіўся і Турсевіч. — Вось я і прывёў цябе сюды, каб паказаць яе. І ведаеш, якое было тут нядаўна здарэнне. Адзін тутэйшы абываталь з шляхты быў на паляванні. Сабака выгнаў ліса. Ліс схаваўся пад алтар каплічкі. Паляўнічы пачаў капацца і забіў ліска. Аб гэтым даведаўся бацюшка, падаў на суд

за абразу святыні. Адным словам, завязалася цэлая громкая справа.

— А ведаеш, і мне не шкада, што гэтага паляўнічага на суд падалі, — адказаў Лабановіч: — Разумеецца, справа тут не ходзіць аб абразе, але сам па сабе гэты выпадак моцна скрабе сэрца: бедны звярок думаў знайсці сабе тут ратунак.

Сябры моўчкі ішлі з могілак. Відаць было, што кожнага паасобку займалі свае думкі. Лабановіч чуў нейкае засмучэнне і неспакой. Яго штосьці не здавальняла і кудысь цягнула. Магла быць тут прычынаю і тая акалічнасць, што, як яму здавалася, Турсевіч лепей вёў сваю школьную працу, і наогул яго школа рабіла ўражанне больш паспяховай школы. А можа, таксама мела значэнне іх скорая разлука, бо цяпер яны ішлі на станцыю, адкуль ён мусіць паехаць у сваю глуш.

— Што, брат, прыціх? — запытаў яго Турсевіч: — Чаго зажурыўся?

— Не заўсёды-ж і вясёлым быць, — адказаў Лабановіч: — Ведаеш, брат, як пабачыў я тваю школу, твае заняткі, то мая школа ў параўнанні з тваёю нікуды не гадзіцца.

— Ха-ха-ха! — засмяяўся Турсевіч. — Ніколі твая школа не будзе адставаць, раз ты ёю так моцна цікавішся і прымаеш блізка да сэрца. Гэта ў цябе яшчэ з непрывычкі, з першага года. А я пераконан, што твая школа шмат лепш стаіць за многія.

— Што я табе хацеў сказаць,—прамовіў Лабановіч,— давай вясною, як скончацца заняткі ў школах, паходзім па Беларусі, азнаёмімся з ёю бліжэй. А свае назіранні запішам, збяром багаты матэрыял. Прыцягнем яшчэ ў сваю кампанію якога-небудзь фатографа, здымкаў цікавых наробім... Апрача смеху... Гэты план, разумеецца, распрацаваць трэба. Я толькі думку падаю.

— А што ты думаеш? Гэта было-б цікава. Аб гэтым, брат, трэба падумаць сур'ёзна, яй-права!

— Ты ведаеш, — з жарам падхапіў Лабановіч, пачуўшы падтрыманне сябра, — гэта была-б цікавейшая рэч! Мы-б абышлі шмат школ, бліжэй пазнаёміліся-б з настаўніцтвам, абудзілі-б цікавасць да свайго краю. А самае важнае — мы раскатурхалі-б соннае балота нашага

настаўніцтва, бо жыць так, як жывем мы, адарваныя адзін ад аднаго, жыць без жывой ідэі, ведаць адну толькі цесную школу і траціць час на карты і папойкі, што звычайна робіць наш брат, так жыць нельга, бо для гэтага трэба наўперад задушыць у сабе голас сумлення, голас доўгу перад народам.

— Вучыцца нам, брат, яшчэ трэба многа, — зазначыў Турсевіч. — Я, напрыклад, думаю ў інстытут падавацца.

— І я чую, што трэба вучыцца, але сэрца маё ніяк не ляжыць да інстытута. Бо што такое інстытут? Гэта тая-ж самая казарма-семінарыя, розніца толькі ў тым, што інстытут канчаткова заб'е ўсё яшчэ больш-менш жывое ў нашай душы, чаго не забіла семінарыя, і з настаўніка зробіць сухога кашчэя-чыноўніка.

Лабановіч у глыбі душы пачуў нейкую непрыязнь да сябра, бо, як яму здалося, Турсевіч штосьць задумаў, нязгоднае з тымі поглядамі, у якіх, як увесь час лічыў Лабановіч, яны не разыходзяцца.

І ўжо да самае станцыі сябры ішлі моўчкі, замкнёныя ў сабе саміх. Развіталіся яны сардэчна.

— Не забывай-жа мяне, — сказаў на развітанне Турсевіч.

— Цяпер, брат, твая чарга даведацца свайго старога месца і старога прыяцеля, — адказаў Лабановіч.

XVII

— Ну, як-жа вам, панічок, гасцілася? — пытала бабка Лабановіча.

— Ой, бабка, добра гасцілася! «Было што піты і есты, але прынукі ны было», — адказаў настаўнік на паляшуцкі лад.

— У мяне, панічок, капуста ад абеду засталася, можа, вы хлебанулі-б крыху?

— Не, бабка, есці я не хачу.

— То, мусіць, вас той паніч добра частаваў?

— А як-жа, бабка! Дзякаваць богу, пачаставаў на славу.

— Ну, то і добра, панічок!

Да бабкі хтось прышоў. Яна зараз-жа вышла ў кух-

ню, а Лабановіч сеў за вучнёўскія сшыткі. Перагледзеўшы, палажыў іх на месца і колькі разоў прайшоўся па пакоіку. Усе гэтыя часы ён чуў, што яму як-бы чагось не стае. Чаго? Рэч вядомая: яму трэба пабачыць панну Ядвісю. Не: гэта не так. Яму проста хочацца пабачыць яе. Якая-ж тут патрэба? Хіба ён мае сказаць ёй што?.. А чаму-ж не мае? Ці-ж гэта не была-б праўда, каб ён прышоў і сказаў да яе: «Я прышоў да цябе, бо хачу бачыць цябе, хачу чуць твой голас: ён гучыць для мяне, як вясна; хачу пачуць твой смех, бо ён, як промень сонца, асвятляе мне душу. Я прышоў да цябе, бо прывяло мяне сэрца».

«Не, дудкі, брат, ты гэтага не пасмееш сказаць ёй. Так можа сказаць Сухавараў, бо ў яго словы не ад сэрца, і ні да чога яны не абавязваюць яго, — думаў Лабановіч. — Чым меней думаць, тым лепей. Проста захацеў пайсці і пайду».

Хвіліну ці дзве счакаўшы, Лабановіч хутка перакінуўся на двор пана падлоўчага цераз невысокі плот, які адгароджваў двор школы ад двара падлоўчага, і пастукаў у дзверы. Ніхто не ішоў адчыняць: або не чулі стуку, або не было дома.

Ён пастукаў мацней. Зараз-жа пачуліся чыесь крокі. Дзверы бразнулі і адчыніліся.

— Ёсць хто дома? — спытаў настаўнік служанку пана падлоўчага.

— Пан з паняю паехалі ў Хатовічы, дома паненкі і Чэсь.

— Проша, проша! — падбегла Габрынька і папрасіла Лабановіча заходзіць далей.

Маленькая, жвавая смуглянка, здавалася, была вельмі рада госцю. Жывыя і бойкія вочкі яе так і свяціліся радасцю.

— Калі ласка, проша да пакоя!

Габрынька ўзяла лямпу і павяла госця ў prасторны пакой.

— Сядайце, калі ласка.

— Я, можа, не ў час зайшоў да вас і пашкодзіў вам у рабоце? — запытаўся Лабановіч.

— Барані божа! Якая-ж у нас работа?.. Вы так рэдка да нас заходзіце...

— Што маю права часамі і спыніць вашу работу, асабліва, калі яна непрыемная?

— Работы, пане настаўніку, ніколі не пераробіш.

— Гэта праўда.

— Ці не можна ведаць, якая праўда? — вясёлым, маладым голасам прамовіла панна Ядвіся, падыходзячы да настаўніка. — Добры вечар, пане Лабановіч!

Ядвіся падала руку, ускінула на настаўніка свае чыстыя цёмныя вочы і затрымала на ім свой погляд, як-бы штось чытаючы на яго твары.

— Што-ж гэта вас не відаць нідзе? — прамовіла яна. — І да нас не заходзіце.

— Каб я да вас часта заходзіў, то, напэўна, не заўважыў-бы, як вы пахарашэлі, — смеючыся, адказаў Лабановіч.

Ядвіся на міг апусціла вочы.

— Цяпер я вас разумею, — сказала яна: — Вы чакалі, пакі я не пахарашэю, бо такую, якою вы сустракалі мяне першыя разы, вам непрыемна было бачыць? Праўда?

— А панна Габрыня за гэты час пастарэла, — не адказваючы на пытанне панны Ядвісі, сказаў Лабановіч.

— Ну, што гэта вы! Як-бы раней намовіліся, — запратэставала маленькая Габрынька. — І татка называе мяне старэнькаю, і вы тое самае кажаце.

— А вы мне не адказалі, — стаяла на сваім Ядвіся. — Я ад вас не адступлюся, пакі не адкажаце.

— Ну, то ў такім разе я ніколі не адкажу вам, бо мне вельмі будзе цяжка, калі вы адступіцеся ад мяне.

Ядвіся прыкінулася ўсерджанай і нецярпліва тупнула.

— З вамі ніяк нельга да праўды дайсці. А вось-жа я адступлюся: хачу паглядзець, як вам будзе цяжка.

Панна Ядвіся адышлася і села на канапу.

Лабановіч перайшоў у цёмны куток пакоя.

— Куды-ж вы схаваліся? — спыталася Габрынька.

— Я не хачу, каб ваша сястра бачыла, як мне цяжка.

Паненкі заліліся вясёлым смехам. Панна Ядвіся зняла з лямпы абажур і падышла да Лабановіча.

— Пакажыце, як вам цяжка?

— А цяпер мне зусім лёгка! — смяяўся Лабановіч.

— У вас сем пятніц на тыдні! — сказала Ядвіся і папрасіла яго бліжэй да лямпы.

Настаўнік і паненкі селі каля стала.

— Дзе-ж вы былі і каго вы бачылі за гэты час, покі мы тут старэлі і харашэлі? — не вытрымала панна Ядвіся, каб не засмяяцца.

Лабановіч пазіраў на яе вясёлы і дапраўды пахарашэўшы твар, на гэтыя тонкія, прыгожа скругленыя бровы. Яму было прыемна ў кампаніі гэтых двух мілых дзяўчынак.

— Перш-на-перш прашу прабачэння, што не перадаў вам паклонаў ад Сухаварава і Турсевіча.

— Ну, як жыве пан Турсевіч?

— А чаму вы наўперад не запыталіся, як жыве Сухавараў? — запытаў Лабановіч і бачліва паглядзеў на Ядвісю.

Ядвіся і Габрыня пераглянуліся, усміхнуўшыся. Як відаць, у іх была гутарка аб Сухавараву, і яны знайшлі ў ім нешта такое, з чаго цяпер смяяліся.

— Вы не чулі, як пан Сухавараў грае на гітары? — спытала Габрыня, не вытрымала і залілася смехам. Ядвіся стрымлівалася, паглядаючы на настаўніка. А потым і яна засмяялася, ды так заразліва, што і Лабановіч смяяўся, гледзячы на іх; нават малы Чэсь, які ўвесь час моўчкі сядзеў каля печы, мусіў смяяцца.

— Калі дазволіце, я скажу прычыну вашага смеху.

Сёстры адразу перасталі смяяцца.

— Ну, скажыце! — разам прамовілі яны.

— У вас была гутарка аб Сухавараве. Вы зацікавіліся — які выгляд мелі-б губы пана Сухаварава ў той час, калі-б ён граў на гітары і сам падпяваў-бы.

Ядвіся апусціла галаву. Зірнуўшы на Габрыньку, яна не магла ўтрымацца ад смеху і дала яму поўную волю.

Лабановіч дагадаўся, што правільна зразумеў прычыну іх смеху.

— Што, праўда?

— Вы не аматар адгадваць, — адказала Ядвіся:—Усё гэта вы самі выдумалі.

— Панна Габрыня напэўна скажа праўду.

Габрыня зірнула на Лабановіча, потым на Ядвісю. Дзяўчаты зноў засмяяліся.

— Вы праўдзівы ці не? — нечакана запытала настаўніка Ядвіся.

— Чаму вы так пытаецеся? — здзівіўся крыху Лабановіч, пазіраючы ёй у вочы.

— Проста, мне цікава ведаць.

— Як-бы я вам не адказаў, усё роўна вы не паверыце.

— А чаму вы думаце, што я вам не паверу?

— Каб вы мне паверылі, то, я думаю, вы не пыталіся-б у мяне аб праўдзівасці.

— Але вы не ведаеце, ці веру я вам, ці не; не ведаеце, ці лічу вас праўдзівым. Мне проста хочацца ад вас пачуць, як вы думаеце пра сябе.

— Значыць, вы самі пра мяне ўжо думалі? — усміхнуўшыся, запытаў настаўнік.

Ядвіся крыху замяшалася, і ледзь прыметны румянец выступіў на яе шчочках.

— Калі вы спатыкаеце чалавека, дык не можаце аб ім не падумаць, — сур'ёзна прамовіла яна.

Лабановіч на хвіліну задумаўся.

— Прызнацца, я ніколі не цікавіўся гэтым пытаннем. Тут, на Палессі, дзе людзей сустракаеш мала, можа, і задумаешся над кожным чалавекам, які ні пяройдзе перад тваімі вачамі. Але ў горадзе, дзе не паспяваеш больш-менш стала заўважыць твар кожнага стрэчнага, я думаю, што гэта проста немагчыма. Можа, дзе ў мазгах гэты працэс і выяўляецца, але ў нашай свядомасці ён дапраўды не адбіваецца.

— Я ў гарадах не была, — адказала панна Ядвіся, крыху нахмурыўшыся.

— Ах, Ядвіська! Што-ж гэта мы: і не падзякавалі пану настаўніку за кнігі.

— Выбачайце, я і забылася. Вельмі дзякую вам, — прамовіла Ядвіся.

— А вы прачыталі іх?

— Даўно прачыталі, — адказалі дзяўчаты.

— Я яшчэ прынясу, калі кнігі вам спадабаліся.

Служанка прынесла самавар. Селі піць чай.

— Ну, а як-жа спадабаліся вам кнігі? — пытаў Лабановіч паненак за чаем.

— Вельмі цікавыя кнігі! — сказала Габрынька: —Мы іх чыталі цэлымі вечарамі.

— Ці гэта ўсё была праўда, што там напісана? — спытала Ядвіся.

— Кожнае, самае праўдзівае апавяданне, разумеецца, не ёсць фатаграфія, але ў яго аснове ляжыць праўда. І кожная звычайная з'ява жыцця, калі ахінуць яе ў прыгожую форму і асвятліць больш-менш яскрава тым ці іншым светапоглядам і пры гэтым яшчэ вызначыць тыя, часта непрыметныя пружыны выяўлення нашай душы, што звычайна не ўлоўліваюцца нашым вокам, — можа быць тэмаю для вельмі цікавага апавядання. Хоць-бы ўзяць для прыкладу вас. Можна-б было, — каб знайшоўся такі, разумеецца, мастак, — цікава напісаць, як у глухім Палессі гадаваліся і раслі дзве красуні-сястры. Гэтыя дзяўчаткі хочуць вырвацца на шырокі прастор жыцця, бо іх забівае і губіць гнілое паветра палескіх балот і гразь розных падонкаў культуры. Вось вам аснова апавядання, драмы і чаго хочаце. А ўжо справа самога пісьменніка дадаць тыя ці іншыя завязкі, узяць той ці другі тон, гледзячы па яго здольнасці... Для яго тут расчыняюцца шырокія магчымасці.

— Хоць-бы ўжо вы не смяяліся з нас, пане Лабановіч, — засмучана адказала панна Ядвіся.

Лабановіч звярнуў увагу, што ён закрануў нейкія балючыя струны ў Ядвісі.

— А вы ўзялі-б дый напісалі-б аповесць аб двух сёстрах, — сказала хітра Габрыня: — Напісалі-б, што ў іх быў стары сабака Негрусь, у якога заўсёды цяклі з роту сліні...

Габрыня не магла гаварыць далей з-за смеху. Гэты смех перайшоў і на Ядвісю, і Лабановіча, бо Негрусь лічыў сваёй патрэбай заўсёды пабрахаць на яго, і наогул быў смешнаю псінаю.

— А я вам чагось не сказала, — гаварыла Ядвіся на развітанне настаўніку.

— Ну, скажыце!

— Не, скажу другім разам.

XVIII

Гэты вечар прайшоў вельмі хутка.

У тую хвіліну, калі Лабановіч вярнуўся ад пана падлоўчага, гадзіннік якраз збіраўся выбіваць час. Пашумеўшы і паскрыпеўшы, колькі яму было трэба, ён прабіў роўна поўнач. Настаўнік запаліў лямпу, узяў кнігу: ён меў звычай чытаць перад тым, як заснуць. Але з кожнага радка на яго пазірала панна Ядвіся, і чытаў ён зусім механічна, нічога не разумеючы з таго, што чытае. Ён проста пераводзіў вочы з радка на радок, ад слова на слова, а думаў пра Ядвісю.

«Не, з гэтага чытання нічога не выходзіць», — схамянуўшыся, падумаў Лабановіч.

Ён закрыў кнігу і колькі хвілін ляжаў нерухліва. Спярша ён чуў, як нейкае задаваленне прыемна запаўняе яго ўсяго, бо ў гэты вечар прымеціў, што панна Ядвіся ім вельмі цікавіцца. Яе акруглыя цёмныя вочы затрымліваліся на ім часта і доўга, то радасныя, ясна-спакойныя, то крыху як-бы засмучаныя, і глыбока западалі яму ў самае сэрца, хвалюючы яго. Усе словы яе, сказаныя ў гэты вечар, цяпер прымалі асаблівае значэнне, здаваліся многазначнымі, яшчэ яскравей выяўлялі вобраз гэтае дзяўчыны і яшчэ з большаю сілай захаплялі маладога настаўніка...

Але і другая думка зараз-жа зачала сваю работу ў яго галаве і як-бы клікала паглядзець на гэту справу іначай. Калі гэта яшчэ не зусім расцвіўшая краска палюбіць яго з усёю сілай першага кахання і даверыць яму сваё сэрца і маладосць, і ўсё сваё жыццё, тады што? І перад ім пачалі вырысоўвацца іншыя вобразы, і думкі яго пайшлі ў другім кірунку. Няўжо-ж у яго хопіць адвагі звязаць яе долю з доляю малапрыметнага настаўніка ў гэтай глушы і тым самым адсеч сабе дарогі да далейшага дасягнення тых мэт, якія меў ён на ўвазе? Яго цягнула вольная праца ў невядомых прасторах людскога жыцця, яму хацелася пашырыць свой кругагляд, набыць тыя веды, якіх яму так бракавала. Яго, наогул, захапляла і вабіла жыццё з прынаднымі малюнкамі і таемнымі чарамі. І вось на гэтай дарозе ўжо ўстала адна перашкода... Але ці так гэта? Чаму перашкода? Ці не

ёсць гэта адна з тых жыццёвых прыгод, якія аздабляюць жыццё? Не ўсе з'явы жыцця вымагаюць такога падыходу, бо тады яны страчваюць сваё хараство, сваю цэльнасць і вартасць. Да іх трэба падыходзіць проста, беспасрэдна. Каб так разважала пчала, яна, можа, і не затрымалася-б каля краскі. Не заўсёды можна разважаць над пытаннямі: а што з гэтага выйдзе? чым яно скончыцца? І ці не ёсць ва ўсіх гэтых прыгодах адзнака нейкага закону жыцця, агульнага і прыватнага, які пільна стаіць на варце інтарэсаў жыцця і строга сочыць за тым, каб не парушалася яго роўнаважнасць?

Гэтыя думкі крыху закалыхалі і заспакоілі настаўніка, а вобраз Ядвісі так і стаяў у вачу, як-бы смеючыся з яго разважанняў.

Ад бабкі-старожкі Лабановіч з большага ведаў сямейнае жыццё пана падлоўчага.

— Добрая душа гэта паненка, — казала бабка і ўздыхала. — Уся ў матку пайшла... Не даў ёй бог яшчэ пажыць трошкі, дзетак падгадаваць.

— Чаго-ж яна, бабка, так рана памерла? — пытаў бабку настаўнік.

— Памерла, панічок... На ўсё воля божая.

Панізіўшы голас, як-бы баючыся, каб яе хто не пачуў, бабка казала:

— Ой, панічыку, цяжка ёй жылося з панам! Біў яе пан! Ды як яшчэ біў! У нябожчыцы пані былі пышныя валасы. Як распусціць, бывала, чорныя косы, дык ледзь не да долу звісалі... Ой, была жанчына, няхай са святымі супачывае яе душачка! Сама я, панічыку, бачыла, як біў яе раз пан. Узяў за косы, яшчэ на руку накруціў і вёў праз двор ў пакоі. А што ён там рабіў ужо ў пакоі, то людзі таго не бачылі.

— Завошта-ж ён біў яе?

— Ой, панічыку, натура ў пана цяжкая! Ой, цяжкая натура! Калі ўжо ссунуцца бровы і вусы абвіснуць, ну тады дабра не спадзявайся. Як-бы на яго што найдзе. А так чалавек ён не кепскі. І пагаварыць любіць, і пашуткуе, і пасмяецца. Папросіш чаго, ніколі не адмовіць. І ведаеце, панічок: часта бедная пані па хатах хавалася, калі ўзбурыцца пан. А дзеці прыціхнуць, бы тыя птушкі

ў гняздзе, калі над імі каршун пралятае... Не даў бог долі беднай пані. Старэйшай паненцы тады толькі дзесяты гадок пайшоў. А без маткі, панічок, самі ведаеце, цяжка жыць. Праз год ажаніўся пан другі раз. Добрая пані, што казаць, панічок, але для дзяцей — не родная матка.

Такія ўмовы сямейнага жыцця балюча адклікаліся на дзецях, асабліва на мяккай натуры панны Ядвісі, але яна была дзяўчына сукрытая, мела характар замкнёны і не жалілася на сваю долю. Дый каму было тут жаліцца? І смутак дзяцінства яна глыбока затаіла ў сэрцы, каб аб ім нават не дагадваліся людзі, бо пры ўсёй мяккасці свае натуры панна Ядвіся была гордая дзяўчына. І толькі на адзіноце з сабою давала яна волю сваім невясёлым думкам. Аб чым тады думала яна? А пэўна былі ў яе тыя-ж думкі, што бываюць і ў нявольніка за муравалымі сценамі, якому так прынадна ўсміхаецца воля. Розніца толькі ў тым, што гэта воля добра вядома яму, тады як жыццё за межамі гэтых панурых лясоў і зацятых у сваёй маўклівасці балот Палесся было для Ядвісі яшчэ не зусім ясным і, стала быць, яшчэ больш павабным і прыгожым.

Але як-бы там ні было, панна Ядвіся часамі бегала на колькі хвілін да старой Мар'і, не затым, каб паскардзіцца на свой смутак, а проста пагутарыць з ёю. Забягала яна ў тыя часы, калі Лабановіч быў на лекцыях, і то ўкрадкам, з усімі перасцярогамі, каб не спаткацца з настаўнікам. Бабка была кабеціна добрая, чулая на чужое гора і ўмела знайсці тыя простыя жывыя словы, што ішлі да душы, гаілі і заспакойвалі яе. Гэтыя пабачэнні доўгі час адбываліся цішком ад настаўніка, і бабка, якая ні была яна гаваркая, ніколі не казала аб іх «панічу», хоць таксама была моцна аддана яму.

Што-ж цягнула панну Ядвісю да гэтае простае кабеціны? Трэба сказаць, што старая паляшучка была бабка добрая, спагадная і сваім простым сэрцам разумела, чаго бракавала маладой дзяўчыне, так рана страціўшай родную матку. Водгук на чужое гора жыў у яе сэрцы, бо і сама яна многа зазнала гэтага гора на сваім вяку, рана застаўшыся ўдавою з малымі дзецьмі. І трэба, наогул, зазначыць, што ніхто, як простая сялянская душа, не

патрапіць так знайсці тыя добрыя словы і выразы, што гаюча ідуць да другой душы, каб уцішыць і заспакоіць яе раны. Скуль-жа бяруцца гэтыя сілы, гэтыя ўласцівасці душы? Напэўна з крыніц свайго гора і цяжкага змагання з жыццём за людскія правы, з гэтай цэльнасці наіўнай веры ў справядлівасць расплаты на тым свеце за ўсе пакуты на зямлі.

З другога боку, Ядвісі было цікава паслухаць, як вёў сваю работу ў школе настаўнік, як ён часамі пакрыкваў на вучняў, сярдуючы на іх някемлівасць або праз меру падняты шум, каб потым задзівіць яго пераказамі таго, што рабіў ён у школе і як трымаўся з дзецьмі. А тонкая сцяна між кухняю і школаю дазваляла чуць усё, што рабілася ў школе. Ядвіся часта прыпыняла гутарку са старожкаю і прыслухоўвалася. Як толькі канчалася лекцыя і школа адразу ўздыхала вальней сваім шумам, Ядвіся, даўшы бабцы знак маўчаць, як спуджаная дзікая птушка, кідалася ў дзверы і знікала між будынін свайго двара, адкуль часта чуўся яе малады сакавіты голас і звонкая песня. А бабка, гледзячы ёй услед, сама сабе ківала галавою і смяялася доўгім ціхім смехам.

— Смешная, вясёлая паненка! — зазначала бабка.

Апавяданне бабкі аб доме пана падлоўчага зрабіла моцнае ўражанне на маладога настаўніка. Вобраз пані з чорнымі пышнымі валасамі жыва рысаваўся ў яго ўяўленні, а дапытлівая думка імкнулася ўнікнуць ва ўсе схованыя пружыны гэтае драмы чалавечай душы. І гэта трагедыя людскога жыцця аявала і вобраз панны Ядвісі, атуляла яго нейкай няяснай заслонай тайнасці цёмнай палескай глушы. І сама гэта глуш усё выяўней прымала своеасаблівы воблік, як нешта само сябе здавальняючае і існуючае сваім уласным жыццём, таемна пераплятаючыся і лучачыся з людскім лёсам.

Застаючыся на адзіноце з самім сабою, Лабановіч часта думаў аб Ядвісі. Ён нават размаўляў з ёю ў думках. І гэта размова была такая простая, шчырая, бо ішла ад сэрца! Ядвіся так міла і крыху хітравата пазірала на яго і смяялася. Яму самому рабілася так добра і ціха на душы ад гэтае размовы. Ён чуў, што нешта прыемнае ўліваецца ў душу і грэе яго сэрца. Але пры спаткан-

ні з Ядвісяю ён ніколі не выказваў таго, што гаварыў ёй без яе. Ні то сарамяжлівасць яшчэ чыстага сэрца, ні то нейкая асцярога стрымлівала сказаць ёй усё, што было на душы.

XIX

У хуткім часе пасля таго, як Лабановіч вярнуўся ад Турсевіча, да яго прыехаў Саханюк. Лабановіч быў моцна здзіўлены, угледзеўшы на парозе высокую, сухарлявую фігуру хатовіцкага настаўніка. Перш-на-перш ніяк не чакаў яго ў госці, асабліва ў будны дзень.

— Зд'ястуйце! — прамовіў Саханюк, прычым губы і вочы смяяліся вясёлым смехам.—Што, не чакалі мяне?— спытаў ён, павітаўшыся з калегам.

— Ніяк не чакаў, — здзіўлена адказаў Лабановіч, — ну, тым прыемней пабачыць вас тут. Заходзьце-ж, калі ласка, у кватэру, а я зараз канчаю лекцыю і пушчу хлопцаў на абед... А можа, вам цікава пазнаёміцца з маёй школаю, то будзьце ласкавы.

Саханюк больш з далікатнасці прайшоўся між вучнёўскіх лавак, заглядаючы на грыфелевыя дошкі і на сшыткі вучняў, а потым прыпыніўся каля шафы з кнігамі і слухаў, як калега вёў работу і якія адказы давалі вучні.

Лабановіч стараўся не скасавацца перад Саханюком і паказаць сваю школу з найлепшага боку. Запытанні так і сыпаліся адно за другім, а следам за пытаннямі выклікаліся вучні. Яны давалі досыць добрыя адказы.

— Можа, паэкзаменуеце маіх вучняў? — спытаў Лабановіч Саханюка.

Саханюк махнуў рукою, даючы гэтым знаць, што ён не мае ніякіх запытанняў.

— Схавайце кнігі! — звярнуўся Лабановіч да вучняў.

Дзеці борзда пахавалі кнігі і дошкі.

— Малітву!

Школа хорам праспявала малітву прад абедам. З шумам рынуліся дзеці на вуліцу і запоўнілі яе сваімі звонкімі галасамі.

— Ну, як вам падабаецца мая школа?

— А нічога, добра! Добра!.. Вы, відаць, многа працуеце?

— Працаваць-то прыходзіцца. Толькі мне ўсё здаецца, што ў маёй працы чагось не стае, і што я раблю не так, як трэба.

Настаўнікі ўвайшлі ў пакойчык.

— Э, плюньце вы на гэта, — прамовіў Саханюк: — Навучылі чытаць, пісаць і задачы развязваць і — шабаш! Вы думаеце медалёў заслужыце? Або свет гэтым перавернеце? Інспектар знойдзе да чаго прычапіцца. Ну, у самым лепшым выпадку падзяку напіша, а дырэкцыя вам дзесяць рублёў вышле. Але сваё здароўе даражэй.

— А як вы сваю школу пакінулі?

— А дзе яна дзенецца? У лес не пабяжыць, — адказаў, смеючыся, Саханюк.

«Відаць, брат, ты не так сюды прыехаў», — падумаў Лабановіч.

— Мусіць, у вас нейкая важная справа, калі так. Можа, часамі ў сваты прыехалі да каго? — мяняючы тон размовы, жартліва запытаў яго Лабановіч.

— А што-ж? Сватайце. Гуляць будзем.

— Дык бачыце, я кепскі сват. Каб часамі з-за дзяўчыны не пасварыліся.

— Каб з-за дзяўчыны ды яшчэ сварыцца! Ці мала гэтага дабра на свеце? Хопіць на наш век!.. Паміж іншым, вамі цікавіцца адна паненка.

— Паненка? Якая?

— Такая, што ўсё аддай — і мала!

— Ну, хто-ж такая?

— Кажа: хацела-б пазнаёміцца з цельшынскім настаўнікам.

— Можа завітанская чараўніца?

— Яна, калега, яна! Як гэта вы адгадалі?

— А ў мяне бабка — знахарка; я ў яе лекцыі па знахарству бяру.

— А ўсё-ж-такі цікава, чаму вы дагадаліся, што гэта яна?

— А вельмі проста: усе кавалеры — сем пар вінных і сем пар нявінных і вы ў тым ліку — закахаліся ў панну Людмілу. У яе аж галава закружылася ад радасці і дух заняўся. Але яе засмучае адно: чаму не ўсе кавалеры ня-

суць падатак яе хараству? Я, калі хочаце, той гарбач у казцы «Царэўна — чырвоная краска», які не пакланіўся царэўне. І не буду ёй кланяцца.

— Вось вы які! — сказаў Саханюк і засмяяўся.

— А што-ж вы думалі!

— І не пазнаёміцеся з ёю?

— Ва ўсякім разе сам да яе не пайду.

— Чаму?

— Проста не пайду і ўсё.

Саханюк гаварыў, часамі смяяўся, але Лабановічу здавалася, што чагось самага галоўнага яго калега не кажа, бо не можа быць, каб ён прыехаў сюды толькі дзеля таго, каб паведаміць, што дачка каморніка хоча пазнаёміцца з цельшынскім настаўнікам.

— Выбачайце, я зараз вярнуся.

Лабановіч выбег у кухню.

— На табе, бабка, пяцьдзесятку, прынясі гарэлкі.

— Вы яго, панічок, частавацімеце? — шэптам спытала бабка.

— А што?

— Не варта, панічыку! Гэта-ж ён, панічок, прыехаў гарцы збіраць!

— Якія гарцы?

— Ссыпку з нашага вобчаства на школу!

— Каму ссыпку?

— Сабе, панічыку!

Бабка, гаворачы гэта, аж сіпала ад абурэння.

Лабановіч пазіраў на яе і дзівіўся. Уся гэта справа для яго была незразумелаю, хоць у значнай меры пралівала святло на прыезд Саханюка.

— Ну, бабка, прынясі гарэлкі; вып'ем, тады, можа, да сэнсу прыдзем.

Бабка сярдзіта накінула на сябе світку, моцна стукнула дзвярамі і накіравалася да Лявона Секача.

Лабановіч вярнуўся да госця. Яшчэ нічога не разумеючы, ён зірнуў на Саханюка.

— Ведаеце, што кажа мая бабка: быццам вы прыехалі збіраць нейкую ссыпку. Што вы на гэта скажаце?

Саханюк апусціў вочы, як-бы пачуўшы нейкую нялоўкасць, а потым ускінуў іх на калегу.

— Так, мне належыць ссыпка ад вашага сяла,— прамовіў ён спакойна.
— Вы не жартуеце?— здзівіўся Лабановіч.
— Не, кажу зусім сур'ёзна.
— Ха-ха-ха! — Лабановіч так і паехаў ад смеху.
Саханюк пазіраў на калегу, таксама ўсміхаючыся.
— Што вы знаходзіце тут смешнага? — спытаў ён.
— Ну, як-жа не смяяцца? Вы прыехалі да мяне адбіраць мой хлеб. Я буду вучыць, а вы толькі будзеце гарцы браць.
— Чакайце! — загарачыўся Саханюк. — На валасным сходзе была зроблена пастанова, каб на хатовіцкую школу давалі ссыпку. Ад вашага сяла мне належыць дванаццаць пудоў трыццаць фунтаў жыта. Ну? Я і маю поўнае права ўзяць сваё.
— Выбачайце. А калі была зроблена такая пастанова? Напэўна тады, калі Цельшына не мела свае школы? А раз гэта школа цяпер ёсць, то было-б па меншай меры смешна браць ссыпку ад свае школы і даваць у чужую. І наогул гэта справа такая простая і відавочная, што і дзіця зразумее ўсю недарэчнасць вашага дамагання.
Саханюк ніколечкі не пакрыўдзіўся.
— Я грунтуюся на цыркуляры дырэкцыі народных вучылішчаў, які зазначае, што раз была пастанова валаснога сходу даваць ссыпку, дык ваша вёска не мае права яе адабраць. Вось чаму я і прыехаў забраць гэту ссыпку.
— Але вы яе не атрымаеце.
— Вазьму!
— Не, не возьмеце!
Колькі хвілін Лабановіч узіраўся ў Саханюка. Саханюк таксама глядзеў на калегу. У яго жаўтаватых вачах блукаў нявінны смех.
— Ведаеце што, — прамовіў Лабановіч. — Мне не шкада гэтае ссыпкі, бог з ёю. Аднак, калі пайшло ўжо на рызыку, магу вас не толькі запэўніць, але і перазапэўніць, што вы адгэтуль не возьмеце ні аднюсенькага зярнятка.
— Ну, пабачым, — сказаў Саханюк.
— Нічога вы не пабачыце!
У самы разгар спрэчкі рыпнулі дзверы з кухні. Старожка прасунула галаву.

— Вось, панічыку, вам грошы: нідзе не дастала! Была і ў Лявона, і ў Губаровых — няма.

— Ну, то давай будзем абедаць.

Саханюк адмовіўся абедаць. Ён прыехаў сюды з Дубейкам і ўмовіўся з ім па дарозе заехаць на пачастунак. Куды, Саханюк не сказаў. Цяпер-жа ён мусіць ехаць, бо Дубейка ў старасты яго напэўна ўжо чакае.

Саханюк развітаўся з калегам, заклікаючы яго да сябе ў госці.

— Дзякую, — сказаў Лабановіч, — але, калега, майце на ўвазе, што ссыпкі вы не атрымаеце.

— Буду судзіцца, — не адступаўся Саханюк: — Вось прыеду і земскаму жалабу падам на вашага старасту.

Пад вечар таго-ж самага дня стараста сабраў гарцы і прывёз іх Лабановічу.

— Што, панічок, звар'яцеў ён ці што? Як-то мы аддамо яму ссыпку, калі ў нас ёсць свой настаўнік!

У старасты быў важны начальніцкі выгляд і пачуццё выпаўненага абавязку перад школай і настаўнікам.

— Хоць-бы ён пасаромеўся, — абурліва гаварыла бабка: — Як гэта можна забраць ссыпку з чужое школы?

Бабка была зацікаўлена ў гэтай ссыпцы, бо і ёй належала некаторая частка гарцаў.

XX

Панна Ядвіся была ў незвычайна вясёлым настроі. Яна і малая Габрынька пойдуць заўтра на раз'езд, сядуць на машыну і паедуць у госці. У Гродзеншчыне ў іх былі сваякі, і татка дазволіў паехаць туды тыдні на два пагасцяваць. Габрынька кружылася каля мачыхі, жартавала, смяялася такім вясёлым дзіцячым смехам, што нават пераважна смутная і заклапочаная пані падлоўчая не магла захаваць свой звычайны настрой і таксама смяялася.

— Адстань, адстань: ты ўжо не дзіця.

Пані падлоўчай, здавалася, было крыху нялоўка, што панна Габрынька так дурэе пры чужым чалавеку. А гэты чужы чалавек быў Лабановіч.

Але Габрынька не зварачала на гэта ўвагі. Яна вы-

думала кароценькі вершык і раз-по-раз дэкламавала яго сваёй мачысе:

Мама така слічна,
Слепа, дыхавічна.

— От распуста, —ківала галавою пані падлоўчая, зварачаючыся да настаўніка.

— Я буду пісьменніцай. Хачу напісаць аповесць, як на Палессі жылі дзве прыгожыя краскі-панны і што з гэтага вышла, — смяялася Габрынька.

— А што з гэтага вышла? — пацікавіўся Лабановіч.

— Вышла тое, чаго ніхто не спадзяваўся! Гэтыя дзве красуні пакахалі аднаго маладога паніча і кінуліся яму на шыю. А ён, небарака, з гора пайшоў і ўтапіўся ў Целяшовым Дубе.

— Габрынька, устыдзься!—прамовіла пані падлоўчая.

А Габрынька ўся хадзіла ад смеху. Таксама смяялася і панна Ядвіся, крыху засаромеўшыся такой непасрэднасці, прастаты і смеласці жартаў свае сястры.

— У вас, як бачна, ёсць здольнасці пісьменніцы, — смяяўся і Лабановіч. — Але чаго-ж ён, гэты ваш паніч, тапіцца пайшоў?

Габрынька хітра зірнула на сястру. Ядвіся, відавочна, зацікавілася яе жартам і, смеючыся, адказала за сястру:

— Мусіць, той паніч спалохаўся свайго шчасця.

Нямаведама чаго, сёстры пераглядаліся і перасмейваліся. Проста, ім было весела, іх цешыла і радавала гэта паездка, змена ўражанняў, новыя месцы, новыя знаёмствы.

Лабановіч пачуў нейкае засмучэнне. Скуль яно, ён не ведаў і сам. Ці не з таго, што панна Ядвіся так радуецца? Як відаць, яе нішто не прымацоўвала тут, ніхто не цікавіў, і яна з лёгкім сэрцам гатова была змяняць гэту глуш Палесся на кожнае новае месца, бо сэрца яе было вольнае, а можа, шукала другога сэрца, каб забіцца яму ў адзін тон? А можа, гэта сэрца было ўжо там?

І пачуванне адзіноты закралася ў душу настаўніка: ён тут — чужы і лішні. І смешнымі цяпер здаліся тыя думкі, якія яшчэ так нядаўна цешылі яго маладое сэрца.

Пані падлоўчая вышла. У пакоі засталіся адны дзяўчаты. Каля печы пад канапаю ляжаў стары Негрусь і зрэдку павільваў хвастом, калі міма яго праходзіла панна Ядвіся.

— Я ні разу не бачыў вас у такім добрым гуморы, — сказаў да яе Лабановіч. — Вы сёння такая вясёлая, як ніколі.

— А вы хацелі-б, каб я плакала? — спытала яна.

— Не, я гэтага зусім не хацеў-бы. Але, як я заўважаю, у вас тут няма нічога такога, аб чым вы маглі-б пашкадаваць. І калі-б вам напаткалася такое здарэнне, што вы маглі-б ніколі сюды не варочацца, вы і ніколечкі аб гэтым не пашкадавалі-б.

— О, не! — прамовіла панна Ядвіся.

На хвілінку яна як-бы аб чымсі задумалася. Твар яе стаў сур'ёзны. Але ўмомант вока выраз яе перамяніўся, уваччу забліскалі іскаркі смяшлівасці і хітрасці.

— О, не! Вы памыляецеся! — сказала яна. — У мяне тут ёсць нехта такі, каго мне вельмі цяжка пакінуць і аб кім вельмі непакоіцца маё сэрца.

Лабановіч замёр у салодкім і разам трывожным чаканні. Панна Ядвіся акінула яго бачлівым поглядам. Яна раптоўна ўсхапілася і накіравалася да Негруся.

— Негрусь, мілы мой Негрусь! — казала яна і лашчыла сабаку, прытуліўшы да яго сваю шчаку: — Мы разлучымся з табою на цэлыя два тыдні!

— Тым прыемней будзе часіна спаткання пасля разлукі, — сказаў Лабановіч і ўстаў. — Ну, жычу вам усяго найлепшага: шчасліва заехаць, весела гуляць і лёгка перанесці разлуку з тым, аб кім так непакоіцца ваша сэрца.

Гаворачы гэта, Лабановіч чуў нейкую крыўду, і, як ні сіліўся захаваць яе, гэта крыўда вызначалася на яго твары.

— Куды-ж вы? — спытала Ядвіся.

— У мяне, бачыце, ёсць адна работа. Вам-жа трэба збірацца ў дарогу — не буду вам замінаць... Бывайце здаровы!

Ядвіся нічога не сказала. Яна толькі вінавата і як-бы пужліва заглядала яму ў вочы. Можа, яна каялася ў сваім апошнім, праўда, грубаватым жарце, але прызнацца ў гэтым чамусь не хацела.

— А можа, вы заўтра пройдзецеся з намі на раз'езд? — спытала Лабановіча Габрынька.

— Нашто турбаваць пана настаўніка? — прамовіла Ядвіся.—Татка заўсёды пасылае з намі лесніка Грыгора.

Што гэта? Новая абраза, ці панна Ядвіся проста не хоча яго кампаніі? А можа, яна не хоча мець сведку свайго спаткання з Сухаваравым?

Вясёлы настрой пакінуў Ядвісю, і яна засталася маўклівaю, замкнёнаю.

— Зразумела, — сказаў Лабановіч, — панне Ядвісі будзе шмат прыемней пайсці ў кампаніі Грыгора і Негруся, які напэўна сам назавецца ў праважатыя.

Пачуўшы сваё імя, Негрусь у здавальненні колькі разоў вільнуў хвастом.

Лабановіч развітаўся і вышаў. На душы ў яго было цяжка і смутна. Ясна, што Ядвіся насміхаецца з яго. А калі і зварачала на яго ўвагу, то толькі з тае прычыны, што тут — глуш, жывога чалавека няма. А ён, як неразумнае дзіця, не бачыць нічога. Ён сам наводзіў на сябе прыемны туман самазманства, ён сам закалыхваў сябе ружовымі думкамі і салодкім летуценнем. Ну, што-ж? Трэба глыбей увайсці ў сябе і там шукаць крыніц радасці і здаровага пачуцця. І трэба, наогул, узяць сябе ў рукі. Пара яму выкінуць усё гэта з галавы і сэрца, пакуль вобраз дзяўчыны яшчэ не засеў там настолькі глыбока, што з ім будзе трудна змагацца. Няхай не падумае яна, што яму без яе свет зачынен.

Колькі разоў прайшоўся Лабановіч па сваім пакоіку.

«Не, — думаў ён, — гэтак далей жыць нельга. Апрача школы і чыста асабістых інтарэсаў, ёсць яшчэ і другія — чыста грамадзянскія абавязкі. Трэба бліжэй стаць да народа, прыглядзецца, як ён жыве і чым ён жыве. Трэба пашырыць рамкі свае работы, трэба вынесці гэту работу за межы чыста школьных пытанняў».

Лабановіч накіраваўся ў школу, падышоў да кніжнае шафы. На адной палічцы стаяла колькі дзесяткаў тоненькіх кніжачак спецыяльна для народа. Выданні гэтыя былі шчупленькія і наогул пустыя. Тут пераважна былі кніжачкі, выданыя рознымі камітэтамі і гурткамі цвярозасці, або сінодскія выданні. Разглядзеўшы гэту кніжніцу, Лабановіч нічога не знайшоў у ёй цікавага, асабліва для

тутэйшага насельніцтва, і вырашыў выбраць больш цікавую на яго погляд тэму для гутаркі з палешукамі. Аб чым-жа гутарыць? Трэба звярнуць увагу на сялянскі побыт, паказаць сялянам, як жывуць другія людзі і як яны дайшлі да лепшага стану жыцця.

Лабановіч усё больш і больш захопліваўся сваёю тэмаю. У галаве складаўся план прамовы і вынікалі ў яго ўяўленні ўсё новыя і новыя факты. Ён зачыніў шафу, пайшоў у свой пакоік і сеў за стол, каб зрабіць накід плана прамовы.

На гэты час увайшла бабка.

— А вы, панічок, усё пішаце.

— Пішу, бабка.

— А ці чулі вы, панічыку, што Курульчука перамяшчаюць ад нас?

— Перамяшчаюць? — спытаў Лабановіч. — Чаму-ж яго перамяшчаюць?

Лабановіч задумаўся. Яму стала чагось шкада. Нейкая адзінота ахапіла яго, і гэты цесны краявід, здавалася, яшчэ звузіўся і стаў больш цесным.

— Нелады ў іх з дарожным майстрам,—растлумачыла старожка прычыну выезду Курульчука.

XXI

Прайшоў нейкі час.

Малады настаўнік шмат перажыў, перадумаў. Цэлыя вечары праседжваў ён у сялянскіх хатах, прыглядаючыся да жыцця палешукоў. Яго тут прымалі і спатыкалі прыветна, з ахвотаю падтрымлівалі гутарку аб розных справах. Але гэтыя гутаркі не выходзілі за межы тых пытанняў, якія закранаў сам настаўнік, бо палешукі — людзі паважныя, сталыя, асцярожныя, не адразу і не кожнаму расчыняюць сваю душу, бо ўжо, мусіць, сама прырода Палесся палажыла на іх сваю адзнаку. Бясконцыя балоты вучылі іх мудраму разважанню, мора лясоў выхоўвала ў іх засцярогу, бо так лёгка тут напаткаць небяспеку: на звера натрапіць, згубіць дарогу або папасціся ў рукі сярдзітым леснікам графа Патоцкага. І толькі выпадкова ўдавалася пачуць якое-небудзь няўмысля ўроненае сакавітае слова, прыказку або цікавае параўнанне.

Старыя, аздобленыя сівізною, маршчынамі і пачэснымі лысінамі дзяды, жывыя летапісы цельшынскай гісторыі на працягу многіх дзесяткаў гадоў, да душы падабаліся Лабановічу. Гэта былі тыя слупы, тыя падмуркі, на якіх трымаліся традыцыі сялянскай старажытнасці. Гэта былі самавукі-аграномы, тлумачальнікі розных прыгод жыцця. Яны ведалі, у які дзень, у якую нават часіну трэба выязджаць з сахою на поле, пры якіх умовах трэба сеяць тую ці іншую збажыну. Ім досыць пабачыць першы вырай жураўоў, каб сказаць, які будзе авёс. У залежнасці ад вышыні лёту знаходзіўся і рост аўса: высока ляціць вырай — высокі вырасце і авёс. Кожны такі дзед меў свой асаблівы, выразны твар.

Вось хоць-бы гэты дзед Мікіта. Сівы, як голуб. Востры погляд, калючыя вочы, гатовыя пранізаць. Старасць прыгнула яго крэпкі стан і кінула на твар і на высокі лоб цэлую сетку маршчын. Але што за дока быў дзед Мікіта ў маладыя гады! І не было ў сяле роўнага яму. Такія штукі выкідваў дзед Мікіта, якіх цяпер ніхто не патрапіць, бо хіба цяпер такі народ? Ды што маладыя гады? Нават і зараз, нягледзячы на свае восемдзесят год, дзед Мікіта за пояс маладога заткне. Вось толькі няхай падгуляе, няхай ачнецца ў ім яго маладая бунтоўная кроў, — не выцерпіць, прасуне рукі ў камяні-жарнавікі і пойдзе з гэтымі камянямі, як з лёгкімі кацёлкамі, упрысядкі па хаце. І цяпер яшчэ баяцца дзеда Мікіты, бо ён—знахар-чараўнік, хоць знахарствам не займаецца; але калі хто ўгневіць дзеда, тады пазнае ён сілу дзедавых чараў. Мікіта—чалавек нелюдзімы, удзень яго бадай што і не спаткаеш на людзях, і жыве ён адзін, як воўк, даўно пахаваўшы сваю старую і адбіўшыся ад дзяцей.

Дзед Мікіта і іншыя роданачальнікі Цельшына дабрахоць уступілі свае правы больш маладым і здаровым, самі-ж ужо стаялі збоку ад грамадскіх спраў. Першае: яны ўжо ўнеслі свае падаткі грамадскаму будаўніцтву; другое: як ні ціха, як ні маларухома было вясковае жыццё, але старыя прадстаўнікі яго, дзяды-палешукі, знаходзілі ў ім цяпер многа чаго такога, што не адпавядала іх поглядам. І толькі ўжо ў незвычайна важных выпадках прымалі яны ўдзел.

Вось тады, калі вынікала якая заблытаная справа агульнавяскoвага характару, злазіў з печы зусім стары ўжо дзед Мікодым, выходзіў на вуліцу і голасна зазначаў:

— Вы не думайце таго—праўда не скварка, з кашаю не з'ясі. Выйдзе наверх яна, родная, бо ўжо сама зямля прысягала небу не пускаць адгэтуль цёмнай, заблытанай праявы.

Звычайна-ж дзяды сядзелі больш дома або на дварэ корпаліся. У царкву яны бадай што ніколі не хадзілі, ды царквы ў Цельшыне, апрача каплічкі на могілках, не было. А дома маліцца богу не выпадала,—больш награшыш, чым намолішся. Апрача таго, маліцца іх не вучылі. І наогул, ніхто ў Цельшыне не ўмеў маліцца як трэба. Кожны маліўся так, як зносіў яго розум. Адзін раз у год, на благавешчанне, прыязджаў сюды бацюшка з Малевіч. Тады ўжо ўсе цельшынцы і неслі свае грахі яшчэ больш грэшнаму а. Мадэсту, які быў вельмі заўзяты п'яніца і лаяльнік. Напэўна за гэта і пакараў святы Ілья малевіцкую царкву, пабіўшы перуном яе вежу. А можа, і другі грэх а. Мадэста мог пацягнуць за сабою такую кару, бо ён сушыў жыта за царскімі дзвярамі, а ў святую нядзельку перад набажэнствам зазвычай хадзіў на балота трасці бучы з рыбаю сваіх парафіян. Раз, ходзячы па балоце, уваліўся ён дзесь у апарыну па самы пояс. Царкоўны стараста, які таксама хадзіў разам з бацькам на раздабыткі, стаяў і спакойна пазіраў, як а. Мадэст церабіўся ў гразі і не мог вывалачы з балота ног.

— Чаго пазіраеш, падла пранцаватая? Цягні мяне!

Тады толькі паварушыўся стараста і вызваліў з балота а. Мадэста.

У гэту нядзельку а. Мадэст зрабіў забастоўку і не пайшоў служыць абедню.

— Што, бацюшка, можа, час званіць на абедню? — пытаў яго дома стараста.

— А ні дзлэнг! — крыкнуў а. Мадэст. — Як бог да мяне, так і я да бога!

І ўсё-ж-такі, нягледзячы на ўсё гэта, цельшынцы адчувалі нейкую патрэбу так ці іначай мець сувязь з небам і царкоўнасцю, хоць гэта сувязь была больш фармальная і павярхоўная.

Лабановіч доўга не мог забыць аднаго здарэння, калі

рэлігійныя патрэбы вызначыліся асабліва самабытна. Настаўнік яшчэ спаў салодкім сном. Была раніца, толькі што разднела. У кухні, поруч з пакоікам настаўніка, дзе ён спаў, стаяў глухі шум ад галасоў цельшынскага жыхарства. Гэты шум часамі гусцеў і павялічваўся, але голас бабкі спыняў яго, бо бабка не хацела трывожыць «паніча». Лабановіч прачнуўся і стаў прыслухоўвацца. Дзверы з двара то адчыняліся, то зачыняліся. У кухні тупалі, штоўхаліся; грукалі збаны, глякі і бутэлькі, а ўвесь гэты шум пакрываўся і заглушаўся шумам вады. Вада лілася з вёдзер у цэбар. Настаўнік адзеўся. Адчыніўшы дзверы, ён убачыў поўную кухню палешукоў і паляшучак, дзяўчат, маладых і старых кабет. Усе яны праціскаліся да цэбра і бралі адтуль ваду. Старожка кіравала ўсёю гэтаю справаю і падлівала ў цэбар ваду. Убачыўшы настаўніка, усё гэтае зборышча спаткала яго вельмі прыветнымі ўсмешкамі.

— Што гэта, бабка, тут робіш?

— Ваду, панічок, свянцоную даю.

— Ах, праўда! — прамовіў настаўнік.—Сёння-ж вадохрышчы. Хіба бацюшка свянціў?

— Не, панічыку. Памятаеце, прыязджаў бацюшка хатовіцкі служыць малебен у школе? Вось засталася ад малебну вада. Я пераліла яе ў бутэлечку, а цяпер, бачыце, мы разбавілі яе, і людзі бяруць свянцоную ваду.

— Дык гэта-ж трэба да царквы паехаць ды на Іардань пайсці і адтуль вады набраць.

— Далёка, панічыку, ездзіць,—важна і аўтарытэтна прамовіў стараста.

— Усё роўна, — махнуў рукою Сцяпан Рылка, той самы, што калісь вазіў настаўніка да воласці.

На працягу гадзіны часу ўсё сяло набрала сабе свянцонай вады. Бабка ў гэты дзень адчувала сябе найважнейшаю асобаю ў сяле.

Колькі разоў заклікаў Лабановіч цельшынцаў да школы. Ва ўсе хаты разносілі вучні весткі аб тым, што вось у такі вечар настаўнік запрашае жыхароў у школу, дзе ён будзе гаварыць і чытаць. На першы вечар народу навалілa поўная школа, нават месцаў не хапала. Як-ні-як, гэта ўсё-ж-такі было цікава для палешукоў. Палешукі, галоўным чынам, сталыя людзі, важна селі на лаўках, а

дзяўчаты і маладыя хлопцы збіліся каля дзвярэй, пашчыпваючы адны другіх і перасмейваючыся.

Калі ўсе сабраліся і пазаймалі месцы, прышоў настаўнік. У кароткіх словах ён выясніў слухачам, дзеля якое мэты сабраў іх сюды і ў аснову свае прамовы палажыў тую думку, што чалавек павінен імкнуцца, каб жыццё было добрае і карыснае, якім чынам можа паляпшацца яно, як трэба ісці чалавеку, каб гэта паляпшэнне было сапраўдным і значным. Ён стараўся зацікавіць слухачоў, прыводзіў жывыя прыклады з іх жыцця, праўдзівыя, простыя і зразумелыя. Ён добра падгатаваўся да прамовы, гаварыў гладка, часамі з натхненнем. Але яго вельмі здзівіла, што дзяўчаты зусім не слухалі і больш цікавіліся сваімі кавалерамі, чым яго прамоваю. Старыя палешукі хоць і слухалі, але то той, то другі шырока расчынялі сківіцы і пазяхалі. А ў канцы прамовы Максім Цялушка зазначыў:

— Усё гэта праўда, панічок. Але куды ўжо нам вучыцца? Няхай хіба яны вучацца, а мы ўжо так дажывем.

Пры слове «яны» Максім паказаў рукою на вучняў.

XXII

Зрабіўшы яшчэ адну ці дзве такія спробы і заўважыўшы, што з кожным разам лік слухачоў памяншаецца, Лабановіч махнуў рукою. Але што было рабіць і чым яму заняцца? У будныя дні зранку да вечара ён быў у школе. Але прыходзілі доўгія зімнія вечары. Куды было падзець гэты вольны час? Ён садзіўся за чытанне, зубрыў на ўсякі выпадак розныя падручнікі, пісаў лісты да сяброў, таксама закінутых у глухія куткі Беларусі; нават паспрабаваў весці дзённік, куды запісваў свае думкі, настроі і перажыванні. Спярша гэты дзённік яго моцна захапіў, і Лабановіч сядзеў над ім цэлымі гадзінамі. Разумеецца, у дзённіку самае важнае месца адводзілася адной дзяўчыне. Боязнь, каб дзённік не папаў каму-небудзь у рукі і не расчыніў таямніцы яго душы, прымушала шукаць адмысловыя спосабы і формы запісаў, ужываць розныя алегорыі. Але праз тыдзень пісанне было закінута, бо самому аўтару яно здалося вельмі наіўным і смешным.

А што-ж гэта дзяўчына, якая так моцна парушыла спакой маладога настаўніка, што думала яна? А яна загасцілася ў Гродзеншчыне і, як відаць, не вельмі спяшалася дадому. Такая няўвага з боку Ядвісі крыўдзіла і абражала яго. Лабановічу хацелася, каб яна хутчэй вярнулася сюды, не з тае прычыны, што ён зараз-жа збярэцца і пабяжыць да яе. Не, зусім не. Ён проста хоча паказаць ёй поўную няўважнасць да яе асобы. Ён нават колькі разоў пройдзецца ўдзень каля яе вокан, але і галавы не паверне ў яе бок і знаку не дасць, што яна цікавіць яго, што яму без яе цяжка і сумна. Ён толькі нацешыцца сваёю помстаю, але нічога не скажа аб гэтым.

У святочныя дні было яшчэ горай, бо яшчэ больш было вольнага часу. Лабановіча цягнула ў людзі, але ён цвёрда пастанавіў нікуды не хадзіць. Дый куды, сказаўшы праўду, пойдзеш? Курульчука няма, на Прыпяць перабраўся. Лабановічу вельмі шкада было Курульчукоў. Аб Марыне асталіся адны толькі чыстыя і прыемныя ўспаміны. Часамі малады настаўнік наракаў сам на сябе, чаму бліжэй не пазнаёміўся з ёю. Такая была мілая і слаўная дзяўчына, і напэўна было ў яе найлепшае сэрца. Што-ж замінала яму бліжэй стаць да Марыны?.. «Эх, — сказаў ён сам сабе,— так лепей». Да пана падлоўчага таксама не хацелася цяпер заходзіць, хоць ён, праўда, заклікае, і Лабановіч раней ні разу не адмовіўся сесці з ім за стол, каб добра выпіць і закусіць знамянітымі літоўскімі калдунамі.

Падвыпіўшы, падлоўчы быў у гуморы; ён успамінаў тады свае маладыя кавалерскія гады, свой жывы і гарачы нораў, свой спрыт да паненак.

— Я не ведаю, што цяпер за кавалеры, — казаў зневажальна пан Баранкевіч: — ні рыба, ні мяса. Я, бывала, на галаве хадзіў! Падыдзеш да паненкі і так і гэтак. Бывала, у морду табе дасць — ну, і нічога. Хіба гэта абраза для кавалера, калі часамі заробіш ад паненкі па мордзе?.. Не, трэба табе, пане прафесару, з паннаю Людмілаю пазнаёміцца. А то сядзіш ты тут, як пень на дарозе... Калі-небудзь мы паедзем з панам да Завітанак, трэба-ж крыху разварушыцца ды павучыцца, як каля паненак хадзіць.

— Куды-ж ужо мне патыкацца да завітанскае красуні,— сказаў Лабановіч,— каля яе ўжо вельмі завозна.

— То што?.. Гэ! Бывала, толькі і сунешся туды, дзе кавалеры кішаць. Вось тут-та і ўся цікавасць, каб іх пададціскаць, насы ім усім нацягнуць і да сябе паненку прывабіць.

Падлоўчы не прамінаў здарэння навесці апавяданне на гэтакую тэму, дзе яму самому прыходзілася выступаць у якасці шчаслівага кавалера, які браў верх над усімі іншымі.

Пані падлоўчая, давольная і шчаслівая, слухала гэтыя выдатнасці свайго грознага мужа і, нібыта не верачы, казала:

— Ну, ты ўжо скажаш.

— А мне што? — важна зазначаў Баранкевіч. Ён быў глыбока пераконаны ў праўдзе ўсяго расказанага і ў правільнасці свайго кірунку ў гэтых справах. — Я не любіў каля паненак кісялём сядзець.

Потым падлоўчы падыходзіў да музычнае скрыначкі, заводзіў тыя кружкі, якія яму асабліва падабаліся, і падпяваў басам, у такт мелодыі памахваючы рукою. Другія кружкі заводзіліся спецыяльна для таго, каб аддацца смутным успамінам далёкага мінулага. Пан падлоўчы тады сядзеў нахмураны, цяжка соп носам і думаў. Пасядзеўшы крыху такім чынам, ён падымаўся з месца і ішоў у свой пакой на супачынак.

Лабановіч звычайна сядзеў яшчэ колькі хвілін і слухаў паню падлоўчую. Яна парывалася сказаць вельмі многа, яна хацела расчыніць сваю душу, выліць з яе ўсю тугу, увесь смутак свой, але словы ўпыняліся, не адпавядалі думкам, што імкнуліся знайсці найболей дакладную форму і не знаходзілі. Колькі разоў падкрэслівала пані падлоўчая, што яна вельмі паважае пана Лабановіча і лічыць яго як-бы за роднага. Нясkладна і перарывіста зазначала яна непаслушэнства і свавольства Чэся, зварачаючы ўвагу на тое, што ёй, як мачысе, вельмі трудна з ім справіцца, але яна цярпліва нясе свой крыж і незаслужана церпіць з-за хлопца.

Гаварыла пані падлоўчая ціха, задыхаючыся і кідаючы баязлівыя погляды ў той бок, куды пайшоў Баранкевіч. У нясkладных, балючых і палахлівых словах было многа недаказу; у іх чуўся страх і сорам гэта-

га спавядання перад чужым чалавекам; адчувалася мітусенне яе душы, неадпаведнасць таго становішча, якое яна займае ў сям'і пана падлоўчага, з тым, на якое давала ёй права паходжанне і выхаванне.

Лабановічу прыкра было слухаць такія скаргі, бо яны як-бы ставілі яго ў ролю суддзі і прымушалі так ці іначай умяшацца ў чужое жыццё, а гэтага яму не хацелася. З другога боку, таксама і шкада было паню падлоўчую: відочна, ёй было тут цяжка. Але разам з гэтым і нейкае варожае пачуццё супраць пані падлоўчай падымалася ў Лабановіча. Для яго было незразумела, як яна так пакорна, без усякага змагання, пагадзілася са сваёю доляю і не мае сілы скінуць з сябе гэты крыж жыцця.

— А скажыце, калі ласка,— не ўтрымаўся раз Лабановіч, — што звязвае вас з сям'ёю пана падлоўчага? Вы тут — чалавек вольны. Цяжка вам, вы чуеце несправядлівасць, — што-ж вас можа ўтрымаць ад таго, каб кінуць гэта жыццё і стаць вольным чалавекам?

На твары пані падлоўчай адбіўся жах. Гэта думка, як відаць, ні разу не прыходзіла ў яе галаву. Нерухомая і маўклівая, сядзела яна за сталом, сціснуўшы рукамі галаву. Потым пані ўсміхалася нейкаю кіслаю ўсмешкаю, як-бы хочучы сказаць, што ўсё гэта — глупства і што аб гэтым не варта было і гаворку пачынаць, а жыць на свеце наогул цяжка і наогул трэба пагадзіцца са сваёй доляю. Лабановіч сказаў тады ёй нешта такое, што так ці іначай магло палепшыць настрой, развітаўся і пайшоў з дому Баранкевіча.

Яшчэ адно здарэнне прыпомнілася цяпер настаўніку. Неяк на гэтых днях, па часе размовы з паняй падлоўчай, зайшла яна вечарам да яго. Пані была моцна ўсхваляваная і заплаканая.

— Выбачайце, калі ласка, што я зайшла да вас, — прамовіла яна, — але я вас вельмі паважаю і лічу вас за роднага... Божа мой! Што мне рабіць? Што рабіць мне? Няма сілы больш цярпець!

Лабановіч дагадаўся, што падлоўчы Баранкевіч падняў у доме буру, але не распытваўся аб гэтым, і сама пані падлоўчая чамусь не гаварыла, не вінавацілa свайго мужа, а толькі казала, як ёй цяжка наогул.

— Што-ж вам можна параіць? — запытаў Лабановіч. — Калі маеце куды паехаць, то што-ж? Паедзьце. Я-б на вашым месцы не пагадзіўся-б з такім жыццём. Якое-ж гэта жыццё?

— Вы ведаеце натуру пана падлоўчага?

— Я чуў. Ну, што-ж паробіш, калі ў чалавека такая натура?

— Ох, мой паночку! Як трудна яму ўнаравіць! Ну, няхай я нягодная, але-ж ён і першую жонку ў магілу ўвагнаў і мяне ўгоніць. — Пані падлоўчая плакала. — І ўсё я вінавата. Чэсь кепска трымае сябе — я ў адказе. То робіш не так, то ходзіш не гэтак! Што-б ні вышла, усё я вінавата.

Лабановіч не ведаў, што сказаць, якую даць параду. Пані падлоўчая выплакалася, вылажыла з душы ўвесь свой смутак і гора і крыху заспакоілася. Усміхаючыся скрозь слёзы, прасіла яна Лабановіча нічога нікому не казаць. Яна яшчэ раз сказала, што толькі з ім пагаманіла аб гэтым, бо лічыць яго вельмі добрым, зусім родным чалавекам, развіталася і вышла, просячы прабачэння.

Лабановіч пачуўся лягчэй, бо яму вельмі цяжка было слухаць гэту споведзь, тым болей, што ён тут не мог даць ніякае дапамогі. Апрача таго, яму наогул было прыкра слухаць усе гэтыя згрызоты ці ўмешвацца ў чужое жыццё.

«І вось-жа будзе цярпець і нікуды не паедзе, — думаў Лабановіч пра паню падлоўчую. — А што, напраўду, прымацоўвае яе тут?»

Лабановіч задумаўся. І была-ж у людзей маладосць, былі ў іх светлыя надзеі на жыццё. Па сваім гусце будавалі яны шчасце, перажывалі пачатак нейкай прыгожай казкі, і чым скончылася гэта казка? І ці не складае часамі і ён, Лабановіч, цяпер сваю казку?

Ізноў успомнілася панна Ядвіся. Яму стала цяпер ясным і зразумелым, чаму яна так рвалася адгэтуль хоць на колькі тыдняў, абы хоць забыць і адысціся ад гэтага бруду жыцця, ад атруты дамашніх праяў.

XXIII

У гэты вечар Лабановіч быў у нейкім асаблівым настроі. З чаго складаўся гэты настрой, ён і сам не мог сабе вытлумачыць. Нейкае нездаваленне, няяснае адчуванне бяссэнснасці такога жыцця, якім жыве ён, пачуццё адзіноты пачынала закрадацца ў душу. Настаўнік чуў, што яму чагось не стае, чуў, што яму трэба нешта зрабіць, чымся заняцца. Чым? Ён думаў, разважаў, але добрага адказу на гэта пытанне, які мог-бы задаволіць яго, не знаходзіў.

Не! Трэба куды-небудзь пайсці, проста зняцца з месца і ісці. Але куды пайсці? Зайсці да каго? Настаўнік перабраў у памяці сваіх тутэйшых знаёмых. Ну, усё роўна, куды ні накіравацца! Ён узяў табачніцу, падлажыў тутуну, каб закурыць у часе вандравання, і стаў збірацца, не ведаючы, куды пойдзе. Добра было-б даведацца да якой блізшае школы, але бліжэй, як за пятнаццаць вёрст нідзе не было тут школы. Ён ужо адзеўся і сабраўся як мае быць.

— Вам ліст, панічок, прынеслі ад старасты! — прамовіла бабка, увайшоўшы ў пакойчык.

Зірнуўшы на канверт, на добра знаёмы характар рукі свайго блізкага сябра, Лабановіч распрануўся і пачаў чытаць.

Бабка стаяла, падпершы рукою шчаку, і назірала за выразам твару настаўніка. Паміж іншым, сябар пісаў, як яго падпаілі і хацелі ажаніць з адною дзяўчынаю, сваячкаю нейкага дыякана, і як яму прыходзілася выратоўваць незалежнасць свае асобы, для чаго ён збег самым нечаканым чынам і ў самую рашучую хвіліну.

Вясёлая ўсмешка асвятляла твар Лабановіча. Гледзячы на яго, смяялася і бабка.

— Ад каго-ж, панічыку, такі ліст?—запытала цікавая бабка.

— А гэта, бабка, піша адна паненка. Піша, што калі прыеду да яе ў сваты, то пойдзе за мяне адразу, — адказаў ён.

— А што-ж, панічыку, думаць? Абы дзяўчына была добрая, — крыху пакрыўдзіўшыся, заўважыла бабка.

У канцы ліста сябар зрабіў прыпіску. Ён паведамляў

аб смерці сябра, што разам з імі скончыў семінарыю. Гэта вестка моцна ўразіла Лабановіча. Няўжо гэта праўда? Андрэй Лабузька, той самы Лабузька, чыё прозвішча так блізка стаяла да яго прозвішча ў спісе, няўжо ён памёр? Ці можа гэта быць?

І вобраз маладога хлопца, сакаўнога, поўнага жыцця, сілы, устаў, як жывы, перад Лабановічам. Успомніўся яму цяпер адзін пусты, нязначны выпадак, калі ён, жартліва праракаючы лёс сваіх сяброў, сказаў вясною мінулага года:

— Ты, Лабузька, нядоўга пажывеш на свеце!

Гэта гаварылася дзеля смеху, бо вельмі трудна вязалася думка аб смерці Лабузькі з самым Лабузькам, так многа было ў ім здароўя і жыцця!

Лабановіч апусціў галаву і сядзеў нерухліва. Нядаўні смутна-няясны настрой цяпер забыўся. Зусім іншыя думкі выклікала ў ім гэта вестка аб смерці Андрэя. Няпэўнасць і нязначнасць людскога лёсу і гэта смерць, смерць усемагутная і неадхільная, як злая здань, пачынала трывожыць яго і зноў ахапіла ўсю істоту.

Лабановіч уставіўся ў адзін пункт і колькі хвілін пазіраў, не міргаючы вачамі. Патрывожанае ўяўленне вельмі жыва намалявала яму вобраз мёртвага Андрэя. Нерухлівы. Скрозь сіняватую плеўку вечка вытыркаюцца пагаслыя вочы. Губы цесна зацяты, і смерць адбіла на іх пячаць сваю. Мярцвячая бледнасць і жаўцізна разліты на твары... Гэта — чалавек! Гэта — тая неспакойная форма, у якой так часта змяняецца змест! Нейкі гаспадар пакінуў яе. Яна перш называлася чалавек, Андрэй Лабузька, а цяпер — труп!.. Дзе-ж гэтыя парыванні-імкненні? Дзе яны? І куды дзеўся сам гаспадар? Што ёсць там, па другі бок?..

Лабановіч жахнуўся. Ён як-бы пачуў, што нехта неадхільны, грозны і няўмольны замахнуўся над ім цяжкаю булавою і вось-вось апусціць яе на галаву. А ён такі мізэрны, такі нікчэмны, што нават голас пратэсту, нават голас просьбы не можа сарвацца.

Бабка пазірала на настаўніка. Яе таксама ахапіў нейкі страх; такая відочная змена зрабілася раптоўна з «панічом», і выгляд у яго нейкі дзіўны.

Яна павольненька адступіла на крок, бліжэй да дзвя-

рэй, не зводзячы з яго вачэй. Крыху пастаяўшы, яна паківала сама сабе галавой і ціхенька вышла з пакойчыка. Стоячы за дзвярамі ў кухні, яна колькі хвілін прыслухоўвалася. Але настаўнік трымаўся ціха. Бабка крыху заспакоілася.

Лабановіч устаў і прайшоўся па пакоіку. Думка аб неадхільнасці смерці моцна ўзрушыла яго і засела ў мазгах.

«Калі-б я сказаў каму: асцерагайцеся мяне — я нашу ў сабе смерць, напэўна, на мяне паглядзелі-б, як на вар'ята, і ва ўсякім разе спужаліся-б, — падумаў Лабановіч.— І тым не меней гэта так. Але чаму-ж людзі аб гэтым не думаюць?.. А можа, і думаюць і напэўна многа думаюць, толькі думкі гэтыя трымаюць пры сабе, бо што казаць пра іх таму, хто і сам мае такую-ж долю?»

Ранейшыя думкі аб смерці зноў прышлі цяпер яму ў галаву. Часамі ідзеш у дарозе. Дарога трудная, ногі баляць, а дадому яшчэ далёка. І думае падарожны: «Будзе-ж такі момант, калі я ступлю на парог свайго дома, і скончыцца мая дарога». «Таксама будзе, — разважаў Лабановіч, — такі момант, калі і я ступлю апошні крок майго жыцця, апошні момант, а там — смерць, там — канец!.. А далей што? Далей — цёмная і жудасная ноч нябыту. А калі гэта так, то ці варта наогул жыць? Жыць, каб памерці?»

Паставіўшы такое пытанне, Лабановіч задумаўся. Ён ніяк не мог пагадзіцца з думкаю аб смерці. У гэты момант яна была для яго найбольшым ворагам на свеце і як-бы засланіла сабою ўсё, здушыла яго, замкнула ў нейкі цёмны і цесны круг.

Ніхто не хоча паміраць, ніхто. Тут яму ўспомнілася панна Ядвіся. Колькі разоў чуў ён ад яе, што яна вельмі хацела-б памерці. Лабановіч ніколі не даваў ёй у гэтым веры, бо цвёрда быў пераконаны ў тым, што кожнаму хочацца жыць, як-бы яму цяжка ні жылося на свеце. Нават глыбокая старасць не хоча ісці ад жыцця. І сказанні народа пацвярджаюць гэта. Як вядома са святога пісання, Матусал жыў больш за ўсіх на свеце. У часе сканання з'явіўся яму бог і спытаў:

— Вось ты меў доўгі век. Скажы-ж мне, як здоўжылася табе жыццё?

— Мне здаецца, што я ўвайшоў у дзверы аднаго дома, прайшоў праз яго і вышаў у другія — так уяўляецца даўжыня майго жыцця.

— Ну, а ці хацеў-бы ты яшчэ жыць?

— Хацеў-бы, божачка.

Падумаўшы, Матусал запытаў:

— Божа! А ці трэба ўміраць другі раз?

— Трэба, — адказаў бог.

— У такім разе я не хачу жыць болей.

Людская мудрасць, такім чынам, зазначае, што страх смерці мацней жыцця, мацней самое смерці. А самагубцы? Жыццё дае многа прыкладаў, калі людзі самі накладаюць на сябе рукі. Як зразумець гэта?

Калі чалавек любіць жыццё, дык што змушае яго на самагубства? Кажуць, у чалавека слабая натура, яму бракуе сілы змагацца з нягодамі жыцця. Калі і сапраўды натура яго слабая, скуль-жа гэта сіла перамагчы страх смерці і падняць на сябе руку?.. Нейкая недарэчнасць. Адно супярэчыць другому.

Лабановіч зацікавіўся гэтым пытаннем, яму хацелася як-бы стаць на месцы гэтых самагубцаў і паглядзець іх вачамі на справу жыцця і смерці. Цікава тут яшчэ адна акалічнасць: кожны самагубца мае нахіленне да таго ці іншага спосабу самагубства — адны страляюцца, другія вешаюцца, трэція топяцца, кідаюцца пад машыну, труцяцца, рэжуцца брытваю. А ўсе, наогул, імкнуцца выбраць найболей лёгкі спосаб расквітання з жыццём. І яшчэ некаторыя з іх маюць звычай пакідаць перад гэтым запіскі, кароценькія, а то і доўгія. Лабановіч нядаўна чытаў у газеце запіску аднаго самагубцы. Ён пісаў: «Каб не так страшна было ўміраць, трошкі выпіў».

Нечакана для самога сябе, Лабановіч чамусь доўга затрымаў свае думкі над самагубцамі і самагубствам, непрыметна пачаў уваходзіць у ролю самагубцы.

«А што такое смерць? Момант — і больш нічога няма. Тады і думаць аб смерці не прыдзецца, і нічога чалавеку не трэба будзе», — разважаў ён.

Нічога не помнячы і не даючы сабе яснага адказу ў тым, што ён робіць, нічога не ведаючы, што ён будзе рабіць, Лабановіч адчыніў шуфлядку ў стале. У самым канцы шуфлядкі, завалены паперамі і кнігамі, ляжаў рэ-

вальвер, просценькі, на шэсць патронаў рэвальверчык. Часамі хадзіў Лабановіч у лес, каб пастраляць у цэль з гэтага рэвальверчыка.

Цяпер гэты рэвальвер у яго вачах меў зусім другі выгляд і значэнне. Узяўшы яго ў рукі, настаўнік аглядзеў рульку, адкуль выглядала куля.

«Вось толькі прыставіць да віска, пацісну́ць дужку, узвёўшы гэту брамку, — і болю не пачуеш!.. Не, боль, напэўна, будзе, але ўсё гэта зробіцца так борзда, што мозг не паспее вызначыць выніку падзеі».

Нейкія злачынныя думкі навялі як-бы туман на маладога хлопца і прычаравалі яго да свайго страшнага кругу.

Ён зноў узяў рэвальвер. І цікава: нейкую ўладу меў цяпер гэты рэвальвер над настаўнікам. Яго прыцягала і гэта кулька, што выглядала з рулі, як галоўка нейкага гада. Ужо колькі разоў пазіраў ён на яе. Але раптоўна нейкі промень асвятлення блі́снуў у галаве. Ён адкінуў ад сябе рэвальвер. Халодны пот выступіў на ілбе. Цяпер толькі заўважыў Лабановіч, што рукі яго трэсліся, як-бы па яго душы прабег нейкі віхор, усё засцілалася нейкім туманам. Ён пачуў вялікую палёгку, нібы пасля цяжкае хваробы, а ўсё тое, што пранеслася так нядаўна перад ім, здавалася нейкім сном.

— Панічыку! — пазвала бабка, толькі што ўвайшоўшы на парог пакойчыка. — Мусіць вы, панічок, нядобрае пісьмо атрымалі?

Настаўнік моцна здзівіўся.

— Чаму ты, бабка, так пытаеш?

— Відаць было, панічыку, па вас, — прамовіла яна, акінуўшы яго бачлівым поглядам. — І ведаеце, панічыку, — таемна прамовіла бабка: — Я ізноў вам шаптала! Шаптала, далі-бог, шаптала! Вы любіце шуткаваць з мяне і з маіх шэптаў, а я ўсё-ж шаптала вам, бо мне стала вас шкада.

— А проці чаго ты мне шаптала? — запытаў зацікаўлены настаўнік.

Бабка глядзела на яго колькі хвілін.

— Каб адхіліліся ад вас нядобрыя мыслі, — ціха прамовіла бабка, гледзячы настаўніку ў вочы; яна як-бы хацела штось адгадаць у іх.

Лабановіч пачуўся так, як-бы яго зласілі ў чымсі непрыемным. Непрыемна было і тое, што бабка ў гэты момант мела над ім перавагу.

«Цікава», — падумаў настаўнік.

Цяпер нябожчык Андрэй як-бы адышоўся ад яго, а разам з ім адышліся і думкі аб смерці.

«На свеце, мусібыць, усё робіцца шмат прасцей, як гэта нам здаецца», — заключыў ён свае думкі аб смерці.

XXIV

Злотаіскрыя вобразы, як усмех вясны, момантамі ўставалі ў памяці Лабановіча, хвалявалі яго, асыпалі праменнямі радасці і разгортвалі прад ім малюнкі не так даўно мінулага дзяцінства. Яны прыходзілі самі, аб чымсі гаманілі і кудысь клікалі, пакідалі ў душы лёгкі след засмучэння. Аб чым? Аб нейкай страце, аб тым, што не вернеш і што складае скарб, дарагі скарб памяці. Ён бачыў дубы на беразе Нёмана, крэпкія, пышныя дубы з развіслымі вярхамі. На жаралістых камлях гэтых дубоў адбіла свае пячаці несупынная плынь часаў. Яму ўсміхалася светласіняе неба і яркім бліскаганнем асвятляла далёкія прыгожыя вобразы: пахучы луг, роўныя пакаты ўзгоркаў у мутнасіняй далі, старую хвою з буслявым гняздом... Бліскучы дзень, таемнае грукатанне надземных абшараў — гоман-воклік гразнапавабных хмар, што шырокаю сцяною засланялі неба і выбухвалі купчастымі клубкамі бела-ружовых воблакаў... Не! Іх не зловіш, не замацуеш словамі, але імі жыве-гарыць душа!

Лабановіч адчуваў нейкую радасць. Яму было лёгка і прыемна. Ён чуў, як моцна звязан ён з жыццём. Яму па душы было гэта адзіноцтва, гэты лес і дарога, па якой ён цяпер ішоў. Куды ён ішоў? Нікуды. Яму проста люба было пабыць у лесе, паглядзець на слаўныя адзінокія хвоі, на старасвецкія дубы па краях палянкі. Ён многа разоў хадзіў тут і цяпер дзівіўся сам сабе, як гэта не звärачаў ён раней увагі на тыя малюнкі, якія бачыў прад сабою цяпер. Вакол было ціха і глуха. Усюды ляжаў снег, але ў паветры патыхала чымся новым, і чулася скорая вясна. Лабановіч сеў на роўна спілаваны пень, сядзеў і

штосьці думаў. Але хіба гэта былі думкі? Не, перад ім праходзілі вобразы за вобразамі, цэлы іх шнур плыў і плыў у яго ўяўленні. Так праседзеў ён некаторы час, пакуль не пачуў глухі тупат конскіх ног і лёгкае шорганне і пасвістванне вузкіх, кованых жалезам палазоў. Ён падняў галаву. Бойкі конік, што дружнаю рыссю зараз-жа выскачыў з-пад навіслых ялін на прасторную палянку, борзда імчаў лёгкія прыгожыя сані, у якіх звычайна ездзіць заможная шляхта або сярэдняй рукі панкі. На высокім сядзенні, па-запраўску трымаючы туга нацягнутыя раменныя лейцы, сядзела маладая паненка. На ёй было лёгкае футра; зімняя шапачка, надзетая крыху набок, вельмі ішла да яе твару. Здаровы холад зімы авеяў і разрумяніў ёй шчокі. Ад стройнае фігуркі так і патыхала здароўем і жыццём. Яна кінула зацікаўлены погляд на незнаёмага хлапца. Відаць, яе здзівіла гэта спатканне, а можа, нават і крыху спалохала: чаго сядзіць зімою на дарозе гэты чалавек? Яна шпарчэй пагнала каня. У колькі хвілін вазок знік з вачэй Лабановіча, зноў ускочыўшы ў лес пад шалаш калматых ялін і хвой. Але ён паспеў разгледзець і запамятаваць твар гэтае паненкі: тонкія бровы, бойкія сіняватыя вочы, пухлыя, прыгожа абрысаваныя губы. Дзяўчына была досыць прыгожая, як здалося Лабановічу.

«Напэўна гэта і ёсць тая краля, за якою так падаюць усе хатовіцкія кавалеры, — падумаў Лабановіч. — Ну, не такая ўжо яна цікавая, як можна было-б спадзявацца». Тым не меней ён устаў і рушыў у той бок, куды паехала дзяўчына. Праўда, ён пайшоў не дзеля таго, што ў гэты бок паехала завітанская красуня, ён проста падаўся дадому. Але, сказаць праўду, у яго-такі была думка — а можа, ён спаткаецца з ёю. Усё-ж было-б цікава паглядзець на яе яшчэ раз, разгледзець лепей. Ды ўжо, калі на тое пайшло, трэба зрабіць так, каб і на мезены палец не даць падумаць ёй, што ён шукае спатканія або зацікавіўся ёю. Не, няхай на гэта яна выбачае. Ён проста зробіць так, каб гэта вышла зусім выпадкова. Мінуўшы Сяльцо, Лабановіч надумаўся зайсці да старога Абрама, выпіць бутэльку піва і крыху адпачыць.

У Абрама была чыстая каморка, куды часамі заходзілі больш важныя госці, чым простыя цельшынцы, якія звы-

чайна таўкліся ў агульным памяшканні-карчме, яшчэ па старому звычаю, калі Абрам трымаў шынок. Увайшоўшы ў гэту каморку, Лабановіч раптоўна спыніўся: за столікам сядзела тая самая дзяўчына, якая нядаўна праехала і аб якой ён усё-ж-такі думаў. Яна разглядала карталюшкі, якія падаў ёй стары шынкар, і падрахоўвала лічбіны. Лабановіч ніяк не спадзяваўся спаткаць яе тут і прышоў у такое замяшанне, што не ведаў, як яму быць: далей ісці ці вярнуцца назад. Панна Людміла,—бо гэта была яна,— зараз-жа падмеціла яго нясмеласць і замяшанне, і гэта ёй, як відаць, спадабалася. Яна ўскінула на яго свае сінія вочы. Лёгкая ўсмешка бліснула на яе твары. І гэта ўсмешка як-бы казала: «А я і ведала, што ты да мяне прыдзеш». Панна Людміла была крыху знароўлена кавалерамі, бо ўсе яны ў тутэйшай акрузе лічылі сваім абавязкам аддаць ёй падатак свае кавалерскае ўвагі. Адзін толькі Лабановіч ухіляўся ад гэтага і ўпарта не хацеў пазнаёміцца з ёю.

«Напэўна думае, што я шукаю спаткання», — падумаў настаўнік і яшчэ больш замяшаўся.

— Выбачайце! — прамовіў ён, крута павярнуўся і вышаў вон з каморкі.

«Як дрэнна і па-дурному вышла ўсё гэта, — разважаў сам з сабою Лабановіч. — Выходзіць так, як-бы я збаяўся яе і збег. Фактычна гэта так і ёсць. І яна напэўна смяецца з мяне. І другім яшчэ раскажа». Ён моцна быў нездаволены сабою, бо трымаўся, як які-небудзь школьнік у прысутнасці дзяўчыны, што хоць і незнаёма з ім, але добра ведае яго, як ведае і ён яе. А панна Людміла, застаўшыся адна, шчыра пашкадавала аб тым, што гэты дзівак так неспадзявана знік адгэтуль, як неспадзявана і з'явіўся тут. Ёй цікава было паглядзець на гэтага дзікуна і пустэльніка, які яшчэ аж дасюль не быў у Завітанках. З другога боку, ёй чулася і нейкае зняважанне яе дзявочае асобы, бо ніякі кавалер не зрабіў-бы таго, што зрабіў гэты пустэльнік, як у сваіх думках называла панна Людміла цельшынскага настаўніка.

Вышаўшы на вуліцу, Лабановіч пачуў незвычайны крык і лаянку. Супраць стараставай хаты стаяла грамада палешукоў. У сярэдзіне яе метушыліся два палешукі, па-браўшыся загрудкі. І па меры таго, як пасуваліся байцы,

расступалася і грамада палешукоў, даючы ім месца. Зацікаўлены Лабановіч прыбавіў кроку і накіраваўся да грамады. Першы кінуўся яму тут у вочы Лявон Шкурат. Ён быў бледны, без шапкі, адна шчака яго была акрываўлена. Але ён моцна трымаў свайго праціўніка, Кандрата Куксу, стрыечнага брата старасты. Тут-жа ў якасці наглядальніка стаяў і сам стараста.

— Як вам не брыдка, мужчыны, — звярнуўся Лабановіч да грамады. — Дапусціць, каб людзі крывавілі адзін другога! Разніміце іх!

Некаторыя з палешукоў, якія стаялі бліжэй, прыветна ўсміхнуліся настаўніку, некаторыя падалі яму руку. Другія былі захоплены бойкаю і не звярнулі на настаўніка ніякае ўвагі. А Шкурат і Кукса куксілі адзін аднаго і не знайся. Стараста, як і ўсе іншыя, таксама трымаў строгі нейтралітэт.

— Стараста! Які-ж вы начальнік? — напаў Лабановіч на Рамана: — Як-жа гэта вы дапушчаеце, каб людзі на вашых вачах калечылі адзін другога?

Стараста правёў рукавом па носе, састроіў сваю звычайную кіслую міну і важна прамовіў:

— Не трэба, панічок, мяшацца. Няхай сабе яны патузаюцца — самі разыдуцца. Умяшайся — горш будзе.

— Госпадзі! Што вы за людзі такія!

Лабановіч, праціснуўшыся скрозь грамаду, апынуўся поруч з байцамі.

— Што вы робіце, дурні?! — крыкнуў ён раз'яраным байцам і стаў паміж імі.

— Ён маю юшку ўкраў, чорт каравы, ды яшчэ біцца са мною будзе?! — крычаў Лявон Шкурат.

— Ты мяне злодзеем называеш, дзяркач ты смярдзючы?! Адыдзіся, паніч!

Кандрат Кукса замахнуўся. Лабановіч і сам пачуў нейкую злосць і таўхануў яго ў грамаду, а сам схапіў Лявона і борздзенька адвёў яго ў другі бок. Палешукі ўзварухнуліся, прытрымалі Кандрата.

— Завошта вы біліся, Лявон? — спытаў настаўнік.

— Юшку маю забраў.

— Якая гэта твая юшка? Калі хочаш ведаць, дык гэта казённая юшка: ты яе са школы ўзяў, як школа будавалася, — казаў усё яшчэ сярдзіты Кукса.

— А каб яна-ж згарэла была, гэтая праклятая юшка, — сказаў Лабановіч. — Ну, падумайце, паварушыце мазгамі: ці варта гэта юшка, каб з-за яе так калаціцца? Ну, колькі яна каштуе?

— Рубель я заплаціў за яе, — адказаў Лявон.

— Украў ты яе, а не рубель заплаціў!

— Ну, на табе рубель, супакойся і ідзі дадому. Ляж на печ і ляжы, покі не астыне твая кроў.

Настаўнік дастаў кашалёк, выняў срэбраны рубель і аддаў яго Лявону.

Лявон узяў рубель і пашыбаваў у сваю хату.

— Бярэ рубель, — з зайздрасцю прамовіў Кукса: — а каб цябе, гад, за жывот узяло.

Лабановіч таксама пайшоў да сябе ў школу, думаючы, што ён зрабіў вельмі добра, і нават ганарыўся сваім учынкам.

Вечарам таго-ж самага дня, калі ўжо было цёмна, з вуліцы зноў пачуўся крык і лямант. Бабы плакалі і галасілі, як па нябожчыку.

— Лявона забілі, панічыку! — сказала бабка, ускочыўшы ў пакой.

— Хто забіў!?

— Кукса. Узяў аскабалак і каравуліў Лявона. Як толькі той паказаўся, цопнуў па галаве, — нават не пікнуў.

Лабановіч выскачыў на вуліцу. Там былі людзі. Сярод вуліцы на брудным снезе ляжаў нерухомы Лявон. Над ім галасілі бабы.

— Не трэба было, панічыку, мяшацца, — аўтарытэтна зазначыў староста: — у нас гэта не першыня, паб'юцца і разыдуцца. Набярэцца паганая кроў, трэба-ж яе выпусціць, і тады ўсё ціха і лагодна.

Лявон, праўда, быў толькі аглушан, паляшуцкі чэрап быў яшчэ досыць крэпкі, каб Лявон не мог ачухацца і падняцца на ногі.

XXV

Выходзіла так, што староста казаў праўду. Гэтага здання напэўна трымалася і ўсё цельшынскае насельніцтва... І які чорт падбіў яго прыткнуць і свае тры грошы?

Каб не гэты паганы рубель, нічога такога і не вышла-б. Добра яшчэ, што ўсё гэта так скончылася. А мог Лявон і не падняцца. І так яго на руках у хату занеслі.

Лабановіч хадзіў па пакоіку і разважаў над гэтым здарэннем. Яму было крыўдна тое, што сам ён — мужык, а не ведаў мужыцкіх звычаяў і зрабіў па прыказцы: «Уткні мяне, божа, куды мяне не трэба». І, наогул, трэба зазначыць, што ён не ўмее трымаць сябе з людзьмі. Узяць хоць-бы яго сустрэчу з паннай Людмілай... Яму сорамна стала перад самім сабою. Ён нават пачаў сам сябе лаяць, кпіць і насміхацца з сябе. «Дурань ты, брат, дрэнь! Думаеш, што ты разумны, а ўся цана табе — шчарбаты грош... Кавалер!.. Тфу!» З гэтымі думкамі ён прыпыніўся каля люстэрачка. На яго пазіраў другі Лабановіч, надзьмуты і зняважаны. «Ух, рыла!» — прамовіў Лабановіч свайму адбітку і адышоўся. Прыпыніўшыся другі раз каля люстэрка, ён ужо глянуў крыху ласкавей на сябе і спагадна прамовіў: «Нічога, брат, не наракай на мяне: як-небудзь будзем жыць на свеце». Яму тут прыпомніўся адзін чалавек, якога ён ведаў, калі быў яшчэ малы. Гэты чалавек меў звычай размаўляць з сабою самім. Ён гаварыў: «Эх, Паўлючок! Кінь ты ўжо гэтыя згрызоты. Ці ты адзін такі на свеце?» Думкі яго пайшлі ў другім кірунку, і непрыметна настаўнік зноў пагадзіўся сам з сабою. Да яго зноў вярнуўся добры настрой, і, стоячы каля люстэрачка, ён сам сабе строіў міны, сам сабе падсмейваўся. Каб хто пабачыў збоку, то напэўна падумаў-бы, што настаўнік крануўся з розуму.

У гэты момант дзверы з кухні адчыніліся, і ў пакой увайшла бабка.

— Што, бабка, добрага скажаш?

— А нічога, панічыку... Ажыў Лявон.

— Ну, дзякаваць богу, а то ён мяне вельмі напалохаў. Думаў, што не ўстане.

— Гэ, панічыку, ці так яшчэ біліся! Бывала, даўней як завядзецца бойка — усё сяло калоціцца. Пабяруць калы і пачнуць матлашыць адзін аднаго. Проста страхоцце. А гэта, панічыку, глупства!

— З чаго-ж гэта бойка паўставала?

— Панапіваюцца, панічыку, і б'юцца. Ну, вядома — мужыкі. Зімою работы мала, абрыдне так сядзець і пач-

нуць біцца. Проста калы аб галовы ламаліся... — Бабка змоўкла і другім голасам сказала: — Прыехалі нашы паненкі. Толькі што з раз'езду прышлі.

Відаць было, што дзеля гэтае навіны бабка і прышла сюды.

— А я, бабка, заўтра раненька-раненька ў воласць пайду.

— А можа-б, вам стараста падводу даў?

— Не, бабка, пайду памалу. Цяпер масленіца, часу ёсць, можа, і падначую там.

— А што-ж, панічыку, прайдзіцеся. Толькі-ж ножак вашых шкада.

Пайсці ў Хатовічы Лабановіч надумаўся раптоўна. Яму трэба было так ці іначай адгукнуцца на бабчыну навіну, і ён проста адказаў, што пойдзе ў воласць, бо, сказаць праўду, вестка аб тым, што вярнуліся суседкі, яго-такі ўсхвалявала. Настаўніку было і прыемна, што Ядвіся тут, блізка каля яго, але ён не хацеў паказаць гэтага. З другога-ж боку, яму таксама трэба паказаць Ядвісі і нават бабцы, дый сабе самому, калі ўжо на тое пайшло, што панна Ядвіся яго ўжо і не так цікавіць. Апрача гэтага, ён яшчэ не забыў тую крыўду, якую прычыніла яму панна Ядвіся, калі выказвала свой жаль з прычыны разлукі з Негрусем. Але трэба сказаць, што гэта крыўда цяпер жыла толькі ў памяці, а не ў сэрцы яго. Хіба можна так доўга трымаць крыўду на Ядвісю? І якая гэта крыўда, каб хто запытаўся? Хіба Ядвіся сказала гэта сумыслу, каб абразіць яго? Але-ж трэба і характар паказаць, і выявіць станоўкасць і цвёрдасць сваю.

Не! Гэта ён добра прыдумаў: што-б там ні было, а ў Хатовічы ён пойдзе.

На гэтай думцы Лабановіч затрымаўся канчаткова.

Вось толькі пытанне: як рана ён пойдзе ў дарогу? Ці не лепш пайсці крыху пазней і гэтым даць магчымасць Ядвісі пераканацца, што ён ужо напэўна ведае аб яе прыездзе і тым не меней ідзе ад яе. Ён нават пастараецца пайсці тады, калі яна будзе стаяць каля акна або выйдзе на двор, а ён пройдзе з такім выглядам, нібы гэта стаіць не яна, а якая-небудзь Параска, да якой яму вель-

мі мала справы. А калі прыдзецца і спаткацца з ёю, то што-ж? Ён скажа: «Дзень добры!» Нават і пагаворыць з ёю аб самых звычайных драбніцах. Так, толькі так!.. Яму стала нават чагось весела.

Назаўтра, як толькі разднела, Лабановіч быў ужо на нагах. Ён колькі разоў паглядаў на дом пана падлоўчага, але там было ўсё яшчэ ціха. Настаўнік хадзіў нецярпліва па сваім пакоіку і курыў адну папяросу за другою, прыслухоўваючыся да гукаў, што ішлі са двара пана падлоўчага. Ён ужо як мае быць нарыхтаваўся ў дарогу: сабраў курэцкія прылады, паставіў у куток свой кій і, выбраўшы зручны момант, вышаў з дому.

Цельшынская школа стаяла на рагу двух вуліц. Адна вуліца, прасторная, роўная, шырокая, ішла на чыгунку, другая, невялічкая, бегла ў поле і зараз-жа канчалася, перайшоўшы ў дарогу. На перасеку гэтых вуліц, каля саменькай школы, стаяў высачэзны крыж. Ён заўсёды прыцягаў да сябе ўвагу настаўніка і рабіў на яго моцнае ўражанне. Гэты высокі пануры крыж і гэта закінутая сярод палескіх трушчобін школа стаялі, як сіроты, і, здавалася, цесна туліліся адно да другога, як-бы ў іх была адна доля. Лабановіч вышаў на прасторную вуліцу. Па правую руку да вуліцы падыходзіў частакол двара пана падлоўчага. У куточку дворыка, каля самае вуліцы, стаяла студня. Ступіўшы колькі крокаў па вуліцы, Лабановіч згледзеў так добра знаёмую постаць Ядвісі. З вядзерцам у руцэ яна скоранька ішла да студні. Нейкая дрыготка прабегла па яго жылах, а сэрца ў грудзях застукала мацней. Як пахарашэла яна за гэтыя тры тыдні. Ён чуў, што яго моцна цягнула да яе. Але ён стараўся быць спакойным і не выказваць ёй таго, што адчуваў у гэту хвіліну.

Радасць, праўдзівая радасць адбівалася на твары Ядвісі; гэта радасць свяцілася ў яе цёмных вачах, яна снавалася на яе губках, такіх мілых, такіх прыветных!.. Чорт-бы вас пабраў, дзяўчаты: баламуціце вы нашага брата і годзе!

Але Лабановіч узяў сябе ў рукі. Нават і ценю радасці не паказаў ён, што ўбачыў дзяўчыну. Параўняўшыся з ёю, — а Ядвіся стаяла і чакала яго, — ён досыць прыветна сказаў:

— Дзень добры!

Панна Ядвіся адказала яшчэ прыветней на яго прывітанне.

— Ну, як-жа вам гасцілася? — запытаў Лабановіч. але запытаў так, як пытаюць тады, калі трэба сказаць хоць што-небудзь: без усякага пачуцця і цікавасці да таго, аб чым пытаўся.

— Ох, як было весела! — адказала Ядвіся. Яна хацела яшчэ штось сказаць, але ўтрымалася. — А як вы тут жылі?

— Жыў вельмі добра: чытаў, пісаў, вучыў, сам вучыўся, хадзіў гуляць і пачуваўся як не трэба лепей.

— А куды-ж вы сабраліся?

— Надумаўся да воласці даведацца.

— І нічога тут не шкада вам пакідаць? — спытала Ядвіся, і вочы яе засмяяліся хітраю ўсмешкаю. Сэнс гэтага пытання быў ясны для іх абоіх.

Лабановіч на момант апусціў вочы, потым паглядзеў на Ядвісю:

— Вас мне шкада пакідаць, — адказаў ён ні-то праўдзіва, ні-то з насмешкаю — разумей, як хочаш.

Яму нават зусім не хацелася цяпер ісці ў Хатовічы, але варочацца назад ужо не было як.

— Ну, бывайце здаровы! — пакланіўся ён і пайшоў.

— А вы скора думаеце вярнуцца? — спытала Ядвіся.

— І сам добра не ведаю. Пабачу там, — адказаў Лабановіч, ужо адышоўшыся на колькі крокаў. Ён яшчэ раз пакланіўся і зачасціў так шпарка, як-бы хацеў паказаць гэтым, што яму няма калі размаўляць з ёю.

Увесь час размовы з Ядвісяю Лабановіч чуў, што робіць нейкую гвалтоўнасць над сабою, што гаворыць зусім не тое, што думае і што пачувае сапраўды.

«Чаму я, як злодзей, таюся ад яе і ад людзей? — думаў, ідучы вуліцаю, настаўнік: — Чаму не сказаць ёй, што я так шчыра і так моцна палюбіў яе. І праўда: чаго я так віляю, нашто замятаю свае сляды, збіваю яе з тропу? Нашто гэта лганнё? Няўжо так робяць і іншыя? Проста няма ў мяне смеласці. Я баюся тае абразы, якая будзе для мяне тады, калі яе сэрца не адгукнецца майму сэрцу... А ўсё-ж-такі гэта каханне ёсць нейкая хвароба,

боль і пакута. Яно захапляе ўсяго, не дае спакою, параджае нейкія няясныя парыванні і вялікі смутак».

У лесе было ціха і спакойна. Гэты спакой паволі сходзіў і на падарожнага. Ён ішоў, мінаў засыпаныя снегам грэблі і балоты і ўсё думаў аб Ядвісі. Як жывы, вобраз яе стаяў у яго ваччу.

Панна Ядвіся прымеціла, што настаўнік за гэты час як-бы асунуўся і пахудзеў. У яго вачах яна расчытала нейкія новыя для яе думкі і нейкую затоеную тугу. І сама яна задумалася, і цень засмучэння пралёг на яе маладым і свежым твары.

Аб Андрэю так многа думала яна ўсе гэтыя дні, да яго так моцна рвалася яе думка.

XXVI

— А! Вось і вы! Міласці просім! — спаткаў а. Кірыл Лабановіча.

Айцец Кірыл, як заўважыў настаўнік, нейк асунуўся, толькі вочы яго былі яшчэ больш жывыя, больш неспакойныя.

— Што-ж гэта вы, вучыцелька, так закапаліся ў вашай глушы? — пытала яго вясёлая, румяная матушка. — Ну, як-жа вам жывецца?

— Дзякую, матушка. Жыву памаленьку ды паціхеньку.

— Ну, кажыце: у каго вы там закахаліся?

— Чаму вы думаеце, што закахаўся?

— Ну, як-жа гэта можа быць, каб малады хлопец быў не закаханы?.. Ой, вы ўсё хітруеце! — пастрашыла матушка пальцам. — Там дзесь, у Цельшыне, знайшлі вы сабе мілую... Не гаварыце мне: па вачах бачу.

— Праўда, матушка, вы не памыліліся...

— А што! — падхапіла матушка. — Хто-ж ваша мілая? Ну, скажыце?

— Старасціха Алена, — прамовіў Лабановіч.

Айцец Кірыл і сама матушка громка засмяяліся.

— А я думаю, ці не дачка пана падлоўчага? Што-ж вы вочы апусцілі?

— Ну, матушка, калі буду жаніцца, дык вас за сваццю вазьму, — сказаў Лабановіч.

— Вазьміце, вазьміце! Такую высватаю вам жонку, што цэлае жыццё дзякаваць будзеце. Вы незнаёмы з дачкою каморніка?

— Гэта з паннаю Людмілаю? Не, незнаёмы.

— Яна цяпер тут, у пісара. Вечарам у пісара бліны будуць. Вось вы і падкаціцеся да яе. Яна дзяўчына сімпатычная. Хоць нашаму настаўніку сэрца параешце.

— Э, матушка! Панна Людміла мае столькі кавалераў, што ў мяне і адвагі няма рабіць да яе залёты.

— Эх, вучыцелька, нічога вы не разумееце. Яна так зацікаўлена вамі, што будзе вельмі рада, калі звернеце на яе ўвагу.

— Што-ж? Дай, божа, нашаму гароху ў гаршчок панскі папасці, — усміхнуўся Лабановіч.

— Вас сяляне хваляць, — сказаў а. Кірыл: — Вы патрапілі заняць належнае становішча.

— А за што ім хваліць мяне або ганіць? — спытаў Лабановіч: — У іх свая справа, у мяне свая. Нашы інтарэсы не стыкаюцца, і нам няма за што пасварыцца нават.

— Вы — сукромны чалавек, і гэта робіць вам чэсць, — адказаў а. Кірыл. — Не, трэба сказаць праўду: Цельшыну шанцуе на добрых настаўнікаў. Толькі што глуш там, як і наогул гэта Палессе.

— Жаніцца трэба, — сказала матушка: — Тады і глуш не такая страшная будзе.

— Што жаніцца! — махнуў рукою а. Кірыл. — Жаніцца кожны патрапіць, але што з гэтае жаніцьбы?

Тым часам маладая служанка а. Кірыла, чырвонашчокая паляшучка, прынесла самавар. Селі піць чай. Матушка ўвесь час гаварыла, перадавала вясковыя навіны і розныя плёткі, да якіх яна мела вялікую ахвоту. Паміж іншым, распачала апавяданне аб змаганні за панну Людмілу паміж Саханюком і Дубейкам. Але апавяданне не было даведзена да канца, бо якраз на гэты момант прышоў і сам Саханюк.

На гэты раз Саханюк быў выфранчаны незвычайна, чыста пабрыты, манішка, гальштук, манкеты, — усё на ім ззяла і зіхацела.

— Майму супарату і калегу ніжэйшае шанаванне! — звярнуўся да Саханюка Лабановіч.

— Вось маладзец цельшынскі вучыцель! — пахваліла матушка Лабановіча: — Адразу робіць выклік нашаму настаўніку.

— Вы не так мяне зразумелі, — заўважыў Лабановіч. — Калега — мой супарат зусім другога парадку. Мы змагаемся з ім за гарцы.

Айцец Кірыл зацікавіўся гэтым змаганнем, і Лабановіч расказаў, якое было ў іх змаганне.

Айцец Кірыл смяяўся, смяяўся і сам Саханюк.

— Наш настаўнік — гаспадар. Мае кабанка і кароўку, — заўважыла матушка.

— Толькі гаспадыні не стае, — дадаў Лабановіч. — Так і быць, калега, жаніцеся — зраблю ўжо вам такі падарунак к вяселлю, аддам сваю ссыпку.

— І добра зробіце, — смяяўся Саханюк. — Я чалавек практычны і адкідаць тое, што ідзе на патрэбу чалавеку, лічу неразумным. Калі жыць, дык жыць са смакам, а раскідаць рублі дзеля таго, каб пагадзіць двух буянаў-мужыкоў, не бачу сэнсу.

Саханюк кіўнуў у бок Лабановіча і засмяяўся. Гісторыя з юшкаю была ўжо тут вядома. Лабановіч не знайшоўся, што сказаць; ён крыху засаромеўся.

— Так, — пацвердзіў і а. Кірыл, — наш настаўнік умее жыць. — Але спогадзь і спачуванне яго былі на баку цельшынскага настаўніка.

— Вось што, калега, — звярнуўся Саханюк да Лабановіча, — вас прасілі на вечар да пісара, і мне выпаў такі гонар паведаміць вам аб тым. Нават і запіску вам перадалі.

— Хто-ж гэта звярнуў на мяне такую ўвагу? — пытаў Лабановіч, беручы запіску.

— А каморнічанка там будзе? — запыталася матушка.

— Н-не ведаю, — не зразу адказаў Саханюк.

— Ідзіце, ідзіце, вучыцелька, — падганяла матушка. — Там паненкі будуць і напэўна панна Людміла.

— Не хочацца мне туды ісці, — прамовіў Лабановіч. — Не люблю ў вялікай кампаніі быць.

— Больш любіце быць у кампаніі аднае? — пажартавала матушка.

Пісарава гасцінная ярка асвятлялася дзвюма лямпамі. Пераступіўшы парог і акінуўшы поглядам гасцей, Лабановіч прыпыніўся ў нейкім замяшанні: да каго наўперад падыйсці і з кім павітацца, проста не ведаў хлопец, куды дзецца — так многа было тут гасцей. Трэба-б было пачаць з гаспадара, але гаспадар сядзеў за столікам, трымаў цэлую жменю карт і пільна ў іх углядаўся. Насупраць блішчэў урадніцкі каўнер. Збоку сядзеў фельчар Гарошка. Ён падганяў пісара.

— Хадзі, хадзі, кум! Пад туза! Пад туза яму!

Але пісар не спяшаўся. Ён доўга ўглядаўся ў свае козыры і, здавалася, вось-вось чыхне.

Сядзелец, па прозвішчу Кляп, выказваў усе адзнакі нецярплівасці ад такой маруднасці пісара.

— Не пары гарачкі, бо так астанешся без аднае, а будзеш гарачку пароць, без дзвюх астанешся.

Максім, сын фельчара Гарошкі, лятаў, як матыль, ад аднае паненкі да другой. Як відаць, у гэтай дзейнасці ён быў дужа напрактыкаваны. Лабановіч нямала быў здзіўлены, убачыўшы тут пана падлоўчага, бо ён крыху пагарджаў пісарскаю кампаніяй. Дубейка, заціснуўшы шыю ў накрахмалены цесны каўнерык, вельмі павабна і вельмі прыгожа, як яму здавалася самому,ківаў сваёю птушынаю галавою то да аднае, то да другое паненкі.

У глыбі пакоя на мяккім крэсле сядзела панна Людміла. Поруч з ёю прымасціўся Сухавараў. Цяпер Лабановіч дагадаўся, што пан падлоўчы мусіў уступіць Сухавараву і паехаць з ім, каб пазнаёміць яго з паннаю Людмілаю, якою таксама зацікавіўся і Сухавараў.

— А, паночку! — прамовіў пан падлоўчы. — Ці бачыш, які ён шпаркі. Я заходзіў да пана, каб разам з панам Сухаваравым паехаць. А ён ужо тут!

Пан падлоўчы весела павітаўся са сваім суседам, узяў яго пад руку і павёў да панны Людмілы.

— Проша быць знаёмымі: пан Лабановіч, прафесар велькіх букваў.

Панна Людміла ўсміхнулася сваёю прыветнаю ўсмешкаю і жартліва прамовіла:

— Мы бадай што і знаёмы. — І падала сваю мяккую ручку.

— Дык наш прафесар шмат дасціпнейшы, як гэта я думаў, — прамовіў пан падлоўчы.

— У ціхай букце чэрці водзяцца, — дадаў і Сухавараў і распусціў свае мокрыя губы ў крыху абразлівую ўсмешку.

Сухавараў быў адзеты ў парадны мундзір з бліскучымі гузікамі і звысоку пазіраў на ўсіх тутэйшых кавалераў.

Павітаўшыся з усімі, Лабановіч сеў адзін у больш спакойным месцы і стаў прыглядацца да гасцей. Старэйшая пісаранка, як гаспадыня, часта адлучалася; кавалеры з далікатнасці ўдзялялі ёй шмат увагі, што прыдавала ёй гонару і здаволення.

— Ну, як жывяце? — спытаў Лабановіча Дубейка. — У нас, бачыце, не тое, што ў вас — публікі многа, паненкі... Як вам падабаецца наша Людміла?

— А чаму яна ваша, а не наша? — спытаў і Лабановіч. — Ну, што-ж? Дзяўчына, як дзяўчына.

— Вы паглядзіце, як каля яе гэты жалязняк увіваецца!

— А вам зайздросна? Чаму-ж вы не ўвіваецеся?

— Маё ад мяне не ўцячэ, — горда зазначыў Дубейка.

Яму нядаўна абяцаў земскі начальнік пісарскую пасаду.

Падышоў Максім Гарошка.

— Што вы так рэдка ў нас бываеце? — спытаў і ён Лабановіча.

Максім быў вяртлявы, нізкага росту дзяцюк, з тонкімі чорнымі дугамі-брывамі і жывымі вачамі. Ён быў досыць прыгожы хлопец і сярод паненак лічыўся цікавым кавалерам, хоць і нявыгадным жаніхом. Максім любіў весці размовы на грамадскія тэмы. Ён не меў службы. Чаму? А проста таму, што ніякая пасада яго не здавальняла і ніякая прафесія не адпавядала яго поглядам на жыццё. Ён проста быў трохі шалапай і распуснік. У яго быў востры язык і нахіленне да высмейвання людзей.

То той, то другі з гасцей падыходзіў да цельшынскага настаўніка і што-небудзь казаў яму. Саханюк сыпаў жарты паненкам. Да панны Людмілы ён не падыходзіў, хоць спотайку сачыў за ёю вельмі ўважна.

XXVII

Панна Людміла ўжо колькі разоў памыкалася падысці да Лабановіча, бо страціла надзею на тое, што ён калі-небудзь падыйдзе да яе сам. Ёй проста было цікава пабачыць, што ён за чалавек. «Ну і бервяно нейкае!»—сама сабе зазначыла панна Людміла. Тым не меней, яна папрасіла прабачэння ў свайго кавалера і з мілаю ўсмешкаю падскочыла да Лабановіча.

— Можна каля вас прысесці? — спытала яна салодкім галаском.

— Проша, проша! — прамовіў Лабановіч і падставіў ёй крэсла.

— Вы як-бы за штось гневаецеся на мяне, праўда?

— О, не, барані божа! — горача прамовіў шчаслівы настаўнік. — Хіба на вас можна гневацца? Дый за што?

— Ну, скажыце мне праўду: чаму вы ніколі да нас не зайшлі?

— Я жыву ўсё-ж далёка ад вас, з вамі да сённяшняга дня быў незнаёмы, і так не было здарэння.

— А яшчэ якія былі прычыны? — дапытвалася панна Людміла.

— Другіх прычын я вам не скажу.

— А яны былі?

— І пра гэта прамаўчу.

— Ну, скажыце! Ах, які вы нядобры.

— Што зрабіць? І нядобрыя людзі жывуць на свеце.

— Не, вы — добры! Я чула, што вы добры.

— Мала што хто гаворыць. Да яшчэ ці гаворыць?

— Дык вы мне не верыце?

— Я і сам сабе не веру.

— Вось гэта міла! Як-жа гэта вы сабе не верыце? — пытала панна Людміла.

— А вось бывае так, што думаеш адно, а робіш другое, хочаш жыць так, а жывеш інача́й.

— А чаму гэта так выходзіць?

— А таму і выходзіць, што чалавек па сутнасці сваёй часта змяняецца. На яго мае ўплыў надвор'е, людзі, асабліва ваш брат...

— А які ўплыў мае на вас наш брат?

Лабановіч падумаў і адказаў:

— І добры і кепскі.
— Ха-ха-ха! — засмяялася панна Людміла. — Няўжо на вас мае ўплыў, як вы кажаце, наш брат? Не верыцца нешта. Вы, выбачайце, дапраўды нейкі... святы.
— Я ведаю, — з ноткаю лёгкага засмучэння сказаў Лабановіч, — што паненкам святыя не падабаюцца, хоць, праўда, святым я з'яўляюся з вашага пункту погляду...
— Не, не! Вы не крыўдзіцеся, прашу вас. Я толькі хацела сказаць, што вы... ну, зусім не такі, як іншыя, не такі ў лепшым сэнсе.
— Вельмі вам дзякую, але, зняўшы галаву, па валасах не плачуць. І крыўды тут ніякай няма. Людзі часта ўсё жыццё б'юцца і думаюць аб тым, каб святым стаць, а мне гэта лёгка далося.
— О! маладзец прафесар вялікіх букваў, — жартаваў пан падлоўчы, падышоўшы да іх. — Адзін завалодаў паннаю Людмілаю.
— Гэта я завалодала прафесарам, проста гвалтам узяла яго, не пытаючыся, ці рад ён гэтаму, ці не рад, — адказала панна Людміла.
— Выбачайце, — усміхнуўся Лабановіч і глянуў ёй у вочы так, нібы ён ведае шмат болей таго, як думае панна Людміла: — А ці так гэта?
Дзяўчына на момант замяшалася, потым ускінула на яго свае бойкія вочы і сказала:
— Ой, хітры-ж вы, хітры!
— А як вы думаеце: святасць і хітрасць не шкодзяць адно другому?
— О, не! Вам яны не шкодзяць.
— Ну, гэта іншае пытанне, але ці можна быць святым, астаючыся і хітрым?
— У пытаннях святасці я нічога не разумею, — адказала панна Людміла: — Але пакінем аб гэтым. Скажыце, чаму вы тады так борздзенька ўцяклі, памятаеце, у Абрама?
— Я ніяк не думаў спаткаць вас там, і мне стала няложка... Скажу вам праўду: я не хацеў, каб вы падумалі, што я зайшоў туды дзеля таго, каб пабачыць вас.
— А хіба вам так непрыемна было пабачыць мяне?
— Вот вы і злавілі мяне. Цяпер выкручвайся, як хочаш, — сказаў смеючыся Лабановіч.

— Вы мне кажыце праўду, чуеце? Чыстую праўду, — горача наступала панна Людміла.

— Я проста не хацеў падманваць вас.

— Што гэта значыць? Я нічога не разумею, — крыху нахмурыўшыся, сказала панна Людміла. — У чым вы маглі мяне падманваць?

— Усяго ведаць няможна, бо часта веданне разбівае наша шчасце.

— Цяпер я ўжо зусім не разумею вас.

— А вы больш размаўляйце з разумнымі людзьмі, — параіў ёй Лабановіч.

— А чым-жа я вінавата, што вакол мяне дурні?

Лабановіч засмяяўся.

— Кепскага-ж вы здання аб вашых кавалерах, і я на гэты раз вам вельмі рады, што не ў іх ліку.

— Аб чым гэта галубкі воркуюць? — запытаўся Сухавараў, падыходзячы да іх. Яму было крыху не па сабе, што панна Людміла аддавала перавагу Лабановічу, а не яму.

— Проша сядаць, — паказала панна Людміла яму месца каля сябе.

Сухавараў сеў, залажыў нагу на нагу і пакруціў свой чорны вусік. Але пагаварыць яму так і не ўдалося: гаспадыня запрашала гасцей за стол. Госці ўздыхнулі лягчэй і, няспрытна топчучыся і аказваючы знакі ўвагі адзін другому, рушылі ў другі пакой. Праз увесь доўгі стол цягнуўся цэлы рад бутэлек гарэлкі. Лабановіч сядзеў поруч з Максімам Гарошкам і Дубейкам. Яго суседзі былі добрыя выпівакі і кампанейцы па часці закусвання. Кожная новая чарка дадавала больш руху, ажыўлення, развязнасці. Шум, смех, жарты поўнілі пакой. Пілі за здароўе пісара, пісаравых дачок. Сухавараў падняў чарку за каханне, Дубейка за панну Людмілу. Госці ўставалі, стукаліся чаркамі, разлівалі гарэлку.Ураднік запрапанаваў заспяваць «Боже, царя храни...» Госці мусілі падняцца, рад быў хто ці не рад гэтаму.

Максім Гарошка незвычайна ўпадабаў свайго суседа Лабановіча і, развязаўшы язык, плявузгаў рознае бруднае глупства.

— Да кожнае бабы падкаціцца можна, — гаварыў Максім Лабановічу: — Я іх натуру ўжо добра ведаю.

З выгляду здаецца — «ані вэзь», брыкаецца, абражаецца, а скончыць тым, што прыгорнецца да цябе.

— Ну, ведаеце, па некалькіх патаскухах нельга судзіць аб усіх, — сказаў Лабановіч.

— Нашто браць патаскух? — Максім зірнуў на суседа. — Няхай гэта будзе між намі. Мне матушка наша жалілася на свайго бацьку Кірылу: «Такі ён, кажа, хваравіты, слабенькі. Нічога не можа. Проста шкада яго». Ну, і я пашкадаваў нашага бацьку, — прамовіў Максім і захіхікаў.

— Няўжо гэта праўда? — спытаў Лабановіч і паглядзеў на Максіма.

— А вы думалі я — Юзаф прыгожы? Вы, прафесарка, як бачу, яшчэ не адукаваны ў гэтым сэнсе чалавек, — сказаў Максім і засмяяўся.

— А хіба для гэтага трэба спецыяльныя курсы скончыць? — спытаў Лабановіч.

— Не, для гэтага трэба мужчынам быць, — адказаў Максім.

— А не проста разбэсціцца?

— Прычым тут разбэшчванне? Прырода, брат, вымагае гэтага.

— Калі за прыродаю пайсці, то можна апраўдаць рознае глупства, асабліва, калі пры гэтым пачнеш яшчэ патураць сабе. Вось вы нідзе не служыце, бацька ваш ужо стары, яму трэба ўтрымліваць вас, а вы скажаце: «І прырода вымагае таго, каб ён клапаціўся пра мяне».

— Разумеецца. Хіба я прасіў яго, каб ён пусціў мяне на свет? А пусціў, няхай і корміць, няхай патурбуецца... Слухай, прафесар, давай вып'ем на ты?

Максім наліў чаркі. Выпілі.

— Ведаеш, брат, што, — пачаў Максім, — я табе такую маладзіцу расстараюся, што з ёю пазнаеш ты радасці раю.

Лабановіч быў ужо досыць п'яны. Яму было лёгка і весела. Перад вачамі снаваўся нейкі прыемны туман і ўсё афарбоўваў у ружовы колер. І гэты самы Максім, і Дубейка, Сухавараў, і наогул усе, праўду кажучы, добрыя людзі. Максім яшчэ зусім малады, ён — хлапчук. А што ён за бабамі ганяецца, ды хто-ж гэтага не робіць? Ды Максім і іншыя маюць смеласць адкрыта сказаць аб гэ-

тым, а ён, Лабановіч? Ён шмат горшы ад іх, бо свае брудныя мыслі аб кабетах трымае пры сабе. А ці мала часу забіралі ад яго гэтыя думкі? Ён помніць спатканне з незнаёмаю жанчынаю, што ішла да яго, а ён прагнаў яе. Хіба ён добра зрабіў? Колькі разоў ён каяўся ў гэтым, і мыслі аб ёй распалялі яго. А каму ён аб гэтым казаў? Нікому. А чаму? Ясна чаму: яму, бруднаму ў такой-жа меры, як і ўсе мужчыны, а можа, і больш таго, хацелася паказацца чыстым, нявінным, лепшым ад іншых. А ён... проста — манюка, хітрэц, фарысей, ашуканец, прыкіда, фальшываманетчык, бо выдае сябе не за тое, што ён ёсць... Ха-ха-ха! Ён — пустэльнік, ён — святы!..

Мутнымі вачамі ён акінуў гасцей. Уваччу ўсё калыхалася і траілася. І невядома адкуль перад ім з'явіўся вобраз панны Ядвісі. «Ядвіська, мілая, слаўная!» — казаў ён у сваіх думках. Ён схіліў галаву і штось думаў. Потым раптоўна павярнуўся да Максіма.

— Максім Грэк! Вып'ем, брат?

— Вып'ем, прафесар.

— За здароўе тае маладзіцы, з якою можна пазнаць радасці раю!

— Брава, прафесар!

Лабановіч ужо зусім ап'янеў. Праўда, цвярозых тут і не было, апрача паненак, — яны былі толькі вясёлыя, — і Саханюка, які гарэлкі не піў. Тым не меней, Максім і Лабановіч выдзяляліся сярод гэтае кампаніі. Яны громка гаманілі, разводзілі рукамі і цалаваліся.

Саханюк непрыметна падышоў да калегі.

— Слухайце, калега: зойдзем на мінутку да мяне!

— Чаго? Не пайду. Я яшчэ піць хачу. Хачу пахаваць цельшынскага педагога, бо ён — фальшывы.

— На адну мінутачку, калега. Выйдзем.

— Саханюк! Мілы мой Саханючок! Ты — мой старэйшы брат. Я пакараюся табе... Але... Стой! Ты, брат, хіцёр, Саханючок: я ведаю, ты хочаш ад мяне пад п'яную руку падпіску ўзяць, што я аддаю табе гарцы.

— Гарцы-ж ты мне і так аддасі, як падарунак к вяселлю.

— Праўда, праўда, брат! — схамянуўся Лабановіч. — Жаніся, брат!.. Аддам табе гарцы, бо ты — чалавек, а не яловы пень, як думаў я раней.

Саханюк пад руку прывёў Лабановіча ў сваю кватэру.

— Куды ты мяне прывёў і нашто прывёў? Я хачу да паненак пайсці. Максім Грэк, свіны ты чалавек, дзе ты?

— Праспіцеся, калега. Ну іх! Будуць пальцамі паказваць і трубіць на цэлы павет — рады на язык падняць нашага брата.

— Эх, Саханюк, Саханюк! Ты і гарцы мае бярэш, ты і чэсць нашу настаўніцкую бароніш. Ты крануў маё сэрца. Жыві-ж, Саханюк, на многія леты. Жаніся, брат, пладзіся, напаўняй пінскія балоты і валодай імі, — гаварыў Лабановіч з канапы, ледзьве варочаючы языком.

XXVIII

Першую палескую вясну сустракаў тут Лабановіч. Здавалася, тое засмучэнне, тая паласа тугі, што ўсю зіму не сходзілі з твару гэтага глухога кутка Палесся, цяпер прайшлі, бо штось новае і радаснае пачынала вызначацца і ў агульным выглядзе пустэляў балот, і гэтага панурага лесу, і асобных хвой і дубоў, што высока падымалі ўгару свае кучаравыя галовы або адзінока стаялі па краях лесу.

Вясна была ранняя, як і звычайна на Палессі. У лясах на ўгрэвах снег злазіў борзда, і вызваленая з-пад снегу зямля радасна выглядала на свет жаўтавата-шэрымі плямкамі, ужо выбіваўся і леташні брусьнічнік, свежы і сакавіты, сухія галінкі вераску і ягадніку. Побач чыгункі, дзе так прыемна купаліся залатыя косы сонейка, у зацішку зялёных хвой і чырванаватага маладога бярэзніку, ужо цягнулася доўгая жоўтая паласа адтаўшай зямлі. Яна шырэла з кожным днём, з кожнай гадзінай.

А каля масткоў на чыгунцы стаяў вясёлы гоман звонкіх кропель, сцякаючых у ажыўшыя рачулкі і ручайкі. Засыпаныя снегам шпалы, старыя трухлявыя пні даўно загубленых дрэў, гнілыя галіны, — усё выглядала з-пад снегу і ўсё, здавалася, радавалася, што не апошні раз бачыла сонца. А лес, асветлены і абагрэты сонцам, пазіраў зусім-такі весела. І было штось незвычайна прыемнае ў гэтых першых светла-бліскучых іскрынках абуджэння

жыцця, у гэтым зямлістым паху прэлых леташніх лісцяў, дзе-ні-дзе шарэўшых на зямлі. І зусім іншыя струны душы закраналіся гэтым кволым патыханнем вясны, і іншыя парыванні разам з абуджэннем прыроды калыхалі душу ціхаю, няяснаю песняю ці даўно чутаю казкаю, поўнаю хараства і чараў, і кудысь цягнулі і клікалі. Куды? Можа, да таго невядомага, заўсёды павабнага, нерасчытанага і неадгаданага, закрытага заслонаю ружовых мараў, што ніколі не зліваецца з тваімі жаданнямі? А можа, гэта смутак аб чымсьці такім, міма чаго прайшоў ты няўважна і страціў навекі? Ці гэта—адбітак вечнага нездаваленьня чалавека, якое выдзяляе яго з кругу жывёлін і вядзе па дарозе шукання і ўтварэння лепшых стасункаў жыцця і яго хараства? Ці гэта — імкненне рассунуць граніцы свайго кругагляду, каб пазнаць непазнанае, уведаць нязведанае? Але вечныя загадкі жыцця і вечныя нашы імкненні іх адгадаць, бо формы жыцця абмежаваны, само-ж жыццё не мае граніц.

Пасля пісарскага балу Лабановіч некаторы час адчуваў сябе дрэнна. Яму было прыкра, што ён там напіўся, гаварыў розныя глупствы і нават піў за здароўе нейкай маладзіцы. Назаўтра ён раненька вырваўся з Хатовіч і бадай што ўцёк дадому. І вось цяпер, на другі дзень пасля п'янства, ён хадзіў па чыгунцы, крыху заспакоены, і ацэньваў свае паводзіны як чалавека і як настаўніка. Яму ўспаміналіся першыя дні прыезду сюды, яго намеры і планы. І цяпер усё гэта так не сходзілася адно з другім і не давала ніякага маральнага задаваленьня! Ён чуў нейкі неспакой душы. Яму хацелася кінуць тут усё і ісці. Куды? У свет, на новыя мясціны — і ўжо там пачынаць жыць як-небудзь іначай.

Лабановіч акінуў вачамі ваколіцы Цельшына: цесна, цёмна і пуста. Толькі ветракі, растапырыўшы ўгары два крылы ў бок сяла, мелі такі выгляд, як-бы іх уразіла нейкая навіна, і яны, у здзіўленні сказаўшы: «О-о-о!», застылі ў такім стане. Дом пана падлоўчага і высокая вяндлярня таксама выдзяліліся крыху весялей з купы гэтых саламяных стрэх сялянскіх хат. Няўжо-ж яму прыдзецца жыць тут яшчэ другую зіму, бо на лета, калі скончацца заняткі ў школе, настаўнік думаў куды-небудзь паехаць.

Дом пана падлоўчага глянуў на Лабановіча яшчэ раз і яшчэ; скараючыся нейкаму пачуццю і голасу, ён звярнуў з чыгункі і накіраваўся дадому, паглядаючы то на высокі крыж каля школы, то на дах пана падлоўчага. Падыходзячы бліжэй да іх, настаўнік пайшоў павольней, як злодзей, кідаючы позірк на вокны. Ступіўшы яшчэ колькі крокаў, ён спыніўся: у акне з-за вазонаў кланялася тая галоўка, якую яму так прыемна было бачыць. Настаўнік прасвятлеўся і рашуча адкінуў клямку на дзверцах веснічак свае суседкі.

— З таго часу, як вы закахаліся ў панну Людмілу, ужо не хочаце да нас зайсці, — сказала панна Ядвіся, ні-то шуткуючы, ні-то сур'ёзна.

Лабановіч глянуў ёй у вочы, у гэтыя акруглыя цёмныя і такія слаўныя, выразныя вочы, на яе чорныя тонкія бровы, якіх ён не бачыў ні ў аднае дзяўчыны, ні ў кога на свеце. Здаецца, ніколі не адводзіў-бы ад яе сваіх вачэй! Ён падумаў: «Ніхто цябе не бачыць, ніхто не ведае, якая ты слаўная і мілая, — і дадаў: — Дурні яны!»

— А, — сказаў Лабановіч у парыванні нейкай радасці, а ўнутрах яго ўсё дрыжэла, — ці толькі свету, што ў панны Людмілы? А вы мне вось што скажыце: калі ўжо вы перастанеце харашэць? Можна было-б ужо і спыніцца.

Усе думкі аб помсце панне Ядвісі, усе тыя калючыя словы, якія ён думаў не так даўно кінуць ёй, — усё цяпер знікла, нібы гэтыя вочы і бровы адвялі іх і пахавалі навекі.

Ядвіся сказала:

— А калі вы перастанеце быць такім панурым і злосным?

— З таго самага часу, як вы аб гэтым запыталіся.

— Не люблю я панураў, — сказала Ядвіся: — Усё здаецца, што яны накінуцца і біць пачнуць.

— Што зрабіць? Часамі чалавеку так цяжка бывае, так наваліцца на яго гора, што нехаця ляжа чорны цень на твары.

— А якое ў вас было гора? — спытала Ядвіся.

— Не пытайцеся: ніякага ў мяне не было гора. Хіба вы навядзеце яго на мяне, але гэтага я вельмі не хацеў-бы.

— Я? Што я для вас значу?

— Усё! — адказаў настаўнік.

— Праўда? — ціха спытала Ядвіся.

— Гатоў пабажыцца, аб заклад пабіцца, — пачаў сыпаць Лабановіч словамі, узяўшы жартлівы тон, каб жартамі прыкрыць тое, што ішло ад самага сэрца.

Панна Ядвіся, як сарна, скокнула да печкі, дзе стаяў пусты кошык. Схапіўшы кош, яна падбегла з ім да Лабановіча і прамовіла:

— Сыпце ў кош свае красамоўства!

Яны смяяліся, шчаслівыя, як дзеці.

Ядвіся раптоўна стала сур'ёзнаю.

— Скажыце, — прамовіла яна: — Каб я вас аб чымсі папрасіла, ці зрабілі-б гэта для мяне?

— Усё, што можна зрабіць, зраблю.

— Зробіце?

— Зраблю.

Панна Ядвіся апусціла вочы, потым паволі ўзняла іх на настаўніка.

— У Гродзеншчыне ў мяне ёсць адна дзяўчына, — ну, вам усё роўна, хто яна. Ёй трэба выйсці замуж. Разумееце? Ёй проста трэба павянчацца, каб у дакументах мець іншае прозвішча. Нашто, — гэта таксама вам нецікава. Дык ці згадзіліся-б вы павянчацца з ёю?

Ядвіся гаварыла самым сур'ёзным чынам.

Лабановіч і верыў, і не верыў. Калі гэта ўсё праўда, то значыць для Ядвісі ён зусім непатрэбны чалавек. І яму стала так горка і непрыемна. Ён апусціў вочы і, памаўчаўшы, прамовіў з прыметнаю ноткаю нездаволення:

— Аб жаніцьбе, якая-б яна ні была, я думаю столькі, колькі думаеце і вы аб леташнім снезе.

У гэты час у пакой увайшла Габрынька, і размова наконт жаніцьбы на тым і скончылася.

— Ну, кажыце, як вам гасцілася? — звярнуўся да яе настаўнік.

Габрынька з жарам і ажыўлена апавядала, як ім было там добра і як не хацелася ехаць сюды. Ядвіся маўчала. Лабановіч слухаў Габрыньку і стараўся не пазіраць на Ядвісю. А яна ўвесь час не зводзіла з яго вачэй. А потым ціхенька вышла, нічога не сказаўшы. Яна

доўга не прыходзіла і вярнулася тады, калі Лабановіч ужо вышаў і накіраваўся да сябе на кватэру.

Настрой у яго быў самы паганы. Ён проста не мог знайсці сабе прыпынку, не ведаў, за што ўзяцца. Прайшоўшыся колькі разоў па пакоіку, ён узяў паперу і пяро і сеў пісаць ліст свайму семінарскаму сябру Янку Тукалу.

«Мілы Янка!

«Дзе ты, мілы, белабрысы? Дзе ты? Адгукніся! Як без цябе тут гарую, прыдзі падзівіся». — З гэтае песні пачаў ён, змяняючы яе тэкст. — Абрыдла, брат, мне тут. Усё прыгледзелася і прыелася. Пачынаецца вясна. Разам з ёю ва мне абуджаецца і нейкі дух бадзяння. От-бы забраў падпаху свае манаткі, пайшоў-бы, куды вочы глядзяць. Скончыцца работа ў школе, паеду дадому. На другі год думаю перабрацца куды-небудзь далей у глыб Палесся. Я пачынаю аналізаваць самога сябе і вынікамі застаюся незадаволены. Тая звычайная работа, якую мы павінны весці ў школе, мне здаецца мала вартоўнай, і калі толькі ёю абмежаваць сваю дзейнасць, то гэта значыць, рабіць вельмі мала, бо будзеш заўсёды чуць нейкі недахват. І тады трэба будзе на ўсё махнуць рукою, а каб было весела, прыдзецца звярнуцца да карт, гарэлкі і праз колькі гадоў зрабіцца поўным вахлаком, што звычайна на кожным кроку і робіцца. Я чую, што ў мяне няма грунту пад нагамі, бо я не намеціў сабе пэўнага плану работы. Я, брат, тая муха, што папала пад шкляны каўпак: і свет вакол відаць, і месца ёсць выбіцца з гэтага каўпака, але няма здольнасці папасці ў выйсце. І не адзін такі я: шумім, круцімся, а толку няма. Можа, каму выпадкова і пашчасліўіцца знайсці дарогу з гэтага каўпака, але пераважная большасць пападае ў сыроватку і трапечацца ў ёй, покі не захлынецца. Яшчэ нічога, калі ўсяго гэтага не заўважаеш і думаеш, што так і трэба. Але вельмі цяжка пачуваць, што цябе пачынае зацягваць балота, і ты ведаеш, што ў гэтым балоце твая грамадзянская смерць. І калі-б мяне спытаў хто, што мне найболей кінулася ў вочы і зрабіла мацнейшае ўражанне за першы год настаўніцтва, я вызначыў-бы гэта так: павольнае ўміранне душы і зацягванне цябе балотам... Не, брат Янка, нельга

доўга заставацца на адным месцы, бо яно цябе заесць і ашальмуе. Няхай жыве вандроўніцтва!

Як я табе і казаў, ва мне з незвычайнаю сілаю абудзіўся дух бадзяння. Я не знаходжу сабе спакойнага месца, мяне кудысь цягне і парывае. Часамі проста хочацца зашчаміць сабе галаву і плакаць. «Маркотна жыць на гэтым свеце, панове». Цяпер толькі зразумеў я, якую праўду казаў Гогаль».

Напісаўшы гэты ліст, Лабановіч прылёг на канапу і задумаўся... «А ўсё гэта я ілгу: не тыя прычыны майго нездаволення і смутку». І перад ім ізноў усплыў вобраз Ядвісі, і зноў аб ёй, толькі аб ёй, пачаў думаць.

XXIX

— Бабка, дома паніч? — пытала панна Ядвіся старую Мар'ю.

— Не, паненачка, кудысь вышаў нядаўна.

Ядвіся падышла да дзвярэй, прыслухалася, як-бы не верачы бабцы і баючыся быць злоўленай, потым ціхенька адчыніла іх, ускочыла ў пакойчык, азіраючы яго цікавым поглядам. Яна падышла да пісьмовага стала і палажыла туды маленькі букецік першых вясенніх красак. Потым узяла асадку, адарвала вузенькую палоску паперы, крыху падумала. На яе губах заблукала ўсмешка, і яна напісала: «мілы», паставіла тры кропкі і дадала другое слова «дурань». Папярачку з напісанымі словамі залажыла ў разгорнутую кнігу, яшчэ раз азірнулася і выскачыла ў кухню.

— Глядзі-ж, бабка, не кажы панічу, што я тут была. Барані божа, бабка, не кажы! — сказала і бягом кінулася на двор. Скора дзесь з двара пачуўся яе голас. Яна спявала нейкую песню.

Бабка ціха ўсміхнулася сама сабе і прамовіла ўголас:

— Вясёлая, харошая паненка! — і аб чымсі задумалася.

Праз хвіліну бабка сама ўвайшла ў пакойчык. Ёй хацелася дазнацца, якую штуку выкінула там паненка.

— Красачак прынесла, няхай падумае пра мяне,

Бабка ўзяла ў рукі букецік, паглядзела на яго, паднесла да носа і палажыла зноў на стол. Яна чагось уздыхнула і вышла.

Гэта было на захадзе сонца.

Калі ўжо добра сцямнела, прышоў Лабановіч. Ён запаліў лямпу. Пры яе святле заўважыў кветачкі.

«Хто-ж гэта палажыў іх сюды?» — спытаў ён сябе самога і стаў разглядаць букецік.

Вечар быў цёплы і ціхі. Лабановіч падышоў да акна і расчыніў фортку. Вокны пакояў пана падлоўчага былі цёмныя. Там, значыць, нікога не было; можа, яшчэ рана. З двара далятаў сюды шум сельскае вуліцы. Дзесь у канцы вуліцы пілікала скрыпка, там-жа чуўся радасны смех дзяўчат і іх крык і піск. Відаць, за імі ганяліся хлопцы, лавілі і дурэлі з імі. Потым дзяўчаты хорам спявалі «вяснянкі». Звонкія, маладыя галасы будзілі спакой гэтага ціхага вечара, і водгулле іх замірала дзесь у соннай цішы балот.

На ясным небе загараліся зоркі, дрыгацелі, свяціліся рознакаляровымі агеньчыкамі, пераліваліся, як-бы там трапяталі крыльцамі нейкія дыяментныя матылі. І было штось незвычайна важнае і велічнае ў гэтым далёкім харастве недасяжных зор і ў гэтай маўклівасці цёмнага бяздоннага неба, і перад велізарнасцю і тайнасцю яго заціхаў дробны клопат зямлі.

«Колькім людскім пакаленням свяцілі гэтыя зоркі! — разважаў настаўнік, — людскія пакаленні даўно сышлі з твару зямлі, і вецер даўно параздзімаў іх магілы і разнёс па свеце прах касцей іх, а яны, спакойныя зорачкі, кожную ясную ночку будуць свяціць сваім нямецежным бляскам, неўспагадныя на ўсе мітусенні і трывогі ўсхваляванай душы чалавека. А мы перабудзем свой век, колькі нам прызначана, гэты страшэнна кароткі міг, малюпасенечкае звенца ў бясконцым ланцугу жыцця, і ніякага следу не захаваюць па нас бязлітасныя часы. І ці варта так прырастаць да гэтага жыцця, да гэтага нязначнага моманту ў ходзе часаў?»

І нейкая туга ахапіла настаўніка. Аб чым? Мабыць аб тым, што такая мізэрная і нязначная людская доля, людское жыццё. Ён апусціў галаву над сталом і сядзеў нерухліва. Лёгкі і раптоўны шолах каля шыбы акна

абудзіў яго. Ён узняў галаву, і ў гэты момант на стол упала некалькі такіх-жа самых красачак, што былі і ў букеце. Відаць, некаторыя з іх не папалі ў фортку, а толькі лёгенька крануліся шыбак і засталіся за акном. Разважанні аб нязначнасці людскога жыцця былі таксама раптоўна распуджаны чыёюсь рукою, што кінула гэтыя краскі.

Лабановіч борздзенька кінуўся да форткі. Але там было ўсё ціха. І толькі шумлівая і многагалосная вуліца правіла маладыя гімны гэтаму жыццю.

— Няўжо гэта Ядвіся? — спытаў сам сябе настаўнік. — Бабка! — гукнуў ён.

— А што, панічыку?

— Ты не спіш яшчэ?

Дзверы скрыпнулі. Прышла бабка.

— Ці ты, бабка, не ведаеш, хто гэта прынёс сюды красак?

Бабка перш прыкінулася, што нічога не ведае, а каб пераканаць у гэтым і настаўніка, узяла краскі і стала разглядаць іх. Але, як ні хітрыла бабка, настаўнік прачытаў на яе твары, што яна прыкідваецца.

— Ой, бабка! Грэх табе, старэнькай, хлусіць і падманваць. Не любіш ты мяне і не шкадуеш. Я ўжо і па той прычыне не паверу табе, што ты — знахарка. Ты павінна ведаць.

— Ой, панічыку! Ну, хто-ж вам можа прынесці красачак, як не паненка?

— Якая паненка і чаму паненка, а не якая-небудзь маладзіца?

— Хто-ж іх, панічыку, ведае, хто да вас лепей горнецца: ці паненкі, ці маладзіцы, — усё яшчэ хітрыла бабка. Але ёй самой неўтрыванне было, каб не сказаць, і яна пачала смяяцца. — Паненка, панічыку, сама сюды забягала і палажыла іх вам. Толькі яна, панічыку, прасіла, каб я вам не казала.

— Злаўлю яе калі-небудзь.

— Злавіце, панічок, злавіце! — прамовіла бабка, гатовая нават памагаць свайму панічу злавіць паненку.

— Чаму ты, бабка, не ідзеш на вуліцу песні спяваць?

Бабка паглядзела на настаўніка, ці ён праўду кажа, ці жартуе.

— Няма, панічыку!.. Адспявала я ўжо сваё.

— А ці шкада табе свае маладосці?

— А што яе, панічыку, шкадаваць? Ці шкадуй, ці не шкадуй — не вернецца назад.

— А ці хацела-б ты вярнуць яе?

— Э, панічок! Ніколі я пра гэта і не думаю. Нікому яна не варочаецца.

— Дык трэба, бабка, карыстацца ёю і ўзяць ад яе ўсё, чым яна міла і люба!

— Так, панічок, што цяпер страціш, таго потым не знойдзеш.

Гэта размова зусім не цікавіла бабку, і яна колькі разоў пазяхнула. А ўрэшце сказала:

— Ужо-ж, панічок, і позна. Заставайцеся здаровы!

Бабка павол пасунулася ў кухню на сваю печ, адкуль хутка пачуліся нейкія мармытанні, ні-то яна сама з сабою размаўляла, ні-то малілася богу.

У сяле яшчэ доўга спяваліся песні, ды дзесь з двара даносіўся брэх патрывожанага сабакі. Апознены месячык загарэўся залатым пажарам за тым панурым лесам, што стаяў з боку чыгункі, і павольна ўзнімаўся над заспакоенаю зямлёю. Ноч цішэла і глушэла і цяжэй налягала на зямлю. Настаўнік яшчэ доўга сядзеў каля акна, і розныя думкі падымаліся ў яго галаве. Спаць не хацелася, і ён доўга варочаўся, пакуль сон замкнуў вочы. На століку каля ложка ляжаў букецік завяўшых красак.

Вясна ўступала ў сілу. Снегу ўжо зусім не было ў палях. Ажылі балоты. Жаласна застагналі кнігаўкі, цяжка лятаючы над вадою. Высока ў небе звінелі жаваранкі. Абсохшая зямля пачынала іскрыцца зялёным аксамітам кволай пахучай траўкі. То той, то другі з вучняў пакідаў школу.

— Вось што, дзеці, — сказаў раз вучням настаўнік, — сёння па абедзе прыходзьце з рыдлёўкамі. Будзем капаць ямкі, а заўтра ўсе пойдзем у лес, прынясем маладых дрэўцаў і абсадзім нашу школу.

Дзеці адзін перад другім спяшаліся запэўніць настаўніка, што яны прынясуць рыдлёўкі, і з вясёлым дзіцячым гоманам, як пчолкі з вулля, высыпалі з школы на вуліцу, напаўняючы яе звонкімі, шчаслівымі галасамі.

Пасля абеду дзеці весела беглі з рыдлёўкамі ў школу

і таксама заяўлялі аб гэтым настаўніку, забягаючы да яго на кватэру. Нават маленечкі Паўлюк Рылка, самы меншы ў школе, горда нёс рыдлёўку, згінаючыся ад яе цяжару.

Настаўнік прышоў у школу і павёў дзяцей на двор. Разам з вучнямі размеркавалі месцы для ямак, потым настаўнік назначыў работу вучням, падзяліўшы іх на гурткі, і сам выкапаў першую ямку, каб паказаць дзецям, як гэта трэба рабіць.

— Што гэта вы робіце?

Панна Ядвіся непрыметна падышла да Лабановіча. Гэты так добра знаёмы яму голас прывёў яго ў нейкае трапятанне. Сэрца застукала мацней.

— Хачу па сабе вам памяць пакінуць.

— А хіба-ж вы паміраць збіраецеся? — засмяялася Ядвіся.

— Я памёр ужо, — трагічна прамовіў Лабановіч.

— Дык гэта вас хаваць тут будуць? — жартавала яна. — Можа, пабегчы пасклікаць баб, каб паплакалі па вас?

— А вы хіба не заплачаце па мне?

— Дык вы-ж усё роўна чуць не будзеце.

— Ах, выбачайце! — апамятаўся Лабановіч. — Вельмі дзякую вам за букецік і за тыя красачкі, што праз фортку ўляцелі.

Панна Ядвіся прыкінулася вельмі здзіўленаю і як-бы нічога не разумела.

— Які букецік?

— А той самы, што ўчора вы на стол палажылі.

— Ваша бабка — лгарка, і самі вы — лгар, — запратэставала Ядвіся. — Больш ніколі да яе не пайду, і ў вашу кухню не ступіць мая нага...

— І ў маю фортку не паляціць ні адна краска?

Панна Ядвіся павярнулася і кінулася бягом у свой двор, потым яна спынілася і пайшла зноў да Лабановіча.

— Слухайце; вы бралі кнігу, што ў вас на стале разгорнутая ляжала?

— Не, не браў.

— Вы не хлусіце?

— Я, здаецца, нікому яшчэ ў фортку не кідаў красак, каб мне лгаць.

Панна Ядвіся чагось засмяялася, ніколечкі не пакрыўдзіўшыся.

— Хочаце? Пойдзем сёння гуляць?

— Пойдзем, пойдзем! — падхапіў настаўнік. — Вы, можа, не паверыце, а ў мяне, чэснае слова, была гэта самая думка, толькі я не адважваўся сказаць вам.

— Дык вы заходзьце да нас.

— Абавязкова і з вялікай прыемнасцю.

Яна зноў паімчалася ў свой двор. Дзеці шумелі, гаманілі, спрачаліся, хвалілі свае і ганілі чужыя ямкі.

Лабановіч стаяў шчаслівы, аб чымсі думаў, і ледзь прыметная вясёлая ўсмешка блукала ў яго вачах і на губах.

«Чаму гэта пытала яна пра кнігу? — падумаў Лабановіч. — Ці не палажыла яна чаго туды?»

А гэтым часам панна Ядвіся кралася з другога ходу, каб тайком выняць з кнігі тую паперку, дзе яна напісала: «Мілы... дурань», чаго Лабановіч не агледзеў.

XXX

Прымкнуўшы дзверы кухні з двара, Лабановіч борздзенька пабег да сябе на кватэру праз другі ход, што вёў у школу. Ціхенька ступаючы, падышоў ён да дзвярэй і толькі дакрануўся да іх рукою, як у той-жа час панна Ядвіся кулём кінулася ў кухню, каб выскачыць на двор. Але дзверы не адчыняліся. Азірнулася — на парозе стаяў настаўнік.

— Ах, попалась, пташка, стой,
Не уйдешь из сети!
Не расстанемся с тобой
Ни за что на свете!

спакойна дэкламаваў Лабановіч, не зводзячы з яе вачэй, любуючыся ёю, шчасліва ўсміхаючыся.

А яна і сапраўды выглядала, як злоўленая птушка... Неспадзеўкі, пужлівасць, нейкая вінаватая ўсмешка разам адбіваліся на яе твары. Акруглыя цёмныя вочы пазіралі то на дзверы, то на настаўніка. Адна рука яе была сашчэмлена — напэўна там была тая паперачка з двума словамі.

— Нашто вы замкнулі тут дзверы? — зусім нявінна спытала яна.

— А каб тыя самыя ножкі, што прышлі сюды праз школу, не вышлі праз кухню.

Лабановіч падышоў да яе зусім блізка. Яна неспакойна заварушылася.

— Пусціце мяне!..

— Вы — мая госця і нявольніца. Ніякаму на свеце паляўнічаму не здаралася злавіць такую слаўную сарначку, як мне сёння. Дайце-ж хоць наглядзецца мне на яе! — І ён стаў пазіраць на яе.

— Ну, другі раз вы не зловіце мяне.

— А навошта мне лавіць, калі я вас ужо злавіў?

Яна раптам кінулася яму пад рукі, каб уцячы. Але ён крэпка схапіў яе падпахі і не пускаў.

— Што вы робіце? — з гневам прамовіла яна. — Не смейце дакранацца да мяне!..

— Вы-ж самі кінуліся мне на рукі, — сказаў настаўнік і пачуў, як збунтавалася ў ім кроў.

Лабановіч выпусціў яе і толькі трымаў за руку. Яна зноў стала вырывацца. Цёмнарусыя валасы раскінуліся па плячах пышнымі хвалямі.

— Не, мілая палонніца, нічога не будзе — не пушчу!

З распушчанымі валасамі, з залітымі агнём шчочкамі яна была незвычайна прыгожая, і настаўнік не мог адвесці ад яе вачэй.

— Ну, слухайце, — тонам просьбы прамовіла яна, — ніяк я не спадзявалася, што вы будзеце мяне мучыць!

— А вы мяне не мучыце? — спытаў ён і глянуў ёй у вочы. — Выкуп дайце, тады я пушчу вас.

— Я не маю чым плаціць, — сказала яна і адною рукою старалася паправіць свае валасы. Настаўнік сумыслу раскідаў іх.

— Ах, адстаньце вы!

— Не, не адстану: каб вы ведалі, якая вы прыгожая з распушчанымі валасамі, вы заўсёды і хадзілі-б так.

— У маёй мамы таксама былі раскошныя валасы, але доля яе была нешчаслівая, — у засмучэнні прамовіла яна.

Лабановічу стала незвычайна шкада яе. Ён выпусціў яе руку, глянуў у вочы.

— Бедная вы, мілая, харошая, слаўная Ядвісечка!

— У, усе вы такія гэрады, тыраны! — з нейкаю нянавісцю прамовіла яна.

Лабановіч хацеў адказаць, што яна памыляецца, але не паспеў. Яна раптоўна абхапіла рукамі яго шчокі і, умомант прыблізіўшы яго галаву, пацалавала, а потым з сілаю адштурхнула яго і кінулася за дзверы. А ён, як-бы апалены маланкаю, стаяў на месцы колькі моманту. Потым, як дзікі звер, кінуўся даганяць. Ядвіся стаяла на парозе, трымаючыся за клямку. Яна была зусім спакойная.

— Калі асмеліцеся пацалаваць мяне, то, клянуся памяццю мацеры, я кінуся пад машыну! — І цёмныя акруглыя вочы яе блиснулі іскрамі гневу.

— Мілая, родная Ядвісечка! Не, не: не буду... А пагуляць мы пойдзем?

— Дурань! — злосна прамовіла яна. Потым ускінула на яго свае добрыя, чыстыя вочы, усміхнулася і знікла за дзвярыма, трымаючы ў руцэ вузенькую паперачку.

Лабановіч вярнуўся ў пакой. Яго рукі і ногі дрыжалі. Ён прысеў каля стала на край канапы і сядзеў, не думаючы ні аб чым. Пасля ўстаў, хістаючыся пайшоў у кухню, выпіў вады. Унутры ўсё кіпела ад нейкага шчасця і радасці.

«Што за дзяўчына! Што за натура! — колькі разоў паўтарыў малады, шчаслівы настаўнік. — Яна любіць мяне!.. Ці-ж можна не любіць яе, гэтую лепшую, прыгажэйшую казку Палесся. Ядвісечка!.. Мілая, любая!»

Два старэйшыя вучні, якія рыхтаваліся да экзамену, прышлі і сказалі настаўніку, што ўсе ямкі пакопаны.

— Збярыцеся ў школу, я вам скажу колькі слоў і пушчу дамоў.

Вясёлы, дружны шум уварваўся ў школу, звонкія, шчаслівыя дзяціныя галасы напоўнілі ўвесь дом.

Настаўнік увайшоў, пахваліў дзяцей за работу і сказаў ім:

— Заўтра ўжо кніг не прыносьце. Вазьміце колькі рыдлёвак (ён назначыў большых вучняў) і збярыцеся тут. Пойдзем у лес, накапаем дрэўцаў і пасадзім іх у ямкі, што вы сёння прыгатавалі. А цяпер ідзіце дамоў!

Настаўнік не хадзіў нікуды ўвесь вечар. Гэта зда-

рэнне, гэты агнявы пацалунак панны Ядвісі напоўніў яго шчасцем, і яму здавалася, што гэтага шчасця стане надоўга. Ён перажываў кожны момант свайго шчасця, над некаторымі затрымліваўся доўга... Чаму яна сказала, што кінецца пад машыну, калі ён пасмее пацалаваць яе, і нават паклялася памяццю мацеры? Чаму кінула яна яму «дурань», а потым як-бы пакаялася ў гэтым і падарыла яму такую добрую ўсмешку, як-бы ёю перапрашала за гэта зняважанне? Ён хадзіў па пакоіку і ўсё думаў аб ёй. Але чым болей думалася, тым больш хацелася яму зноў пабачыць сваю мілую Ядвіську, пачуць яе голас, зазірнуць ёй у вочы, каб прачытаць, што робіцца ў яе душы. Ён часта паглядаў у вокны, каб убачыць яе. Яе імя гучала ў яго вушах незвычайнаю музыкаю і мела нейкае асаблівае значэнне.

Назаўтра Лабановіч прачнуўся пазней, бо заснуў толькі тады, як пачало развідняцца, прачнуўся з думкаю аб сваім шчасці, аб Ядвісі. Ён устаў, калі ўжо ў школе чуліся дзіцячыя галасы. Успомніў, што сёння субота перад вербніцаю, што ў гэты дзень ён скончыць сваю работу ў школе, бо пасля вялікадня прыдуць усяго толькі тры вучні, якім трэба падгатавацца да экзамену.

З вясёлым шумам ішлі дзеці ў лес са сваім настаўнікам, збіўшыся вакол яго цеснаю грамадкаю.

Дзень быў ясны, цёплы. Нават на цельшынскай вуліцы падсохла. Сяляне з сохамі, з каробкамі і мяшкамі з аўсом выязджалі на поле. Жалобна крычалі кнігаўкі, снуючыся над балотамі, над вадою, як-бы шукалі вельмі дарагую страту і ніяк не знаходзілі. У зацішку на лужынах тужліва кумкалі зялёныя жабы, а далей у балотах, між лесу, пераклікаліся бугаі, бухаючы, як у пустыя кадушкі. Гэта буханне на далёкай адлегласці будзіла лясы, прыдаючы агульнаму настрою Палесся асаблівыя тоны. Сталыя і важныя буслы з незвычайнаю сур'ёзнасцю хадзілі па краях балота або ляталі да гнёздаў на старых хвоях і папраўлялі свае апушчаныя на зіму палацы. Там і сям на ўскраінах лясоў распускаліся маладыя лісточкі бярэзінак. Жоўтыя пухаўныя каткі звісалі на вербалозінах, купаючыся на сонцы і склікаючы пчолак і чмелікаў. Зялёныя кветачкі павыбіваліся ўжо на свет скрозь сухія выцвіўшыя лісці, і прынадныя пахі разлівала ў паветры

маладая чаромха. Адны толькі паважныя дубы, узбагачаныя вопытам жыцця за свой доўгі век, не вельмі спяшаліся расчыняць свае покаўкі і выпускаць адтуль свежую зелень маладых лісточкаў, бо дуб — мудрае дрэва, і не паддаецца ён на зман няпэўнай у пачатку вясны.

Настаўнік спыніўся з вучнямі на сухім месцы ў лесе і вёў з імі размову аб тым, што бачылі перад сабою, і аб значэнні тае справы, дзеля якой яны прыйшлі.

Дзеці рассыпаліся па лесе і агаласілі яго сваім крыкам і шчэбетам. Лабановіч доўга шукаў маладую грушку. Ён хацеў знайсці прыгожанькую грушку і пасадзіць яе на памяць аб сваёй каханай.

Знайшоўшы маладое, крэпенькае і стройнае дрэва, ён доўга і асцярожна капаўся каля яго, пакуль акуратненька не было яно выкапана разам з зямлёю. Сам нёс яго дамоў, пасадзіў у куточку на школьным двары, дзе найболей свяціла сонца, і два разы паліў вадою ў гэты дзень. Пасля агарадзіў гэту грушку высокімі коллямі, каб не патаптала і не паламала яе жывёла.

На кожнае дрэва вызначыў ён вучняў, даручыўшы ім догляд за выхаванцамі.

— Ну, а цяпер, дзеткі, ідзіце абедаць. Па абедзе збярыцеся і прынясіце свае кнігі, бо пасля вялікадня парассыпаецеся вы па лясах і палях. А хто захоча хадзіць у школу і па вялікадні, той потым і атрымае кнігу.

Прыняўшы па абедзе кнігі ад вучняў і пусціўшы іх на святы, Лабановіч пачуў, як-бы яму стала чагось шкада, хоць, праўду сказаць, крыху дакучыла за зіму гэта работа па восем і па дзесяць гадзін у дзень.

Ён вышаў на двор, абышоў пасаджаныя дрэвы, над некаторымі затрымліваўся даўжэй. Ён часта паглядаў на двор пана падлоўчага. Вельмі хацелася пабачыць Ядвісю і паказаць ёй гэту слаўную грушку, якую пасадзіў ён на памяць аб ёй. Але Ядвіся доўга не паказвалася на двары. Ён падкараўульваў яе з гадзіну. І калі заўважыў, аклікнуў і папрасіў яе падысці.

Яна, радасная і вясёлая, падбегла.

— Я хачу паказаць вам грушку.

— А вы не будзеце лавіць мяне? — з мілаю і хітраю ўсмешкаю спытала яна.

Ён памог ёй пералезці цераз плот і павёў да грушы.

— Гэту грушку я пасадзіў на памяць аб вас.

Яна доўга разглядала яе. Потым засмяялася і сказала:

— Я вырву яе і выкіну.

— Чаму?

— Бо яна такая-ж калючая і дзікая, як я.

— Пойдзем гуляць сёння? — спытаў ён.

— А вы памятаеце, што я вам учора на гэта сказала?

— Зрабіце вы тое самае, што зрабілі ўчора, і тады скажыце мне хоць дзесяць разоў тое, што сказалі адзін раз.

Яна паглядзела на яго строга і прамовіла:

— Больш ніколі! Чуеце? Ніко-о-олі!

XXXI

Вербніца і благавешчанне ў гэтым годзе прыпалі на адзін дзень. На свята павінен быў прыехаць з Малевіч а. Мадэст з дзякам Цішкевічам, бо ў гэты дзень цельшынцы па старому звычаю зносілі свае грахі папу, пасля чаго ўжо рабіліся як-бы святыя. Праўда, у Цельшыне было многа такіх палешукоў, як, напрыклад, дзед Мікіта, да якіх святасць не падыходзіла ніякім чынам. І замест таго, каб здаць старыя грахі, яны не толькі не здавалі іх, а набіраліся яшчэ новых.

Звычайна а. Мадэст прыязджаў напярэдадні пад вечар. Так і сёння прыехаў ён досыць рана, калі яшчэ сонца не паспела схавацца за дубам, што стаяў з боку раз'езду. Счакаўшы з поўгадзіны, з каплічкі, што стаяла ў зараслі панурых і цёмных могілак, панёсся глухі звон, як-бы гэта званілі ў які-небудзь шчарбаты чыгун. Тым не меней, звон гэты, такі рэзкі і такі незвычайны для Цельшына, рабіў моцнае ўражанне. І кожны, хто чуў яго тут, так ці іначай аказваўся на гэты звон.

— А што гэта? — пытаўся хто-небудзь з цельшынцаў. — Звоняць ці што?

— А мабуць звоняць.

І пасля гэтага вяліся тыя ці іншыя развażанні.

— Ужо, мабуць, піп прыіхаў: штось забомкалі.

— Спавядацісямем?

— А мабуць, шчо так.

Але палешукі не вельмі кідаліся да царквы, бо яны народ дбалы і дасціпны. Таму паляванне ўсміхалася панадна, у другога было асочана месца, дзе яшчэ шчупакі не скончылі нераставаць.

І цельшынскі звон, як відаць, добра ведаў звычаі сваіх парафіян, бо не спяшаўся канчаць скліканне. Толькі праз гадзіну, калі ўжо на цвінтарыку збіралася досыць многа палешукоў і паляшучак, а з дворыка Міхалкі Кугая паказваўся а. Мадэст, які ішоў роўна, і дзяк Цішкевіч, у якім было ўсё-такі меней «благадаці», з прычыны чаго ён крыху заграбаў нагамі, — ужо тады звон пачынаў заліваецца ямчэй, прыхватваючы для гэтага сваіх меншых тонкагалосых братоў.

Каплічка адмыкалася. Каля дзвярэй звычайна стаяла колькі маладзіц з дзецьмі на руках. Яны не смелі самі ўвайсці ў капліцу, бо былі яшчэ «нячыстыя». Маладзіцы мелі розныя тэрміны: каму трэба было «ўводзіцца» каля сёмухі, каму каля Пятра, каму на каляды, а хто яшчэ і зусім не вытрымаў свой тэрмін. Але ў Цельшыне гэта не мела значэння. Айцец Мадэст стаўляў цэлы шэраг маладзіц у капліцы па абодва бакі дзвярэй, браў свой трэбнік і чытаў малітвы, а дзяк Цішкевіч спяваў, крыху пагойдваючыся на нагах. Але гэта не шкодзіла яму назіраць і за «благочинием» у капліцы, бо маладзіцы, былі здарэнні, часамі і штурхаліся або выпіраліся наперад.

— «Еліцы во Хрысце»... — спяваў Цішкевіч, і тут ён заўважаў, што якая-небудзь маладзіца парушала парадак. Тады ён прыпыняў спяванне і навучальна казаў маладзіцы: — Не прыся ты, а стой спакойна, — і спяваў далей.

— «Крэсці-і-ісь-це-сяяя!»

А тут ізноў рабілася што-небудзь не так, як трэба ў царкве.

— Ці чуеце вы, ці не, што я вам кажу? — ужо досыць строга пытаў маладзіц Цішкевіч і ссоўваў бровы. Направіўшы парадак, ён прадоўжваў спяваць:

— «Во Хрыста аблекосцеся!»

Пабачыўшы новы непарадак, Цішкевіч рашуча спыняў спевы і ўжо сярдзіта казаў:

— Тфу! Што гэта за праціўная баба! Ці ты ёй кажы, ці не кажы — хоць кол на галаве чашы. — І, не спускаючы з маладзіц свайго грознага погляду яшчэ колькі хвілін, Цішкевіч канчаў песню:

— Алілу-у-у-я!..

Айцец Мадэст нічым тут не выказваў свайго «я» і даваў Цішкевічу поўную магчымасць навучаць «пастве», бо яны жылі вельмі згодна. І гэта была не навіна і не першыня, калі яны дома, у Малевічах, ішлі поруч, падтрымліваючы адзін другога, бо вельмі часта хварэлі на няўстойку ног. Ідучы дружнаю параю, часамі прыпыняліся на вуліцы і рабілі кароткую параду, куды зайсці? Яны падымалі галовы, пакладаючыся ўжо тут на свае вочы. І калі перад вачамі стаяла школа, яны і накіроўваліся туды. Узышоўшы на ганак школы, зноў прыпыняліся, і тут часамі бывала між імі невялікая спрэчка, бо, як праўдзівыя хрысціяне, яны ўступалі першае месца адзін другому. А з тае прычыны, што перад богам усе роўныя, яны ўваходзілі разам, адначасна. Айцец Мадэст садзіўся першы на крэсла і казаў Цішкевічу:

— Садзіся, дзяча, школа царкоўная і крэслы царкоўныя.

Тут ён вымаў з-за пазухі расы бутэльку, сам цягнуў і дзяку даваў пацягнуць. Настаўніца не ведала, як трымаць сябе з гасцямі. Але госці былі непатрабоўныя, частаваліся сваёю гарэлкаю і закусвалі сваімі языкамі. Яны трохі спачывалі, спявалі «Хрыстос уваскрос» і спакойна выходзілі.

Увёўшы маладзіц і крыху панасіўшы іх дзяцей, а. Мадэст прыступаў да споведзі. Палешукі, збыўшы гэты клопат, зараз-жа выходзілі з капліцы і ішлі дамоў. Назаўтра зранку таксама ішла споведзь, а потым ужо служылася абедніца, набажэнства, спецыяльна створанае для палешукоў, бо звычайна іх доўга ў царкве не затрымлівалі. Невялічкая капліčка, якая магла ўмясціць якую-небудзь шостую частку цельшынцаў, была напалавіну пустая, і толькі тады, калі пачыналася прычашчэнне, у ёй рабілася цесна, бо кожнаму хацелася хутчэй узяць прычасце. І тут ужо без канфліктаў ніколі не абыходзілася.

— Што ты мне на ногі ўзлез? — злосна глядзеў

Трахім Буч на Рыгора Качана. — Прэцца, бы тая свіння, — усё яшчэ ў злосці казаў Буч.

Качан пазіраў на Буча, як-бы разважаючы, што адказаць яму на гэта. Ён успамінаў, што яны ідуць да прычасця і што не павінны мець гневу ў сваім сэрцы, і, з дакорам ківаючы галавою, казаў, а ў голасе яго чулася скруха.

— Саладушнік ты, шчоб ты захлынуўся! Ідзеш да святога прычасця, а лаешся, як сабака, як-бы ты не ў царкве, а ў карчме ў Абрама!

Напамін аб хрысціянскай пакорлівасці, зроблены Качаном, меў значэнне і сілу, бо Буч нічога не адказваў і глядзеў перад сабою. А там, каля бацюшкі з чашаю, таксама мітусіўся народ.

— Чаго ты пхаешся? — аглядаецца на суседа паляшук.

— А ты сам куды пражэсса?—адказвае сусед, па мянушцы Швайка, і займае першае месца, а другі сусед, злосны, становіцца за ім, бо сварыцца ўжо няма калі, і Швайка стаіць з разяўленым ротам.

Айцец Мадэст лыжачкаю бярэ з чашы:

— Прычашчаецца раб божы... Імя?

— Габрусь!—адказвае Швайка.

Угневаны ім сусед дадае:

— Дый яшчэ Швайка!

Швайка зачыняе рот, адварочваецца да суседа:

— Дый яшчэ чорт тоўстаносы!

Потым ён зноў разяўляе рот, павярнуўшыся да чашы.

Айцу Мадэсту таксама не церпіцца, хоць у справы сваіх парафіян ён не мяшаецца. Але калі заўважае што, то выкідае ўсё гэта на вока.

Дзед Мікіта толькі што вярнуўся з рыбы. Відаць, ён спяшаўся, каб не апазніцца на прычасце, бо моцна засопся і яшчэ ў капліцы зрабіў колькі шпаркіх крокаў, якімі ён ішоў з балота. Ён адапхнуў колькі кабет і стаў наперадзе. І вось, калі дайшла да яго чарга, а. Мадэст, зірнуўшы на ногі дзеда Мікіты, заўважыў, што яны па самы пояс былі мокрыя, а лапці плюхцелі.

— Ты чаму-ж гэта мокры прышоў сюды? — спытаў яго а. Мадэст.

— Замачыўся, то і мокры,—адказаў дзед Мікіта, крыху адвярнуўшы ад бацюшкі лысую маршчыністую галаву.

— Дзе-ж гэта замачыўся?

— На балоце, дзе-ж?

— А чаму-ж ты на абедніцы не быў?

Дзед Мікіта маўчыць.

— Я табе прычасця не дам,—накінуўся на яго бацюшка.—Не мог ты поўгадзіны ў царкве пабыць, памаліцца? Дык ты скарэй на балота, да чарцей пабег, а цяпер, аблюманы і абрынданы, прычашчацца прыпёр? Не буду прычашчаць!—прамовіў а. Мадэст і павярнуўся з чашаю ўбок.

— Го! — сказаў дзед Мікіта,—не будзе прычашчаць!.. То і не трэба! Настрашыш ты мяне!

Дзед Мікіта, ні на кога не пазіраючы, ідзе вон з капліцы. Айцец Мадэст колькі хвілін стаіць з чашаю і глядзіць услед дзеду... Ён яшчэ думае, што дзед вернецца і папросіцца ў яго. Але дзед Мікіта, той самы дзед, што з жарнавікамі танцаваў, падыходзіць ужо да дзвярэй:

— Гэй! Як цябе там? Вярніся! Чуеш?—гукае а. Мадэст.

Дзед спыняецца, паварочвае галаву да бацюшкі і кажа:

— Не хочу!

— Вярніся ты!—крычыць а. Мадэст:—Табе ўжо і слова нельга сказаць.

Мікіта адпускаецца і, хлюпаючы лапцямі, зноў ідзе да амбону.

Айцец Мадэст прычашчае яго. Дзед бярэ кусочак прасфары, кладзе ў рот і хоча ісці.

— Ці злавіў-жа хоць рыбы?—пытае а. Мадэст.

Дзед зусім адпускаецца, глытае прасфару і адказвае ўжо лагодна:

— Дзе там у чорта? Няма!—працягвае ён апошняе слова, махае рукою і выходзіць.

Святая служба канчаецца. Цішкевіч бубніць апошнія малітвы, а. Мадэст скідае рызы. Малітвы скончаны, кніга загорнута.

Айцец Мадэст падыходзіць да Цішкевіча, яны перакідваюцца колькімі словамі і выходзяць.

На цвінтарыку духавенства прыпыняецца, знаёміцца з цельшынскім настаўнікам.

— А вашы вучні добра чытаюць. Учора даў газету ва-

шаму вучню, Рылку; такі маленькі, а як разбірае! Права слова!—гаворыць а. Мадэст.

Цішкевіч панура слухае, потым падымае вочы на бацюшку.

— Э, бацька! Ці ты яго хвалі, ці не хвалі, а на чай нас усё роўна не пакліча!

— Цёмны тут у вас народ!—гаворыць на развітанне а. Мадэст і паволі з Цішкевічам ідзе да Міхалкі Кугая.

XXXII

На чацвёрты дзень вялікадня вярнуўся Лабановіч у сваю школу. Яшчэ вечарам таго-ж самага дня, калі цельшынцы здавалі свае грахі а. Мадэсту, надумаўся ён паехаць дадому, каб крыху праветрыцца і хоць на кароткі час адысціся ад кругу тутэйшых уражанняў і сваіх настрояў. Але на першыя-ж дні свят яго моцна пацягнула сюды, бо быць блізка ад Ядвісі і бачыць яе хоць зрэдку стала яго патрэбаю. Едучы назад, ён не спаў дзве ночы, а па дарозе, апрача таго, яму прыходзілася віншаваць таго-сяго са святым вялікаднем і, разумеецца, крыху падвіншавацца. Утомлены бяссоннымі начамі і выпіўкаю, ён пачуў сябе вельмі добра, улёгшыся на сваёй пасцелі, і зараз-жа заснуў крэпкім-крэпкім сном.

Даведаўшыся, што прыехаў сусед, пан падлоўчы праз поўгадзіны, прымасціўшыся пад акном, дзе спаў настаўнік, барабаніў кулаком у раму і клікаў:

— Прафесар велькіх букваў! О, прафесар! Чуеш? Уставай піць гарэлку!

Лабановіч спаў крэпка і нічога не чуў. Падлоўчы быў падвыпіўшы і не адступаўся. Яго кулак часцей і шмат мацней пачаў барабаніць па сярэдняй раме. Шыбы зазвінелі, а з некаторых пасыпаўся кіт.

Падлоўчы Баранкевіч, звярнуўшы на гэта ўвагу, засмяяўся і прамовіў сам сабе:

— Чорт яго бяры, прафесара: павыбіваю яму вокны!

Лабановіч на гэты раз пачуў грук і скрозь сон дагадаўся, што яго будзіць падлоўчы, але расчыніць вочы і падняць галаву проста не меў сілы. Калі-ж грук пачаўся з новай сілаю, ён громка прамовіў:

— Га-а!

— Уставай, прафесар! — гукаў з двара Баранкевіч.

Лабановіч узняўся, адчыніў фортку і стаў прасіцца:

— Пане суседзе, не спаў тры начы—не магу!

— Што за «не магу»? Зараз-жа адзявайся, бо, далі-бог-жа, прыду і павалаку так, як ты цяпер ёсць. А будзеш упірацца, то паклічу Рыгора і Язэпа і, далі-бог, прывалачом вось так, як ты цяпер ляжыш. А ў мяне і паненкі ёсць.

Лабановіч убачыў, што ад падлоўчага не адчэпішся, і стаў адзявацца. Памыўшыся халоднаю вадой, ён крыху асвяжыўся і прышоў да памяці. Ён пералез добра знаёмы яму пералаз і ступіў на ганак пана падлоўчага. Негрусь па свайму сабачаму звычаю забрахаў разы тры, павільваючы хвастом, як-бы хочучы сказаць: «Гэта я так сабе брашу, без злосці».

— А што? Збаяўся: прышоў-такі!—спаткаў «прафесара» падлоўчы ў сваім пакоі.

Даўжэразны стол, якога раней настаўнік не бачыў у пана падлоўчага, стаяў каля сцяны, прыпёрты да яе шчыльна адным сваім краем. Гэты стол, як ёсць, быў завален пірагамі, бабкамі, мясам розных гатункаў і рознага прыгатавання. Штук шэсць шкляных банак з крэпкім хрэнам выглядалі з розных месцаў стала, тры «буслы» гарэлкі высока падымалі галовы над стусамі закусак. Шынкі, як падушкі, абтыканыя зелянінаю, ляжалі важна зялёнымі ўзгоркамі.

На дзябёлым крэсле старасвецкай работы сядзеў чыгуначны майстар Грыгарэц, з шырачэзнаю спінаю, дубовага складу чалавек, ніколі ў жыцці не ведаўшы страху перад гарэлкаю. Ён быў тоўсты, крэпкі, і меў выгляд навоя, на які толькі што навілі кросны ў дванаццаць губіц. Рыжая і ўжо з лысінаю галава яго насілу пакручвалася направа і налева на кароткім, але незвычайна тоўстым карку. Маленькія вочкі яго ўжо замасліліся, але ён не касаваўся перад чаркамі і ліў іх, як у бочку. Тут-жа была і панна Людміла са сваім братам Анатолем. Анатоль, пaздароўкаўшыся з настаўнікам, зараз-жа пайшоў шукаць прыпынку для свае галавы, у якой цяпер малаціла нейкая малатарня. Людміла толькі правяла яго балесным поглядам. Яна была адзета ў лёгкую шаўковую блузку колеру ільнянога цвету і выглядала вельмі прыгожаю і цікаваю. Ядвіся таксама была адзета з густам. На ёй

была чырвоная атласная кофтачка, якая вельмі ішла да яе смуглага твару, а пышныя цёмнакаштанавыя валасы былі перахвачаны чырвонаю-ж, як жар, стужачкаю. Габрынька стаяла каля музычнае скрыначкі, з якой нядаўна грымела музыка.

— Тут, пане мой, паненкі адны сядзяць, а ён спаць заваліўся,—адчытваў Лабановіча вясёлы падлоўчы.

Падышоўшы да Людмілы, Лабановіч спыніўся і сказаў ёй:

— Чаму вы, панна Людміла, не перахрысціліся, убачыўшы мяне?

Ядвіся зірнула на Лабановіча, потым на Людмілу. Людміла, асвятліўшы свой твар усмешкаю, пазірала на яго, штось прыпамінаючы, а потым весела засмяялася.

— Аднак-жа вы злапомны.

— Зусім не,—адказаў настаўнік,—я толькі хацеў вам напомніць, што, угледзеўшы «святога», трэба перахрысціцца.

— Ну, годзе табе тут любошчы разводзіць,—падышоў падлоўчы і ўзяў настаўніка пад руку:—Вып'ем!

— Ох, паночку: за што вы на мяне так угневаліся? З раю ў пекла цягнуцца?—скардзіўся Лабановіч, гледзячы на паненак.

— І ў пекле паненкі ёсць, ды яшчэ такія, якіх і ў раі не знойдзеш,—прамовіў падлоўчы і, пакланіўшыся паненкам, папрасіў прабачэння, што забірае ад іх кавалера.

— Але нічога,—заспакоіў ён іх,—пан прафесар шмат цікавейшы будзе, вярнуўшыся ад стала.

Падлоўчы Баранкевіч наліў чаркі.

Грыгарэц вельмі спрытна кульнуў сваю чарку; здавалася, што ён яе і не піў, а так толькі ўскінуў галаву, каб паглядзець, як высока столь у пакоі падлоўчага. Закусваючы, ён штурхануў локцем Лабановіча і ціха прамовіў:

— Ну, як наконт маладзічак?

Настаўнік нічога не паспеў сказаць, бо перад ім ужо стаяла другая чарка.

— Выпі, тады будзеш закусваць. Мы тут, пане мой, мардаваліся, а ён сабе спаць палажыўся.

І гаспадар прымусіў яго выпіць яшчэ чарку.

Лабановіч пабег да паненак, запрашаючы іх да стала.

— Пойдзем!—прасіў ён іх: —Я раскажу вам гісто-

рыю, як на Палессі такія, як вы, прыгожыя дзяўчаткі з'явіліся.

Паненкі зацікавіліся і ўсталі. Ён узяў іх пад рукі і пайшоў разам да стала. Наліў па чарцы віна і вельмі ўпрашаў выпіць, называючы іх дыяментамі Палесся, божымі летуценкамі. Яму было надзвычайна весела, язык развязаўся, ён забаўляў паненак; яны слухалі і смяяліся.

— Ну, а гісторыю калі скажаце? — пыталі яны.

— А вось, як віна вып'еце!

Дзяўчаты выпілі.

— Ну, слухайце... Стварыў бог Палессе і пайшоў аглядаць балоты. Доўга хадзіў бог, і стала яму маркотна. І стварыў ён дзяўчыну незвычайнага хараства і сам залюбаваўся ёю. Вочы ў яе былі, як у панны Ядвісі, і такія-ж самыя пышныя валасы. Бровы... — тут Лабановіч глянуў на бровы панны Людмілы, а потым на бровы Ядвісі.

— Усё ў яе было, як у панны Ядвісі, — сказала панна Людміла і хітра ўсміхнулася.

— Не, не ўсё, — адказаў Лабановіч, — бровы былі, як у Габрынькі, губы і рот — як у вас. Доўга пазіраў на яе бог, а потым сказаў: «Не, няможна цябе пакідаць людзям: яны будуць калаціцца з-за цябе». Паставіў яе бог на сваю руку і дзьмухнуў. Дзяўчына рассеялася і зрабілася хмаркаю. «Ты будзеш хадзіць над Палессем век-векам, і ад тых людзей, на якіх упадуць твае кроплі, будуць раджацца красуні». І вы, — сказаў Лабановіч паненкам, — маеце ў сабе тыя кроплі і радзіліся дзеля таго, каб на Палессі не маркоціліся маладыя хлопцы.

— Ну, годзе табе казанні казаць, — спыняў яго падлоўчы.

Лабановіч ужо не спрачаўся і піў многа. Гарэлка ўрэшце страціла над ім сваю сілу, ён піў ужо сам і падліваў другім.

— Слухайце, — спытала Людміла, — чаму вы ніколі да нас не зойдзеце?

— Добра, што вы запыталіся цяпер, — адказаў настаўнік, — бо я толькі тады і кажу праўду, калі добра вып'ю. Дык слухайце: буду казаць праўду. Я затым і не хадзіў да вас, што баяўся вас, бо душа мая чуе: тады, калі мае ногі пераступяць парог вашага дома, яна пападзе да вас у палон.

— Я вельмі шкадую, — смеючыся прамовіла панна Ядвіся, — што ніколі не чула вас тады, калі вы добра вып'еце.

— Эх, панна Ядвіся, панна Ядвіся!—як-бы ў нейкім незвычайным засмучэнні прамовіў настаўнік: — Калі я гавару з вамі, то тады я не толькі «добра выпіўшы», але і п'яны — і, стала быць, яшчэ большую кажу вам праўду.

— Хіба-ж я бочка з гарэлкаю? — засмяялася панна Ядвіся.

— Вы — той напітак, які п'юць толькі багі.

Адным словам, Лабановіч стараўся развясельваць дзяўчат.

Падлоўчы хадзіў перавальваючыся, і здавалася, што яму вельмі было цяжка падымаць ногі. Але ён быў незвычайна вясёлы і, павярнуўшыся да Людмілы, заспяваў:

Ксёндз бэрнадын у касцелі —
Ха-ха-ха-ха!
Відзеў собе анелі!
Тра-ля-ля-ля!

Але далей ён чамусь не спяваў, як яго ні прасілі.

— Габрынька! — скамандаваў ён. — Заграй нам штонебудзь!

Пад звонкія і меладычныя гукі музыкі сарваўся з месца Грыгарэц і пайшоў тупаць і прытупваць. Здавалася, што гэта не чалавек танцуе, а нейкі добра ўкормлены вяпрук убег у пакой і ў нейкай свіной радасці разгуляўся тут і пайшоў выбрыкваць розныя вяпручыныя выкрунтасы. Пайшоў танцаваць і пан падлоўчы са сваёю жонкаю. Усе вельмі хвалілі пана падлоўчага і паню падлоўчую. Праўда, танцаваў ён спрытна. Потым Баранкевіч пайшоў у танцы з паннаю Людмілаю.

Грыгарэц пад шум танцаў кудысь знік. А калі агледзеліся, што ён прапаў, пан падлоўчы сказаў:

— О, злодзей! Ведаю я, куды ён пайшоў!—І, як відаць, трохі яму пазайздросціў.

Анатоль, праспаўшыся, зноў увайшоў у пакой. Гэта быў высокі малады хлапец, не падобны да свае сястры. Яны з настаўнікам падселі да стала і пачалі зноў піць, як-бы гарэлкі ў вочы не бачылі.

— Ну, Толя, ці не пара нам дамоў?—падышла да іх Людміла.

— Гуляйце: вялікдзень раз на год бывае, — сказаў ёй Лабановіч.

— Ну, хто вам больш падабаецца з хатовіцкіх маладых людзей?—спытала яна Лабановіча.

— Усе слаўныя хлопцы, — адказаў ён.

— Ну, гэтым вы мала сказалі.

— А што мне пра іх казаць? Я больш цікаўлюся дзяўчатамі.

— Ну, а хто-ж вам больш падабаецца з паненак?

— Калі аб гэтым пытаецеся вы, то я павінен сказаць вам — вы.

— Не, вы скажыце праўду.

— Хто цяпер гаворыць праўду? Нават і «святыя» і тыя пачынаюць лгаць.

— А я ведаю, хто вам не толькі падабаецца, але каго вы і кахаеце.

Лабановіч паглядзеў ёй у вочы, паглядзеў доўга і сказаў:

— Так, вы ведаеце.

— А па чым вы ведаеце, што я думаю?

— Па вашых вачах прачытаў.

— О, пані! — падхапіў падлоўчы: — Наш прафесар шаптаць і варажыць умее.

— Ну, паваражыце мне!—панна Людміла працягнула Лабановічу руку.

— Пані! — адказаў за яго падлоўчы, — наш прафесар па каленях гадае.

Людміла засаромелася, ускочыла і села на канапу. Пан падлоўчы качаўся ад смеху, пазіраў на «прафесара», а вочы яго казалі: «Вось як трэба з паненкамі гаварыць!»

Ад'язджаючы дамоў, Людміла доўга цiснула руку настаўніку, заглядала яму ў вочы і казала:

— Памятайце, я чакаю вас у Завітанкі.

— На тое-ж яны і Завітанкі, каб у іх завітаць, — адказаў Лабановіч і моцна паціснуў ёй руку.

XXXIII

Назаўтра атрымаў Лабановіч пакет. Інспектар паведамляў, калі і дзе назначаюцца экзамены, куды настаўнік павінен прыбыць са сваімі вучнямі. Экзамены назна-

чаліся на панядзелак па вялікадні, а ехаць трэба было па чыгунцы вёрст за пяцьдзесят... У той-жа самы дзень, калі было атрымана гэта паведамленне, прышлі і вучні. Тут яны ўмовіліся з настаўнікам, што паедуць у суботу вечарам, каб часамі не прапусціць цягніка. Гэтыя тры дні, якія заставаліся да экзаменаў, пайшлі на паўтарэнне курса.

Гэтымі-ж днямі даведаўся Лабановіч, што Ядвіся збіраецца выехаць з Цельшына, калі не назаўсёды, то ва ўсякім разе на доўгі час. Гэта вестка моцна засмуціла настаўніка. Ён адразу пачуў, што перад ім як-бы ўжо расчыняецца нейкая пустота, і гэтыя пышныя малюнкі зазеляняеўшага Палесся, узбуджанага вясною, поўнага спеву, шуму і жыцця, патускнелі ў адзін момант і як-бы адыходзілі ад яго. Усё, здавалася яму, мела цяпер такі выгляд, як-бы хацела сказаць яму: «У цябе гора, але мы ў гэтым не вінаваты», і пачынала жыць сваім клопатам, сваімі інтарэсамі, зусім для яго чужымі, а ён заставаўся адзін як ёсць.

Яшчэ адна акалічнасць засмучала яго: вестку пра ад'езд пачуў ён не ад самой Ядвісі, а ад бабкі. Разам з тым была надзея, што гэта, можа, яшчэ і не зусім праўда. Ён вырашыў сягоння-ж пастарацца пабачыць Ядвісю і пагаварыць з ёю. Цяпер толькі пачуў, як дарага яна і якая будзе невыказная страта, калі прыдзецца тут жыць без яе. Не, тады ён не застанецца тут! Уяўленне ўжо малявала асірацеўшы двор і пакой пана падлоўчага, і ён незвычайна востра пачуў тыя настроі, якія агорнуць яго тады, калі ўжо не будзе мілай суседкі.

Пасядзеўшы да самага вечара ў школе з вучнямі і крыху адцягваючыся заняткамі і блізкімі экзаменамі, ён пусціў дадому хлопцаў і пайшоў на кватэру. Зірнуўшы на дом пана падлоўчага, ён згледзеў Ядвісю на ганку. Яна сядзела за столікам, на якім стаяла швейная машына. Панна Ядвіся штось шыла. «Напэўна гатуецца ў дарогу», — тужліва зазначыў сабе настаўнік.

Лабановіч надзеў шапку і вышаў на двор. Борзда перакінуўшыся праз знаёмы яму пералаз, ён узышоў на ганак пана падлоўчага.

Ядвіся была сур'ёзная і як-бы крыху чымся заклапо-

чаная. Тут-жа сядзела і пані падлоўчая, таксама з шыццём у руках.

— Што-ж у пана чуваць добрага? — спытала пані падлоўчая.

Лабановіч паведаміў ёй аб экзаменах.

— Калі-ж вы паедзеце?—запыталася Ядвіся і ўскінула на яго свае цёмныя вочы.

— Умовіліся з хлопцамі ехаць у суботу вечарам.

Панна Ядвіся прыпыніла сваю работу і задуменна кудысь пазірала.

— Люблю я гэту станцыю, — прамовіла яна.

Пані падлоўчая вышла — яе паклікалі.

Лабановіч сядзеў моўчкі і думаў.

Вечар быў ціхі, ясны і цёплы. Цень ад хаты пана падлоўчага паволі закрываў палісаднічак і свежыя клумбачкі з краскамі, нядаўна пасаджанымі, і пасуваўся па вуліцы. Бойкія вераб'і чылікалі на хаце і снаваліся па палісаднічку.

— Што вы сёння нешта не ў гуморы?—запыталася Ядвіся і глянула на настаўніка.

— Скажыце вы мне, праўда ці не: я чуў — вы збіраецеся кудысь паехаць адгэтуль надоўга?

Панна Ядвіся ніжэй нахіліла галаву. Лабановіч пачуў, што адказ для яго будзе невясёлым. Не падымаючы вачэй, яна ціха сказала:

— Так, збіраюся паехаць.

Яна ўздыхнула ледзь прыметна, падняла галаву і паглядзела доўга-доўга на настаўніка.

— А вы-б хацелі, каб я не ехала?

— Я ведаю, вам тут цяжка, — сказаў настаўнік, — і пэўна там, дзе думаеце вы жыць, вам будзе лепей. І тут ужо не прыходзіцца лічыцца з тым, як-бы я хацеў. Але калі вы выедзеце адгэтуль, то я тут болей не застануся.

Ледзь прыметная радасць прабегла па яе твары. Ядвіся борзда ўскінула на яго цёмныя вочы і, смеючыся імі, зусім ужо весела прамовіла:

— І вам не шкада будзе панны Людмілы?

Лабановіч маўчаў.

— Скажыце, — прамовіў ён, — як даўно надумаліся вы выехаць адгэтуль?

— О, я ўжо даўно думала! Яшчэ і вас тут не было.

— А чаму вы са мною ніколі аб гэтым не гаварылі?

— А што мне было гаварыць? — сказала яна. — Вы і так смяяліся многа з чаго такога, што я гаварыла.

— А калі вы думаеце ехаць?—спытаў ён.

— Я і сама не ведаю: гэта будзе залежаць ад таткі. Запражэ каня, скажа ехаць, тады і паеду.

— І можа стацца так, што я вярнуся з экзаменаў, а ластавачка ўжо вылецела ў вырай?.. Скажыце мне, нашто гэта ластавачка вясною ў вырай вылятае?

— Што-ж? Як прыходзіцца! — прамовіла яна. — Чаго гэта вы сёння так павесілі нос? Як-бы ў вас за пазухаю свечка, якую вы мне павінны на сканане даваць?.. Я-б раіла вам пайсці да панны Людмілы... Праўда, яна цікавая панна?

— Праціў яе грэх сказаць што-небудзь: слаўная дзяўчына!.. Чаму вы раіце мне схадзіць да яе?

— Чаму? Самі ведаеце чаму: як толькі вашы ногі пераступяць парог яе дома, то душа ваша пападзе да яе ў палон.

Лабановіч усміхнуўся.

— Вы нават і гэтага не забылі.

— Хто вам казаў легенду аб палескіх прыгожых паннах?—запытала панна Ядвіся, палажыла сваю работу на стол і глянула на настаўніка.

— Гарэлка пана падлоўчага з аднаго боку...

— І панна Людміла — з другога, — падказала Ядвіся.

— Што вы мяне ўсё паннаю Людмілаю папракаеце?

— Я не папракаю, і не думаю нават, але панне Людміле вельмі спадабалася гэта легенда.

— А вам яна спадабалася?

— Каб яна для мяне казалася, тады і мне спадабалася-б, а чужое любіць — толькі сэрца пераядаць.

— Ну, вы мяне, панна Ядвіся, хочаце ўсердаваць, але вам гэта не ўдасца. А покі што бывайце здаровы.

Лабановіч затрымаў яе руку і з нейкаю просьбаю ў голасе сказаў ёй:

— Вы не выедзеце, покі я не вярнуся?

— Калі я паеду, я і сама яшчэ не ведаю. А можа, і зусім не паеду.

— А вы пад машыну не будзеце кідацца? — ціха спытаў ён яе, усміхаючыся.

— Не буду, — яшчэ цішэй прамовіла яна, азірнулася і апусціла вочы.

Ён умомант нахіліўся да яе і пацалаваў крэпка-крэпка. І, п'яны ад гэтага пацалунку, борзда вышаў з палісаднічка. А панна Ядвіся сядзела, нахіліўшы галаву, і аб чымсьці моцна-моцна задумалася.

У нядзельку раненька, на ўсходзе сонца, настаўнік са сваімі вучнямі, правёўшы ноч на станцыі, садзіўся ў вагон. Прабілі тры званкі, гучна і адрывіста азваўся паравоз, абуджаючы ранічны спакой бясконцых балот, і поезд зрушыў з месца. З шумным шыпеннем выпускаючы пару, усё быстрэй і быстрэй бег паравоз, і ў нейкую своеасаблівую, глухую музыку злівалася тухканне цяжкіх ног поезда.

Лабановіч стаяў каля расчыненага акна. Штось прыемнае і радаснае ўлівалася яму ў душу ад гэтых новых малюнкаў і ад гэтага размашыстага бегу машыны. Борзда адыходзіла назад станцыя з высокаю вадакачкаю, закрываючыся свежаю зеленню раслін. Рассыпаючы сноп залатых стрэл, велічна выплывала сонца з-за краю зямлі над прасторамі зялёнага палескага мора. Хутка вынікалі і беглі ўсё новыя і новыя малюнкі гэтага зачараванага краю. Балоты з густымі зараслямі лазы, кустоўніка і маладой асакі рассціляліся шырачэзнымі круглымі абшарамі, па краях якіх ледзь відненіся зубатыя цёмныя палоскі лясоў. Балоты канчаліся, побач дарогі ўставалі высокія сцены бору, бор перасякаўся вясёлымі палянкамі; тамсям віднеліся на іх людскія будынкі, а бярвенні гэтых будынкаў, асветленыя сонцам, здаваліся маршчынамі на разумнай галаве чалавека, які многа думае і разважае. Вясёлыя палянкі абводзіліся аправаю пышна-зялёных хвойнікаў на жоўценькім пясочку. Нейкім прыветам, ласкаю і цішынёю патыхала ад гэтых сакавітых хвойнікаў, ад гэтых людскіх будынкаў. А як прынадна і прыгожа павіваліся і беглі ў хвойнік каляінкі вясковых дарожак і сцежак, па якіх так рэдка пракоціцца сялянская цялежка! А колькі самабытнага хараства ў гэтых адзінокіх разложыстых дубах, раскіданых па краях лесу, і гэтых пышна-купчастых хвоях у полі! Чымся родным, мілым, даў-

но знаёмым веяла ад аксамітных абрусаў маладога жыта і ад кволых бледназялёных усходаў ранніх аўсоў!

Лабановіч стаяў каля акна, як прычарованы, і не адводзіў вачэй ад самавітых, простых малюнкаў Палесся, поўных невыразнага хараства і жыцця, стаяў да таго часу, пакуль машына не стала набліжацца да тае станцыі, дзе трэба было выходзіць.

Вышлі з вагона і пайшлі шукаць школу. Школа была не вельмі далёка ад станцыі, і шукаць яе прышлося нядоўга. Тры вучні і чацвёрты настаўнік узышлі на ганак школы і спыніліся.

Школа была замкнёна. Лабановіч пастукаў, крыху пачакаў, але нікога там не чуваць было. Пастукалі яшчэ раз. Таксама ніхто адтуль не адклікаўся. Урэшце Лабановіч угледзеў званок. Пазваніў. Зараз дзесь у сярэдзіне адчыніліся дзверы і пачуліся крокі, досыць рашучыя, і з-за дзвярэй чыйся голас, таксама строгі, прамовіў:

— Хто?

— Цельшынская школа.

Дзверы зараз-жа адчыніліся і паказалі фігуру гаспадара-настаўніка. Трахім Пятровіч Грынько, мужчына гадоў пад трыццаць пяць, толькі што памыўся. Валасы яго былі прычэсаны набок, адна дугавідная пасма валасоў тырчала над ілбом і надавала Грыньку выгляд вучонага чалавека, а рэдкія доўгія вусы рабілі яго строгім настаўнікам.

— Што-ж гэта так рана? — спытаў Грынько, пазнаёміўшыся і павітаўшыся з калегам.

— Няхай сабе хлопцы агледзяцца і азнаёмяцца са школаю. Часу ў нас хапае, — адказаў Лабановіч.

— І то праўда, — ужо больш мякка прамовіў Грынько. Як відаць, у гэтым ходзе калегі Грынько заўважыў значную долю педагагічнай стратэгіі і адразу прасякся да яго павагаю.

Вучняў увялі ў школу.

— Ось тут можаце сабе сядзець, хадзіць і спаць, — сказалі ім настаўнікі, а самі пайшлі ў пакой Грынько.

Кватэра тутэйшага настаўніка зразу кідалася ў вочы кожнаму чыстым выглядам і сваім убранствам. На сценах віселі розныя фатаграфіі, малюнкі ў прыгожых апраўах, мяккая, абітая чырвоным плюшам мэбля, каберац

каля стала, прыгожы абрус, — усё казала за тое, што Грынько жыў панам. У яго была цэлая гаспадарка: дзесяцін тры агароду, столькі-ж сенакосу, была карова, свінні, на двары хадзіла рознае птаства пад пільным і дбалым наглядам гаспадыні.

Лабановіч у параўнанні з Грыньком быў горкі пролетар, і ён нават са знявагаю паглядзеў на свой сурдут, які ён купіў у Курульчука за два рублі з палавінаю і ў якім ён, асабліва ззаду, вельмі змахваў на местачковага рабіна.

XXXIV

Каля восьмае гадзіны раніцы пачалі з'язджацца іншыя школы. То той, то другі настаўнік з кучкаю сваіх выхаванцаў узыходзіў на ганак і з шумам уводзіў іх у школьную залу. Тут ён даваў розныя інструкцыі і заканчваў іх звычайна так:

— Толькі не трэба труса задаваць: глядзі смела, кажы адважна, рэж з-за пляча — храбрасць гарады бярэ!

Паддаўшы такім чынам духу, настаўнік заходзіў да Трахіма Пятровіча, захоўваючы яшчэ на сваім твары тую смеласць і рашучасць, якімі ён толькі што начыняў сваіх вучняў.

Іншыя настаўнікі, наадварот, доўга заставаліся ў школе пры вучнях і тлумачылі ім, дзе, у якіх выпадках трэба паставіць той ці іншы знак прыпынку, і вялі нават папярэдні экзамен. Пакінутыя адны, вучні памаленьку пачыналі разварушвацца, знаёміцца паміж сабою — часта пры дапамозе кулакоў, штурханоў, высмейвання адных другімі і давання мянушак.

Звычайна на экзамены збіралася пяць-шэсць школ. Тут ужо можна было лягчэй паназіраць настаўнікаў розных тыпаў. Рознасць іх выяўлялася і з чыста надворнага выгляду. Тут можна было спаткаць прылізанага зуха са спрытам і нахіленнем да жаночага роду; былі і выяўна зняважлівыя да розных умоўнасцей грамадскай прыстойнасці: мелі доўгія валасы, і адным словам, насілі на сабе ўсе адзнакі нігілізму, як пратэст супраць свайго

бяспраўя і нязначнасці становішча ў грамадстве. Былі і такія, што ўсё асмейвалі, на ўсё пазіралі звысоку і, прачытаўшы Дрэпера або Бокля, лічылі сябе ў высокай меры свядомымі і начытанымі і ўжо на валаснога пісара глядзелі так, як вучоны на якога-небудзь мікроба. Людзі-ж пажылыя, жанатыя, цікавіліся болей гаспадаркаю і кавалкам хлеба, чым школамі і навукамі; гэта былі ўжо людзі пакорлівыя, якія лічылі сваім абавязкам лішні раз пакланіцца начальству.

Само начальства, інспектар Хрысціцкі, прыехаў гадзіну таму назад, але ў школу яшчэ не прышоў. Ён спыніўся ў мясцовага папа-акадэміка Пражорыча, бо і сам інспектар таксама быў акадэмік; у настаўніка ён начаваў толькі тады, калі не было дзе прыпыніцца.

Настаўнікі сядзелі ў кабінеце Трахіма Пятровіча і аб сім-тым гамапілі, пераважна аб экзаменах і аб інспектару. Адны знаходзілі яго чалавекам, з якім яшчэ жыць можна; другія-ж, наадварот, даводзілі, што ён — прыдзіра, з кожнага глупства робіць цэлую справу і, наогул, страшэнны бюракрат. У залежнасці ад таго, якое ў каго было дачыненне да інспектара, і выяўляліся гэтыя погляды. Была адна рыска, агульная для ўсіх настаўнікаў: гэта асаблівая бледнасць і зямлістасць колеру твараў, якую можна заўважыць толькі ў тых, хто змушан жыць у падвалах і астрогах. І яшчэ што іх рабіла падобнымі адных да другіх — гэта тая семінарская закваска, якая так трудна вытыхаецца з настаўніка — выхаванца семінарыі.

— Ідзе!

Хтось з настаўнікаў заўважыў праз акно інспектара.

Усе крыху здрыгануліся, папpавілі манішкі і гальштукі, а Лабановіч нават ускінуў плечы, каб падняць свой «лапсярдак», як паспелі назваць гэтае важнае адзенне для афіцыйных выступленняў. Сапраўды, да гэтае адзежыны больш падыходзіла слова «лапсярдак», чым сурдут, бо ён быў пашыты на чалавека шырынёю з аршын у плячах і на паўтары, а то і цэлых дзве галавы вышэйшага ад Лабановіча. Апрача таго, на сурдуце былі сякія-такія плямы, паходжанне якіх можна было-б вытлумачыць неасцярожна ўпаўшымі капкамі верашчакі. Тым не меней, нават і такі «лапсярдак», са спуш-

чаным далёка ўніз станам, усё-ж-такі больш стасаваўся з важнасцю моманту, чым які-небудзь замухрысты пільчак вясковага настаўніка.

Сярод настаўнікаў прайшоў нейкі рух. Тут ужо многа чаго належала ўзяць пад увагу: не паказаць свайго страху перад інспектарам, не паздароўкацца так, каб іншым кінулася ў вочы, што ён дагаджае начальству, а дагадзіць хоць трошачкі, а трэба было, і разам з гэтым таксама не ўраніць і сваю годнасць.

Інспектар увайшоў, як цар: важны, строгі і з такім выглядам, як-бы ён трымаў у руках лейцы, каб не разбеглася, спудзіўшыся, зямля, на якой мы жывем. На твары ў яго быў незвычайны клопат, думка яго была так моцна занята нейкаю важнаю справаю, што ён нават не меў часу паглядзець на таго, каму даваў руку. Не паспеўшы яшчэ прысесці, ён зараз-жа звярнуўся да Трахіма Пятровіча з чыста дзелавымі пытаннямі: ці ёсць прылады пісьма, ці ўсё падгатавана ў школе, ці павешаны на сцяне карты. Адразу стала ціха і важна, бо ні ў кога не хапала смеласці парушыць работу мыслі начальства.

— Усе з'ехаліся? — спытаў інспектар. — Ну, пойдзем!

Начальства паднялося і накіравалася ў дзверы. За ім ішоў Грынько, а там ужо рухаліся, як папала. Лабановіч у сваім «лапсярдаку» ішоў апошнім, маючы на ўвазе, каб яго вопратка не так ужо кідалася ў вочы. Працэсія была вельмі важная. Наплечнікі і бліскучыя гузікі інспектара зусім асляплялі палешукоў, боязна пазіраўшых вытарашчанымі вочкамі. Іх парассаджвалі, далі паперу. Яны павінны былі напісаць першае слова: «экзаменационная». Дзеці мардаваліся, мыляліся, некаторыя плакалі, пішучы гэтае слова. Потым само начальства пачало дыктаваць, не давяраючы настаўнікам.

Кажаноўскі настаўнік, Філюк, стаў воддаль ад сваіх вучняў, як-бы вельмі спакойны за іх навуку і веды. Але там, дзе вучні павінны былі паставіць коску, ён браў сябе за кончык вуха, пазіраў кудысь у прасторы, як-бы заняты нейкаю думкаю, і пакручваў вуха. Калі трэба было паставіць дзве кропкі, Філюк праціраў вочы, як-бы ў іх набілася пылу. Кропка і коска — чухалася вока

і кончык носа. А калі ўжо трэба было паставіць клічнік, то, падняўшы ўгару палец, Філюк чухаў ім брыво. Тут быў прыдуман цэлы рад умоўных знакаў, і не адзін раз былі паверачныя дыктоўкі, каб усвоіць гэтую хітрую сігналізацыю.

Канчалася дыктоўка, давалася другая работа — пераказ. За пераказам ішла пісьмовая задача. І ўсе гэтыя работы вяліся падназіраннем самога начальства. Прамучыўшы дзяцей гадзіны дзве, іх пусцілі на перамену, пакуль папраўляліся вучнёўскія работы. Тады пачаўся вусны экзамен.

На вусны экзамен прышоў поп Пражорыч. Гэта быў незвычайна пануры, чорнабароды бацька. У вочы ён рэдка каму пазіраў, не смяяўся. А калі здароўкаўся і падаваў руку настаўнікам, асабліва ў такім лапсярдаку, як у Лабановіча, то ў гэту хвіліну шчыра шкадаваў, што ў яго ёсць рукі.

На першае месца сеў інспектар, ён і быў старшынёю камісіі, на другое — Пражорыч. Трэці член камісіі быў той настаўнік, чые вучні экзаменаваліся. Вучні-ж адчувалі сябе мала чым лепей за тых цялят, якіх загналі на разніцу.

Вучнёўскія сшыткі складаюцца і даюцца інспектару. Ён па спіску выклікае вучняў. Вучань, трасучыся, падыходзіць да стала.

— Што трэба напісаць у слове «телега» пасля л? — пытае вучня інспектар.

— Трэба напісаць яць, — адказвае вучань.

— А чаму-ж ты напісаў е?

— Спужаўся, — адказвае вучань.

— Ну, чытай тут, — інспектар дае вучню кнігу, а сам, грозна насунуўшы бровы, зварачаецца да настаўніка: — Чаму вы падчыркнулі «не смотря»? Якая-ж тут памылка?

Малады настаўнік пазірае на падчыркнутую памылку, на яго твары адбіваецца рашучасць і смеласць.

— «Несмотря», гаспадзін інспектар, трэба пісаць злучна.

— Вы самі слаба знаеце граматыку, — адказвае громка інспектар.

— Выбачайце, гаспадзін інспектар: «несмотря» пішацца злучна, — стаіць настаўнік на сваім. — Па Гроту «несмотря» пішацца разам.

Які ні важны інспектар, якое ні вялікае яго начальніцтва, але пры слове «Грот» ён перастае спрачацца, хоць лёгка здавацца і не хоча.

— Трахім Пятровіч, — зварачаецца ён да Грынько, — прынясеце сюды Грота.

Трахім Пятровіч кажа:

— Так, гаспадзін інспектар, «несмотря» пішацца злучна, — але ідзе і выносіць з шафы Грота.

У тыя часы Грот сядзеў незвычайна крэпка на сваім троне. І калі ты казаў свайму супярэчніку, што па Гроту пішацца так, то ўжо ніякія довады чалавечага розуму не маглі зрушыць цябе з пазіцыі. Калі сказаў Грот, то — аман. Тут канец, і далей ісці няма куды.

Чарга прыходзіць да вучняў Філюка. Інспектар разглядае дыктоўкі.

— Вашы напісалі добра. Але па сінтаксу яны значна крапчэйшыя, чым па этымалогіі, — зазначае інспектар.

— Не наладжана сігналізацыя па этымалогіі, — робіць ціхенька ўвагу Грынько на вуха Лабановічу.

Філюк, як ні ў чым не бывала, адказвае інспектару:

— Я наогул на граматыку зварачаю ўвагу.

— Гэта і відаць, — хваліць яго інспектар.

Вучнёўскія пакуты канчаюцца, іх пускаюць, а інспектар робіць увагі то таму, то другому настаўніку, вельмі важна кланяецца ім і з папом Пражорычам ідзе абедаць.

Настаўнікі застаюцца на некаторы час, абедаюць з выпіўкаю, віншуюць адзін другога са сканчэннем вучэбнага года і распаўзаюцца па сваіх трушчобах.

— А вы, калега, можа,占начуеце? — сказаў Грынько Лабановічу.

— Не, калега, я і так адну лішнюю ноч правёў у дарозе, трэба ехаць.

Лабановіч даўно ўжо маркоціўся па Цельшыне і вельмі быў рад, калі скончыліся экзамены. Ён яшчэ цэлую гадзіну чакаў на станцыі, пакуль прышоў поезд. Позна ўночы выехаў ён дадому.

XXXV

— Гэта мой апошні тут вечар, — казала сама сабе Ядвіся: — І я не ўбачу яго!

Яна задумалася, прыслухоўваючыся да голасу свае думкі. Няўжо-ж і не ўбачыць яго? Ніколі не ўбачыць? І нашто яна зманула яго? Яна-ж і тады ўжо ведала аб тым, што заўтра, у панядзелак, паедзе, а яму сказала, што не ведае, калі будзе выязджаць. Ядвіся зірнула на вокны кватэры настаўніка. Там цёмна і страшна, бо пуста. Дом толькі тады жывы, калі ў ім жыве гаспадар, бо гаспадар — душа свайго дома. Як смутна і тужліва пазіраюць гэтыя шкляныя вочы пустой і мёртвай кватэры! І дарэмна гэты малады бліскучы месячык стараецца ажывіць пагаслыя вочы: яны свецяцца, а жыцця няма.

Ёй нават страшна. Яна нізавошта цяпер не падыдзе да іх, як падыходзіла калісь, калі гэтыя вокны жылі і так прыветна пазіралі на іх двор светлазялёным святлом. О, тады ёй было весела, і яна так ціхенька падыходзіла, як начны матылёк, да гэтых вокан, яшчэ цішэй падымалася на плот перад вокнамі і доўга пазірала туды. Шчаслівая ўсмешка прабягала па яе губках, бо ён нічога не ведае, сядзіць якраз насупраць, схіліўшы галаву над кнігай, і толькі зрэдку правядзе рукою па сваіх цёмных, зусім яшчэ маладых вусіках. Смешны ён, калі падымае свае вочы, такія добрыя і ўдумныя, і пазірае ў акно. І гэтыя вочы напэўна шукаюць яе. Яна-ж тут, але яго вочы не бачаць яе. І смешна ёй і радасна. Але ён гэтага не ведае...

— Не! Ён многа не ведае чаго — і ніколі ведаць не будзе!

І чаму салгала яму? Ну, чаму? А можа, заўтра не ехаць? Ад яе залежыць. Татка-ж не гоніць яе. Ён цяпер такі добры з ёю! «Пагуляй ты, кажа, Ядвісься: не гарыць-жа там у цябе!» Яе татка добры, але чагось яна баіцца яго. Ёй страшна, калі ён прыдзе дадому, а вочы яго пазіраюць кудысь далёка-далёка, як-бы яны сышлі з яго твару, а гэтыя грозныя, жорсткія вусы, як хмары ў навальніцу, апусцяцца ўніз.

Нашто яна салгала яму? Ёй хочацца пабачыць яго. Эх, каб ёй крылле! От-бы ўзнялася цяпер і паляцела да

яго, проста, каб пабачыць яшчэ раз, вось так, як пазірала на яго тут, калі ён і не ведаў аб тым...

Не, гэта апошні яе вечар тут!

Тонкія, доўгія, цёмныя рыскі-бровы Ядвісі крыху насуваюцца і хмурацца, і твар яе робіцца строгім. Так, гэта апошні тут вечар!

Яна зноў пазірае на вокны. А каб пайсці туды? Сесці за сталом, як сядзеў калісь ён і праводзіў рукою па маладых сваіх цёмных вусіках? Там страшна, бо там пуста. Там цяпер прытаіўся нехта другі, няласкавы і варожы. І, напэўна, яна спаткала-б нешта там, каб пайшла цяпер туды. Ну, напэўна, пачула-б голас, а можа, смех, пусты і жудасны смех. Яна ўпэўнена ў тым, што пачула-б той страшны і таемны смех, і гэта забіла-б на смерць радасць і шчасце, што знайшлі месца ў яе сэрцы. Яна зноў пазірае туды.

Як жудасна залліваюцца смехам совы каля каплічкі! Чаго смяюцца яны пустым сваім смехам? Чаго? Ці не з яе? А гэтыя цёмныя вокны! Што ў іх? Чаму яны ўбіліся ёй у вочы? Ёй нават робіцца нейк непрыемна ад гэтага. «А я пайду туды! Вазьму ды пайду!.. Няўжо я пайду?»

Яна ціха падымаецца, азіраецца, ідзе. Кухня не замкнёна. Адчыняе дзверы. Яна ў кухні.

— Ты, бабка, тут? — пытае ціха Ядвіся.

Бабка варочаецца на печы.

— Тут, паненачка!

— А чаму ты, бабка, дзвярэй не замкнула?

— От, паненачка, прылегла дый так не прычыніла. Я-ж не сплю.

— Заўтра, бабка, паеду.

— Паедзеце, паненачка? — пытае бабка, устае і садзіцца на печы. — І не пачакаеце, покі паніч вернецца? — пытае яна.

— А хіба-ж твой паніч са мной паедзе?

— Ну, як-жа, паненачка: ён смуціцца будзе, што вы паехалі і не развіталіся з ім.

— А чаго ён будзе смуціцца? — пытае Ядвіся.

Ёй прыемна чуць ад бабкі, што ён будзе смуціцца.

— Чаму-ж не будзе, паненачка? Я-ж бачыла, якімі вочкамі пазірае ён на вас.

— Ну, якімі-ж? Скажы, бабка!

— Добрымі вочкамі, успагаднымі вочкамі, паненачка, такім позіркам, што ад сэрца ідзе, каб другому сэрцу штось сказаць.

— А што сказаць другому сэрцу?

— Я ўжо забылася, паненачка. Куды-ж я? — старая. Забылася, — хітра адказвае бабка.

— А каго ты, бабка, больш любіш: мяне ці паніча?

— Я і вас люблю і паніча люблю... От, паненачка, пабраліся-б вы з панічом, далі-бог! — з жарам і зусім іншым тонам прамовіла бабка, і ў ёй адразу абудзілася жанчына-сваццця.

— Мне-ж, бабка, толькі шаснаццаты год, мне і замуж няможна яшчэ.

— О, паненачка, шаснаццаты год! Дык не сёння-ж і замуж ісці.

— А твой паніч не хоча мяне.

— Ой, паненачка, што вы кажаце! Чаму-ж ён ні на кога іншага не хоча глядзець? Чаму-ж ён ніколі не пойдзе да панны каморнічанкі? Усе туды ходзяць, а ён не. Мусібыць, каля вас яму мілей.

— Проста гультай твой паніч і болей нічога.

— Не, не гультай ён: ён вас, паненачка, пакахаў.

— А хіба ён табе казаў?

— А што ён будзе казаць мне? Ён вам пра гэта казаў.

— Не, бабка, ніколі не казаў ён гэтага мне.

— Казаў, паненачка, казаў! І яшчэ скажа.

— Нічога ты, бабка, не ведаеш!

— Ведаю, паненачка, ведаю!.. А куды вы, паненачка, ехацімеце?

— Далёка, бабка, у маёнтак, на службу.

— А паніч ведае?

— Нічога не ведае і не будзе ведаць.

— Вы напішаце яму, паненачка?

— Нічога я не буду пісаць яму.

Ядвіся падышла да дзвярэй пакойчыка Лабановіча, адчыніла і ўвайшла. Ціха. Цёмна і пуста.

Ядвіся прыслухалася.

Між сцяною і адстаўшымі ад яе абоямі прашуршэў кусочак пабелу. Чаго ён так доўга каціўся? Гэты шолах

здаўся ёй не выпадковым. Але ёй не страшна. Ёй проста чагось шкада. Яна чуе нейкі смутак. Вочы яе прывыклі да цемры. Са змроку выступаюць няясныя абрысы стала. Вось і крэсла. На тым самым месцы, дзе ён звычайна сядзеў.

Ядвіся зноў чутка прыслухоўваецца. Не, гэта ёй проста так нешта здалося. Яна ціхенька адстаўляе крэсла і садзіцца. Садзіцца так, як сядзеў і ён, і праводзіць рукою па сваёй губцы. Гэта вось ён тут сядзіць, а яе тут няма. Яна там, за акном, пазірае на яго. Яна ўся ўздрыгвае і боязна глядзіць у куток: там нешта заварушылася ціха, без шуму. Не, гэта там, на палічках, ляжаць яго кнігі. Яна ўстае, кладзе ў кнігу кавалак паперачкі, азірае цёмныя сцены — яны непрыветныя і маўклівыя. Яны мёртвыя, бо душа вышла з гэтага дома. Ёй страшна і жудасна — і разам з гэтым прыемна і смутна.

Што думае аб гэтым бабка? Ну, усё роўна: сягоння яе апошні вечар тут.

Ядвіся яшчэ раз азіраецца. Яе забірае нейкі страх. Ёй хочацца заплакаць. Яна ціхенька ўваходзіць зноў у кухню.

— Ну, бабка, дабранач!

— Дабранач, паненачка! — адклікаецца бабка з печы.

Бабка не спіць. Яна проста думае свае старэчыя думкі, сухія, як і сама старасць, простыя, як і ўсё жыццё яе, нецікавыя, як і яе доля. Яна ўстае, накідае зашчапку, глядзіць проста па прывычцы ў акно, пазяхае ды зноў лезе на печ і чагось уздыхае, кладучыся ў цесны, цёмны куток, адведзены ёй жыццём. Але бабка любіць свой гэты куточак. Тут ціха, тут цёмна, і толькі прусакі шалпочуцца ў шчылінах, але бабка не чуе іх, хоць і ведае аб тым, што яны тут жывуць і жывяцца ад яе жыцця. Ну, што-ж? Няхай.

Ядвіся зноў на двары. Яна падышла да дзікае грушкі. Пазірае на яе, штось разважаючы. Яна аглядаецца, бярэцца за дрэўца. Але грушка моцна бароніць сябе і коле Ядвісі руку.

«Гэта-ж я такая калючая, -- думае Ядвіся, — бо я — дзікая!»

Яна зноў падымае руку, асцярожненька бярэ за самы

вяршок і ломіць яго. Нашто яна гэта зрабіла? Яна проста хоча сказаць гэтым, што яна злая і нядобрая. Няхай ён ведае гэта.

Яна ідзе на свой двор. Зноў пазірае на гэтыя цёмныя вокны. І месячык адышоўся ад іх, бо яны мёртвыя і іх не ажывіш. Не ажывіш, бо душа вышла з гэтага дома. Ядвіся глядзіць на іх і не верыць, што была там. Гэта проста ёй прыснілася... Няхай-бы ён ужо і не прыязджаў сюды і не даваў-бы жыцця гэтым вокнам. А яны ажывуць. Яны зноў ажывуць! Але жыцця яна ўжо не ўбачыць, бо гэта апошні яе вечар тут: яна сама так захацела. Чаму? Яна проста спыніла сваё шчасце і сказала: «Даволі!» Але хто-ж вырве з яе сэрца гэта шчасце цяпер? Ніхто. Яна будзе з ім жыць, будзе жыць і з тым, хто сядзеў унь там і праводзіў рукою па сваіх цёмных, маладых вусіках.

Але сэрца ёй кажа: «Я хачу яшчэ болей гэтага шчасця! Я хачу выпіць яго ўсё, усё, да самага дна!» «Не, няхай яно будзе лепш недапітым, бо, можа, на дне яго наліта атрута. Так лепей!» — гаворыць Ядвіся да свайго сэрца, ды яно ніяк не згаджаецца з ёю. Яна хоча думаць аб іншым: аб дарозе, аб тым невядомым, што на гэтай дарозе яе напаткае. А ўдумныя, добрыя вочы пазіраюць на яе, як-бы просяць, каб аб іх, толькі аб іх думала яна. І сэрца ёй зноў кажа: «Нашто ты лгала яму?..»

Малады месячык схіліўся над ветракамі. Яго ўжо не цікавіць гэта дзяўчына і гэтыя вокны, якія імкнуўся ён ажывіць. Ён яшчэ не акрэп. Яго цягне край зямлі, няясны і мілы. Ідзе ён туды адпачыць, каб набрацца новых сіл на заўтрашнюю ноч. І ён ажывіць гэтыя вокны.

Нявідная рука поўначы ціха праводзіць граніцы між ноччу і днём, і ў вечнасць адходзіць гэты вечар Ядвісі.

XXXVI

Ціхая ноч ляжала над Палессем.

Аднатонную песню вялі колы вагонаў. Бясконцы рой залатых іскраў выпускаў паравоз, агністаю паласою вызначаючы сабе дарогу. Ціха гулі і судрыгаліся балоты побач чыгункі, дзе бегла машына. Раскаціста і гучна

грымелі салаўі: звону іх песень не маглі заглушыць грук і шум вагонных колаў. Месцамі ўзнімаўся белаваты туман і нерухома звісаў над маладымі асокамі і цёмнымі абрысамі разложыстых купчастых лазнякоў. І калі спынялася машына на станцыях і поўстанках і заціхаў шум поезда, з балот даносіліся хвалі незвычайна мяккіх зыкаў крахтання жаб. Нейкі невыразна маркотны і разам з тым прыемны гоман стаяў над балотамі, як-бы яны апавядалі гэтай ціхай ночцы і гэтым людзям, што не спалі, адвечную скаргу сваю і смутак свой...

Ізноў шуміць машына, ізноў заліваюцца салаўі.

Вось і станцыя. Дарога скончана. Далей у свет пабяжыць машына.

Лабановіч вышаў з вагона, крыху пастаяў, падумаў і, не заходзячы на станцыю, пайшоў па палатне дарогі. У галаве яшчэ стаіць шум вагонных колаў, а экзамены, гэтыя новыя ўражанні ўсё блёкнуць і блёкнуць. Пачынае развідніваецца, разам з гэтым абуджаецца Палессе. Далёка ў лесе такуе цецярук, як-бы нехта багамольны чытае там малітвы. Яшчэ больш гучна, яшчэ з большым натхненнем правяць салаўі раннія літанні. Як падзяку небу, як дым пахучай смалы, узносяць угару балоты свае туманы, і, здавалася, адпраўляюць набажэнства гэтыя лясы, ахінуўшыся тонкімі тканкамі пары. Усход святлее, ціха грае і пераліваецца гэта ясната, залатая багра — шчаслівы ўсмех дня, — каб дыяментамі разліцца на свежых маладых лісціках, на чысцюткіх кроплях расы і запаліць іх бляскам найдарожшых каменняў.

Дзесь уперадзе пагруквае, як-бы пасмейваецца і перамаўляецца з рэйкамі дрызіна, і гэты вясёлы смех адбіваюць сцены лесу, што стаіць побач чыгункі. Едуць рабочыя, палешукі-хлопцы. Яны вясёлыя, перакідаюцца жартамі і крэпка налягаюць на тоўстыя палкі, падганяючы дрызіну. Збоку дзесь голасна і музычна выводзіць трэлі пастухова труба; балоты падхватваюць голас трубы, нясуць яго далёка па краях лесу і кідаюць невядома дзе. Залаты пажар сонца залівае верхавіны лесу.

Настаўнік падыходзіць да пераезду, паварочвае ўправа ў лес і выходзіць на дарогу, што ідзе на станцыю з яго вёскі. Колькі часу ідзе ён між маладых хвойнікаў, выходзіць на круглую палянку, дзе калісь спаткаўся з

паннаю Людмілаю. Адгэтуль ужо блізка вёска. Але раніца такая слаўная, у лесе так добра, што ён садзіцца на пень і слухае, як спяваюць дразды, як дзесь на ўзлессі кукуе зязюлька. Ён думае, чым займецца цяпер, калі так многа вольнага часу, колькі пабудзе яшчэ ў школе. Напэўна яшчэ досыць доўга і ва ўсякім разе не будзе спяшацца, пакуль тут яшчэ застаецца і панна Ядвіся. Чым бліжэй ён да яе, тым з большаю сілаю ажываюць у ім пачуцці, тым жывей устае прад ім гэта слаўная дзяўчына. Ён падымаецца, ідзе далей.

Дарога выходзіць з лесу на грэблю. За грэбляю відаць Сяльцо, карчма старога Абрама, капліца, высокія дзікія грушы, а за сялом, нерухома падняўшы крыллі, стаяць два ветракі, захоўваючы ўсё той-жа выраз здзіўлення. Ён праходзіць грэблю, мінае карчму і хвілін праз пяць адчыняе дзверы і ўваходзіць у кухню.

Каля печы стаіць з вілкамі ў руках старожка, прыстаўляе гаршчочак.

— Дзень добры, бабка!

— Дзень добры, панічок! — прыветна адказвае бабка. — Хіба-ж, панічыку, вы пяхотам прыйшлі?

— Так, бабка, на пары сваіх прыехаў.

— Любіце вы хадзіць, панічыку. Няхай-бы таварнага пачакалі ды да раз'езду ехалі-б.

Бабка чымся заклапочана і як-бы нават засмучана.

— А як-жа вам, панічок, там бог паводзіў? — пытае яна.

— Добра, бабка. Хлопцы выдатна паздавалі экзамены. Можна сказаць — лепш ад усіх школ.

Бабка весялее. Відаць, і ёй прыемна гэта навіна, і яна сапраўды рада ёй. Але зноў чагось засмучаецца і ціха ўздыхае.

— Што ты, бабка, як-бы нечага зажурылася?

— Не, нічога, панічыку, — кажа яна.

Лабановіч ідзе ў свой пакойчык, раздзяваецца. Следам за ім туды ўваходзіць і бабка.

— Можа, вам чаю, панічыку, паставіць? — пытае яна.

— Хіба пастаў, — згаджаецца ён.

— Паехала-ж, панічыку, наша паненка, — ужо зусім смутна прамовіла бабка.

Лабановіч пачуў, як сціснулася яго сэрца. Колькі мо-

манту пазірае на бабку. Яму робіцца цяжка-цяжка на душы.

— Паехала, панічок, паехала! Учора і паехала. Яшчэ сюды забягала. «Кланяйся, кажа, бабка, свайму паничу!» Паехала, панічок, — у засмучэнні кажа бабка.

— Ну, што-ж, — стараючыся быць спакойным, гаворыць Лабановіч: — Можа, ёй там лепш будзе.

— Я-ж пайду самавар ставіць.

Бабка выходзіць. Настаўнік застаецца адзін, садзіцца каля стала, сціскае галаву і моцна-моцна задумваецца.

Паехала!..

Ён колькі хвілін думае над гэтым словам. Звычайнае, простае слова. А колькі гора і смутку для яго сэрца ў гэтым слове!

Паехала!.. Нават і не развіталася з ім. А як многа хацеў ён сказаць ёй у гэтыя апошнія дні! Чаму так здарылася?

Ён устае і ідзе ў другі свой пакойчык, глядзіць праз акно на дом, на палісаднічак пана падлоўчага, на ганак, абсаджаны дзікім вінаградам. На гэтым ганачку ён бачыў яе апошні раз. А цяпер ні там, ні ў гэтым доме яе няма. Там цяпер пуста, і ўсюды стала пуста.

Вуліца жыве сваім звычайным жыццём. Дзве кабеціны-паляшучкі, убраныя па-святочнаму, аб чымся гутараць, спаткаўшыся на сярэдзіне вуліцы. На прызбе каля старасты сядзяць мужчыны з люлькамі, па вуліцы перабягаюць свінні і пужаюць вясёлыя гурткі верабейчыкаў. Усё гэта так нецікава, усё гэта так далёка ад яго і так чужое яму.

Ён чуе страшэнную адзіноту. Штосьці перахватвае яму горла. Цяжка, невыказна цяжка.

Ён падыходзіць да стала, бярэ паперу, чарніла, садзіцца, нахіляецца над лістком паперы і думае. Трэба напісаць ёй, трэба выліць з сэрца ўвесь гэты жаль. Ён думае, як звярнуцца, як назваць яе, але не знаходзіць адпаведнага слова і піша:

«Вас ужо няма тут. Вы паехалі, разам з сабою забралі ўсё, што звязвала мяне з гэтым месцам, з гэтым кутком Палесся. Цяпер ён не жыве для мяне, бо ўсё тое, што прыдавала яму прыгоства і нейкую чароўнасць, забралі вы. Я тут адзін, усё тут стала няміла для мяне,

як-бы тое, што раней гарнула і вабіла мяне, памерла і знікла. І толькі цяпер я адчуў сваю вялікую страту. Мне так хацелася пабачыць вас, пачуць ваш голас, ваш смех, глыбока зазірнуць у вашу душу і даведацца, якое гора ляжала ў ёй. Цяпер-жа, пішучы вам, я толькі хачу прынесці вам падзяку за тое, што вы аздобілі маё жыццё тут, што вы былі тою яснаю, чыстаю зоркаю, якая свяціла мне ў гэтай цемры жыцця, радавала мяне і ўхіляла ад рознага бруду, і калі ў мяне захавалася жывая іскра, то толькі дзякуючы вам...»

Настаўнік перачытаў напісанае і падумаў: «Усё гэта выходзіць не так, як-бы хацелася». Ён задумаўся. «А куды пасылаць?» — спытаў ён сябе самога і не мог даць адказу.

Бабка прынесла самавар.

— Гатоў, панічыку, чай: выпіце ды спачывайце сабе, бо вы-ж з дарогі.

— Добра, бабка, я зараз буду піць.

Ён вышаў на двор.

Бабка, пазіраючы на яго, паківала галавою. «Па паненцы нудзіцца», — зазначыла яна сабе.

Зірнуўшы на маладую грушку, Лабановіч заўважыў, што вяршок яе быў зломан і гаротна нахілен да зямлі.

— Гэта яна зламала, — прамовіў сам сабе настаўнік, — нашто яна зрабіла так? Няўжо яна хоча, каб я выкінуў яе з сэрца?

Яшчэ больш жаль ахапіў яго. Ён хацеў зрэзаць адломаны вяршок.

— Э, усё роўна! — сказаў ён і адышоўся.

Спаць у гэты дзень ён не лажыўся. Ён пачаў перабіраць кнігі, складваць паперы, прыводзіць іх у парадак. У адной кнізе знайшоў невялічкі лісцік паперы, напісаны рукою Ядвісі. Яна пісала:

«Бывайце здаровы. Я сумыслу пастаралася, каб вы мяне тут не засталі, хоць мне і хацелася яшчэ хоць раз, апошні раз, пабачыцца з вамі. Але я падумала сабе: усё роўна, ехаць мне трэба; ехаць-жа тады, калі вы былі-б тут, мне было-б яшчэ цяжэй... Панна Людміла чакае вас — зайдзіце да яе».

І больш нічога не напісала.

Лабановіч доўга пазіраў на гэту паперку. Нават не напісала, куды едзе, і сама не падпісалася...

І чаму ўсё гэта так скончылася? Чаму?.. І няўжо гэта канец?

Ён яшчэ доўга сядзеў і разважаў. На вочы набягалі слёзы.

Ён згарнуў запісачку разам са сваёю і палажыў у кішэню.

Пад вечар прышоў стараста прыняць школу. Лабановіч тлумачыў яму, дзе якія дакументы і што ён здае. Стараста нічога не цяміў, але выгляд меў такі, як-бы для яго ўсе гэтыя справы былі добра знаёмы.

Назаўтра напісаў Лабановіч прашэнне аб перамяшчэнні і стаў збірацца ў дарогу. Бабка часта ўваходзіла ў пакойчык і, як родная матка, падбірала за ім розныя рэчы.

— Разлятаюцца мае галубкі, — тужліва прамовіла бабка, — не вернецеся вы, панічыку, сюды! — І яна ў вялікім засмучэнні падперла рукою шчаку.

Вечарам, праводзячы настаўніка, бабка заплакала.

Садзячыся на фурманку з двума чамаданчыкамі, настаўнік сказаў у сваіх думках:

«Адзін раздзел кнігі прачытан і загортваецца!.. Ну, што-ж? Гайда далей!»

Мінск, 1921—22 гг.

Кніга другая

У ГЛЫБІ ПАЛЕССЯ

12 Зак. 78

ЧАСТКА ПЕРШАЯ

НА БАЦЬКАЎШЧЫНЕ

На прастор, на шырокі прастор!

Я люблю гэтыя прасторы, люблю неаглядныя, ружова-сінія далі іх, поўныя жыцця, малюнкавасці, рознастайнасці тонаў зямлі і неба, дзе так многа разгону для тваіх вачэй, дзе маўклівая далечыня, атуліўшыся танюсенькаю наміткаю сінечы, думае нейкую адвечную сваю думку і так моцна парывае душу зазірнуць за заслону гэтай мудрасці, каб пазнаць яе таямніцы. Я люблю гэтыя далі, дзе ласкава-прыветнае сонца разлівае свой ўсмех і так пяшчотна праводзіць мяцёлачкаю праменняў па твары зямлі і лёгкімі ветрыкамі калыша на гальках зялёнае лісце, расчэсвае і блытае косы кучаравым хвоям і гойдае над полем срэбна-шэрае жыта, кожны момант пераліваючы яго жывыя рухлівыя цені і асвятленне, якбы выганяючы з зямлі ільняна-дымную, бясконцую, несупынную плынь.

Я люблю гэтыя прасторы, дзе параскіданы людскія сялібы з іх гаспадарліва абсталяванымі дворыкамі, з іх нізкімі хаткамі, верабінамі, ліпамі, вязамі і клёнамі, з палеткамі, дзе праходзіць сялянскае жыццё з яго трывогамі і надзеямі, з яго радасцямі і смуткам і дзе маўклівыя сялянскія думкі зліваюцца з думкамі прастораў.

Я люблю гэтыя далі, калі над імі разнімае сваё крылле грозная хмара і выкочвае велізарныя, злататрунныя клубкі, кідаючы гняўлівыя цені на сутокі неба і зямлі, разліваючы громы і трасучы зацятую немасць прастораў. Будзе бура, павінна быць навальніца...

Ласка і гнеў, ціша і бура! Я вітаю вас, калі вы пры-

ходзіце ў сваім часе, калі выконваеце вы адвечную волю жыцця.

На прастор, на шырокі прастор!

I

За Сяльцом дарога крута паварочвала на гатку з мосцікам цераз Целяшоў Дуб і зараз-жа падымалася на горку ў лес.

Вечарэла. З балот пацягнула цёплаю вільгаццю. Над лозамі рассцілаўся бялявы туман. У алешніку пры лесе засвістаў салавей. А лес, нерухліва развесіўшы свае галіны, маўкліва слухаў гэты гімн вясне і маладому жыццю.

Лабановіч апошні раз зірнуў на Цельшына. Мільгатнулі высокія грушы ў каронах белага цвету, каплічка на панурых могілках, аднатонна-шэрыя стрэхі цельшынскіх будынкаў, школа і пры ёй высачэзны крыж, дом пана падлоўчага, а за сялом вятрак з паднятымі і занямелымі ў вячэрняй цішы крылламі. Здавалася, яшчэ большае здзіўленне адбівалася ў яго постаці, так добра знаёмай Лабановічу.

Пуста і нявеўтла там...

I нейкі востры боль адчуўся ў сэрцы маладога настаўніка, а вобраз Ядвісі яшчэ яскравей устаў у яго вачах.

Яна была, — і там было жыццё, там жыла радасць, нейкая паўната гэтага маладога жыцця. А цяпер яе няма там, —і ўсё зблёкла, як-бы замерла...

I чаму гэта сталася так? Чаму?

А можа, яно так і лепей...

I тым не меней, пачуццё нейкай крыўды заставалася ў яго сэрцы.

Дарога ўвайшла ў лес. Цельшына, школа і дом пана падлоўчага, заслоненыя лесам, засталіся ззаду.

Няўжо назаўсёды?

I штось смутна-журботнае, нібы пахавальны звон, адчулася ў гэтым бясслоўным пытанні...

Лабановіч паправіўся на возе, дастаў папяросы.

— Закурым, дзядзька Раман, каб дома не журыліся.

Хацелася пагаварыць, адысціся з думкамі ад гэтага смутна-балючага настрою, палажыць мяжу пражытаму жыццю і гэтаму адчуванню.

Дзядзька Раман, шырокі ў плячах мужчына, ахвотна павярнуўся да настаўніка, засвяціўшыся прыветнаю ўсмешкаю, і загрубелымі пальцамі няспрытна ўзяў папяросу.

— А чаго журыціся? — азваўся ён. — Дома, пэўна, рады будуць пабачыць вас... Вы, пане настаўніку, на ўсё лета едзеце ад нас?

— Так, на ўсё лета, а можа, і назусім.

— Зусім хочаце выбірацца?.. Э, пане настаўніку, трэба пажыць яшчэ ў нас. І дзеці палюбілі вас, і мы да вас прывыклі. Ды вы-ж яшчэ і не разгледзеліся тут... Хіба-ж вам не спадабалася ў нас?

— Вось так, бачыце, і добра: пабыў сабе трохі — і далей. Хоць вачэй людзям не намазоліш. А месца мне тут вельмі падабаецца, і народ тутэйшы добры. Тым лепей па-прыяцельску з людзьмі развітацца: самы лепшы госць — той, што ў гасцях не заседжваецца.

— Э, не, у вас, мабыць, другая прычына, калі вы хочаце пакідаць нас.

— Ды я проста, як той цыган: не люблю доўга на адным месцы заставацца.

— Ну, вядома, — чалавек шукае, дзе яму лепей, — тонам лёгкага папроку адказаў Раман. — А ў нас, праўда, што можа быць для вас цікавага? Але мы не пусцім вас: прыгавор напішам і не пусцім... Но-о! — пагнаў ён коніка.

Конік весела пырхнуў, і рухавей застукалі колы па каранях.

Пачынала цямнець. Побач дарогі пайшоў малады сакавіты хвойнік. Хвойнік скончыўся, выехалі на вясёлую палянку. Па краях стаяў рэдкі хваёвы лес. Збоку, направа, бегла чыгунка. Палянка змянілася зноў лесам. Лес, атулены мрокам і цішынёю, стаяў нерухліва. Заблісkалі першыя зоркі.

— Мінём Яшукову гару, палавіна дарогі застанецца, — загаварыў дзядзька Раман.

— А ці далёка да Яшуковай гары?

— Вярсты яшчэ тры засталося.

— А скажыце, чаму гэта гара Яшуковаю называецца?

— Ды так яе ўжо даўно называюць у нас. Расказваюць людзі розныя байкі, але напэўна ніхто добра не ведае. Тут, кажуць, пахаваны пан Яшук.

— А чаму-ж яго пахавалі тут, у глухім лесе? — дапытваўся Лабановіч.

— Ды так, ужо тут памерці яму прышлося.

— А як ён памёр?

Лабановіч даўно чуў, як толькі прыехаў у Цельшына, назву гэтай гары. Але яму не ўдалося даведацца яе гісторыі-легенды, хоць і не раз распытваўся ў тутэйшых людзей. Цяпер-жа зноў абудзілася ў ім моцнае жаданне, а разам і надзея дачуцца аб гэтай гары.

— Э, пане настаўніку, не варта проціў ночы і ўспамінаць аб ім: ліхі гэта быў пан — ну, так людзі кажуць. Дый смерць яго нялюдская была. Вось так, бачыце, расказваюць. Быў тут калісь маёнтак, і гэты лес, і балоты гэтыя належалі да яго. А ў маёнтку жылі паны. І пераходзіў ён ад аднаго пана да другога. Усялякія былі паны — і добрыя, і ліхія. Апошні з іх роду і быў пан Яшук, ды гэтакі ўжо вырадак, гвалтаўнік, што і свет не бачыў такога. Здзекаваўся з людзей, забіваў іх бізунамі і такія вытвараў штукі, што ўрэшце і зямлі цяжка стала насіць яго. Людзі цярпелі, бо думалі, што калі цярпець, то лягчэй ад гэтага будзе, дый баяліся пана. Але часамі і дзерава не сцерпіць і скіне галіну, каб прыбіць чалавека. На свеце ёсць мера ўсяму. І тут так вось было. А пан гэты тое і рабіў, што або людзей катаваў, або баляваў, назганяўшы дзяўчат ды маладзіц, або на паляваннях прападаў. Так і прапаў на адным паляванні. Скончылася паляванне, збор трубіць пачалі, пазбіраліся паны, а пана Яшука няма і няма. Шукаць пачалі, народу яшчэ больш назганялі. А тут і бура такая паднялася, што лес крышыўся і стагнаў. І дагадаліся людзі, што пан напэўна павесіўся, бо з чаго-ж бы такая бура была? І толькі на трэці дзень знайшлі пана. Вісеў пан Яшук паміж двух тоўстых асін. Дрэвы таўшчэзнаю вяроўкаю з лазы перавіты былі, а на гэтай вяроўцы гайдаў вецер пасінелы труп пана Яшука. Тут і пахавалі яго, і курган над ім насыпалі. Над балотам, калі заўважылі, горка такая даўгаваценькая цягнецца. На гэтай

горцы курганок ёсць невялікі. Вось і сталі людзі гару гэтую называць Яшуковаю. За доўгія часы многа на свеце рабілася. А праўда гэта было ці не — не ведаю.

— Яго павесілі, ці сам ён павесіўся? — спытаўся настаўнік.

— А хто-ж яго ведае, — даўно было гэта, але так баюць старыя людзі.

Гэта ціхая ноч, палеская глуш, агорнутая змрокам, і гэты спакойны расказ дзядзькі Рамана мімаволі хілілі думку да народных легенд і паэзіі, авеяных духам гэтых лясоў і прастатою веры палешука.

Лабановіч, задаволены расказам Рамана, крыху памаўчаў, а потым зноў запытаўся:

— Ну, а скажыце, тут, каля гэтае магілы, ніякіх такіх страхаў не здараецца?

Раман адказаў не адразу. Відаць, яму не хацелася, пад'язджаючы да Яшуковай гары і ўночы, успамінаць аб страхах, і ён, каб ухіліцца ад простага адказу, прамовіў:

— Усяго не пераслухаеш, што людзі кажуць.

І, памаўчаўшы, дадаў:

— Хто баіцца, з тым і страхі здараюцца... А вось я вам скажу, пане настаўніку, такую праяву. Ёсць у нас недалёка ад раз'езду масток на чыгунцы. Каля гэтага мастка вось колькі ўжо чалавек машынаю зарэзала, і нават сабака адзін пад поезд папаў. І часта хто ні ідзе ўночы, там што-небудзь здасца... Вось гэта што значыць?

— А што здавалася там?

— Ды ўсякія штукі бывалі. Часамі там штось плюхціць, як-бы хто па балоце топчацца і зубамі чаўкае, або стагнаць пачне. І са мною там адно здарэнне было. Ішоў я на раз'езд да свайго родзіча. Вы яго ведаеце напэўна: Занька Язэп, стрэлачнікам служыць. А ўжо было і позна — поезд трэці нумар прайшоў. Толькі гэта я мінаю масток, аж там, у кустах на балоце, як зашуміць, ну, здаецца, і лісце з кустоў усё пасыпалася! І раптам ціха стала. А ноч была спакойная — ні ветрыку. Дык, ведаеце, мне вусцішна зрабілася.

— Бачыш ты, якія праявы, — прамовіў Лабановіч.

Яму было крыху смешна ад гэтай наіўнай веры дзядзькі Рамана, але хацелася слухаць яго, хацелася ўвайсці ў яго псіхіку і яго вачамі зірнуць на з'явы прыроды.

Дзядзька Раман маўчаў, чакаючы, што скажа настаўнік.

— Вы, дзядзька Раман, вельмі добра самі растлумачылі гэтыя страхі: хто баіцца, з тым яны і налучаюцца. Страх жыве ў нас саміх, мы самі ствараем і перадаем яго адзін другому. Незалежна-ж ад чалавека страху няма. У істоце кожнага страху ляжыць наша няведанне, наша цемната. Страх і цемната — неразлучныя прыяцелі. І пакуль мы не ўведаем прычыны тых ці іншых з'яў і не зможам паставіць сябе вышэй ад іх, падпарадкаваць іх нашаму людскому розуму, да таго часу мы і будзем адчуваць страх. Сам-жа па сабе страх, як нейкая незалежная сіла, гэта не больш і не менш, як наша глупства.

— Вось і Яшукова гара, — прамовіў Раман і паказаў улева.

Гара вельмі няясна вырысоўвалася са змроку. Далей за ёю праз галіны дрэў прасвечвалася на начным небе шырокае балота. Дарога павярнула досыць крута да пераезду. Перад самым пераездам стаяў крутаверхі клён у шапцы густога маладога лісця. Пад ім было цёмна-цёмна. Мінулі клён. Колы гучна загрукалі па мосціку перад самымі рэйкамі. З другога боку чыгункі стаяла будка. Цёмныя вокны зірнулі панура. Лабановіч чамусь звярнуў на іх увагу, як-бы хочучы замацаваць у памяці. Для чаго?.. Ды хіба-ж пытае цень хмаркі, чаму прабягае яна тут, а не там?

У лесе стала яшчэ больш глуха, ціха і вільготна. Хацелася ўглыбіцца ў сябе самога, аддацца плыні сваіх думак. Усплывалі вобразы пражытага, няясна вынікалі новыя. Ноч і цішыня соннага лесу, балот агортвалі душу спакоем. Крыху было смутна. Нейкі жаль закрадаўся ў сэрца — можа, аб тым, што было ды сплыло і чаго назад не вернеш. Але ўперадзе было яшчэ многа цікавага, нязведанага, бо гэта-ж толькі адна мяжа, за якою разгортваюцца новыя краіны жыцця, новыя хвалі яго вечнай плыні. А гэтая ноч і гэтая дарога — апошні кавалачак мяжы.

II

Заснуць у гэту ноч не прышлося.

У вагоне было цесна і душна. Увесь час Лабановіч стаяў у калідорчыку перад адчыненым акном. Дружна грукацелі колы. Іх грук зліваўся часамі ў нейкія дзіўныя спевы, і варта было толькі падабраць словы, каб колы зараз-жа выстукалі і матыў да іх. Або наадварот: часамі матыў выклікаў словы. Адзін час, здавалася, колы казалі:

«У-ця-кай!.. У-ця-кай!.. У-ця-кай!..»

І так без канца ўсё адны і тыя-ж словы. Надакучыла слухаць. Лабановіч хацеў не чуць іх, а яны ўпарта лезлі ў вушы: «Уцякай! Уцякай! Уцякай!» Каму казалі гэта колы: сабе ці яму? Ён пазіраў на прыдарожныя малюнкі. Але ў заслоне чорнай нерухлівай цемры яны вырысоўваліся вельмі цьмяна. Беглі-адступалі назад дрэвы, балоты з іх нязменнымі купінамі, з купчастымі лозамі і бліскучымі стужкамі вады. Заліваліся нейкім незразумелым смехам колы, прабягаючы кароценькія мосцікі, ды зноў пачыналі песню. Цяпер яны выстуквалі:

«Дзы-лін-бом! — купляй мак! — за тры грошы! — або так!..»

Адно і тое, адно і тое. Ну, проста як-бы насміхаліся! Толькі тады, калі поезд падыходзіў да раз'езду або да станцыі, яны змянялі свой рытм і казалі ўжо нешта зусім невыразнае.

Разам з прыдарожнымі дробнымі малюнкамі, з якіх складалася палеская краіна, і ўся яна, гэтая краіна, паволі адыходзіла і адыходзіла, саступаючы месца больш светлым, больш вясёлым пейзажам Беларусі.

Развіднялася.

Як лагодная ўсмешка, заяснелася неба на ўсходзе, заяснелася і паружавела. Прасторы зямлі шырыліся, разгортваючы свае малюнкі-чары. І хто не паддасца гэтым чарам?

Палессе засталося дзесь ззаду. Іншая краіна, іншыя малюнкі. Месцамі рассцілаліся прасторныя даліны рэчак, а самі рэчкі пакручастымі завітушкамі вельмі прыгожа вырысоўваліся ў сваіх высокіх беражках. Над далінамі ўзнімаліся роўненька акругленыя схілы ўзгоркаў,

аздобленыя зеленню маладой ярыны. На маладых аксамітных усходах палёў, на прыдарожнай траве, сакавітажыццёвай, на лісці кустоў, нібы брыльянты, буйніліся багатыя росы. Выступалі цёмнасінія сцены высокіх лясоў, прыгожа раскіданых па бясконцых прасторах зямлі.

І радасць жыцця была разліта ў прыродзе. Пульс гэтай жыццерадаснасці біўся кожны момант у кожным куточку гэтых вясёлых прастораў. На полі сям-там паказаліся людзі з сохамі і плугамі. У прасторах надзем'я замільгалі вольныя птушкі. Вось побач з поездам ляціць варона, нібы ёй хочацца паспрачацца ў быстрыні з ім. Ляціць доўга, паволі адстае, зварочвае кудысь убок і знікае.

Дзень зачаўся.

Лабановіч пільна ўглядаецца ў гэтыя далі, у гэтыя ўсё новыя і новыя малюнкі. Спаць яму зусім не хочацца. Ён адчувае, што чым далей ад'язджае ад Палесся, тым меншую ўладу маюць яго чары над ім. Тое, што так моцна захапіла яго там, што непакоіла яго мыслі, — усё яно заціхала, як-бы ніжэй асядала на дно душы. У яго цяпер было такое адчуванне, нібы ён толькі што пачаў ачуньваць пасля нейкай хваробы.

«Дарога, вандроўка — самае лепшае лякарства ад усякіх напасцей», — зазначае сам сабе Лабановіч і сам сабе ціха ўсміхаецца.

У гадзін адзінаццаць раніцы ён вышаў з поезда са сваімі двума чамаданчыкамі. Некалькі местачковых балаголаў апанавалі Лабановіча і цягнулі яго кожны на сваю фурманку, вырываючы з рук чамаданы. Але ехаць ён не хоча: навошта на такое глупства грошы траціць, калі чамаданы можна пакінуць у стоража, балазе ён добры знаёмы, а самому пехатой пайсці? Ён так і зрабіў: будуць у мястэчка з дому ехаць — і чамаданы забяруць.

Хвілін праз пяць сустрэчны пасажырскі поезд прышоў. Лабановіч намерыўся ўжо рушыць у дарогу, аж чуе — аклікае нехта, семінарскаю мянушкаю называе:

— Стары! Стары!

Азірнуўся — зямляк-аднакашнік Алесь Садовіч. Ідзе-калыхаецца, чамадан з распёртымі бакамі тарабаніць, а цераз плячо накідка звешваецца. На смуглым твары разліваецца самы шчаслівы смех.

Лабановіч шпарка пайшоў яму насустрач, незвычайна рады нечаканаму спатканню. Прыяцелі спыніліся, паглядзелі адзін аднаму ў вочы.

— Га-га-га-га! — басістым смехам загрымеў на ўсю станцыю Садовіч.

— Не смейся, Бас, бо ў сківіцу дам!

Сябры шчыра абняліся. Блізка году яны не бачыліся і за гэты час значна змяніліся, галоўным чынам змяніліся таму, што з семінарскіх скур павылузваліся.

— На лета прыехаў?

— На лета. А ты?

— Няхай яно згарыць. І я, брат, на лета да бацькі... Уцёк, можна сказаць, — прамовіў Садовіч.

Зноў апанавалі балаголы і пачалі тузаць. Ледзьве адбіліся ад іх.

— Пехатою пойдзем, Алесь, а чамадан Марозу нясі — там і мае ляжаць.

Аддаўшы чамаданы пад ахову стоража, юнакі-настаўнікі пусціліся ў дарогу. Усяе дарогі было вёрст сем-восем. Ішлі весела. Ідучы, дзяліліся сваімі ўражаннямі, навінамі, і гаворка іх часта перарывалася дружным смехам.

Мінулі пераезд.

— Стой, старына, прысядзем, дружа!

— Давай прысядзем.

Яны звярнулі з дарогі, выбралі слаўную мясцінку — зялёны грудок сярод жоўценькага пясочку — і спыніліся. З аднаго боку перад імі ляжала досыць убогае тарфяное балота. Нізенькія кусцікі, хірлявыя алешынкі ўперамежку з ялаўцамі кучкамі раскідаліся па балоце. Па другі бок дарогі цягнуліся пясчаныя груды. Купінкі белага моху, разложыстыя нізенькія хвойкі надавалі характар нейкай маркоты гэтаму пейзажыку.

Садовіч разаслаў сваю накідку.

— Лажыся, брат! — сказаў ён і выцягнуўся на спіне, упёршыся абцасам у пясок.

— Эх, Стары! Добра, брат, расцягнуцца на сваёй роднай зямлі, ляжаць і лічыць, колькі вёрст да неба.

— Адным словам, хоць на кароткі час Манілавым зрабіцца, — дадаў Лабановіч.

Хвілінку паляжалі моўчкі.

— А я, брат, не спаў усю гэтую ноч.

— Гэ, — загуў басам Алесь, — ці адну ноч не спаў я! Няхай яно, брат, запаветрае.

— Што-ж ты рабіў, у карты дуў.

— Усяго, брат, было: і карты, і піятыка, і ўсякая трасца. Вось-жа я і ўцёк ад усяго гэтага. Абрыдзела і астачарцела.

У голасе Садовіча пачуліся ноткі нездаволення і расчаравання сваім маладым настаўніцкім жыццём і тою абстаноўкаю, у якой прыходзілася жыць.

— Думаю пераводзіцца ў другое месца і ўзяць ужо сябе ў рукі, а то гэтыя зборышчы, гарэлка, карты і ўся местачковая брыдота зацягнуць зусім. І самае важнае— ніякае стравы для галавы. Не чытаў нічога і школу апусціў... Бесхарактарны я, брат Стары, — на тон самабічавання з'ехаў Садовіч, — але пераеду ў другую школу, тады, брат, шабаш. Я ўжо намеціў сабе праграму — гатавацца буду за курс гімназіі.

Садовіч энергічна перавярнуўся на бок і смела зірнуў на сябра. Вочы яго загарэліся, і выраз ўсяго твару свяціўся рашучасцю.

— Ты не прападзеш, Алесь, — паддаў яму духу Лабановіч. — Усе мы, браток, напэўна, за першы год настаўніцтва многа навучыліся мудрасці жыцця. Самае галоўнае, друг ты мой, гэта тое, каб не страціць усведамлення сваіх памылак...

— Правільна, старына, — падхапіў Садовіч: — Трэба-ж, брат, знайсці ў жыцці нешта такое, што дадавала-б сэнсу гэтаму жыццю. Трэба перш за ўсё пашырыць свой кругагляд, выблутацца з павуціння, што засланяе разумнае жыццё.

Сябры захапіліся гэтаю тэмаю. Але іх разважанне круцілася ў замкнутым коле агульных пытанняў маралі, ідэалізма і ў няясным парыванні да «разумнага» жыцця. Усе-ж дарогі, якія маглі-б прывесці іх да выйсця з гэтага зачараванага кола, для іх былі няясныя — сяброў шчыльна і моцна загрузіла семінарская навука і семінарскае выхаванне. Яны не бачылі таго палітычнага ўціску і соцыяльнага зла, якімі было забіта і прыдушана жыццё. Трэба было саматугам працярэбліваць да-

рогі, а дзеля гэтага трэба было так ці інача́й узыйсці на іх.

Гэтыя разважанні мелі для сяброў тое значэнне, што падмацавалі іх у шуканнях чагось новага, асэнсованага і падымалі над забраснявелым балотам грамадскага жыцця; гэтыя разважанні падтрымалі той агонь, які не дае памерці і заглухнуць чалавеку для грамадскай работы, — адным словам, яны былі як-бы маральнаю чысткаю, што ніколі не шкодзіць чалавеку.

— Так, брат Алесь, нам трэба шчыльней злучыцца, пісаць адзін аднаму, часцей рабіць паверкі самім сабе і час-ад-часу пытаць сябе: «Ці ёсць яшчэ порах у парахаўніцах?»

— Ёсць! — заўзята адказаў Садовіч.

Ён зусім настроіўся на ваяцкі лад і ўсё мацней усталёўваўся на сваіх новых пазіцыях — парваць усякія зносіны з местачковай кампаніяй і жыць «разумна».

— А то сап'ешся і прападзеш, як цюцька.

Успомнілі сваіх сяброў-аднакашнікаў, знаёмых маладых настаўнікаў. Шмат аб кім не мелі вестак.

— А ведаеш ты нашага Івана Тарпака? Гэта ты, здаецца, ахрысціў яго Тарпаком? — запытаўся Садовіч і весела засмяяўся.

— Не, не чуў аб ім. А што?

— Пацешны хлопец. Перш за ўсё атэістам зрабіўся. І нікога прызнаваць не хоча. Назначылі яго ні то ў Апечкі, ні то ў Зарубежжа. Там ужо нікога няма, адзін, як палец. Завёў з бабамі шашні, гуляк на сяле знайшоў, кампанію водзіць з імі. Захацелася раз выпіць, а не было за што. Дык ён узяў ды прапіў Ісуса Хрыста: за кварту гарэлкі аддаў мужыку школьны абраз. «Калі, — кажа, — ён ёсць сапраўды бог, то зноў у школу вернецца». Вось які наш Іван!..

— Ды гэтага ад яго можна спадзявацца, — заўважыў Лабановіч.

— А цяпер мае намер цара з царыцаю прапіць і ехаць у Амерыку.

Паводзіны Івана Тарпака развесялілі маладых настаўнікаў. Успомнілі яго семінарскую біяграфію. Гэта быў здольны хлопец, але страшэнны гультай, трымаўся з усімі незалежна, да лекцыі гатаваўся слаба. А калі яго

выклікалі да дошкі і ён пачынаў збівацца, то на заўвагі настаўніка звычайна адказваў:

— Я спужаўся, — і пры гэтым рабіў міну зусім перапалоханага чалавека.

Тарпак быў здаравенны, грудасты, шырокаплечы, і яго «пярэпалахі» выклікалі агульны смех. Адзін з настаўнікаў, акінуўшы поглядам яго фігуру, сказаў:

— Ды чаго-ж табе пужацца? Ты-ж можаш сцерці мяне ў парашок.

І тым не меней на гэтых пярэпалахах Іван Тарпак шчасліва даехаў да канца семінарскага курса.

Сонца звярнула з паўдня, было досыць горача. Садовіч сеў на сваёй накідцы, зірнуў на дарогу і сказаў:

— Што, Стары, пойдзем можа?

— Давай будзем рухацца.

Зрабілі кароткую нараду, якою дарогаю ім пайсці дамоў. Дарог было некалькі, і кожная мела пэўныя перавагі ў параўнанні з аднымі і чым-небудзь уступала другім.

— А ведаеш ты што, — сказаў Лабановіч, — давай пойдзем на Панямонь? Зробім там прывал...

— А гэта ідэя! — падхапіў Садовіч. — І ўжо калі на тое пайшло, давай зойдзем там да Шырокага. Ён мне, гад, яшчэ з каляд застаўся вінен тры рублі картачнага доўгу.

— Ідзе, — адгукнуўся Лабановіч.

Сябры падняліся, паправілі свае гарнітуры і павярнулі на Панямонь.

III

Мястэчка Панямонь — прашу не змешваць яго з другою Панямонню — было ў трох вярстах ад станцыі, а можа, нават і меней. Гэта старадаўняе мястэчка. Стаіць яно ў прыгожым месцы над Нёманам, на шырокім гасцінцы, што ідзе з Нясвіжа на Мінск. Калі падняцца на вапельную гару, а яна тут-жа, крыху на захад ад мястэчка, і зірнуць у бок Нёмана, то перад вамі разгорнецца найпрыгажэйшая панарама. Улева будзе чыгунка, мост над ракою. А як прыгожа выглядае адгэтуль Нёман! Як выцягнутае срэбнае вужышча з дзесяткамі, сотнямі,

тысячамі прыгожа акругленых кален-нартоў, павіваецца, бы пасмейваецца на сонцы, стары наравісты Нёман у высокіх берагах, атуленых лозамі і пахучымі травамі-зеллем, далінамі-лугамі, палямі-ўзгоркамі з залатымі або беласнежнымі схіламі пяскоў... Смела кажу: мала дзе знойдзеце вы такія прыгожыя рэчкі, як Нёман.

Лявей чыгункі — другое мястэчка, большае за Панямонь, хоць і Панямонь мястэчка не малое. А вапельная гара! А Сіняўскі гай... Хіба толькі той не паддасца чарам іх хараства, хто ў хараstве нічога не кеміць.

У мястэчку Панямонь многа розных выдатных будынкаў і ўстаноў. Тут ёсць цагляная лазня, царква св. Магдалены, два млыны, дзве школы, сінагога, касцёл і камяніца Базыля Трайчанскага. Але вы яго, напэўна, не ўсе ведаеце. А шкада: чалавек ён нішто сабе, настаўнік і грамадскі дзеяч. Адным словам, мястэчка вельмі выдатнае, і калі, бывала, уваходзіш у яго, дык несвядома пачынаеш прасякацца вялікаю павагаю і пашанаю.

Заслугоўваюць увагі і самі панямонцы. Гэта ўсё мілыя і добрыя людзі, і многа ў іх далікацтва. Калі іх моцна што здзівіць, то сваё здзіўленне, — а гавораць яны борздзенька, — выказваюць так:

— Ва! Ва!

Пры гэтым некаторыя дабаўляюць «браток ты мой». Але ў слове «браток» літару «а» вымаўляюць, як «ы», і такім чынам яны кажуць:

— Ва! Ва! Брыток ты мой.

Вось у гэтае мястэчка і накіраваліся нашы вандроўнікі — Лабановіч і Садовіч.

Прайшлі жалезны мост, спусціліся з высокага насыпу і пайшлі берагам. Чыстая вада, жоўценькі пясочак на дне, прыгожы беражок, — усё гэта вабіла такой спакусаю, што маладыя настаўнікі змушаны былі спыніцца. Сам Нёман, здавалася, казаў ім:

— А можа-б, вы, хлопцы, пакупаліся?

І, нягледзячы на тое, што час для купання быў заранні, бо каноплі былі яшчэ не настолькі высокія, каб у іх магла схавацца варона [1], настаўнікі з вялікаю прыем-

[1] У народзе ёсць такая прымета, што купацца можна толькі тады, калі каноплі падрастуць настолькі, што ў іх можа схавацца варона.

насцю выкупаліся, папесціўшы голае цела на гарачым пяску прыбярэжжа, асвяжыліся і пачуліся як не трэба лепей, пасля чаго пайшлі ў Панямонь малайцы малайцамі.

У той час, калі сябры купаліся, на ганку фельчарскага пункта сядзеў гурток панямонскай інтэлігенцыі. Гэта была група найболей дзейных карцёжнікаў, самых што называецца заядлых канаводаў. Тут быў сам фельчар Мікіта Найдус, зухаваты хлопец-праныра. Супраць яго сядзеў валасны старшыня Брыль Язэп, нізенькі, кругленькі чалавек накшталт французскай булкі, з носам драпежніка. У колах карцёжнікаў ён больш быў вядомы пад мянушкаю «Акула», як назваў яго Тарас Іванавіч Шырокі. Гэты «хрышчоны бацька» Брыля сядзеў тут-жа поруч з ім. Шырокі — тутэйшы настаўнік, загадчык двухкласнае школы, быў шырокім не толькі па прозвішчу, але і па сваёй фігуры, і па сваёй натуры, і нават па размаху гульні ў карты.

Усе яны зрэдку перакідаліся кароткімі сказамі. Але відаць было па тварах, што яны даўно ўжо прыгледзеліся адны другім і што ім чагось бракавала. Душы іх знаходзіліся ў стане тамлення і праглі дзейнасці, шукалі вострасці адчування, але выхаду не знаходзілі. Шырокі задуменна пазіраў кудысь у прасторы. Найдус ціхенька пасвістваў і барабаніў пальцамі, а Брыль Язэп паварочваў драпежніцкі свой нос направа і налева. Ён першы заўважыў маладых вандроўнікаў.

— Хто гэта такія?

Увага трох прыяцеляў спынілася на незнаёмых падарожных. А тыя, у сваю чаргу, пазіралі на гэтых трох і, як відаць, яшчэ здалёк пазналі іх.

Напрактыкаванае вока Шырокага адразу аднесла гасцей да належнай катэгорыі.

— Педагогі! — сказаў ён, і голас яго ажыў, набыў зразу жыццёвую моц, а вочы яшчэ вастрэй уставіліся ў маладых хлопцаў: хацелася-ж пазнаць іх. І толькі тады, калі Лабановіч і Садовіч шырокімі ўзмахамі рук паднялі свае шапкі і артыстычна пакланіліся кампаніі панямонцаў, Шырокі ажыў яшчэ больш. Ён усхапіўся з месца, дзябёлая фігура яго рэзка калыхнулася, страсянуўшы ганак. Гучным голасам прывітаў Шырокі маладых настаўнікаў.

— А галубчыкі-ж мае! Адкуль-жа гэта вы?

Шырокі размашыста рушыўся насустрач гасцям, прычым жывот яго закалыхаўся, як човен на вадзе. Па чарзе абняў ён аднаго і другога госця. А госці ў абдымках Шырокага як-бы на момант знікалі з вачэй, закрываліся фігураю яго і траціліся ў ёй.

— Вот люблю свайго брата настаўніка! Гэта — соль зямлі! — крыкнуў ён, зірнуўшы на фельчара і старшыню.

Шырокі выказваў усе адзнакі нястрымнага руху, парывістай, стыхійнай радасці і бушавання: спатканне з калегамі прывяло яго ў гэты надзвычайны стан душы.

— Пакланіся ім ніжэй, гулугала ты! — накінуўся Шырокі на старшыню.

У той час, калі старшыня вітаўся з настаўнікамі, Шырокі ўхапіў яго за карак і нагнуў галаву.

— Гэта — святыя мучанікі за ідэю народнае асветы, не тое, што ты, камінар цёмны: толькі тое і робіш, што за нядоімкі апошнюю цялушку цягнеш са двара, або ты, рыцынная душа: стружа чалавека жывот, а ты з яго рыцынаю пазалеташняе выганяеш.

— Не чапай ты ўжо лепш медыцыны: нічога ты ў ёй не разумееш, — заступіўся фельчар за сваю прафесію.

Зняважліва глянуў Шырокі на фельчара, галавою паківаў.

— Ды хіба-ж я процiў медыцыны кажу? Трубка ты гутаперчавая.

Словам, Тарас Іванавіч Шырокі разышоўся на радасці, што калег спаткаў, бо толькі ў сваіх калегах ён бачыў сапраўдных людзей, з якімі адчуваеш сябе, як з братамі.

З'яўленне новых людзей прынесла значнае ажыўленне. Найдус і Брыль таксама заварушыліся, бо была надзея перакінуцца картамі з дарагімі гасцямі.

Азірнуўшы спотайку маладых настаўнікаў, Брыль, здавалася, абнюхаў іх кішэні, але гэты агляд не выклікаў вялікіх надзей на скарбы, бо настаўнікі былі адзеты не надта фарсіста. Ну, але гэта не так ужо важна! Важна было тое, што каля новых людзей можна сабраць кампанію. Брыль зараз-жа заспяшаў да воласці, бо якраз трэба было адсылаць пошту і падпісваць паперы. Што-б там ні казаў Шырокі, а непадпісаная старшынёю

папера з воласці не пойдзе. Ён развітаўся і на развітанні перамігнуўся з Найдусам і Шырокім. Сэнс гэтых мігаў быў прыблізна такі: «Банчок можна лічыць наладжаным. Склікай брацію».

Усё гэта зрабілася, разумеецца, вельмі борзда, мімаходам, між іншым.

— Чаго-ж мы будзем таптацца на ганку? — зноў парывіста загаманіў Шырокі. — Ты, п'яўка, заклікай гасцей ды па пляшку пасылай.

— Далі-бог-жа няма за што! — і Найдус некалькі разоў пастукаў сабе кулаком у грудзі.

— Тфу! — плюнуў Шырокі і акінуў фельчара зняважлівым вокам.

— А нашто тая гарэлка?

— Кіньце вы гарэлку! Пасядзімо трохі, — і дадому...

— А браткі-ж мае родныя, куды дадому?! І не думайце нават. Я рад, што сваіх братоў-настаўнікаў бачу: хоць душу адвесці ёсць з кім.

— А мы, прызнацца, і выбралі такую дарогу, каб Тараса Іванавіча не мінуць.

— Малайцы, ей-ей малайцы!.. Пойдзем, хлопцы, да мяне!

Шырокі ўстаў, як-бы паравоз зрушыўся, узяўся за рукі калег.

— Пойдзем! — пазваў ён і Найдуса.

— Мне да хворага зайсці трэба.

— А чаго табе ісці? Пашлі рыцыны — і ўсё.

— Я потым прыду.

— Дык прыходзь.

Шырокі і два калегі вышлі на пясчаную вуліцу. Правей ішла яшчэ адна вуліца. На самым канцы яе стаяла камяніца Базыля Трайчанскага. Адгэтуль яна бадай што была і не відна — яе закрывалі хаты, і толькі ганак, вышклены рознастайнымі каляровымі шкелцамі, выступаў на вуліцу і як-бы казаў, што камяніца — не якая-небудзь пустая мара, а рэальны здабытак рэальнага чалавека. Гэтая камяніца ў сваім часе была выдатнейшаю праяваю ў жыцці Панямоні. Аб ёй было многа гутаркі сярод панямонцаў, а сам уласнік параўноўваўся з суседнімі дваровымі панкамі — Пласкавіцкім, Дашкевічам, Лабоцкім. Базыль, слухаючы гэта, толькі пазіраў з-пад казырка

шырокаверхае настаўніцкае шапкі і добрадушна пасмейваўся. Разумеецца, пры гутарках прабівалася людская зайздрасць, бо ніхто з панямонцаў не адмовіўся-б ад такой камяніцы.

Прайшоўшы колькі крокаў, настаўнікі павярнулі ўлева. Мінулі кузню. Лабановіч, ідучы каля кузні, акінуў яе поглядам. Яму ўспомнілася, што тут спрытны каваль Хаім нацягаў шыны на колы, што ў гэтую кузню не адзін раз прыязджаў ён і прыходзіў з дзядзькам Марцінам па розных гаспадарскіх справах. І кузня і само мястэчка тады нейк выглядалі іначай, рабілі большае ўражанне, можа, з тае прычыны, што ён быў малы. І яму стала чагось смутна, але гэты смутак быў мімалётны, няясны. Недалёка ад кузні працякала малюсенькая рэчачка Панямонка, над якою прыгожа нахіліліся крохкія шырокаверхія вербы, як-бы ўслухоўваючыся ў шолах і бульканне малюпасенькіх хвалек.

Усю невялікую дарогу, хвілін на пяць хады, Шырокі не пераставаў у значна павышаным тоне расказваць аб затхласці местачковага жыцця, аб нікчэмнасці інтарэсаў панямонскай інтэлігенцыі. Ён энергічна махаў рукамі, соп, жаліўся на гарачыню, знімаў сваю белую шапку з двума значкамі, і хустачкаю абціраў коратка астрыжаную галаву.

— І толькі калі сустрэнеш свайго брата-настаўніка, то пачуешся так, нібы на цябе бліснуў промень сонца з-за хмар пасля зацяжнай нягоды, — грымеў Шырокі ўжо каля двара свае школы. І, як-бы абурыўшыся затхласцю панямонскага жыцця, ён з сілаю таўхануў нагою веснічкі. Яны бразнуліся аб вароты, і настаўнікі ўзышлі на двор.

Ступіўшы на ганак, Шырокі з шумам сеў на лаўку, адкінуўся, выцягнуў здаравенныя дзябёлыя ногі і пагладзіў свой жывот-ночвы.

— Го-о-о, браткі-ж мае, утаміўся!

Лабановіч з Садовічам, зірнуўшы на жывот Тараса Іванавіча, не ўтрымаліся.

— Ну, брат, і жывот-жа ў цябе! Мусібыць, на дзесяць тысяч настаўнікаў другі такі не знойдзецца.

Замест адказу Тарас Іванавіч толькі паляпаў рукою па жываце з выглядам самаздаваленння.

А жывот у яго быў выдатны. Не дарма-ж ён паслужыў тэмаю для аднаго паэта. Верш, напісаны невядомым паэтам, не адзін раз зачытваўся Шырокаму ў адпаведных выпадках жыцця. Верш так і называўся: «Жывот»:

Эх, жывот, ты жывот,
Каб ты жыцця не знаў,
І чаго ты за год
У сябе не прымаў:
Бульбы пограб згнаіў,
Засек жыта ты з'еў,
А давольны не быў,
Яшчэ болей хацеў.

Шырокі змоўк у салодкім адпачынку, але гэта быў адзін толькі момант, і Тарас Іванавіч раптам усхапіўся, як спуджаны арол.

— Жонка! Жонка! — загукаў ён на ўвесь школьны двор.

На клік выбег сын яго Лёня, хлопчык гадкоў чатырох. Убачыўшы незнаёмых людзей, ён спыніўся, утаропіўся на іх сваімі яснымі вочкамі.

— Пазнаў ты мяне, Лёня? — спытаў яго Лабановіч.

Лёня прыветна ўсміхнуўся і сказаў:

— Дзядзя, ласказы мне казку!

Следам за Лёнем вышла і жонка Шырокага, Вольга Сцяпанаўна. Гэта была мілая і добрая жанчына. Яна вельмі была рада гасцям.

— Ты ведаеш, — гэта самыя лепшыя людзі на свеце, гэта — настаўнікі!

— Ведаю, ведаю, — сказала Вольга Сцяпанаўна.

Тарас Іванавіч зноў разышоўся і ў натхненні сказаў:

— Эх, каб я не быў жанаты! Свет-бы я перавярнуў!

— Сціхні ўжо ты, — сказала жонка, — пляце нямаведама што.

— Нічога ты не разумееш, галубка мая!

Вольга Сцяпанаўна заклікала гасцей у дом.

IV

Уваходзячы з гасцямі ў свае апартаменты, Шырокі расказаў, як да яго на кватэру зайшоў нядаўна жандар і, пабачыўшы пакоі, здзівіўся:

— «Какая популярность ваших комнат!»

Шырокі ўсім расказваў пра гэтага жандара і ўсякі раз залівайся забіяцкім смехам. Так было і цяпер.

— Ну, жонка, шарганіся ты каля буфета ды ці не знойдзеш там чаго.

Такую ўжо натуру меў Тарас Іванавіч. І здавалася дзіўным, каб чалавек яго камплекцыі быў здолен на гэткую рухавасць і стыхійную бурлівасць. У гэтым выпадку маладнякоўскае слова «бурапеністы» падышло-б да яго, як не трэба лепей.

Вольга Сцяпанаўна вышла прыгатаваць стол. Лёня ўсеўся на каленях Лабановіча і слухаў казку пра бабуягу. Казка надзвычайна зацікавіла малога, асабліва калі Лабановіч пусціўся на выдумкі і сказаў, што баба-яга бывае часамі маленькаю, як палец, а потым зноў расце і прымае свой звычайны выгляд. Але ў самым цікавым месцы Тарас Іванавіч грымнуў песню:

Три деревни, два села,
Восемь девок — один я —

і заглушыў казку. Сын запратэставаў рэзка і крыкліва. Тарас Іванавіч толькі павярнуў галаву ў яго бок і, махаючы кулакамі, адбіваў такт і спяваў далей. Сын закрычаў яшчэ грамчэй, каб у сваю чаргу заглушыць бацьку, а бацька, не паддаючыся, падняў голас на некалькі тонаў вышэй. Тады Лёня залемантаваў так, што вышла Вольга Сцяпанаўна — даведацца, што тут здарылася.

— Ну, дай-жа ты дзіцяці казку паслухаць! Добры бацька сам расказаў-бы, а ён і паслухаць не дае. Вось вар'ят ужо!

Тарас Іванавіч кінуў спяваць, заліўшыся багатырскім смехам, а потым сказаў да сына:

— Што-ж з цябе будзе, калі ты гадоў дарасцеш? Цяпер ужо бацьку злажыцца не даеш, гад ты печаны! — І, павярнуўшы галаву да жонкі, дадаў: — Вось і жаніся ты цяперашнім векам — у труну гатовы палажыць чалавека.

Жонка акінула позіркам фігуру мужа і ні то сярдзіта, ні то жартліва прамовіла:

— Ото дзіва: паложыш такога ў труну.

Шырокі зірнуў на гасцей і з дакорам паківаў галавою.

— Вось, як пабачыла маладых хлопцаў, дык хоча, каб я памёр.

Раптам ён перайшоў на іншую тэму і расказаў, як у аднаго настаўніка быў у хоры спявак, аб якім ён казаў: «Быў у мяне ўнісон. Вы ведаеце, што гэта быў за ўнісон!» І Тарас Іванавіч зноў затросся ад смеху.

Не пераставаў ён тарахцець і тады, калі селі за стол. У Вольгі Сцяпанаўны знайшлося па чарцы. Смачная наліўка дзесь была прыхавана так, што аб ёй і не ведаў Тарас Іванавіч. Наліўка прывяла яго ў вышэйшы стан радасці.

— Ты ў мяне, жонка, малайчына!

Падняўшы чарку, ён сказаў цэлую прамову на тэму, якое значэнне мае ў жыцці беднага настаўніка добрая жонка.

— Пі ты ўжо, малатарня,— смеючыся, азвалася Вольга Сцяпанаўна, — людзі чакаюць выпіць, а ён меле.

Выпілі.

Тарас Іванавіч адкінуў галаву і, гладзячы рукою тое месца, дзе прайшла наліўка, казаў у захапленні.

— А браткі-ж мае, а родненькія!.. Іскры вясёлкавыя! Бальзам, амброзія боская!.. Салавейчыкі ў кішках спяваюць!

І Вольга Сцяпанаўна і госці ўрэшце паддаліся ўладзе гэтай шумлівай крыніцы жыцця і вясёласці. Смяяўся Тарас Іванавіч, смяялася і Вольга Сцяпанаўна, і маладыя настаўнікі, гледзячы на іх, смяяўся і Лёня, і час за сталом праходзіў весела, а наліўка яшчэ больш дадавала вясёласці.

Непрыметна і вечар надышоў.

Лабановіч і яго прыяцель заварушыліся, ці не пара ўжо ім дадому?

— Куды-ж вы так спяшаецеся? — сказала Вольга Сцяпанаўна. — Жонкі вас чакаюць або дзеці плачуць? Пагасцюйце ў нас... Ды вы яшчэ, мусібыць, не знаёмы з нашаю новаю настаўніцаю?

Пры словах «новая настаўніца» Тарас Іванавіч падскочыў, як на пружынах, не даў жонцы дагаварыць.

— Браткі мае, родненькія! Паглядзіце на яе — і пальчыкі абліжаце!.. Вочы!.. Што за вочы! Неба Італіі свеціцца ў іх. А бровы! А губкі! А фігурка!.. Эх! — выкрыкнуў Тарас Іванавіч і сашчаміў зубы, — усё на свеце, здаецца, аддаў-бы, каб абняць ды прыгарнуць яе...

Тут Вольга Сцяпанаўна замахнулася на мужа чарпаком, а Тарас Іванавіч, ратуючыся, крута падаўся ўбок.

— Нашто-ж ты пра яе ўспомніла?

— Тут ёсць кавалеры, а ты што?

— Я, брат, таксама пудла не даю. — І Тарас Іванавіч зноў затросся ад смеху.

— Уй, мяшок! — сказала яму жонка: — Куды табе? Унь хлопцы ёсць нежанатыя, кавалеры... Яна вас у паганскую веру прыводзіць будзе, — звярнулася Вольга Сцяпанаўна да настаўнікаў.

— У якую паганскую веру? — запытаў Лабановіч.

Вольга Сцяпанаўна засмяялася.

— Ну, заставайцеся — будзеце ведаць.

— Дык хіба застанемся, Стары? — запытаў Садовіч прыяцеля.

Лабановіч паглядзеў на яго, уздыхнуў і патрос галавою.

— Алесь, Алесь, не спакушайся, брат, цяжка будзе жыць на волі, калі будзеш мець сэрца ў няволі!

— Гэта вы з практыкі гаворыце? — запыталася Вольга Сцяпанаўна.

Лабановіч адказаў:

— Ён называе мяне Старым. Па праву старога я павінен мець усякую практыку і перасцерагчы блазна.

— Го-о-о, браток ты мой! — падхапіў Тарас Іванавіч. — Ці не ў Палессі пакінуў ты сваё сэрца?

Усе засмяяліся.

— Маё сэрца са мною... Вось-жа я на злосць вам застануся, у паганскую веру не пайду і на «неба Італіі» пазіраць не буду.

Вольга Сцяпанаўна запляскала ў ладкі: яна была рада, што настаўнікі застаюцца, а Лабановіча яна тутжа паставіла ў прыклад свайму мужу, на што Тарас Іванавіч адгукнуўся так:

— Я пакрыўдзіўся-б на месцы Лабановіча. Хіба ты, брат, не мужчына, ці што?

Тым часам надыходзіў і вечар. Сонца схавалася за вапельную гару, цень ад яе закрыў усё мястэчка, але дзень ніяк не хацеў саступаць месца вечару, і неба доўга заставалася ясным і светлым.

А ў Панямоні ўжо ўсе ведалі, што да Шырокага прышлі два настаўнікі, значыць збор сёння будзе ў Тараса Іванавіча. Найдус і старшыня і паведамілі аб гэтым знаёмых сваіх, бо іх можна было спаткаць некалькі разоў на дзень. А калі-б нават Найдус і старшыня нікому не сказалі, то ўсё роўна ведалі-б усе: на гэта ў Панямоні і быў Ёсель.

Ёсель не меў пэўнай прафесіі. Гэта быў бедны мястачковы дзяцюк гадоў за дваццаць, бязвусы, безбароды, трохі заіка, трохі гультай і трохі прыдуркаваты. А можа, ён проста прыкідваўся такім, каб мець больш права на тую ролю, якую выконваў ён, жывучы ў Панямоні. Усё яго жыццё праходзіла каля панямонскай «інтэлігенцыі». Ад яе і жывіўся ён, слугуючы ёй і церпячы яе кпіны. Зранку да самага вечара шнураваў Ёсель па мястэчку, непрыметна заходзіў то да аднаго, то да другога, так што і заўважыць яго было трудна. Але варта было падгуляўшаму «інтэлігенту» толькі крыкнуць «Ёсель», як ён зараз-жа з'яўляўся, як-бы вырастаючы з зямлі. Яму давалі даручэнне збегаць з запіскаю да тае ці іншае асобы, прынесці піва ці схадзіць купіць новую калоду карт. Пры гэтым, каб ён быў рухавейшым, яму давалі чарку гарэлкі ці шклянку піва. І Ёсель весела бег, куды яго пасылалі, а невялічкая здача з'яўлялася яго заробткам.

Ёсель хоць і быў непісьменны, але вёў строгі рэестр імянін і ўсякіх сямейных свят у Панямоні. Дзён за два, за тры да такіх свят ён абходзіў сваю парафію і напамінаў «парафіянам», што такі і такі, тады і тады будзе імяніннікам. Яму казалі з'явіцца ў пэўны дзень, каб занесці павіншаванне. І Ёсель прыходзіў акуратна ў назначаны тэрмін і выконваў свой абавязак. На вечарах Ёсель быў неадлучна, стаяў убаку, каб з'явіцца па першаму слову ў патрэбную хвіліну.

Праўда, была яшчэ ў яго і здольнасць пасмяшыць, павесяліць гасцей, калі яму ставілася такая задача. Тады яго частавалі — ну, разумеецца, недаедкамі, і Ёсель,

уплятаючы свініну, строіў жарты і насмешкі над законамі свае веры.

Ледзь толькі пачало цямнець, Ёсель ужо быў, як на варце, у Тараса Іванавіча і чакаў загадаў.

Першым прышоў Базыль Трайчанскі. Яго яшчэ звалі коратка «База». На твары яго красавала прыемная ўсмешка, і сам ён быў чалавек даволі прыемны, хоць трошкі мешкаваты. Маючы размову з кім-небудзь, ён крыху ківаў галавою і глядзеў як-бы спаднізу, наўперад адным вокам, а потым, перакінуўшы галаву ў другі бок, другім. У гэтым пункце ён меў падабенства з курыцаю, калі яна шукае па хаце крошак.

Базыль прывітаўся з калегамі, распытаў іх, ці на ўсё лета прыехалі, як ім паводзілася на настаўніцтве, ці збіраюцца быць летам на курсах. Кожны адказ маладых настаўнікаў Базыль сустракаў добрадушным смехам.

Тупат на ганку сведчыў аб прыбыцці новых асоб. Іх было дзве: сядзелец Кузьма Скаромны і панямонскі жыхар Мікола Зязюльскі. Жылі-ж яны на свеце і займалі ў ім пэўнае месца: аб іх таксама трэба сказаць хоць колькі слоў. Скаромны быў чалавек з прэтэнзіямі на інтэлігентнасць. Любіў ён збіраць грыбы і меў нахіленне да брудных анекдотаў; любіў яшчэ гуляць у карты, але пабойваўся жонкі. Мікола Зязюльскі быў калісь багаты чалавек, задаваў форсу і прагульваў цэлыя сотні рублёў. Аб ім гаварылі з пашанаю. Але непрыемна з'ехаў ён на бзік, адышоў на задні план, страціў пашану і былую славу. І толькі нядаўна ў яго жыцці здарылася адна праява, якая зрабіла яго ледзь не героем сярод панямонцаў. Месяц таму назад, ужо калі Зязюльскі меў 53 гады, у яго жонкі радзіліся блізняты. Гэты факт значна падняў курс Зязюльскага на біржы панямонскага жыцця. Аб ім зноў загаварылі. Сам-жа Зязюльскі пасля гэтага заганарыўся і казаў таму-сяму з панямонцаў:

— Ну, куды-ж вы варты.

А панямонцы чухалі галовы.

— Вось табе і Зязюльскі.

Зязюльскі прышоў ужо выпіўшы. Худы яго твар быў ружовы і блішчаў, як вычышчаны рондаль. Генеральскія вусы рабілі яго важным, нават да некаторай ступені

грозным, і толькі нізкі рост яго значна перашкаджаў гэтай грознасці.

Ён падышоў да маладых настаўнікаў, моцна паціснуў ім рукі і кожнаму па чарзе сказаў досыць доўгае слова прывітання і пасля гэтага пацалаваў аднаго і другога.

Зязюльскі падсеў да Лабановіча

— Любачка мая, — казаў ён, — гляджу я на цябе і ўспамінаю твайго бацьку: тваё аблічча так напамінае мне нябожчыка! — Зязюльскі цяжка ўздыхнуў, журботна звесіў старую галаву, як-бы акамянеўшы ў вялікім смутку. Пятрусь, Пятрусь! Нашто ты памёр? — голасам бязмежнай жальбы выкрыкнуў ён і, падняўшы завільгочаныя слязамі вочы на Лабановіча, сказаў: — Гэта быў мой першы прыяцель, дружака... О, колькі разоў выпівалі мы з ім! — І яшчэ ніжэй апусціў галаву. — Эх... — Ён не мог далей гаварыць і толькі безнадзейна махнуў рукой.

V

Пакуль Зязюльскі выліваў смутак свайго сэрца, сабралася амаль што ўся кампанія. Падышоў вядомы ўжо старшыня Брыль Язэп, памочнік пісара Савось Карэнчык, бяссочны, як таран, вяртлявы хлопец, і дзяк з царквы св. Магдалены, Майсей Памахайлік. Яго яшчэ называлі «месца пячаці». Гэта мянушка вышла з валаснога праўлення, бо там галоўным чынам былі бланкі з літарамі М. П., на тым месцы, дзе і ставілася пячаць. Дзяк належаў да тыпу людзей, якіх звычайна называюць цвілымі або сметанковымі. Ён быў крыклівы, гарласты і сваё права бараніў з такім жарам, што толькі Тарас Іванавіч Шырокі, стукнуўшы кулаком-молатам перад носам Памахайліка, наводзіў на яго страх і змушаў заціхаць.

Садовіч і асабліва яго прыяцель на першых часах адчувалі сябе трохі нялоўка сярод гэтае кампаніі і чакалі, што будзе далей. То той, то другі з гасцей перакідаўся з імі адным-двума словамі, але агульнай тэмы для гутаркі не знаходзілася, як-бы гэтыя людзі выпадкам сышліся дзесь на вакзале, чакаючы поезда.

— Што-ж гэта Найдуса няма? — запытаўся Тарас

Іванавіч. Ён добра ведаў, чаму няма Найдуса — фельчар пакручваўся каля новае настаўніцы, — але трэба-ж было даць тон і нейк прыступіць да справы.

— Найдус ведае, дзе трэба хадзіць, — чмыхнуў сядзелец.

— Ды яны зараз прыдуць, — сказаў Карэнчык, — Тамара Аляксееўна і мяне заклікала разам ісці, але я не хацеў ужо станавіцца Найдусу ўпоперак дарогі.

— Чуеш, брат Стары, — шапнуў Садовіч прыяцелю, — давай, брат, адціснем Найдуса!

— Ну, што-ж? Папрабуй, — ціха адказаў Лабановіч.

Садовіч, яшчэ не бачачы новае настаўніцы, кашлянуў басам, падаў наперад грудзі, — словам прыняў пэўную кавалерскую паставу.

Карэнчык яшчэ дадаў:

— Яна дачулася, што прышлі маладыя настаўнікі, і хоча пазнаёміцца з імі, — і паказаў галавою на сяброў.

Садовіч непрыметна штурхануў локцем Лабановіча, а той ціхенька азваўся:

— Грунт ёсць.

— Прыдуць, — пераконана адазваўся Скаромны. — Давай, Тарас Іванавіч, абразікі, каб не так маркотна было чакаць шчаслівай пары.

Сядзельца падтрымалі, і Тарас Іванавіч, слаба пратэстуючы, вышаў і зараз-жа вярнуўся з дзвюма калодамі карт.

Дзеля большай вольнасці і разгону пастанавілі перайсці ў класны пакой. Тарас Іванавіч прынёс туды вялізную лямпу «Молнія», запаліў яшчэ і вісячую лямпу, і ў класе стала светла.

Каля карт аб'едналася перш невялікая група гасцей. Туды падсеў старшыня. Увесь час ён маўчаў і цяпер пачаў прыглядацца да карт. Аказалася, што гэтымі картамі гуляць ужо нельга: на адной ражок здзёрты, на другой падазроная плямка. Адным словам, ігра тут небяспечная... Няма ў людзей веры ў адносінах аднаго да другога. Можа, ад гэтага часамі і цяжка бывае чалавеку.

Тарас Іванавіч сказаў з запалам:

— І чалавек з часам аблупліваецца, і пашпарт мяняеш ты ў воласці, а то дзіва, што карты зашмуляюцца.

Шырокага лічылі іграком не зусім лаяльным, але аб гэтым яму ў вочы не казалі. Сам-жа ён у цеснай кампаніі часамі гаварыў:

— На тое-ж і шчупак у моры, каб карась не драмаў.

Аблаяўшы старшыню «капшуком», Тарас Іванавіч гучна крыкнуў:

— Ёсель!

Зараз-жа дзесь у глыбіні дома затухкалі ногі, а яшчэ праз момант на парозе стаў Ёсель.

— На, збегай да Моні і прынясі дзве калоды карт. Ды жыва — на адной назе!

Ёсель узяў грошы, забалбатаў нешта і, шырока ступаючы, знік за дзвярамі.

—А-а-а! — разам ахнула некалькі галасоў.

Праз тыя-ж дзверы пад ручку ўваходзіла пара — Тамара Аляксееўна і Найдус. Найдус быў прылізаны, у чорнай тужурцы з бліскучымі гузікамі. Ясна, што была пастаўлена стаўка на закасаванне ўсіх іншых прэтэндэнтаў на прыгожую дзяўчыну. На губах у Тамары Аляксееўны красавалася ўсмешка, ды такая чароўная, што хіба толькі той не мог крануцца ёю, хто ўжо высах на 90 працантаў.

Найдус галантна падводзіў сваю даму да кожнага госця, з якім і віталася яна ўсё з тою-ж чараўнічаю ўсмешкаю. Кожны стараўся сказаць ёй пры гэтым самы прыемны панямонскі камплімент, а калі ў каго не знаходзілася такога, то хоць адказнаю і таксама прыемнаю ўсмешкаю выказаць сваё захапленне яе прыгажосцю.

Карэнчык таксама расплыўся ва ўсмешку, але гэта вельмі мала дадало яму хараства. Ён быў нават намерыўся нешта сказаць, але з губ сарвалася адно толькі шыканне.

Тарас Іванавіч перахапіў Тамару Аляксееўну ад Найдуса, сказаўшы:

— Кіньце вы гэтага таўкача: я вас пазнаёмлю з нашымі калегамі, — і сам павёў яе да настаўнікаў.

Тамара Аляксееўна павіталася з імі моўчкі, асвятляючы кожнага ўсё тою-ж чараўнічаю ўсмешкай. Паходка яе была плыўкая, мяккая. Цёмнакаштанавыя валасы, завітыя спрытнаю, напрактыкаванаю рукою,

спускаліся бясконцымі хвалямі на верхні абрыс твару, даючы яму раскошную аправу.

Знаёмячыся з Садовічам, яна проста-такі асыпала яго іскрамі з «неба Італіі», а верхняя губка яе, з невялічкаю ямінкаю пасярэдзіне, лёгенька задрыжала пад павевам найпрыямнейшай у свеце жаночай усмешкі.

— Гэта — свяцільнік Бабруйшчыны, — рэкамендаваў Тарас Іванавіч Садовіча.

Свяцільнік Бабруйшчыны кіўнуўся ўсёю фігураю і толькі кашлянуў басам.

— А гэта — прасвяціцель цёмнага Палесся, вялікі пустэльнік, але не кладзіце яму пальца ў рот.

Тамара Аляксееўна падала руку «пустэльніку», а другою рукою лёгенька шлёпнула па руцэ Тараса Іванавіча і назвала яго «златавустам панямонскім». Гэта былі яе першыя словы.

Шырокі, каб апраўдаць славу «златавуста панямонскага», сказаў аб Лабановічу яшчэ:

— Тут, на тэрыторыі, дзе красуе ваша прыгоства, ён асмеліўся заявіць, што не будзе прызнаваць паганскай веры...

— Ой, скажу Вользе Сцяпанаўне, — пастрашыў Лабановіч Шырокага, — не мінуць табе чарпака.

Тамара Аляксееўна з дакорам паківала галавою, пазіраючы на Лабановіча, а Тарас Іванавіч з жарам выпаліў:

— З-за Тамары Аляксееўны гатоў пад розгі легчы і на крыж пайсці.

Але якраз увайшла Вольга Сцяпанаўна, Шырокі асекся і разыграў ролю дураслівага школьніка ў момант з'яўлення грознага настаўніка.

Тамара Аляксееўна кінулася да Вольгі Сцяпанаўны і, па-жаночаму звычаю, пацалавалася з ёю.

— Каго-ж вы, Тамара Аляксееўна, у паганскую веру прыводзіць будзеце? — запытала гаспадыня.

Госці засмяяліся, зашумелі, а Тамара Аляксееўна, крадучыся, як кошка, накіравалася да Садовіча. Садовіч стаяў у недаўменні і не ведаў, што будзе далей і як рэагаваць на гэта. А настаўніца падышла блізенька, працягнула руку і ўзяла Садовіча за вуха і павяла яго вакол стала пад громкі смех прысутных. На поўдарозе

Садовіч спрытна падхапіў яе пад руку і вызваліў сваё вуха. Потым удваіх яны пайшлі да Лабановіча. Як толькі Тамара Аляксееўна працягнула руку, каб узяць за вуха, ён адскочыў убок.

— Эге! — пачуліся галасы, — паляшук не даецца.

І пачалася беганка. Лабановіч выкручваўся кожны раз, калі Тамара Аляксееўна, здавалася, вось-вось схопіць яго за вуха. Яна ганялася за ім па класе, па лаўках, але дарма. То той, то другі з гасцей стараліся памагчы настаўніцы ўзяць за вуха непакорлівага, але ён вылузваўся, уцякаў і падражніваўся:

— Кароткія ў вас рукі.

Сам Тарас Іванавіч прышоў ёй на дапамогу. Не спадзеючыся дагнаць вёрткага «палешука», ён скраўся ззаду, наваліўся ўсім сваім сяміпудовым целам на Лабановіча і ўшчаміў яго жалезнымі рукамі. Рвануўся бедны хлопец, але вырвацца не здолеў. Тамара Аляксееўна з раскудлачанымі валасамі падбегла і хацела ўжо як мае быць узяць за вушы калегу. Але ў Лабановіча рукі напалавіну былі вольныя, і ён схапіў яе рукі разам з батыставымі рукавамі. Вырываючыся, Тамара Аляксееўна разарвала рукаў.

— Гадасць вы! — сказала яна і пабегла да Вольгі Сцяпанаўны зашываць блузку.

У той час, калі адбываўся абрад «паганскай веры», людзі сур'ёзныя і салідныя, як Скаромны, старшыня і дзяк Памахайлік, прыводзілі ў парадак прынесеныя Ёселем карты, адкідалі непатрэбныя, пачынаючы з двоек і канчаючы шасцёркамі, і пералічалі, ці ўсе карты ў калодах. Калі шум аціх, яны вылезлі з-за лавак і падышлі да стала.

— Ну, — сказаў Памахайлік, — будзем служыць набажэнства.

— Хто закладае банк? — спытаў сядзелец.

Звычайна, ніхто першым не называўся. Такі ўжо быў звычай у Панямоні. Наўперад трохі таргаваліся, рабілі выгляд, што нікому іграць у карты не хацелася, а хто проста казаў, што грошай няма. Канчалі-ж тым, што цягнулі карты. У каго аказвалася старшая масць, той і садзіўся банкаваць.

Трымаць банк выпала Базылю Трайчанскаму. Па-

вольна сеў ён на самым выгодным месцы за сталом, азірнуў кампанію, кіўнуўшы направа і налева, палажыў на стол два рублі «банку» і пачаў здаваць, пытаючыся, колькі хто бярэ карт. Потым узяў другую калоду, патасаваў яе на ўсе бакі і ўсімі спосабамі і даў аднаму з партнёраў зняць. Знімаць трэба было асцярожненька, каб, не дай божа, ніхто не падгледзеў карт. Пасля гэтага Базыль выкладаў дзве карты першага раду. Яны не аплачваліся і замяняліся другімі. Затым банкір патрабаваў ад партнёраў плату. Плацілі, хто колькі назначаў: 15, 20, 10, 40 капеек, у залежнасці ад велічыні банка. Банкір павінен палажыць пяць радоў: чатыры рады па дзве карты, а пяты рад — адну. Хто браў у другім радзе, той меў з банка ўдвойчы болей свае стаўкі, у трэцім — утройчы і г. д. У дзевятым радзе выкладалася толькі адна карта, і калі чыя карта брала ў гэтым радзе, той атрымліваў у дзевяць разоў болей свае стаўкі. Гэтая гульня называлася тэфтэлем або дзевятым валам і была ў пашане сярод панямонскіх інтэлігентаў.

Калі на стале зазвінелі грыўні, залатоўкі, саракоўкі і поўрублі, Садовіч ціха сказаў Лабановічу:

— Давай, брат, папрабуем. А ну-ж!

Лабановіч першы раз бачыў такую ўрачыстую, такую паважную гульню. Была спакуса выйграць, і самы працэс такой гульні быў цікавы, асабліва калі хто браў «дзевяты вал».

— Чорт яго, брат, ведае, — адказаў ён і ў тоне адказу чулася жаданне папрабаваць шчасця.

Лабановічу ўспомнілася Палессе, Цельшына. Як-бы са змроку глянулі вочы панны Ядвісі, і хваля нейкага болю кальнула ў сэрца. Жаль, крыўда адчуліся ў ім. Дзесь, у падсвядомасці, як-бы нейкі голас казаў, як неразумна, як брыдка траціць свой час у такіх забавах. А твары партнёраў, рэзка змененыя прагавітасцю да грошай, яшчэ больш павялічвалі непрыемнае адчуванне.

Садовіч падышоў да стала, узяў у банкіра тры карты, дастаў свой шчупленькі кашалёк і выняў тры грыўні. А Лабановіч некаторы час стаяў збоку, аддаўшыся сваім думкам аб тым, што так моцна жыло яшчэ ў яго сэрцы.

VI

Банкір толькі-толькі намерыўся выкладаць платны рад, як увайшла Тамара Аляксееўна. Яна зашыла рукаў і прывяла ў парадак прычоску. На губах яе красавала ўсё тая-ж усмешка.

— Тамара Аляксееўна, ці не ўгодна вам картачку? — запытаў банкір.

Тамара Аляксееўна здалёк працягнула руку.

— Пару.

Ёй зараз-жа далі месца за сталом, і яна села каля шчаслівага Садовіча. Заплаціла грошы, закурыла папяроску. Лабановіч хацеў падысці і папрасіць прабачэння. Яна-ж не падняла на яго вачэй, пасіху перагаварвалася з Садовічам і часамі смяялася кароткім смехам.

Не гуляў у карты і Зязюльскі. Ён спярша сядзеў здалёк і пыхкаў папяросаю, скручанаю з махоркі. А каб махорачны дым не біў у інтэлігенцкія насы, ён разганяў яго рукою, бо ўладары гэтых насоў звычайна заяўлялі пратэст. Так і цяпер Тарас Іванавіч, чмыхнуўшы носам, прамовіў, глянуўшы ў бок Зязюльскага:

— Ты, бацька-дубальтовік! Зноў засмуродзіў!

Зязюльскі шпурнуў сваю суслу-папяросу. Яна ўпала дзесь на лаўку і, як ракета, пырскнула іскрамі.

— Ты мне школу спаліш! — накінуўся зноў Шырокі.

Зязюльскі затаптаў папяросу, падышоў да стала і прыпыніўся за спінамі ігракоў. Калі банкір пачаў класці карты ў рады, на адзін момант стала ціха, як у магіле.

У другім радзе не вышла нічыя карта.

— Мост кладзе! [1] — сказаў Найдус і зірнуў на няверную Тамару Аляксееўну.

— Для банка гэта нядобры знак, — азваўся Базыль.

— Ёсць! — крыкнуў Карэнчык і выкінуў на стол чырвеннага ніжніка.

— Вярнуў сваю стаўку, — падаў голас Садовіч і таксама выкінуў карту.

Перад чацвёртым радам стан напружанасці ігракоў павысіўся.

— Мая! — сказала Тамара Аляксееўна і засмяялася.

---

[1] Класці мост — не даць платнай карты.

Банкір заплаціў грошы і паклаў другую карту чацвёртага раду.

— Мая! — яшчэ грамчэй заявіла Тамара Аляксееўна.

Шум адабрэння пранёсся сярод ігракоў.

— Ёй у каханні і ў картах шанцуе, — гаротна сказаў Найдус.

— Ну, ты так даеш, што зараз ігрaка страціш. Давай дзевяты рад, — загрымеў Тарас Іванавіч.

Напружанасць яшчэ ўзрасла.

Базыль асцярожненька пасунуў уніз дзевятую карту, зірнуў на яе край, уздыхнуў, кіўнуў галавою направа і налева, каб даведацца, чыя бярэ дзевяты рад. Прыемна ўсміхнуўшыся, ён ткнуў пальцам у карты Садовіча.

— Стары! — гукнуў Садовіч. — дзевяноста капеек зарабіў!

Тарас Іванавіч з шумам шпурнуў на стол карты.

— Прапёр шэсцьдзесят капеек, — прызнаўся Памахайлік.

— Скупы ты, Базыль, чалавек! — чмыхнуў сядзелец.

— У яго і снегу на каляды не дастанеш, — з дакорам прамовіў Шырокі.

— Не па-суседску робіш, Базыль, — упікнуў яго і старшыня.

Тамара Аляксееўна і Садовіч пахвалілі банкіра.

— Маладзец, Базыль!

— Вам заўсёды гатоў! — азваўся з прыемнаю ўсмешкаю Базыль. — Банк падвоіўся. — Банкір пачаў зноў тасаваць карты.

— Вось шанцуе — як няхрышчанаму: з першай кідкі банк падвоіў, — з зайздрасцю сказаў Памахайлік.

Партнёры тым часам зноў палезлі ў кішэні.

— Што-ж ты, мілачка, так сядзіш? — запытаў Зязюльскі Лабановіча. — Вазьмі картачку. Па пятачку. Многа не прайграеш і не выйграеш, а час правядзеш з прыемнасцю... Дай папяросу.

Лабановіч і сам памыкаўся папрабаваць — вельмі было спакусна і цікава.

— Дай нам пару картачак, — сказаў Зязюльскі да банкіра.

— Калі ласка.

— Добрыя карты! — шапнуў Зязюльскі, глянуўшы на званковую дзевятку і на храстовага караля. Ён прыняў самы жывы ўдзел у новай ролі Лабановіча. — Пастаў на дзевятку дзесяць капеек, а на караля — пяць... Стой, я яшчэ прымажу пяць капеек на дзевятку. — Зязюльскі пашукаў па кішэнях і выцягнуў мядзяк. — Стаў смела!

Іграні ўваходзілі ў большы азарт. У банку было даволі многа грошай. Хто прайграў, таму хацелася адыгрицца і яшчэ зарабіць, а хто выйграў, таму хацелася выйгрыш свой павялічыць. І грошы ямчэй і часцей звінелі на стале, плывучы ў банк.

Карэнчык варажыў на пальцах: ніжнік — сямёрка, ніжнік — сямёрка. І стараўся пацэліць палец у палец, развёўшы ўбок рукі і робячы імі некалькі калаваротаў. І калі выходзіла, што пальцы стыкаліся пры слове «ніжнік», то на ніжніка і ставілася болей.

У Памахайліка быў другі спосаб варажбы. Ён клаў карты роўненька на край стала і стукаў у іх далонню: тая карта, што адлятала далей, цанілася вышэй.

Чараваў і Найдус, але яго чараўніцтва было асаблівага парадку. Тут было нешта задумана і загадана. Не адны толькі грошы прымаліся пад увагу: да яго прышла чырвенная дама, якая сімвалізавала сабою Тамару Аляксееўну. Найдус адлажыў даму і падсунуў пад яе цішком поўрубель, а потым, падумаўшы, палажыў зверху яшчэ грыўню і сказаў банкіру:

— На карце і пад картаю.

Банкір толькі галавою паківаў і стаў выкладаць рады, сказаўшы:

— Бярыце грошы.

— Рана вышла! — сказаў Памахайлік, выкідаючы на стол карту.

— Наша возьме! — падбадзёрваў Зязюльскі Лабановіча.

— Гані сюды! — крыкнуў Тарас Іванавіч і адвярнуў сваю карту, пад якою ляжаў рубель.

— Вот угадае паставіць, — здзівіўся банкір, адлічаючы тры рублі.

— Я-ж табе чатыры прасадзіў.

У чацвёрым радзе ўзяў кароль Лабановіча па пяць капеек. На смех паднялі, а Зязюльскі сказаў:

— Мы яшчэ дзевяты рад возьмем. Пяць капеек зарабіў — і то добра.

З заміраннем сэрца ўсе чакалі дзевятага валу. Банкір паглядзеў у бок Тараса Іванавіча і Найдуса.

— Не даць-бы ім.

— Нам давай! — крычаў Зязюльскі.

— А ў вас што?

Лабановіч паказаў дзевятку.

— Ваша! — радасна крыкнуў Базыль.

— А што?

І Зязюльскі пачаў штурхаць локцем Лабановіча, а іграці кінулі злосна карты.

Бедны Найдус хацеў непрыметна забраць поўрубля з-пад дамы, але банкір сачыў пільна.

— Гані! Гані! — І забраў поўрубель і грыўню.

Тарас Іванавіч пацікавіўся картаю, як ні хацеў Найдус выдаваць свае таямніцы.

— Ха-ха-ха! — рагатаў Шырокі: — Тамара Аляксееўна, нашто вы падвялі Найдуса? — І паказаў ёй чырвенную даму.

— Стукаю! — крычаў банкір, — праменад!

Гэта значыла, што банк патроіўся і будзе апошняя здача карт.

— Прапёр, брат, выйгрыш і сваіх пяцьдзесят капеек, — тужліва прызнаўся Садовіч прыяцелю. — Пушчу яшчэ рубель і квіта... Ты, брат, маладзец — дзевяты вал узяў.

— А і ты-ж узяў.

— Я яшчэ вазьму, — храбрыўся Садовіч.

Базыль раздаў карты. Банк яго рос. Найдус пачырванеў, — відаць, высокія меркаваў стаўкі. А Зязюльскі тым часам даваў дарады Лабановічу, як якую паставіць карту. Паставілі ўвесь папярэдні выйгрыш. Садовіч таксама павялічыў стаўку і заміж рубля паставіў два. Тамара Аляксееўна была зусім спакойная, але чараўнічая ўсмешка збегла з яе губ. Цяпер толькі гульня перайшла ў найвышэйшую ступень напружанасці.

Трывожна акінуў Базыль вачамі поле сваіх праціўнікаў. У банку было рублёў дваццаць. Хацелася захаваць гэты банк, зняць як можна больш. А іграці прагавітымі

поглядамі акідалі кучу грошай, кожнаму хацелася як найбольш выцягнуць адтуль.

Банкір аж закурыў. Яму шчасціла. Нават дзевятага раду нікому не даў. Вылажыўшы апошнюю карту, банкір пазбіраў «мазы» з-пад карт і абедзвюма рукамі пасунуў да сябе грошы.

— Набраўся, як жаба гразі! — з зайздрасцю прамовіў Найдус, хоць ён трохі «адбіўся» за гэты раз.

Лабановіч спусціў свой выйгрыш, але Зязюльскі паддаваў яму духу.

— Выйграем яшчэ! Ты толькі мяне слухай.

Садовіч ціхенька падышоў да Тараса Іванавіча і напомніў яму аб трох рублях доўгу.

— Браток ты мой родненькі! Я-ж голы астаўся: сем рублёў прасадзіў!.. Пачакай трохі.

Калі на першы банк банкіраў не знаходзілася, то цяпер іх выскачыла адразу цэлых тры.

— Я дзяржу банк! — загарланіў Памахайлік.

— Банк стаўлю я! — замітусіўся старшыня.

— Шыш аднаму і другому, — грымнуў Тарас Іванавіч і схапіў карты, расчышчаючы месца за сталом.

— Я першы сказаў!

— Паставіш яшчэ, чорт цябе не возьме! — сказаў Шырокі і палажыў на стол тры рублі.

Скрыва глянуў Памахайлік.

— Гэта чорт ведае што! З рук вырываць карты!.. Бочка, — дадаў ён, панізіўшы голас.

— Заткніся, кадзіла... добрасмярдзючае! — Тарас Іванавіч павярнуўся да Памахайліка, акінуў яго грозным вокам.

— Ціха вы, усе нагуляецеся, — лагодненька сказаў да іх Зязюльскі.

Шырокі пачаў раздаваць карты.

— Табе колькі даць, масла ты лампаднае? — спытаў ён Памахайліка ўжо тонам згоды.

— Не хачу на твой банк карты браць.

Памахайлік сядзеў надзьмуты.

— Каяцца будзеш: карты бяручыя.

— Ну, давай.

Злосць у Памахайліка прайшла.

— Піва, горла прамачыць!

— Базыль, пасылай па піва!

Базыль не спрачаецца. Ён нічога не мае супраць піва і адлічвае грошы на тузін бутэлек, бо ён-жа выйграў.

На сцэну выходзіць Есель, знікае, а праз нядоўгі час тарабаніць поўны кош піва.

Банк Тараса Іванавіча цягнецца доўга. Грошы прыходзяць і выходзяць. Садовіч некалькі разоў даведваецца ў кішэні. Зязюльскі дыпламатычна адышоў ад свайго вучня, бо «настаўніцкія» парады аказваюцца марнымі.

— Ну што? — пытае Садовіч прыяцеля.

— Кепска, брат, — трасе галавою Лабановіч.

Яны адыходзяць ад стала, п'юць піва. Выгляд у іх далёка не геройскі.

— Ведаеш, брат, дзесяць рублёў прапёр... У цябе ёсць грошы? — пытае Садовіч.

— Слаба, брат.

Выпіваюць яшчэ.

Піва шаломіць стомленыя галовы, робіцца трохі весялей. У вачах стаяць фігуры карт, у вушах грошы звіняць, а там, дзесь у нутрах-глыбінях, штось ные, баліць і снуюць неспакойныя думкі. А голас спакусы шэпча — яшчэ ўсё можна паправіць, вярнуць свае грошы...

— Эх, вярнуць-бы свае грошы!

Садовіч дыміць папяросаю. Лабановіч прыглядаецца да ігракоў. Нялюдскія цяпер у іх твары: драпежніцкія, прагавітыя, закураныя пылам і дымам. Твар у Тамары Аляксееўны асунуўся, яна як-бы пастарэла. Лабановіч думае, рысуе ў думках сваіх вобраз яе ў старасці... Праціўна.

За сталом шум, лаянка.

— Праменад! — грыміць Тарас Іванавіч.

— Пазыч мне рубель, — кажа Садовіч.

— Ведаеш, брат, што, — адзываецца Лабановіч, — давай цішком, як пабітыя сабакі, пойдзем дадому.

— Я чую, што адыграюся. Пазыч рубель. Папрабуем яшчэ.

Яны ідуць да стала, бяруць карты. І ў самы ўрачысты

момант апошняй раздачы адчыняюцца дзверы. На парозе спыняецца новая фігура, знімае заношаны капялюш, кланяецца, і па ўсіх кутках класа разліваецца насмешлівы голас:

— Добры вечар, героі зялёнага поля!

VII

Тутэйшым «інтэлігентам» чалавек, што стаяў цяпер каля парога, быў добра знаёмы. Яго з'яўленне нікога не здзівіла. На яго прывітанне ніхто не азваўся, бо ўсе былі ў гарачцы апошняй здачы карт. Новым ён быў толькі для маладых настаўнікаў. Няясная ў змроку постаць яго выплыла на сярэдзіну класа, дзе было светла.

Лысы, лоб круты, маршчыністы. Сам сутулаваты, прысадзісты. Адзеты бедна, але па-інтэлігенцку. Зверху цёмная, па канцах рыжаватая барада яго пачыналася ледзь не ад самых вачэй. Бровы навіслыя, густыя. Твар пануры і часта мяняецца. Вочы неспакойныя, часамі глядзяць нейк дзіка, і іх выраз таксама змяняецца часта. З вушэй тырчаць цэлыя кусты густых валасоў. Гаворыць чотка, выразна, гладка, нават красамоўна. У некаторых пунктах размовы звонка б'е далонню аб далонь. На выгляд яму гадоў пад пяцьдзесят. Гэта быў ні хто іншы, як «рэдактар». Сапраўднае-ж прозвішча яго было Бухберг.

Рэдактар таксама быў настаўнікам. У яго вышлі нелады з народам Іеговы, сынам якога ён быў, і школу прышлося пакінуць. Ён рэзка нападаў на звычкі свайго народа, жорстка высмейваў яго забабоны і, як той старажытны біблейны прарок, бічаваў яго акасцянеласць і кансерватызм. Праціўнікі называлі яго «місюгінэ», што значыць вар'ят, і хацелі пабіць каменнямі. Была раз рукапашная стычка з імі, але ён паразмятаў іх сілаю і крэпасцю кулакоў сваіх.

Ніхто не даваў яму дапамогі, і рэдактару прыходзілася вельмі цяжка. Але ён гнуў сваю лінію і ні на якія кампрамісы не ішоў. Ён быў дапісчыкам правінцыяльнай газеты і выкрываў «язвы на грамадскім целе». Але рэ-

дактар не здавольваўся роляю дапісчыка. У галаве яго было многа ўсякіх ідэй. Адна такая ідэя — прыступіць да выдання панямонскай газеты. Ён развіваў і прапагандаваў гэтую ідэю сярод панямонскай інтэлігенцыі. Але словы яго падалі на камяністы грунт і засыхалі, не даўшы прорасці, бо ніхто на іх не адгукнуўся. Тады рэдактар махнуў на ўсіх рукою і ўзяўся за газету сам адзін. Яго газета называлася «Панямонскія ведамасці». Уся яна ад пачатку да канца складалася самім рэдактарам. Газета выходзіла раз у два тыдні. Тыраж яе быў ад 10 да 15 экземпляраў. Рассылалася яна не па пошце: сам рэдактар прыносіў яе на кватэры сваіх падпісчыкаў у рукапісным выглядзе. Цана нумара значылася: 10 кап.

Досыць дзіўныя былі адносіны паміж рэдактарам і падпісчыкамі: падпісчыкі пабойваліся рэдактара, а рэдактар пабойваўся падпісчыкаў, каб яны часамі не адмовіліся купляць яго газету. Рэдактару прыходзілася ламаць галаву, хітрыць, пускацца на ўсякія выдумкі, выбіраць жанр і форму ў дастасаванні да панямонскага жыцця і да характару саміх панямонцаў.

Рэдактара часта можна было бачыць у розных кутках Панямоні. Хадзіў ён сур'ёзны, задумлены, да ўсяго прыглядаўся, прыслухоўваўся і часамі нешта запісваў у сваю патрэпаную кніжачку, прасякнутую потам.

Рэдактар спыніўся каля стала, шырока развёў рукі.

— Што я бачу! Змаганне на зялёным полі!.. О, людзі, людзі!! Як далёка адышліся вы ад законаў разумнага жыцця!

— Так, дружа рэдактару, жыццё — гэта адвечнае змаганне. І гора тым, хто будзе пераможан! — тонам філосафа адказаў Тарас Іванавіч. Ён нават не павярнуўся ў бок рэдактара і не ўсё чуў, што той сказаў: трэба было сачыць за платаю.

Памахайлік дадаў:

— У поце ліца твайго будзеш ты есці хлеб свой.

— Не трудзівыйся да не яст, — уставіў і сваю ўвагу Найдус.

А рэдактар як-бы не чуў нічога гэтага і казаў далей:

— Там, за гэтымі сценамі, вялікі дом прыроды. Столь яго — неба, расквечанае зорамі. Памост — зямля,

дзе чуецца дыханне травы і красак. Там прастор, якому няма граніц. Там кніга адвечнай мудрасці разгортвае свае таямніцы. Вы, у каго ёсць вушы, каб чуць, і вочы, каб бачыць! Ідзіце на прастор, разнііміце крылле мыслі, каб пазнаць парадак рэчаў і атрэсці фуз, бруд і пыл, бо імі заслеплены вочы вашы, бо вы замкнуліся ў цесныя сцены, вы прышлі ў катух, поўны смуроду, вы атруцілі яго сваім дыханнем.

— А сам рэдактар чаго прышоў у катух? — запытаўся Найдус, не зводзячы з карт вачэй.

— Дзівак, дзівак, а што-небудзь ды змарозіць наш рэдактар! — адгукнуўся сядзелец і пусціў смех у вусы.

І гэтыя словы рэдактар прапусціў між вушэй. Ён трагічна патрос лысаю галавою.

— Эх, людзі, людзі! Адзябелела сэрца ваша, і вушамі вы дрэнна чуеце. Як далёка, кажу вам, стаіце вы ад жыцця! І калі вы, соль зямлі, страцілі салёнасць, то што сказаць аб гэтых малых? Я бачу трупныя цені на вашых тварах. Рука прагавітасці кладзе на іх свае пячаці і выводзіць звера з глыбінь вашае істоты. Бяссонныя ночы запісваюць на іх доўг свой, і вы аддасце яго бясчаснаю старасцю і болем змучанага цела...

Рэдактар яшчэ гаварыў, але яго ніхто не слухаў. Да вушэй ігракоў далятали толькі словы, але не значэнне іх: звон срэбра і шолах бумажак глушыў іх. І да гэтага бічавання рэдактара панямонцы прывыклі, лічылі з'яваю звычайнаю, сам-жа рэдактар для іх быў чалавек, у якога «не ўсе дома». А для вуха Лабановіча гэтыя словы гучалі дакорам, чулася ў іх горкая праўда і захаваны сэнс.

Тарас Іванавіч уступіў месца Памахайліку. Ён вельмі ўдала патроіў банк, пасля чаго пайшоў піць піва.

Рэдактар змоўк. Вочы яго патухлі. Адвярнуўся ў другі бок, апусціў уніз вочы і задумаўся, а потым надзеў парыжэлы капялюш і вышаў, нічога не сказаўшы. У «Хроніцы панямонскага жыцця» трэба было зрабіць сякія-такія дадаткі. Ён пайшоў дамоў, у сваю цесную каморку, запаліў агарак свечкі і стаў пераглядаць сваю газету — надыходзіў тэрмін яе выхаду ў свет. Перад рэдактарам ляжаў рукапісны аркуш паперы. Буйнымі літарамі ўгары гэтага аркуша было напісана:

ПАНЯМОНСКІЯ ВЕДАМАСЦІ

Газета пачыналася з перадавіцы. Перадавіца памечана:

Панямонь, 10 мая.

Наша мястэчка — досыць значны цэнтр у валасці. Па перапісу 1897 года ў ім значыцца дзве тысячы восемсот сорак чалавек насельніцтва. Прымаючы пад увагу натуральны прырост, мы не зробім вялікае памылкі, калі скажам, што цяпер Панямонь мае тры з палавінаю тысячы насельніцтва. Між тым, у мястэчку ёсць толькі дзве пачатковыя школы: двухкласная міністэрская і аднакласная жаночая. Само сабою зразумела, што гэтыя школы не могуць, далёка не могуць абслугоўваць інтарэсы насельніцтва ў сэнсе задаваленння яго патрэб у адносінах асветы. Наспела пільная, неадкладная патрэба ў адчыненні новых школ у Панямоні.

Паўстае пытанне: якую-ж школу мы павінны прапагандаваць у Панямоні? Якая школа можа найболей адпавядаць патрэбам і інтарэсам мястэчка і валасці?

Рэдакцыя «Панямонскіх ведамасцей» бярэ на сябе смеласць заявіць і гэтым выказаць агульнае жаданне грамадзян Панямоні, што такою школаю можа быць толькі гімназія або прагімназія, але ва ўсякім разе не ніжэй прагімназіі.

Як паказваюць факты, ні ў якой іншай валасці не заўважаецца такога цягнення моладзі да навукі, як у панямонскай. Чым гэта тлумачыцца? Валасць наша малазямельная, зямля неўрадлівая. Стала быць, у аснове гэтай прагі моладзі да навукі ляжыць эканамічны фактар. Ну, фактары, разумеецца, могуць быць розныя: Довід Пінхалес таксама быў «фактарам», а цяпер ён адчыніў сваю краму... Але мы адхіляемся ад нашае тэмы. Куды-ж ідзе наша моладзь? Дзе знаходзіць яна задаваленне сваім імкненням, свайму жаданню? Шырокаю хваляю плыве яна ў настаўніцкія семінарыі, у гарадскія вучылішчы, плыве за дзесяткі і сотні вёрст пехатою, з лапцямі за плячамі, без капейкі ў кішэні. Але толькі нямногім шчасліўчыкам удаецца папасці ў гэтыя школы, пераважная-ж большасць маладых людзей застаецца за парогам школы.

Колькі гора, колькі трагедый перажывае наша сучасная моладзь! Адгэтуль і ясна, што наша Панямонь павінна мець школу павышанага тыпу, а такою школаю можа быць гімназія. Трэба даць ход нашай моладзі. Шырэй дарогу ў храм навукі! Няхай-жа закрасуе Панямонская гімназія!

ПА ВАЛАСЦІ

□ Нам паведамляюць, што ў засценку Пранукі былі ўжо два выпадкі пакражы коней у сялян. Паліцыя на чале з нашым бравым паважаным ураднікам Тупальскім прымае энергічныя меры да вылоўлівання зладзеяў. Да гэтага часу напасці на іх след не ўдалося.

□ Сяляне вёскі Красны Бераг ужо даўно судзяцца з адміністрацыяй князя Радзівіла за сервітутную пашу. Апошнія капейкі выцягваюць з іх розныя дамарослыя адвакаты, але толку з гэтага

няма. Акружны суд прысудзіў адабраць пашу ад сялян. Сяляне пераносяць справу ў судовую палату.

Не шкодзіла-б успомніць тут усім вядомую прыказку: «З багатым не судзіся».

□ Апошнімі днямі, у звязку з сухою пагодаю, пачалі гарэць Радзівілаўскія лясы.

□ Каталіцкае насельніцтва воласці, адміністрацыя князя Радзівіла, дробныя арандатары, а таксама і шляхта робяць захады да адчынення ў Панямоні касцёла, зачыненага з 1863 года. Як нам удалося даведацца, касцёл будзе адчынены; ужо назначаны ксёндз Кісля.

ПА МЯСТЭЧКУ

□ У Малкі Шулькінай пазаўчора адбыўся вобыск. Агенты акцызнага нагляду шукалі гарэлкі: быў зроблен данос, што Шулькіна трымае патайны шынок. Знойдзена поўбутэлькі гарэлкі, пяць засмажаных тараноў, хвост, рэбры і галава ад селядца. Напісан пратакол.

□ На Юр'еўскім кірмашы адбылася зацятая бойка паміж нашым панямонскім чэмпіёнам Петрусём Маргуном і сялянамі вёскі Чыхуны. Нягледзячы на тое, што перавага была на баку чыхуноўцаў, наш чэмпіён, выхапіўшы з цялежкі шворан, разагнаў іх, і поўная перамога засталася за нашым чэмпіёнам.

Як відаць, мы ўступаем у паласу мілітарызму: народ б'ецца шворнамі, а мозг гэтага народа, інтэлігенцыя, практыкуецца ў стратэгіі на «зялёным полі».

Ва ўсякім разе, начальству варта было-б звярнуць увагу на чэмпіёнаў шворна і «зялёнага поля» і выдаць ім медалі за храбрасць.

ТРОХІ ФАНТАСТЫКІ

Каля падножжа вапельнай гары, непадалёку ад могілак, час-ад-часу з'яўляюцца таемныя постаці маладой пары. Шмат каму з жыхароў здаралася сустракаць іх там вечарамі. Каваль Хаім быў напалохан імі і ад страху захварэў.

Цікава адзначыць, што ў той час, калі з'яўляюцца гэтыя постаці, хворыя панямонцы не могуць дастукацца на фельчарскі пункт, рыцына застаецца неспажытаю, а болі і хваробы нялечанымі.

Пакуль рэдактар дачытваў і папраўляў сваю газету, агарак свечкі пачынаў канаць. Белае полымя дрыгацела, хісталася, падымалася і ападала, і вось-вось, здавалася, пагасне. Раптам з неспадзяванаю сілаю яно зноў выбухала і зараз-жа ў знямозе нікла, як апошні прадсмертны ўздых.

Рэдактар перавёў вочы на агонь, пазіраў на апошнія моманты яго жыцця. І было штосьці трагічнае ў гэтым змаганні жыцця і смерці. Рэдактар пазіраў і трос гала-

вою. Не, не падняцца табе са дна жыцця: дайшлі да канца, спустошыліся твае жыццёвыя сокі. Кноцік упаў на стол, агонь зусім апаў, але затрымаўся на момант, падняўся, асвяціў яшчэ на адзін міг газету і знік, як-бы заліты гэтым варожым змрокам. І цесная каморка рэдактара, і двор за акном каморкі зліліся ў адну цёмнашэрую пляму, нямую, зацятую, не парушаную ніводным голасам жывога жыцця.

Рэдактар адчыніў акно, абапёр лысую галаву на рукі і доўга сядзеў нерухліва, і толькі калі на ўсходзе забялелася неба, ён уздыхнуў, зачыніў акно і лёг на сваю жорсткую пасцель.

VIII

Зямля яшчэ песцілася ў сонным змроку вясенняй ночы, а неба ледзь-ледзь пачынала святлець на ўсходзе зорамі, калі маладыя настаўнікі выходзілі з Панямоні. Змрок закрываў змучаныя, бледныя твары: дарога, бяссонныя ночы, згрызоты і няўдачы на «зялёным полі» адбілі на іх свае пячаці. З кампаніі сябры пашлі ціхачом, незаўважана, ні з кім не развітаўшыся, бо былі жорстка пабіты на ўсіх «тэфталеўскіх» пазіцыях, вышлі са строю поўнымі інвалідамі.

Спакойна, нават неспагадна сустрэлі сяброў маўклівыя панямонскія вуліцы і хаты на гэтых вуліцах, і толькі халодны пясок шуршэў пад іх нагамі няўцямнаю многазначнай гутаркай.

Некаторы час ішлі моўчкі. У іх кішэнях была пустэля, у галаве — малатарня, уваччу мітусіліся розныя фігуры карт, а на душы, як кажуць, кошкі скробалі.

— А няхай яно, брат, згарыць, — азваўся нарэшце Садовіч: — Не варта было заходзіць.

— Ну, нічога, брат, бывае і яшчэ горш, — тонам заспакаення адгукнуўся Лабановіч: што-ж было казаць? — Што прайшло, таго не вернеш, і няма тут чаго каяцца. Добра ўжо і тое, што хоць пачулі смурод мястачковага балота... Тфу, паскудства! Ну яго к чорту!

Відаць было, што ў Лабановіча не так спакойна на душы, як гэта ён хацеў паказаць.

— Ты памятаеш, Стары, як нам дыктаваў калісь Корзун: «Чист кругом я, лёгок и никому не нужен». Цяпер і мы з табою такія-ж чыстыя, лёгкія і нікому непатрэбныя.

Садовіч гучна засмяяўся. Гэты смех падхапілі прасторы панямонскіх выганаў, панеслі яго пад масты і перакінулі на той бок Нёмана.

— Усё гэта яшчэ нічога, Алесь. Нашы капіталы, што перайшлі сёння ў чужыя кішэні, не такія вялікія, каб аб іх вельмі многа гараваць. Але справа не ў гэтым: слізнякі мы, бязвольнікі, людзі без цвёрдага грунту. Вот дзе наша слабае месца! Мяне яно мучыць больш, чым паражэнне на «зялёным полі»... І вось-жа ведаеш, усведамляеш усё гэта і тым не меней робіш тое, ад чаго потым становішся праціўным сам сабе. Чаму гэта так?

— У чалавека многа такіх супярэчнасцей, — заўважыў Садовіч, — думаеш адно, а робіш другое. Ад гэтага і канфлікты вынікаюць з самім сабою.

— Ну, а скажы, Алесь: а каб мы з табой выйгралі — так рубельчыкаў па дваццаць, якое тады было-б самапачуванне?

— Го! — басам выгукнуў Алесь, — тады, брат, мы-б казырамі ішлі, чорт пабяры! Нават каб нічога не выйгралі і не прайгралі, і тады быў-бы іншы каленкор.

— Значыць, тут усё залежыць ад вынікаў гульні. І стала быць, калі-б шанцавала ў карты, то гуляў-бы і гуляў, і ніякага там табе ні самааналізу, ні згрызот і наогул ніякага чорта... Дык гэта, брат, ужо швах справа!

Садовіч хацеў нешта сказаць, але ўвага яго звярнулася на штось іншае. А можа, проста гаварыць аб гэтым не хацелася. Ён раптам спыніўся, набраў духу і, моцна падаўшы наперад грудзі, загукаў старанна, разлічана, у двух тонах, нават з замахам на некаторую музычнасць:

— Э-э-э-вуу!

Росны луг страсянуўся вільготным паветрам, падхапіў гэтае «э-ву», панёс яго ў лес, што стаяў досыць далёка за Нёманам. Краем лесу паляцела задорыстае водгулле, прыціхла, а потым павярнула назад, бегучы другім крылом лесу, і нарэшце зусім заціхла на яго заломе.

— Хораша выходзіць! — забыўшы ўсё на свеце, за-

хоплены гулкасцю і выразнасцю водгулля, прамовіў Садовіч і гукнуў яшчэ раз.

— А ну, давай гукнем разам!

Некалькі разоў гукнулі разам і слухалі, як разлягалася рэха і будзіла ранічны спакой маўклівых вакаліц.

— Вось дзе, брат, хараство! Прастор! А якое здаровае паветра! Ну, проста як-бы на свет нарадзіўся. Чуеш, як жыццё крыніцаю б'ецца ў кожнай тваёй жыле! — яшчэ ў большае захапленне прыходзіў Садовіч.

Мінуўшы масты, сябры павярнулі направа. Разуліся, бо дарога забірала ў лугі, а побач яе стаяла высокая росная трава. Басанож патрапалі далей, пахвальваючы і дарогу, і расу, і гэтую прыемнасць ступаць босымі нагамі па мяккай дарозе, і свежае ранічнае паветра.

Чым далей адыходзілі яны ад Панямоні, тым спакайней рабілася ў іх на сэрцы, тым з большаю сілаю паддаваліся яны чарам дарогі і яе малюнкаў. Адзін край лугу стыкаўся з лесам, уразаўся ў яго, адхопліваючы дугаватыя лукі і павялічваючы свае травяністыя прасторы. І ўдоўж і ўпоперак луг перасякаўся вузкімі, доўгімі і глыбокімі тонямі, заросшымі аерам, сітняком, чаротамі і мяккімі ніцымі лозамі, дзе хаваліся розныя лугавыя птушкі. Срэбнаю стужкаю вывіваўся Нёман, то падыходзячы пад самы лес, падразаючы карэнне дрэвам, то бегучы сярэдзінаю лугу, то падступаючы да поля, апраразваючы бліскучым жывым паскам яго пясчаныя схілы. Сям-там па лугавых грудах раскідаліся бародкі-кудзеркі астраўкоў, дзе буяў малады, сакавіты дубняк, кусты арэшніку, брызгліны, чаромхі і крушыны, а самая пошзь засцілалася мяккаю лугавою канапелькаю, што зацвітае летам такімі прыгожымі сіненькімі кветачкамі...

Эх, як прывольны прасторы наднямонскіх лугоў! Часамі над прасторамі зялёнага мора, як вартаўнікі, узнімаліся пышныя постаці адзінокіх дрэў, пераважна дубоў, параскіданых дзе-ні-дзе сярод лугу, а месцамі і цэлыя дубовыя гаі. Многа тут для іх прастору і сонца. Ёсць дзе разгарнуцца іх магутным карэнням, камлям і галінам.

Між гэтых дрэў асабліва кідалася ў вочы падарожнага старадрэвіна-хвоя, што стаяла зусім адна на высокім

грудзе непадалёку ад Нёмана. Тоўсты, гладкі, бы вытачаны, камель з карою накшталт адмысловай чарапіцы высока ўзнімаў верхавіну, заламаўшы яе набок пад простым вуглом; на гэтым заломе змайстраваў сабе бусел доўгавечнае гняздо. Ад усяе адзінокае хвоі, ад гэтай пахіленай у бок лесу верхавіны павявала нейкім смуткам, як-бы ўзлажыла яна цяжар на свае плечы і схіліла пад ім галаву.

У лузе было пуста і бязлюдна. Адны толькі драчы не ведалі супачынку і не шкадавалі горла. Адзін перад другім, схаваўшыся ў траве, дзерлі яны свае аднагучныя скрыпучыя песні, як-бы ўвесь сэнс іх жыцця складаўся з таго, каб перакрычаць адзін другога.

— Драч-драч! Драч-драч! — і так без канца, і так без адпачынку.

Пачынала развідняцца.

Прыбярэжныя кусты ўсё больш і больш вырысоўваліся, выплывалі з ранічнага змроку, святлелі, развясельваліся, і шырэй разгортваліся прыгожыя краявіды, поўныя радаснага спакою і маўклівага задумення.

Дарога павярнула ўлева, пайшла грудамі, шчыльней тулячыся да Нёмана, дзе ён апісваў вельмі зграбную луку, падыходзячы да лесу. Уся гэта лука выглядала пышным старасвецкім садам, дзе замест пладовых дрэў раслі разложыстыя, дуплястыя, з асмаленымі жараламі дубы, убраныя чорнымі шапкамі буславых гнёздаў. Часамі гэтыя гнёзды, зацісиутыя ў развіліны стромкіх аголеных шпянёў, высока ўзнятых над зялёнаю каронаю дуба, што пачынаў сохнуць зверху, здаваліся нейкімі дзіўнымі падвескамі над дубамі, бо самыя шпяні скрадваліся адлегласцю і губляліся ў празрыстых хвалях паветра.

Не даходзячы да лукі, выгнуўшыся яшчэ раз каля лесу вельмі прыгожаю дугою, Нёман забіраў управа, пралёгшы роўнаю, бліскучаю стужкаю паміж лугамі і полем. На адным канцы дугі стаялі кучаравыя пышныя хвоі, звесіўшы над вадою махрыстыя галіны і аплёўшы пясчаны бераг цэлаю сеткаю смаляных карэнняў. За імі пачыналіся маладыя сакавітыя баравіны, перамешаныя са старым лесам. Там-сям з зялёнага мора маладога хвойніку высока ўзнімаліся парасоны-верхавіны хвой-старадрэвін, што як-бы аглядалі зялёныя прасторы свае маладое зме-

ны, цешачыся яе размахам і сакавітаю жыццёвасцю. І гэты малады хвойнік, і гэты лес, і гэтыя хвоі зліваліся ў адну сцяну лесу, вырысоўваючы прыгожую вычварную лінію паваротаў, разгортваючы сваё цёмназялёнае крыло і ахватваючы пясчанае поле, дзе раскінуліся маўклівыя пагоркі. А над усім над гэтым ляжала цішыня і спакой раніцы.

— Стой, брат Алесь, — спыніўся Лабановіч, захоплены спакоем раніцы і харастаом таго, што было навакола. — Ты паглядзі, што за слаўнота!

Лабановіч паказаў рукою на ўсход, дзе скрозь проразі далёкага лесу прасвечваўся пазалочаны край неба, абмыты майскімі росамі, і разгорваліся цэлыя панарамы ўзгоркаў.

— Эх, што за мясціна! — пачаў ён і раптам перапыніў самога сябе. — Слухай, брат, слухай.

Над ускрайкам лесу, дзе пачыналіся жоўтыя пяскі, зазвінела песня ляснога жаваранка. Ён першы тут вітаў надыход дня, і песня расплывалася ў маўклівым паветры звонам тонкага дарагога металу, напаўняючы яснасінія разлогі надзем'я і глыбокую цішыню зямлі, агорнутай затоена-радаснаю задумлёнасцю. Здавалася, усё навокала занямела, зачараванае цудоўнымі тонамі песні гэтага вольнага песняра ўзлескаў і пясчаных пустак між лесу. Снуючыся высока ў небе, раняла птушка мяккія, ласкавыя мелодыі, сатканыя са звону срэбраных струн, з булькання лясных ручайкоў, з зумкання пчаліных крыльцаў, шолаху красак. І ўсе гэтыя тоны спляталіся так гарманічна-своеасабліва ў песні ляснога жаваранка, што яна даходзіла да самых затоеных глыбінь сэрца і калыхала самыя тонкія струны душы.

Ніякая іншая птушка, нават праслаўлены салавей, не можа параўнацца ў спевах з лясным жаваранкам. Толькі свае песні спявае ён у бязлюдных мясцінах, дзе рэдка бывае чалавек, і мала хто чуе іх. Мелодыя-ж спеваў надзвычайна багатая, рознастайная, дзівосна прыгожая і такая чоткая, такая выразная, што яе можна палажыць на ноты, а мастак-музыка, напэўна, змог-бы выканаць на скрыпцы, але афарбоўкі яе тонаў не патрапіць перадаць ніякі музычны інструмент.

Лабановіч стаяў і слухаў, як прычараваны, гэты

смутна-радасны гімн раніцы, што нейкім дзіўным водгуллем адбіваўся ў яго сэрцы. Здавалася, што ён ужо калісь перажываў тое самае, што звінела цяпер у душы, толькі ніяк не мог прыпомніць, калі гэта было. Ці гэта яму толькі снілася?

— З-за аднае такое раніцы варта не паспаць яшчэ адну ноч, — азваўся, нарэшце, ён і зірнуў на Садовіча, бо той ужо цягнуў яго за рукаў і некалькі разоў казаў:

— Пойдзем, брат.

І яны пайшлі.

У двух вярстах перад імі раскінулася іх роднае сяло Мікуцічы.

— Выспімся, брат Стары, пасля ўсіх гэтых згрызот, адпачнем, і тады будзем думаць — як і што.

— Не ўспамінай ты пра іх. Усё гэта трынь-трава. Мала што было — і гэта трэба перажыць. Для мяне ўся гэтая панямоншчына — проста як нейкі паскудны сон.

Чым бліжэй падыходзілі яны да Мікуціч, тым з большаю ўладаю апаноўвалі іх думкі і настроі свайго сяла, і кожны па-свойму перажываў іх.

— Ведаеш, брат, што: застануся я тут за настаўніка. Што ты на гэта скажаш, Стары?

— Чаму-ж табе так захацелася тут быць?

— Сваё, ведаеш, сяло, свае людзі. Буду працаваць для сваіх.

— А я на тваім месцы не застаўся-б тут, — заўважыў Лабановіч.

— Чаму?

— Ды так, — мне тут нецікава. Усё даўно табе знаёма. А я люблю пабыць на новых мясцінах, сярод новых людзей.

— Не, брат Стары, тут і танней пражыць можна. Будзеш сабе сталавацца ў бацькі, можна і капейку прыхаваць. І ціха, спакусы няма, а я хачу сур'ёзна ўзяцца за навуку.

— Няўжо мы, Алесь, такія бязвольныя, што гэтых спакус не можам здолець? Бо гэта-ж ёсць прызнанне свайго бяссілля, раз ты баішся спакусы.

— А начорта змагацца з імі, калі гэтага можна ўнікнуць? Змаганне, ды яшчэ з няпэўным вынікам, патрабуе траты, непатрэбнай траты энергіі і будзе заўсёды за-

мінаць той ці іншай рабоце над сабою. А тут, у нашых Мікуцічах, нікога няма, хто пацягне цябе на карты, на п'янства... Не, брат, гэта ідэя! А месца тут якраз звальняецца. Падам прашэнне — і квіт.

— Ну, разумеецца, і тут будзеш жыць. Усё гэта справа густу, — тонам згоды адказаў Лабановіч, бо спрачацца не хацелася. — Можа, ты і маеш рацыю. А калі ў цябе ёсць яшчэ і ахвота жыць тут, тым лепей. Хоць мець будзем летам штаб-кватэру.

Садовіч быў хлопец гарачы, борзда захапляўся новымі мыслямі і планамі.

— Ведаеш, брат, сур'ёзна: давай, каб не траціць часу, зоймемся падгатоўкаю. Да нас прыстануць яшчэ хлопцы... А то ведаеш? Зберамося чалавек пяць-шэсць, зложымся ды наймем яшчэ студыёзуса... Што скажаш на гэта?

— Трэба абмеркаваць, можа тваімі вуснамі прамудрасць глаголе.

Садовіч захапіўся новаю ідэяю і ўсю рэшту дарогі гаварыў аб ёй з высокім пафасам.

IX

Не даходзячы трохі да сяла, прыяцелі развіталіся. Садовіч пайшоў далей адзін, а Лабановіч звярнуў з дарогі і накіраваўся на маленькі хутарок, што стаяў адзінока ў полі недалёка ад Нёмана. Тут жылі яго родныя.

Хутарок быў пабудаваны нядаўна на арандаванай скарбовай зямлі. Тры гады назад выгаралі Мікуцічы, і тады дзядзька Марцін надумаўся пабудавацца тут, дзе было прастарней і спакайней. За гэты час хутарок не паспеў яшчэ абсталявацца належным парадкам і меў досыць убогі і пустэльны выгляд, бо нават не было ніводнага дрэўца каля хаткі, хоць ямкі для іх і пакапаў дзядзька Марцін.

Сотнямі знаёмых вачэй зірнуў хутарок на Лабановіча, зірнуў, здавалася, дакорліва, бо ён, Лабановіч, забыўся аб гэтай беднасці, аб гэтай пустэчы, заняты сабою, сваімі мыслямі, сваім замкнута асабістым жыццём,

хоць яшчэ летась меркавалі яны з дзядзькам Марцінам аб тым, каб завесці тут садок, а ў садку — пчольнік. Успомніліся такія-ж звароты дадому, калі вучыўся ў семінарыі, і мімаволі адчуў ён, што адразу папаў у самы асяродак дамашняга клопату, скаргі на цяжкае жыццё, на беднасць. Радасць спаткання з роднымі астуджалася гэтымі адчуваннямі, што былі прыглухлі за час побыту па-за межамі роднага кутка, саступіўшы месца другім. І тут нейк сама сабою ўспомнілася Панямонь і марная страта грошай, праўда, невялікіх, але ў такой бядоце яны мелі-б значную сілу. А гэта ўсё разам яшчэ больш памацняла апалы настрой маладога настаўніка.

На хутарку дзень толькі што пачынаўся. Вароты ў гумне былі адчынены і адтуль даносілася прагавіта-заядлае «хрум-хрум! хрум-хрум». Гэта дзядзька Марцін рэзаў сечку на саматужнай сячкарні, — відаць, збіраўся ехаць араць папар.

Першы заўважыў Лабановіча сабака Шукай. Сарваўшыся з месца і кінуўшыся са злымі намерамі, пачаўшы сваё сабачае прывітанне моцным гаўканнем, якое звычайна накіроўваецца на незнаёмага чалавека, ён раптам зарваў злосны брэх, прыпыніўся на момант, каб лепей паўглядацца, завіляў хвастом і з радасным піскам кінуўся сустракаць госця. Спатканне з аднаго і з другога боку было самае шчырае. Шукай вішчаў, круціўся, скакаў, клаў свае лапы на грудзі Лабановіча, стараючыся лізнуць у губы, што яму, нарэшце, і ўдалося і яшчэ больш павялічыла яго сабачую радасць.

Дзядзька Марцін кінуў рэзаць сечку і вышаў на прыгумень: па тону вішчання ён дагадаўся, што свой чалавек вітае на хутар. Угледзеўшы пляменніка, якога Марцін вельмі любіў, ён засвяціўся радасцю і яшчэ загадзя расхіліў вусы, каб адвесці прастарнейшае месца пацалунку, шурпатаю далонню выцер губы і, стаўшы каля весніц, нарыхтаваўся як належыць спаткаць госця.

— Ну, здароў, Андрэй!

Дзядзька і пляменнік моцна абняліся.

— На ўсё лета прыехалі? — запытаўся Марцін, зварачаючыся да пляменніка часамі на «вы».

— На ўсё лета... Ну, як здаровы і што ў вас добрага?

— Нічога, брат, жывем патрохі.

— Чамадан свой я пакінуў на вакзале, а сам пехатою пайшоў. Якраз з Алесем Садовічам на станцыі з'ехаліся і разам дадому ішлі, — як-бы апраўдваўся Лабановіч за свой «парожні» выгляд.

Маці ў гэты час дадойвала ў хляве карову. Яна адразу была падумала, што гэта іх Андрэй прыехаў на лета, бо і сон такі прысніўся ёй сёння. Яна спяшалася як мага хутчэй дадаіць, і ў той час, калі дзядзька Марцін на той бок веснічак вітаўся з пляменнікам, вышла з даёнкаю і, прыкрыўшы яе хвартухом, борздзенька пайшла ў сенцы і зараз-жа вярнулася, каб павітацца з сынам.

— Сынок мой!.. Вярнуўся!

Лабановіч пацалаваў ёй руку.

— А я даю карову, чую — Шукай забрахаў і адразу сціх, вішчаць пачаў. Дык мне і цюкнула, што гэта напэўна ты...

Маці з некаторымі падрабязнасцямі апісала сваё адчуванне, што было незадоўга перад гэтым, і нават сон расказала, ідучы ў хату разам з дзядзькам Марцінам і Андрэем. На парозе сустрэліся з Юзікам, меншым братам Лабановічавым. Юзік быў адзеты пастухом, з пугаю і торбаю. Ён ішоў выганяць у поле каровы на раніцу.

— Здароў, Юзік! — павітаўся з ім старэйшы брат.

Юзік толькі ўсміхнуўся, павярнуўшы ў бок брата смуглы твар і паказаўшы рад белых зубоў. Нібы трохі засаромеўся.

— Выганяй, выганяй, брат, быдла, — заўважыў дзядзька Марцін: — Сонца, унь, ужо высока над лесам стаіць.

Хата была яшчэ не прыбрана, і ўсе там паўставалі.

— У самы бярлог ты, сынок, папаў, — казала маці, як-бы просячы гэтым прабачэння ў сына.

— Ды яшчэ-ж і рана, — азваўся Лабановіч.

— Спаць папрывыкалі доўга, — досыць строга прамовіў Марцін і кінуў погляд у той куток, дзе ляжалі ў пасцелях яго пляменніцы, Маня і Насця. — Параспешчвала іх маці: такія, пане мой, дзявухі!

Мані было ўжо гадоў шаснаццаць, а Насця гады на два малодшая.

— Ім-жа так хочацца паспаць, — заступілася за дачок маці. — Маладзенькія яшчэ, напрацуюцца за свой век.

Ганна, маці Лабановіча, была жанчына добрая, працавітая, руплівая, усё старалася зрабіць сама, за ўсіх заступалася. Яна не раз плакала, будзячы Юзіка гнаць каровы, бо таму так хацелася паспаць. Хоць адну лішнюю хвілінку старалася яна прыбавіць на яго салодкі ранічны сон, а калі хлопец уставаў, стаяла пры ім, памагала сабрацца і рабіла ўсё, што толькі можна, каб улагодзіць сына.

— Змоладу трэба ў работу ўцягвацца, — стаяў на сваім Марцін, — бо як вырастуць гультаямі, то дзякуй не скажуць табе за гэта.

Сказаўшы так, ён падышоў да пасцелі. Накрыўшыся з галавою коўдрай, спаў самы меншы пляменнік Якуб, найлепшы дзядзькаў прыяцель. Нахіліўся да яго дзядзька і стаў шаптаць штось на вуха. Якуб нешта буркнуў, а Марцін зарагатаў самым шчырым смехам, пасля чаго сказаў:

— Якуб у мяне — чалавек. Гэта не Юзік. Таго трэба з музыкаю падымаць, а Якуб, як слова прамовіць, падымаецца, калі трэба. Гэта — першы гаспадар у доме.

Пахвалены Якуб — яму было гадоў шэсць — паказаў галоўку з-пад коўдры, бліснуў на брата цёмнымі вочкамі, усміхнуўся ды зноў схаваўся.

— Мама! Ідзі сюды, — паклікаў ён матку.

Хлопцу трэба была нейкая адзежына, бо ён надумаўся ўставаць, каб апраўдаць сваю гаспадарчую рэпутацыю.

А дзядзька Марцін расказаў гэтым часам, як Якуб шукаў чарвякоў, збіраючыся вудзіць рыбу, адварочваў гнілякі, і калі пад імі чарвякоў не было, сам сабе казаў:

— Тут тожа няма.

Здарэнне, здавалася-б, зусім мала выдатнае, але Марціну яно чамусь падабалася, а гэтае «тут тожа няма» выклікала ў яго кожны раз вясёлы смех.

Дзядзька Марцін быў яшчэ не стары чалавек. Зранку да самага вечара не выпускаў ён работы з рук. То на полі, то каля дому ўвіхаўся. А ў часіны больш-менш вольныя займаўся майстэрствам, што мела беспасрэдныя ад-

носіны да спраў гаспадарскіх: то калёсы ладзіў, то саху правіў, у хляве ці ў гумне парадак рабіў, або ў хаце ці ў сенцах усякія рыштункі штукаваў. Проста што-небудзь выдумляў для большага парадку ў гаспадарстве. Кароткія перапынкі паміж работаю выкарыстоўваў Марцін для спраў рыбацкіх, балазе Нёман быў, як кажуць, пад самым бокам. А рыбацкая снасць — сетка, нераткі, вуды — была ў яго адмысловая. У грыбныя часы, калі задажджыцца і работа спыніцца на полі, дзядзька Марцін браў каробку і хоць выхадзіць палавіну дня, затое-ж прынясе такіх баравікоў, што хоць вязі на выстаўку.

— Ну, браце, супачынь з дарогі. Я табе і палаткі ў гумне змайстраваў, — сказаў дзядзька да госця, — а я паеду паару трохі, думаем грэчку пад Клінамі засеяць.

Дзядзька Марцін паехаў араць, а Лабановіч некаторы час сядзеў і слухаў навіны дамашняга жыцця. Навіны-ж гэтыя нельга сказаць, каб былі вясёлыя. Наладзіць гаспадарку так цяжка. Зямля пустая, хоць і многа яе, параскідана «за светам», толькі тае карысці, што з шнура каля дома. І гэты кавалак пусты, але-ж яго хоць угнаіць можна. Арэндная-ж плата падвышана, а плаціць няма з чаго. Уладзя, старэйшы брат, вось ужо тры тыдні як на плыты пайшоў. А якія заработкі — плыты? Калі прынясе дзесяць рубельчыкаў, то і добра. А колькі нагаруецца, нацерпіцца! І з пашаю цесна, забаронена ўсюды, толькі дзе ступіць жывёла, зараз і штрафы плаці. Ну, словам, чым далей, тым горай. Наогул, нейк цяжэй стала жыць на свеце. А тут і дзяўчаты падрастаюць, адзенне ім трэба спраўляць.

Лабановічу цяжка было слухаць усё гэта. Ён заўважыў, што маці паблажэла за гэты час: клопату многа і жывецца нялёгка. А перад гэтым клопатам знікаў яго ўласны. У глыбі душы ён папікаў сябе за тое, што нічым яшчэ не дапамог дома. Праўда, і памагчы было трудна, бо пенсію меў невялікую, і за два апошнія месяцы ён і не браў яшчэ яе. Тут асвяціла яго думка — даць даручэнне знаёмаму крамніку Гэсалю, што ў Панямоні, на гэтую пенсію. Гэсаль з ахвотаю бярэцца за такія справы і хоць прыдзецца яму даць значны процант, затое-ж без клопату можна дастаць рублёў трыццаць пяць. Дваццаць рублёў ён аддасць на гаспадарку, а рэшту пакіне сабе.

На гэтай думцы Лабановіч зусім заспакоіўся і значна павесялеў. І гэта ён зробіць у бліжэйшы час. Можа, нават заўтра сходзіць да Гэсаля.

— Ты, сынок, як-бы трохі паблажэў, — заўважыла маці, прыглядаючыся да сына.

— Не, мама, гэта проста з дарогі, бо я дзве ночы не спаў.

— То ты, сынок, выпі свежанькага малачка ды ідзі засні ў гумне.

— Але, такі трэба трохі адпачыць.

Маці прынесла цэлы кубак малака. Якуб ужо ўстаў і пазіраў на брата.

— Ну, Якуб, дык многа назнаходзіў ты чарвей?

— Я цяпер ведаю, дзе іх трэба шукаць: на дрывотні пад трэскамі, — адказаў Якуб.

Вось калі Андрэй захоча, то ён ў два мігі прынясе іх поўную бляшанку. Але рыба цяпер лепш бярэцца на аўсянікаў.

— А ведаеш, Андрэй, дзе многа рыбы?

— Ну, дзе?

— У Бервянцы. Там такая букта, што і прысам дна не дастанеш. Там можа хвоя схавацца!.. Вось там многа рыбы!

— Адкуль-жа ты ведаеш, што там яе многа?

— Я бачыў, як там яна плавае. І плюхае, страх як плюхае!

Якуб нешта ўспомніў і пачаў смяяцца.

— Чаго ты смяешся?

— Смешна было раз. Дзядзька вудзіў рыбу, а яна як плюхне! Я кажу: «Дзядзька, унь рыба плюхнула!» А дзядзька кажа: «Вось каб яшчэ плюхнула адна такая рыба, дык і квас быў-бы!»

— Ну, годзе табе расказваць! Няхай Андрэй адпачываць ідзе, — сказала Маня. — Я паслала ўжо табе на палатках у гумне, — звярнулася яна да Андрэя.

— Хадзі, я табе пакажу палаткі, — і Якуб павёў брата ў гумно. — Мы з дзядзькам майстравалі тут, — казаў, ідучы, малы. Ён увесь час круціўся каля брата і шчабятаў сваім дзіцячым галаскам.

— Што-ж ты цяпер будзеш рабіць? — запытаўся Андрэй.

— Пайду зараз да дзядзькі. Дзядзька казаў, што навучыць мяне араць.

— Пойдзем, Якубка, няхай Андрэй спіць.

Маня паклікала гаваркога Якуба і зачыніла вароты.

Лабановіч раздзеўся і лёг на мяккую пасцель. Змучанае дарогаю і бяссоннымі начамі цела даўно патрабавала адпачынку, але заснуць ён адразу не мог, бо вельмі многа было ўсялякіх уражанняў. Нервыператаміліся, а мыслі нейк мітусіліся ў галаве і не паддаваліся ніякаму кантролю.

У гумне было досыць свежа і цемнавата, хоць з-пад шчыта сюды ўрываліся косы вясенняга сонца, а праз няшчыльна зложаныя сцены свіцілася яснае неба. З вясёлым шчабятаннем залятала сюды пара ластавачак, аблюбаваўшых сабе месца для гняздзечка, і парушала маўклівасць сялянскага зацішку. З поля сяды-тады даносілася пануканне дзядзькі Марціна. Каля Нёмана — а ён быў тут зусім блізка — пачулася Якубава песня, а потым яго-ж імправізацыя:

Нёман, Нёман дарагі,
Залатыя берагі,
Пацячы назад.

Добра Якубу! Ні згрызот, ні клопату. Вольны і шчаслівы, як гэты ясны прамень, як срэбраная нёманава хваля, якою ён цяпер любуецца там.

Часамі ў гумно ўрываўся лёгкі ветрык, паварушваючы звіслыя са страхі нішчымныя каласкі і мастацкі сатканую павуціну на кроквах. Над страхой зазвінела песенька палявога жаваранка... Знаёмыя, блізкія малюнкі-з'явы дамашняга побыту, родныя адгалоскі — павевы сялянскага жыцця-клопату...

«Добра, што я дома», — мільганула ў Лабановіча думка-адчуванне, і ён заснуў моцным-моцным сном.

X

Усё гэтае лета Лабановіч жыў дома. Нельга сказаць, каб яму было вельмі добра. Непрыемна перш за ўсё было адчуванне, што ён тут не такі, як усе, і што на яго ў доме пазіралі, як на чалавека іншага кругу. І як ён ні ста-

раўся сцерці ўсякія граніцы паміж сабою і роднымі і цалкам зліцца з імі, жыць так, як жывуць і яны, яму гэта ніяк не ўдавалася, бо самі-ж родныя падтрымлівалі гэтыя граніцы. Калі ён уставаў разам з усімі, каб узяцца за якую-небудзь работу, дык дзядзька або маці заўважалі, што ён мог-бы паспаць і даўжэй, і не яго ўжо справа цягнуць гарапашніцкую лямку простых людзей.

— А хіба-ж я крывы? — пытаў Лабановіч.

— Крывы не крывы, а раўняцца з намі табе няма чаго. Не на тое-ж ты вучыўся, каб капацца ў гэтым смецці і брудзе.

А маці старалася і яду гатаваць госцю лепшую, не зважаючы на яго пратэсты. Браты і сёстры таксама трымаліся здалёк ад яго, як-бы чужаліся, таілі ад яго сваё жыццё, свае патрэбы, і ён, нарэшце, пагадзіўся з роляю адгароджанага ад сям'і чалавека, што нейк рабілася само сабою натуральным парадкам. У сваю чаргу і Андрэй замыкаўся ў сабе. Адзін толькі Якуб быў з ім за панібрата і знаёміў яго з колам сваіх інтарэсаў, сваіх забавак і свайго дзіцячага жыцця, забаўляючы брата несціханым шчэбетам.

Першыя часы побыту дома Лабановіч хадзіў па полі, што яны арандавалі ад скарбу, аглядаў засевы збожжа. Ён радаваўся, калі бачыў шнуры добрай збажыны ці бульбы і не згаджаўся з тою ацэнкаю іх, што рабілася дома, бо і ў мацеры і ў дзядзькі Марціна, як здавалася яму, заўважалася нахіленне зніжаць сапраўдны стан рэчаў.

Недалёка ад хаты была нізкая балоціна, дзе расла дзікая трава. Карысці з яе не было амаль ніякай, бо ні да пашы, ні да сенакосу яна не надавалася: трудна было туды даступіцца. Між полем і балоцінаю рос густы алешнік, раскінуўшыся па купінах, дзе пракідалася маліна і смародзіна. У цені гэтага алешніку было вільготна. Чорная, як дзёгаць, гразь выглядала з-за высокага куп'я.

«А што, каб гэтай гразі нацягаць на поле», — думаў, ходзячы тут, Лабановіч. — Поле-ж пустое: капарні нагою — і жоўтага пяску дастанеш. Трэба будзе параіцца з дзядзькам Марцінам».

Ён пачаў меркаваць, як-бы можна было палепшыць зямлю. Сілы малавата, а перакапаць-бы зямлю на пера-

вал ды навазіць у канаўкі гразі з алешніку, напэўна зямля паправілася-б, і расло-б тут збожжа, як лес.

Мыслі Лабановіча пайшлі далей у гэтым кірунку. Яго яшчэ невялікае жыццёвае дасведчанне казала яму аб нядбайнасці людской, аб закаранеласці форм людскога жыцця.

Вось хоць-бы і тутэйшы народ: бедны, ледзь-ледзь зводзіць канцы з канцамі, таўчэцца, кідаецца ў розныя бакі, шукаючы аддушыны, і мала хто знаходзіць яе. Зямлі мала, зямля неўраджайная, голы пясок. Усе-ж лепшыя землі належаць да скарбу. Адчуваецца вострая патрэба ў зямлі, а народ множыцца. Чым-жа можна палепшыць яго добрабыт? Каб людзі грамадою пасталі на работу, яны-б асушылі балоты, пазносілі-б пяскі з палёў, а балотны гной і яго ўраджайны грунт перанеслі-б на пясчанае поле — хапіла-б і хлеба, і сенажаці.

З рэальнага грунту разважання Лабановіч паволі з'ехаў у павабны край прыгожых мар. Ён бачыў сябе ў ролі чалавека, які здолеў заклікаць грамаду на новую дружную работу. Грамада асушае балоты, стварае новыя землі, праводзіць дарогі, абсаджвае іх пладовымі дрэвамі, робіць масты, будуе новыя дамы і пачынае жыць шчасліва і багата.

Аглядаючы двор і гаспадарскую надобу, Андрэй спыніўся каля хлява: пад страхою ляжалі тры тоўстыя кавалкі чорнага дубу. Яшчэ летась, купаючыся, напаткаў ён выпадкам гэты дуб у пяску на дне Нёмана. Пачаў тупаць каля яго, зацікавіўся знаходкаю. Прынёс рыдлёўку, стаў адкопваць. Работа пасувалася борзда, вада сама адносіла ўзварушаны пясок, і цела старога волата ўсё больш і больш выступала з зямлі. Чорны, як вугаль, тоўсты, роўны, гладкі дубовы стаўбур ляжаў упоперак ракі. Камель далёка ўваходзіў у высокі бераг, і адкапаць там яго было вельмі цяжка. Лабановіч з захапленнем увіхаўся. Ён адчуваў тады нават нейкую радасць, выкопваючы на свет гэтага невядома калі пахаванага нябожчыка. І напэўна доўгі-доўгі час ляжаў ён на дне, бо ніхто не памятае, калі тут раслі дубы — ніякіх слядоў ад іх не захавалі часы. Калі ўвесь стаўбур быў адкапаны, прынеслі пілу. Дзядзька Марцін таксама зацікавіўся дубам, і ўдвух пачалі яны даставаць яго. Дастаць цалкам ім бы-

ло не пад сілу, прышлося пілаваць на тры часці. Набрынялы вадою, ён лёгка, як морква, паддаваўся пілоўцы. Разрэзаныя кавалкі выкацілі на бераг, дзе яны прасохлі і сталі цвёрдыя, як косць.

І гэтыя тры таўшчэзныя кавалкі чорнага дубу, роўныя, гладкія, без ніводнага сучка, ляжаць пад страхою без ніякай карысці, не знаходзяць ужывання, нягледзячы на сваю высокую вартасць. Ад сонца і ветру яны пакалоліся, парыжэлі. І трохі крыўдна зрабілася цяпер Лабановічу, што дзядзька Марцін не паклапаціўся папілаваць на дошкі і скарыстаць гэты дарагі матэрыял. Не дубу шкада было яму, а крыўда брала, што не выкарыстоўваецца тое багацце, якое ляжыць каля нас, а мы не ўмеем даць яму належнага ходу.

— Нічога з іх ужо не будзе, брат. Пакалоліся падлы, прыдзецца папілаваць на дровы.

Такі прысуд вынес цяпер гэтым дубовым кавалкам дзядзька Марцін і як-бы ў апраўданне дадаў:

— Нам трэба было палажыць іх наўперад у гумно ды прыкрыць саломкаю, каб яны высыхалі павольненька — тады і не пакалоліся-б.

Праект-жа пляменніка — падвезці чорнай зямлі з алешніку на поле — дзядзька прызнаў вартым увагі, можа, проста, каб не пакрыўдзіць «настаўніка». Але... тут знайшлося сваё «але». Па-першае, на гэтую справу патрабуецца многа сілы, часу і працы. Ды гэта яшчэ нічога, можна было-б спрабаваць. Другая, самая важная прычына перашкаджала такой рабоце: зямля была не іх, а арандаваная. Невядома, што будзе далей з арэндаю, бо скарб хоча пусціць гэтую зямлю на замену з сялянамі на канцы вясковых шнуроў, якія падыходзяць або ўкліняюцца ў скарбовы лес, каб такім чынам акругліць княжацкія ўладанні.

— Жывеш вось так з дня на дзень і нічога пэўнага не ведаеш. Можа, яшчэ скажуць зносіць адгэтуль будынкі. Тады хоць вазьмі ды падпалі іх, а сам надзявай торбу ды ідзі жабраваць. Няма, брат, простаму чалавеку ні волі, ні разгону. Іх сіла і іх права. Служыў, служыў бацька ўвесь век, а памёр — сям'я куды хочаш дзявайся... І калі ім, халерам, канец той будзе? І ці будзе? Пачалася-б вайна ці якое ліха, можа-б людзям палёгка ці не была-б.

Жаліўся дзядзька Марцін, што ўсюды ўціск пачаўся. Куды ні кінься, усё ў панскія рукі пападзеш. Свет яны ўвесь загарадзілі, а за простага чалавека ніхто не заступіцца.

Цяжка было слухаць гэтыя жальбы, бо ў іх была голая і горкая праўда. І як пагадзіць гэта ўсё з тым, што ўбівалася ў іх галовы ў семінарыі? Вучылі-ж там, дзяўблі на кожным кроку, як апякуецца царскі ўрад, царскае начальства і сам цар аб народзе, як гэты народ любіць свайго бацьку-цара, як ён заўсёды знаходзіць у яго і ласку і міласць. «Бог на небе, цар на зямлі» — вось тыя кіты, на якіх стаіць свет. І гэтыя-ж ідэі праводзіў праз школу і ён, Лабановіч. Скуль-жа такая няўвязка «навукі» і жыцця?

Лабановіч прыпамінае слова «соцыяліст». Ён першы раз чуў яго ў семінарыі ад аднаго таварыша з Навагрудчыны. Гаварылася яно ціха, шэптам, а самы-ж сэнс яго агортваўся нейкаю таямнічасцю, не выклікаючы рэальнага значэння: гэта проста той прапашчы чалавек, які асмельваецца нядобра думаць аб цару, аб цяперашнім парадку.

Так праходзілі першыя дні дома. Лабановіч нікуды не хадзіў, снаваў па двары, па полі, часамі выбіраўся ў лес у свае знаёмыя абходы, дзе ў грыбныя часы так любіў збіраць грыбы, але цяпер іх яшчэ не было. Хадзіў ён, хадзілі з ім і думкі яго, і яго мары, і ўспаміны. Спакой і цішыня лясная так хіляць да такога думання. І ў гэтай адзіноце-глушы неадступна хадзіў з ім і вобраз Ядвісі, чысты, недасяжны і бясконца мілы і дарагі. І дзе яна цяпер? Ці ўспамінае яго? І чаму ўсё-ж-такі нічога не напісала, не сказала яму, куды паедзе? Няўжо яна не хоча знаць аб ім нічога? А можа, там у Хатовічах, у воласці ёсць пісьмо ад яе. Ён напіша туды. Як добра, што такая думка прышла ў галаву. І ў сэрцы абуджаецца надзея, што ліст напэўна ёсць там. Прышоўшы з лесу, ён піша да Дубейкі і просіць, каб усякая пошта перасылалася яму сюды. З гэтым лістом ідзе ён у Панямонь. Якраз і другую справу можна зрабіць — камерцыю з Гэсалем. З Панямоні вярнуўся ён значна павесялеўшым і падвесяліў у значнай меры сваіх родных, бо дваццаць рублёў грошы для іх не малыя.

Асталяваўшыся, Лабановіч увайшоў у каляіну дамашняга жыцця. Чытаў, аднаўляў у памяці навуку, набываў новыя веды. Часам надвячоркамі хадзіў у Мікуцічы, каб пабыць у кампаніі сваіх таварышаў, а летам іх тут ніколі не бракавала.

Мікуцічы — сяло вялікае, вядомае ва ўсёй акрузе. Стаіць на пясках каля Нёмана. Народ тут бедны, малазямельны. Жыць з гаспадаркі трудна, і мікуцічане перабіваюцца заработкамі. Але гэтых заработкаў мала. Зімою возяць калоды, вясною і летам ходзяць на сплаў — на згоны і на плыты. Жанкі і дзяўчаты збіраюць летам ягады і грыбы і гэтым трохі падзарабляюць на дамашні абыходак, а моладзь расходзіцца па свеце, каб выбіцца ў людзі, знайсці сабе кусок хлеба і бацькоў падтрымаць. Выб'ецца адзін, за ім цягнецца другі, памагаюць адзін другому. Чыгунка, тэлеграф, пошта, школы розных гатункаў, пачынаючы настаўніцкімі семінарыямі і канчаючы вышэйшаю школаю, маюць сваіх прадстаўнікоў з Мікуціч. Такім парадкам, Мікуцічы маюць сваю інтэлігенцыю, пераважная большасць якой прыходзіцца на настаўніцтва, і гэтая група найболей цесна звязвалася з родным сялом.

Як толькі канчалася работа ў школах, настаўнікі з'язджаліся на лета да бацькоў. Гэта ўвайшло нейк у традыцыю, дый дома пражыць танней, можна было не чапаць пенсіі за летнія месяцы, перабіцца на дамашнім хлебе і на бацькоўскім крупніку. У цяньку гумен і адрынак знаходзілі яны спакой душы і адпачынак целу. Хто рыхтаваўся ў настаўніцкія інстытуты, хто ўзбройваўся філасофіяй жыцця, хто лавіў рыбу на ўлонні прыроды, хто ўходжваўся каля гаспадаркі, памагаючы бацькам, а хто проста біў бібікі. Але ў гарачы час сенакосу і жніва высыпалі яны ўсе на луг, на поле, і толькі ўжо самыя важныя і салідныя, прасякнутыя «панскім духам», упарта сядзелі пад сваімі стрэхамі. А калі хто і выходзіў у крытычны момант вязаць ячмень, то не інача́й, як у пальчатках, даючы гэтым багатую страву для жартаў вясёлым мікуцічанам.

Вечарамі, калі спадала дзённая гарачыня, выходзілі настаўнікі халадком на шпацыр, хадзілі па вуліцах, а часамі збіраліся ў каго і ладзілі выпіўку. А некаторыя

цішком наведваліся ў каморы і сенечкі, дзе мелі свае рэзідэнцыі абранніцы іх сэрца. Такіх «абранніц» называлі ў Мікуцічах «панскімі» дзяўчатамі, і гэты парадак рэчаў быў тут законным і натуральным. Але трудна было ступіць крок па лініі кахання, каб не стаўся ён вядомы назаўтра ўсім у Мікуцічах.

Сярод настаўніцтва былі свае групы, якія складаліся на грунце тых ці іншых інтарэсаў. Настаўнікі болей сталыя, што ўжо мелі пэўную жыццёвую практыку і працавалі па колькі гадоў, трымаліся свае кампаніі і на маладых глядзелі трохі звысоку, як людзі больш дасведчаныя, больш развітыя і больш заможныя, калі толькі заможнасць наогул можна прылажыць да вясковага настаўніцтва.

Маладыя-ж настаўнікі лічылі сваім абавязкам сядытады зайсці да сваіх калег, пагаварыць з імі, а часамі паспрачацца і паказаць ім, што і яны не лыкам шыты і казённую кашу не дарма елі. А ў Мікуцічах сцяг навукі і годнасць «развітога» чалавека трымаліся высока сярод настаўніцтва.

Першая пазіцыя, якую заваёўвала моладзь у сваім змаганні за права называцца «развітымі» людзьмі, звычайна было абвяржэнне рэлігіі і бога. Можа, у гэтым выяўляўся пратэст супроць семінарска-папоўскага выхавання і славянскіх тэкстаў Філарэта, але хто не чытаў Бокля, Дарвіна і Дрэпера, той проста лічыўся невукам, чалавекам, які нічога не ведае і з якім няма аб чым гутарыць. Мікуціцкія гумны і адрынкі былі школамі бязбожніцтва і вольнадумства.

З адрынак вольнадумства пераходзіла і пад стрэхі сялянскіх хат. Сталыя людзі наўперад з дакорамківалі галовамі, калі прачувалі аб якой-небудзь бязбожніцкай штучцы таго ці іншага настаўніка.

— Чаму-ж яны дзяцей навучаць, калі самі робяць нямаведама што?

А потым прывыкалі і гаварылі:

— А можа, і сапраўды няма бога.

І, нарэшце, проста смяяліся, як вось і са здарэння з Іванком Перагудам. Яго маці — богабаязная жанчына. Балела яе сэрца, што Іванок у царкву не ходзіць, а папа

кудлатым чортам называе. А калі яго часамі запытаюць аб чым, дык ён адкажа: «А чорт яго святы ведае».

— Ах, як ты нядобра гаворыш, сынок! Ты-ж-такі настаўнік і сам павінен ведаць, што гэта — грэх.

— Што значыць «грэх»? — адказвае Іванок, — можа, ты скажаш, што і сала есці ў пятніцу — грэх?

— А ты запытай у бацюшкі, што ён табе скажа.

Іванок зняважліва трасе галавою.

— Я буду пытацца ў гэтага валасатага асталопа!

— Пабойся бога, сынок! Што ты гаворыш! Ён-жа служка божы.

— Не баюся я таго, чаго на свеце няма.

— Дух святы з намі, матка найсвентшая!

Маці хрысціцца, назад падаецца, а Іванок нападае:

— А ты бачыла бога? Дык скажы, які ён! Да каго падобны: да каня ці да каровы?

Маці адступаецца і ціха шэпча: «Ойча наш». Яна не можа забыць гэты цяжкі грэх сына. Цішком моліцца за яго богу.

— Сынок, — кажа яна праз некаторы час, — пайдзі ў царкву, памаліся. На табе сараковачку, пастаў, сынок, свечачку ў царкве.

Гэту саракоўку ён прапіў у адрынцы з сябрамі, а мацеры сказаў:

— Я табе, маці, потым пяць рублёў дам за тваю саракоўку, але цяпер я прапіў яе: лепей прапіць, як аддаць папу.

XI

Каля самага сяла, падмываючы вуліцы, цячэ Нёман. Разложыстыя круглаверхія вербы, узняўшы над вадою карэнне, абступаюць адхонны пясчаны бераг. На мікуціцкіх вуліцах — сыпучы пясок. Гразі тут амаль не бывае ніколі, але калі падымецца вецер, дык цэлыя воблакі пылу стаяць у паветры.

Шумна і гучна ўлетку на беразе Нёмана. Зранку і да самага вечара галышамі качаюцца тут дзеці, то ў пяску, то ў вадзе. Сотнямі гукаў разносіцца над ракою пляскание пранікаў. Падаткнуўшы спадніцы і агаліўшы лыткі, выбіваюць палотны жанкі і дзяўчаты, беляць іх, рассцілаюць на беразе. У гэтым месцы Нёман мелкі і шырокі.

І ездзяць, і ходзяць, і жывёлу ганяюць уброд. Цалюткі дзень снуюць тут людзі — старыя і малыя, хто за Нёман, хто з-за Нёмана. Перайсці-ж уброд раку летам — адна асалода. І калі ў мужчын ёсць яшчэ сякі-такі клопат — падкасацца або скінуць нагавіцы, калі вада прыбудзе, дык жанчыны ў гэтых адносінах зусім шчаслівы народ. Падымуцца на хаду, колькі трэба, і храбра рушацца ўброд, не зважаючы, ці ёсць тут хто, ці не, глядзяць на іх, ці не глядзяць. Часамі-ж некаторыя смелыя і рызыкоўныя асобы, асабліва, калі на беразе ёсць гледачы, сумыслу нарыхтуюцца брысці так, як-бы тут вельмі глыбока і можна падумаць, што вада зойме па самыя пахі, хоць вышэй калена яна не даходзіць. Бывала і жартамі перакінуцца ў такіх выпадках па сутнасці справы, а часам які-небудзь Гілерык, чалавек сталых год, і заўвагу зробіць, выняўшы люльку з зубоў: «Апусціла-б хоць ніжэй спадніцу», — а сам пры гэтым сарамліва ўбок адвернецца. А калі яго закраналі смехам, то, каб у даўгу не быць, так адзавецца:

— Пацягнуць-бы бясстыдніцу цыбуком, то шанавалася-б. Казырыцца чорт ведае чым!

Па той бок Нёмана лугі ідуць, а за лугамі — лес і поле. Вярсты дзве будзе да поля. Ляжыць чорная грэбля ўпоперак лугу, адным канцом да ракі даходзіць, другім — у поле ўпіраецца. Вось гэта грэбля — бяда і гора мікуціцкае. Пакуль праедзеш яе — духі вытрасеш і кішкі збоўтаеш, а ў мокрае лета і каня ўгрузіш, і сам, як д'ябал, у гразі выкачаешся. І снасць ламалі тут, і жывёлу калечылі. Паганая грэбля, каб яе людзі не зналі, так-жа ўелася яна ў косці.

Калісь тут, як расказваюць старыя людзі, праўда, самі яны не помняць, быў мост. І цяпер яшчэ сям-там па баках грэблі засталіся рэшткі паляў, і тырчаць яны з гразі, як згніўшыя зубы ў сківіцы. Мост гэты быў знішчаны ў часе Шведскага Палення. Жыве яшчэ ў памяці людзей вайна са шведамі. Нават імя сваё мае ў вуснах народа — Шведскае Паленне. Вось і спалілі тады шведы мост. Вялікія бойкі адбываліся тут. А над самым Нёманам, вышэй трохі сяла, ёсць курган-магіла. Размывае рака грудзі гэтай невядомай магілы, вымывае чалавечыя чарапы і старасвецкую зброю. І перадаюць мацяркі

сваім дзецям аб гэтай страшнай часіне Шведскага Палення. Многа тады народу пабіта было, а будынкі папалілі. Людзі па лясах туляліся. І кідаліся шведы на хітрыкі. Гукалі ў лесе:

— Тацяна, Мар'яна! Выходзьце з лесу: шведы дадому паехалі.

І калі хто выходзіў на голас, таго забіралі і забівалі.

Тады і жывёла амаль уся перавялася. У Мікуцічах застаўся адзін толькі бык, а ў Сверынаве — карова. Сабралі гэтую пару людзі потым іаралі на ёй. Але, нарэшце, пакараў бог шведаў за здзекі над людзьмі — асляпіў іх, і збіраючыся ехаць верхам, яны садзіліся тварам да конскага заду. Тады іх пабілі.

Такая легенда звязвалася з грэбляю і з даўнейшым мастом, што быў на месцы яе.

Крайнім будынкам ад Нёмана супраць броду была старая карчма на высозным падмурку. Калісь гэта быў вір сялянскага жыцця, і не адна мікуціцкая душа захлынулася ў ім. З таго часу, як увялі манапольку, карчма заняпала, а потым згарэла. Але па старой прывычцы збіраўся тут народ, як на старадаўняе веча, дзе вырашаліся сялянскія справы і разважалі аб розных пытаннях мікуціцкага побыту.

Мікуцічане — народ грамадскі, любяць пагутарыць аб розных рознасцях: аб замежнай палітыцы, аб вайне, аб заработках, аб цяжкасцях жыцця, аб тым, што нешта на свеце робіцца і нешта гатуецца і што павінна нешта адбыцца, бо далей так жыць нельга. Прагавіта прыслухоўваліся да розных чутак, часамі выдумлялі іх і на гэтай аснове стваралі такія рэчы, што самі пачыналі палохацца іх, а потым самі-ж дапякалі сябе смехам. Стаіць, бывала, грамада, а перад ёю за Нёманам, як нейкая гадзюка, ляжыць праклятая чорная грэбля, дыхнуць вольна не дае. Многа было аб ёй гутарак і сварак, калі справа заходзіла аб тым, каб яе паправіць. Бывала, таксяк і збяруцца і падправяць сям-там, але такая рапарацыя мала давала карысці, і грэбля як была, так і заставалася іх бядою.

Праўда, не заўсёды грэбля з аднакаю сілай бунтавала сялянскія душы. Часамі аб ёй зусім нават забывалі, і толькі ў часе касьбы і жніва, калі трэба было ездзіць

з вазамі, аб ёй думалі, яе праклінаді, з-за яе сварыліся. Жыла гэта грэбля і ў думках грамады і паасобных членаў яе. Жыла, як стрэмка ў целе.

Лабановіч не раз чуў размовы аб грэблі і скаргі на яе як з боку дзядзькі Марціна, так і з боку грамады. Не раз і сам хадзіў па ёй пехатою і ездзіў. Не раз перадрыжаў ён тут, везучы снапы ці сена, каб не абярнуцца з возам. У яго памяці абуджаліся легенда і розныя пабаюшкі, створаныя напалоханай фантазіяй цёмнага чалавека. Было на ёй, казалі, і страшнае месца, адкуль часамі выбягаў нехта ў чырвоным, з пугаю ў руках і шалёстаў па вушах таго, хто позна ехаў з поля.

Дзіўным здавалася Лабановічу, што такое вялікае сяло, як Мікуцічы, не можа справіцца з грэбляю. Ну, што-б значыла сялянам адвесці, ну, тыдзень — два часу, каб адвінуцца і збыць гэтую злыбеду? Няўжо так цяжка грамадою выкапаць абапал грэблі канавы, падвезці пяску і камення, падняць яе, насыпаць, зараўняць, утрамбаваць. Пяску-ж, куды ні павярніся, цэлыя горы. Каменнем завалены межы. Цэлыя рэчкі каменняў, паскіданых з поля, цягнуцца побач дарогі. І рабочых рук стае, і матэрыял пад рукамі, няма толькі такой рукі, што паставіла-б сяло на грамадскую работу.

І вось гэтым летам, калі ў галаве Лабановіча спелі розныя праекты палепшыць людское жыццё, падняў ён раз пытанне аб грэблі сярод настаўнікаў свайго сяла. Чалавек з дзесяць сабралася ў гумне Іванка Перагуда. Сам Іванок ляжаў у сваім логаве, змяўшы нагамі дамотканую коўдру і збіўшы падушку ў нейкі брудны камяк. Валасы яго, даўно не стрыжаныя, ускудлачыліся і, як купіна, ляжалі на падушцы. Настаўнікі размясціліся дзе папала. Каля пасцелі стаяў кволенькі столік, на ім было некалькі кніг, пустая папяровая скрынка ад гільзы ды пара акуркаў.

Іванок Перагуд карыстаўся славаю дзівака і філасофа. Асноўная формула яго філасофіі казала: «Плюй на ўсё і шануй сваё здароўе». Праўда, у яго было многа напускнога, і ён трохі фарсіў сваім дзівацтвам. Наогулжа быў добрым работнікам у школе і вясёлым чалавекам у кампаніі.

Сышліся тут розныя групы настаўнікаў. Старэйшыя вялі рэй, а маладыя толькі прыслухоўваліся ды падавалі рэплікі.

— І вось што цікава, і гэта трэба адзначыць, хлопцы, — гаварыў Міхась Лабада, настаўнік з пяцігадовым стажам: — Сярод нашых мікуцічан ніводнага злодзея няма.

Настаўнікі былі прыемна здзіўлены. І праўда, няма тут злодзея.

— Гэта, братцы, варта таго, каб залатымі літарамі занесці ў гісторыю нашага сяла, — азваўся прыяцель Лабады, Ігнат Курган.

— Так, гэта рэдкасць, — загулі галасы.

— Бо тут і ўкрасці няма чаго, і мікуціцкая галота няздольна выгадаваць злодзея, — азваўся са свайго логава Іванок.

Усе засмяяліся.

— Не, брат, стой! — з жарам выступіў Садовіч, — а Язэп Малюк...

— О ты, чорт! — нібы напусціўся на яго Курган, — абедню псуеш. Ды што Язэп? Ён тут не жыве і ніводнага цвічка не ўкраў і, такім парадкам, не парушае агульнай чэснасці нашага сяла.

— Праўда! — падхапілі настаўнікі.

Язэп Малюк з'яўляўся ў Мікуцічах разы са два, а цяпер аб ім ніякіх чутак не было.

— Я вам раскажу пра Язэпа, — сказаў Курган. — Як быў ён тут апошні раз, паехаў з нашымі мікуцічанамі ў Панямонь. А ён чалавек спрытны, адзеты на гарадскі лад, манеры ў яго, як у пана. «Чый-жа гэта такі?» — дзівяцца людзі. «А гэта наш — мікуціцкі», — адказваюць мікуцічане. Рады яны, што іх чалавек такі спрытны. Аж праз некалькі хвілін злавілі Язэпа на кражы. Вядуць. «Хто-ж гэта такі? Чый ён?» — пытаюцца людзі. Нашы мікуцічане адказваюць: «А чорт яго ведае, чый ён там».

Калі гутарка скіравалася на сяло, Лабановіч улучыў момант, каб перавесці размову на грэблю.

— Ведаеце, хлопцы, што? Вот мы тут успамінаем усякія, праўда, вельмі цікавыя, драбніцы. А варта было-б грэблю наладзіць. Усім яна ў косці ўелася і ўсе адчуваюць, што яе трэба наладзіць, так наладзіць, каб

перастала быць стрэмкаю ў жыцці сяла... Давайце паднімем народ на работу!

Ён хацеў сказаць болей, што зрабіць добрую грэблю зусім не цяжка пры дружнай рабоце грамады, але трохі саромеўся старэйшых таварышаў і адчуваў сябе ў іх кампаніі не вельмі ўпэўнена.

— Ты што-ж? Хочаш быць Оберлейнам? — запытаў яго Лабада.

— Не мяшайся ў жыццё, — заўважыў з бярлогу Іванок, — няхай яно ідзе, як ідзе. Плюй на ўсё і шануй сваё здароўе.

— Тут, брат, трэба ўмяшанне начальства, наказ строгі і сур'ёзны, а цябе ніхто не паслухае, — дадаў Курган.

— Распанелі вы і не хочаце пальцам паварушыць, каб зрабіць добрую справу, — жартам адказаў Лабановіч і сціх.

Гутарка павялася на іншыя тэмы, але яму было як-бы трохі крыўдна за сваё выступленне. Ну, што-ж? Ён зробіць гэта і без іх. Болей ён не чапаў ужо гэтага пытання, бо відаць было, што ніхто не прыдаваў тут сур'ёзнага значэння таму праекту, з якім ён так няўдала высунуўся.

Кожны, хто хацеў-бы пагутарыць з мікуцічанамі, заўсёды знойдзе сярод іх уважных слухачоў, асабліва ў святочны дзень і ў пагоду. Падсядзь толькі да двух-трох чалавек на прызбе, толькі расчыні рот і скажы некалькі слоў, як зараз-жа каля цябе пачнуць збірацца людзі, і праз поўгадзіны іх назбіраецца не адна сотня. Вось і на гэты раз каля хаты дзядзькі Базыля, на горцы, адкуль так добра відаць і брод і грэбля за Нёманам, сабраліся мікуціцкія сяляне. Між імі быў і Лабановіч. Гутарка зачалася з Палесся. Лабановіч расказаў некалькі смешных здарэнняў з цельшынскага жыцця, як палешукі свята згубілі і як яны прычашчаліся пасля споведзі.

Мікуцічане слухалі і смяяліся.

— Дык яны, падлы, дзікія, — заўважыў дзядзька Сымон: — Я раз бачыў іх. У Нясвіжы лесніка-палешука сустрэў. Валасы доўгія, бы ў папа. Узялі яго ды агалілі, як калена. Ото-ж ён гараваў! Хапаўся за галаву і ўсё

казаў: «Што-ж мне зробілы? Як-жа я покажуса на родыму? Скажуць — таўкач та і ўсэ».

— Але паміж імі і, скажам, намі, мікуцічанамі, ёсць многа падобнага і агульнага, — заступіўся Лабановіч за палешукоў.

— У чым-жа? — пацікавіўся дзядзька Яхім.

— А вось у чым. Там, у Цельшыне, страшна гразі многа, не вылезці, праз вуліцу нельга перайсці ў мокрае надвор'е. Двары-ж і вуліцы бярвеннем завалены. І нікому ў галаву не прыдзе палажыць кладку каля хаты. Гаварыў я з імі аб гэтым не раз, а яны хоць-бы што. «А, — кажуць, — мы ўжо да гэтага прывыклі, спрадвеку так у нас вядзецца». А вы-ж паглядзіце — бачыце? — Лабановіч паказаў на грэблю, — ці не тое самае?

— Верна, брат, — чуюцца галасы.

— Дык яна, падла, вялікая! Гэта не тое, што бервяно выкаціць з двара на вуліцу, каб палажыць кладку, — апраўдваецца дзядзька Сымон, не хочучы, відаць, у адзін рад з палешукамі стаць.

— Але праехаць з возам па грэблі гэта не тое, што прайсці пешкам па гразкай вуліцы.

— Што казаць! Вось дзе сядзіць яна, гэтая грэбля. — Дзядзька Базыль паказвае на горла.

— Вось я сумыслу і пачаў з палешукоў, каб пагаварыць аб грэблі. Па праўдзе, як гэта вы цярпіце да гэтага часу такое ліха, як наша грэбля? Такое вялікае сяло, столькі рук, столькі сілы! Кінуліся-б гуртом — хто пяску падвёз-бы, хто камянёў, — імі поле, дарогі завалены, — хто вышаў-бы з рыдлёўкаю, хто з сякераю... Тыдзень часу, і грэбля была-б, як яечка.

— Каб-жа гэта дружна ўзяліся, — гудзе голас.

— Гэта, брат, не так лёгка, — выступіў стары Сёмка, краснабай і заядлы курэц. Ён так прапах сосам, што яго можна было за поўвярсты носам знюхаць.

— Зрабі ты найлепшую грэблю, а выльецца вясною вада і сапрэ яе к чортавай матары.

Тут падняўся шум. Некаторыя стаялі за тое, што грэблю можна зрабіць вечную. Уся бяда ў тым, што народ на работу не падымеш, бо нядбайны. Другія даводзілі, што з гэтае грэблі толку не будзе. Тут мост рабіць трэба, лес вазіць, майстроў ставіць. Часамі завязвалася паміж не-

каторымі сварка: вось, напрыклад, Сцяцок — колькі працаваў на грэблі, а Гаронім туляўся, як сабака ад мух.

— Вы ніколі і не браліся дружна, грамадою, і не ведаеце, якая вы сіла ў дружнай грамадзе. Хто-ж за вас рабіць будзе? І для каго вы будзеце рабіць?

— Мы гэта, брат, ведаем, ды вось рады не можам даць. Калі-б прыехаў пристаў з бізуном ды даў перцу, то паставіў-бы ўсіх на работу, — кажа стары Гілёрык.

Мікуцічане гудуць. Выплываюць розныя крыўды, непаразуменні, успамінаюцца старыя прарэхі сялянскага жыцця, аб грэблі перастаюць зусім гаварыць.

Некаторы час Лабановіч і ў сяле не паказваўся, бо нейк прыкра было слухаць насмешкі сяброў.

XII

Канчалася лета.

На лугах ужо рассцілалася зялёнымі аксамітамі пяшчотна-кволая атава. Парыжэлі стагі. Збіраліся ў вырай буслы. Агорнутыя сіняватаю смугою, журботна пазіралі далечы і ніклі ў святле жнівеньскага сонца.

Пачалі раз'язджацца з летніх вакацый настаўнікі.

— Пажыў, брат, і годзе: збірайся на сваё седала! — У гэтым голасе восені чуваць нейкі смутак, а, здаецца, так нядаўна яшчэ гучаў другі голас, радасны, свежы голас вясны: — Разгарні крылле, рушся з месца, ляці на прастор, жыві, як толькі ты здолееш жыць.

Назначыў сабе дзень ад'езду і Лабановіч.

Дубейка пераслаў яму пошту, але таго пісьма, якога так прагна чакаў, аб якім так многа думаў і аб якім не гаварыў нікому, а толькі насіў у сваім сэрцы, не было і не было. І не будзе. Лета прайшло, прайшла і надзея. Ну, што-ж? Пажартавала дзяўчына, а цяпер гэтыя жарты прайшлі; там, у глушы, дзе апроч яго, нікога не было, можна было і з ім пажартаваць, пасмяяцца з яго, дурнога. Але такі канец, такі вывад спакою не дасць, не, не дасць!

Нядаўна прышоў казённы пакет — назначэнне ў Выганаўскую школу. Углядаўся Лабановіч у гэтае слова: якраз яно і падыходзіць яму. Проста аж нейк дзіўна трохі, бо ў гэтым слове чуецца як-бы нейкае выгнанне. І чаму ў

гэтым «выгнанні» чуваць сугучныя акорды яго сэрцу? Што выгнана з яго? Хто выгнаў?

Ён думаў і аб сваёй новай школе. І гэтая школа, і гэтыя Выганы, аб якіх ён ніколі раней не чуў, уплятаюцца ў яго жыццё, уяўляюцца ў тых няясна прывабных тонах-абрысах, што такія прыгожыя здалёк, але ніколі не супадаюць з рэчаіснасцю. І аднаго гэтага паэтычнага вобраза новага месца было мала. Пайшоў у Мікуцічы ў школу, каб знайсці на карце свае Выганы, паглядзець, якія там ёсць болей значныя пункты. Настаўнікі амаль усе раз'ехаліся, і ніхто не раскажа аб новай школе.

Зайшоў да Садовіча. Хацелася-б з прыяцелем падзяліцца навіною. Садовіч таксама чакаў назначэння. Нечакана спаткаў Лабановіч там і другога свайго таварыша па семінарыі, Янку Тукалу. Гэта быў замкнуты ў сабе юнак, круглагаловы, бялявы, з задраным трохі ўгору носам і шэрымі вачамі. У семінарыі ён трымаўся ў баку ад сваіх таварышаў і ўсё нешта думаў. Што займала яго мыслі, ён нікому не гаварыў. У яго душы, відаць, адбываўся нейкі балючы працэс, і ён перажываў гэта моўчкі, патаемна. Часамі ўдавалася яго разварушыць, і тады ён рабіўся вясёлым, жартлівым, здольным усіх захапіць сваімі жартамі і смяяўся такім заразлівым смехам, што нельга было не паддацца яму.

Выпадкам Тукала адкрыў у сябе адну ўласцівасць. Было гэта на другім курсе. Тукала заўсёды быў каротка астрыжаны. Валасы ў яго былі жорсткія, стаялі тырчаком. Раз, кладучыся спаць, знімаў ён суконную кашулю. Шаргануўшы ёю па валасах, ён пачуў нейкі дзіўны трэск і зацікавіўся. Шаргануў яшчэ раз, зноў пачуўся той-жа трэск.

— Гэй, хлопцы, — гукнуў ён, накрыўшы галаву кашуляю, — ідзіце сюды — у мяне, аказваецца, не галава, а машына электрычная!

Вакол Янкі збілася чалавек з дваццаць семінарыстаў. Затаіўшы дыханне, слухалі трэск у яго валасах, калі па іх шоргала кашуля, а потым заліваліся дружным рогатам.

— Плаціце, пся маць ваша, грошы, — смяяўся і сам Янка, забаўляючы таварышаў.

І вось гэты самы Янка Тукала стаяў цяпер каля гумна, дзе пасяліўся на лета Садовіч.

— Янка! Ты-ж гэта адкуль узяўся?— здзівіўся Лабановіч і патрос Янкаву руку.

— Дзён майго вандроўніцтва сто сорак, — нейкім біблейным тонам адгукнуўся Тукала: — Абышоў я чатыры ветры зямлі, узважыў чалавечае жыццё і знайшоў, што яно падобна быдлячым ляпёшкам, параскіданым па выганах.

— Бадай-жа ты згарэў са сваім вывадам, — смяяліся яго сябры.

— Га-га-га! — рагатаў Садовіч, — ты ведаеш, — звярнуўся ён да Лабановіча, — ён-жа святым хацеў быць — на Валаам ездзіў бога шукаць!

— Не можа быць!

Янка вінавата пасміхаўся і не пярэчыў. Лабановіч і Садовіч пазіралі на яго і рагаталі.

— Чаго вы рагочаце, вельзевулавы дзеці?

— Бадай-жа ты скіс, Янка! Святым хацеў зрабіцца!

— Чхаць я хачу на святых — баста! Не знайшоў я праўды і болей шукаць яе там не буду. А цяпер помсціцца пачну. Сцеражыцеся, багі, бедната гуляе, — перайначыў ён верш Нікіціна. — Жыў я, браткі, адзін. Глуш, нікога няма, часу многа. Начытаўся я ўсялякай душазбавеннай дрэні, і пацягнула мяне пад царкоўныя сцены, у кусты сівабародага Іеговы. Пасціў, брат, збіраў грошы, каб на Валаам паехаць. А скончыў я тым, што, вярнуўшыся, прынёс такую ахвяру святым у асобе Мікалая ўгодніка, якой ніякі жрэц на свеце не прыносіў.

І расказаў аб непатрэбстве, якое зрабіў ён перад абразом Мікалая цудатворца.

— У цябе, брат, усё крайнасці, няхай ты згары, — заўважыў са смехам Садовіч.

— Трэба-ж нейкі падрахунак падвесці пяройдзенаму кругу і тычку паставіць, — смяяўся Янка. — Не, браткі, цяпер я хачу жыць інакай. Годзе гэтага лайдацтва. У іншыя гарызонты пераведу я вочы свае. Перш за ўсё — месца перамяніць трэба, хоць з другога боку — не месца красіць чалавека, а чалавек месца. Я хачу Басавым суседам быць, а яшчэ лепш — у адну школу з кім-небудзь з вас папасці, бо калі я адзін, я зноў нейкае глупства зраблю — натура мая такая сабачая. Думкі ўсё нейкія ў галаву лезуць.

— А я, хлопцы, пераведзены ў другое месца, — пераняў Янку Лабановіч, — у Выганаўскую школу.

— Цябе ўжо, як нейкую жывёлу, пагналі на выган, — пажартаваў Янка.

— Гэта напэўна святы Мікалай памыліўся і замест цябе мяне пакараў.

— Ён яшчэ, глядзі, і мне каб фефару не задаў. Чорт яго, брат, ведае.

Пажартавалі трохі сябры, а потым пачалі гаварыць аб сваіх школах, пераводах, аб сваіх адносінах да так званай інтэлігенцыі, з якою прыходзілася жыць.

— Можа, яны шчаслівейшыя за нас, усе тыя, што ў карты гуляюць і гарэлку п'юць? Ім гэта люба, у гэтым іх радасць, і яны ніякіх чартоў знаць не хочуць. А я дык і піць не хачу — праціўна! Карты не горнуць мяне, а дзяўчаты хоць і хіляць, але я з сваім «імбрычкам», — так назваў Янка свой нос, — саромеюся паткнуцца да іх. Мне ўсё здаецца, што яны смяюцца з мяне. Што-ж мне рабіць? — пытаў Янка. Сур'ёзнае і жартлівае перамешвалася ў яго прамове. — Я пачынаю думаць, што да ўсяго трэба падыходзіць з нейкаю меркаю, але гэтай меркі ў мяне няма. Сёння яна — мерка, а заўтра — глупства, і я сам адмяняю яе сваёю ўласнаю рукою. Я кідаюся ад аднае тэорыі да другой, бяруся за адно, хапаюся за другое і ўсюды адстаю. Чытаеш адну кнігу, здаецца — тут праўда. Возьмешся за другую, і з ёю згаджаешся. Цяпер вось захапіўся Ніцшэ «Так казаў Заратустра», і мне хочацца быць «надчалавекам», чорт вазьмі! А калі строга падумаць, то выходзіць, што ты проста чалавек з пакалечанымі семінарскім выхаваннем мазгамі. Я, аб вас я не адважваюся гаварыць гэта, хоць і вы, напэўна, такія-ж хісткія, як і я, я — дрэва ў полі, што хіліць галіны туды, куды вецер дзьме.

— Ну, гэта — вельмі песімістычнае прызнанне, Янка, — азваўся Садовіч.

— Янка, дарагі! Руку, брат!

— Ты, значыцца, згаджаешся са мною? — і Янка са здзіўленнем паглядзеў на Лабановіча.

— А ні на валасок, — адказаў Лабановіч, — дый у чым з табою згаджацца? Ні да якога-ж заключэння ты не прышоў, ты толькі паказаўся з новага для мяне боку.

Але я люблю цябе за пакуту тваю, як гэта сказана ў Дастаеўскага, за тое, што ты не стаіш на месцы, што ты мітусішся, праўды шукаеш і «хочаш свае пагібелі» — так-жа казаў Заратустра. Няхай мы — тыя дрэвы ў полі, што стаяць пад ветрам, няхай нахіляюцца галіны ў той бок, куды дзьме вецер. Але-ж ветры веюць з розных бакоў, і галіны хіляцца і туды, і сюды. Аднак здаровае, моцнае дрэва будзе стаяць роўна, а галіны яго больш нахіляцца ў той бок, адкуль свеціць сонца. Штука-ж уся ў тым, як намацаць галінамі гэтае сонца.

— Ты ўжо, я чуў, намацваў «галінамі сонца», калі думаў падняць мікуцічан зрабіць грэблю? — запытаў, смеючыся, Янка.

— Дык і ты намацваў гэтае самае сонца, калі думаў знайсці яго ў Валаамскіх манастырах! — заступіўся за Андрэя Садовіч.

— Падняць сяло, зрабіць добрую грэблю, па-мойму, у тысячу разоў важней, чым блытацца пад кустамі сівабародага Іеговы, як ты казаў. Але я цябе за гэта не асуджаю і не смяюся. А што не ўдалося падняць сялян, каб зрабіць самім-жа ім карысную работу, то гэта не значыць яшчэ, што іх наогул не падымеш і падымаць не трэба: не падняў цяпер, падымеш потым. Ды брацца за гэта трэба можа нейк трохі не так. Неабходна лічыцца з тым, што народ малакультурны, кансерватыўны, не ўмее цаніць сваіх грамадскіх інтарэсаў і не прывык выступаць грамадою. Але-ж яму трэба гэта гаварыць, будзіць яго, катурхаць. І, па-мойму, гэта ёсць наш абавязак... Але што казаць аб народзе, калі настаўнікі не разумеюць гэтага!

— Праўда, брат, — сказаў Садовіч: — Народ наш спіць, воля яго спаралізавана, у яго многа нянек, апекуноў, з яго рук выбіта ўсялякая ініцыятыва... Вось дзе карэнне яго бяды... Я, хлопцы, вельмі задаволены, што мы спаткаліся і пагаварылі. Праўда, мы, як у лесе; ходзім вобмацкам, як сляпыя. Мы павінны перш за ўсё шчыльней адзін аднаго трымацца, каб разам выбіцца на нейкую дарогу, павінны падганяць самі сябе, каб не заснуць і не ўгразнуць у балоце. Я цвёрда намерыўся тут застацца. Янка будзе маім блізкім суседам. Вось шкада толькі, што ты, Андрэй, забіўся ў гэтае Палессе.

— З вамі я чуюся весела і пайду на што хочаце, —

разышоўся Янка.— Богу не паддамся і з цара гатоў карону здзіраць. У мяне, браткі, і сны бываюць цікавыя. Я ўсё збіраюся запісаць іх у навучанне патомкам.

— Ну, што-ж? Будзем пісаць пісьмы, дзяліцца сваімі думкамі і не губляць адзін аднаго з вока,— перапыніў Янку Лабановіч.

— Дык давайце заключым трыумвірат! — крычаў Янка.

— Давайце!

І сябры з запалам пацiснулі адзін аднаму рукі ў знак свайго саюзу.

На карце ў школе Лабановіч не знайшоў свайго новага месца.

«Напэўна, яшчэ большая глуш, як Цельшына»,— думаў ён.

Дасталі «Памятную кніжку Мінскай губерні», дзе звычайна былі адзначаны ўсе ўстановы і школы. У кнізе значылася і Выганаўская школа, што трохі ўсцешыла і заспакоіла маладога настаўніка, але дакладнага адраса не было. Адно толькі дазнаўся Лабановіч: ехаць трэба ў Пінск, а ўжо адтуль дабірацца да школы.

Напярэдадні ад'езду пайшоў Лабановіч у лес, каб апошні раз агледзець свае грыбныя абходы і развітацца з імі.

У лесе было зусім ціха. Скрозь галінкі выносных хвоек прабіваліся цёплыя косы вераснёўскага сонца. Пажоўклыя калюшкі без шуму ападалі на дол, ледзь зачэпіш галінку. Дзесь у небе закрычалі жураўлі, шыбуючы ў вырай. Лабановіч адчуваў нейкую мяккую журботу, навеяную і цішынёю лесу і гэтым заміраннем жыцця. І розныя думкі, лёгкія, як цені хваёвых галінак, журботныя, як курлыканне журавоў у небе, снаваліся ў яго сэрцы.

Было чагось шкада, як-бы нейкая страта напаткала яго. Думаў аб сваім новым месцы, складаў план жыцця і работы там. Успаміналася Цельшына. Цяпер яно нейк адыходзіла ад яго, ахіналася змрокам, рабілася пустым і чужым, бо не было там таго мілага вобраза, што даваў жыццё і радасць. Гэты вобраз неадступна хадзіў з ім па лесе, адганяў іншыя думкі, змушаючы думаць аб сабе. І словы Ядвісі: «Калі вы мяне паца-

луеце, то, клянуся памяццю мацеры, я кінуся пад машыну» — ніяк не забываліся, і сама яна, як жывая, стаяла ў яго ўвесь час перад вачамі.

На другі дзень на захадзе сонца запрог дзядзька Марцін чорнага коніка, якога празваў за жвавасць «Ножыкам», каб завезці пляменніка на станцыю. Невялічкі чамадан быў загадзя зложаны, сабраны ў дарогу.

— На добры лад, дык і каня запрагаць не варта было-б, — казаў Лабановіч, паважваючы ў руцэ чамадан.

— Навошта-ж, сынок, ты будзеш трапаць ногі? Не звярэдзіцца конь, гуляе цяпер.

Пакінуў Лабановіч грошы на дарогу, як заехаць, а рэшту, рублёў сем, аддаў мацеры.

— Прышлі-ж, сынок, ліст заехаўшы, як ужо будзе табе паводзіцца там.

Пацалавала маці сына і слёзы выцерла.

— Ну, Якуб, бывай, брат, здаровы! На другую зіму да сябе забяру цябе. Добра?

— Добра, — кіўнуў галавою Якуб.

Маці стаяла на дварэ і праводзіла вачамі фурманку, што шыбавала ў бок лесу. Лабановіч азірнуўся, памахаў шапкаю мацеры і сёстрам, кіўнуў ім здалёк галавою. Яшчэ раз азірнуўся назад, як пад'язджалі да лесу. Мільгнуў хутарок са сваім алешнічкам, мільгнуў і схаваўся.

ЧАСТКА ДРУГАЯ

НА НОВЫМ МЕСЦЫ

XIII

Поезд падыходзіў пад Пінск.

Яшчэ не бачаныя краявіды Пінскага палесся, залітыя святлом вераснёўскага сонца, атуленыя тонкаю павалокаю сінечы, поўныя своеасаблівага хараства, першабытнай дзікасці, мяккасці тонаў і нейкай адвечнай задумлёнасці, вынікалі перад Лабановічам, захаплялі сваімі чарамі, неасяжнымі прасторамі зямлі і роўняддзю паземаў, што зліваюцца з небам ці хаваюцца за цёмнасіняю стужкаю бясконца далёкіх лясоў. А на гэтай роўнядзі вынікалі палескія вёскі, дзе над стрэхамі будынкаў высока ўзнімаліся вязы, ліпы і клёны, абсыпаныя золатам восені. Бліскучым срэбрам вывіваліся рэчкі ў нізкіх берагах, раскрываліся шырокія разлогі балотных нізін, заросшых дзікаю травою, аерам і чаротам. Па гэтых дрыгвяных балоцінах, дзе, здавалася, і вады не было, прапіхаліся з чаўнамі рыбакі-палешукі ў сваёй самабытнай вопратцы і шырокаполых капелюшах. Месцамі рассціламіся цэлыя плошчы жоўтых пяскоў, ашлякованых кучаравымі маладымі хвойкамі. Малюнкі борзда знікалі, замяняліся новымі, і не было калі спыніцца на іх, бо поезд імчаўся вельмі шпарка, мінуўшы апошні раз'езд перад Пінскам.

Пасажыраў у вагоне было нямнога, і Лабановіч пераходзіў ад аднаго акна да другога, каб разгледзець гэтую мясцовасць і хоць прыблізна адгадаць, дзе яго новая

школа. У вагоне ён распытаўся аб сваіх Выганах у тутэйшых людзей. Аказалася, што яго новае месца ў пяці вярстах ад Пінска, і гэта вельмі ўзрадавала маладога настаўніка. І яшчэ даведаўся ён, што воласць ад школы зусім блізка. Яму тут і дараду далі, як даставіцца да Выганаў. Для гэтага трэба толькі трапіць на Каралінскі рынак, а там, напэўна, будуць выганаўскія сяляне і за вельмі сходную цану, а то і проста дарма завязуць яго на самае месца.

І гэты ясны дзень, і гэтыя краявіды, поўныя паэзіі, і гэтыя весткі аб новым месцы, сабраныя ў дарозе, — усё гэта памацняла той добры настрой, з якім пад'язджаў Лабановіч да Пінска. З яго зніमаўся цяпер і непакой і клопат знайсці сваю школу, дабрацца да яе.

З чамаданам у руках пацiснуўся ён на станцыю ў густым патоку людскога тлуму. Прайшоў багатую і прыгожую залу першага класа, прайшоў з выглядам чалавека бывалага, для якога ўсё гэта прыгоства і раскоша як-бы былі самымі звычайнымі рэчамі, хоць не мог не заўважыць усю неадпаведнасць свайго ўласнага адзення, у дадатак з гэтым танненькім чамаданчыкам, з убранствам залы і тае шыкарнае публікі, што так важна сядзела за пышнымі сталамі. Усё-ж ён пачуваўся, як чалавек, папаўшы не на сваё месца, яго ўласная асоба здавалася тут занадта мізэрнаю і нязначнаю. Вось чаму ён пачаў шпарчэй праціскацца, трымаючыся больш каля сцяны, каб не замінаць нікому, каб не вярнуў яго назад гэты высокі і грозны швейцар у бліскучых галунах. І толькі прайшоўшы залу і апынуўшыся ў калідоры, уздыхнуў ён лягчэй. Цяпер перад ім стаяла задача: знайсці Каралінскі рынак. Горада ён не ведаў, бо даводзілася быць тут першы раз. Хвіліну пастаяў на ганку перад пад'ездам, дзе тоўпіліся возні́кі, стараючыся перахапіць пасажыраў.

«Лепш будзе ўзяць возніка», — падумаў Лабановіч. Зрушыў з месца, выбраў возніка пабядней і загадаў ехаць на Каралінскі рынак, што быў на другім канцы горада.

Праехаўшы некалькі вуліц і завулкаў, возні́к спыніўся — тут і ёсць Каралінскі рынак. Не спяшаючыся і разглядаючыся, пачаў Лабановіч хадзіць па рынку, шу-

каючы сялянскіх падвод. Сям-там пападаліся тыповыя постаці палешукоў і паляшучак, надзвычайна паважных і нават гордых, бо яны так зняважліва пазіралі на ўсё што не было палешуком, і не надта ахвотна ўступалі ў размовы, якія не мелі беспасярэдніх адносін да іх уласных персон. Па іх думцы, хто не паляшук, той басяк або проста жулік.

— Скажыце, будзьце ласкавы, — зварачаўся настаўнік да некаторых сялян: — Ці не ведаеце, дзе-б тут знайсці каго з выганаўскіх?

Запытаны паляшук разважна падымаў вочы на настаўніка, аглядаў яго і адказваў не адразу. І з гэтага адказу часамі не выплывала ніякай пэўнасці — буркне, каб адвязацца. Але, разглядзеўшы Лабановіча і нешта разважыўшы, часамі гэты-ж паляшук, зноў спаткаўшы яго і даведаўшыся, што гэта настаўнік, расказваў ужо болей падрабязна, дзе спыняюцца выганаўцы, дзе іх можна знайсці. Аказалася, што сёння іх тут зусім не відаць было.

Патупаўшы па рынку і не знайшоўшы нікога з Выганаў, Лабановіч старгаваў за рубель возніка. Хоць заплаціць прыходзіцца дорага, затое-ж ехаць будзе выгодна.

Рэсорная павозка, мінуўшы брукаваныя траскія вуліцы, мякка пакацілася па гладкай пыльнай дарозе, дзе пападаліся часамі прыгожыя адзінокія ліпы і цэлыя купы разложыстых вязаў каля паселішчаў, параскіданых досыць густа ў баку ад дарогі.

Лабановіч уважна прыглядаўся да ўсяго, што пападала ў поле зроку, стараючыся заўважыць кожную драбніцу, як-бы гэта мела для яго нейкае надзвычайна важнае значэнне. І гэтая мясціна яму адразу спадабалася. Зямля навокал была добрая, ураджайная, і народ, відаць, жыў тут заможна. А надвор'е стаяла ціхае, яснае. Хоць дзень ужо змяняўся надвячоркам, але было яшчэ досыць горача. Неба, злёгку агорнутае танюсенькаю белаватаю паволокаю, як-бы шоўкаваю кудзелькаю, здавалася, ніжэй нахілілася над гэтымі паземамі, каб папесціць іх пацалункамі сонечнага святла.

Мінуўшы прыдарожны слуп з дзяржаўным гербам і табліцаю, дзе значылася: «Вёска Выганы, двароў 73

(прычым нейкі жартаўнік сцёр літару «д» у слове двароў), мужчын 269, жанчын 284», возвік спусціўся з горкі і павярнуў направа. Зараз-жа за Выганамі на шырокім пляцы, што раздзяляў дзве вёскі, Выганы і Высокае, паказалася школа, прыветна бялеючы шырока раскрытымі аканіцамі. Лепшай пазіцыі для яе, як паміж дзвюх невялічкіх вёсачак, здаецца, нельга было і знайсці. Досыць вялікі прышкольны агарод, праўда, незасеяны і запушчаны, прымыкаў да плятня казённага ляснічага. Уздоўж плятня цягнуўся цэлы рад высачэзных вязаў, аддзяляючы прыгожы парк ляснічага ад школьнага пляца. Лявей гэтага пляца раскінулася вёска Высокае, дзе з-за дрэў весела выглядалі акуратныя чаротавыя стрэхі сялянскіх хат і клуняў. Ніжэй школы, на адной з ёю лініі, выглядала з-за саду дзякова сядзіба і царкоўны дом, дзе жылі цяпер дзве папоўскія сястры, якіх абмінула замужства, хоць надзеі на яго яны яшчэ не трацілі. У кроках ста ад школы прасторны пляц-выган досыць крута спускаўся да рэчкі Піны, за якою ляжалі неасяжныя прасторы балот, дзе рос густы і незвычайна высокі чарот. Зарэчная балотная роўнядзь злівалася з небам і, здавалася, не мела канца-краю.

Усе гэтыя малюнкі абегла мільганулісяперад вачамі настаўніка, але не было калі затрымацца на іх з тою ўвагаю, якой справядліва яны заслугоўвалі, бо возвік спыніўся перад прасторным школьным ганкам.

Лабановіч саскочыў з павозкі і ўзбег на ганак. Дзверы былі замкнёны, на стук ніхто не азваўся, але вокны ў кватэры настаўніка былі расчынены насцеж. Заліты сонцам пакойчык выглядаў вельмі прыветна. Адтуль пахла свежаю фарбаю. Пад вокнамі ляжалі кучкі друзу. Відаць, тут быў нядаўна рамонт і яшчэ не паспелі зрабіць парадку.

— Пастойце трошкі, — сказаў Лабановіч да возніка, а сам пабег у двор, каб зайсці ў школу другім ходам.

Каля дзвярэй кухні стаяла замурзаная дзяўчынка гадкоў пяці і здзіўленымі вочкамі пазірала на незнаёмага чалавека. На дзвярах вісеў замок.

— А дзе твая маці? — запытаў дзяўчынку Лабановіч.

Дзяўчынка правяла па носе каравым рукавом.

— Пайшла да паненак, — адказала яна і кіўнула галавою ў бок папоўскага дома.

— А мама твая тут жыве?

— Эгэ!

— А бацька твой дзе?

Дзяўчынка пазірала на настаўніка, не ведаючы, што адказаць на гэтае запытанне.

— Ты, можа, паклічаш маму?

— Яна, мусіць, на сяло пайшла, — прамовіла разважліва дзяўчынка. Відаць, ёй не хацелася шукаць маткі, ці яна проста добра не ведала, куды тая пайшла. Яна адвярнулася ў другі бок, перастаўшы цікавіцца незнаёмым чалавекам, а можа, каб паказаць, што гаварыць тут болей з ёю няма чаго, і заспявала песеньку.

Лабановіч пайшоў назад, раздумваючы, што рабіць далей. Вышаўшы з двара школы, ён заўважыў новую асобу. Каравы стары чалавек стаяў каля возніка. Угледзеўшы настаўніка, гэтая асоба ў заношаным паліце на гарадскі лад, доўгавалосая, з неахайным хмызам на твары накіравалася ў бок Лабановіча.

— Педагог? —развязна запытаўся незнаёмы чалавек, асвяціўшы свой хмыз усмешкаю, і падаў руку.

— Так, я назначаны сюды настаўнікам, — адказаў Лабановіч, падаючы руку. Далонь і пальцы ў незнаёмага чалавека былі нейк ненатуральна вывернуты і напаміналі лапу вялізнага крата.

— Ну, будзем знаёмы: ваш сусед, псаломшчык Бацяноўскі.

Нельга сказаць, каб Лабановіч быў вельмі здаволены такім суседствам: дзяк быў занадта каравы і апушчаны, і ў яго твары было нешта такое, што не гарнула да гэтага чалавека.

— Дык як ваша прозвішча? — запытаў дзяк.

— Лабановіч.

— А вы можа з духоўных? — цікавіўся далей дзяк.

— Не, я другой пароды.

— З семінарыстаў?

— Скончыў настаўніцкую семінарыю.

— А вы разумееце царкоўныя спевы?

Гэта распытванне пачынала злаваць настаўніка, тым

болей, што яго чакаў візнік і ён не выясніў яшчэ, як увайсці ў школу. І на апошняе запытанне ён адказаў:

— А вось зачынайце «Іжэ херувімы», дык я вам зараз падцягну.

— І нотнае ведаеце? — не адставаў дзяк.

— Калі трэба, дык і па нотах заспяваю.

— Вось гэта добра! — зарадаваўся дзяк. — Айцец Мікалай прасіў інспектара назначыць сюды такога настаўніка, каб мог наладзіць царкоўны хор.

Гэта было зусім не пад густ Лабановічу, бо па часці царкоўных спеваў ён чуўся вельмі нямоцна, як і наогул у гэтай галіне мастацтва.

— Скажыце, калі ласка, — перапыніў ён дзяка, бо той яшчэ хацеў паставіць нейкае пытанне, — як знайсці тут воласць?

— А вот праехаць сялом на той бок — вярсты не будзе.

— Ну, то бывайце здаровы!

Пакланіўся дзяку і крута павярнуў да возніка.

— Праедзем у воласць!

Яны паехалі, а Бацяноўскі пазіраў услед і ківаў галавою. Відаць, настаўнік не спадабаўся дзяку, бо як-жа асмеліўся сказаць яму, старому чалавеку, зачынаць тут, на выгане, «Іжэ херувімы»? Трэба будзе пагаварыць з а. Мікалаем.

У сваю чаргу сустрэча і размова з гэтым заскарузлым дзяком трохі папсавала настаўніку яго добры гумор. Асабліва не спадабалася яму, што а. Мікалай прасіў інспектара назначыць сюды спевака. Ён падумаў аб а. Мікалаю: «Што гэта яшчэ за тыпус такі? І прыдзецца-ж да яго зайсці гэтымі днямі». Але ўсё гэта хутка згладзілася, сцерлася з памяці, і ён з вялікаю зацікаўленасцю разглядаў двары тутэйшых сялян. У сяле была адна толькі вуліца, а будынкі далёка цягнуліся ў глыб двароў. Мінулі цэркаўку і новы папоўскі дом. Яшчэ праехалі некалькі двароў і павярнулі да валаснога праўлення.

На ганку перад зборняю спаткаў Лабановіча валасаты сторож дзед Піліп. Гэта быў каржакаваты, крэпкі і ўвішны яшчэ старычына з доўгім чырвоным носам і вострымі, пранізлівымі вачамі.

— Дзень добры, дзеду!

— Дзень добры, панычу!

— Можна пабачыць пісара?

— У канцылярыі паныч сядзіць. А вы-ж хто будзеце? — запытаў дзед.

— Настаўнік вашай школы.

— А, дык гэта паныч — настаўнік!?

Дзед Піліп, здавалася, зарадаваўся, што прыехаў настаўнік. Ён прыветна засмяяўся і, як нейкаму даўно чаканаму госцю, шырока расчыніў дзверы.

— А наш паныч такі казаў, што павінен скора прыехаць новы настаўнік. Вось вы і прыехалі.

«Цікавы дзед», — думаў Лабановіч, разглядаючы самабытную постаць дзеда Піліпа.

— Дайце ваш чамадан, я занясу яго ў пакой для прыезджых.

Дзед узяў чамадан з рук настаўніка, паказаўшы рукою на канцылярыю.

XIV

Прайшоўшы прасторную зборню, чыста падмеценую, але ўсё-ж брудную, бо на падлозе было не менш, як на корх, засохшай гразі, нанесенай сюды з усіх канцоў воласці, Лабановіч адчыніў дзверы ў канцылярыю. Гэта быў светлы і таксама прасторны пакой, разгароджаны балясамі, за якімі стаяў доўгі стол, абіты цыратаю. Над ім са сцяны пышліва схіляліся строгія, размалёваныя цары і царыцы ў пазалочаных рамах. За сталом сядзелі дзве асобы. Памочнік пісара быў яшчэ зусім малады бязвусы хлапчук з маленькімі шэрымі вочкамі, хітрымі і трохі насмешлівымі. Белая манішка і прылізаныя валасы казалі аб яго зухаватасці, а хітрыя вочкі і жулікаватая ўсмешка сведчылі аб здольнасцях выуджваць грыўні і саракоўкі з паляшуцкіх кішэняў. Другая асоба — сам пісар, таксама малады, але больш сталы. У пісара былі чорныя вусы, праўда, кароткія, і рэзка азначанае месца барады, заросшае кароткаю ґустою шэрсцю, невялікі задзёрты нос і прыплюшчаныя блізарукія вочы, прыкрытыя цёмнымі акулярамі. Пісар сядзеў, нізка спусціўшы ў паперы галаву, і нешта пісаў.

Лабановіч спыніўся каля балясаў і прывітаўся.

Памочнік спыніў работу, кіўнуў настаўніку галавою і чакаў далейшага выяснення справы. Пісар не адрываўся ад папер.

— Выбачайце, што я перабіваю вам работу, — загаварыў Лабановіч і адрэкамендаваўся.

— А-о-о! — азваўся тады пісар, борзда ўстаючы і праводзячы настаўніка за балясы. Тут ён падаў крэсла і папрасіў Лабановіча сесці.

— Школа мая аказалася замкнутаю з усіх канцоў, і я ніяк не мог туды ўвайсці. Прыехаў да вас, каб навесці спраўкі. Дзе-ж мне прыпыніцца?

Пісар засмяяўся.

— І школа, кажаце, ёсць, а спыніцца няма дзе. Ну, нічога, усё будзе добра.

— Раз ужо заехалі да нас, то ўсё роўна, як хрысту за пазуху папалі, — у тон пісару дадаў памочнік.

— За пазухай не надта ўжо цікава сядзець, — засмяяўся Лабановіч. — А ў школе, здаецца, рамонт быў?

— Быў, быў! Я пастараўся ўжо адштукаваць вам кватэрку на пяць з плюсам.

Пісар, як відаць, стараўся пусціць трохі пылу ў вочы, і ўсе важныя мерапрыемствы ў значнай меры прыпісваў сабе. Калі ён гаварыў, дык нейк падціскаў губы і дробненька трос галавою. Пісарскае самахвальства адразу кідалася ў вочы. Каб яшчэ больш заахвоціць яго, Лабановіч тут-жа падзякаваў і пахваліў яго за добрыя адносіны да школы, зазначыўшы, што такіх слаўных пісароў не надта многа на свеце.

— Ну, што вы кажаце? — Адразу відаць было, што гэта пісару спадабалася.— У нас з настаўнікам заўсёды былі самыя лепшыя адносіны, школа ад нас ні ў чым не цярпела, — важна сказаў пісар і патрактаваў Лабановіча папяросаю.

— Дайце ўжо і мне пусціць дым з прычыны такога важнага здарэння, — працягнуў руку да пісаравых папярос памочнік, бо звычайна пісар ухіляўся частаваць яго папяросамі, хоць і быў лібералам.

Лабановіч зноў пачаў гутарку.

— А пры школе-ж, здаецца, жыве хтось?

Пісар і памочнік зірнулі адзін на другога і нейк хітравата-памаўзліва пасміхнуліся.

— Жыве там... старожка.

— Дык гэта, мусіць, яе дзяўчынку бачыў я там каля кухні?

Пісар выпускае дым і адначасова выдае скрозь прыцятыя губы нейкі спецыфічна свой гук «псс», трасучы галавою.

— Так, гэта яе дачка Юста, а скора і... сын будзе... напэўна, сын, мяркуючы па бацьку.

Пісар і памочнік зноў пераглядаюцца і смяюцца.

— Мітрафан Васільевіч не павінен даць маху, — дадае памочнік, і маленькія вочкі яго амаль зусім засланяюцца смехам.

Лабановіч глядзіць на іх, дагадваецца аб нейкай раманічнай гісторыі. Ён адчувае, што гэта гісторыя стане зараз вядома.

— А хто такі Мітрафан Васільевіч?

— Гэта ваш папярэднік.

— А... Ну, цяпер я ведаю, у чым тут справа.

— Нашкодзіў, а сам у Пінск уцёк.

І пісар зноў пачаў смяяцца.

Нецікава было весці далей гутарку ў гэтым тоне і калупацца ў людскім брудзе. Лабановіч рад быў-бы сядзець цяпер у сваёй школе. Хацелася асталявацца там і пачаць нешта рабіць, разабраўшыся ў новай абстаноўцы.

Дзён тры Лабановічу ўсё-ж-такі прышлося пабыць у валасці на кватэры пісара, пакуль школа прыводзілася ў парадак. Праўда, няшмат патрэбна было, каб зрабіць гэта: выслаць некалькі жанчын памыць падлогу ды прыбраць друз каля школы. Усё гэта абяцалі выпаўніць на гэтых днях. Астаноўка была толькі за старастам Бабічам, які павінен быў выправіць на работу жанчын. Але стараста займаўся дзесь іншаю справаю.

Гэтыя дні Лабановіч жыў і сталаваўся ў пісара. Ён быў чалавек халасты, гасцінны. Пры ім жыла старая маці. Родам яны былі са Случчыны, і Лабановіча лічылі сваім чалавекам. Апрача таго, старэйшы пісараў брат быў таксама настаўнікам на Піншчыне.

Будынак валаснога праўлення стаяў на горцы над самаю Пінаю. Адгэтуль адкрываецца надзвычайна шы-

рокі і прыгожы від на зарэчную частку. Каля самага сяла праходзіць шырокая дуга ракі. Яе хутчэй можна прыняць за затоку, а не за самую рэчку, бо вада цячэ вельмі ціха. Круглыя зялёныя лопухі купаюцца ў ёй, калышацца расянка на тонкіх доўгіх ніцях-сцяблінах.

Адхонны бераг Піны застаўлен чаўнамі і чайкамі-душагубкамі. Быстра слізгацяць душагубкі па люстранай вадзе пад лоўкімі ўзмахамі вёсел прывычных палешукоў і паляшучак. Вось з-за рачных заваротаў выплываюць рыбакі са сваімі снасцямі; сур'ёзныя, павольныя постаці. Селянін-гаспадар шыбуе з таго берагу, з душагубкі звешваюцца махрастыя пукі чароту і жмуты жорсткай асакі. Гоніць чайку грабец. На другім канцы сядзіць са стрэльбаю паляўнічы. Зоркія вочы пільна ўглядаюцца ў лінію дугі каля берагу. А сярод гэтай драбязы чаўноў і душагубак цісне павольна паважны «дуб» з рознымі таварамі і прадуктамі.

За шырокаю бліскучаю дугою ляжыць, як мора, неасяжны прастор балотных зараснікаў, дзе ўсё згладжваецца, закрываецца роўнаю сцяною высозных чаротаў з бурымі мяцёлкамі. І ўвесь гэты зараснік, гэтая жывая коўдра вісіць-хістаецца над дрыгвяною багнаю бяскрайніх балот, дзе не пройдзе чалавек, дзе толькі можа з трудом прасунуцца лёгкі човен або чайка-душагубка, угінаючы балотную покрыўку, на якую набягае вада. Незнаёмаму з тутэйшымі балотамі чалавеку небяспечна забірацца ў гэтыя нетры: заедзеш, ашаломішся, заблудзіш і не патрапіш выбрацца, бо, апроч густых чаротаў ды неба над галавою, нічога не ўбачыш. Прападзеш, калі не выратуюць людзі. На гэтым балотным прасторы пападаюцца вузкія, чорныя, як растопленая смала, палосы вады, страшныя сваёю маўклівасцю і глыбінёй. Тут праходзяць рэчкі Струмень, Стаход і Стыр, дзесь па той бок балотнай роўнядзі.

Лабановіч цэлымі гадзінамі праседжвае ў воласці каля адчыненага акна, любуецца прасторамі балот, поўнымі своеасаблівага прыгоства і жыцця.

А надвор'е на здзіўленне ціхае, яснае, цёплае. Сінявацая смуга звісае над зарэччам. Журботна-ласкавая ўсмешка восені разліта на занямелых, як-бы заснуўшых далях. Вынікае, далёка-далёка, белаваты дымок рачных

параходаў. Здаецца, ён стаіць на адным месцы — так павольна здалёк вызначаецца лінія яго руху. І доўга трэба сачыць, углядацца, каб заўважыць рух белаватага дыму над пабурэлымі ад часу чаротамі.

Адна з'ява асабліва зацікавіла тут Лабановіча: раптам то ў адным, то ў другім месцы паднімаецца палавое воблака дыму, выбліснe агонь, разбягаючыся па крузе. Пройдзе хвіліна, другая, дым прападзе, і знікне агонь — не пад сілу яму змагацца з стыхіяй балот, не можа ён разгарнуць тут сваіх гарачых крылляў. Крыху счакаўшы, агонь выбухае ў другім, у трэцім месцы, а то ў некалькіх мясцінах адразу. Гэта сумысля падпальваюць балота палешукі, каб на выгаралым месцы расла налета маладая, лепшая трава.

Пазірае Лабановіч на гэтыя з'явы-малюнкі, убірае іх у сваю істоту, злучаецца з імі, імі жыве, адчувае як-бы нейкую блізкасць да іх, спачуванне, прыязнь, дружбу. Яму хочацца яшчэ болей шчыльна зліцца з імі, расплысціся ў павабнай далечы-прасторы і самому стацца гэтым прасторам. У душы ўзнікаюць нейкія поўныя чараў няясныя вобразы, і часамі мільгаецца штось як-бы даўно знаёмае, бачанае, перажытае. Але дзе і калі? Ці гэта толькі водгалас уласных летуценняў, снення, ці сапраўды ён перажываў ужо нешта падобнае? На нейкі момант настаўнік забывае, дзе ён, як-бы зусім адрываецца ад зямлі і ад рэчаіснасці.

Але гучныя галасы зямлі і моцныя ніткі рэчаіснасці, каб можна было надоўга забыцца аб іх. У валасці толькі ў некаторыя дні і гадзіны бывае зацішак, такі зацішак, калі нават памочнік пісара вылезе з-за стала і на некаторы час знікне. Звычайна-ж тут, на зборні ці ў канцылярыі, таўчэцца народ. Прыходзяць людзі па сваіх справах, а спраў гэтых у валасці многа. Ці скаргу напісаць на суседа, ці заключыць кантракт, ці нядоімку ўнесці, ці льготу сыну зрабіць, ці копію ўзяць, ці проста так сабе пісара пабачыць, шапнуць, таемна кіўнуць яму галавою, каб вышаў у пакой для прыезджых, дзе ўжо пачціва, стаіўшыся ў куточку, стаяць пакорлівыя бутэлькі піва.

Шумна і гучна прыходзіць сюды старшыня Захар Ле-

меш. Яго ногі яшчэ не паспеюць як след стаць на ганку за зборняю, а ўжо у канцылярыі кажуць: «Старшыня ідзе». Гучны голас старшыні паперараджае самога старшыню. Як капітан з салдатам, паздароўкаецца ён яшчэ з двара з дзедам Піліпам, а той адкажа яму па-салдацку: «Здравя жылаю, гаспадын старшыня», хоць ні старшыня, ні Піліп у салдатах не служылі. Калі-ж дзед на вочы не пападзецца, то старшыня пусціць свой голас да кагонебудзь на зборні. А калі і на зборні пуста, нікога няма, дык ён прарэжа гучным голасам і гэтую пустату: «Братцы мае, нікога няма!» Бо голас у старшыні моцны, ён любіць свой голас: голас дае яму пашырэнне ўласнага «я». Пісар-жа і памочнік патураюць яму. Пісар сцвярджае, што такога старшыні ва ўсім Пінскім павеце няма, а памочнік не раз гаварыў: «Нашаму-б старшыні паліцмайстрам быць». Усё гэта кружыць галаву Захару Лемешу. Ды ён-жа — гаспадар воласці!

Захар Лемеш — фігурны чалавек. Як для старшыні, ён яшчэ зусім малады, гадоў пад трыццаць пяць. Да таго-ж ён і бялявы, а бялявасць мае тую ўласцівасць, што паказвае чалавека маладзейшым. Барады ў старшыні няма і вусы вышлі слаба, але твар энергічны і досыць прыгожы. Губы, хоць трохі таўставатыя і часамі крывяцца, але гэта ўжо — здабытак яго старшынскай важнасці, а не падарунак прыроды. Зеленаватыя вочы умеюць быць злымі і строгімі, хоць сам старшыня чалавек не злы. Калі ён уваходзіць у канцылярыю, то шумна ідзе за балясы, громка здароўкаецца з пісарам і з памочнікам і важна садзіцца за стол, прычым крэсла пад ім рыпіць, трашчыць і хістаецца, бо старшыня — мужчына ёмкі, шырокі, як добрае шула ў гумне заможнага гаспадара.

— Слухай, пісар: трэба купіць нам добрых крэслаў, бо на гэтай рундзе і сядзець нельга. — «Рунда» ў старшыні азначае — ерунда.

Затым старшыня пераводзіць вочы на царскія партрэты і на рамы, што сам выбіраў. Ён цешыцца з цароў і асабліва з царыцы. А часамі не ўтрывае і скажа:

— Эх, ядры яго качан. Убрацца-б, як цар, ды мець-бы сабе такую маладзіцу!

Пасля гэтага старшыня пытае ў пісара, як справы

ідуць, што зроблена, што трэба зрабіць, куды паехаць у першую чаргу і да каго заехаць, зрабіўшы справу.

— Ну, дай папяросу, — гаворыць у заключэнне старшыня.

Калі часамі памочнік пісара працягне яму свае папяросы, старшыня зняважліва махае рукою і гаворыць:

— Рунда твае папяросы!

Ён ведае, што пісаравы папяросы даражэйшыя, хоць распазнаць гэта сваім уласным смакам не можа, бо старшыня не курэц, а курыць толькі пры выкананні старшынскіх абавязкаў для большай саліднасці і важнасці. Ён часамі нават і сам купляе пачачкі папярос па дзесяць штук, за тры капейкі пачак, бо не заўсёды-ж пад рукою бывае пісар, дый яно яшчэ важней выглядае, калі старшыня пры людзях вымае са свае кішэні папяросу.

— Пры службе, бач ты, без гэтага трудна абысціся, — гаворыць старшыня, калі хто заўважае, што ён курыць пачаў.

Сюды-ж вольным часам заходзіць і царкоўны староста Грыгор Крэшчык, крапак-старычына гадоў за шэсцьдзесят. Ён любіць кампанію вышэйшага палёту, любіць пасядзець, пабалакаць, парагатаць і аб царкоўных справах завесці размову, бо Крэшчык больш за папа дбае аб добрабыце царквы. Таксама ахвотнік ён хлабыснуць піва. Часамі з півам і прыходзіць сюды ды яшчэ і рыбіну ў дадатак прыцягне, каб пісарава маці зрабіла фрыштык. Грыгор Крэшчык рагоча заліхвацка. Пагутарыўшы аб святых справах царкоўных, ён так ці іначай скіруе размову і на прыгожых маладзіц. Адным словам, чалавек—душа.

Сельскі староста Бабіч — ціхі чалавек, лагодны. Сам ён гаворыць мала, а толькі слухае, як другія сакочуць, прычым на яго твары ўвесь час красуе найдабрэйшая ўсмешка. Ніхто так не ўмее слухаць, як Бабіч: уважна, спагадна, прачула. Часамі ён смяецца ўголас, махнуўшы рукою і спусціўшы лысую галаву. А калі адпаліць хто што-небудзь вельмі сакавітае, тады староста замахае абедзвюма рукамі і смяецца, круцячы галавою. Прыемна расказваць такому чалавеку.

І пісар, і старшыня, і абодва старасты агортваюць Лабановіча сваёю ўвагаю, частуюць півам, падбадзёрваюць,

каб быў весялейшым, бо тут няма прычыны быць невясёлым: і маладзіц харошых многа і паненак стае — у першую чаргу дзве сястры-пападзянкі і дзякова Даша, і ўсе яны амаль на адным двары са школаю.

Слухае настаўнік ды пасміхаецца, а сам думае — хутчэй-бы ў школу сваю перайсці.

XV

Лабановіч любіць сваю новую школу. Адразу нейк да душы прышлася, бо нават і знадворны выгляд яе такі, як быццам-бы яна ўсміхаецца табе прыветнаю ўсмешкаю. І ганачак такі прытульны, просты, без усякіх лішніх выдумак. Ну, вось так часамі і горне пасядзець, паслухаць штодзённае водгулле наўкольнага жыцця, яго адвечную песню, дзе галасы людскога шуму будзяць, жывяць і поўняць прасторы зямлі і нейкім дзівосным водгаласам закідаюцца ў тваю душу. Асабліва гучна звініць гэтая песня надвячоркам або раніцаю, калі паветра такое пяшчотна-чуллівае, што кожны гук плыве-разыходзіцца па яго струнах у працяглых музычных тонах.

Улева ад школы, у трох чвэрцях вярсты, пралягае чыгунка. Высокія слупы з туга нацягнутым дротам, бы нейкія музыкі, складаюць гімны людскому розуму. Пераможнаю радасцю гучаць жалезныя колы вагонаў, і гэтае гучанне падхоплівае зарэчны чарот, ператвараючы яго ў цэлую мяцеліцу адрывістага смеху-шасцення. А справа, з глыбі зарэчча, бы звер з нутраў балот, гудзе кароткі нізкі голас парахода. Цэлая сімфонія гудкоў, змякчаная далечынёю, бяжыць-плыве сюды з горада, дрыжыць-трасецца ў паветры, як срэбраны звон на вострым металічным шпяні. Сюды-ж, у гэтую сімфонію фабрычных гудкоў, далучаецца грукат і клыганне сялянскіх калёс, гоман рыбакоў, стук вёсел і закацісты смех вясёлага чалавека ці ядраная лаянка ўзлаванага сэрца.

Задаволены Лабановіч і сваёю кватэраю. І параўнаць не можа яе з цельшынскаю. Тры светлыя, прасторныя пакойчыкі, акуратна адрамантаваныя, пабеленыя, чыстыя. Аглядае іх, цешыцца, усміхаецца сам сабе і сам сабе кажа: «Добрую маеш, брацe, кватэру». Асабліва яму да гус-

ту сярэдні пакойчык. Адно акно выходзіць на выган, другое — на зарэчча. У гэтым пакойчыку і будзе яго сталае месца.

У кухні жыве старожка Ганна, жанчына гадоў за трыццаць пяць, з малою дачкою Юстаю. Юста ціхенька сядзіць каля печы, голасу яе не чуваць, бо маці не дазваляе ёй ні песні заспяваць, ні громка загаманіць. Ганна так баіцца новага настаўніка. Яна ўпэўнена, што ён скажа ёй выбірацца вон са школы: нашто яна яму такая брыдкая ды яшчэ цяжарная? Каму-ж гэта ахвота слухаць піск дзіцяці, а яно будзе ў яе месяцы праз тры-чатыры? Не бываць ёй у школе — і людзі кажуць так.

У кухні адбываецца вялікая пакута чалавечай душы. Але хто ведае аб ёй? І каму ведаць цікава? Людзі могуць толькі паспагадаць, але ўзяць на сябе частку людскога гора ніхто не хоча. Ніхто не хоча пусціць Ганну да сябе ў хату, а свайго прыпынку ў яе няма. Праўда, у Ганны ёсць муж, п'яніца-жабрак. Але яна ўжо некалькі гадоў як кінула яго, бо ён злы, нягодны. Біў яе без усякай прычыны, можа, таму, што на свеце жыць нялёгка. У школе асталявалася была Ганна, і жылося ёй някепска. Але зноў-жа гэтае няшчасце... Ганна ўспамінае Мітрафана Васільевіча, настаўніка, што быў перад гэтым. Ну, што яна магла зрабіць? Баялася працівіцца, каб месца не страціць, бо хто заступіцца за яе? Ды лепей было-б страціць тады, з адным дзіцем, чым траціць цяпер. І Ганна боязна прыслухваецца да кожнага руху, да кожнага кроку настаўніка ў яго пакоях. У яе ёсць маленькая надзея на старшыню, на пісара, на бацюшку, бо да іх звярталася яна, каб закінулі хоць адно слоўка перад настаўнікам. Але ні старшыня, ні пісар нічога аб ёй не казалі Лабановічу, а поп яшчэ і не бачыўся з ім. Старанна прыбрала яна кухню, змяла, выцерла кожную пылінку. Два разы перамыла падлогу ў пакоях настаўніка, пасыпала жоўтага пясочку каля кухні. Усё, што толькі можна было зрабіць, каб чыста было, яна зрабіла і цяпер са страхам чакала вырашэння свайго лёсу.

Лабановіч заходзіць у кухню. Яму цікава паглядзець на сваю старожку, чыя асоба звязвалася раманічнаю гісторыяй з асобаю яго папярэдніка, гэтага самага Мітрафана Васільевіча.

Пужліва стаіць Ганна, і сэрца яе калоціцца.

Лабановіч першы раз бачыць такую брыдкую, няўдалую жанчыну. Постаць яе нясkладная, тапорная. Маленькія піўныя вочкі глыбока ў лоб заходзяць. Але гэта ўсё нічога, — нос, вось дзе ўсё няшчасце беднай жанчыны. Носа, можна сказаць, і няма; пярэдняя частка яго правалілася, тырчыць каля вачэй агрызак носа. Нос ці, праўдзівей, бязноссе робіць твар жанчыны страшэнна брыдкім, пачварным, а голас гугнівым. Радзілася яна такою. Як нейкі праклён, носіць на сабе грэх бацькоў сваіх. Юста сядзіць ваўчком на тапчаніку каля печы і паглядае, бы той звярок, на настаўніка. І яна баіцца яго: ад маткі чула, што гэты незнаёмы чужы чалавек можа прагнаць яе з гэтага тапчаніка, дзе яна спіць з маткаю.

Настаўнік здароўкаецца са старожкаю, азірае кухню, мяркуючы, як разгаварыцца тут.

— Даўно вы тут жывеце? — пытае Ганну.

— Другі год, панычку, — гугніць тая.

— Умееце вымесці школу?

Ганна ніяк не чакала такога пустога запытання, і ёй робіцца смешна.

— Ото дзіва што ўмею! І памыць мажу.

— Ну, а вот абед зварыць вы можаце ці не?

Ганне робіцца трохі лягчэй.

— Мажу, панычку, абы толькі было з чаго!— весялей адказвае Ганна.

— О, гэта добра,— заўважае настаўнік. А потым ён заклікае яе да сябе, каб пагаварыць з вока-на-вока.

— Вось табе дзевяць рублёў — пенсія за тры летнія месяцы, што належыць з воласці. Ты сабе заставайся тут, даглядай школу і рабі ўсё, што трэба сторажу рабіць. Раніцаю да заняткаў і вечарам пасля заняткаў школу трэба чыста вымесці, нанасіць вады дзецям, а зімою і печ выпаліць.

— Ды ўжо-ж буду, панычку, старацiся!— гаворыць шчаслівая ў гэты момант старожка.

Лабановіч трохі замяўся, хацеў запытаць пра свайго папярэдніка, як усё магло здарыцца, але палічыў, што гаварыць аб гэтым нялоўка, і толькі сказаў:

— А далей вось што. Калі надыдзе час радзіць, ты загадзя падшукай сабе іншы прыпынак на тыдзень ці на

два, бо ў школе гэта нядобра, а потым сабе вернешся і будзеш тут жыць. Я за гэты час з грошай тваіх нічога не буду вылічаць. Наймі на сваё месца каго, а заплачу я сам.

Ганна слухае, спусціўшы галаву.

— Добра, панычку. Я-ж ведаю гэта і сама.— І пачынае выціраць хвартухом вочы.

— Ну, вось і ўсё, што меў я сказаць.

Ганна выходзіць у кухню. Яна сядзіць там некаторы час і плача. Плача ад радасці і гора. Той цяжар, што так даўно насіла яна ў сабе, цяпер зняты з яе. Але-ж наперадзе горкае і цёмнае жыццё з малымі дзецьмі, з якіх адно яшчэ не нарадзілася, жыццё па чужых кутках, сярод чужых людзей. Чуваць, як усхліпвае яна і хрыпіць сваім няўдалым носам.

Пакуль не пачалася работа ў школе, вольнага часу многа. Цэлымі гадзінамі капаецца Лабановіч у школьных кнігах, паперах, прыводзіць у парадак школьную маёмасць, прачытвае ўвагі інспектараў народных вучылішчаў. Па гэтай перапісцы знаёміцца з гісторыяй свае школы, з настаўнікамі і настаўніцамі, што былі да яго, вялі тут работу. Дзе яны цяпер? Напэўна, каго-небудзь з іх і на свеце няма, бо даўно ўжо былі яны тут. І мімаволі нейк робіцца журботна. Сляды гэтых невядомых яму людзей засталіся ў паперах, а дзе яны самі? І ад яго застанецца такі-ж след, а самога тут не будзе. Яму ўспамінаецца Цельшына. Вось цяпер яго там няма, а такі-ж папяровы след застаўся. І зноў цэлы рад вобразаў выплывае ў памяці паміма яго волі, і сэрца шчыміць болем утраты. Гэтая старая перапіска невядомых людзей і гэтыя старыя кнігі, прадукт мыслі даўно памёршых аўтараў, як магільныя цені, кладуцца на сэрца маладога настаўніка, і яму робіцца яшчэ больш маркотна, і ён адчувае сваю адзіноту на свеце.

Пераглядаючы спісы вучняў, ён заўважае, што паміж іх не сустракаецца дзяўчатак. Відаць, няма тут звычаю пасылаць іх у школу. Трэба будзе, зазначае сабе настаўнік, пагаварыць з сялянамі на сходзе, давесці ім, што і жанчыне навука патрэбна, яшчэ, можа, больш, чым мужчыну. І яго думкі ідуць у новым кірунку.

Лабановіч ужо з практыкі ведае, што пакуль ёсць ра-

бота дзецям дома, пакуль не наступіць позняя восень, сабраць іх у школе трудна. Неакуратны-ж і неаднačасны збор перашкаджае нармальнаму ходу заняткаў. Дык лепш наўперад склікаць адных навікоў, падагнаць іх трохі, а ўжо крыху пазней сабраць рэшту вучняў. На дваццатае верасня назначае ён збор навікоў, гэта значыць цераз два дні. У Цельшыне работа пачалася ў школе значна пазней. Значыцца, цяпер будзе болей часу, і ён больш зробіць. Яшчэ адзін клопат трэба было збыць настаўніку — зайсці з візітам да суседзей і ў першую чаргу — да а. Мікалая, як да самай важнай у сяле асобы, а потым да ляснічага, да пападзянак і да дзяка Баცяноўскага, з якім ужо ён пазнаёміўся. Не падабалася настаўніку такая місія, але пайсці трэба было,—так вымагаў звычай. Не пойдзеш — нажывеш сабе ворагаў.

Вечарам таго-ж самага дня, калі Лабановіч асталяваўся ў школе, пайшоў ён да папа.

Айцец Мікалай жыве ў новым доме недалёка ад царквы. У вялікую заслугу ён ставіць сабе пабудову гэтага дома, і калі гаворыць аб ім,—а гаворыць ён кожнаму,— дык паказвае свае рукі, на якіх да гэтага часу засталіся сляды мазалёў. І пры гэтым не забывае прывесці тэкст са святога пісьма: «У поце ліца твайго будзеш ты есці хлеб твой». Месца, дзе цяпер стаіць новы дом і ўсе гаспадарскія будынкі, вельмі спадабалася а. Мікалаю, і ён надумаўся заснаваць тут сядзібу. Але самы пляц ніяк не надаваўся для будоўлі: няроўны, пакаты, запушчаны. Айцец Мікалай уласнымі рукамі раўняў зямлю, зразаў цэлыя горы, як ён казаў, і калі можна з чым параўнаць гэтыя цяжкасці, дык толькі з пераходам Суворава цераз Альпійскія горы. А колькі было клопату!.. Айцец Мікалай тут махае рукою і пераводзіць вочы кудысь у неазначаныя прасторы, і твар яго робіцца тужлівым. Але гэта цягнецца толькі момант, бо яго турбота, яго, можна сказаць, пакута шчодра акупілася вынікам намаганняў.

У такіх выпадках а. Мікалай не ўтойвае нават таго факту, як ён вясною гэтага года сустракаў з прамоваю ў царкве архірэя і трохі памыліўся. У гэтай прамове гаварыў ён і аб цяжкасцях, з якімі прыходзілася «воздвигать», выконваючы запаведзь божую, гэты свой новы Ерусалім. Адносна-ж турбот сваіх ён сказаў:

— Я перанёс, перацярпеў, як Фёдар Міхайлавіч Дастаеўскі.

Архірэй тут-жа заўважыў:

— Ойча! Няўжо-ж ты не ведаеш прыкладаў пакуты і цярпення з жыцця святых угоднікаў божых, што спасылаешся на свецкага пісьменніка?

Ну, памыліўся. Айцец Мікалай і сам смяецца цяпер з гэтага.

Айцец Мікалай сустрэў настаўніка досыць ветла. Здавалася, што рады быў пабачыць яго. І пасля некалькіх кароткіх слоў а. Мікалай заўважыў:

— Вы паісціне паступілі па-хрысціянску.

Лабановіч недаўменна глядзіць у вочы а. Мікалаю.

— Вы, знаеце, зрабілі нейлепшае ўражанне на сялян, — гаворыць далей а. Мікалай.

— Чым-жа гэта? — пытае Лабановіч.

Айцец Мікалай па-сяброўску стукае настаўніка па плячы, а сам смяецца дробным смяшком, прычым гэты смех нейкі працяглы, выходзіць знізу, як-бы там нешта надушвае жывот.

— Быццам-бы не ведаеце? — гаворыць а. Мікалай: — Вы прыхілілі бяздомнага чалавека. Нават пенсію за ўсе летнія месяцы аддалі.

Айцец Мікалай крута мяняе тон і раптам кажа:

— І як гэта Мітрафан Васільевіч пагнаўся на яе? Вы-ж бачылі, які гэта вырадак... Яна прасіла мяне закінуць перад вамі слова, але я не адважыўся. Па сумленню вам скажу: я не пакінуў-бы яе.

— Шкада-ж выкідаць чалавека. Ну, дзе-ж ёй падзецца? І не яна вінавата ў тым, што яна — вырадак, што над ёю, праўду сказаць, зроблены здзек.

— Так, так, — згаджаецца а. Мікалай, і твар яго робіцца засмучаным, а вочы глядзяць у неазначаныя прасторы. — І ўсе-ж-такі вы — гуманны чалавек. Вы гэтым заваявалі сімпатыі сялян.

Потым а. Мікалай паказвае настаўніку свой дом, сляды мазалёў на руках ад цяжкае працы. Расказвае аб прамове сваёй, аб Фёдару Міхайлавічу Дастаеўскім, і яго калыша працяглы смех. Аглядаючы апартаменты а. Мікалая, Лабановіч мімаволі адчувае тут нешта спецыфічна папоўскае. Яму прыходзіць на памяць а. Кірыл:

тое самае адчувалася і там — нешта затхлае, мёртвае, трупянoе. І нейкая новая думка закідаецца ў душу, але ён не можа думаць тут, бо трохі чопарная маленькая матушка заклікае на шклянку чаю.

XVI

Эх, і пагодка-ж стаіць на Палессі!

Толькі старыя людзі памятаюць такія прыгожыя дні. Цеплыня, цішыня, яснасць. У сіняй смузе песцяцца далі. Залатая чырвань лістоў нерухліва звісае на купчастых галінах высокіх вязаў. Цёмныя ночы тояць нейкі ўрачысты спакой, і неба ніжэй нахіляецца да зямлі, каб падслухаць яе адвечную скаргу. А квяцістыя зоры, бы дыяменты, усыпаюць усё неба, дрыжаць, пераліваюцца колерамі вясёлкі, аб чымся бязмежна вялікім гамоняць тваёй душы, клічуць шырэй разняць крылле і ляцець у сусвет, каб пабачыць яго веліч і пачуць сваю нязначнасць, рассунуць цесныя граніцы гэтага жыцця-клопату на зямлі і пазнаць яшчэ нязведаную радасць.

Эх, пагодка, пагодка!

Пачынаюць другі раз зацвітаць сады... Старыя людзі кажуць, што гэта — на цяжкі год...

Ажыла Выганаўская школа. Звіняць дзіцячыя галасы. На прасторным пляцы каля школы дзецям так слаўна пагуляць у часе перапынкаў. Каля дваццаці навікоў запісалася ў першы-ж дзень прыёму. Але сярод іх няма ніводнай дзяўчынкі, хоць настаўнік зрабіў усё, што можна, каб прывабіць іх да навукі. Сяляне знаходзілі, што дзяўчатам навука не патрэбна: і так з бабамі трудна зладзіць, а што з іх будзе, калі яшчэ вучонымі стануць. Хлопцы і тыя не ўсе ходзяць у школу. Дык няхай дзяўчаты сядзяць дома ды кудзелю прадуць.

Гутарачы з сялянамі па гэтай справе, даведаўся Лабановіч ад аднае маладзіцы, чаму мацеркі не пускаюць дачок у школу. Гадоў пяць таму назад хадзіла вучыцца адна дзяўчынка, адна на ўсю школу. І бралася яна добра, ды захварэла нейк зімою і памерла. Напэўна, з навукі і хворасць сталася. Так думаюць мацеркі, і ніхто з іх

пасля гэтага не адважваецца паслаць сваю дачку ў школу.

Цяпер у Лабановіча ўжо трохі ёсць настаўніцкая практыка. Пакуль што ён больш гуляе з дзецьмі, чым вучыць іх,— няхай прывыкаюць да школы, асвойваюцца з вучнёўствам, паволі ўцягваюцца ў сваё новае жыццё. І ён займаецца толькі да абеду. А сярод малых ёсць такія слаўныя хлапчукі, і асабліва з іх грамадкі выдзяляецца Алесік Грылюк. Алесік страшна закіданы і адзеты бядней за ўсіх. Кашулька ў яго падраная, нямытая, заношаная.

— Чаму-ж ты такі замурзаны?— пытае яго настаўнік.

Алесік маўчыць. За яго адказваюць малыя.

— Ён — сірата, у яго маці памерла.

Алесік журботна схіляе галоўку і лёгенька перабірае пальцамі па лаўцы.

Шкада хлапчука.

Лабановіч маўчыць, пазірае на яго, потым падыходзіць і лагодна кажа:

— А ўсё-ж, браток, ты ўжо сам вымыцца можаш.

Заводзіцца гутарка аб чыстаце, бо ўсе хлапчукі не святыя ў гэтым. Валасы ў іх доўгія, нячэсаныя; прыгледзішся — вошы поўзаюць. Рукі — хоць рэпу сей.

У школе ёсць машынка. На школьным двары ў часе перапынку стрыжэ настаўнік сваіх маленькіх вучняў. Тут-жа стаіць сподачак з газаю і вата. Астрыжэ — памочыць вату ў газу і выцірае вашывыя галовы. Вошы адразу пруцянеюць. Дзецям вельмі цікава пазіраць, як зразаюцца роўнымі радамі пасмы валасоў, яны тыкаюць пальцамі ў галаву, паказваюць на бруд. Потым пад наглядам настаўніка мыюць астрыжаныя галовы, твар і вушы.

За работаю ў школе мацней урастае Лабановіч у сваё новае месца. Глыбей адчуваецца паўната жыцця. Пакуль не ўсе вучні сабраліся ў школу, у яго застаецца вольны час. Ён гэтым карыстаецца для большага азнаямлення з новым месцам. За некалькі дзён абхадзіў усе ваколіцы, агледзеў дарогі і новыя мясціны, бо ў гэтым знаёмстве ёсць заўсёды нешта свежае і цікавае. А нядаўна ездзіў і ў Пінск. Зносіны з горадам простыя і лёгкія — тры разы на тыдзень пасылае валасць фурманку на пошту.

У Пінску-ж ён і краму сабе аблюбаваў, дзе можна браць сёе-тое напавер, бо грошы не заўсёды бываюць у кішэні. Для Алесіка ён купіў мультановую кашульку і паясок, бо шкада было закіданага хлапчука і хацелася чым-небудзь акрасіць яго жыцце.

У вольныя часіны заходзіў настаўнік у воласць, дзе былі ўжо знаёмыя і можна было завесці новае знаёмства. А на сяле часамі напаткаеш вясёлую і смешную праяву сялянскага жыцця.

Недалёка ад воласці ёсць піўнушка. Трымае яе Максім Гулейка. Апошнімі днямі каля піўнушкі прымецен рух. Часцей заходзіць туды і старшыня, Захар Лемеш. Сам старшыня цвёрда на нагах трымаецца. Відаць, шануецца, справу нейкую робіць. Старшынёй кіруе пэўная думка. З сялянамі ён лагодны, паддабраецца да іх і шчодра частуе. Лабановіч не ў курсе справы, застаецца толькі звычайным гледачом таго, што робіцца каля піўнушкі. А там людзі снуюць. Туды ідуць сур'ёзныя, і нават сляды надзённага клопату адбіваюцца на іх тварах. Назад-жа выходзяць пачырванеўшы, і ногі іх убезладзь ступаюць. Тут ужо і песню пачуеш, і самую шчырую гутарку, і самую ласкавую лаянку, без прымешкі нават і ценю злосці. Проста людзям весела і добра, як вось кульгаваму дзядзьку Есыпу.

Есып ужо стараваты чалавек. Барада яго збілася ў лямец, а на самым канцы хвосцікам закруцілася, як у невадзе матня. Краі чорнай світкі разышліся па баках з-пад шырокага даматканага пояса. Белая доўгая кашуля расшпілена. Шырокі прарэх адкрывае грудзіну і жывот да самага пупа. Старая шапка збілася са свайго звычайнага месца на галаве і брылем убок павернута. Усё гэта робіць постаць дзядзькі надзвычайна пацешнаю. Выраз-жа яго твару найлагаднейшы і найдабрэйшы. Выступае Есып подскакам. У гэтым вінавата яго кульгавая нага, а піва толькі злёгку водзіць яго па баках.

На сярэдзіне валаснога двара дзядзька Есып спыняецца, круціць галавою направа і налева. Бачыць настаўніка. Падыходзіць, падае руку.

— Здаровенькі булы, пане настаўніку. Ось трохі выпілы, — расказвае Есып: — Ты сваю справу ведаеш, а мы — сваю. І ўсім нам добра! — памацняючы голас,

кажа ён. А потым раптам мяняе тон, як-бы ахамянаецца. — Ты вучы, вучы нас і дзетак нашых, бо мы дурныя. Ой, якія-ж мы дурныя!.. Вучэце, вучэце, — паніжае голас дзядзька, — я вам не кампанія... Выбачайце мне!

Есып бярэцца за шапку, хочучы зняць яе, але ніяк не намацае брыля і памаленьку адыходзіць і кланяецца, а потым рашуча накіроўваецца ў вароты. Выходзіць, пакульгваючы, на вуліцу і зноў прыпыняецца, разглядаецца. У вочы кідаецца яму царква. Дзядзька ківае сам сабе галавою і заводзіць:

І-і-і-жэ хе-е-еру-вы-ы-мы,
Хе-е-е-е-ру-вы-ы-мы,
Тай-на да та-а-йна абрызу-у-юшчэ...

Пасняваў трохі і кінуў, а, можа, яму Шугай Міхалка перашкодзіў, ідучы насустрач.

— Міхалка! — запыняе яго дзядзька Есып. — Ведаеш, браток, што?

— А што? — пытае Міхалка.

— Набі ты мяне! Набі, браток!

Міхалка глядзіць на Есыпа і смяецца.

— Ты не смейся, а набі мяне.

— Дык як-жа я, дзядзька, буду біць вас? За што?

— Не пытай за што, а вазьмі і набі мяне, — стаіць на сваім дзядзька Есып.

— Ну, як я буду біць вас. Вы-ж-такі — стары чалавек.

— Го, пытае, як будзе біць? Дай па мордзе і ўсё.

— У мяне-ж і злосці на вас няма.

— А ты зазлуй, браток, і плясні.

— Няма за што біць дзядзьку.

— Брэшаш, Міхалка: ёсць за што! Не патурай ты мне. Прашу — набі мяне. Бо калі ты мяне не наб'еш, то я пайду і буду біць сваю старую.

— Не трэба, дзядзька, біцца, лепш у згодзе жыць.

— Дык не хочаш біць мяне?

— Не, не хачу.

— Ну, то чорт-жа цябе бяры. Знойдзецца і без цябе добры чалавек.

Дзядзька Есып зрушвае з месца і кульгае далей па вуліцы. Ён адчувае сябе ў чымся вінаватым. Яму хо-

чацца, каб яго пакаралі, набілі. А можа, гэта — толькі дзівацтва падвыпіўшага чалавека. Ён штось мармыча сам сабе, шворыцца рукою каля шапкі, намацвае брыль і верне шапку брылем на патыліцу. Спатыкаючы дзяўчат або маладзіц, ён кліча іх да сябе і просіць, каб пацалаваліся з ім. Маладзіцы ўцякаюць, хто моўчкі, а хто пацвельваючыся.

Мінуўшы сярэдзіну сяла, Есып сустракае Цімоха Жыгу. Яшчэ здалёк ён расстаўляе рукі, ідзе напярэймы Цімоху.

— Стой! — крычыць.

Цімох спыняецца, глядзіць на Есыпа.

— Куды ідзеш, сабачы сын?

— Ідзі, ідзі! — адзываецца Цімох.

— Я іду і пайду, вось яно што! Цімох, хочаш быць чалавекам — дай мне ў морду.

Здзіўлены Цімох акідае поглядам дзядзьку Есыпа. Нейкая ўсмешка бліснула на яго твары, і не паспеў дзядзька Есып вымавіць слова, як Цімох Жыга — трах яму поўху. І Есып — гоп вобземлю, грабянуўшы ў паветры кульгаваю нагою.

— Ой, трасца-ж тваёй матары, Цімох. Як-жа спрытна ты б'ешся. Дый моцна-ж даў.

— А ты-ж прасіў.

— Прасіў, то прасіў, але навошта было так моцна біць... Ось, злодзей. Ось, арыштант.

Цімох, пасміхаючыся, ідзе далей, а Есып падымаецца, клянучы яго. Людзі навокал смяюцца, а дзядзька толькі гаворыць:

— Добра даў, гад. Хіба дагнаць яго ды выпіць з ім.

Ад памочніка пісара дазнаецца Лабановіч аб прычынах незвычайнага руху каля піўнушкі. Усяго некалькі дзён застаецца да выбараў старшыні, бо Захар Лемеш дажывае апошнія моманты свайго старшынскага трохгоддзя. Захару ходзіць аб тое, каб застацца старшынёю яшчэ на тры гады. На гэта ў яго ёсць многа сваіх меркаванняў. Па-першае, ад гэтага выйграе яго гонар, бо старшыня — першая, можна сказаць, урадавая асоба ў воласці. Па-другое, само старшынства мае ў сабе многа павабнага і прыгожага. Па-трэцяе, у Захара Лемеша ёсць патайная думка адстаршыняваць адразу, без перапын-

ку, тры раты. Калі-б гэта яму ўдалося, ён выслужыць пачэсны каптан. У Пінскім павеце, здаецца, і ёсць адзін толькі старшыня, што заслужыў пачэсны каптан, і гэты старшыня — цесць Захара Лемеша. І цесць і жыццёвая практыка вучаць, якім спосабам дасягаюцца тыя ці іншыя мэты. З земскім начальнікам ён у добрых адносінах. З земскім, вядома, выпіваць Лемешу не прышлося, але сёе-тое перайшло з яго кішэні ў кішэню земскага. Цяпеража Захар рыхтуе грунт сабе ў межах воласці, шчодра заліваючы горлы прагавітых на выпіўку сваіх выбаршчыкаў.

Воласць прыбрана, памыта, падскрэбена з незвычайнаю пільнасцю і стараннасцю. Дзед Пілíп, на хаду таўкануўшы ў нос табакі, разрываецца на кавалкі: і тое і гэтае трэба падправіць, туды і сюды пабегчы, зрабіць тое і другое. Захар Лемеш трохі нервуецца. Стан душы ў яго цяпер такі-ж самы, як у самага добрага хрысціяніна перад споведдзю. Неспакойны трохі і пісар. Сяды-тады яны пераглядаюцца са старшынёй, ківаюць адзін аднаму і падміргваюць. А зборня гудзе, дрыжыць ад людскога шуму.

Раптам усё сціхае. Старшыня і пісар разам бялеюць. Старшыня згінаецца, робіцца адразу процантаў на сорак мізарнейшым. Народ расступаецца, а паміж сцен людскога калідору ідзе земскі начальнік, ідзе чоткаю, бýстраю паходкаю вайсковага чалавека, прысадзісты, карэнкаваты, смуглы. Земскі начальнік — граф з французскім прозвішчам, быўшы кавалерыйскі афіцэр. Усе яго рухі выкрываюць у ім вайсковага.

— Здрастуйце! — звонка кідае земскі начальнік.

— Здрам-жалам, ваша сіяцельства! — гудзе сход.

Дзядзька Есып не паспеў паздароўкацца разам з людзьмі і адзін ужо, калі ўсё сціхла, выкідае непаслушным языком адказныя словы на прывітанне:

— Здравя жжы-лаю, ваша прыяцельства!

Земскі начальнік адразу-ж прыступае да справы.

— Каго хочаце мець старшынёю?

— Захара Лемеша! — гудуць галасы.

— Лемеша, Лемеша!

— Ладна! — згаджаецца земскі.

Захар Лемеш улучае добрую мінуту, міргае пісару, паказаўшы кончык языка.

Земскі садзіцца і піша.

Раптам дзверы расчыняюцца з шумам, у канцылярыю, як бура, урываецца Цімох Жыга. Вочы яго варочаюцца дзіка, валасы ўскалмачаны.

— Грамада! — крычыць Цімох, — ужо выбралы? Захара Лемеша? Каго-ж вы выбралы? Яшчэ мала выпіў з вас крыві?

Усё гэта адбылося зусім нечакана. Цімох Жыга адзін цяпер валодае ўвагаю сходу.

Не даючы апамятацца, ён налятае на Лемеша.

— Старшыня! Старшынька ты?.. Га-а! Сто рублёў прапіў! Земскаму падсунуў!.. А цяпер будзеш кроў нашу піць?

— Старшыня! — крычыць земскі начальнік, — пасадзіць яго ў халодную.

— Дзесяцкія! — камандуе старшыня, і сам, як драпежны звер, кідаецца на Цімоха. Жыга не даецца, варочае шырокімі плячамі, раскідае дзесяцкіх. Тут хапае яго старшыня ззаду за плечы. Дзед Піліп расчыняе дзверы, і Цімоха ўпіхаюць у чорную дзірку халоднай.

У канцылярыі ціха і нялоўка.

Палешукі пераглядаюцца, чухаюць галовы. А Цімох крычыць, бушуе, лаецца, не шануючы ні старшыні, ні земскага.

XVII

— Ведаеце, пане настаўніку: уся мая бяда ў тым, што я не ўмею запісаць таго, што думаю. А ў мяне такія добрыя думкі бываюць. Вось напішуць у воласці паперу — ну, прашэнне там ці скаргу якую. Чытаюць табе яе, — не, чую, што не так трэба напісаць. І многа напішуць і слоў усялякіх накруцяць, а таго, што трэба, няма. Каля праўды ходзяць, але праўду з'ядаюць: няма яе, або шчыльна ў лушпайку загорнута. А каб я сам умеў пісаць, дык я многа каму нос уцёр-бы.

Аксён Каль — селянін з Высокага. Ён прышоў да Лабановіча пагаварыць. Настаўнік сам запрашаў яго, калі пазнаёміўся ў воласці, бо ў Аксёна ёсць свае мыслі, якія яго займаюць.

Лабановіч слухае, углядаецца ў твар Аксёну. Гэта яшчэ малады чалавек, гадоў за трыццаць. Рысы яго твару строгія, нават халодныя. Вочы ўдумлівыя, і ўся сухарлявая і моцная постаць выкрывае ў ім чалавека выдатнага. Кароткія чорныя вусы шчыльна туляцца каля самых губ упартымі завіткамі і робяць твар яго прыгожым і энергічным.

«Кім-бы ён мог быць, каб яго натура ва ўсю разгарнулася?» — думае настаўнік. І Аксён вынікае перад ім то строгім пракурорам за грамадскія справы, то ўдалым атаманам разбойніцкай шайкі, бязлітасным помснікам за сялянскую крыўду.

Аксён Каль верыць у праўду, у тую адвечную праўду, якой так прагна чакае народ і якая за сям'ю замкамі хаваецца ад яго. Ён не можа спакойна глядзець на несправядлівасці, што чыняцца над людзьмі, і дабіваецца праўды. Яго ведае воласць, ведае і земскі начальнік, як чалавека неспакойнага і небяспечнага. А старшыня мае загад не спускаць яго з вока. Аб гэтым ведае і сам Аксён і пасміхаецца ў чорны вус: не вам, дурням, зашчаміць мяне.

Не дае Аксён задрамаць сялянам у іх заціснутым жыцці. Катурхае, будзіць іх грамадскую думку, кідае новыя мыслі, падымае на змаганне з няпраўдай, бо сялян ашукалі, абышлі ўсякія кручкатворы-чыноўнікі, панскія прыслужнікі. Іначай як магло стацца, што пан Скірмунт з Альбрэхтова залез у іх хату, прыбраў у свае рукі з-пад іх носа затокі на рэчцы, дзе так многа рыбы, і здае гэтыя ўжыткоўнасці ім-жа ў арэнду? Затокі — балючае сялянскае месца. Дванаццаць гадоў цягнуўся суд з панам Скірмунтам. Аксён Каль выступаў ад грамады, як давераная асоба. Хадзіў па судах, пачынаючы з акружнога, і давёў справу да сената, дзе яна і захлынулася, бо ўсюды пан цягне за пана. Так і засталіся затокі за панам Скірмунтам. А цяпер іх арандуюць пяць заможных гаспадароў з Высокага: старшыня Захар Лемеш, царкоўны стараста Грыгор Крэшчык і яшчэ тры гаспадары. Ім гэта выгадна, і яны радуюцца, што Аксён Каль прайграў сялянскую справу. Яны-ж аб ім і ўсялякія чуткі распускаюць, як аб авантурніку, якому трэба толькі грамадскія грошы, бо хто ідзе супроць закону? Вось чаму Аксён так не любіць

іх — не любіць, як здраднікаў сялянскіх інтарэсаў і сваіх асабістых ворагаў. Не любіць ён таксама паноў і чыноўнікаў, бо, па яго думцы, ад іх усё зло на свеце.

Хоць і сенат не прызнаў сялянскага права, але Аксён не хоча супакоіцца на гэтым. У яго ёсць яшчэ думка — падаць прашэнне цару.

— Як вы думаеце? — пытае Аксён Лабановіча наконт прашэння цару.

Лабановіч апускае вочы, як-бы штось мяркуючы.

— Я сказаў-бы, ды толькі не ведаю, як прымеце вы тое, што я скажу, — ціха адзываецца ён. І, момант счакаўшы, дадае: — Я думаю, што з гэтага нічога не будзе.

Настаўнік ледзь стрымліваецца, каб не падзяліцца з Аксёнам тым, што ўжо некалькі дзён як урвалася ў яго душу і перавярнула там усё дагары нагамі, захапіўшы цалкам мыслі. Але засцярога і голас самазахавання бяруць верх, і ён кажа:

— Ведаеце, Аксён, мы аб гэтым пагаворым як-небудзь другім разам, пагаворым так, каб ніхто не ведаў. А цяпер я хачу сказаць вам вось што. Вот вы жалкуеце, што не можаце запісаць сваіх мыслей... А давайце папрабуем павучыцца?

Аксён у сваю чаргу апускае вочы, а потым усміхаецца.

— Ведаеце, галава ўжо на другое скіравана, не тым занята... Добра вучыцца змоладу, а цяпер і часу бракуе.

І па тону гутаркі і па выразу яго твару відаць, што Аксён не пярэчыць супроць навучання.

— Кіньце! Часіну заўсёды можна знайсці, была-б толькі ахвота. Прыходзьце да мяне вечарамі, калі час будзе. На вялікую навуку разганяцца не будзем, а навучыцца чытаць і трошкі пісаць, я думаю, патрапім.

— Яно-б чаму-ж? Хоць-бы з большага чытаць ды распісацца, і гэта добра.

— Давайце спрабуем зараз!

Лабановіч зрываецца з месца, бярэ паперу і прылады пісьма ды падсядае да Аксёна.

— Чалавек вы дарослы, і я з вамі буду займацца не так, як з малымі. Пачнем адразу з пісання і ў першую чаргу — з вашага прозвішча.

Настаўнік піша «Аксён Каль», старанна выводзячы кожную літару.

— Вось я напісаў ваша імя і прозвішча. Завяцеся вы — Аксён. Вось вам гэты самы «Аксён», слова «Аксён», бо наша гутарка складаецца з слоў, а кожнае слова можна запісаць. А вось і прозвішча ваша «Каль». На ваша шчасце і імя і прозвішча ў вас кароткія. Паўглядайцеся ў іх, а я зараз друкаваныя літары дастану.

Настаўнік ідзе да школьнай шафы, бярэ скрыначку з літарамі, а Аксён сядзіць, не зводзіць вачэй з напісаных настаўнікам двух слоў. Уся яго ўвага скіравана на гэтыя словы, але нічога не кажуць яны яму. Ён бачыць цэлы рад дзіўных значкоў-фігурак з палачак, кружкоў і кручкоў, зусім чужых і незнаёмых для яго вока.

Лабановіч адгадвае мыслі яго і кажа:

— На першых часах, вядома, гэтыя напісаныя словы нічога не гавораць вам. Да іх трэба прывыкнуць, прыглядзецца, як прыглядаецца гаспадар да сваіх гусей у чарадзе і адразу пазнае іх.

У настаўніка ўзнікае сумненне ў тым, ці правільна выбран метад навучання, бо ў школе ён карыстаўся іншым, які добра ведаў. Такі-ж метад тады не меў распаўсюджання і нават не быў вядомы Лабановічу. Але настаўнік выходзіў тут з псіхалагічнага меркавання: уласны подпіс павінен быў лепш зацікавіць яго вучня.

— Вы разглядаеце напісаныя словы, а цяпер я пакажу, як яны друкуюцца ў кнізе. Вось глядзіце: гэтыя значкі называюцца літарамі. Нам трэба злажыць слова «Аксён». Слухайце, як можна сказаць «Аксён».

Настаўнік гаворыць слова па частках:

— А-к-ссьё-н.

І, па некалькі разоў называючы літару, ён паказвае іх Аксёну і выкладае ў адзін рад.

Напісаныя словы і словы, зложаныя з друкаваных літар, Лабановіч кладзе перад сваім выпадковым вучнем, сам захапляецца і нарэшце разварушвае і Аксёна. Ён пачынае з большаю цікавасцю пазіраць на словы, на склады і на асобныя значкі-літары. А калі дайшлі да мяккага знака ў слова «Каль» і высветлілася яго значэнне, дык Аксёнава прозвішча нечакана для настаўніка і для вучня набыло зусім іншы сэнс і выклікала наўперад нялоўкасць, а потым і смех.

Аксён з гэтай прычыны нават заўважыў:

— Трыццаць шэсць гадоў жыву, а не ведаў, што можа быць з майго прозвішча! Вось што значыць навука, згінь яго маты.

Навучыўшыся адрозніваць значкі адзін ад другога і злажыўшы некалькі разоў імя і прозвішча, Аксён прыступіў да пісання. Загрубелыя і няспрытныя пальцы яго з намаганнем трымалі асадку, сціскаючы яе, як абцугамі. Часамі ён прыходзіў да пераканання, што нічога з гэтага не будзе, што не адолее прамудрасці трымаць, як след, асадку, але кожны раз на дапамогу прыходзіў настаўнік, разганяў яго страхі і падмацоўваў вераю, што гэта толькі на першых часах, а потым пойдзе гладчэй.

Навучанне скончылася, настаўнік даў Аксёну аловак і паперу, каб ён сяды-тады практыкаваўся дома.

— Вечарком, у вольную часіну, прыходзьце да мяне: патрошку, непрыметна вы навучыцеся і чытаць і пісаць.

Аксён моцна пацiснуў руку настаўніку і пайшоў дадому, даўшы абяцанне вучыцца.

Праводзячы Аксёна з кватэры, Лабановіч вышаў на двор. Было ўжо гадзін дзесяць вечара. Аксён пасунуўся ў цёмную вуліцу і хутка знік у змроку, а Лабановіч стаяў на ганку, прыслухоўваючыся да цішыні халоднага асенняга вечара. У канцы дашчанай агарожы, каля клёну, шурхнула пад чымісь нагамі сухое лісце, і нейчая фігура, тоячыся, асцярожна пасунулася ў бок рэчкі. Як відаць, нехта стаяў пад акном і напэўна пазіраў у яго пакой.

Часамі ў вокны заглядалі вясковыя хлопцы або і маладзіцы, праходзячы каля школы, — проста цікава было паглядзець на кватэру настаўніка, калі там гарыць яркая лямпа пад светлым абажурам, а можа, і на яго самога. І Лабановіч не звяртаў на гэта ніякай увагі. Цяпер-жа адчуванне нейкага неспакою варушыцца ў яго душы. І тыя ўстрывожаныя мыслі, што цалкам захапілі яго, вынікаюць зноў разам з тою крыніцаю, адкуль і выплылі яны.

Два дні таму назад знайшоў Лабановіч на ганачку школы дзіўную рэч. Загорнутая ў газетную паперу, на лаўцы каля сцяны, ляжала маленькая кніжачка. Настаў-

нік увайшоў у кватэру і стаў чытаць. Словы і літары замітусіліся, заскакалі ў яго вачах, як-бы ў нейкім танцы, і ён спачатку не мог сачыць за мыслямі аўтара, хоць яны былі надта простыя і ясныя, да таго незвычайны быў змест кніжачкі.

Усе тыя ўяленні аб цару, як аб памазаніку божым, як аб персоне справядлівай, бесстаронняй, для якой інтарэсы самага апошняга бедака і інтарэсы вяльможы — зусім аднакія, — словам увесь той злотабляск, якім агортвалася асоба цара, і тое ўвасабленне ўсяго найлепшага, што толькі можа быць у чалавеку, — усё гэта развейвалася тут самым бязлітасным чынам, развейвалася ў прах. Аўтар метка біў у гэты казённы шчыт царскае асобы і рашэціў яго, сцягваючы з цара далікатныя покрывы і паказваючы ў сапраўдным, непадмалёваным, грубым выглядзе чалавека-павука, найбольшага крывасмока на целе народа.

Усе мыслі аўтара накіраваны былі на адно і білі ў адну цэль: разбурыць веру ў цара, паказаць яго ў сапраўднай істоце. У кніжачцы даваліся так званыя царскія рэформы ў зусім новым асвятленні. Тут-жа высмейваліся царскія загады і мерапрыемствы, накіраваныя быццам-бы на дабро народу, як устанаўленне інстытута земскіх начальнікаў і іншае. На справе-ж аказвалася зусім не тое, і даводзілася гэта ўсё на простых прыкладах. А поплеч з гэтым раскрывалася сапраўдная роля тых палітычных арганізацый, на чыіх сцягах было напісана бязлітаснае змаганне з царызмам за вызваленне народа з-пад ярма самадзяржаўя, тых арганізацый, якія змушаны былі туляцца ў патаемных кутках і якія шальмаваліся і кляйміліся страшнымі словамі — вырадкі, злачынцы, крамольнікі. «Памятай, Мікола Крывавы: цяпер табе масленіца, але прыдуць і посныя дні». Так канчалася брашурка.

Першае, што адчуў Лабановіч, прачытаўшы кніжачку, быў страх, як-бы пад нагамі захістаўся грунт і перад ім расчынялася нейкае бяздонне. Гэтая бяздонніца і палохала і цягнула да сябе з такою сілаю, што ад яе нельга было адысціся. Першы страх, як спадарожнік крушэння пэўнага ладу ўнутранога жыцця, яшчэ не зусім аформленага і ўгрунтованага, у сваю чаргу выклікаў другі страх:

а што, калі-б гэтую кніжачку знайшлі ў яго і данеслі начальству?.. Чаму яе падкінулі яму? Хто падкінуў? Якая мысль кіравала тым, хто падкідаў яму гэтую небяспечную кніжачку?

Мыслі нейк блыталіся, перабівалі адна другую, і адно адчуванне змянялася другім, параджаючы ў душы неспакой. А разам з гэтым постаць цара вынікала ва ўяўленні ў сваёй страшнай дваістасці: цар лагодны, партрэтны цар, і цар, паказаны ў кніжачцы, драпежны цар-ашуканец са злосна вышчаранымі зубамі, гатовымі грызці людское цела. І гэтая дваістасць лезла ў мыслі, вымагала сталага прызнання якога-небудзь аднаго з двух воблікаў.

Цэлы рад жыццёвых фактаў, што давялося наглядаць Лабановічу, і тое, як адносіліся да простага чалавека ўсе, хто стаяў ад яго вышэй, і ўвесь грамадскі ўклад,— усё гэта разам давала нагляднае падцвярджэнне тым думкам, што выказваліся ў кніжачцы. Але няўжо людзі не заўважаюць гэтага? Няўжо ўсе гэтыя чыноўнікі, усе настаўнікі вышэйшай адукацыі, што выхоўваюць людзей новага пакалення, няўжо яны ўсе — свядомыя лгуны і прахвосты? Як магло здарыцца, што людзі розуму, людзі высокай асветы ўхваляюць гэты палітычны лад, знаходзяць яго найлепшаю формаю грамадскага жыцця, якой трэба служыць, ахоўваць, дапамагаць?

Гэтая маленькая кніжачка зрабіла цэлую рэвалюцыю ў мыслях Лабановіча, паказала стан рэчаў у зусім іншым асвятленні. Кніжачку насіў ён з сабою, а вечарам, кладучыся спаць, на ўсякі выпадак хаваў яе далей.

Пастаяўшы на ганку, Лабановіч ідзе ў кватэру, апранаецца, бярэ кій і выходзіць на выган. Яго зацікавіла, хто-б гэта мог быць пад вокнамі. Асцярожна праходзіць у бок рэчкі, прыглядаецца, бачыць — адтуль нехта сунецца. Падходзіць бліжэй — стары дзяк Бацяноўскі.

Няўжо гэта ён падглядаў у вокны? Не падабаецца дзяк чамусь настаўніку. Вось чаму і з візітам да яго не сабраўся да гэтага часу. Дзяк памалу пляцецца ў свой двор, а Лабановіч ідзе ў бок чыгункі, каб пабыць аднаму са сваімі думкамі.

XVIII

Дзяк Бацяноўскі тоіць крыўду на свайго суседа Лабановіча: хто ён за такі, што не хоча зайсці да яго, старога, паважанага чалавека, дваццаць дзевяць гадоў праслужыўшага каля святога алтара? Яшчэ не было тут ніводнага настаўніка і настаўніцы, хто-б выказаў дзяку такую знявагу, абмінуўшы яго дом. Нават Іван Пракопавіч Бяляўскі, казённы ляснічы — хіба-ж можна параўнаць такую асобу з гэтым настаўнікам? — зайшоў з візітам, калі прыехаў сюды пяць гадоў назад, і цяпер наведвае, як бывае ў ляснічага і сам ён, дзяк Бацяноўскі. А які адукаваны, разумны чалавек, і якую пенсію бярэ! Дый з кім наогул не знаецца дзяк Бацяноўскі! Людзі, можна сказаць, з прозвішчамі на ўсе двунадзесятыя святы складаюць кола яго знаёмства: Спаскі, Успенскі, Благавешчанскі, Уздвіжанскі, Увядзенскі, Богаяўленскі, Срэценскі і іншыя. Гэта калі ўзяць па духоўнай лініі, а калі далучыць сюды людзей свецкіх! Не злічыш!

І наогул падазроным здаецца яму сусед. То адзін цягнецца, тоіцца па завуголлю, то шушукаецца з людзьмі небяспечнымі, як гэты Аксён Каль, і поначы соваецца, як злодзей, па пустых дарогах. Нешта-ж ёсць-такі ў яго на думках. І дзяк пачаў трохі прыглядацца да свайго суседа. Сяды-тады праходзіць ён каля школы, заглядаючы ў вокны. Часамі прыпыніцца і вуха прыложыць, каб улавіць хоць колькі слоў і па іх крышку разгадаць сэнс тае гутаркі, што вядзецца там, за акном. Іншы раз ён ціхенька адчыніць веснічкі і ўвойдзе ў двор школы, зазірне ў пакойчык сумежны з кухняю, і ў самую кухню, бо ў дзяка Бацяноўскага розныя бываюць падазрэнні і дагадкі. Але такім спосабам дабіцца яму чаго-небудзь пэўнага ніяк не ўдаецца, і сусед застаецца для яго некатораю загадкаю. Аднак дзяк ад свайго не адступаецца. У яго ёсць і іншыя спосабы дазнацца таго, што яго цікавіць. Ён толькі не хоча спяшацца з гэтым: нідзе не дзенецца, і ў святым пісанні сказана: «Нічога няма патаемнага, што не стане яўным».

Старожка Ганна часамі заходзіць да пападзянак для сякіх-такіх паслуг, і наогул яе не цяжка сустрэць і пагаманіць з ёю.

— Ну, здарова, Ганна! — запыніў аднойчы яе дзяк.

— Здаровенькі булы! — адказвае старожка, трохі здзіўленая дзякоўскаю ўвагаю, і хоча далей ісці.

— Ці скора-ж ты мяне на радзіны заклічаш? — здалёк пачынае дыпламатычна гутарыць дзяк. Ён наогул пагаманіць з жанчынамі любіць, хоць ужо чалавек і стары. Дзячыхі-ж у яго няма — памерла.

Ганна ўсміхаецца, — што сказаць на гэта?

— Не ведаю, — адказвае.

— Як-жа ты не ведаеш? Добры гаспадар ведае, калі яго карова ацеліцца. А ты свае прыгоды не ведаеш? Хіба ўжо справа такая заблытаная, або айцоў многа?

— Бацька то адзін, але і таго няхай халера задушыць, — гугніць Ганна.

— А гэты-ж да цябе не падкочваецца?

— А нашто вам усё ведаць?

Ганна бачыць усю нікчэмнасць дзякоўскай плявузготы, і ёй зусім не хочацца весці з ім такую гутарку. Яна борзда заварочваецца і ідзе ў школу, а дзяк усміхаецца, праводзіць яе вачамі. Ён трохі нездаволен вынікам размовы, бо нічога не ўдалося дазнацца. Наадварот, цяпер ён яшчэ болей збіты з тропу яе адказам: «А нашто вам усё ведаць?»

Трохі раздумаўшыся, дзяк матае гэты адказ сабе на вус і галавою трасе. Ох, гэтыя ціхія маладыя людзі! Іх сапраўдную існасць даўно вызначыла народная мудрасць: у ціхай букце чэрці водзяцца. Гэтае меркаванне да некаторай ступені задавольвае дзяка, але поўнага заспакаення не дае, і ён не адводзіць вока ад свайго суседа.

І многа чаго ў настаўніку паказваецца яму дзіўным. Вось хоць-бы і са старожкаю гэтаю: няўжо не мог-бы знайсці сабе старожа або нават і маладзіцу, ну няхай-бы сабе і не толькі для старажоўскіх абавязкаў? Але нашто трымаць гэтую бязносую? Якая тут прычына хаваецца? Нячыстая тут справа. Далей — купляе падарункі сваім вучням. Ніхто гэтага не робіць. Які дурань будзе выкідаць так сабе грошы? Напэўна-ж тут павінна быць нейкае сваё меркаванне. А таксама і з сялянамі штосьці дужа знаёмства заводзіць. Глядзіш — то той, то другі, то па некалькі разам на яго кватэру заходзяць. І хто ходзіць?

Людзі, што ў сяле ніякай вагі не маюць, а калі і маюць, дык у дрэнны бок, як гэты Аксён Каль.

Сама сабою напрошваецца думка — дэмакрат і смуццян!

Сям-там, пры здарэнні, дзяк з кім-небудзь аб суседзе загаворыць: цікава ведаць, як людзі пазіраюць на гэта?

Калі гэтыя ўсе факты былі выкладзены а. Мікалаю, бацька наўперад махнуў рукою і засмяяўся сваім працяглым смехам, потым, падумаўшы, перавёў вочы ў неазначаныя прасторы, нарэшце кіўнуў галавою направа і налева і сказаў:

— Усё можа быць.

Такому заключэнню можна было знайсці падмацаванне ў газеце «Свет», якую выпісваў а. Мікалай.

Іван Пракопавіч, казённы ляснічы, лысы чалавек, гадоў пад сорак, бліснуўшы сваімі быстрымі і вострымі вачамі, зазначыў:

— Пустое! Семінарскі ідэалізм яшчэ не зусім выветрыўся.

А пісар вывеў такое заключэнне:

— Папулярнасці сабе шукае.

Хоць у гэтых поглядах розных асоб на аднаго чалавека і не было згоды, тым не меней дзяк не толькі не адступіўся ад свае думкі, а, наадварот, яшчэ больш умацаваўся ў ёй, бо ўсе-ж-такі паводзіны яго суседа не зусім людскія. Людзям збоку гэта не так у вочы кідаецца, але старога дзяка не ашукаеш. Не, да настаўніка трэба прыглядацца! І трэба быць асцярожным, бо сусед, відаць, таксама асцярожны. Недарма-ж ён тады, праўшы з кватэры Аксёна, хадзіў каля рэчкі, каб дазнацца, хто быў пад акном, і спаткаў яго, дзяка. Пазнаў яго ці не?

Каб не даць суседу прычын думаць благое аб сабе, дзяк надумаўся сам наведаць Лабановіча як-небудзь вечарком.

Дзяк зайшоў з двара і пастукаў у кухню. Ганна адчыніла дзверы.

— Добры вечар, Ганна! — громка паздароўкаўся дзяк. — Дома настаўнік?

Лабановіч адчыніў дзверы ў сваю кватэру.

— Не заходзіце вы да мяне, дык я сам завітаў па суседству да вас.

— І добра зрабілі. Сядайце, калі ласка. А вы мне выбачайце, што да гэтага часу не зайшоў да вас. Нават і сёння збіраўся, — салгаў настаўнік.

— Ой, ці-ж праўда? — пытае дзяк і хітра прыжмураным вокам глядзіць на суседа.

— Ну, няловка мне і апраўдвацца, бо я вінаваты перад вамі.

— Пахвальна, што хоць віну сваю прызнаеце.

— Я заўсёды паважаю старэйшых ад сябе.

— А як у святым пісьме напісана на гэты выпадак? — пытае дзяк.

— «Перад ліцэм седага восстані і пачці ліцэ старча», [1] — па-вучнёўску адказвае Лабановіч.

— Святое пісьмо ведаеце, але па святому пісьму не паступаеце, — у голасе дзяка чуваць дакор.

— А хто жыве па святому пісьму? Святое пісьмо забараняе мець крыўду на каго-б там ні было, а вы на мяне крыўдуеце.

— Хавай божа! Ніякай крыўды не маю на вас. Кожын волен жыць, як знаходзіць лепей, — гаворыць дзяк і аглядае пакойчык. — А нічога сабе кватэрка ў вас.

Дзяку трэба што-небудзь казаць і ён паўтарае:

— А нічога кватэрка.

Наступае кароткая маўчанка.

Настаўнік хоча загаварыць, але гутарка не клеіцца, Яго выручае дзяк.

— Не маркотна вам аднаму?

Лабановіч ажыўляецца, хапаецца за гэтую думку і кажа, што яму зусім не маркотна, што ў яго ёсць работа ў школе, а вечарам ён то чытае, то рыхтуецца да наступнага школьнага дня.

— А я да вас думаў нейк зайсці, але тут хтось быў, і я не хацеў замінаць вам.

— Вы мне ніколькі не заміналі-б. Калі ласка, заходзьце, — гаворыць настаўнік і тут-жа думае: «А лепш было-б, каб ты не заходзіў».

Гутарка зноў прыпыняецца.

---

[1] Перад сівым устань і ўшануй старога.

— Ну, а як у вас хор? — нарэшце пераходзіць дзяк на дзелавы грунт.

— Ніяк.

— Мітрафан Васільевіч быў арганізаваў хор, і нічога сабе спявалі ў царкве. Вам-бы толькі падтрымаць яго. Ведаеце, благочыніе царкоўнае ад гэтага многа залежыць.

— О, Мітрафан Васільевіч дасціпны быў настаўнік, і памяць аб ім не памрэ ў Выганаўскай школе.

Пачынаюць хваліць Мітрафана Васільевіча, хваліць няшчыра і фальшыва.

— А цяпер яму падвышэнне далі, — кажа дзяк: — Назначылі ў горад у прыходскае вучылішча. А там, ведаеце, настаўнікі ўжо і форму сваю маюць з бліскучымі гузікамі і шапкі з цэшкамі носяць, як чыноўнікі.

— Мітрафан Васільевіч гэта заслужыў у поўнай меры! — скрозь прытоенае насміханне атэстуе свайго папярэдніка Лабановіч.

— Умеў чалавек паставіць сябе, — заўважае дзяк.

— Так, гэта не ўсім ўдаецца.

— Не закапаў сваіх талентаў у зямлю.

Нудная, нікчэмная гутарка ідзе з кароткімі перапынкамі, цячэ, як гнойная вада па брудным раўчаку.

Дзяк сядзіць ужо з добрую гадзіну і не збіраецца дамоў. Дый што яму дома рабіць? Не ведае дзяк, куды дзець свой час. Гаспадарка яго невялікая — Даша адна спраўляецца з ёю.

Даша — маўклівая, сур'ёзная, замкнутая ў сабе дзяўчына. Аб чым яна думае, хто яе ведае. Аб тым, што ў яе на сэрцы, яна ні з кім не гаворыць і нават бацьку не адкрываецца. Праўда, бацька не надта і стараецца зірнуць у яе сэрца. Ён ведае, што ёй даўно пара замуж, але дзе ты возьмеш цяпер таго жаніха? А Даша сама зацялася на маладых людзей, бо што-ж ёй застаецца рабіць?

Дзяк сядзіць, часамі пазірае на свае вывернутыя пальцы, штось думае, і хітраватая ўсмешка прабягае ў прыжмураных вачах.

Нецікава сядзець са старым дзяком. Сухі і нішчымны, як абмалочаны сноп. Нейкі старэцкі скептыцызм прабіваецца ў яго словах, затхласцю мінуўшчыны ад-

дае яго размова, і сам ён, прапахлы царкоўнымі канонамі, выпетранымі і бяздушнымі, лампадным алеем і воскам царкоўных свечак, здаецца нейкім прыкрым архаізмам, варожым да ўсяго, што свежа і молада.

Сяды-тады, крадком, кідае настаўнік погляд на дзяка. «І быў-жа калісь чалавек маладым... Які быў ён юнаком? — снуюцца думкі ў галаве настаўніка. — Напэўна-ж былі ў яго тады нейкія імкненні, чагось чакаў ад жыцця чалавек. І як стаўся ён такім заскарузлым, сухім і чэрствым?»

Дзяк пачынае карцець яму, назаляць, замінаць. А той сядзіць сабе, пакурвае суседавы папяросы, разглядае свае кратовыя лапы-рукі. Лабановіч не знаходзіць аб чым гаварыць з ім, не ведае, як падтрымаць гутарку. Разам з дзяком і ён пераводзіць вочы на яго рукі, запыняе на іх увагу. Нарэшце не вытрымлівае і пытае:

— Ад чаго гэта ў вас такія рукі, Амос Адамавіч?

Амос Адамавіч — так завецца дзяк — глядзіць на свае дзіўныя лапы, растапырыўшы пальцы, усміхаецца і кажа:

— Ад старасці і ад раматусу. Старэе чалавек, змяняюцца і формы яго цела. Не красіць, мілы мой, старасць чалавека... А вы ведаеце, чым лячуся я ад раматусу?

— Чым?

— Крапівою. І вельмі памагае.

— Як-жа вы лечыцеся крапівою?

— А вот рву крапіву і б'ю ёю па руках. Насячэш іх, і адразу лягчэй робіцца. А дактары не ведаюць лякарства ад раматусу. Крапіва — найлепшае лякарства.

— А зімою як вы лечыцеся крапівою?

— Зімою горш: не расце крапіва. Гэта добра — свежанькаю.

І расказвае дзяк аб вялікай вартасці крапівы. А каб здаровым быць, то часамі не шкодзіць наогул пасеч сябе крапівою. Ад крапівы пераходзіць ён у мінулае. Тады людзі ніякіх дактароў не ведалі і былі здаровыя. Наогул даўней жылося лепей. Прадукты былі танныя. За тры капейкі чорт ведае чаго можна было купіць. І людзі былі лепшыя.

Вядзе гутарку Амос Адамавіч нецікавую, усім вя-

домую, многа разоў чутую. Прыплятае сюды нейкага спраўніка, як ён са смятаны маслёнку рабіў.

Бедны настаўнік глядзіць на гадзіннік, а дзяк не зважае. Здаецца, ніколі не выйдзе ён адгэтуль.

Так праходзіць увесь вечар.

— Вы, мусібыць, позна спаць кладзецеся? — пытае настаўнік.

— Як калі, — адказвае дзяк ды зноў сядзіць, пазірае на свае вывернутыя пальцы.

«Ах, што-б ты лёг ды не прачнуўся больш», — думае Лабановіч і не можа дачакацца, калі госць яго пойдзе дамоў.

XIX

Пачатак лістапада.

Вечар.

Лабановіч сядзіць у сваім аблюбаваным пакойчыку. На стале гарыць лямпа пад светлым абажурам. У вокны глядзіць густы змрок. Сівыя хмары звісаюць нізка, сеючы дробны дождж. Ціха і глуха. Толькі з кухні даносіцца Юсцін галасок — спявае песеньку, ды зрэдку кіне слова Ганна да свае дачкі.

Настаўнік разглядае паперы, прысланыя сёння з пошты праз валасць. З поштаю прышла і газета «Гражданін». Рэдактар гэтай газеты — князь Мяшчэрскі. Агідная чорнасоценная газетка, звышпатрыятычнага зместу. Высылаецца ў школы дарма, выдаецца на казённую субсідыю для пашырэння манархічных ідэй. У газеце даюцца і адпаведныя рысункі. У гэтым нумары таксама ёсць рысунак: цар Мікалай другі сядзіць за сталом сярод кніг і папер з пяром у руках. Міна яго поўна задумлёнасці і заклапочанасці. А дзесь, на заднім плане, мітусіцца народ, заняты сваімі справамі. Пад рысункам подпіс: «Народ весяліцца, а цар працуе».

Лабановіч пазірае на рысунак, і па губах прабягае іранічная ўсмешка. Потым ён хапае газетку і шпурляе кудысь у куток.

— Паскудства! — гаворыць сам сабе.

На школьным ганку з боку выгана чуюцца нейчыя крокі, а потым — асцярожны стук у дзверы.

«Хто-ж гэта яшчэ прэцца?» — думае настаўнік ды ідзе адчыняць, падняўшы на ўсякі выпадак «Гражданина» князя Мяшчэрскага.

— Хто? — пытае Лабановіч.

— Вучыцельніца, — чуецца з-за дзвярэй малады дзявочы голас.

Візіт незнаёмай настаўніцы ды яшчэ ў позні час яго моцна дзівіць. Ён адчыняе наўперад дзверы ў сваю кватэру, каб відней было, бо ў перадпакойчыку цёмна, і ўпускае настаўніцу.

— Заходзьце, будзьце ласкавы.

Настаўніца заходзіць у цемнаваты пакойчык і спыняецца.

— Праходзьце далей — там святлей і цяплей.

— Раней-жа трэба хоць пазнаёміцца: Вольга Андросава... Не напалохала я вас? — пытае настаўніца і смяецца.

— Калі палохацца настаўніцы, то лепш пайсці ды ўтапіцца ў Піне.

— Вы мяне выбачайце. Еду ў сваю школу, у Купячычы, і па дарозе да вас заехала.

— І вельмі добра зрабілі. Раздзеньцеся ды трохі пасядзіце. У мяне якраз і самавар зараз будзе гатоў.

Вольга Андросава — яшчэ зусім маладая дзяўчына. Год, як скончыла гімназію. Смуглая, круглатварая, жывая і быстрая. Фігурка яе мерная і складная. Цёмныя валасы падстрыжаны. Вочы бойкія і смелыя.

— Вы яшчэ не былі ў сваёй школе?

— Не, не была. І не ведаю, якая яна там. А вы ўжо даўно тут?

— А ўжо зараз два месяцы будзе.

— І работу распачалі ў школе?

— Пачаў. Другі месяц, як заняткі ідуць.

— Ох-ці мне! Як-жа я адстала ад вас!

— А чаму так позна вас назначылі?

— Назначылі мяне з першага кастрычніка. Ну, пакі прышло назначэнне — а жыву я ў Смаленшчыне — ды пакі заехала сюды, ды ў Пінску трохі ў знаёмых пабыла, вось і апазнілася.

— Ну, што-ж? Лепей позна, чым ніколі.

Андросава — бойкая, гаварказ дзяўчына. Не прай-

шло і пяці хвілін, як яны разгаварыліся, нібы даўно ўжо былі знаёмыя. А калі Ганна прынесла самавар, настаўніца ўзяла ад яе рушнік, стала выціраць шклянкі, папрасіўшы дазволу на гэта, і сама наліла чаю гаспадару і сабе. Яна піла чай і гаварыла. Загаварыўшыся, курыла і, відаць, адчувала сябе тут вельмі добра.

Але ў самы разгар чаявання і гутаркі ў акно пастукаў фурман. Аб ім тут і забыліся. Фурман гэты — селянін з Купяціч. Яму абрыдла стаяць каля школы, і ён забарабаніў у акно.

— Скора будзем ехаць?

Вольга Віктараўна паглядзела на Лабановіча.

— А я і забылася, што мне ехаць трэба. Што-ж, буду збірацца.

— Вольга Віктараўна! Адпраўляйце вы сваю фурманку дамоў, а самі начуйце тут. Дзе-ж там у школе прыпыніцеся? Ужо ноч, а пакі заедзеце, яшчэ пройдзе гадзіна. А там напэўна холадна і можа нікога няма. Кажу вам, адкіньце ўсякія цырымоніі і заставайцеся начаваць. Заўтра пойдзеце ў воласць, — а ў воласці вам быць усё роўна трэба, — возьмеце фурманку і паедзеце.

Настаўніца пазірае на Лабановіча.

— А ведаеце, — гаворыць яна, — вы падаеце мне геніяльную мысль.

Лабановіч выходзіць на двор.

— Едзьце вы сабе дамоў, настаўніца тут застанецца.

— Тут, дык тут. Але чаго-ж я бітую гадзіну стаяў?

Фурман заварочвае каня, бубніць штось сам сабе і ад'язджае.

Лабановіч ідзе ў кватэру, а Вольга Віктараўна па нейкай аналогіі ўспамінае адно здарэнне са свайго жыцця і расказвае аб ім.

— Раз у Смаленску запыняе мяне абарваны чалавек інтэлігенцкага аблічча: «Дайце мне, барышня, на выпіўку». — «А колькі-ж вам даць?» пытаюся. Абарваны чалавек прыстаўляе палец да ілба і застывае ў глыбокадумнасці: «Уявіце сабе, барышня, першы раз у сваім жыцці натыкаюся на такое пытанне!.. Ну, дайце, каб можна было чарвяка заліць». — «Разуменне «заліць чарвяка» — рэч неазначаная і расцяжная: аднаму і круч-

ка даволі, а для другога кручок — капля ў моры» — заўважаю яму. «Зусім справядліва. Я іменна з катэгорыі тых, для каго кручок — капля ў моры»...

Вольга Віктараўна як-бы ахамянаецца і кажа:

— Можа, я вам, калега, замінаць тут буду? Бесталковая я!

— Ніколечкі! — заспакойвае яе Лабановіч: — Кватэра мая прасторная. І канапа мяккая нават ёсць.

— Ды вы, калега, — буржуй! — смяецца Вольга Віктараўна.

— Я толькі карыстаюся, можна сказаць, ад вашага брата.

— Як, так?

— Тут была калісь настаўніца, якой сімпатызаваў інспектар. Гэта ён для яе набыў такую буржуйскую росказш. Так што вы на яе маеце большае права, чым я.

— Ну, ладна! — згаджаецца Вольга Віктараўна: — Будзем лічыць гэтае пытанне вычарпаным да дна. А цяпер хацела-б я прасіць, калега, каб вы ўвялі мяне ў курс школьнае справы, бо я ў ёй ні чорта не разумею. Не ведаю нават як і прыступіць да яе.

— Ну, што-ж? Раскажу вам, як і што, толькі вы мне за гэта павінны будзеце зафундзіць, бо дарма, кажуць, і каза не скача, — пачынае жартам Лабановіч.

— За гэтым справа не стане. Прыязджайце да мяне, пачастую, — смяецца настаўніца.

— Ну, калі так, дык слухайце. Перш за ўсё вам трэба сабраць вучняў. Звычайна гэта робіцца так: вы назначаеце дзень збору, а стараста (можна і праз папа) апавяшчае бацькоў, каб пасылалі ў школу дзяцей. Збяруцца дзеці, вы іх запішаце ў асобны журнал... Вось гэта ўсё я пакажу вам...

Лабановіч прыносіць журналы і раскладвае іх перад настаўніцаю, паказвае, у якім журнале і што трэба запісаць.

— Як бачыце, журнал сам падказвае, як і што запісваць. Але гэта глупства. Самае паганае ў нашай настаўніцкай практыцы тое, што аднаму чалавеку прыходзіцца весці работу з чатырма групамі. А ў вас яшчэ і школа многалюдная — каля ста дзяцей набярэцца.

— Што вы кажаце! Каля ста чалавек?! І чатыры гру-

пы! Ды гэта-ж свінства! Што-ж я буду рабіць?.. Охці, галованька мая!

Страх і недаўменне адбіваюцца на твары Вольгі Віктараўны. Лабановіч глядзіць на яе, а потым рагоча.

— Ды гэта-ж звычайная з'ява ў нашых школах, — зазначае ён.

— Але-ж я не магу сабе ўявіць, як можна весці работу пры такіх умовах. І ўсе чатыры групы ў адным класе?

— А як-жа іначай? Страшнага тут нічога няма. Трэба наўперад напісаць расклад свае работы, напісаць такім парадкам, каб у вас на кожную гадзіну была група, дзе вы будзеце весці асноўную работу, а другія групы ў гэты час хай займаюцца самі пад вашым кантролем. Групы вы мяняеце, чаргуеце, але ні аднае не спускаеце з вока, іначай у вас будзе гармідар.

— Невясёлыя рэчы расказваеце вы мне, Андрэй Пятровіч. Ведала-б і не заязджала-б да вас... Міленькі, Андрэй Пятровіч, навучыце-ж мяне, як-жа размеркаваць работу так, каб можна было добра весці яе?

— Вы так хораша папрасілі мяне, што я павінен навучыць.

Лабановіч прыносіць свой расклад работы ў школе. Садзяцца поруч. Настаўнік паказвае ёй расклад і тлумачыць. Вольга Віктараўна прыглядаецца, пачынае разбірацца і зусім весялее.

— Ну, я спішу ваш расклад, здзяру яго да літары... Дайце мне, калі ласка, паперы... Ах, як слаўна, што я да вас заехала і як разумна зрабілі вы, што не пусцілі мяне!

Яна зноў ажыўляецца, парывіста хапаецца за работу. Праз чвэрць гадзіны яны скончылі перапісванне.

— Ну, цяпер мяне не возьмеш за руб дваццаць, — гаворыць настаўніца, хаваючы расклад.

Гутарка яе развязная, бойкая. З Лабановічам трымаецца па-таварыску. Лабановіч прыглядаецца да яе, мяркуе да якой катэгорыі жанчын аднесці. Яна нагадвае яму тургенеўскую нігілістку.

— Ну, як вы наогул глядзіце на сваю настаўніцкую місію? — пытае яе.

— Ох, скажу вам — нудная гэта справа! Ды я-ж яе

і не ведаю. А вы так напалохалі мяне. Проста былі такія мыслі, — завярнуцца адгэтуль ды даць драпака. Я толькі цешу сябе тым, што, на шчасце, вы — мой сусед і спадзяюся, што вы мне паможаце, калі я часамі ўткнуся ілбом у сцяну.

— Бачыце, Вольга Віктараўна, справа ў тым, каб палюбіць сваю работу. Калі вы яе палюбіце і захопіцеся ёю, дык знойдзеце спосаб адхіліць і перамагчы перашкоды, калі яны напаткаюцца.

— Каб палюбіць сваю справу, трэба яшчэ і вера ў сэнс яе, — заўважае Вольга Віктараўна. Яна апускае вочы, як-бы веры ў яе якраз і бракуе, толькі сказаць гэтага не адважваецца.

— Але-ж вы напэўна гэтую веру маеце, калі выбралі сабе настаўніцкую дарогу.

— А вы думаеце, што ўсе настаўнікі так захоплены сваёю справаю, што цалкам аддаюцца ёй? — пытаннем адказвае Вольга Віктараўна, відаць ухіляючыся ад простага адказу. Потым яна падымае вочы на Лабановіча.

— Андрэй Пятровіч, скажыце, калі ласка: дабро вы робіце народу ці зло, забіваючы розум дзяцей і іх чыстыя душы ўсякаю казённаю трухляцінаю?

«Ах, унь ты якая», — думае сабе Лабановіч і адчувае, як балюча ўкалола яго гэтая дзіўная дзяўчына.

— Хто ведае, што ён свядома начыняе дзіцячыя мазгі гэтаю, як вы называеце, казённаю трухляцінаю, той ёсць нягоднік або проста няшчасны, бязвольны чалавек, ці проста рамеснік, гатовы за грошы рабіць усё, што хочаш. Але што замінае адкінуць гэтую трухляціну і накіраваць увагу дзяцей у другі бок?

— А як-жа гэта зрабіць? — пытае Вольга Віктараўна.

— Вось гэта і трэба ўсё абмеркаваць. Я ведаю, што такая работа патаемнаю не застанецца.

Далейшая размова зблізкае іх, рассейвае тое недавер'е і тую асцярожнасць, што замінаюць выяўленню шчырасці і адкрытасці паміж людзьмі, асабліва малазнаёмымі.

Вольга Віктараўна расказвае, як летам жыла яна сярод студэнтаў і настаўнікаў, якія гутаркі вяліся паміж імі, як варожа настроены яны супроць гэтай «ка-

зённай трухляціны». У яе ёсць цікавыя кнігі, якімі яна ахвотна падзеліцца са сваім суседам. Гутарка цягнецца за поўнач, пакуль Лабановіч як гаспадар не ўспамінае, што настаўніца з дарогі, што ёй трэба адпачыць.

А з двара на іх пазірае не адна толькі гэтая чорная, маўклівая ноч: дзяк Бацяноўскі стаіць на граніцы святла, што падае праз акно настаўніцкай кватэры, і густа злеглай над зямлёю цьмы. Ён пільна ўглядаецца ў гэтую маладую пару, ён ловіць кожны рух іх мыслі на твары. У яго мазгаўні таўкуцца розныя думкі, дагадкі. А калі ён дазнаецца, што гэта чарнявая, стрыжаная дзяўчына застаецца тут начаваць, дык здзіўленню і абурэнню дзякоўскай душы няма граніц.

XX

Вольга Віктараўна ўзяла слова ад свайго калегі, што ён у бліжэйшы святочны дзень даведаецца да яе. На гэтым яны і развіталіся.

А тым часам дзяк Бацяноўскі не мог стрымаць сябе, каб не расказаць суседкам-пападзянкам, а. Мікалаю і ляснічаму аб познім візіце настаўніцы да яго суседа і — што яшчэ болей цікава — аб яе начаванні ў яго кватэры. Дзяк пры гэтым не пашкадаваў фарбаў, каб апісаць усё падрабязна: як яны пілі чай, як яна выцірала шклянкі, як ён падсаджваўся да яе, і як яна гарнулася да яго. І гэта ўсё дзяк бачыў выпадкам, праходзячы каля школы.

— Падумайце, што пачало тварыцца на свеце! Чаму-ж яны навучаць дзяцей? — асвятляў дзяк гэтыя факты.

Цнатлівыя пападзянкі выслухалі з вялікаю цікавасцю дзякова паведамленне. Слухаючы, яны пераглядаліся, а на тварах прабягалі іранічныя ўсмешкі.

— А якая яна — прыгожая? — запытала малодшая пападзянка, Антаніна, болей жывая і яхідная.

— Стрыжаная! — адказаў дзяк, прычым гэтае азначэнне гучыць у яго роўназначна слову «прапашчая». — А якая яна далей, аднаму вельзевулу, князю цьмы, вядома. Блудніца садомская!

— На прыгоства цяпер не глядзяць, — са скрухаю заўважае старэйшая, Глафіра, бо яна лічыць сябе прыгожаю. — А прыклад таму — бязносая Ганна і Мітрафан Васільевіч. — І яна ўздыхае.

Застаўшыся ўдваіх, пападзянкі доўга разбіраюць гэтае здарэнне і выліваюць усю гарчэчу свайго застарэлага дзявоцтва. А Ганну паставілі пад допыт, бо цікава-ж было даведацца чаго-небудзь яшчэ новага.

— І доўга яны сядзелі? — пытае Антаніна.

— Не ведаю, паненачка: я ўжо легла спаць, а яны яшчэ сядзелі.

— І яна сама выцірала шклянкі?

— А хто яе ведае! Узяла ад мяне рушнік.

Ганна баіцца сказаць чаго-небудзь лішняга, бо настаўніка яна шануе і нічога благога ў ім не бачыць.

— А дзе яна спала? — цяпер пытанне ставіць ужо Глафіра.

— На канапе.

— А ён дзе спіць?

— А ён у гэтым пакойчыку, што пры кухні.

— А ўночы не ўставаў ён? Не чула?

— Не, не чула. Паныч яшчэ з вечара, кладучыся спаць, аддаў той паненцы ключ, каб яна замкнулася.

— Ключ аддаў? Нашто? — цікавіцца Антаніна.

— А мабыць, каб яна замкнулася і спакайней спала.

— І яна ўзяла ключ?

Ганна выказвае нецярпенне і неахвоту адказваць на такія пытанні.

І а. Мікалай слухаў дзяка ўважна. Наўперад ён зрабіў здзіўленыя вочы, а потым працягла засмяяўся і, нарэшце, запытаў:

— А як яна сабою, нічога дзяўчына?

Айцец Мікалай — чалавек малады, і яго не-не ды часамі бухторыць д'ябал і прымушае заглядацца на прыгожых маладзіц.

Дзяк гэта ведае.

— Нічога дзяўчына, сакаўная і фігурыстая.

Айцец Мікалай каўтае сліну.

— Што-ж? І ты, Амос Адамавіч, быў малады. А можа, і цяпер злы дух спакушаў цябе, калі запыніў каля акна?

Працяглы смех зноў трасе жывот а. Мікалая, а дзяк апускае вочы.

— Спета песня мая, а. Мікалай, — адзываецца ён і ўздыхае журботна.

— Ці так гэта, Амос Адамавіч? — пытае а. Мікалай і стукае дзяка па плячы: — Аўрааму было сто гадоў, калі радзіўся ў яго Ісаак, а табе да ста, глядзі, гадоў сорак засталося?

Дзяк выпроствае згорбленую спіну.

— Да яно, калі-б на тое пайшло, а. Мікалай, — стары вол баразны не псуе.

— Ось бачыш!.. Так-та, Амос Адамавіч, — дадае а. Мікалай, — мы бачым сучок у воку брата свайго, а бервяна ў сваім не заўважаем.

Айцец Мікалай трохі расчараваў дзяка. Праўду сказаць, у глыбіні сваіх мыслей ён сам не бачыў тут нічога надзвычайнага, але было нешта такое, што настройвала яго супраць настаўніка. Хутчэй за ўсё ў яго была проста глухая зайздрасць да свайго суседа, зайздрасць немачнай старасці перад маладосцю. Але гэтаму пачуццю ён стараўся даць іншае афармленне. Як-ні-як — настаўнік павінен прыкладам быць, а не шашнямі займацца.

І дзяк не можа супакоіцца. Ідзе да ляснічага. Заводзіць гутарку аб настаўніку.

— А ён, відаць, сур'ёзны хлопец, — адзываецца ляснічы, — і работнік добры.

— Гроб паваплены! — зазначае дзяк і расказвае пра візіт настаўніцы.

Ляснічы слухае ўважна. Увесь час на яго губах пакалыхваецца ўсмешка. Сам ляснічы далёка не святы ў гэтым сэнсе чалавек. Выслухаўшы дзяка, ён кажа:

— На лаўца і звер бяжыць, калі толькі ён сам не дурань. — А потым яшчэ больш расхалоджвае дзяка. — Гэта — глупства. Я ведаю здарэнні, калі студэнт і студэнтка начуюць у адным пакойчыку, на адной пасцелі і нічога паміж імі не бывае.

Такім парадкам сярод мужчын дзяк не сустрэў таго эфекту, на які спадзяваўся. Затое жанчынам ён даў багаты матэрыял, якога ім хапіла на доўгі час.

Неўзабаве пасля гэтага дзяк з'явіўся ў школу. На

гэты раз ён прышоў сюды як настаўнік. Айцец Мікалай, з-за гаспадарскіх ці іншых спраў, не меў часу з'явіцца на «закон божы» і папрасіў дзяка падмяніць яго.

— Ты, Амос Адамавіч, жывеш там блізка. Займіся, зрабі ласку, чым-колечы з вучнямі.

— Можна, а. Мікалай! — даў дзяк сваю згоду.

У справе выкладання Бацяноўскі не меў практыкі. Але яна яму і не была патрэбна. Ён сам калісь вывучаў «закон божы», памятае, як вучылі ў яго часы. Праўда, ён шмат чаго забыў, але сёе-тое ў памяці яшчэ засталося. Вось аб гэтым, што захавала яму памяць, ён і будзе казаць.

Вучні былі вельмі здзіўлены, убачыўшы дзяка ў школе. Шмат хто з іх меў справу з дзяком, забягаючы летам у яго сад і агарод. А ён ганяўся за імі і лаяў іх.

Дзяк прыступіў да справы павольна. Наўперад паведаміў, што а. Мікалай даручыў сёння яму заняцца «законам божым». Усю школу злучыў ён у адну групу і загадаў дзецям сядзець ціха, слухаць уважна. А потым пачаў так.

— Ну, ты! — пальцам тыча дзяк на аднаго хлапчука.

Падымаецца некалькі хлапчукоў, бо выкрнуты дзякоўскі палец накіроўваецца адразу на некалькі вучняў.

— Чаго вы ўсе паўставалі? — крычыць дзяк.

Дзеці пачынаюць хіхікаць.

— Я вам пасмяюся, лайдакі вы! — грозіць ён.

— Ну, вось ты, чарнявы з краю!

Падымаецца «чарнявы з краю».

— Як цябе зваць?

— Міхалка.

— Прозвішча тваё пытаю, дурань!

— Мажэйка.

— Гэта які Мажэйка, што каля кузні?

— Эгэ, — адказвае вучань.

— А як цябе дражняць?

Міхалка маўчыць, а з усіх куткоў, наўперад ціха, а потым мацней гучаць галасы:

— Латак, Латак!

— Многа нарабіў ты ў агародзе дзірак? — пытае дзяк.

— Не, нямнога.

— Ну, колькі?

— Можа, з дзесятак морквачак і вырваў.

— Ах ты, гіцаль! Ну, садзіся.

Пад дружны рогат дзяцей Міхалка садзіцца, а дзяк тупае нагамі і рукамі махае, каб заспакоіць іх.

— Хоць вы і вучыцеся, але нічога не ведаеце, — пачынае дзяк прамову, прычым гаворыць паляшуцкаю мовою, якою ён валодае лепей, чым рускаю. — Пачнем з канца або з самага пачатку, бо вы — дурні і нічога не ведаеце... Дык вось, так. Нічога наўперад не было: ні неба, ні зямлі, ні нашых пінскіх балот, ні чароту на іх.

— А чым тады ў печы палілі? — пытае хтось ззаду.

— І пячэй не было, і хат не было, — адказвае дзяк. — Нічога не было. Быў адзін толькі бог... А дзе жыве бог? — перапыняе сам сябе дзяк і раптам пытае вучняў.

— На небе! — гудуць дзеці.

— Так, на небе. Сёе-тое вы ведаеце. Ну, а вот як неба не было, тады дзе жыў бог?

— На ўсякім месцы.

— О, шэльмы, і гэта ведаеце. Ну, што-б у вас запытаць, чаго вы не ведалі-б... Ага. Скажэце, колькі асоб у бога?

— Тры: бог айцец, бог сын і бог дух святы!

— Вось арыштанты! і гэта вы ведаеце. Ну, буду казаць далей. Дык нічога не было. Толькі дух божы насіўся над бяздонніцаю. І замысліў сабе бог стварыць свет. Аддзяліў бог святло ад цьмы і назваў святло — дзень, а цьму — ноч. Паглядзеў бог і кажа: «Добра вышла». Назаўтра бог устаў рана і пачаў майстраваць неба. Зрабіў, падзівіўся — добра. Калі ёсць неба, дык трэба, каб і зямля была. Зрабіў бог і зямлю. Але зямля была пустая і неўпарадкаваная, перамешаная з вадою. Ды ўжо было позна. «Заўтра зраблю», — думае бог. Назаўтра ён устаў яшчэ раней, бо работы было процьма. Трэба было нарабіць рэчак, азёр, мораў, ну, і балота таксама трэба чалавеку. Вось гэта ўсё і зрабіў бог на чацвёрты дзень. А каб яшчэ было харашэй, дык ён і цацак нарабіў на

небе: сонца, месяц і зоры. У пятніцу, гэта значыць, у пяты дзень, нарабіў бог рыбы ў вадзе і птушак у паветры. Весела зрабілася на зямлі: тут табе і трава і дрэвы растуць, вецер шуміць у лісцях, птушкі спяваюць, проста і ў хату не хочацца ісці. Не хапала яшчэ звяроў і чалавека. У шосты дзень нарабіў бог звяроў.

— І чалавека! — падказваюць дзяку.

— Не, стой: наперад не забягайце. Перад тым, як стварыць чалавека, была нарада паміж богам айцом, духам і сынам. Бог кажа: «Трэба стварыць чалавека, па вобразу і па падабенству да нас». Узяў бог гліны, зляпіў чалавека і хукнуў. Як хукнуў, чалавек зараз і ажыў. Пачаў ён хадзіць, разглядацца. Ды падобнага да сябе нікога не бачыць. Маркотна стала Адаму — першы чалавек называўся Адамам. Нідзе не прыткнецца бедны. Ходзіць, як пасля добрай выпіўкі, шукаючы, каб чым апахмяліцца. Пазіраў на яго бог, пазіраў ды кажа: «Нядобра чалавеку быць аднаму — трэба ажаніць яго». Дзяўчатжа на свеце не было, у сваты яго не павязеш. Трэба іншую раду даваць. Натупаўся Адам, ходзячы па зямлі, і моцна заснуў. Вось тады бог узяў з яго рабро, з рабра выштукаваў кабету і назваў яе — Ева. Прачнуўся Адам ды як глянуў на яе, дык увесь і прасвятлеўся. А бог пазірае ды цешыцца. «Бяры, — кажа, — яе: няхай яна будзе табе за жонку. Жывеце,— кажа,— у згодзе, у добрым ладзе, не сварыцеся, не біцеся. А ты, Ева, даглядай свайго мужа. Вось гэта ўсё, што вы бачыце, гэта ўсё ваша. Будзьце-ж гаспадарамі над усім, што на зямлі. Не забывайце бога, у царкву хадзіце. На папа і на дзяка таксама не забывайцеся, бо яны за вас мяне моляць».

Расказаў далей дзяк, як жылі ў раі Адам з Еваю, як ім было добра, якія былі там сады і дрэвы і якую запаведзь даў ім бог. Але найболей цікава расказаў дзяк, як людзі саграшылі і як бог караў іх за гэта.

— Паслухаў Адам сваю жонку, з'еў яблыка з забароненага дрэва. А як з'еў, дык адразу пазнаў, што зрабіў брыдка... Нядобра яму зрабілася і першы раз аблаяў Еву як мае быць. А тая маўчыць — ну, што ты возьмеш з бабы? Кінуў Адам Еву і пайшоў у дубы. Лёг пад дубам і ляжыць. Аж чуе — бог па раі ходзіць. Сорамна

Адаму богу ў вочы зірнуць. Ляжыць, не ўстае. Чуе — бог з Еваю гамоніць.

«А дзе твой Адам?»

Апусціла вочы Ева, маўчыць.

«Чаго-ж ты маўчыш? Дзе, кажу, Адам?»

«Не ведаю».

«Як «не ведаю»? А хто-ж павінен ведаць? — Глядзіць на яе бог строга. — Гэта, кажа, мая мілая, з цябе свет гарыць! Я ўсё бачу і ведаю. Пачакай, кажа, я з табою яшчэ пагавару! Пайду толькі таго лайдака пашукаю. Як мяне — дык не хачу слухаць, а жонку дык паслухаў!»

Чуе ўсё гэта Адам. Страшна яму. Стаіўся за дубам і ані чхне. Прайшоў бог так і гэтак, глядзіць — няма Адама. Дзе-ж ён, кажа, падзеўся? Давай яго клікаць.

«Адам!»

Адам — ані гу-гу.

«Адам!» — яшчэ мацней гукае бог.

А той Адам і галаву прыгнуў. Бог-то ведае, дзе Адам, але хоча, каб ён хоць трохі пакаяўся і сам папрасіў, каб даруваць яму грэх.

«Адам, дзе ты?»

Не падае Адам голасу. —

Тут дзяк уваходзіць у ролю ўгневанага бога і прыпісвае яму свае ўласцівасці.

— Угневаўся бог, ды як крыкне: «Адам, трасца тваёй галаве, дзе ты, гад?!».

Бачыць Адам, што нідзе тут дзенешся — вылазіць з-пад дуба.

«Нашто ты еў тое, што я табе не дазволіў?»

Замест таго, каб пакаяцца, Адам пачаў апраўдвацца: «Жонка, якую ты мне ўсватаў, дала мне, і я еў».

Паклікаў бог Еву.

«Нашто ты давала Адаму забароненыя плады?»

«Мяне спакусіў д'ябал, угаварыў мяне».

Паглядзеў на іх бог, патрос галавою.

«Будзь-жа ты пракляты, д'ябал. Поўзай на сваім чрэве, а некалі Евін патомак раздушыць табе галаву. Ты, Ева, будзеш у болях раджаць дзяцей, а муж твой будзе гаспадар над табою. А ты, Адам, не забывай, што зроблены ты з зямлі і ў зямлю зноў пойдзеш. Праклята зямля з-за цябе. Будзеш ты працаваць многа, а карысці

мецъ мала, бо не паслухаў бога». І павыганяў іх бог вон з раю.

— Дык вось бачыце, шэльмы вы, які грэх не слухаць бога! Рабіце тое, што вам кажуць старэйшыя. І па садах лазіць не трэба.

XXI

Мыслі, закінутыя ў душу Лабановіча нелегальнаю брашуркаю, не давалі яму спакою. Старыя пазіцыі светаразумення аказваліся хісткімі, пабудаванымі на пяску. Яны не вытрымлівалі напору крытычнай мыслі і рассыпаліся, паказваючы сваю нястатнасць і нікчэмства.

Здавалася, ужо само паветра было насычана новымі павевамі свежай мыслі, хоць ахоўнікі ўсталяванага вякамі палітычнага ладу цвёрда стаялі на сваёй варце і забівалі самыя маленькія шчылінкі, праз якія маглі-б прабіцца новыя ідэі. Але там, дзесь у патаемных глыбях, нешта бурліла, кіпела, узнімалася, рвалася наверх. Газеты паведамлялі аб забастоўках, успыхваўшых тамсям па вялікіх гарадах. Глуха далятала з розных месцаў грознае водгулле людскога абурэння. З заціснутых нізін выбіваліся крыніцы новага жыцця.

Цяпер усе гэтыя падзеі пераломліваліся ў свядомасці Лабановіча пад іншым пунктам разумення. Ён адчуваў радасць пазнання новай праўды, той праўды, што ў няяснай постаці вякамі жыве ў мужыцкім сэрцы, бунтуючы дух і падымаючы яго на паўстанні, той праўды, за якую лепшыя дзеці народа марнелі па астрогах, гібелі і чэзлі ў ссылках, на катарзе або ў росквіце жыцця складалі галовы па цёмных сутарэннях. І ўсе гэтыя мучанікі за праўду выклікалі здзіўленне і глыбокае спачуванне і з непераможнаю сілаю хілілі на тую цярністую пуціну пакуты, па якой ішлі яны.

Але разам з гэтым ясней выяўлялася і дваістасць таго стану, у якім цяпер апынуўся Лабановіч. З аднаго боку ён — вясковы настаўнік — павінен праводзіць у жыццё пэўныя ідэі. Сэнс іх — замацаванне таго парадку рэчаў, у справядлівасць якога ён не верыць. Над ім ёсць вока, і гэтае вока не дрэмле. І не адно, а многа

такіх вачэй. З другога-ж боку, выконваючы сваю ролю, ён свядома пераходзіць у рады ворагаў народа. Ён становіцца лгаром і проста нячэсным чалавекам, калі будзе ўбіваць праз школу ў дзіцячыя галовы гэтыя казённыя ідэі.

Прабаваў ён у сваіх разважаннях спыніцца на пэўных уступках — абыходзіць моўчкі ўсё тое, што спрыяе развіццю гэтых казённых прынцыпаў, накіроўваць думкі дзяцей на несправядлівасць социяльных парадкаў, абуджаць у іх грамадскую свядомасць, закідаць у іх душы зерне сумнення ў тым, ці добра ўсё тое, што прынята лічыць справядлівым.

Лабановіч успамінаў свае даўнейшыя разважанні аб ролі настаўніка, калі быў яшчэ ў Цельшыне. Падобныя мыслі прыходзілі яму і там, але тады не бачыў ён таго, што ведае цяпер, а толькі адчуваў гэта сваім социяльным чуццём. Аднак гэтыя кампрамісы не заспакойваюць яго. Настаўніку думаецца, што такія мыслі выходзяць ад таго згодніка, які жыве ў істоце чалавека.

Заспакоіцца і пагадзіцца на гэтым няможна. Трэба рабіць нешта іншае, трэба заспакоіць сваё грамадскае сумленне і выйсці з фальшывага становішча ашуканага чалавека, таго становішча, у якім знаходзяцца мільёны абдураных людзей. І такі выхад ён знаходзіць у Аксёну Калю.

Аксён Каль заходзіць да яго вечарамі. Навучанне хоць марудна, але пасоўваецца наперад. Аксён ужо нават можа і распісацца, што яго вельмі цешыць, але гэта яшчэ не сведчыць аб яго пісьменнасці. Чытае ён з друкаванага слаба, а з рукапіснага яшчэ горш. Распісацца-ж ён навучыўся, бо распісванне — найболей часты від яго практыкавання ў пісьме. Дома практыкавацца яму няма калі, дый нязручна. Прыходзіцца здавольвацца тым, што набудзе тут. Але без практыкі гэты набытак нетрывалы, і Аксён часамі выказвае думку, што, можа, навукі з яго і хопіць. Настаўнік-жа ўпарта насядае на яго, заахвочвае ісці далей. І яны патрошку ідуць.

Але не гэтая навука складае галоўны змест іх вечароў — першае месца адводзіцца гутаркам на тэмы палітычнага характару. Аксён Каль аказваецца такім чалавекам, з якім гаварыць можна смела. Ён толькі тро-

хі здзівіўся, пачуўшы ад настаўніка, што самы больш вораг народа ёсць цар, бо Аксён падзяляў агульную веру ў цара, як у асобу, што стаіць па-над людскімі інтарэсамі, для якой аднакава блізкія інтарэсы ўсіх станаў насельніцтва, а калі на свеце і робяцца здзекі і несправядлівасці над бедным чалавекам, дык у гэтым вінаваты царскія дарадчыкі і ўсе гэтыя басякі: міністры, губернатары, земскія начальнікі, спраўнікі і ўсялякія іншыя чыны, якіх нават і не злічыш. Для Аксёна Каля цяпер якраз і нявыгадна было траціць веру ў цара, нявыгадна з чыста практычнага боку: яго не пакідала надзея адваяваць затокі ад пана Скірмунта, а для гэтага заставаўся адзін толькі спосаб — падаць прашэнне на царскае імя.

— Але падаюць-жа людзі просьбы цару і гэтыя просьбы ён прымае, — прабуе супярэчыць Аксён.

— Ну, вядома-ж, каб гэтых просьб ён не прымаў, то іх і не падавалі-б. Але якія просьбы задавольвае цар? Калі ў каго брыдкае прозвішча, і ён хоча змяніць яго,— такую просьбу цар уважыць. Калі засудзяць каго, таксама цар можа зменшыць кару і можа нават зусім скасаваць яе. У такіх дробных выпадках, чаму-ж? Цар памагае, бо трэба-ж, каб людзі мелі веру ў яго. Але там, дзе закранаюцца інтарэсы дваран, памешчыкаў, цар ніколі не стане на бок сялян. І ў такіх разох кажуць: «Міністры не паказалі прашэння цару». Выходзіць так, што гаспадар добры, а вінаваты слугі. Глупства ўсё гэта, Аксён, і мана: цар ніколі не пойдзе супраць памешчыкаў, бо сам ён перш за ўсё ёсць памешчык. Цар Мікалай першы так і сказаў на сходзе дваран і памешчыкаў: «Не забывайце, панове, што я ёсць першы сярод вас памешчык». Я вам, Аксён, і болей скажу. Вы ведаеце здарэнні, калі цар задавольвае просьбы. Але ці ведаеце вы такія выпадкі, калі цары высылалі хадакоў ад сялян у Сібір? А такія здарэнні былі.

Аксёна ў гэты момант найболей займаюць тоні.

— Дык выходзіць, што тоней ад пана Скірмунта не вырвеш? — пытае ён.

— Не вырвеш, — пацвярджае Лабановіч.

— І прашэнне, кажаце, не паможа?

— Не, не паможа, — упэўнена адказвае настаўнік.

— Ох, згінь-жа яго маты!

Злосць забірае Аксёна. Перад яго вачамі ўстаюць суды, доўгая цяганіна з панам Скірмунтам і пройгрыш справы па ўсіх інстанцыях.

— Застаецца адно, — кажа Аксён, і вочы яго пабліскваюць злосцю, — прыдушыць, згінь яго доля!

— І гэта не паможа: у пана знойдуцца наследнікі, а таго, хто яго прыдушыць, згнояць у астрозе.

Аксён хмурыць лоб. Відаць, як блізка прымае ён гэта ўсё да сэрца. Мыслі яго шукаюць выхаду і гэтага выхаду не бачаць, а ў сэрцы ўзнімаецца помста і злосць.

— І няўжо-ж вечна будзе іх сіла і права? — як-бы да самога сябе гаворыць Аксён.

— Гэтага не павінна быць і не будзе, але само нічога не зробіцца.

— А хто зробіць?

— Павінны зрабіць самі пакрыўджаныя.

— А як яны зробяць?

— Вось над гэтым і трэба падумаць. Перш за ўсё трэба перастаць верыць у цара і рассейваць гэтую пустую веру і ў другіх. Трэба ўсвядоміць, што ўвесь дзяржаўны цяжар нясуць на сабе гаротныя сялянскія спіны і мазолістыя рукі рабочых. На іх гарбах багацеюць і ад'ядаюцца ў гарадах розныя купцы і фабрыканты, а на зямлі — дармаеды-памешчыкі. Трэба ведаць, што намі камандуе нязначная кучка дваранства і багатых гандляроў на чале з царом. Трэба зразумець усю гэтую музыку, гэтую хітрую машыну, каб зваліць яе са сваіх плячэй. Але аднаго толькі ведання мала, трэба закладаць свае саюзы і арганізацыі. Чым большыя будуць такія арганізацыі, тым лягчэй будзе весці змаганне за сваё права і за сваё вызваленне.

Аксён слухае, згаджаецца, часамі трасе галавою.

— Ой, трудна зрабіць гэта з нашым народам! — кажа ён і робіць увагі, што народ у розныя бакі глядзіць, а іншаму дурню гэтага ніяк і ў галаву не ўваб'еш.

— Адразу, за адзін дзень, пэўна, не зробіш гэтага. Добра ўжо будзе, калі цяпер на сяле знойдзецца некалькі чалавек, што будуць падзяляць такія думкі і другім аб іх казаць... Толькі-ж, Аксён, у гэтай справе павінна быць вялікая асцярога!

— Ну, гэта-ж вядома.

Такія гутаркі вяліся на кватэры настаўніка спярша з Аксёнам. Потым далучыліся яшчэ двое, бацька і сын. Гэта былі суседзі Лабановіча. Старому Бязручку гадоў пяцьдзесят, а сыну яго Якіму ў гэтым годзе трэба на прызыў ісці. Стары Бязручка называў сябе казаком — яго продкі былі казакамі на Украіне, а потым перабраліся на Палессе. Стары Бязручка болей маўчыць. У яго зубах увесь час люлька тырчыць. Мажа, гэтая люлька і ёсць прычына таму, што стары Бязручка бярэ малы ўдзел у размовах. Затое-ж твар яго вельмі выразна адбівае ўсе рухі яго мыслей і пачуццяў. Часамі ён вымае з рота люльку, сплёўвае і робіць кароценькую ўвагу. Звычайна-ж больш гаворыць рукамі. Асабліва многазначна махае ён рукою, калі гаворка заходзіць аб цару. Тады ён падыме вочы на царскі партрэт, не вымаючы з зубоў люлькі, і махне на яго рукою, і гэты мах гаворыць вось што:

— Карысці, брат, з цябе столькі-ж, як з дзіркі, што ў мосце.

Абодва Бязручкі — людзі шчуплыя і белабрысыя. Калі стары Бязручка скупы на словы, дык сын гаворыць і за сябе і за бацьку. У той час, калі гаворыць Якім, бацька ўважна слухае, але не глядзіць на сына. І трудна наогул сказаць, куды ён глядзіць. Здаецца, абмяркоўвае ўвесь час нейкую надзвычай складаную жыццёвую задачу, але ён усё чуе, не прапускае нічога.

Гаварылася тут многа чаго: аб цяжкім стане народа, аб прывольным жыцці паноў і начальства, аб ашуканстве і здзеках над простымі людзьмі, аб тых прычынах, што выклікаюць такі парадак на свеце, што трэба рабіць, каб адваяваць сваё права, што гэта за людзі ўсе тыя, каго называюць соцыялістамі, чаго яны хочуць, за што пакутуюць, чаму іх караюць стражэй, чым забойцаў і канакрадаў.

— Але чаму нам бацюшка аб гэтым ніколі нічога не скажа? — пытае Якім.

— Як-жа табе ён казаціме, калі ён з нашай цемры хлеб мае. Хто-ж гэта пойдзе сам супраць сябе, — адказвае Аксён: — Поп, земскі начальнік, прыстаў, спраўнік, гэта, брат, — усё адна шайка.

Часамі-ж тэмаю гутарак былі і пракламацыі. Тым ці іншым спосабам траплялі яны і ў сялянскія рукі. Быў такі час, калі гэтыя пракламацыі таемнымі рукамі засоўваліся ў сялянскія вазы. Прыедуць, бывала, сяляне з рынку, пачнуць выбіраць з воза пакункі і знойдуць вузенькія, доўгенькія лісточкі. Няграматны селянін паглядзіць на іх ды схавае ў кішэню, каб пры здарэнні паказаць чалавеку граматнаму. Паднясуць іх часам а. Мікалаю, дзяку ці ляснічаму.

Ляснічы паглядзіць, паглядзіць і — шась. Парве пракламацыю на дробныя шматкі, а потым вылаецца моцнымі словамі і кажа:

— Гэта ўсё жыдоўскія махінацыі. Ідзі і рукі памый. А калі зловіш гэтага сукінага сына, што падсоўвае такую сквернасць, дык цягні ў паліцыю. У паліцыю, і ніякіх.

— А чорт-жа яго бацьку ведае, што яно тут пішацца, — адказвае селянін і вельмі шкадуе, што не ўдалося даведацца, аб чым гаворыцца ў лістках.

Калі пракламацыя пападзе ў рукі папа, ён злосна бліснe вачыма і запытае:

— Дзе ты яе ўзяў?

— У саломе на возе знайшоў.

— Гэта ёсць богамерзкае пісанне, і пячаць антыхрыста прыбіта на ім. Такія рэчы трэба аддаваць у паліцыю. А яшчэ лепш, калі спаліць на месцы.

— А што-ж тут, бацюшка, пішацца? — пытае праз меру зацікаўлены паляшук.

Бацюшка запальвае свечку, каб спаліць пракламацыю.

— Калі злы дух намерваецца спакусіць чалавека, ён абяцае яму залатыя горы. Вось і тут ён робіць тое самае. Ад гэтых прахвостаў, што пішуць такія лісткі, адступіўся бог, і ў вар'яцтве сваім кажуць яны: «Няма бога, і не трэба цара». Святое-ж пісьмо нас вучыць: «Усякая душа няхай слухае начальства, бо начальства пастаўлена ад бога». — І а. Мікалай падпальвае пракламацыю.

А калі такая пракламацыя трапіць да дзяка, ён забірае яе, хавае ў кішэню.

— Я аддам яе старшыні, а старшыня перадасць па начальству.

У кватэры настаўніка пракламацыі давалі багаты

матэрыял для гутарак. Гаварылася і па зместу пракламацый і аб тых людзях, што складаюць іх.

Старога Бязручку дзівіць спрыт гэтых невядомых асоб, што так лоўка падкідаюць лістоўкі.

— Ну і лаўкачы, згінь іх маты: так падсунуць, што і не пачуеш!

XXII

Некалькі дзён ліў дождж.

Гразь непралазная, клейкая гразь затапляе дарогі. Каляіны заліты вадою. Па нізінах, як азёры, стаяць шырокія лужыны. Ні прайсці, ні абмінуць іх. Холадна, золка, пуста і глуха. Спустошаныя, знясіленыя, як-бы памерлі гэтыя прасторы Пінскага палесся. Толькі шэрыя плямы людскіх паселішч журботна туляцца да азызлай мокрай зямлі, ды нейкімі прыкрымі шкілетамі выглядаюць аголеныя дрэвы.

Лабановіч досыць далёка адышоўся ад сяла, мінуў два ветракі ў полі і спыняецца перад вялізнаю лужынаю — не пяройдзеш тут. Глядзіць па баках — не абыйдзеш: далёка па разорах, як тыя праменні, ад гэтае лужыны разыходзіцца вада. Цяпер ён бачыць сваю памылку, трэба было адразу накіравацца на чыгунку. Ісці назад далёка: амаль палавіна дарогі. Яшчэ поўвярсты — і пераезд, а за пераездам — грэбля. Там не будзе такой гразі. Стаіць, разглядаецца, мяркуе. Няўжо-ж спыніць яго няшчасная гэта лужына? Ужо некалькі разоў важыўся ён у гэтую дарогу, не раз успамінаў Вольгу Віктараўну і свае слова — пабыць у яе.

Настаўнік выходзіць на больш сухое месца, прыгінаецца, знімае хадакі, падкасваецца: «Ліха яго бяры, лёду няма, а можа, ногі не паадвальваюцца, а на пераездзе абуюся», — думае. Раз і два. Ногі ўлазяць у халодную, як лёд, калатушу. Пякучы холад, здаецца, даходзіць да сэрца, але ён храбра цярэбіцца па гразі. Успамінаецца, як некалі малым бегаў босы каўзацца на лёдзе. Месцамі гразь і вада займае па калені. Нарэшце лужына канчаецца, і ён выходзіць на сушэйшае месца і тут прыпускаецца бегчы, адчуваючы незвычайную лёг-

касць і ахвоту імчацца, як мага шпарчэй. Бяжыць, а ў вушах гучыць украінская песня: «Ой, не ходы, Грыцю, тай на вечорныцю». Пакуль дабег да пераезду, ногі зрабіліся чырвоныя, як у бусла. Затое-ж калі абуўся, дык адразу пачуў, як добра нагам.

Не даходзячы да сяла, ён зварочвае з дарогі і ідзе пустымі агародамі па пратоптанай сцежцы. Школа відаць здалёк — яе адразу можна пазнаць па белых аканіцах і наогул па ўсім яе выглядзе.

Пер態лезшы цераз плот, Лабановіч ідзе школьным агародам, дзе тырчаць яшчэ цыбуры сланечнікаў, і заходзіць у кухню. Старожка Маланне, у белай вышыванай кашулі, чыстая і акуратная маладзіца, увіхаецца каля печы.

— Дома настаўніца?

— Дома, дома! — бойка адказвае Маланне, аглядаючы настаўніка жывымі, вясёлымі вачамі.

Вольга Віктараўна, відаць, пачула і па голасу пазнала свайго суседа па школе, бо зараз-жа з пакоя пачуліся яе борздыя, цвёрдыя крокі. Момант, і яна сама паказалася на парозе. Твар яе вясёлы, у вачах свецяцца іскры радасці.

— Андрэй Пятровіч! Вось маладзец! А я ўжо і веру страціла на тое, што ўбачу вас тут. Ну, міласці-ж прашу.

— Калі я памру, то перад смерцю напішу: «У маёй смерці вінавата Вольга Віктараўна».

— Чаго-ж гэта вы паміраць збіраецеся ды яшчэ мяне за прычыну свае смерці ставіць думаеце? Ніколі-ж мне ў галаву не прыходзіла, што праз мяне можа чалавек памерці.

Лабановіч расказвае пра страшную лужыну, што стала на дарозе.

— Але жаданне пабачыць вас у мяне было такое моцнае, што я разуўся і ўброд перайшоў.

— Што вы кажаце? — на твары Вольгі Віктараўны адбіваецца вялікае здзіўленне. — Так і сапраўды не штука захварэць і да Абрама-на піва трапіць. Ох, Андрэй Пятровіч, біць вас няма каму!.. Трэба-ж хоць падлячыць вас.

Яна бяжыць у кухню, загадвае Маланні падагрэць самавар, а потым, як круцёлка, завіхаецца каля шафкі.

Лабановіч глядзіць ды пасміхаецца: «Няўжо ў яе гарэлка ёсць». Аказалася-ж нешта лепшае — поўбутэлькі нечапанага добрага кан'яку.

— Я вельмі рада, што маю чым падлячыць вас. — Яна налівае ёмкую чарку. — Піце, Андрэй Пятровіч: гэта першы спосаб усцерагчыся ад прастуды.

— А вы пачніце самі.

— О, не! Я-ж босая не хадзіла, — смяецца яна, — і наогул не п'ю чыстага кан'яку.

— Ну, дык будзьце-ж здаровы.

Лабановіч хацеў ужо выпіць, але спыніўся і сказаў:

— Няхай-жа ніколі не абяднее рука, што налівае чаркі, і няхай стаяць на дарогах лужыны!

Пасля такой прымаўкі ён спрытна куляе чарку. Пасмакаваў, паглядзеў на настаўніцу.

— Ведаеце, Вольга Віктараўна, што?

— Ну?

— Другі раз я прыду да вас босы.

Настаўніца смяецца.

— А можа, яшчэ адну?

— Не, і ўся тая лужына не варта гэтага божага дару.

— Ну, то мы вып'ем яго з чаем. А цяпер закусіце.

Лабановіч чуе, як прыемная цеплыня разыходзіцца па целе, і яму зусім добра тут.

Кватэрка Вольгі Віктараўны старая і цемнаватая. Даўно пабеленая столь уся зрысована рудымі зацёкамі. Падлога падгніла, і дошкі хістаюцца пад нагамі. Настаўніца жыве ў адным толькі пакойчыку, акуратна і чысценька прыбраным, як умее прыбраць дзявочая рука.

— Ну, пахваліцеся-ж, Вольга Віктараўна, як жывецца вам тут?

— І не пытайцеся, Андрэй Пятровіч. Кідаюся, хапаюся, а ўсё нейк... не тое. Няма... ну, як вам сказаць, ну, гэтай радасці работы.

— Вы яшчэ напэўна знаходзіцеся ў стане наладжвання работы, а на гэтай ступені заўсёды многа клопату і непрыемнасці, — прабуе супакоіць і падвесяліць яе Лабановіч.

Яна як-бы трошкі задумваецца над яго словамі і адмоўна трасе галавою.

— Не, мяне проста работа не задавольвае, і ўся абстаноўка для яе нейкая нялюдская. Вы бачылі мой класны пакой?

— Не, не бачыў.

— Хочаце паглядзець?

— А давайце паглядзім.

Вольга Віктараўна вядзе яго ў школу.

— Вот, любуйцеся, — гаворыць яна, адчыніўшы дзверы.

Школьны клас меў вельмі запушчаны і пануры выгляд. Атынкаваныя сцены былі збруджаныя, абшарпаныя, ababітыя. Усюды чарнелі сляды вучнёўскай пісаніны, бо доўгія гады сцены гэтыя выконвалі ролю прамакальнай паперы. На падлозе, якая ў многіх мясцінах прагніла і пакасілася, цэлы пласт гразі. І дух у класе цяжкі, нездаровы.

Лабановіч аглядае школу.

— Так, Вольга Віктараўна, пахваліцца сваёю школаю вы не можаце.

— Вы ведаеце, Андрэй Пятровіч, пабудзеш у такой атмасферы некалькі гадзін і выходзіш адгэтуль, як атручаная. Проста, хоць і на свеце не жыві.

— Паршывая школа, гэта праўда, — згаджаецца Лабановіч, — спачуваю вам, Вольга Віктараўна!

Агляд школы прыніжае яго добры гумор. Яму нейк шкада робіцца Вольгі Віктараўны. Хоча сказаць што-небудзь добрае, вясёлае, каб падняць яе настрой, але слоў такіх не знаходзіцца.

— Ну, што-ж? — нарэшце кажа ён. — Застаецца толькі цешыць сябе тым, што скора канікулы, можна будзе адпачыць, а там патрохі і зіма скончыцца, прыдзе вясна... Эх, Вольга Віктараўна! Люблю я вясну і асабліва той час, калі на бярозах пачнуць распускацца лісточкі. Вясною ў мяне абуджаецца дух вандроўніцтва. Вось так-бы, здаецца, ішоў і ішоў-бы ў прасторы зямлі.

Лабановіч захапляецца мыслямі аб вясне і аб вандроўніцтве. Ён забывае душную, гнілую школу Вольгі Віктараўны і гаворыць аб сваім жаданні павандраваць у вольны час летніх канікул.

— Ведаеце, Вольга Віктараўна, што ёсць добрага ў жыцці вясковага настаўніка?

— Па-мойму, нічога няма добрага, — скептычна адказвае Вольга Віктараўна.

— Няпраўда, Вольга Віктараўна, — ёсць!

— Ну, што, напрыклад?

— Вольнае лета. Скончыў работу ў школе — і ідзі куды хочаш, рабі што зажадалася.

— Так, з гэтага боку вы, бадай, і маеце рацыю, — згаджаецца Вольга Віктараўна.

— А што? Вось бачыце. Ніякая іншая служба не дае такога прыволля. І ведаеце, якія ў мяне ёсць мыслі?

— Да хто-ж можа ведаць вашы мыслі?

— Той, хто пацікавіцца ведаць іх.

— Ну, то раскажыце.

— А вось якія мае мыслі: я хачу навучыцца рабіць фатаграфічныя знімкі, хачу купіць апарат. Вясною падбяру сабе кампанію вольных вандроўнікаў... У дэталях я яшчэ не прадумаў плану, а ў асноўных рысах ён такі — абыйсці пехатою цэлы раён, апісаць яго, сабраць народныя песні, легенды і іншыя віды народнай творчасці, багата ілюстраваць сваё падарожжа фатаграфіямі... Хачу сабраць цэлую галерэю ведзьмароў, вядзьмарак, шаптух і шаптуноў, бо гэты тып вымірае, і захаваць яго такім чынам для навучання патомкаў.

— А ваш план мне падабаецца, — ажыўляецца Вольга Віктараўна: — І сапраўды, у ім ёсць, калі хочаце, паэзія і сваё хараство.

— Паэзіі тут і не абярэшся! — падхватвае Лабановіч. — Новыя мясціны, новыя людзі, негаданыя прыгоды падарожжа, начлег дзе-небудзь на ўлонні прыроды, касцёр, цёмнае неба і ясныя зоры... І сярод усяе гэтае абстаноўкі вы будзеце слухаць апавяданне якога-небудзь баечніка-дзеда аб падзеях мінулага, дзе праўда і фантазія пераплятаюцца ў дзіўных злучэннях.

— Вы так цікава расказваеце, Андрэй Пятровіч, што мне ўжо хочацца пусціцца з вамі ў дарогу, калі прымеце ў сваю кампанію.

— Аб цікавых рэчах нельга расказваць нецікава, — заўважае Лабановіч, — а супраць таго, каб мець вас у кампаніі, я абсалютна нічога не маю. Нават больш вам скажу: такою кампаніяй я зусім задаволюся і калі каго прыму, то толькі не свайго брата мужчыну.

Пры гэтым Лабановіч зазірае ў вочы Вользе Віктараўне з хітраватаю ўсмешкаю, каб сказаць гэтым поглядам тое, чаго не даказаў словамі.

Вольга Віктараўна з прыкідлівым дакорам глядзіць на суседа і ківае галавою.

— І ўсё-ж вы, мужчыны, на адзін капыл параблены! — дадае яна.

Маланння прынесла самавар.

— Ну, будзем чай піць і пагутарым аб вашым вандроўніцтве.

Вольга Віктараўна прыбірае стол, зрэдку перакідаючыся з суседам кароткімі сказамі.

— Ведаеце, Вольга Віктараўна, — гаворыць Лабановіч, седзячы за сталом, — апроч жартаў, я сур'ёзна думаю над сваім вандроўніцтвам. Але я бачу ў ім і не толькі адну паэзію — тут можа быць і нецікавая проза. Ды справа не ў гэтым. Я хачу бліжэй прыгледзецца, як людзі жывуць, чым жывуць і што яны думаюць. Такое жаданне з'явілася ў мяне нядаўна... Вы ведаеце, што раблю я цішком? — ціха пытае Лабановіч.

Вольга Віктараўна глядзіць на яго.

— Напэўна прапаганду ведзяце?

— Іменна. Крамольныя ідэі прапаведую.

— Ну?!

Настаўніца яшчэ больш ажыўляецца, і ў вачах яе іскрачкі паблісксваюць.

— Што вы на гэта скажаце? — пытае яе.

— Маладзец вы, Андрэй Пятровіч! Ад душы поспеху жадаю вам. Цікава-ж, як вы гэта робіце?

— Покі што ў мяне ёсць тры асобы, сяляне, і адзін з іх чалавек вельмі сур'ёзны. На яго можна палажыцца, як на каменную сцяну. Вечарамі сяды-тады ён заходзіць да мяне, і я вучу яго, бо ён непісьменны, а побач з гэтым вяду гутаркі на розныя «крамольныя» тэмы. Прыходзяць і яшчэ двое, бацька з сынам. Цікавыя тыпы!

— А як-жа вы натрапілі на іх, сабралі? — пытае Вольга Віктараўна.

— Ды проста прыглядаюся да людзей, прыслухоўваюся да іх слоў, выпрабоўваю іх патрошку.

— І яны слухаюць?

— Вельмі ўважна. Наогул работу з імі можна ра-

біць. Адно толькі шкодзіць — няма адпаведнай літаратуры.

Лабановіч расказвае сваю гісторыю с нелегальнаю кніжачкаю.

— Сёе-тое і ў мяне знойдзецца, — кажа настаўніца.

— Калі ласка, ужычце мне, — просіць яе Лабановіч.

Вольга Віктараўна зараз-жа ўстае, капаецца ў сваіх патайных сховах і вымае некалькі тоненькіх брашурак.

— Вазьміце і скарыстайце, ды толькі вярніце мне.

Лабановіч бегла знаёміцца з кніжачкамі і хавае іх.

— Як вы думаеце, Вольга Віктараўна, якім парадкам магла трапіць да мяне на ганак кніжачка Івана Вольнага?

— У Пінску-ж напэўна ёсць рэволюцыйная арганізацыя. І нехта разумны дагадаўся падкінуць вам гэтага Івана Вольнага.

— Напэўна, так яно і ёсць, — згаджаецца Лабановіч.

— Я гэтымі днямі збіраюся ў Пінск. У мяне там ёсць знаёмыя. Праз іх можна звязацца з арганізацыяй. Тады літаратуры будзе даволі... Вот гэту работу я разумею!

Вольга Віктараўна зусім ажыўляецца. Яна толькі шкадуе, што ў яе няма пакуль што такіх людзей, з якімі-б можна было таксама заняцца чытаннем нелегальных кніг, але цешыць сябе тым, што ўвойдзе ў арганізацыю, і арганізацыя ёй дапаможа.

Яны доўга сядзяць і гавораць. Вольга Віктараўна паказала тоўсты рукапісны сшытак, дзе было многа розных рэволюцыйных песень і вершаў.

Калі Лабановіч ішоў дадому, ён думаў аб сваёй нелегальнай рабоце і аб Вользе Віктараўне. У яе асобе ён бачыў першую такую дзяўчыну і прасякся да яе вялікаю павагаю.

XXIII

Сякія-такія змены адбыліся ў Высокім за гэты час. Прыехаў новы пісар Мацей Дулеба, бо чарнявага Раманчыка, ранейшага пісара, забралі ў салдаты.

Калі гэта сталася фактам, старшыня Захар Лемеш упаў у стан жальбы і адчаю. Колькі жалю і спачування было выказана тут Раманчыку!

— Эх, Хведзя, Хведзя, друг ты мой любы! Не думаў я і не гадаў разлучыцца з табою.

Старшыня апускае вочы і журботна звешвае галаву, як тая ўдава, пахаваўшы мужа. І тады ўжо сам пісар выступае ў ролі суцяшальніка.

— Нічога, Захарка! Прыедзе другі пісар, і будзеце жыць і работу рабіць.

Пры гэтым Раманчык стукае старшыню па шырокім плячы. Самому-ж яму здаецца, што другі пісар ніколі не будзе такі дзялок, як ён. Ён хоча пачуць гэта ад старшыні. І старшыня яму кажа:

— Не, брат Раманчык, не, Хведзя, не нажыву я другога такога пісара, як ты.

На некаторы час яны змаўкаюць, апускаюць галовы, супольна аддаюцца журботным пачуццям.

— Э! Ёсць чаго смуткаваць! — адзываецца першы Раманчык і заліхвацка махае рукою: — Знойдуцца людзі, а мой тут і след загіне і памяць пра мяне памрэ.

Каб Раманчык быў паэт, ён цяпер зложыў-бы самую жаласную элегію самому сабе, але ён — толькі проста адукаваны чалавек, здольны глыбока адчуваць. З яго даволі будзе, калі ён трапна прыложыць адпаведныя чужыя словы. І ён прыводзіць іх са свяшчэннага пісання.

— Чалавек — яко трава: дні яго, яко цвет сельны, тако адцвітуць.

Не ведае старшыня, што адказаць на гэта, а адказаць нешта трэба. Ён перш цмакае, а потым гаворыць, і горкае нездаваленне чуваць у голасе яго:

— Адцвітуць, адцвітуць! Рунда, яны адцвітуць!

Гэтае спачуванне канчаеццца тым, што пісар пасылае дзеда Піліпа па тузін піва.

Прытарабаніўшы цэлы кош піва, дзед гаворыць:

— Не нажыць нам такога паныча, няхай дае вам бог здароўе.

І на яго долю перападае не адна шклянка піва.

Тым не меней Раманчык саступае месца другому пісару, яго словы са свяшчэннага пісання спраўдзіліся: памяць аб ім аказваецца не такою трывалаю, як можна было-б думаць, прыняўшы пад увагу смутак старшыні. Захар Лемеш дружна жыве і з новым пісарам, бо і прыказка такая ёсць: «Пісар са старшынёю, як муж з жа-

ною». А памяць аб Раманчыку так і заглухла, і толькі я цяпер успамінаю яго, але за гэты ўспамін ён, можа, і дзякуй не скажа мне. І мала таго, што заглухла: Захар Лемеш выяўляе да некаторай ступені і здрадніцтва ў адносінах да Раманчыка, бо не прайшло і тыдня, як наехаў сюды Мацей Дулеба, а старшыня ўжо гаворыць:

— О, гэты, брат, яшчэ мудрэйшы за таго!

Мацей Дулеба наўперад быў настаўнікам. Але захацелася яму закаштаваць хлеба валаснога пісара, як болей смачнага і прыбытнага. З Лабановічам яго звязвала нядаўняя настаўніцкая прафесія, і ён прызнаўся Андрэю, якім спосабам дабіўся пісарскай пасады:

— «Кацьку», брат, падсунуў графу.

Гэта значыць — даў графу, земскаму начальніку, сто рублёў, бо на царскай сторублёўцы быў партрэт царыцы Кацярыны.

Будучы пісарам, Дулеба не забывае і некаторых былых сваіх настаўніцкіх звычак. Так, з часоў настаўніцтва захоўваецца ў яго ахвота і здольнасць чытаць у царкве «апостала».

— Вось вы паслухаеце, як добрыя людзі чытаюць «апостала», — хваліцца пісар.

Царкоўны стараста Грыгор Крэшчык, пачуўшы такую навіну з вуснаў самога пісара, прасякаецца да яго незвычайнаю пашанаю. Круглы буйны твар старасты свеціцца, як сонца. Угодлівы смех коціцца гарохам. Ён не можа стрымацца, каб не раззваніць аб здольнасцях Дулебы і старанна падрыхтоўвае грунт для славы новага пісара, як незвычайнага мастака чытаць «апостала».

У першы-ж дзень набажэнства прыходзіць пісар у царкву, займае месца на клірасе побач з дзякам Бацяноўскім. Да іх далучаецца Кандрат Крэшчык, сын старасты, і Кандратаў сын Пятрук, якога дзед хоча вывучыць на дзяка. І яшчэ двое сялян праціскаецца на клірас, бо яны таксама спявалі і часамі так гукалі «госпадзі памілуй», што не адна пара вачэй паварочвалася ў іх бок, а некаторыя гаварылі:

— О, здорава, згінь яго маты!

У некаторыя ўрачыстыя дні царкоўнага набажэнства складаецца саматужны хор. Ніхто ім не кіруе, спяваюць самапасам, як хто ўмее. Дзяк у справы кіравання хорам

не ўмешваецца. Ён проста не ўмее, але ў такіх выпадках спасылаецца на словы свяшчэннага пісання: «Хваліце бога на трубах, на арганах, на гуслях, на дудках, на цымбалах»... Ну, словам, як хто хоча, абы толькі хваліў. Такім парадкам у кожнага спевака выпрацоўваецца свая манера спяваць. У звычайныя-ж дні на клірасе стаіць толькі дзяк і спявае адзін. Спявае ён, гледзячы як калі. Пачне як чалавек, а кончыць чорт ведае як — дзікаю піскліваю фістулою. А то проста на сярэдзіне спеваў спыніцца і высмаркае нос, калі гэтая прылада спеваў так ці іначай забастуе, неакуратна праводзіць насавыя ноты.

Не вельмі ўважны да набажэнства і а. Мікалай, асабліва на вячэрнях, калі народу ў царкве мала. Вячэрня прапускаецца борзда. Поп толькі расчыніць губу, каб выгукнуць некалькі святых слоў, а дзяк падхватвае на ляту або перабівае і цягне сваё. А часамі а. Мікалай, адпраўляючы набажэнства, умудраецца перагаварыць з Крэшчыкам аб гаспадарскіх справах. Звычайна рабілася гэта так.

Айцец Мікалай заводзіць:

— «Благословенно царство всегда ныне и присно и во веки веков»...

А дзяк цягне:

— Амінь.

Вось у гэты момант, калі яго змяняе дзяк, а. Мікалай і гаворыць:

— Прадай мне, Грыгор, сваю карову.

Пачуць ад Грыгора адказ зараз-жа не заўсёды ўдаецца, бо дзяк сваё канчае. Тады а. Мікалай заводзіць новы выгалас, каб дзяк не заставаўся беспрацоўным. Дзяк спявае, а Грыгор у гэты час кажа:

— Купляй, бацюшка.

— Колькі-ж ты за яе хочаш?

Ізноў не ўпраўляецца пачуць адказу, бо дзяк чакае.

— «О изобилии плодов земных и временех мирных господу помолимся!»

Дзяк спявае «госпадзі памілуй», а Грыгор назначае цану каровы:

— Сорак пяць рублёў.

— А яна ў цябе не перадойка?..

— «О плавающих, путешествующих, страждущих, недугующих и плененных и о спасении их господу помолимся».

Дзяк зноў спявае, а Грыгор адказвае:

— Не! Пабегала! Каля Міколы ацеліцца.

Такім парадкам правіцца набажэнства і таргуецца карова.

Цяпер-жа, калі на клірасе стаіць пісар Дулеба, адчуваецца некаторая напружанасць. Спевакі баяцца аскандаліцца перад новым чалавекам, ды яшчэ валасным пісарам, і трымаюць галасы ў граніцах пэўнай дысцыпліны. Сам пісар непрыметна пераходзіць на ролю рэгента. Выгляд яго страшны. Хоць ён чалавек і малады, — яму толькі дваццаць восем гадоў, — але барада вырасла, як у добрага старавера. Ён нават і падобен да старавера. З першага погляду яго бараду можна было-б назваць рыжаю, але яна была не рыжая, а так сабе светлаватая. Гледзячы на бараду, растуць і бровы, грозна навісаючы над светласінімі, пранізлівымі, як у дзеда Піліпа, вачамі. Ад стыку брывей пачынаецца яго нос з усімі адзнакамі носа-волата. Каб галаву дзятла павялічыць разоў у дваццаць і адпаведна з гэтым дадаць яму светларусую бараду, то яго галава мела-б вельмі блізкае падабенства да пісаравай.

Стоячы на клірасе, пісар прыпускае часамі баса, але не на ўсю сілу: сіла голасу яго выявіцца ў часе чытання «апостала». Хор прыслухоўваецца і цягне за пісарам. У тых-жа выпадках, калі чуецца выразны фальш або збіванне з тону, пісар трасе галавою, махае рукою, перахватваючы спевы і змушаючы хор падпарадкавацца яму.

Але набліжаецца момант чытання «апостала». Пісар знайшоў ужо і адпаведнае месца ў святой кнізе. Вось ён, спусціўшы вочы, выходзіць на сярэдзіну царквы, займае пазіцыю супраць царскіх дзвярэй. Айцец Мікалай падрыхтоўвае парафіян да слухання слоў святога апостала. Нарэшце паміж папом і пісарам, чытальнікам «апостала», адбываецца невялікая перамова, што патрабуецца рытуалам, пасля чаго ўжо Дулеба прыступае да чытання.

— Браціе! — расцяжна гудзе пісар, пачынаючы з самай нізкай басовай ноты, як шэршань у пустым асінавым дупле.

Пачаўшы так нізка, што ніжэй і пачаць нельга, пісар чым далей, тым болей павышае тоны. Голас яго наўперад глуха шуміць, потым пераходзіць у гром, дрыжыць, звініць, вые, штораз мацнее, змяняецца злосным, адчайным крыкам, але поступ яго ўгору ўсё не спыняецца. Перад самым канцом чытання ён забіраецца ў такую вышыню, што людзям страшна робіцца за пісара: вось-вось, здаецца, не вытрымае, трэсне, рассыплецца, або разарвуцца ўсе яго жылы і пуп, або проста з ім зробіцца нешта такое, чаго ў царкве няможна рабіць.

Народ заціх. Адна маладзіца прыткнула вуха. Грыгор Крэшчык высунуў галаву з бакавых дзвярэй алтара, на твары яго красуецца найшчаслівейшая ўсмешка. А Дулеба робіцца чырвоным, як бурак, нос-волат больш і больш задзіраецца ўгору, і апошняя нота вырываецца жудасным завываннем, не сарваўшыся, аднак, з агульнага тону.

Зачараваны і здзіўлены стараста ў захапленні кажа:

— А-а-а! Во голас!

Пісарскі трыумф поўны, а вянец гэтага трыумфу — просвіра, якую і падносіць яму Крэшчык у канцы абедні на срэбранай талерцы па загаду а. Мікалая.

Такім парадкам, пісар Дулеба адразу здабывае сабе славу і ставіць яе на моцны грунт, бо ён і настаўнік, і пісар, і спявак, і вельмі добры выпівака. І з сялянамі ён умее ладзіць. Калі часамі, праходзячы па вуліцы, пісар пачуе, як хто-небудзь з сялян крычыць на жывёлу і выказвае пажаданне, каб яе з'елі ваўкі, ён заўважыць:

— Нашто яе будуць есці ваўкі? Скажы лепей — няхай цябе пісар з'есць!

Часамі ён і праборку зробіць каму, але зробіць умеючы, і на яго нельга пакрыўдзіцца. З людзьмі сходзіцца борзда і адразу ўваходзіць у ролю панібрата. З Лабановічам сышоўся ён яшчэ барджэй. Заходзіць да яго часамі, каб пагутарыць аб школьных справах, бо яны яму не чужыя, і настаўніцкую ён пасаду любіць, а пісарам зрабіўся пад уплывам жонкі, жанчыны разумнай і практычнай.

— Ну, пасылай, брат, па піва, — кажа ён, бо любіцьтакі выпіць.

На выпіўкі пісар страчвае не адну ноч, асабліва калі

паедзе ў Пінск. Наогул, чалавек ён кампанейскі. Выпіўшы, трохі буяніць, за што пападае часамі ў паліцыю.

Тым часам у школе адбылася яшчэ адна падзея, сведкам якой быў таксама і Дулеба.

Было гэта ў сярэдзіне зімы. Заходзіць пісар у школу.

— Ну, Андрушка, пускай дзяцей ды паедзем у Пінск. Годзе табе ўжо марнавацца тут.

Паездка гэтая была якраз на руку настаўніку.

— Паабедаем і паедзем.

Заходзяць у кватэру.

— Ганна! — кліча Лабановіч старожку.

Ганна не адклікаецца. Настаўнік заходзіць у кухню. Юста ціхенька сядзіць каля печы.

— А дзе маці? — пытае настаўнік.

— У кладоўцы.

Кладоўка тут-жа, поруч з кухняю. Выходзіць Ганна.

— Давай, Ганна, абед!

Ганна дастае з печы гаршчок, ставіць яго на стол, а сама зноў знікае.

Патраўка была нецікавая. Госць і гаспадар пабоўталі трохі лыжкамі і забракавалі яе.

— Кінь! — гаворыць пісар, — заедзем да Карамблюма, рыбкі з'ямо з піўком.

— Не, брат, стой, — можа, другое будзе лепшае, — кажа Лабановіч, бо яму трохі нялоўка перад пісарам за няўдалую патраўку.

— Ганна! — гукае ён.

Ганны не чуваць.

Лабановіч зноў ідзе ў кухню.

— Куды дзелася маці?

— У кладоўцы, — адказвае Юста.

— Што-ж яна робіць там? — злуецца настаўнік.

Юста апускае вочкі. Можа, яна ведае, а можа, нічога не цяміць.

— Не ведаю, — чуецца адказ.

Толькі што нарыхтаваўся Лабановіч гукнуць Ганну і раптам спыніўся: з кладоўкі даносіцца: «Куга! куга!»

Усё гэта зрабілася нейк вельмі борзда і зусім неспадзявана для настаўніка, бо ён быў упэўнены, што Ганна сыйдзе на гэты час да каго-небудзь з сялян. На першых

часах ён прыходзіць у замяшанне. На дварэ — зіма, у кладоўцы мала чым цяплей, як на дварэ.

Лабановіч бяжыць у свой пакойчык, дзе яго чакае пісар.

— Ведаеш, брат Мацей, што?

— Ну?

— Ганна ў кладоўцы абрадзінілася!

— Што ты кажаш? — і пісар пасміхаецца ў бараду.

— Трэба-ж нейкую раду даваць!

— Бадай яна спрахла, — гаворыць пісар, — колькі клопату нарабіла! Акалее, падла, там!

Удвух бягуць яны да фурмана Аўменя і клічуць яго на падмогу. Аўмень ідзе ў кладоўку, і праз хвіліну на парозе паказваецца бязносая Ганна. Яна трымае на руках дзіця, а Аўмень вядзе яе падпаху. Юста рассцілае нейкія бэбахі на тапчане, куды і пераходзіць Ганна разам з народжаным сынам. Той-жа Аўмень бяжыць па бабку. Сяк-так справу ўладзілі.

Пісар і настаўнік едуць у Пінск.

XXIV

— Давай, Андрушка, наладзім хор! — казаў раз пісар Лабановічу. — Я табе памагу. Разумееш ты, зусім іншы калянкор, калі ў царкве спявае добры хор.

— І калі «апостала» чытае Мацей Дулеба, — у тон пісару дадае Лабановіч.

— А што-ж, па-твойму, я кепска прачытаў «апостала»? Вось ты не прачытаеш так, — крыўдзіцца трохі пісар: — І «апостала» прачытаць трэба ўмець.

— Ды я і не бяруся чытаць. І наогул не разумею, нашто гэта бушаванне ў царкве? Хіба нельга прачытаць проста і натуральна? А то раве чалавек, як бугай на прадвесні, аж вочы на лоб лезуць. Хіба гэта ўжо так прыемна богу? Ці ён глухі?

Пісар яшчэ больш крыўдзіцца.

— Можна было-б сказаць гэта і больш далікатна, — заўважае ён. — Ты-ж думаеш, што ты толькі адзін такі вольнадумец? І я, брат, быў вольнадумец, але глупства гэтае з часам прайшло, пройдзе яно і ў цябе.

Лабановіч хацеў адказаць, што калі чалавек з настаўніцтва пераходзіць на пісарства, дык аб вольнадум-

стве гаварыць не прыходзіцца. Але сказаць так, значыць пасварыцца з чалавекам, і ён толькі пытае:

— А ў чым выявілася тваё вольнадумства?

— Было, брат! — адказвае пісар, — а я мушу сказаць табе, як старэйшы, і ты мяне павінен паслухаць: хор наладзіць табе трэба!

— А ну яго к чорту! — злуецца Лабановіч, бо ўпамінанне аб хоры яму нейк балюча абходзіць.

— Дык ты не прызнаеш значэння хору? — У пісаравым тоне чутна строгасць. — Які-ж ты пасля гэтага настаўнік?

Пісаравы бровы навісаюць грозна, а вочы ўпіваюцца ў твар Лабановіча.

— А калі я не хачу гэтага твайго хору? — яшчэ з большаю злосцю пытае Лабановіч. — І нашто табе здаўся гэты хор? Поп маўчыць, не лезе з хорам, дык табе трэба свае тры грошы ўткнуць.

Пісарава строгасць раптам сходзіць, і выраз яго твару адразу нейк дабрэе.

— Чаго-ж ты злуешся, дзівак ты? Я-ж хачу пагаварыць з табою, як з чалавекам, якога я люблю і паважаю. Ты-ж думаеш, калі а. Мікалай нічога не кажа табе, дык яму і ўсё роўна, ёсць хор ці не? Ён да цябе, брат, вельмі добра адносіцца і паважае, але яго трохі не задавольвае, што ты вечарамі нейкія гутаркі вядзеш з людзьмі, да царквы непрыхільнымі, а праз гэта і цябе самога можна залічыць у раскольнікі, разумееш ты?

Лабановіч зразу адчувае, што аб яго патайной рабоце ходзяць ужо чуткі. Ён трохі непакоіцца і чуе нават нейкі страх, але стараецца не паказаць гэтага, хоць ад зоркага пісаравага вока не ўкрываецца ніводзін рух яго твару.

— Тфу, праклятае дзякоўска-папоўскае балота! — абурліва гаворыць Лабановіч, каб адвесці ўсякія сляды. — Калі да цябе зойдзе ў вольную часіну чалавек, звычайны мужык, і калі ты ад яго не бяжыш, як ад зачумленага, не сядзеш за бутэльку, а пагутарыш з ім проста, як з чалавекам, дык зараз-жа нейкаму чорту гэта пачынае ўжо карцець і наводзіць на ўсякае падазрэнне!

Праз пісараў нос-волат прабіваецца кароткі гук «хм», галава яго зрушваецца, і смех, хітры, многазначны смех, рассоўвае валасатыя губы. І смех гэты як-бы кажа: «Ага!

Унь ты як загаварыў! Але ведаю, брат, куды ты гнеш!»

Лабановіч заўважае, што яго абурлівая рэпліка ніколечкі не пераконвае пісара. Прыступ нейкай вар'яцкай злосці захоплівае яго ўсяго. У настаўніка цяпер з'яўляецца моцнае жаданне сказаць нешта рэзкае, абразлівае, хочацца плюнуць на ўсё тое, што становіць гэтую казённа-мяшчанскую святасць. І ён ледзь-ледзь стрымліваецца, чакае, што скажа пісар.

А пісар гладзіць бараду, зноў абразліва смяецца, як чалавек, што стаіць нязмерна вышэй за таго, з кім ён гаворыць, і ведае шмат больш, як гэта можна думаць.

— Так... Чалавек... Звычайны мужык, — гаворыць пісар, націскаючы амаль не на кожнае слова, і раптам змяняе тон: — Але-ж ён і не такі звычайны, як ты гэта хочаш паказаць! І гэтых вольных часін у яго нешта занадта многа. Пра гэтага «звычайнага» мужыка ходзіць не зусім звычайная слава. Аб ім нават і сякія-такія матэрыялы маюцца ў воласці...

— Ну, як не быць такім матэрыялам! — перапыняе пісара Лабановіч. — Ён-жа судзіўся з панам Скірмунтам, бухторыў сялян, падымаў іх на «яўнае» беззаконне. Як ён, мужыцкае рыла, асмеліўся выступіць супроць пана? Якое права мае мужык дапусціць мысль, што з ім паступаюць несправядліва, калі над ім з такім замілаваннем апякуюцца ўсе, пачынаючы з гарадавога?

Пісар слухае, спусціўшы вочы, і ў сваю чаргу перапыняе Лабановіча нечаканым зваротам:

— Андрушка! Па дружбе кажу табе — кінь! Кінь ты гэтую цёмную работу! Любячы цябе, кажу — кінь!

— Якую цёмную работу? — нападае Лабановіч на Дулебу.

Ён ведае, на што ківае пісар, але хоча парушыць упэўненасць, з якой гаворыць той аб «цёмнай» рабоце, або пераканацца, на чым і ў якой меры грунтуецца гэтая ўпэўненасць.

— Каго ты хочаш у дурнях пакінуць? — зняважліва пытае пісар: — Скажы мне, з кім ты знаёмы, і я табе скажу, хто ты, — прыводзіць ён вядомы афарызм.

— Я знаёмы з дзяком Бацяноўскім, з папом і не з адным, а многа іх ведаю, знаёмы з земскім начальнікам, з пісарам Дулебаю, — дык хто я такі?

— Гэта — не факт, — адказвае пісар, збіты з нагі такім запытаннем.

— А вось мая «цёмная» работа для цябе — факт, можа, таму толькі, што навучыць грамаце цёмнага чалавека ёсць цёмная работа?

— А ты яго вучыш грамаце?

— Так, раблю гэтую «цёмную» работу... І скажы мне, Мацей, якая табе справа да ўсяго гэтага?

Мацей як-бы не чуе запытання і кажа:

— І ты гэтага сукінага сына вучыш грамаце?! Для чаго-ж гэта робіцца такая ласка?

— Для таго, каб «гэтага сукінага сына» не крыўдзілі сотні сукіных сыноў.

— Ах, вось як! Хто-ж гэтыя «сотні сукіных сыноў»? Мусіць-жа і я ўваходжу туды?

— Не, ты — выключэнне.

— Ну што-ж? І за гэта дзякую!

Пісар адвешвае Лабановічу паклон, ледзь не ўпіраючыся носам у стол, а настаўнік, злосны, ходзіць па пакойчыку.

Некаторы час яны маўчаць.

— Паслухай ты мяне, Андрэй, — тонам згоды гаворыць нарэшце Дулеба, — злавацца тут няма чаго. Я, можа, чым і пакрыўдзіў цябе. Тады выбачай мне. Выбачай, браток! Але я табе кажу, як чалавеку, як свайму брату, бо я ўсё-ж-такі больш настаўнік, чым пісар, — пляваць я хачу на пісарства і плюну, — не мяшайся ты ў гэтую брудную справу!.. Стой, стой, стой! Дай мне сказаць. Няўжо-ж ты думаеш, што ты адзін угледзеў праўду, а ўсе іншыя — сляпыя, нічога не ведаюць, не знаюць і ў галаве іх салома? Няўжо-ж ты думаеш, што гэта праўда ў тых паскудных лістках, што пачалі пладзіцца і пападаць і ў сялянскія рукі? Хто-ж ім паверыць? Хто за імі пойдзе? Злодзей, гультай, лодыр і наогул усякі аматар да лёгкага хлеба. А сталы чалавек за імі не пойдзе, не паверыць, толькі плюне на іх з агідаю. Чаму? А таму, што сталы чалавек, не гультай, знойдзе сабе спосаб, як жыць на свеце, і калі будзе дабівацца чаго, то свайго даб'ецца. І няўжо начальства не думае, не дбае аб народзе? Яно-ж само звязана з ім, залежыць ад яго. У інта-

рэсах самога начальства клапаціцца аб народзе, каб яму жылося добра.

— Каму каб жылося добра? — смяецца Лабановіч. — Народу ці начальству?

— Народу!

— А я думаў, каб начальству добра жылося, бо ты трохі няясна выказаў сваю думку. Ну, але ва ўсякім разе вельмі дзякую табе, што ты аднавіў у маёй памяці гэтую мудрасць, якою кармілі нас ў семінарыі на працягу чатырох гадоў.

— А ты-ж думаеш, семінарыя благому вучыла?

— З чаго ты ўзяў, што я так думаю? Мяне толькі дзівіць, да чаго ты гэта ўсё гаворыш?

— Слухай, Андрэй! Што ты крывіш нейкую нявіннасць?

На пісаравым твары адбіваецца пакута, і нос яго моршчыцца ад нездаволення.

— Дык чаго ты ад мяне хочаш?

— Ну, годзе, не будзем аб гэтым гаварыць, — і пісар махае рукою.

— Не, брат: аб гэтым гаварыць ты будзеш. Як будзеш гаварыць, гэта іншая справа. Можа, так, а можа, і не так, але гаварыць будзеш. Не сёння, дык заўтра, не заўтра, дык налета.

— Кінь казаць глупства! І слухаць гэтага не хачу.

— А нашто-ж ты пачынаў?

— Я-ж пачаў не з гэтага.

— У тым-та, брат, і штука, што пачнеш з неба, а пяройдзеш на зямлю, бо зямля да нас бліжэй, чым неба.

— Ну, гэта як для каго.

— Ну, а для цябе, напрыклад? Думаю, што зямля больш мілая, чым неба, бо каб было наадварот, ты пайшоў-бы не ў валасныя пісары, а ў манахі. Неба, брат Мацей, для дурняў адводзяць разумныя людзі, каб самім было вальней жыць на зямлі. Але справа ў тым, што і дурні пачалі шукаць шчасця на зямлі. А раз гэта так, то яны непрыменна зробяць на зямлі рэвізію.

— Гэта так у лістках напісана? — пытае пісар.

— Гэта так напісана ў ходзе людскога жыцця. І гора таму, хто гэтага ходу не разумее або не хоча зразумець

— Не, брат Андрэй, гора таму, хто разумее жыццё навыварат і паддаецца на вудачку розных палітычных машэннікаў.

Вынікам гэтае спрэчкі было ўзаемнае нездаваленне. Пісар Дулеба лічыў, што настаўнік стаўся ахвяраю «розных палітычных машэннікаў», а настаўнік думаў аб пісару, як аб чалавеку, які ўжо застыў у сваіх поглядах на рэчы і якога трэба асцерагацца. Кожны з іх пашкадаваў другога, выходзячы са сваіх меркаванняў.

На развітанне пісар сказаў:

— Дык заходзь вольнаю часінаю. А што мы троху паспрачаліся, дык гэта, можа, і добра. Ва ўсякім разе я буду цешыць сябе думкаю, што мае словы пойдуць табе на карысць.

— А я буду спадзявацца, што і мае словы знойдуць прытулак у тваёй галаве.

— Не, брат, — круціць галавою пісар, — яйцо курыцы не вучыць.

— Але ўсё-ж-такі курыца з яйца вышла.

— Але яйцо курыца знесла!.. Не, Андрэй, жарты на бок. Памятай, што я табе казаў. Са мною ты можаш гаварыць усё, што хочаш: гэта ўсё будзе паміж намі. А ліха можа прыйсці з другога боку. Ты яшчэ не ведаеш людзей: той, за каго ты распінаешся сёння, прадасць цябе заўтра. І грошы возьме і барыш вып'е. Вось тады і зразумееш ты ход жыцця. Але гэтага няхай не здарыцца.

Пасля жывой і троху ўзнятай спрэчкі ў пакойчыку Лабановіча стала нейк незвычайна ціха, і ў гэтай цішыні зусім іначай пачаў выяўляцца сэнс рэчаў, і нават сцены, печ і дзверы, нямыя сведкі гарачай размовы, здавалася, выглядалі трохі па-іншаму.

Некаторы час Лабановіч прыслухоўваецца да гэтай цішыні, як-бы хоча зразумець затоены сэнс яе. Але ён чуе толькі шум і звон у сваіх уласных вушах. Пачынае прыслухоўвацца да самога сябе, як-бы першы раз сустрэўся з самім сабою, і глядзіць на сябе, як на нейкага староннята чалавека. Ён заўважае, што ў яго ёсць сэрца, і чуе пульс яго. А будзе-ж час, калі гэты пульс замрэ. Нейк халадна і непрыемна робіцца ад гэтае думкі. І думаць аб гэтым прыкра.

Настаўнік падыходзіць да акна. За акном, каля саменькае сцяны, дзе стаіць круглаверхі клён, цяпер халодны і аголены, густа-густа збіраецца мрок, нібы гэтая цёмная ноч паставіла тут свайго вартаўніка. Скрозь парадзелыя дрэвы папоўскага саду свеціцца акно ў кватэры пападзянак, свеціцца бледназеленаватаю плямкаю. Яшчэ глыбей у двары відаць і дзякоўскае акенечка, як воўчае вока. І здаецца, далёка ад жыцця, у заняпалым кутку яго, мігцяць гэтыя вокны. Няветла там і журботна.

Ён адыходзіць ад акна і паволі шнуруе ад сцяны да сцяны па пакойчыку. Кухня даўно супакоілася, і толькі цяпер кугакае дзіця. Гэта Ганнін сын Кірыла, што нарадзіўся ў кладоўцы, заяўляе там аб нейкіх сваіх правах. Варушыцца Ганна, ціхенька супакойвае дзіцянё і штось ласкава-ласкава гугніць свайму маленькаму сыну. Нездаволеная паводзінамі брата, абуджаецца і Юста. Яна сярдзіта нешта гаворыць, відаць, злуецца на Кірылу, што перашкаджае ёй спаць.

— Спі ты, згінь твая маты! — прыдушаным голасам, каб не трывожыць настаўніка, напускаецца яна на Юсту. І ў кухні зноў усё заспакойваецца.

Лабановіч успамінае, калі нарадзіўся ў Ганны сын, і дзівіцца, як яна засталася жывою. Тады ён прывёз ёй з Пінска поўпляшкі гарэлкі, каб было чым пачаставаць бабку. Айцец Мікалай, дачуўшыся аб гэтым, быў надзвычай задаволены паводзінамі настаўніка, і ў сваю чаргу, каб не адстаць ад яго ў дабраце, прыслаў Ганне вялізны каравай на радзіны.

Адзін толькі дзяк Бацяноўскі трохі іначай тлумачыў сабе ўчынкі свайго суседа.

Было ўжо досыць позна. Лабановіч успамінае спрэчку з Мацеем Дулебаю. Настаўнік верыць, што пісар і сапраўды ліха яму не зробіць, бо ён, хоць і думае іначай, чалавек добры і без хітрыкаў. Яго толькі дзівіць, што патайная работа выходзіць наверх, аб ёй ужо ходзяць чуткі. Ну, што-ж? Трэба гэта прыняць пад увагу і трымацца больш асцярожна.

І, ужо лежачы ў пасцелі, ён абмяркоўвае спосабы, як праводзіць далей работу, а для таго, каб адвесці сляды, можа-б, не пашкодзіла і сапраўды, як кажа пісар, наладзіць з яго дапамогаю невялічкі хорык?

XXV

У студзені 1904 года пачалася вайна з Японіяй.

І сама гэтая Японія і тыя прычыны, што спарадзілі вайну, былі не вельмі вядомы шырокім колам насельніцтва, асабліва вясковага. А толькі цяпер сялянская мова пабагацела на два словы: «Апонія і апонцы», але за гэтымі словамі хаваўся вельмі цьмяны змест, як быў цьмяным і самы сэнс вайны.

Праўда, і па цёмных закутках неасяжнай Расіі знаходзіліся храбрыя і надта ўспанялыя палітыкі-ваякі, для якіх усё тут было проста і ясна. Усю сваю мудрасць і празорлівасць яны выказвалі ў двух кароткіх пунктах: 1. Японцы — гэта макакі, або жоўтамордыя малпы. 2. Белы цар, цар-бацюшка, намне ім шыі так, як яны таго і не снілі, бо хто не адчуваў на сабе сілы царскага кулака? І пры гэтым адважны палітык-ваяка, седзячы ў цёплым пакоі і папіваючы гарбатку з кан'ячком, згортваў кулак і трос «япошкам».

Цар Мікалай зараз-жа падпісаў маніфест, паведамляючы, што дзёрзкі вораг напаў ні з таго, ні з сяго на нашу эскадру ў Порт-Артуры, напаў спотайку, як злодзей, не паведаміўшы, не абвясціўшы вайны, за што і трэба пакараць яго, заступіцца за гонар Андрэеўскага сцяга, а таму і абвяшчаецца японцам вайна. Цар не забыўся прыхапіць на свой бок і госпада бога, выказваючы надзею на сілу рускай зброі. Ён звярачаўся да вернага прастолу дваранства і вернападданых сялян, заклікаючы іх выканаць свае абавязкі і спадзеючыся ад іх усялякага геройства, якога ў нас ніколі не бракавала.

Следам за маніфестам пачаліся выбухі казённага патрыятызму, але ўражанне ад іх было вельмі нязначнае. Газеткі казённага кірунку, знаходзячыся на ўтрыманні казны, стараліся раздзьмуць патрыятызм і пасеяць нянавісць да японцаў, не шкадуючы фарбаў, каб паказаць усю іх азіяцкую некультурнасць і нікчэмства.

Герояў і геройства, якога чакаў цар, было не так многа. Сапраўдным героем аказаўся адзін толькі крэйсер «Вараг». Дзесь на моры каля Чэмульпо ён сутыкнуўся з японскімі караблямі праз некалькі гадзін пасля таго,

як японцы напалі на нашу эскадру ў Порт-Артуры і моцна пакалечылі броненосцы «Цэсарэвіч», «Рэтвізан» і крэйсер «Палада». Біўся «Вараг» з пераважнымі сіламі японскай эскадры. Каб не здавацца ў рукі ворагу, «Вараг» падарвалі і падтрымалі славу рускага флоту. Геройства «Варага» скаланула Расію. Замільгацелі імёны генералаў і адміралаў. Хоць яны геройства яшчэ і не зрабілі, але маглі зрабіць, таму іх і разглядалі, як герояў. Іх было многа: Алексееў, намеснік цара на Далёкім Усходзе, Безабразаў (ён якраз і адпавядаў свайму прозвішчу), Старк, Вірэн, Стэсель, Фок, Засуліч, Зарубаеў, Самсонаў, Рэненкампф, Грыпенберг, Каульбарс, Бірдэрлінг (ён нават і героем аказаўся: скінуўся з каня і выбіў сабе плячо), Мішчанка (ён быў моцны кандыдат у героі, але з гэтага нічога не выйшла). А замыкалі гэты доўгі ланцуг герояў такія сланы, як Курапаткін і Ліневіч.

Тэлеграмы з вайны на царскае імя нязменна пісалі, як нашы пасеклі то роту, то эскадрон японцаў і што дух нашага войска «превосходный», а калі часамі дзе войскі трохі і адступалі, то адступалі не іначай, як на парадзе.

З гэтых тэлеграм выходзіла, што «япошкі» нідзе не прасунуцца, куды-б яны ні паткнуліся, так іх там клалі і крышылі. У той час, калі ў японцаў былі цэлыя горы трупаў, нашы страты былі зусім нязначныя — адзін, другі афіцэр ды некалькі «ніжніх чыноў». Тым-жа часам арэна вайны ўвесь час змянялася, пасоўвалася з Карэі і Ляадунскай поўвыспы ў Манчжурыю, праходзячы такія этапы, як Ялу, дзе генерала Засуліча пабілі на горкае яблыка, Цюрынчэн, Порт-Артур, Ляаян і сотні другіх месцаў у палях Манчжурыі, дзе капаліся магілы для пахавання царскага самаўладства.

Горача стала ў Пецербурзе.

Замахалі папы кадзіламі, вымольваючы ў бога перамогі над «макакамі». Пасыпаліся, як лісце ўвосень, абразы на тэатр вайны — відаць, на сілу зброі і на здольнасць стратэгаў надзея была малая. У справу прыйшлося прыплесці Серафіма Сараўскага, якога незадоўга да гэтага высунулі кандыдатам у святыя. Хоць душа Серафіма Сараўскага была цяпер на небе, але гэта не шкодзіла яму прысніцца каму трэба, каб пацешыць цара, даклераваўшы яму перамогу над японскім мікадо. Але, як

вядома, святыя каля гармат не хадзілі, салдацкай лямкі не цягнулі, пораху не нюхалі, ваеннай тэхнікі не вывучалі, дык і карысці з іх было гэтулькі-ж, як і з дзірак у мосце. І горш усяго — Серафім Сараўскі прысніўся зусім недарэчы: якраз за некалькі тыдняў перад Мукдэнскім боем, дзе руская армія была разбіта, а месяцы праз тры прад Цусімаю была пахавана і Балтыйская эскадра пад камандаю адмірала Раждзественскага.

Прайшло некалькі месяцаў. Наўперад глуха, потым галасней пайшлі хадзіць чуткі аб злачынствах, якія тварыліся рознымі сатрапамі на вайне, аб крадзежствах і на тэатры вайны і ў тылу, аб цяжкім матэрыяльным стане салдат, аб поўнай непадрыхтаванасці да вайны і аб усякіх іншых махінацыях. Пайшлі гуляць анекдоты і карыкатуры, якія больш трымаліся ў галаве, чым траплялі на старонкі друку. Была карыкатура і на цара Мікалая. Стаіць цар без нагавіц, у адной кашулі. Японцы розгамі сякуць Мікалая, а ён сам трымае кашулю. Збоку стаіць нямецкі кайзер Вільгельм.

— Міколка! — гаворыць ён Мікалаю. — Ды даў-бы ты патрымаць сваю кашулю каму-небудзь з прыдворных. Нашто табе турбавацца самому?

— Ах, Віля! Ну, што ты гаворыш? Як магу даць дзяржаць кашулю другому? Я-ж — самадзержац!

Надвячорак. Пачынае цямнець.

Лабановіч праводзіць апошнюю гадзіну ў школе. За работаю час праходзіць борзда. Не згледзіш, як прабяжыць тыдзень. Настаўніку нейк весела і радасна, нягледзячы на цэлы дзень, праведзены ў душным класе. Як-ніяк час хіліцца да вясны. Большая палавіна школьнага года засталася ззаду. І дзень пабольшаў значна. Можна скончыць заняткі ў школе, не запальваючы лямпы.

Каля акна, што выходзіць у бок чыгункі, настаўнік запыняецца: па дарозе імчыцца параконны вазок. У вазку сядзіць пісар Дулеба. Гэта ён з Пінска едзе, вязе пошту.

Настаўнік думае, што яму трэба схадзіць у воласць — павінны быць сякія-такія пісьмы і карэспандэнцыя, свая і школьная.

Вазок зварочвае з дарогі ў бок школы. Каля ганка

Аўмень запыняе коні. Настаўнік пускае вучняў дадому, а сам выходзіць на ганак.

— Ну, я да цябе на адну хвіліну, — гаворыць пісар, — ведаеш, брат, што?

— Ну? — чакае настаўнік нейкай важнай навіны.

— Адзявайся лепей ды паедзем да мяне.

Ад пісара трохі папахвае выпіўкаю.

— А што ты меўся сказаць мне?

— Важная, брат, навіна. Ведаеш? Вайна пачалася!

— Вайна? З Японіяй? Не можа быць!

— Не «не можа быць», а ўжо ідзе вайна... Ну, паедзем.

Лабановіч апранае паліто, і яны едуць у валасць.

— Вось прахвосты, сукіны сыны, — гаворыць абурліва Дулеба, — не спадзяюцца на сваю сілу, дык пусціліся на чыста азіяцкую подласць: не абвясціўшы вайны, напалі на нашы броненосцы. Ну, але-ж ім далі чосу! І яшчэ дадуць. Так дадуць, што толькі мокранькае астанецца ад іх. Каго яны чапаюць? На каго падымаюць руку? На Расію, якая адна супроць усяго свету можа выступіць!

— Але-ж, пане пісару, і яны ведаюць пра Расію і на нешта спадзяюцца, калі не пабаяліся першымі зачапіць нас, — заўважае фурман Аўмень.

— Калі бог захоча пакараць каго, то першым чынам адбярэ ад яго розум, — строга кажа пісар.

Аўмень змаўкае і хавае нейкі, як-бы вінаваты, смех пад вусамі. Ні то ад таго, што пісар сказаў так трапна, ці так з якой прычыны.

Вестка аб вайне борзда абходзіць сялянскія хаты, а каля фурмана Аўменя і дзеда Піліпа на зборні збіраецца кучка палешукоў. Аўмень — асяродак увагі. Вочы ўсіх падняты на яго. Такая ўвага надае Аўменю важнасці і гонару. Ды калі сказаць праўду, ён вышэй тут стаіць за ўсіх, у яго ёсць знаёмыя чыноўнікі ў Пінску — на пошце і ў казначэйстве. Ад іх можна шмат чаго даведацца.

— Напалі на нашы караблі! — дзівіцца дзед Піліп, і вочы яго выкочваюцца, як у рака, наверх.

— І здорава пабілі! — важна сцвярджае Аўмень.

— Пабілі? — падхопліваюць слухачы. — Вось, згінь іх маты.

— І самыя лепшыя караблі. Там былі такія гарматы,

што стралялі на дваццаць вёрст. Такія гарматы мае толькі адна Ангелька.

— І як яны пабілі, каб іх гром пабіў? — пытае дзед Піліп і стукае рукамі па сцёгнах.

Усе пазіраюць на Аўменя.

— Міны пусцілі, — кажа Аўмень.

— Го, каб яны кроўю пусцілі! — злуецца дзед Піліп. — Гэта-ж каб такія гарматы паставіць у Гарадышчы, дык яны-б і да Лунінца данеслі!

Дзядзьку Есыпу хочацца дазнацца прычын вайны. Аўмень ведае і гэтыя прычыны. Але ён пакуль што маўчыць, бо ўсё роўна апошняе і самае важнае слова будзе яго, а цяпер няхай сабе пагавораць яны.

— І вось, скажы-ж ты, не паладзілі за невашта!

— Ды ўжо калі хто захоча пабіцца, то прычыну знойдзе.

Дзеда Піліпа прычыны вайны мала цікавяць. Яму вельмі абходзяць гарматы, што страляюць на дваццаць вёрст.

Сярод палешукоў падымаецца шум. Кожнаму хочацца як-небудзь адгукнуцца, выказаць сваё меркаванне аб прычынах вайны, але нікому не ўдаецца сказаць трапна, каб усіх задаволіць.

Аўмень слухае і хавае смех пад вусамі.

— Японцы вось чаго хочуць, — кажа ён, — яны запатрабавалі ад нашага цара не мяшацца ў справы Кітая. Мы і кітайцы, — кажуць яны, — свае людзі. А ў цябе і так зямлі свае многа. Рабі, кажуць, парадкі ў сваёй Расіі, а нашай Азіі не чапай.

— А гэта што-ж, палюбоўніца іх ці што? — пытае дзед Піліп.

— Якая табе палюбоўніца? Краіна іх так называецца, — тлумачыць Аўмень, і дзеда Піліпа падымаюць насмех.

— А чорт-жа іх бацьку там ведае, — апраўдваецца дзед Піліп, — і за бабу часамі б'юцца людзі.

— А наш цар, значыцца, не схацеў і дулю ім паказаў, — чуецца голас.

Міхалка, якога дзядзька Есып прасіў, каб яго ўдарыў, увесь час маўчаў, потым пачухаў патыліцу і заўважыў:

— А ўсё-ж нашаму брату прыдзецца аддувацца сваімі бакамі.

І некалькі рук чухаюць патыліцу.

У кватэры пісара таксама ідзе гутарка аб вайне.

— От, згінь твая доля! — гаворыць старшыня, гаворыць так, як-бы ўсе згрызоты і цяжар вайны леглі на яго плечы. — Вось не было яшчэ клопату!.. Гэта рунда, што там папсавалі трохі караблі. Але няхай ён вылезе на бераг!..

— Яму і дадуць вылезці на бераг, сумысля дадуць, каб потым патапіць усіх к чортавай матары!.. Гэта, брат, ім не хаханькі!

Пісар сказаў гэта так энергічна і так грозна ссунуў бровы, што старшыня зусім заспакойваецца за лёс вайны і за нашу перамогу.

— І далёка-ж, мусібыць, падла Апонія гэтая? — пытае старшыня.

— Далёка, брат, адгэтуль і не згледзіш, — жартуе пісар.

— Вось і нашага Раманчыка, каб не пагналі на вайну, — успамінае Захар Лемеш аб нядаўнім сваім прыяцелю.

— Куды яго пагоняць! — адказвае зняважліва Дулеба: — Там сваіх войскаў хопіць, сібіракоў.

— Так, — адзываецца Лабановіч як-бы на свае думкі, — даўно Расія не ваявала.

Гэтая вайна робіць на яго моцнае ўражанне і захапляе неспадзяванасцю падзей. Яму даводзілася многа чытаць ваеннай літаратуры, запісак, раманаў, пераважна з гісторыі рускіх войнаў. Захапляла апісанне баёў, як апісанне Барадзінскага бою ў рамане «Вайна і мір». З асаблівай цікавасцю накідаўся ён на тыя творы, што былі спецыяльна прысвечаны войнам. Пад уплывам тэндэнцыйнага і аднабаковага асвятлення іх, выпуклення гераічнага боку і наўмыснага закрывання вачэй на цёмныя бакі, у Лабановіча зладжылася ўяўленне, у корані фальшывае, аб ваяцкіх здольнасцях царскай Расіі і аб яе неперамажнасці ў вайне. Вось чаму і цяпер ён падзяляў моцную ўпэўненасць у тым, што Японія ў гэтай вайне будзе пабіта, як падзялялі гэтую ўпэўненасць і

дзесяткі тысяч адураных фальшывым аднабокім выхаваннем людзей.

Лабановіч пільна сочыць за разгортваннем ваенных падзей на Далёкім Усходзе, знаёміцца больш падрабязна з Японіяй, з яе бытам і тэхнікаю, чытае газеты, не прапускае ні аднае заметкі аб вайне самага нікчэмнага ваеннага карэспандэнта.

Неўзабаве ў школу прыязджае інспектар народных школ для рэвізіі. Інспектарская рэвізія — гэта свайго роду страшны суд для вясковага настаўніка. Інспектар можа зрабіць з настаўнікам усё, што захоча: пазбавіць пасады і наогул нарабіць усялякіх згрызот і непрыемнасцей. Адносіны да настаўніка ў яго афіцыйныя, строга начальніцкія. Інспектар адчувае сваю сілу над настаўнікам, глядзіць на яго звысоку, рэдка дарыць усмешкай. Ні на адну хвіліну не дае забыць аб розніцы паміж ім і настаўнікам: ты — нішто, я — усё. Голасна гаварыць, ступаць на ўсю ступу пры інспектару не палагаецца: кожны рух, кожнае слова павінны выказваць павагу і трэпет перад інспектарам. Калі ён уваходзіць у школу, настаўнік павінен ісці на два крокі ззаду, а ў школе зусім касавацца. Калі вучань кепска адказвае на пытанне інспектара, ён кідае на настаўніка погляд, поўны грознага нездаволення.

Сяргей Пятровіч Булавін — новы інспектар, пануры, скупы на словы, асабліва з настаўнікамі. Лабановічавы вучні падрыхтаваны добра. Прычын для нездаволення няма. Экзаменуецца вучань трэцяе групы Іван Занька. Ён з указкаю стаіць каля карты.

— Пакажы мне Азію.

Занька абводзіць указкаю карту. Кавалачак Азіі на карце заходзіць у Амерыку. Занька не забывае і пра гэты кавалачак.

— Добра, — хваліць яго інспектар.

— Пакажы мне Японію.

Занька паказвае.

— А што ты ведаеш пра Японію? У якіх адносінах знаходзіцца яна да нас?

— Ваюем з ёю.

— Ну, а скажы, хто каго зваюе?

— Наш цар паб'е, — адказвае ўпэўнена Занька.

— А чаму ты думаеш, што мы яе паб'ем?
— У нашага цара войска болей.
— Так, мой мілы. Расія паб'е Японію. Па-першае, і войска ў нас болей, і войска наша лепшае, і справа наша справядлівая, і, па-другое, — мы павінны яе пабіць і паб'ем.
Іван Занька рэпутацыю школы падтрымаў, затое Алесік Грылюк псуе ўсю справу. Ён увесь час не зводзіць з інспектара вачэй. Увага яго запыняецца на носе інспектара. А нос у інспектара быў здаравенны. Нарэшце Алесік не можа стрымацца:
— А чаму ў цябе такі вялікі нос? — сярод магільнай цішыні чуецца яго наіўнае дзіцячае запытанне.
— Табе няма справы да майго носа.
Ну, што-ж было ўзяць з малога Алесіка?
Наогул-жа рэвізія сышла досыць добра.

XXVI

Аблажыўшыся газетамі, сядзіць Лабановіч у сваім пакойчыку, чытае апошнія навіны з вайны. Навіны, відаць, яго не здавальняюць. Ён так паглыбляецца ў чытанне, што не чуе, як нехта стукае ў дзверы, і толькі тады адрывае вочы ад газеты, калі стук пачуўся ў акно насупраць.
«Каго там чэрці нясуць?» — думае ён.
Ніхто ў гэта акно яму ніколі не стукаў, і ён ад нечаканасці аж здрыгануўся. Выходзіць, адчыняе дзверы.
— Ну, і Андрэй Пятровіч! — чуе знаёмы пакрыўджаны голас. — Не хоча ўжо і пускаць у кватэру.
— Як не хачу? — радасна гаворыць ён. — З мілаю душою!
— Сур'ёзна?
— Больш чым сур'ёзна, Вольга Віктараўна, каб мне з гэтага месца не сыйсці!
— Ну, то добры вечар, калі так.
— Добры вечар! Ну, і малайчынка-ж вы! Вось як слаўна зрабілі, што даведаліся да мяне! Прышлі ці прыехалі?
— Дзе там у чорта прыехала! Пехадралам пру.

— Ну, гэта ўсё роўна, ці ішлі ці ехалі, абы сюды папалі.

Заходзяць у пакойчык.

— Газеты ўсё чытаеце?

— Чытаю, няхай яны спрахнуць.

— А што так? — пытае Вольга Віктараўна, і вочы яе вясёлаю насмешкаю іскрацца.

— Не ладзіцца ў нас.

— І гэта вас засмучае?

— Не толькі засмучае, а пачынае разбіраць злосць.

— На каго?

— А чорт яго ведае, на каго.

— Вам, як бачу я, хацелася-б заспяваць:

Гром победы раздавайся,
Веселися, храбрый Росс.

Дык не дачакаецеся, Андрэй Пятровіч. Калі ў каго і былі надзеі на перамогу ў пачатку вайны, дык цяпер яны развеяліся, як ранішні летні туман. Хіба-ж не ясна вам, што гнілая царская Расія не здольна ваяваць? Вайна даўно прайграна. І пачата вайна гэтая дзеля таго, каб адцягнуць увагу закабаленага насельніцтва ў другі бок, каб знізіць хвалю рэвалюцыі, якая ўсё нарастае і блізіцца. Не перамогі трэба жадаць Расіі, а поўнага паражэння!

— Што-ж выйграеце вы ад гэтага паражэння?

Лабановіч чуе праўду ў яе словах. Яму нялоўка за сваё захапленне вайною, за сваю памылку ў пглядзе на вынікі вайны, за сваю веру ў перамогу Расіі. Ён адчувае фальшывасць свайго становішча, але хоча паспрачацца з суседкаю.

— А я запытаю вас, што выйграеце вы ад перамогі Расіі на вайне? — пытаннем на пытанне адказвае Вольга Віктараўна.

— Па-першае, задаволіцца мая нацыянальная гордасць: я буду думаць аб сабе, як аб сыне таго народа, які перамог на вайне. Па-другое, паражэнне на вайне нанясе нам незлічоныя матэрыяльныя страты. Па-трэцяе, натуральнае імкненне Расіі, што выплывае з геаграфічнага становішча яе, — знайсці сабе вольны выхад на мора, будзе паралізавана, а гэта для нас нявыгадна. Ні

Балтыйскае, ні Чорнае мора гэтага выхаду нам не даюць. Сібір занадта далёка, каб можна было належным спосабам карыстаць з яе багаццяў. І зусім іншая справа, калі выхад у нас будзе на Далёкім Усходзе. Усё роўна, ці будзе ў нас цар ці прэзідэнт, а вольны выхад у мора мы павінны мець, бо без гэтага нам цесна і на нашых неасяжных прасторах. Вось чаму я і не хачу, каб нас пабілі японцы, і вось чаму мне так балюча абходзяць нашы няўдачы на вайне.

— Мыслі, дастойныя самага заядлага патрыёта.

У голасе Вольгі Віктараўны чуваць насмешка. І раптам яна змяняе тон размовы.

— Ды вы проста смеяцеся, жартуеце, Андрэй Пятровіч, і мне падабаюцца жарты вашы!

— А калі я кажу гэта сур'ёзна?

Вольга Віктараўна падымае на яго бойкія вочы.

— Сур'ёзна казаць так вы не можаце.

— Чаму?

— Калі вы гэта казалі сур'ёзна, то тады вы — або фальшывы чалавек, або вельмі кепскі рэвалюцыянер.

— Лепш быць кепскім рэвалюцыянерам, чым фальшывым чалавекам, бо фальшываму чалавеку стаць шчырым шмат цяжэй, чым кепскаму рэвалюцыянеру зрабіцца добрым.

— Гэта праўда, з гэтым я згодна, і вы мне падабаецеся вашаю шчырасцю.

— Няўжо я вам падабаюся? Першы раз гэта чую ад дзяўчыны!

— Ах, які няшчасненькі! Ну і апошні раз чуеце гэта — не трэба прыдзірацца да слоў!

Лабановіч напускае на сябе трагічнасць, нізка звешвае галаву і журботна трасе ёю.

— Няўжо гэта праўда? Няўжо ніколі не пачую я ад дзяўчыны, што падабаюся ёй?.. Не пачую!..

— Не пачуеце, — сцвярджае Вольга Віктараўна.

Умомант трагічнасць сходзіць з яго твару. Ён хутка ўскідае галаву:

— І напляваць!

Такі борзды і неспадзяваны пераход ад трагічнасці да бесклапотнасці развясельвае настаўніцу і яна заліваецца вясёлым смехам.

— Лепшага ў вашым стане і не скажаш, — гаворыць яна, не перастаючы смяяцца.

Нейкая новая думка адбіваецца ў выразлівых вачах настаўніцы.

— А скажыце, Андрэй Пятровіч, — змяніўшы тон, пытае Вольга Віктараўна, — ці любілі вы каго хоць раз?

Пры гэтым запытанні Лабановіч мімаволі апускае вочы, але борзда спраўляецца з замяшаннем і ў сваю чаргу пытае:

— А як вам здаецца?

Вольга Віктараўна ўглядаецца ў Лабановіча.

— Мне здаецца, што любілі і цяпер любіце.

— Каго? — зноў пытае Лабановіч.

— Ну, гэта ўжо вам лепей ведаць.

Лабановіч пераводзіць вочы кудысь у неазначанае месца і маўчыць.

— А вы мне ўсё-ж не адказалі на пытанне, — не адступаецца настаўніца.

— Калі хлопец пачынае расказваць дзяўчыне аб сваім каханні да другой дзяўчыны, гэта значыць, што ён пераносіць сваё каханне на тую, якой расказвае.

На твары Вольгі Віктараўны прабягае нейкая радасць.

— Праўда гэта?

— Думаю, што праўда.

— Ну, але гэта тады, калі расказчыка не цягнуць за язык?

Лабановіч памаўчаў.

— І гэта праўда.

Вольга Віктараўна апускае вочы ў сваю чаргу і задумваецца.

— А калі-б расказвала дзяўчына хлопцу аб сваім каханні да другога, то і тады-б была праўда?

— Праўда засталася-б праўдаю.

— І такі вывад робіце вы з уласнае практыкі? — дапытваецца настаўніца з хітраватаю ўсмешкай.

— Не, гэта толькі тэорыя, і яна, думаю, пацвярджаецца практыкаю.

— А што паслужыла прычынаю стварыць такую тэорыю?

— Жыццё. Маладое людское жыццё.

Вольга Віктараўна заліваецца смехам.

— Ах вы, псіхолаг-сэрцавед! — у гэтых словах яе чуваць скептыцызм.

Тады Лабановіч хітравата кажа:

— У вас, Вольга Віктараўна, было такое здарэнне, калі адзін ваш знаёмы падзяліўся з вамі аб сваім каханні да другой, а вы пакахалі яго раней, чым ён расказаў вам гэта. І я не буду дапытвацца, было гэта ці не, бо ведаю, што было.

Вольга Віктараўна прыходзіць у замяшанне і злёгку чырванее. Лабановіч робіць выгляд, што не заўважае гэтага.

— Чорт ведае, што вы плецяце! Годзе аб гэтым! — кажа яна. — Не за тым прышла я да вас, каб гаварыць аб каханні.

Яна, здаецца, узлавалася на сваю слабасць, бо мае на мэце нешта болей важнае.

— Ведаеце, калега, што я хацела вам сказаць?

— Не, не ведаю.

— Дык вось. Увайшла я ў адну рэвалюцыйную арганізацыю, маю там знаёмства. І вам беспрыменна трэба звязацца з ёю.

Лабановіч маўчыць, штосьці думае. Ён і сам ведае, што рана ці позна, а стаць шчыльней да якой-небудзь рэвалюцыйнай арганізацыі яму прыдзецца. Ён чуе, што трэба зрабіць нейкі новы крок у жыцці, крок важны і небяспечны. І цяпер якраз надыходзіць гэты момант.

— Разумеецца, звязацца з арганізацыяй трэба, — нарэшце гаворыць ён.

— Беспрыменна трэба, — падхватвае Вольга Віктараўна. — Усё, што ёсць здаровага, чэснага, павінна выступіць на барацьбу з самадзяржаўем і весці яе арганізавана, бо рэальная сіла толькі і можа быць тады, калі будзе моцная арганізацыя і калі работа павядзецца па строга азначанаму плану. Арганізацыя паможа вам і літаратураю, і грашыма, і жывою парадаю. Арганізацыя падтрымае вас, за яе спінаю вы будзеце чуць сябе цвярдзей і смялей. А цяпер якраз ідзе збіранне рэвалюцыйных сіл, гэтыя сілы растуць, набіраюць моцы, ідзе шырокая падрыхтоўка, і недалёка той час, калі выбухне рэвалюцыя. Захапляцца ў гэты час вайною, хныкаць над па-

ражэннямі на вайне проста смяхотна. Чым болей гэтых паражэнняў, тым шырэй будзе расці нездаволенне, тым болей шансаў на рэвалюцыю, на яе перамогу.

— І вы верыце ў блізкую перамогу рэвалюцыі?

— Я ўпэўнена ў гэтым, — горача адказвае Вольга Віктараўна.

— Можа, вы больш у курсе справы, калі ў вас такая глыбокая вера ў рэвалюцыю і ў яе перамогу. Я-ж, прызнацца, не падзяляю цалкам гэтае веры, бо для мяне няясны дзве сілы ў дзяржаве, ад якіх і будзе залежаць усё: сялянства і войска. Мяне глыбока ўзрушыў адзін факт і закінуў сумненне ў маю душу. Летам давялося мне ехаць па Палескай чыгунцы. На адным невялічкім раз'ездзе я спыніўся і мне прышлося застацца там дзён на два. Праходзіў царскі поезд. На працягу ўсяе чыгункі стаяла ахова. Наперадзе стаяў ланцуг войска, потым за ім цягнуўся шнур паліцэйскай аховы і трэці рад — ахова сялянская. Нікога і блізка не падпускалі да чыгункі. Запынілі ўвесь рух. Царскіх паяздоў было два: у адным з іх ехаў цар, але ў якім, ніхто не павінен быў ведаць. Уявіце-ж вы сабе, калі праходзіў царскі поезд, сяляне па добравольнаму пачыну высыпалі з вёсак і станавіліся на калені за гэтымі трыма лініямі аховы. І заўважце — такія выпадкі мелі месца не адзін раз і былі ў розных губернях.

— Андрэй Пятровіч! Ці варта прыдаваць гэтаму значэнне? Пачнецца рэвалюцыя, і ўсё зменіцца раптоўна і стыхійна. І той, хто становіцца цяпер на калені перад царскім поездам, пойдзе з коллем на самога цара. У часе рэвалюцыі настрой зменіцца борзда. А войска, вы думаеце, цалкам стаіць на баку цара?

— Гэтага я не ведаю.

— У тым-жа і штука, што вы многа чаго не ведаеце.

Панізіўшы голас, Вольга Віктараўна ціха дадае:

— Сярод войска вядзецца работа, і грунт для гэтае работы ёсць. Рэвалюцыя надыходзіць, і яна прыдзе так гучна і неспадзявана, што зямля задрыжыць і небу горача стане.

Лабановіч слухае і дзівіцца, як многа рэвалюцыйнага запалу ў гэтай смуглай дзяўчыны з астрыжанымі вала-

самі і як гараць яе вочы. Яму нялоўка перад ёю, бо дзесь там, на дне душы яго, варушацца нейкі страх і хістанне, чаго няма, як відаць, у яе.

— Так, — гаворыць ён, — ну, што-ж? У добры час!.. Дык вы, Вольга Віктараўна, дапамажыце мне, пазнаёмце мяне бліжэй з арганізацыяй, каб можна было папасці на сход, сякія-такія знаёмствы завесці.

— З вялікаю ахвотаю! Я так і ведала, што вы гэта зробіце, — гаворыць яна, і задаваленне адбіваецца на яе твары.

Позна вечарам Вольга Віктараўна ідзе ў сваю школу.

— Ну, я вас трохі правяду.

У той час, калі яны выбіраюцца ў дарогу, на выгане супраць вокан кватэры настаўніка ціха прапаўзае цень і туліцца ў цёмных закутках, застаючыся непрыметным для іх.

Далёка за пераездам, каля самага сяла, настаўнік спыняецца.

— Ну, Вольга Віктараўна, цяпер вы, можна сказаць, і дома. Бывайце здаровы.

— Андрэй Пятровіч! А вы начуйце ў мяне. Чаго вам ісці так позна?

— Не так ужо і позна. Покі вы нарыхтуецеся класціся спаць, я буду дома.

— А чаму вы не хочаце начаваць?

— Я люблю хадзіць поначы — гэта раз.

— І баіцеся плётак — гэта два.

— Ну, няхай будзе два, — згаджаецца Лабановіч.

— Ну, як знаеце... Яно, мажа, і праўда, што не варта даваць страву для плётак. Толькі-ж мне шкада, што вы будзеце з-за мяне трапацца яшчэ цэлую гадзіну.

— Э, Вольга Віктараўна! Усё роўна трапацца прыдзецца. Дык лепш пачынаць патроху цяпер.

Яны развіталіся.

Толькі цяпер, калі Лабановіч апынуўся адзін на грэблі, ён адчуў усю глыбіню, глуш і затоеную ціш асенняй ночы. Нізка да зямлі туляцца чорныя кусты побач грэблі. Сцятыя гэтым густым змрокам, яны выглядаюць, як нейкія дзіўныя купіны. А далей нічога не відаць. Зямля завешана чорным-чорным полагам. На небе ні

зорачкі. Сівыя хмары навісаюць нізка-нізка і яшчэ больш павялічваюць гэтую цемнату. Відаць, збіраецца дождж.

На пераездзе Лабановіч запыняецца. Чуваць далёкае грукатанне поезда. Настаўніку робіцца весялей, і грукат здаецца яму блізкім і слаўным. Далёка-далёка выплываюць са змроку два агеньчыкі, як вочы добрага прыяцеля. Здаецца, яны стаяць на адным месцы, не рухаюцца, але жалезныя колы ўсё выразней спяваюць сваю аднастайную песню-тухканне.

Гэтыя два агеньчыкі і гэтае тухканне, што ажыўляюць начную пустэлю, мімаволі напрошваюцца на параўнанне з тым невядомым новым, прыход якога адчуваюць ужо чуткія вушы гэтых загнаных у цёмныя норы людзей.

XXVII

З крутой завіліны каля сяла Высокага, дзе Піна падаецца ў бок зарэчных балот, вельмі добра відаць поўднёвая часць Пінска. Велізарны белы манастыр, збудаваны езуітамі ў шаснаццатым веку, і манастырскі будынак, дзе даўней жылі манахі, а цяпер змяшчаецца духоўнае вучылішча, узнімаюцца над роўняддзю балот, становячы самы крайні поўднёвы рог Пінска.

Зацятаю грознасцю і панураю суровасцю вее ад гэтых старасвецкіх муроў, а манастыр мае выгляд непадкупнага вартаўніка аджытых рэлігійных традыцый старасветчыны. Як непарушная скала над морам, стаіць над балотамі гэты маўклівы волат, аглядаючы неасяжныя разлогі Пінскага палесся на далёкія дзесяткі вёрст. Халодная строгасць стылю і гордая моц узняцця ўгару робяць дужа вялікае ўражанне і прыкоўваюць да сябе ўвагу, кідаючыся ўсім у вочы. У ясныя вясеннія або летнія раніцы ці вечары, калі паветра, напоенае вільгаццю, бывае асабліва чыстым і празрыстым, манастыр выступае яшчэ больш пуката і выразна ў сваіх магутных абрысах. Тады ён здаецца зусім блізкім, хоць да яго адгэтуль будзе вёрст пяць. Яго парталы паважна разгортваюцца на фоне ружова-яснага неба, і нельга не заглядзецца на яго.

Кожны раз, калі Лабановіч ідзе з воласці па-над

Пінаю, яму кідаецца ў вочы гэты манастыр і нейкае дзіўнае ўражанне робіць на настаўніка, будзячы ў памяці падзеі гістарычнага мінулага, змаганне двух веравызнанняў, з якіх ніводнае не зрабіла людзей шчаслівымі. Многа прайшло часу, многа людскіх пакаленняў сышло з арэны жыцця, а гэтая махіна стаіць і стаіць, і доўга яшчэ будзе стаяць, каб быць сведкам новага змагання за новы парадак жыцця, дзе на першым плане будуць рэальныя інтарэсы людзей.

Лабановіч не спускае з памяці апошнюю гутарку з Вольгаю Віктараўнаю. Яны ўмовіліся спаткацца вечарам у суботу каля гэтага манастыра на прыстані. Тут-жа недалёка патайнае месца, дзе зрэдку адбываюцца патаемныя сходы. Вось такі сход і займае цяпер мыслі настаўніка.

Сказаць праўду, Лабановічу трохі страшна. Страшна гэтага новага павароту ў жыцці, бо ён немінуча павінен пайсці па дарозе, дзе так многа небяспекі, дзе на кожным кроку цябе можа чакаць ліхая прыгода. У яго ўяўленні рысуюцца арышты, астрогі, ссылка. З таго часу, як пачаў настаўнік весці сваю патайную работу, ён адчувае нейкі непакой і трывогу. Калі яму здаралася бачыць тут якога-небудзь паліцэйскага чына, мімаволі думалася, ці не па яго справе з'яўляецца гэты прадстаўнік улады. Нервы ўвесь час былі троху ўзняты, і ён стаў падазроным і асцярожным, асабліва калі да яго пачалі даходзіць сякія-такія чуткі аб яго паводзінах. Але патрошку ён прывык да мыслі, што можа папасціся, што яго заарыштуюць, і перастаў гэтага баяцца. Наадварот, яму часамі арышт здаваўся прынадным, не пазбаўленым своеасаблівай прыемнасці. Чаму-ж і не пацярпець за праўду? Чаму не спрабаваць лёсу «крамольніка»? Чаму не зазнаць астрожнага жыцця? Астрог таксама ёсць школа, дзе жыццё пазнаецца больш глыбока і востра. Апроч усяго гэтага, тут ёсць і пэўная рызыка, ёсць асалода змагання. Ты ведаеш, што за кожным тваім крокам сочаць, што калі ўсё выкрыецца, цябе будуць лавіць, будуць судзіць, але ты таксама можаш не паддавацца, выкручвацца, весці сапраўднае змаганне за сваё права жыць на волі.

Займае думкі і спатканне з людзьмі, да гэтага

часу яму невядомымі. Ён толькі чытаў аб іх, чуў здалёку і пераважна з вуснаў тых, хто іх ненавідзеў, лічыў самымі вялікімі злачынцамі на свеце. Ён адчувае глыбокую павагу да іх, нават некаторы страх. Хто такія яны, гэтыя людзі? Чым яны жывуць? Аб чым думаюць? У яго ўяўленні гэтыя людзі ўсе — героі, на якіх можна пазіраць толькі з вялікаю пашанаю.

У суботу надвячоркам, закончыўшы работу ў школе, ён збіраецца ў дарогу, прыхаваўшы ў патайнае месца ўсё, што магло-б яго выкрыць у выпадку якога-небудзь непажаданага здарэння, замыкае кватэру на ключ і ідзе выганам на дарогу. Асенні змрок насоўваецца борзда, звужваючы паземы і націскаючы на занямелыя далі. У сялянскіх дварах снуюць людзі, пы́няць свае гаспадарскія справы, канчаючы клопат кароткага дня.

Лабановіч мінае выганы, выходзіць у поле. Тут прастарней і як-бы вальней трохі, прынамсі нікога не відаць, бо Лабановічу не хацелася-б цяпер спаткаць каго-небудзь знаёмага, уступаць у гутаркі, выдумляць прычыны свайго позняга вандроўніцтва ў Пінск, хоць іх можна лёгка прыдумаць не адзін дзесятак. Але на дарозе ціха і бязлюдна. Праходзіць і Альбрэхтова, дзе раскінуўся велізарны маёнтак пана Скірмунта, дзе працуюць яго сукнавальня, гісэрня, бровар і яшчэ нешта. Каля маёнтка на полі, як копы сена, параскідаліся досыць высокія капцы, дзе закапана бульба на гарэлку. Недалёка ад дарогі пачынаецца велізарная клуня, крытая чаротам. Клуня цягнецца ад дарогі да самае Піны — сажняў дзвесце напэўна яе даўжыня. За Альбрэхтовым, ужо каля самага горада, відаць Лешча, дзе ёсць цэркаўка і папоўская пасада. Ужо цёмна, але высачэзныя вязы і ліпы яшчэ вырысоўваюцца сваімі шырокімі вярхамі на шэрым небе.

Мінуўшы арыштны дом, прычым Лабановіч падарыў яго вельмі ўважлівым поглядам, ён ступіў на тэрыторыю Пінска і пайшоў па брукаванай Купецкай вуліцы. Тут было досыць пуста і глуха. Калі-ні-калі затухкаюць па каменным мосціку ногі, скрыпнуць веснічкі, і зноў усё заспакойваецца, як-бы скоўваецца гэтым цёмным змрокам. Прайшоўшы некалькі вуліц і завулкаў, Лабановіч накіроўваецца на прыстань, абмінаючы болей жывыя і

шумлівыя вуліцы. Па дарозе папалася яму некалькі будак, пунктаў паліцэйскай варты, каля якіх звычайна стаялі або тупалі гарадавыя ў цыратовых плашчах.

«Што рабіў-бы ты, брат, каб ведаў, куды я іду? — думаў Лабановіч, мінаючы сонных, марудлівых, прывычных да свае варты гарадавых. — Напэўна заварушыўся-б шпарчэй»,— і ледзь прыметная ўсмешка прабягае па яго губах.

Не даходзячы да цэнтра горада, Лабановіч ідзе глухім завулкам у бок пристані. Прыглядаецца да тых фігур, што абганяюць яго. Мяркуе, ці не шпік гэта часамі, бо яму здаецца, што гэтыя людзі-сабакі чуюць нюхам яго крамольныя замахі.

На прыстані ізноў адчуваецца вальней і прастарней. Прыстань шырокая, доўгая, роўная, прасторная, акуратна вылажана гладкімі каменнымі плітамі і заліта асфальтам, абсаджана двума радамі каштанаў. Таксама ў два рады пастаўлены тут лаўкі на роўнай адлегласці адна ад другой, каб было дзе пасядзець у добрае надвор'е людзям, калі прытомяцца шпацыруючы. Прыстань моцна сціскае левы бераг глыбокай і спакойнай Піны. Яе халодныя сталёвыя струмені ціха ўсхліпваюць, б'ючыся аб гладкі каменны бераг, штось гутараць прыцішаным голасам з чаротамі на другім баку, злёгку пакалыхваюць параходы і параходзікі, дубы і чайкі, што густа збіліся на ўсім працягу прыстані.

Павольна пасоўваецца Лабановіч у бок манастыра. Панурлы і страшны цяпер гэты манастыр, атулены змрокам і імглою асенняга вечара. Яго сярэдзіна сям-там выступае з цемрадзі белымі плямамі, дзе падае святло ад вокан і ліхтароў, а парталы і вежы расплываюцца ў змроку.

Вольга Віктараўна трохі спазнілася. З ёю быў незнаёмы высокі хлопец.

— Пазнаёмцеся, — кажа яна.

Лабановіч і незнаёмы хлопец моўчкі павіталіся.

— Вы даўно тут? — пытае калегу Вольга Віктараўна.

Лабановічу здалося, што яна стараецца гаварыць ціха. Мусібыць, гэта патрабуецца асцярогаю.

— Ды ўжо з поўгадзіны тупаю.

Ён хоча прыдаць вясёласць свайму голасу.

— А вы не замаркоціліся без мяне? — таксама весела гаворыць і Вольга Віктараўна.

— Ой, як замаркоціўся! Хацеў ужо кідацца ў Піну, але пабаяўся, што будзе холадна.

Яна ціха шэпча на вуха яму:

— Мяліце ўсякае глупства. Чым больш глупства, тым лепей. Пачалі вы надта добра.

Іх абганяе чыясь постаць. Можа, гэта быў так сабе чалавек, а можа, і шпік. Хвілінкі праз дзве зноў праслізнула фігура. Лабановічу здалося, нібы тая-ж самая, што іх абганяла.

— Пойдзем, гаспада, падзакусім у рэстаран! — громка гаворыць незнаёмы хлопец.

Яны накіроўваюцца на людную вуліцу, дзе светла і шумна, і праходзяць адзін квартал. Незнаёмы хлопец крута верне ў завулак. Ідуць доўга, мінаюць вуліцы і завулкі і выходзяць да манастыра з другога боку. Незнаёмы хлопец запыняецца, прапускае наперад Вольгу Віктараўну і кажа:

— Заходзьце!

Лабановіч з настаўніцаю ўваходзяць у дворык, дзе лепіцца некалькі заняпалых старасвецкіх хатак, заходзяць збоку і спыняюцца на ганачку.

Вольга Віктараўна стукае.

— Хто? — пытае адтуль голас.

— Ад Барыса, — адказвае Вольга Віктараўна.

Дзверы адчыняюцца. Яны заходзяць у пакойчык, даволі прасторны, але абсталяваны бедна. Збітая, аблупленая канапка, голыя сцены, калі не лічыць гітары на адной з іх, некалькі крэслаў, невялічкі столік, на якім цьмяна гарэла просценькая лямпа, — вось і ўся абстаноўка.

Тут сядзела тры асобы.

Лабановіч следам за Вольгаю Віктараўнаю па чарзе павітаўся з імі, прычым ніхто сваіх прозвішчаў не называў. Толькі Вольга Віктараўна называла незнаёмых па імёнах: таварыш Глеб, Саламон, Грыша. Усе яны — яшчэ маладыя дзяцюкі, і вызначыць іх прафесію было трудна — напэўна рабочыя.

Самы сталы быў Глеб, і аблічча выкрывала ў ім найбольш інтэлігентнага чалавека на гэтым сходзе. Ён насіў

пенснэ. Меў невялічкую рыжаваценькую бародку, акуратна падстрыжаную, і трымаўся найбольш незалежна і спакойна. Па ўсім відаць было, што ён — найбольш аўтарытэтная тут асоба.

Лабановіч абегла акінуў поглядам пакойчык з яго ўбогаю абстаноўкаю і запыніў усю сваю ўвагу на гэтых маладых, зусім незнаёмых яму хлопцах.

Уяўленне аб рэчаіснасці і сама рэчаіснасць — розныя рэчы. Вобразы «крамольнікаў»-рэвалюцыянераў зусім не так рысаваліся Лабановічу. Перад ім былі звычайныя людзі, без рамантыкі і дэманізму, на від хірлявыя і слабыя, адзетыя яшчэ бядней, чым ён сам. Яму здалося, што яго новыя знаёмыя чымся занепакоены... Няўжо яны баяцца? Было неяк нялоўка, цесна і як-бы душна, а наогул непрыемна і залішне ўрачыста.

Грыша падыходзіць да Глеба, аб чымся гутараць. Саламон падсядае да Лабановіча.

— Вам, таварыш, першы раз прыходзіцца быць на такіх сходах?

— Першы раз, — адказвае настаўнік.

— А вы ўжо многа займаецеся настаўніцкаю практыкаю?

— Трэці год.

— Ну, а скажыце, як настроена сялянства?

— Розныя ў іх бываюць настроі. Даць такую агульную характарыстыку досыць трудна.

Праз колькі хвілін з другога ходу паказваецца высокі малады хлопец, той самы, што вёў іх сюды. Ён пашаптаўся з Глебам.

Лабановіч тым часам крыху асвойтаўся і з цікавасцю чакае, што будзе далей.

— Таварышы! — гаворыць Глеб.

Голас яго звонкі, вочы вясёлыя і смелыя. Ён папраўляе па прывычцы пенснэ і кажа далей:

— Нам, думаю, цікава будзе пачуць невялікую інфармацыю з месца ад нашага новага таварыша.

Гэтыя словы адрасаваліся да Лабановіча. Ён адчуў тое самае, што адчувае не зусім добра падрыхтаваны вучань, калі яго нечакана выкліча настаўнік.

Чатыры пары вачэй падымаюцца на Лабановіча. Ён прыходзіць у некаторае замяшанне, але яго выручае Вольга Віктараўна. Яе жаночы такт выводзіць суседа з досыць непрыемнага для яго стану.

— Я думаю, — гаворыць яна, — майму калегу цікава было-б наўперад увайсці ў курс справы. Ці не лепей было-б, каб таварыш Глеб сам зрабіў інфармацыю іншага парадку.

— Наш сённяшні час, нажаль, абмежаваны, і гэта зрабіць цяпер якраз не выпадае. Нам трэба прыняць інструкцыі на момант дня, ну, на бліжэйшыя дні, — адказвае Глеб. Потым ён, як-бы эканомячы час, стаў гаварыць сам да Лабановіча.

— Нам вядома ваша работа, і я з прыемнасцю вітаю вас, таварыш, як нашага аднадумца, хоць афіцыйна вы ў нас не лічыцеся.

У далейшым Глеб крануў трохі тую рэвалюцыйную дзейнасць, якую трэба праводзіць цяпер, пахваліў Лабановіча і зрабіў высокую ацэнку яго работы. Гэта надало настаўніку смеласці, і ён папрасіў слова, каб выказаць свой погляд на праграму далейшай працы.

Прамова Лабановіча была наўперад крыху блытаная, словы неяк не слухалі яго, і язык варочаўся не так, як належыць. Але потым ён паправіўся і нават ажывіўся, калі выказваў свой погляд на пашырэнне прапаганды сярод сялян праз вясковых настаўнікаў.

— Як мне думаецца, да гэтага часу вельмі мала звaрачаецца ўвагі на нашага брата з боку рэвалюцыйных арганізацый. А між тым вясковы настаўнік — адзіны чалавек сярод сялянства, што мог-бы весці работу. А для гэтага трэба толькі разварушыць яго, згуртаваць у свае настаўніцкія арганізацыі параскіданых па трушчобах настаўнікаў. Тады можна падрыхтаваць у належнай ступені народ да рэвалюцыі.

Такі погляд знаходзіць тут спачуванне, што надта ўзнімае дух Лабановіча. І Вольга Віктараўна радуецца за яго, бо гэта-ж яе кандыдат.

На развітанні яму даюць лісткі і брашуркі, адрасы кватэр і запрашаюць надалей трымаць сувязь.

Вольга Віктараўна застаецца начаваць у сваіх знаёмых, а Лабановіч, шчодра наладаваны нелегальнаю лі-

таратураю, пляцецца па апусцелых вуліцах і завулках, баязліва прыглядаючыся і прыслухоўваючыся да гэтай зацятай цішыні, і калі мінае раён горада, дык адчувае вялікую палёгку і ўздыхае вальней.

XXVIII

Ясна відаць, што Іван Пракопавіч, казённы ляснічы, не ў гуморы. Не гадзіну, не дзень, нават і не тыдзень, а праз цэлыя месяцы хмурыцца яго крутая лабаціна, сярдзіта звісаюць доўгія вусы, а з быстрых вачэй іскры сыплюцца. Нават лаянка яго, звычайна прыяцельская, прыязная, вясёлая, цяпер звініць сапраўднаю злосцю, рассыпаецца круглымі, ядранымі словамі пад парасонамі высозных вязаў і ліп, што стаяць у парку.

Хоць ужо і холадна, але Лабановіч сумысля адчыняе фортку ў акне супраць парку казённага ляснічага, каб пачуць гэтую лаянку. Гэта нават і не лаянка, а дыскусія Івана Пракопавіча на социяльна-палітычныя тэмы. І тут няважна, ці пярэчыць яму хто ці не — важна толькі сама зачэпка для такой дыскусіі, бо ў ляснічага накіпела на сэрцы за гэтыя часы, і яму трэба выліць сваё абурлівае нездаваленне, накіраванае на няздольнасць вялікіх і малых чыноўнікаў, на гэтае нікчэмства, што пачынае дамагацца нейкіх сваіх правоў, выпаўзае, як гад з нары, на віднае месца. Ён не можа пагадзіцца з гэтым няшчасным фактам, што на Русі перавяліся «багатыры», або волаты, што няма каму ратаваць яе. Таксама няважна, як хто слухае яго, згаджаецца з ім ці не — яму проста трэба чалавек, сведка яго абурэння. А калі гэты сведка, які-небудзь паляшук з Выганаў ці з Высокага, ці хто іншы, нават з інтэлігенцыі, часамі, не дачакаўшы канца, памаленьку схаваецца, проста збяжыць, дык ён яшчэ сакоча некаторы час. А калі заўважыць, што яго слухачы — вязы і ліпы, тады азірнецца быстра, як патрывожаны арол. Часамі ён на гэтым і канчае. Усё залежыць ад таго, у якой меры выліта абурэнне. Калі-ж абурэнне надта вялікае, ён ідзе шукаць жывога сведку-слухача, каб скончыць дыскусію. Спружыніста зрываецца з месца, рашуча кіруецца да плятня ў бок школы. Там ёсць пе-

ралаз. Іван Пракопавіч задзірае полы чорнага яраслаўскага кажуха, закідае перш адну, потым другую нагу — гоп! — і ён на тэрыторыі школы.

На сярэдзіне школьнага агароду ён трохі затрымліваецца — куды накіравацца. Ізноў-такі далейшыя паводзіны яго залежаць ад ступені абурэння. Часамі ён мінае школу і ідзе далей, бо настаўнік заняты, хоць з ім пагаварыць найзручней. Па-першае, ён слухаць умее, уставіць слова, рэпліку падасць, ну, словам, дапамагае выказацца да дна; па-другое, ён такі чалавек, з якім прыемна пагаманіць аб вайне: абодва яны былі ў курсе ваенных спраў, абодва мелі на канец вайны аднакія погляды, хоць яны тут здорава падашукаліся; па-трэцяе, настаўнік такі чалавек, з якога можа толк быць, калі яго належным парадкам накіраваць у патрэбны пункт. І ляснічы шмат папацеў, даючы суседу належны кірунак: засылаў яму «Новое время», Розанава, Лютастанскага, а з прыгожага пісьменства — Мельнікава-Пячэрскага, якога ляснічы ставіў на самае першае месца сярод рускіх пісьменнікаў, бо раманы «На ѓорах» і «В лесах», на яго думку, не мелі роўных сабе.

Абурэнне Івана Пракопавіча на гэты раз такое вялікае, што ён ідзе ў школу. Наўперад заходзіць у кухню.

— Здарова, Ганна! — як з пісталета выпальвае Іван Пракопавіч словы прывітання.

— Здаровенькі булы! — кланяецца Ганна.

— Ну, як жывуць байструкі твае?

Ганна штось адказвае, але ён не слухае. Карыстаецца выпадкам, каб сарваць хоць на кім сваю злосць.

— Ну, не сукін гэта сын? Гэта чалавек? Гэта бацька? Хоць-бы капейку прыслаў на сына, прахвост! Ну, ён вырасце... — і паказвае пальцам на малога Кірылу. — Што-ж з яго будзе? Куды прыткнецца? Красці пойдзе або возьме новую моду: у рэвалюцыю пойдзе! Цяпер-жа вот такія смаркачы, — палец ляснічага накіроўваецца на Юсту, — пачынаюць бунтавацца, вучыцца не хочуць, супраць дырэктара выступаюць... Больш іх розгамі лупцуй! Не шкадуй дубцоў! Не дасі лазы, калі лаза па іх плача, сама ад іх плакаць будзеш!

Выпусціўшы такім парадкам частку пары свае злосці, ляснічы заходзіць у кватэру настаўніка. Пакуль не пры-

дзе на пераменку настаўнік, Іван Пракопавіч, як тыгр у клетцы, ходзіць па пакойчыку, пазірае ўніз, залажыўшы рукі за спіну. Увесь час на яго твары адбіваюцца: то яхідны смех, то злосць, то іронія, то сарказм. Сяды-тады з губ зрываецца кароткае бурчанне. Але як толькі ён згледзіць настаўніка, усе гэтыя эмоцыі раптам прападаюць, твар прыходзіць на кароткі час у звычайны стан, на той толькі момант, каб павітацца з Лабановічам.

— Ну, што? — пытае Іван Пракопавіч, — школа ваша яшчэ не бастуе?

— А чаго ёй баставаць?

— А як-жа? Пайшлі забастоўкі сярод дзяцей. У Пінску, унь, рэальнае вучылішча забаставала — давай ім свабоду! Прыгатавішкі мітынгаваць пайшлі. «Далоў, — кажуць, — дырэктара і настаўнікаў!» Ходзяць і папяросы кураць... Ну, што вы скажаце?

Пасля кароценькай паузы, набраўшы духу і раптам змяніўшы выраз твару, Іван Пракопавіч панёсся, як спуджаны конь, крышачы і калечачы ўсё на сваёй дарозе.

— А нашы гэтыя пенцюхі, адміністрацыя, начальства гэтае, з пазвалення сказаць, і губы адвесіла!.. — Лясьнічы таксама адвешвае губу, каб паказаць, які выгляд мае перапалоханае начальства.

Лабановіч не можа захаваць сур'ёзнасці і закочваецца смехам.

— Чаго вы смяецеся?

— Ну, вельмі-ж «карцінна» расказваеце, Іван Пракопавіч, — не перастаючы смяяцца, адказвае Лабановіч.

— Дык праўда-ж гэта! Галовы пагублялі! Стаіць збоку: адна калоша поўная, а другая, як завязаць. А гэты наш... паліцмайстар!.. Жаба разлезлая! Ліберал!.. Вы ведаеце? Пракламацый яму ў кішэню бахурчыкі напхалі! І гэта — павятовы начальнік паліцыі! Сорам! Гнаць такіх у тры шыі, каб паветра не псавалі! Над бочкамі начальнікам паставіць!.. Тфу!.. Дубовыя галовы!

Іван Пракопавіч ледзь са скуры не вылазіць. І ўсё ў ім гаворыць: язык, губы, нос, бровы і лоб, вочы і вушы, рукі і ногі, як-бы ў нейкім дзікім шаленстве. Яго слухач не вытрымлівае і пачынае зноў смяяцца. Сярдзіта глядзіць на яго лясьнічы.

— Ды тут і смешнага нічога няма,— кідае настаўніку.

— Ну, як-жа не смешна, Іван Пракопавіч: такая шышка паліцмайстар і раптам — начальнік над бочкамі!

— Сволачы, скажу вам! Скуры прадажныя! У той час, калі дзяржаве патрэбны цвёрдыя людзі, іх тады няма, яны ссыхаюць, нікнуць, туляюцца, прыкідваюцца, што нічога няма і нічога яны не бачаць. Хіба можна дапусціць, каб нейкая няшчасная саплівасць асмелілася дамагацца нейкіх там свабод, гаварыць пра абмежаванне ўлады манарха?

— Нічога не зробіш, Іван Пракопавіч: стыхійна выліваецца абурэнне заціснутага...

— Ерунда! — грыміць ляснічы, — якая стыхійнасць? Якое абурэнне? Хто заціснуты? У нас у Расіі большая свабода, чым у любой канстытуцыйнай ці рэспубліканскай дзяржаве. Вы акалпачаны прадажным жыдоўскім друкам. Хіба вы гэтага не ведаеце? Рускаму чалавеку цяпер няможна слова сказаць, яму заціскаюць рот, высмейваюць, рэтраградам называюць. Увесь друк у жыдоўскіх руках, ім трэба разбурыць праваслаўную царскую Русь, а рускіх людзей парабіць шабасгоямі.

Скіраваўшы гутарку ў гэты бок, Іван Пракопавіч разліваецца бясконцым патокам слоў. Пярэчыць яму — усё роўна, што ў сцяну гарохам страляць: ніякіх аргументаў ён знаць не знае і не слухае, наадварот, гэта толькі — падліванне масла ў агонь. Лабановіч цярпліва выслухоўвае лясьнічага, хоць там дзеці дурэюць, як школы не развернуць.

Замкнуўшы круг сваіх аргументаў і выліўшы злосць на «жыдоў», у чыіх руках уся прэса, Іван Пракопавіч ізноў навальваецца на паліцмайстра. Ніяк яго забыць не можа.

— І гэтая аблезлая жаба, рапуха, гаворыць мне ўчора: «А вы там, Іван Пракопавіч, агітацыю ведзяце сярод сялян!» Гэта я вяду агітацыю? Ну, ці чулі вы?

— Ну, гэта ён толькі напэўна жартаваў, — заступаецца за паліцмайстра настаўнік.

— Ды хоць-бы і жартаваў! Як ён асмельваецца сказаць мне гэта публічна? Думаў даць у зубы, ды скандалу не хацеў рабіць. А варта было-б.

Ляснічы трохі супакойваецца. Відаць, яму стала цяпер лягчэй, бо ён сказаў усё, што наймацней карцела.

— Ну, выбачайце, — нарэшце гаворыць ён, — у вас там гэтыя шмокі шыі ломяць, а я вас затрымліваю.

Ляснічы падае руку і выходзіць, а настаўнік яшчэ доўга пасмейваецца, успамінаючы, што паліцмайстар абвінаваціў ляснічага ў агітацыі сярод сялян.

«Калі што, ляснічы закіне за мяне слова», — кажа сам сабе.

І не адзін Іван Пракопавіч выбіты цяпер з каляіны. дыханне рэвалюцыі і яе грозны размах адчуваюцца ўсімі. Кожны-ж новы дзень прыносіць весткі, што рэвалюцыя расце і ўшыр і ўглыб. І важней за ўсё — бунты ў войсках і сялянскі рух.

Дзяк Бацяноўскі ходзіць ды прыслухоўваецца, але сам гаворыць мала. Ён толькі трасе галавою ды ўздыхае.

— Охо-хо! Да чаго дажыліся!

Часамі, сустрэўшы каго-небудзь з заняпалых гаспадароў, ён усміхаецца і пытае:

— Можа, вам ужо і поп з дзяком не патрэбны?

Айцец Мікалай — чалавек дыпламатычны. Ён асцярожненька і ў заўтрашні дзень зазірае, а калі сустрэне чалавека, чыё спачуванне на баку рэвалюцыі, дык ціхенька пашэпчацца з ім.

— Хочуць адабраць зямлю ад духоўных! Няхай бяруць! Няхай мне назначаць пенсію. Нашто мне зямля? Адзін толькі клопат і згрызоты з ёю, а карысці няма. А мужыку зямля патрэбна. Дык нашто гэтая лішняя зачапка для непрыязні? Вось вы глядзіце, — а. Мікалай паказвае рукі, — сам працую, мазалі панаціраў на гэтай зямлі... Няхай бяруць яе! Маюць рацыю.

Хітры чалавек а. Мікалай: дагаджае і богу і мамоне.

Найбольшы водгук на падзеі рэвалюцыі можна пачуць у воласці. Захар Лемеш рэвалюцыі не спачувае. Ён абураны ёю. У галаве яго не месціцца, як гэта можна пайсці супраць начальства? І дзе гэта бачылі, каб людзі маглі жыць без начальства?

— Добра! Ну, вось, скажам, перасталі слухаць у воласці старшыню. Падатку не плацяць, нядоімак не ня-

суць і навабранцаў не даюць. Дык што-ж-бы тады было? Рунда!

Глянуць на справу больш глыбока старшыня ніяк не можа. Ён толькі чуе, што дабра ад рэволюцыі яму не будзе. Вось пісар — той, падла, разбіраецца. І пагутарыць прыемна з ім, бо пісар у руку старшыні гаворыць.

— Ну, як ты глядзіш, пісар: паскідаюць нас, брат, з табою, — пачынае старшыня. Праўда, ён не верыць, што іх паскідаюць, але яму хочацца, каб пісар выказаў свой погляд на гэта.

Пісар насоўвае густыя бровы, вочы яго грозныя-грозныя, наскрозь, здаецца, праб'юць кожнага, хто асмеліўся-б крануць яго і старшыню.

— Хто скіне нас? — пытае пісар.

— Ну хто-ж? Забастоўшчыкі, дэмакраты!

— А халодная нашто? А нашто казакі? Прыслалі-ж у Пінск сотню казакоў. Так, брат, усыплюць, што тыдзень сваім крэслам не сядуць. Няхай толькі заварушыцца хто!

Старшыня ад задаволення ўсміхаецца.

— Казакі — народ спрытны. Майстры залівання даць, — згаджаецца ён.

А пісар прыходзіць у абурэнне.

— Ды я сам вазьму нож і пайду рэзаць гэтых дэмакратаў. Рэзаць буду направа і налева! Дай толькі мне нож.

Пісар сашчэмлівае зубы і згортвае кулакі, а твар старшыні свеціцца ад радасці.

— Герой наш пісар, далі-бог герой.

Пазіцыя сельскага старасты Бабіча не такая выразная, бо ён наогул больш маўчыць і слухае. Але заставацца зусім у цяню ён лічыць нязручным, і калі прыходзіцца быць у кампаніі асоб афіцыйных, ён у некаторых момантах гутаркі трасе галавою, часамі з сур'ёзнасцю на твары, а часамі аздобіўшы яго смехам, у залежнасці ад абставін. Наогул-жа Бабіч і па службоваму і па соцыяльнаму свайму стану ёсць як-бы нейкая прамежная планета, што адчувае на сабе ўплыў суседніх планет.

На зборні гутаркі трохі іншыя.

Заядлымі палітыкамі з'яўляюцца дзед Піліп і фурман Аўмень. Ізноў-жа-такі і тут першая роля належыць Аўменю. Кожны раз, асабліва калі прыедзе з Пінска, ён уражае сваіх слухачоў якою-небудзь неспадзяванаю навіною.

— Ну, скора будзе канец трыбухачам!

Пад «трыбухачамі» Аўмень разумее ўсіх паноў і шышак. Паясняць гэта сваёй аўдыторыі не трэба — усе ведаюць, хто такія трыбухачы.

Дзед Піліп утароплівае ў Аўменя свае пранізлівыя вочы. І вочы яго і нос, непамерна доўгі і чырвоны, пабіты на дзірачкі, як акораная чачоткавая бяроза, і ўся постаць дзеда Піліпа ператвараецца ў знак запытання.

— Ну? — дзівіцца ён.

— Канчаецца іх панаванне. Губернатары і тыя хвасты пападціскалі. Свабода, брат, пайшла! Каюк міністрам!

— І міністраў не будзе?..

— Усё будзе скасавана!

— Каму-ж тады падаткі плаціцьмем?

— І падаткаў не будзе. Самі будуць на сябе працаваць.

— А як-жа начальства? — пытаюць Аўменя.

— Начальства застаецца без падначальных, ніхто яго слухаць не хоча цяпер.

— Няўжо-ж-такі начальства не будзе?

— Будзе, але другое. Тое начальства назначалася, а гэта выбірацца будзе.

— І земскага будуць выбіраць?

— Калі трэба будзе, то выберуць. Але іх не любяць нешта. Ці захоча хто і земскім быць?

— Чаму не захоча! — гаворыць дзед Піліп, — у начальства, пэўна, кожны папрэцца... Ха! — ускідвае ён рукамі, — вось, ядры тваю качку, якія часы находзяць!

Калі на гэты час разважанняў праходзіць пісар або старшыня, гутарка абрываецца, бо такіх размоў начальства не любіць.

XXIX

Прыходзіць у школу Аксён Каль. У руках у яго скрутак, абгорнуты газетаю. І выгляд у Аксёна радасны і светлы. Такі выгляд бывае ў таго, хто доўга чагось шукае, нягледзячы ні на якія перашкоды і на безнадзейнасць, здавалася-б, гэтага шукання, і ўрэшце знаходзіць.

Аксён разгортвае скрутак і паказвае настаўніку план. На плане зняты сялянскія землі і сумежныя ўладанні пана Скірмунта.

— Гэта такая праўда і справядлівасць на свеце!..

Аксёнавы вочы запальваюцца агнём помсты.

— Вы бачыце, каму належаць затокі па плану і хто імі карыстаецца?

Злашчасныя затокі, з-за якіх Аксён Каль так многа судзіўся, хадзіў, дабіваўся законнага права на іх, у плане значыліся на сялянскіх землях.

— Прывесці яго сюды, тыцкнуць носам у план, а потым утапіць прахвоста ў гэтых затоках!

— Нічога, Аксён: будзе свята і на нашай вуліцы. Надыходзіць час расплаты за здзекі над народам. Дымам і агнём паляцяць у неба панскія палацы, і ўжо ляцець пачалі.

— Спаліць! Спаліць і зруйнаваць іх, а котлішчы пазаворваць.

З аднаго і з другога боку абурэнне было вялікае. Нарэшце Каль пераходзіць на практычны грунт, каб вырашыць пытанне, як і што рабіць далей.

— А сяляне ведаюць пра гэты план? — пытае настаўнік.

— Заўтра будуць ведаць усе.

— Збірайце тады сход. Вырашым сходам. Выступаць трэба згодна і ўсім разам.

На трэці дзень сабраўся сход.

Ніколі не бачылі школьныя сцены такога многалюднага, бурлівага, неспакойнага сходу. Вякамі збіраная і тоеная крыўда, несправядлівасць і прыніжэнне цяпер усплываюць са дна сялянскай душы і злучаюць увесь натоўп у нешта адно злітнацэлае, многагаловае, многарукае, знітаванае адным жаданнем, адною воляю. Гэта

той стан выяўлення людской псіхікі, калі людзі-адзінкі расплываюцца, каб зліцца ў чалавеку-натоўпе.

Сярод соцень светлых і цёмных галоў, валасатых і лысых, відаць і старастава галава. Бабіч, гэты ціхі, лагодны чалавек, які ўмее так добра слухаць, цяпер строгі і зацяты. Відаць, ён чымся заклапочаны і як-бы неспакойны. Ці выпадала яму прыходзіць на гэты сход, як асобе афіцыйнай?.. Нядобра займаць такое прамежнае месца! Старшыні тут няма. О, не! Старшыня сюды не пойдзе. І царкоўны стараста Крэшчык таксама не прышоў. Дый многа каго няма, але гэта ўсе людзі заможныя, што каля начальства любяць пабыць, а тут якраз супрацьначальніцкая чыннасць можа мець месца.

Грозны вагар зямельных бунтаў пакаціўся па неасяжных прасторах царскай Расіі, скутай астрогамі і ланцугамі няволі, пакаціўся бляскам пажараў, клубамі дыму, афарбоўваючы ў крывавы колер халоднае асенняе неба. Адвечная сялянская прага да зямлі і гэтае неўміручае імкненне да волі цяпер выліваецца ў адным глухім, няўцямным ракатанні, гудзе і ідзе нястрыманым поступам, разбураючы ўсё на сваёй дарозе. Кідаюць паны маёнткі, як пацукі падпалены млын, уцякаюць у гарады, галосячы аб ратунку і расказваючы аб жудасцях, якія чыніць мужык-звер.

І вось цяпер такія «мужыкі-звяры» сабраліся ў школе. Паміж сабою дома яны не раз цішком разбіралі падзеі апошніх дзён, а цяпер, на сходзе, трэба ўсё гэта аформіць. А для законнасці яны і старасту Бабіча прыпрэглі сюды.

Гудзе сход, як цёмная пушча пад напорам буры. Асобных слоў не чуваць, адзін густы рокат поўніць школьную залу.

Настаўнік і Аксён Каль уваходзяць у школу.

Натоўп сціхае: пачынаецца акт вялікай грамадскай важнасці. Сотні вачэй узняты на гэтых двух асоб.

— Грамада! Дык прыступім да справы.

Голас у Аксёна звонкі. Тоны ўрачыстасці чуваць у ім.

— А-ру-ду-ду-ду-д-ум! — коціцца невыразны гук з натоўпу, зрэдку пранізваючыся асобнымі словамі. Сход выказвае згоду прыступіць да справы.

— Мы прышлі не ў воласць, дзе робяцца сходы, а ў

школу, бо настаўнік — наш чалавек, ён за нас, а за гэтую справу не возьмецца ні пісар, ні старшыня, ні хто іншы, бо яны нам не спачуваюць! — гаворыць Аксён.

— Басякі! Нажывацца толькі ўмеюць нашым потам! — чуецца голас.

— Мы будзем прасіць настаўніка дапамагчы нам, каб гэта ўсё аформіць і зрабіць, як трэба.

— Просім! Просім! — гудзе сход.

У часе гэтага ўступу з натоўпу непрыметна праціскаецца нізенькі, хірлявы паляшук сярэдніх год, з бародкаю, падобнай да жмута моху, што расце на кары старой бярозы. Ён падыходзіць да настаўніка і ціха кажа:

— Вы-ж думаеце, мы не ведаем, хто наш вораг, а хто прыяцель?.. Вы майму Алесіку падаруначак зрабілі, купілі сіраце кашульку. А поп, пісар, земскі — гэта басякі, скуру гатовы драць з нас, але мы з імі расправімся!

Настаўніку няма калі гаварыць з ім: сход чакае пачуць яго слова.

Самая справа, па якой скліканы гэты сход, усім вядома: трэба нешта зрабіць з панам Скірмунтам, трэба так ці іначай парахавацца з ім.

Лабановіч адчувае ўсю незвычайнасць абстаноўкі, напружанасць моманту і настрой сходу. Ён адчувае таксама і сваю адказнасць, маральную адказнасць перад гэтым узбударажаным народам, гатовым цяпер пайсці на ўсё: грабіць, паліць, рэзаць — такія прыклады яму вядомы. У той-жа час настаўніку трэба выпаўніць свой абавязак перад рэволюцыяй. А парадзіцца ў гэтай справе няма з кім, тым больш гэта патрэбна цяпер, калі прыціхшая паліцэйшчына пачынае падымаць галаву і рабіць расправу з сялянствам, паўстаўшым супраць паноў.

Усхвалёваны і бледны, выступае настаўнік перад сходам.

— Грамадзяне! Усім ясны і зразумелы ваш гнеў і абурэнне. Сотні гадоў жылі мы пад панскім ціскам. Нас не лічылі за людзей, нам чынілі здзек і ўсякую крыўду. Селянін на зямлі, рабочы на фабрыцы працуюць на багатых. Паны і багатыры жывуць у раскошы, а вы — у

цёмных і цесных халупах, капаецеся, як чэрві ў зямлі, і няма вам ні жыцця, ні долі. Справядліва гэта? Ці павінна гэтак і далей быць? Хто-ж за нас заступіцца? Хто дасць нам збавенне ў гэтай цяжкай нядолі? Калі мы самі не паможам сабе, дык нам ніхто не паможа. Вы толькі падумайце: маленькая жменька дваран і багатыроў села вам на карак, захапіла лепшыя землі, жыве з вашае працы і вас-жа катуе, чыніць несправядлівасці, пазаганяла вас у норы, у шчыліны, парабіла вас нявольнікамі. Чаму? А таму, што ў іх руках улада, суды, войска. Яны чмуцяць вам галовы праз цэрквы і школы, што гэтак і павінна быць, палохаюць вас карамі ў пекле, каб вы былі паслушнымі і пакорнымі, абяцаюць вам рай на тым свеце, каб самім вальней было жыць на гэтым. Трэба зразумець, хто намі кіруе і чаму, трэба голасна заявіць аб сваім праве і падтрымаць гэтае права сілаю. Што-ж для гэтага трэба? Трэба злучыцца ў адзін шчыльны саюз, у адну грамаду людзей і выступаць у згодзе, дружна, як адзін. Толькі тады вы будзеце непераможнымі, бо хто тады выступіць супраць вас? Войска? Але-ж яно складаецца з вашых сыноў, і не для таго патрэбна яно, каб біць сваіх бацькоў і братоў.

Гэтая трохі аб'ездная дарога-прамова пачынае, як заўважае прамоўца, таміць сход. Людзям трэба пачуць пра маёнтак пана Скірмунта.

Лабановіч бярэ план.

— Вось вам, грамадзяне, прыклад таго, як справядліва абышліся з вамі. На гэтым плане затокі і прырэчная сенажаць належаць да вас, але чамусь яны апынуліся пад панам Скірмунтам. Вы за іх судзіліся, але нічога не высудзілі. Нават хацелі цару падаваць прашэнне, але і з гэтага нічога не вышла-б, бо і цар за паноў стаіць, а не за вас.

— Галаву адкруціць трыбухатаму чорту!

— Спаліць яго маёнтак разам з ім і з усім яго насеннем! — гудуць злосныя галасы.

Сялянскае абурэнне расце. Яно можа выліцца ў дзікую форму грабежства і гвалту. А ўсё гэта дасць начальству «законнае права» жорстка пакараць сялян, як грабежнікаў і гвалтаўнікоў.

— Грамадзяне! З вамі абышліся несправядліва, але

не паддавайцеся злосці і не рабіце таго, аб чым потым прыдзецца пашкадаваць. Трэба ўсё ўзважыць, абмеркаваць халоднаю развагаю. Перш за ўсё я запытаю вас: ці будзеце трывалымі і цвёрдымі, калі ў гэтай справе налучыць вас якое-небудзь ліха? Ці будзеце складаць з сябе віну на каго другога за свае ўчынкі?

Пытанне, кінутае ў натоўп так проста і неспадзявана, ахаладзіла пал сялянскай злосці.

— Вас мы не выдамо! — чуецца голас з натоўпу.

— Я за сябе не баюся, — адказвае прамоўца, уколаты гэтаю шчыраю заяваю. — Я толькі хачу перасцерагчы і напомніць вам, каб наўперад спакойна абмеркаваць, а потым ужо рабіць і рабіць арганізавана і дружна, каб вашы ўчынкі сапраўды былі рэвалюцыйныя і свядомыя.

Стараста Бабіч глядзіць на настаўніка, ківае галавою: праўда ўсё гэта, трэба памеркаваць.

— Праўда, праўда, — уголас кажа ён.

— Дык давайце зробім так, каб было, як кажуць, і сярдзіта і каб нас не маглі падкалупіць лёгка і проста.

Сход уважна прыслухоўваецца да слоў настаўніка.

— Я думаю, — кажа ён далей, — наўперад паслаць Скірмунту наша патрабаванне. Яно ў мяне напісана, і я прачытаю вам яго.

Настаўнік бярэ заранёй напісаную паперу, петыцыю, што тады звычайна практыкаваліся, і чытае:

ГРАМАДЗЯНІНУ СКІРМУНТУ Ў АЛЬБРЭХТОВЕ
ГРАМАДЗЯН с.с. ВЫГАНЫ І ВЫСОКАЕ

ПЕТЫЦЫЯ

Несправядлівасць, што чынілі вякамі сялянству паны і чыноўнікі, той цяжкі стан, у якім апынулася яно ў выніку гэтай несправядлівасці, змусіла сялян саміх узяцца за справу скасавання гэтай несправядлівасці. Усюды па Расіі ўзняўся рух сялян на грунце зямельных адносін з памешчыкамі. Гэты рух, як вам напэўна вядома, часта прымае грозную, для вас непажаданую форму, бо даведзенае да крайнасці сялянства змушана ўжываць такія формы. Ухіляючыся ад ужывання такіх крайніх сродкаў, мы, грамадзяне с.с. Выганы і Вы-

сокае, напамінаем вам, што затокі і сенажаць на Піне, згодна плану, зацверджанаму Межавою Камісіяй 18... года, значацца ў нашым уладанні. Між тым гэтымі нашымі ўжыткоўнасцямі незаконна карыстаецеся вы. У справе-ж нашых цяжбаў з вамі за гэтыя ўжыткоўнасці суд стаў на ваш бок.

На падставе ўсяго вышэйпаданага мы патрабуем:

1. Адмовіцца ад незаконнага карыстання нашымі затокамі і сенажаццю.

2. Як узнагароду за гэтае карыстанне, перадаць нам частку вашага маёнтка, што прымыкае з аднаго боку ад Піны да дарогі і з другога — да маёнтка Альбрэхтова.

3. Калі наша законнае дамаганне вамі не будзе прынята пад увагу, мы змушаны будзем ужыць іншыя сродкі.

З вялікаю ўвагаю слухалі сяляне гэтую петыцыю.

— Грамадзяне! Згаджаецеся вы падаць такія патрабаванні Скірмунту?

— Згаджаемся.

— Падаць! Падаць! — гудзе сход.

— Калі так, то падпісвайцеся.

Сяляне рушылі да стала і мазолістымі загрубелымі пальцамі выводзілі свае прозвішчы ці проста стаўлялі крыжыкі, а нарэшце паперу змацаваў пячаццю стараста Бабіч.

Выбралі трох дэлегатаў. Ім даручана перадаць петыцыю пану Скірмунту.

— Калі пан ужо верне нам затокі, мы прынясем самай лепшай рыбы нашаму настаўніку за турбацыю, — гаворыць дзядзька Есып.

Скірмунт — чалавек важны і заможны пан. І ўся постаць яго выкрывае гэтую важнасць. Яго маёнтак адзін з найлепшых на Піншчыне. І сярод паноў і сярод начальства ён — паважаная асоба. Ён асабіста знаёмы з губернатарам. Выгладжаны і прылізаны, важна сядзіць ён у сваім пышным кабінеце за багатым сталом, курыць дарагія цыгары. На рэвалюцыю глядзіць звысоку, ці не замнога сабе ўзялі ў голаў гэтыя «хлопы»? Яго золата захавана ў надзейных банках. Маёнтак, будынкі і маёмасць — усё застрахавана. Ён не баіцца. Сядзіць, праглядае рахункі, робіць праекты, як пашырыць свае прад-

прыемствы, наогул «працуе». Праца сялян і праца рабочых — гэта праца жывёлы. А ён працуе галавою. На яго гаспадарцы жывуць і кормяцца сотні людзей, ён дае ім хлеб, і яму павінны быць за гэта падзячны.

У пакой асцярожна і пачціва стукае чыясь рука.

— Проша! — кідае пан Скірмунт.

Уваходзіць перапалоханы галоўны аконам. У руках яго папера.

— Ясны пане! Якую агідную паперу падалі пану гэтыя хамы з Выганаў і з Высокага!

Пан Скірмунт бярэ петыцыю, ускідае вочы. На твары абразлівая ўсмешка.

— Гм! На роўную нагу са мною становяцца: грамадзяне пішуць да грамадзяніна!

Пан Скірмунт вышэй падымае свае закручаныя пышныя вусы. Чытае. Увесь час іранічная ўсмешка не сходзіць з панскіх вуснаў. Чытаючы, ківае часамі галавою. Нарэшце ўсмешка знікае, вочы робяцца злымі. Аддае загад.

— Залажыць брычку і пару коні!

Калі пан Скірмунт скончыў чытанне петыцыі, у яго з'явіўся план, што рабіць у гэтым выпадку.

Пан Скірмунт у Пінск едзе. Трэба-ж пацешыць маршалка. Трэба падняць на ногі начальства.

І пан Скірмунт закруціў машыну.

XXX

Вечарам, закончыўшы заняткі, Лабановіч выходзіў часамі прайсціся, каб пабыць на свежым паветры. Было адно такое абранае месца, куды ён звычайна і хадзіў, калі хацелася пабыць аднаму. Месца гэтае — дарога за Выганамі, што ідзе поруч чыгункі, дзе стаяць два ветракі. Тут зусім ціха, асабліва калі сцямнее. І што падабалася тут яму, дык гэта скоры поезд, што ідзе з Лунінца на Пінск. Вёрст пяць адгэтуль, мінуўшы Заазер'е, чыгунка робіць залом, адкуль вельмі добра відаць агні поезда. У гэтых яркіх рухлівых агнях было штось надзвычай павабнае і цікавае. Многа разоў бачыў ён гэтыя агні, і яны здаваліся яму нейкаю чароўнаю ўсмешкаю сярод

зацята-маўклівай цемры і заўсёды былі прынадныя і любыя, як сімвалы вечнага жыцця.

На гэты раз ён вышаў сюды для таго, каб праверыць адну вельмі важную падзею. Удзень пранеслася чутка, што пачалася вялікая агульная забастоўка, што рэвалюцыя дасягае найвышэйшага напружання, што ўступкі, зробленыя царом паўстаўшаму народу, не задавальняюць яго.

Мімаволі нейкі страх ахоплівае душу перад веліччу змагання — чым-жа ўсё гэта кончыцца? Які будзе вынік гэтага змагання?

Лабановіч ведае, у які час праходзіць поезд. Гэты час набліжаецца. Настаўнік пільна ўглядаецца ў тое месца залому, адкуль звычайна вынікаюць агні. Але іх не відаць. Можа, таму, што цемра густая і шчыльна перавітая з імглою. У гэтай цемры-імгле нікне зямля і неба, нікнуць агні. Ён пазірае на сяло, каб пераканацца, ці відаць агні з вокан. Яны амаль не відны, толькі светлавата-бледныя слупы-стрэлы ўзнімаюцца ўгору і знікаюць невысока над стрэхамі.

Ён зноў пазірае на чыгунку, на залом і прыслухоўваецца. Навокала магільная цішыня, як-бы ўсё анямела або вымерла. Падыходзіць яшчэ бліжэй да чыгункі, зноў услухоўваецца — тая-ж цішыня: Глядзіць на гадзіннік, асвяціўшы запалкаю, — прайшло поўгадзіны пасля таго часу, калі звычайна праходзіць скоры поезд. Значыць, праўда — забастоўка пачалася!

Было некалькі дзён напружанага чакання. Звычайнае людское жыццё выбілася з каляіны і спынілася, а калі дзе трохі і рухалася, то рухалася, як павозка, у якой зламалася адно кола.

Старшыня Захар Лемеш цяпер нідзе не паказваецца, бо яго аўтарытэт, як начальніка, упаў на ўсе сто працантаў. І ён больш тупае каля свае гаспадаркі, чым у валасці. Апрануў сівую світку, падперазаўся горшым поясам і ходзіць трохі прыгнуўшыся, каб меней кідацца людзям у вочы. Яго мыслі часамі ідуць у іншым кірунку. Ён думае, што нічога трывалага на свеце няма і што нават яго старшынства мае свой пачатак і свой канец. Без канца канец. Старшыня кажа сам сабе, у думках:

— Э, маць яго барабан!

Гэта «барабанная маці» і ёсць той мосцік, што кладзецца паміж старшынёй і звычайным чалавекам, якім у перспектыве і давядзецца быць Захару Лемешу.

Пісар Дулеба хоць трохі і прыціх, але ўсё яшчэ храбрыцца. І не пісарства дорага яму — пляваць ён хоча на яго і плюе, — яму абыходзіць самы прынцып: ну, што будзе, калі гэтыя соцыялісты возьмуць верх? Прападзе тады Расія! Ён не парушыўся ў сваіх перакананнях нават пабачыўшы бурлівы вір маніфестантаў на вуліцах Пінска, калі паліцыя баязліва пахавалася. А старшыні сказаў:

— Нічога, Захар: перамелецца — мука будзе.

— Або мукà або мýка, — уздыхае старшыня.

— Пачакай трохі: я чуў — холад становіцца на ногі, дзьму-у-ухне ён, брат! Ды так дзьмухне, што ад тваіх забастоўшчыкаў і пер'я не застанецца.

— Што ты кажаш?! — радасць адбіваецца на старшынёвым твары.

— А вот пабачыш!

Не відаць таксама Івана Пракопавіча і голасу яго не чутно. Нікуды не ходзіць, дома сядзіць, бо яму прыкра глядзець на ўсё гэтае «плюгаўства»: шуміць, крычыць, само не ведае чаго. «Перавяліся людзі на рускай зямлі. У лібералізм гуляць пачалі. Сволачы». І тут-жа ён першы раз аблаяў цара: «Ідыёт. Дый што з яго возьмеш, калі яму бог мазгоў пашкадаваў?»

У папоўскай асярэдзіне таксама шушукаюцца, зашыўшыся ў свае куткі. У вялікае абурэнне прыводзіць усіх той факт, што ў горадзе служанкі забаставалі, і матушка, жонка саборнага папа, змушана была сама мыць падлогу і хадзіць з кошыкам на рынак.

Толькі дзяк Бацяноўскі не згубіў галавы і першы выказаў мысль, што гэта за грахі пасылае бог такую кару.

З прычыны таго, што паязды не хадзілі і газет не было, гэтыя людзі замянялі сабою газеты: па іх паводзінах і па іх тварах можна было меркаваць, як праходзіць рэвалюцыя. І быў такі дзень, калі Лабановіч засмуціўся: ён пачуў вясёлы голас Івана Пракопавіча:

— Гэ, сукіныя сыны! Паўстанне паднялі! Ды што ты супраць войска зробіш?.. Не, брат, вышэй пупа не падскочыш!

І ўсе, хто быў прыдушаны і загнаны ў шчыліны рэвалюцыяй, цяпер акрыялі і высока падрялі галовы.

Надыходзіў момант, калі перамогшы царскі ўрад рыхтаваўся капаць магілу рэвалюцыі, мабілізуючы для гэтага карныя часці войска і суды. Паліцыя і адпаведныя органы ўлады заварушыліся.

У той вечар, калі загрукалі па чыгунцы вагоны пасля дзесяцідзённага перапынку, зайшла да Лабановіча Вольга Віктараўна.

— Невясёлыя навіны, Андрэй Пятровіч: забастоўка скончылася, паўстанне задушана, гарады заліты кроўю. Ідуць арышты.

Неспакой і трывога ахопліваюць Лабановіча.

— Ну, што-ж. Трэба лічыцца з фактамі... Але следу гэтае рэвалюцыі ніхто не затрэ ў гісторыі, — адказвае ён.

— О, не! — падхватвае Вольга Віктараўна. — І вешаць нос на квінту няма чаго.

Усе гэтыя весткі, відаць, балюча абыходзяць ёй, але яна стараецца не паддавацца смутнаму настрою.

— І ў Пінску арышты пачаліся. Арыштаваны Глеб і Саламон, помніце іх?

— Арыштаваны? Шкада хлопцаў!

— Я ім зайздрошчу: няхай-бы і мяне арыштавалі.

— Ну, у гэтым радасці не надта многа.

— Ведаеце, а па Пінску чуткі ходзяць, што школа ваша — вогнішча рэвалюцыі і быццам-бы вы збіраліся ці збіраецеся з сялянамі руйнаваць нейкага пана Скірмунта?

— Ну, там з мухі слана зрабілі!

Лабановіч расказвае, як была справа. Вольга Віктараўна слухае, вочы яе весялеюць.

— А ведаеце, — кажа яна, — калі што, дык у вас ёсць тут вялікі козыр. Можна асвятліць справу так, што вы стрымалі сялян, адхілілі разгром і праліццё крыві... І вам няма чаго баяцца.

— Я не баюся. Чаму? А вось чаму: я даўно падгатаваў сябе да благога канца, і калі са мною здарыцца, ну, тое, што з Глебам і Саламонам, гэта для мяне не будзе нечаканасцю, і арышт мяне не палохае. Напляваць!

— Ну, аб арышце няма чаго думаць.

— Можа так, а можа, і не. Усе мы пад паліцыяй і жандарамі ходзім.

— Гэта то праўда... А я ўсе гэтыя дні была ў Пінску, школу сваю закінула, ну яе к чорту. Усё маё навучанне ў апошнія дні складалася з таго, што я збірала дарослых і чытала ім усякую нелегальшчыну.

— Цяпер, Вольга Віктараўна, трэба трошкі вам устрымацца, а то і да вас дабяруцца.

— А чорт іх бяры!.. Ведаеце, мне шкада будзе, калі нам прыдзецца разлучыцца.

— Калі мяне забяруць, то буду цешыць сябе, што мяне шкадуе такая слаўная дзяўчына, як вы.

— Ох, і злы-ж вы чалавек. Не хачу з вамі больш заставацца.

Падымаецца, збіраецца ісці.

— А я вас не пушчу. Пасядзіце яшчэ.

Яна мяняе тон, уздыхае.

— Ох, Андрэй Пятровіч! І не хочацца ісці, але трэба. Правядзіце мяне, калі не лянуецеся.

Яны выходзяць.

На чыгунцы развіталіся.

Вольга Віктараўна ідзе борзда, ні разу назад не аглянулася. Лабановіч стаіць, пазірае ёй услед. Хацеў дагнаць, яшчэ прайсціся з ёю.

На поле насоўваецца змрок, і постаць настаўніцы зліваецца з цемраю.

Лабановіч ідзе назад. Ідзе, разважае аб апошніх падзеях.

У той вечар, калі загрукацеў першы поезд, Захар Лемеш ішоў з воласці. Гумор яго быў значна падняты, бо ён чуў добрыя навіны. Ён нават пасмейваецца сам сабе.

«Галава, гэты мой пісар! — думае старшыня аб Дулебе, — выходзіць так, як ён і казаў!»

Калі-ж да вушэй старшыні данёсся грукат з чыгункі і пачуўся гудок, ён запыніўся, паслухаў, а потым загаварыў громка, сваім ужо старшынёўскім голасам:

— Дурні, дурні! І як яны маглі асмеліцца пайсці супраць царскай улады?

Гэты прарыў глухой цішыні на чыгунцы быў як-бы дзіркаю, праз якую і палезлі розныя падзеі. Спадцішка

яны падрыхтоўваліся і раней, але цяпер выяўленне іх пайшло болей шпарка.

Лабановіч часцей заўважаў нейкія таемныя цені пад вокнамі свае кватэры. Пачаў прыглядацца. Ясна, што ён быў на падазрэнні, і за ім сачылі. Сачыла патрошкі і патаемна паліцыя, сачылі і з двара пана Скірмунта, прыглядаўся да яго і дзяк па сваёй добрай волі. Гэтае сачэнне пачалося з таго часу, калі пан Скірмунт перадаў петыцыю пану маршалку. З прычыны гэтага была склікана цэлая нарада. Запрасілі паліцмайстра і казацкага афіцэра.

Маршалак, таўшчэразны, непаваротны чалавек, накшталт гіпапатама, прышоў у вялікае абурэнне.

— Цешцеся, гаспада! Пад самым носам у нас замышляюцца падзеі, падзеі рэвалюцыйнага парадку, праўдзівей сказаць, рэвалюцыйнай катэгорыі.

Чытае петыцыю.

— «Грамадзян»... Звярніце ўвагу — «грамадзян!» Няма, бачыце, больш мужыка, а ёсць толькі «грамадзяне», якіх крыўдзіць, эксплаатуе... і... якая там яшчэ ў іх тэрміналогія? «Грамадзянін» Скірмунт!.. Га? Як вам падабаецца?.. Такая нагласць!

— Бяспрыкладная нагласць!

— Прахвосты! — уторащь галасы.

— Устаноўлена, хто пісаў гэтае мілае пасланне? — пытае казацкі афіцэр.

— Прасвяціцель народа, ён-ж педагог, — іранізуе маршалак. — Сяргей Пятровіч! — зварачаецца ён да інспектара, — гэта ваш скарб.

Інспектар Булавін канфузіцца за свой «скарб».

— Я ад сябе даследую ступень яго ўдзелу ў гэтым беззаконні, — апраўдваецца ён.

— За гэта, разумеецца, мы яго па галоўцы не пагладзім, — гаворыць паліцмайстар. — Але згадзіцеся, гаспада, што яго ўмяшанне мае і свой дадатны бок: гэтая петыцыя захавала ад разгрому пана Скірмунта. І мне так прадставіў справу ляснічы Іван Пракопавіч. Ён проста сказаў: «Ды вы падзякуйце яму за гэтую петыцыю».

Абурэнне супраць аўтара петыцыі значна зніжаецца.

Толькі адзін пракурор захоўвае строгасць, уласцівую яго прафесіі.

— Хто-б ён ні быў і чым-бы ён ні кіраваўся, а ён чалавек небяспечны, крамольнік, гэта ясна, прайдоха, не пазбаўлены юрыдычнага кручкатворства, праўда, наіўнага. Такія «хадатаі» ўраду не патрэбны.

Тым часам, не дачакаўшыся адказу на петыцыю, сяляне склікаюць другі сход. З прычыны таго, што «закон» споўнены, яны вынеслі новую пастанову — прыступіць да карыстання з затокаў, што па плану належаць да іх.

Чалавек дваццаць сялян, узваліўшы невад на сані, выходзяць на затокі. Павольна, не спяшаючыся, бяруцца за справу. Прасякаюць палонкі, закідаюць невад. Работа ідзе весела, дружна. Выцягваюць першы невад, яшчэ весялей робіцца ім. Калі і далей будзе такі спор у рабоце, сёння яны пажывяцца добра. Пасля паўдня ў іх было ўжо цаброў тры ўлову. А рыба, як на заказ: ліны і шчупакі, ды ўсё ладныя. Проста ахвота бярэ да работы.

Нарыхтаваліся закінуць невад у новую тоню, разматалі яго, цягнуць, каб закінуць. Дзядзька Есып апошнюю крыгу выкочвае, аж зірк — з-за сухіх высокіх чаротаў чалавек трыццаць казакоў на конях вылятае! І як падкраліся яны так спрытна, ліха іх ведае. Раз — і акружылі!

— Крамольнікі! Бунтаўшчыкі! Для вас ўжо царскія законы — не законы?! Сваволіць? Бунтаваць?

Строгі быў казацкі афіцэр.

У дзядзькі Есыпа са сполаху выпала люлька з зубоў у палонку.

— Кладзі невад на сані! — камандуе рыбакам афіцэр.

Мокры невад і тры цабры ўлову паклалі на сані. Панурыя, засмучаныя, устрывожаныя і абураныя такою несправядлівасцю кандыбаюць сяляне пад казацкім канвоем. Іх вядуць берагам Піны каля Высокага, каб усе бачылі ганьбенне іх і пакаранне.

У гэты-ж час у школе гаспадарыць паліцыя. З парку Івана Пракопавіча наляцела сюды і акружыла школу. Вучняў пусцілі, настаўніка запрашаюць у яго-ж кватэру.

— Нічога не знойдзеце, — гаворыць прыставу Лабановіч.

— Усё загадзя пахавалі? — пытае прыстаў і ўсміхаецца.

Пакапаліся трохі, а потым сказалі настаўніку апранацца.

— Так-бы і гаварылі адразу!

Лабановіч збіраецца. Зборы яго невялікія.

Арыштаваных сялян вывелі на выган. Тут збегліся людзі, забілі ўвесь выган.

— Расхадзісь! Расхадзісь! — камандуе паліцыя і распіхае натоўп.

Аксён Каль быў у клуні. Малаціў. З цапільна зрываецца біч. Аксён падымае біч, выходзіць на двор, каб начапіць на цапільна. Пачуўшы на выгане такі незвычайны шум і крыкі, ён бяжыць туды з цапільнам і бічом. Падыходзіць да «лініі ачаплення». Казацкі афіцэр патокам разліваецца, гаворачы прамову-навучанне, перасыпаючы яе «сволаччу», «крамольнікамі» і іншымі страшнымі словамі.

— Каб вы так храбра японцаў бралі ў палон, то былі-б малайцы, — гаворыць Аксён да казакоў.

Афіцэр паварочвае злы твар у бок Аксёна.

— Што ты сказаў?

Узлаваўся і Каль.

— Сказаў, што вас японцы білі і гналі, як сабак, а вы прыехалі сюды на бяззбройных мужыках адыгрывацца.

Момант — і афіцэр выхватвае шаблю. Высока ўзняты бліскучы клінок і...чвяк. Афіцэрская шабля далёка ў бок адлятае, выбітая з рук мужыцкім бічом. Яшчэ момант — гэты-ж біч гладка прыстае да далікатнай афіцэрскай фігуры. Зваліўся-б з каня, але казакі падтрымалі. Рэшта казакоў пачала ў натоўп з коньмі кідацца.

— Бяры яго! Бі! — крычыць звар'яцелы ад злосці афіцэр.

Аксёна кідаюцца лавіць, але ён знікае, як нейкі злы дух. І ніхто не ведае, як гэта ўсё здарылася. А хто і ведае, то не гаворыць.

Натоўп разагналі. Некалькі чалавек падмя́лі коньмі.

Арыштаваных сялян і настаўніка вядуць выганам, а потым паварочваюць налева, на дарогу ў Пінск.

Дзяк Бацяноўскі стаіць збоку. Праводзіць вачамі гэтую працэсію і кажа, зварачаючы свае словы да настаўніка:

— Так, суседзе, нічога няма патаемнага, што не сталася-б яўным. І ўсякую гардыню наказуе гасподзь.

Мінск, 1926—27 гг.

На белорусском языке

Якуб Колас

НА РОССТАНЯХ

Трилогия

Том 1

Книги первая
и вторая

Государственное издательство БССР
Минск 1955

*

Рэдактар *М. Лужанін*
Мастак *А. Сапетка*
Тэхрэдактар *Ю. Аляксеева*
Карэктар *Н. Лебедзева*

*

АТ 03401. Падп. да друку 16 IV 1955 г.
Тыраж 10 000 экз. Фармат $84 \times 108/_{32}$.
Фіз. друк. арк. 11,625. Ум. друк. арк. 19,065.
Уч.-выд. арк. 20. Цана 8 руб. Зак. 78.

Друкарня імя Сталіна, Мінск,
праспект імя Сталіна, 105.